Аляксандра
Валодзіна



Вальдэнсы

ў канцы XII - пачатку XV стагоддзя:
паміж ерэтычнай сектай
і народнай рэлігійнасцю




LUX LUCET IN TENEBRIS



АЛЯКСАНДРА ВАЛОДЗІНА

ВАЛЬДЭНСЫ

ў канцы XII – пачатку XV стагоддзя

паміж ерэтычнай сектай і народнай рэлігійнасцю



МІНСК • ІВЦ МІНФІНА • 2024

УДК 272-876-9(4)“11/14”
ББК 86.375-8-3(4)
ГРНТИ 21.15.61
В15

Р э ц э н з е н т ы :
доктар гістарычных навук,
прафесар Віктар Анатольевіч Фядосік;
Facoltà Valdese di Teologia,
Cattedra di Storia del cristianesimo
Professore Lothar Vogel.

На контртытуле размешчаны:
вальдэнская пячатка з лацінскім надпісам
«Святло свеціць у цемры»;
карта квартала горада Ліёна,
дзе жыў Вальдэс.

Паўлін на вокладцы і ілюстрацыі ў пачатку глаў
намаляваны *дызайнерам Вольгай Гаўрычэнка*
на аснове вітражоў вальдэнскай царквы ў Рыме
на Плошчы Кавур.
Іх аўтар, мастак з вальдэнскіх далін
Паоло Паскетто (Paolo Pasquetto),
абапіраўся на жыццесцвярджальныя
сюжэты фрэсак катакомбаў
рымскіх хрысціян.

ISBN 978-985-880-471-8
© Валодзіна А., 2024

Уводзіны

 ярод усіх сектаў, якія ёсць ці былі, няма ніякай больш пагібельнай для Царквы, чым леаністы"[1], – пісаў пра вальдэнсаў аўтар (парафіяльны святар, або манах-дамініканец) так званага Пасаўскага ананіма – трактата другой паловы XIII ст., што паходзіў з Пасаўскай дыяцэзіі (горад Пасаў, сучасная Германія)[2]. Гэтыя словы найлепш ілюструюць сітуацыю са стаўленнем да вальдэнскага руху ў сярэднявечнай Еўропе, калі са знікненнем катарызму і да з'яўлення гусітаў вальдэнсы лічыліся галоўнымі ворагамі Каталіцкай Царквы. Калі для XIII ст. "ерэтык" – гэта, хутчэй за ўсё, катар, то для XIV ст. – гэта вальдэнс[3].

Вальдэнскі рух узнік на поўдні сучаснай Францыі ў 1170-я гг., з цягам часу распаўсюдзіўся ад Пірэнеяў да Карпатаў пад рознымі назвамі: "вальдэнсы" (ад імя заснавальніка – Вальдэса[4]), "бедныя з Ліёна" (ад роднага горада Вальдэса), або "леаністы" (гэтае слова магло мець падвойнае значэнне: акрамя паходжання з Ліёна – спасылку на міфічнага таварыша Папы Сільвестра Леона, які адмовіўся апаганіцца свецкай уладай[5] (т. зв. "Канстанцінаў дар")), "рункарыі" (ад імя галавы італьянскай галіны руху – Яна з Ронка), "мантанэлі", або "ўльтрамантаны" (літаральна – "тыя, хто жыве ў гарах", або "за гарамі"), "бедныя духам", "бедныя ламбардцы" і інш. З пачатку XV ст. яны паступова "зліліся" ў крыніцах з ведзьмамі[6] і гусітамі, у выніку чаго

---

[1] Alexander Patschovsky, and Kurt-Victor Selge, *Quellen zur Geschichte der Waldenser*, vol. 18 (Gütersloh: Gütersloher Verlagshaus Mohn, 1973), 73. Поўны тэкст крыніцы можна пачытаць у раздзеле ПЕРАКЛАДЫ [V.i.B] (далей спасылкі на пераклады будуць пададзены проста ў квадратных дужках).

[2] Lucy J. Sackville, *Heresy and Heretics in the Thirteenth Century: The Textual Representations* (Woodbridge: York Medieval Press, 2014), 138.

[3] Grado Giovanni Merlo, "Distribuzione topografica e composizione sociale delle comunità valdesi in Piemonte nel basso Medioevo," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 95 (1974), 3.

[4] Імёны асоб пададзены максімальна набліжана да лацінскай транскрыпцыі (за выключэннем найбольш пашыраных імён апосталаў, варыянты напісання якіх арыентуюцца на найбольш ужываныя сярод 10-і перакладаў Евангелля на беларускую мову), назвы мясцовасцей – згодна з сучаснымі назвамі.

[5] Прыняцце Сільвестрам свецкай улады ад імператара Канстанціна ўспрымалася многімі радыкальнымі вернікамі як атручанне, апаганьванне Царквы, бо тая павінна займацца толькі духоўным, а не зямным. Pierrette Paravy, *De la chrétienté romaine à la Réforme en Dauphiné: Évêques, fidèles et déviants, vers 1340 – vers 1530* (Rome: École Fançaise de Rome, 1993), 909.

[6] Сёння большасць даследчыкаў лічыць вядзьмарства культурным канструктам, які сумясціў народныя ўяўленні са схаластычнай тэалогіяй на тле ўзрослага напружання ў грамадстве.

"класічны"[7] вальдызм спыніў сваё існаванне. У 1532 г. вальдэнсы афіцыйна далучыліся да пратэстанцкага руху, а ў 1975 г. аб'ядналіся з Італьянскай Метадысцкай Царквой. Сёння вальдэнсы жывуць на поўначы Італіі (з цэнтрам у П'емонце, горад Торэ Пелічэ (Torre Pellice)), Германіі, ЗША, Аргенціне і Уругваі. Такім чынам, гэта адзіны ерэтычны[8] рух, які здолеў легалізавацца і праіснаваць у мадыфікаваным выглядзе да нашага часу.

Да 1170-х гг. на поўдні Францыі і поўначы Італіі сышоўся ў адно цэлы шэраг розных сацыяльна-эканамічных і рэлігійных абставін, які дазволіў новаму руху не толькі ўзнікнуць, але і развіцца ў шырокую і магутную плынь, што ахапіла сабой розныя сацыяльныя пласты і рэгіёны сярэднявечнай Еўропы на працягу наступных трох стагоддзяў. Перш чым перайсці непасрэдна да гісторыі вальдэнсаў, варта асвятліць гэтыя абставіны.

Мяжа XII–XIII стст. – час уздыму сярэднявечнай рэлігійнасці. "Тады рэлігійнасць і мірскі дух, час перамогі якога яшчэ не надышоў, супрацьстаяць адзін аднаму, не змешваюцца, а ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго і штурхаюць да самавызначэння"[9]. Адначасова ідзе імклівая змена сацыяльнай будовы грамадства, абумоўленая эканамічным развіццём. На першае месца выходзіць горад са сваёй структурай. У ім віруе жыццё, узнікаюць розныя суполкі гараджан, аб'яднаных сацыяльна-эканамічнымі інтарэсамі. Аслабляюцца перагародкі паміж горадам і вёскай. Раней рэлігійныя рухі ствараліновыя храмы і кляштары, выключалі з мірскога жыцця асобных людзей, рэдка ахоплівалі цэлы горад. Кляштар служыў мэтам індывідуальнага выратавання. Цяпер ён наблізіўся да горада ці нават увайшоў у яго межы. Палажэнне аб брацкай любові манахаў вымушала іх быць бліжэй да жыхароў горада[10]. Большую ролю пачынаюць адыгрываць не манастыры і манахі, а кафедральныя саборы і свецкае духавенства. Словы прапаведніка, хто б ён ні быў, знаходзілі водгук у больш шырокіх пластах насельніцтва, перадаваліся з вуснаў у вусны з большай лёгкасцю і хуткасцю. Сацыяльныя сувязі злучаюць не толькі маленькую групу людзей, але горад з яго акругай. Гэта дае магчымасць шматлікім рэлігійным ідэям не толькі ўзнікаць у галовах асобных інтэлектуалаў ці харызматычных лідараў, але і пашырацца далёка за межамі іх родных населеных пунктаў, перадаючыся па ланцужку з вуснаў у вусны сярод іх паслядоўнікаў, а пасля – і іх нашчадкаў.

---

[7] Тэрмінам "класічны" ў дадзеным кантэксце вызначаецца гістарычны працэс у перыяд свайго найбольш поўнага развіцця.

[8] Вядома, пажадана пазбягаць такіх тэрмінаў, як "ерась" і "інквізіцыя". Першага – таму, што гэты тэрмін нясе выключна негатыўную нагрузку. Як пісала Джэніфер Дзін, гэта як называць кагосьці сёння тэрарыстам (Jeniffer Kolpacoff Deane, *A History of Medieval Heresy and Inquisition* (Lanham: Rowman & Littlefield, 2011). 6). Другога – таму што ў гэты час інквізіцыя не была адзінай арганізацыяй. Але паколькі ўжыванне гэтых тэрмінаў робіць тэкст больш простым для ўспрымання, я буду прытрымлівацца гістарыяграфічнай традыцыі і ўжываць абодва тэрміны і вытворныя ад іх, не надаючы ім ніякай негатыўнай канатацыі.

[9] Лев Карсавин, *Сочинения*, Том 2 (Санкт-Петербург: Алетейя, 1997), 34–36.

[10] Адольф Гарнак, *История догматов*, доступ 22.10.2022, http://www.gumer.info/bogoslov_Buks/dogmatika/Garnak_int.php.

Сукупнасць рэлігійных ідэяў, назапашаная стагоддзямі, прыходзіць у рух. З яе глыбіні з'яўляюцца, здавалася б, забытыя вучэнні, пераглядаюцца старыя ідэі, па-новаму разумеюцца ранейшыя ідэалы, і гэта ўвасабляецца ў цэлы шэраг сістэм, якія непрымірыма варагуюць між сабою. Няясныя і несфарміраваныя рэлігійныя вучэнні, што ўзнікалі ў Еўропе пасля 1000 г., нарэшце крышталізуюцца, з аднаго боку, у стройную каталіцкую тэалагічную сістэму, якая дасягнула свайго апагея ў "Падсумаванні тэалогіі" Тамы Аквінскага. З іншага боку, усё гэта рэлігійнае жыццё спараджае неверагодную разнастайнасць, якая выяўлялася ва ўзнікненні ў кароткі прамежак часу ўніверсальных жабрацкіх ордэнаў і вялізнай колькасці ерасяў, пашырэнні ерэмітычных[11] рухаў, а таксама ў буйных фанатычных прыпадках, што на кароткі час ахоплівалі ўсе пласты насельніцтва на пэўнай тэрыторыі (міленіярызм[12], рух флагелантаў[13]). Мы зараз, як і інквізітары ў Сярэднявеччы, бачым гэтыя рухі як вялікія і глабальныя сістэмы, між тым кожны ерэтычны выбар – глыбока індывідуальны[14]. Фактычна, вывучэнне сярэднявечных ерасяў – гэта пошук агульных элементаў у мностве такіх выбараў, і вытлумачэнне прычын, якія прыводзілі людзей да гэтых выбараў.

На гэты перыяд прыпадае апагей магутнасці папства як рэлігійнага і палітычнага інстытута. Папы імкнуцца да дамінавання над манархамі. Ад Д'ябла ўлада манарха ці ад Бога? Гэтае пытанне будзе не раз узнімацца вальдэнсамі.

Адначасова менавіта з узвышэннем палітычнай вагі Царквы яна ўсё больш аддаляецца ад ідэалу, апісанага ў Новым Запавеце. Багацце і пашана разбэшчваюць духавенства, што прыводзіць да надзвычайнага падзення яго нораваў. Папа Грыгорый IX прызначыў Конрада Марбургскага папскім візітатарам германскіх кляштараў са словамі: "Германскі клір, прызваны распаўсюджваць духмянасць дабрадзейнасці, распаўсюджвае смурод смерці. Нам данеслі: парафіяльныя святары і іншыя, якія прынялі свяшчэнны сан, забыліся пра сваё становішча; паству, якой ім належыць служыць прыкладам паважанага жыцця, яны заражаюць сваімі заганамі. Як вада, якая выцекла, ці пасудзіна без корка, яны бесклапотна аддаюцца ўсялякім распустам, трымаюць палюбоўніц і вядуць вясёлае жыццё"[15]. Менавіта супраць гэтага і паўстаюць ерэтыкі: чым мацней Царква, тым больш

---

[11] Ерэміт – пустэльнік, той, хто імкнецца да адзіноты і выратавання сваімі сіламі, а не ў манаскім калектыве.

[12] Чаканне канца свету ў сувязі з надыходам 1000/1033 года (калі ў 1000 годзе канец света не наступіў, быў прапанаваны заснаваны на апокрыфах варыянт адлічваць час не ад даты нараджэння Хрыста, а ад яго ўкрыжавання).

[13] Пакаянны рух людзей, якія ўтаймоўвалі сваё цела шляхам самабічавання.

[14] Louisa A. Burnham, "Unusual Choices: The Unique Heresy of Limoux Negre," *Late Medieval Heresy: New Perspectives*, 2018, pp. 96–115, https://doi.org/10.1017/9781787443327.007, 114.

[15] Эрнст В. Вис, *Фридрих II Гогенштауфен* (Москва: АСТ: Транзиткнига, 2005), 31.

ерасяў. І апагей папства – яшчэ і апагей антыцаркоўных рухаў, які можа быць параўнаны толькі з Рэфармацыяй.

Гэтыя працэсы былі ўласцівыя не толькі хрысціянству. У XI–XIII стст. галоўныя пазарэлігійныя мэты ерэтычных рухаў былі аднолькавыя і ў хрысціян, і ў мусульман, і ў яўрэяў[16]:

- ✠ сацыяльныя змены. Як слушна заўважыў Роберт Іэн Мур, ерась – гэта сведчанне змены ўзаемаадносінаў паміж царкоўнымі ўладамі і тымі, каго яны бачылі сваімі ворагамі; "таму і «з'яўленне» народных ерасяў на Захадзе ў XI ст. упершыню з часоў Антычнасці сведчыла пра парушэнне існуючага сацыяльнага і палітычнага парадку"[17];
- ✠ супрацьстаянне перавышэнням паўнамоцтваў рэлігійнымі і свецкімі ўладамі;
- ✠ супрацьстаянне гвалтоўнаму пераследу іншадумцаў[18].

У Паўночнай Італіі на барацьбу паміж папствам і ерэтыкамі накладалася барацьба паміж гвельфамі (прыхільнікамі папства) і гібелінамі (прыхільнікамі імператара Свяшчэннай Рымскай Імперыі). Апошнія часта ўступалі ў антыпапскі саюз з ерэтыкамі, і таму часам цяжка размежаваць праціўнікаў свецкай дзяржавы Патрымонія Святога Пятра (афіцыйная назва Ватыкана) і Каталіцкай Царквы[19]. Разам з тым да канца XIII ст. інквізіцыі ўдалося ўзяць сітуацыю пад свой кантроль і атрымаць неабходную падтрымку насельніцтва. Часткова дзякуючы іх намаганням, колькасць ерэтыкоў радыкальна скарацілася, а тыя, хто засталіся, былі вымушаныя хавацца[20]. Ерась у паўночнаітальянскіх гарадах часта станавілася інструментам эмансіпацыі грамадства, давала перспектыву выйсці за яго рамкі[21]. Папа, у сваю чаргу, таксама быў вымушаны ставіцца да ерэтыкоў даволі паблажліва, каб не звужаць базу сваіх прыхільнікаў. Да таго ж сітуацыю ўскладняў і распачаты ў X ст. камунальны рух – змаганне гарадоў за сваю незалежнасць ад феадальных сеньёраў праз атрыманне т. зв. камунальнай хартыі. Паралельна з гэтым ішоў працэс ператварэння горада ў своеасаблівага калектыўнага феадала ў адносінах да навакольнай сельскай мясцовасці (кантада). Адбывалася прымусовае перасяленне

---

[16] Тэрміны "яўрэй" і "іўдзей" у кнізе выкарыстоўваюцца як сінонімы.

[17] Robert Ian Moore, "Heresy, Repression, and Social Change in the Age of Gregorian Reform," in *Christendom and Its Discontents: Exclusion, Persecution and Rebellion, 1000–1500* (Cambridge: Cambridge University Press, 2002), pp. 19–46, 41.

[18] Christine Caldwell Ames, *Medieval Heresies: Christianity, Judaism, and Islam* (Cambridge: Cambridge University Press, 2015), 134–135.

[19] Самуил Лозинский, *История папства* (Смоленск: Русич, 2004), 145.

[20] Peter D. Diehl, "Overcoming Reluctance to Prosecute Heresy in Thirteenth-Century Italy," in *Christendom and Its Discontents: Exclusion, Persecution and Rebellion, 1000–1500* (Cambridge: Cambridge University Press, 2002), pp. 47–66, 49.

[21] Rita Bellelli, "I boni homines (La 'gente nova') e la 'congiura' precomunale. Secoli XI–XII," accessed 22.10.2022, https://montesquieu.unibo.it/article/download/8058/7781/24922, 6.

феадалаў са сваіх замкаў, якія разбураліся, у горад, што значна павялічвала сацыяльную стракатасць і стварала добрую базу для развіцця розных рухаў супраціву – як паўстанняў і палітычных пераваротаў, так і ерэтычных сектаў, якія вялі барацьбу не толькі за царкоўную рэформу ў галіне маральнага аблічча кліру, але часам і за палітычную ўладу[22]. Камунальны рух можа разглядацца і як рэлігійны, бо камуны былі заснаваны на прынясенні ўсеагульнай клятвы па захаванні міру. Сілу камунальнаму руху давала ідэя "хрысціянскага братэрства", "хрысціянскага задзіночання любові і міру"[23].

Барацьба паміж уладай Папы і ўладай манарха характэрная не толькі для поўначы Італіі, але і для поўдня Францыі, які ў той час належаў французскаму каралю толькі дзякуючы васальным сувязям з мясцовымі феадаламі, а некаторыя гарады, такія, як, напрыклад, Авіньён, увогуле знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад Імперыі. Рымская Царква ўсімі сіламі імкнулася там замацавацца, асабліва ўлічваючы небяспеку з боку катараў, ерась якіх усё пашыралася і ахоплівала вобласць за вобласцю. Сітуацыя настолькі абвастрылася, што ў 1209–1229 гг. быў арганізаваны так званы Альбігойскі крыжовы паход[24].

Прычыну надзвычайнага распаўсюджання рэлігійнага дысідэнцтва менавіта на поўдні сучаснай Францыі можна шукаць ва ўладных адносінах, у сацыяльных структурах і ў свецкім характары мясцовай культуры, якія спрыялі ўспрыняццю пропаведзяў і выступленняў у абарону дысідэнтаў. У першую чаргу сваю ролю тут адыграў больш глыбокі, чым у іншых месцах, разлом, які падзяліў дамінуючы пласт грамадства на два лагеры. Усё, што магло служыць аслабленню свецкай улады духавенства, атрымлівала падтрымку з боку іх супернікаў – баронаў і рыцараў. А таму біскупы і папскія легаты мелі падставу бачыць у свецкіх уладарах апору ерасі. Марк Грэгары Пег выказаў меркаванне, што нават саманазва катараў – "добрыя людзі" – паходзіць ад паважлівага звароту "добры чалавек" да аўтарытэтнай асобы і не мае дачынення да рэлігійнага пратэсту/ерасі; у той час як інквізітары ўспрынялі павагу/ветлівасць як пакланенне духоўнаму настаўніку ў процівагу каталіцкаму святару[25]. З ім палемізуе Пётр Білер, які прыводзіць доказы з крыніц, што гаворка ідзе пра складаны фармалізаваны рытуал, які павінен быць менавіта "вывучаны", уключна з трохразовым укленчваннем і прамаўленнем традыцыйнай просьбы "Блаславі, Добры

---

[22] Martin Erbstösser, *Ketzer im Mittelalter* (Leipzig: Edition Leipzig, 1984), 107.

[23] Отто Герхард Эксле, *Действительность и знание: очерки социальной истории Средневековья* (Москва: Новое лит. обозрение, 2007), 161–162.

[24] Спачатку альбігойцамі называлі толькі ерэтыкоў вакол горада Альбі, але пасля пачатку крыжовага паходу гэтая назва пашырылася на ўсіх меркаваных паслядоўнікаў дуалістычнай ерасі (веры ў існаванне дабрага і злога багоў). Robert Ian Moore, *The War on Heresy: Faith and Power in Medieval Europe* (London: Profile Books Ltd, 2014), 217.

[25] Mark Gregory Pegg, "The Paradigm of Catharism; or, the Historians' Illusion," in *Cathars in Question* (Woodbridge: York Medieval Press, 2016), pp. 21–52, 39.

Чалавек, і маліся Богу за нас"[26]. У любым разе гэта адназначна сведчыць пра тое, што ў тагачасным Лангедоку была вялікая колькасць аўтарытэтных асоб, якія дзейнічалі па-за межамі Каталіцкай Царквы, складалі ёй значную канкурэнцыю і тым выклікалі яе раздражненне.

Да слоў вандроўных ерэтыкоў-прапаведнікаў асабліва ўважліва прыслухоўваліся жанчыны. Форма выказвання ерэтычнай набожнасці не ставіла жанчыну на больш нізкую ступень у адрозненне ад формаў, усталяваных афіцыйнай Царквой, якая глядзела на іх як на чашу граху[27]. Жанчыны маглі станавіцца "дасканалымі" ў катараў[28], яны маглі прапаведаваць і падарожнічаць разам з вальдэнсамі-мужчынамі.

Да таго ж на поўдні Францыі склалася своеасаблівая свецкая культура адкрытай дыскусіі. Звыклае да абмеркавання пытанняў прававога характару насельніцтва гарадоў і замкаў гэтак жа публічна і свабодна абмяркоўвала і пытанні, датычныя рэлігіі. Сакральнае тут не было так выразна аддзелена ад свецкага, і пытанні рэлігіі маглі абмяркоўвацца ў адкрытай дыскусіі нароўні з гарадскімі справамі. Людзі, якія сабраліся на плошчы, па чарзе выслухоўвалі як строгіх змагароў-каталікоў, так і іх апанентаў, падобна да таго, як яны слухалі спаборніцтвы трубадураў або прыхільнікаў варагуючых палітычных партый. Арбітрамі ў дэбатах, што праходзілі на чале з сеньёрамі, выступалі свецкія асобы[29]. Культура трубадураў забяспечыла ерэтычныя рухі гатовай дзейснай мадэллю для распаўсюджання ўплыву[30].

Катары і вальдэнсы не былі першымі ерэтыкамі на поўдні Францыі. Ужо ў пачатку XII ст. на гэтых тэрыторыях дзейнічалі прапаведнікі Пётр з Бруі (чыіх паслядоўнікаў, сапраўдных і/ці ўяўных, у пазнейшай гістарыяграфіі назвалі петрабрузіянцамі) і Генрык[31] (адпаведна, генрыкіянцамі). Такім чынам, супрацьстаянне з царкоўнымі ўладамі было даўняй традыцыяй поўдня Францыі[32]. Адначасова негатыўны вобраз Аквітаніі як ерэтычнага краю падмацоўваўся тым фактам, што яе клір падтрымаў

---

[26] Peter Biller, "Goodbye to Catharism?," in *Cathars in Question* (Woodbridge: York Medieval Press, 2016), pp. 274–313, 285.

[27] Stanisław Trawkowski, *Między herezją a ortodoksją: rola społeczna premonstratensów w XII wieku* (Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1964), 160.

[28] Пад "дасканалым" (perfectus) хутчэй за ўсё трэба разумець не столькі "ідэальнага", колькі "закончанага", "таго, які прайшоў поўны абрад пасвячэння". Падрабязней гл. Anne Brenon, "The Voice of the Good Women: An Essay on the Pastoral and Sacerdotal Role of Women in the Cathar Church," in *Women Preachers and Prophets through Two Millennia of Christianity* (Berkeley: University of California Press, 1998), pp. 114–133.

[29] Жорж Дюби, *Средние века. От Гуго Капета до Жанны д`Арк* (987–1460) (Москва: Междунар. отношения, 2000), 302–303.

[30] Andrew P. Roach, *The Devil's World: Heresy and Society 1100–1300* (Routledge, 2019), 50.

[31] Таксама вядомы ў гістарыяграфіі як "Генрык з Лазаны" або "манах Генрык", у крыніцах – проста Генрык.

[32] Jaques Chiffoleau, "Religious Dissidence and Political Struggles in the Rhône Valley (13th Century)," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* (Leiden: Brill, 2022), pp. 98–118, 107.

антыпапу Анаклета II у супрацьстаянні з Інакенціем II (які ў выніку атрымаў перамогу).

Такім чынам, ерасі былі ўсюды, яны пранікалі ва ўсе сферы грамадскага жыцця. Але паўстае пытанне: у чым была прычына такога імклівага росту іх колькасці і ўплыву ў вызначаны перыяд? Якім чынам рэлігійны ўздым быў звязаны з ерэтычнай традыцыяй?

З пачатку XII ст. па меры таго, як у агульным рэчышчы прагрэсу індывідуальная свядомасць вызвалялася ад усеагульнага канфармізму, а навукоўцы глыбей аналізавалі змест Новага Запавету, калі само Свяшчэннае Пісанне станавілася больш даступным для міран, ерасі сталі ўзнікаць і памнажацца паўсюль і ў самых розных формах. Усё больш людзей выказвала незадавальненне багаццямі і распустай святарства, працягвала сумнявацца ў рэальнай прысутнасці Цела Хрыстова на алтары[33] і карысці для душы царкоўных рытуалаў. Многія з гэтых патрабаванняў супадалі з ідэямі, з якімі выступалі грыгарыянцы (прыхільнікі Папы Грыгорыя VII (1073–1085 гг.), які распачаў шэраг рэформаў па абнаўленні Каталіцкай Царквы). Поспех грыгарыянскай рэформы сам па сабе садзейнічаў узмацненню такіх думак[34] – данатызм[35] фактычна ўяўляе сабой максімальна радыкальную трактоўку грыгарыянскай ідэі павышэння маральнага ўзроўню кліру. Увогуле, у многім ерэтыкі працягвалі традыцыю рэформаў, якія ўжо фармальна скончыліся на канец XII ст., але прывялі да імкнення шырокіх груп насельніцтва да "апостальскага жыцця"[36]. Да рэлігійнага пад'ёму сярод міран прыводзіла і тое, што ўсё больш людзей выключалася з літургіі[37], з актыўнага ўдзелу ў афіцыйным царкоўным жыцці, але працягвала яго прагнуць. "Трынаццатае стагоддзе прагнула рэлігійна-маральных ісцін"[38], – сцвярджаў Леў Карсавін. Людзі шукалі ідэал праведнага жыцця, кідаліся то ў аскезу, то ў містыку, то ў апостальскае перайманне жыццёвага шляху Хрыста. Шукалі праўдзівае жыццё, праўдзівую веру, праўдзівую Царкву. Ад таго і набывалі такое значэнне рэлігійныя асацыяцыі міран, ад таго і памнажаліся тэрцыярскія групы[39], што праз іх адкрывалася магчымасць жыць па веры, а ў веры адкрываўся рэлігійна-маральны ідэал. Калі людзі

---

[33] Канцэпцыя "рэальнага" пераўвасаблення падчас таінства еўхарыстыі была прынятая толькі на Саборы ў Рыме ў 1059 г. і працягвала аспрэчвацца сярод "ерэтыкоў".

[34] Дюби, *Средние века*, 298–299.

[35] Вера ў тое, што маюць значэнне толькі тыя таінствы, якія здзяйсняюцца праведнымі святарамі, а таінствы грэшнікаў, нават у святарскім сане, нічога не вартыя.

[36] James M. Powell, "Religious Diversity and Communal Politics in Thirteenth-Century Italy," in *Portraits of Medieval and Renaissance Living: Essays in Memory of David Herlihy* (Ann Arbor: University of Michigan press, 1996), pp. 363–381, 364.

[37] Julien Bellarbre, "Perceptions of Heresy in Historiographical and Hagiographical Sources of Aquitaine and the Loire Valley during the High Middle Ages," in *Heresy and the Making of European Culture* (Farnham: Ashgate, 2013), pp. 113–128, 127.

[38] Карсавин, *Сочинения*, 54.

[39] Тэрцыярыі – члены т.зв. "трэціх ордэнаў", якія існавалі пры некаторых каталіцкіх манаскіх ордэнах. Прымалі зарокі і трымаліся манаскага статута, але не пакідалі свету.

не знаходзілі ісціны ўнутры Царквы – яны пачыналі шукаць па-за яе межамі, што ў рэшце рэшт прыводзіла да ерасі.

Балючымі пытаннямі, на якія пазней паспрабаваў даць адказы Тама Аквінскі, былі, напрыклад:

1. Нявызначанасць месца Д'ябла ў светабудове і прычыны сусветнага зла (адна з прычын катарскага дуалізму).

2. "Спрэчка пра права міран прапаведаваць", што бярэ свой пачатак з тагачаснага падзелу грамадства на тры асноўныя страты, які толькі-толькі замацаваўся[40]. І новая страта – духавенства – актыўна абараняла свае прывілеі. "Мірская пропаведзь" была асуджаная на Веронскім саборы 1184 г. З гэтага моманту пытанне пераходзіць з чыста дагматычнага ў юрыдычна-іерархічную плоскасць. Такая пропаведзь становіцца "ерассю непадпарадкавання", злачынствам "абразы ўлады", абсалютна непрымальным гвалтам у наскрозь іерархічным сяроднявечным грамадстве. Гэта сітуацыя была замацавана ў буле Папы Інакенція III у 1199 г.[41] Паказальна, што канчатковая забарона пропаведзі (любой) свецкім вернікам Папам Грыгорыям IX у 1228–1234 гг.[42] фактычна супала з канчатковым адлучэннем вальдэнсаў ад Царквы. Адсюль выцякаюць і пытанні узурпацыі вальдэнсамі знешняга выгляду манахаў, данатызм і права міран на здзяйсненне таінстваў.

3. Праблема беднасці як свядомага выбару "жыцця па Біблii", з чым таксама быў звязаны пратэст супраць неадпаведнасці рэальнага жыцця кліру апостальскаму ідэалу[43]. Гэтую праблему яшчэ больш абцяжарвала дваістае стаўленне Царквы да аскетызму: з аднаго боку, Царква адмоўна глядзела на яго праяўленні сярод міран, бо адразу ж бачыла ў ім ерась, а, з іншага боку, пра яго так многа казалася ў пропаведзях, што людзі пры любым падазрэнні на разбурэнне іх звыклага ладу жыцця кідаліся ў аскезу[44]. Групы такіх аскетаў стваралі "брацтвы міран", што ў рэшце рэшт і прыводзіла да ерасі.

Спроба адказу на апошнія два пытанні і прывяла да ўзнікнення вальдэнскага руху.

---

[40] Больш падрабязна гл. Philippe Buc, "Vox clamantis in deserto? Pierre le Chantre et la prédication laïque," *Revue Mabillon* 65, 1993, pp. 5–47.

[41] Grado Giovanni Merlo, *Eretici del Medioevo: temi e paradossi di storia e storiografia*, (Brescia: Morcelliana, 2011), 126.

[42] Nicole Bériou, "The Right of Women to Give Religious Instruction in the Thirteenth Century," in *Women Preachers and Prophets through Two Millennia of Christianity* (Berkeley: University of California Press, 1998), pp. 134–145, 137.

[43] Лада Цыпина, "Ересиархи и реформаторы: религиозное диссидентство позднего Средневековья как предпосылка Реформации," *Вестник Гуманитарного Факультета СПбГУТ им. Проф. М.А. Бонч-Бруевича* 8 (2016): стр. 133–140, 137–138.

[44] Пётр Бицилли, *Избранные труды по средневековой истории: Россия и Запад* (Москва: Яз. слав. культуры, 2006), 120.

Гэтая кніга – вынік маёй 16-гадовай працы над гісторыяй сярэднявечнага вальдызму. Яна складаецца з дзвюх частак: "тэарэтычнай", дзе я прыводжу гісторыю гэтага рэлігійнага руху ад моманту яго ўзнікнення да пачатку XV ст., збіраючы ў адным месцы дадзеныя шматлікіх крыніц і меркаванні даследчыкаў, і "практычнай", якая ўключае ў сябе пераклады тых самых крыніц, выкананыя мной з лаціны[45]. З галоўнымі маімі высновамі чытач можа азнаёміцца ў падсумаваннях напрыканцы кожнай з чатырох глаў "тэарэтычнай" часткі, а таксама ў заключэнні. Асобна падкрэслю, што я не прытрымліваюся меркавання пра раз'яднанасць вальдызму ў сярэднявечнай Еўропе[46], для якой увогуле уласціва разнастайнасць успрыняцця вусных рэлігійных вучэнняў[47]. Нягледзячы на ўсе разыходжанні ў другасных аспектах вальдэнскага вучэння, выразна прасочваецца адзінства руху у XII – пачатку XV ст. З аднаго боку, яно праяўлялася ў наяўнасці агульнага найвышэйшага органа кіравання (capitulum generale) абшчынай вальдэнсаў, якая складалася з вандроўных прапаведнікаў-настаўнікаў[48] і аселых вернікаў. З другога боку, агульнымі былі і зафіксаваныя яшчэ першымі інквізітарамі вальдэнскія дагматы, заснаваныя на літаральным успрыняцці перакладзенага імі Новага Запавету: апостальская беднасць, абавязковасць пропаведзі (у тым ліку і жанчынамі), існаванне толькі двух шляхоў пасля смерці – раю і пекла, адмаўленне гвалту і клятвы, данатызм. Адыход вальдэнсаў ад першапачатковай дактрыны аб недапушчэнні клятвы, валодання маёмасцю і гвалту быў выкліканы неабходнасцю прыстасавання да жыцця і асаблівасцей канкрэтнага рэгіёну.

Вальдэнсы становяцца ўсё бліжэй да Беларусі. Яшчэ ў літаратуры XVI ст. "Сарматыя" часта згадвалася як месца распаўсюджання вальдэнсаў[49]. Адзін з вальдэнскіх настаўнікаў, Сымон, паходзіў з Галіча (зараз Украіна, каля 300 км да мяжы з Беларуссю)[50]. Некаторыя даследчыкі лічылі, што само

---

[45] Для кнігі былі перакладзеныя большасць з апублікаваных (на 2022 год) тэкстаў/урыўкаў з тэкстаў датычна гісторыі вальдэнсаў абранага перыяду. Ставілася мэта падабраць максімальна разнастайныя тыпы крыніц з розных куткоў Еўропы, якія б адлюстроўвалі асаблівасці кожнага рэгіёну.

[46] Grado Giovanni Merlo, *Identità valdesi nella storia e nella storiografia. Studi e discussioni* (Torino: Claudiana, 1991); Kurt-Victor Selge, "Il Valdismo medievale tra conservazione e rivoluzione," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 133 (1973): pp. 3–16, 3.

[47] Marina Benedetti, "*Fratelli barlotti, cagnardi, sorelle in Cristo.* Identità valdesi nel Quattrocento," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 219 (2016): pp. 4–58, 43.

[48] Тут і далей слова "настаўнік" будзе выкарыстоўвацца для перакладу лацінскага тэрміна "магістр" як найбольш адпаведнае па сэнсе.

[49] Cesare G. De Michelis, "Il valdismo e le terre russe (secc. XIV-XVI)," *Revue de l'histoire des Religions* 217, no. 1 (2000): pp. 139–153, https://doi.org/10.3406/rhr.2000.1075, 143; Cesare G. De Michelis, *La Valdesia di Novgorod: «Giudaizzanti» e prima riforma: con un'appendice di studi e testi* (Torino: Claudiana, 1993), 25.

[50] Аляксандра Валодзіна і Мірослав Волощук, "Вальденський Магістр Symon de Galicz de Ungaria," *Галич. Збірник наукових праць* 8 (2023): 105–128.

імклівае пашырэнне пратэстантызму ў Беларусі магло быць абумоўлена ў тым ліку і добра падрыхтаванай ерасямі глебай[51]. На дадзены момант ерэтычныя рухі на тэрыторыі сярэднявечнай Беларусі не выяўленыя – але, магчыма, адкрыццё новых крыніц дапаможа асвятліць і гэтае пытанне.

Працу над кнігай я пачала падчас вучобы на кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Шчыра дзякую за падтрымку роднай кафедры і яе выкладчыкам, а таксама прафесару Аляксею Мартынюку і навукова-даследчаму гуртку Scriptorium, асабліва Ганне Дзягель, Але Спартак і Юлі Кухарчык. Мая сардэчная ўдзячнасць Факультэту вальдэнскай тэалогіі ў Рыме (Італія), а менавіта прафесару Паўлу Гаеўскаму, прафесару Даніэле Гарронэ і прафесару Лотару Фогелю, супрацоўнікам Фонду вальдэнскага культурнага цэнтра (Італія) Марко Фрацині, Энрыцы Морра і Габрыэлле Баллесіё, прафесару Лазанскага ўніверсітэта (Швейцарыя) Марцін Астарэро і прафесару ўніверсітэта ў Фрыбуры (Швейцарыя) Георгу Мадэсціну за навуковыя кансультацыі і доступ да багатай літаратуры. З нюансамі перакладаў з лацінскай мовы на беларускую мне дапамаглі прафесар Таццяна Рамза, Алесь Жлутка і Яўген Глінскі, за што я ім вельмі ўдзячная. Цудоўным афармленнем кніга абавязана таленавітаму дызайнеру Вользе Гаўрычэнка.

[51] Михаил Дмитриев, *Православие и Реформация: Реформационные движения в восточнославянских землях Речи Посполитой во второй половине XVI в.* (Москва: Изд-во Моск. гос. ун-та, 1990), 101.

Глава 1

Гістарыяграфія і крыніцы



Гістарыяграфія

Першыя кнігі, напісаныя пра гісторыю вальдэнскага руху (пачынаючы з XIV ст.)[1], зусім не ставілі за мэту спазнанне мінулага. Перад кожным аўтарам стаяла выразная задача даказаць тое ці іншае меркаванне. Пратэстанцкія "гісторыкі" выкладалі факты адпаведна з тэорыяй аб вальдэнсах як папярэдніках пратэстантаў[2]: падкрэсліваліся агульныя дагматы, замоўчвалася першапачатковае імкненне Вальдэса да прызнання Апостальскім Прастолам. Каталіцкія ж даследчыкі адмаўляліся прызнаваць пераемнасць паміж вальдэнсамі і пратэстантамі, для іх Вальдэс і па сёння застаецца "няспраўджаным Св. Францыскам Асізскім"[3] або Св. Дамінікам[4].

Паміж першапачатковай ідэалогіяй і статутам францысканцаў і "бедных каталікоў", а таксама "бедных ізноў далучаных" (так называліся протаордэны вальдэнсаў у пачатку XIII ст.) шмат агульнага[5]. Усе тры групы развіваліся прыкладна ў адзін час і ў аднолькавых умовах, існавала практыка пераходу членаў і нават маёмасці з аднаго ордэна ў другі. Гэта дае падставу некаторым аўтарам – прыхільнікам Рымскай Царквы – змяншаць значэнне ерэтычнага складніка вучэння першых вальдэнсаў, акцэнтуючы ўвагу выключна на агульных з каталікамі дагматах. Дададзім, што, як паказваюць апошнія даследаванні, сярэднявечныя вальдэнсы не падзялялі фундаментальнай пратэстанцкай канцэпцыі пра "выратаванне

---

[1] Takashi Shogimen, "William of Ockham and Conceptions of Heresy, C. 1250 – C. 1350," in *Heresy in Transition Transforming Ideas of Heresy in Medieval and Early Modern Europe* (London: Taylor and Francis, 2016), pp. 59–70, 63.

[2] Piotr Czarnecki, "Europejskie drogi do Reformacji (prereformacja)," *In Dziedzictwo kulturowe Reformacji w perspektywie polskiej i europejskiej: w 500-lecie wystąpienia Marcina Lutra: V Międzynarodowy Kongres Religioznawczy: Religie w dialogu kultur, Reformacja – Dialog – Kultura, 14–16 września 2017*, ed. by Krzysztof Pilarczyk and Wojciech Gajewski, 19–39. (Kraków: Wydawnictwo Antykwa, 2017), pp. 19–39, 19–20; Joshua Wingerd, "«Poor Preaching Protestants»: a Brief Discussion of the Waldenses," accessed 22.10.2022, https://www.academia.edu/11593267/Poor_Preaching_Protestants.

[3] Grado Giovanni Merlo, *Eretici ed eresie medievali* (Bologna: Il Mulino, 1989), 49; Gioacchino Volpe, *Movimenti religiosi e sette ereticali nella società medievale italiana* (secoli XI–XIV) (Roma: Donzelli Editore, 1997), 60.

[4] Jeffrey Burton Russell and Douglas W. Lumsden, *A History of Medieval Christianity: Prophecy and Order* (New York: Peter Lang, 2000), 138.

[5] Александра Володина, "Общины «Paupers Catholici» и «Paupers Reconciliati» в рамках религиозного подъёма второй половины XI – первой половины XIII века", в *Bractwa religijne w średniowieczu i w okresie nowożytnym (do końca XVIII w.)* (Kielce: Wydawnictwo Uniwersytetu Jana Kochanowskiego, 2014), pp. 19–31, 25.

верай"[6]. Гэта сведчыць у тым ліку і пра тое, што насамрэч сярэднявечныя вальдэнсы – гэта не "протапратэстанты", але і не каталікі, а самастойны рэлігійны рух, які нарадзіўся ўнутры Каталіцкай Царквы, але па шэрагу прычынаў выйшаў з яе. Відавочна, што ні адзін з гэтых падыходаў з-за сваёй тэндэнцыйнасці не можа даць усебаковай карціны гісторыі вальдызму.

Сваё адлюстраванне вальдэнскі рух знайшоў і ў мастацкай літаратуры – варта прыгадаць хаця б гістарычны раман Артура Сандстэдта "Вальдэс, прапаведнік ерасі" пра драматычнае супрацьстаянне свецкай і царкоўнай улады ў сярэднявечным Ліёне[7].

Для першых пратэстантаў, як і для каталікоў таго часу, у 1520–1540-х гг. вальдэнсы былі хутчэй вядомыя сваімі сувязямі з Багемскімі братамі (*гл. Раздзел "Вальдэнсы ў Цэнтральнай Еўропе і вучэнне Яна Гуса"*). Сумнавядомы аўтар "Молата ведзьмаў" Генрых Крамер – апалагет пераследавання жанчын пад выглядам абароны ад чараўніцтва – напісаў палемічны трактат пад загалоўкам "Шчыт для абароны Святой Каталіцкай Царквы супраць Вальдэнсаў або Пікардаў", які быў насамрэч скіраваны супраць Багемскіх братоў. Сітуацыя радыкальна змяняецца пасля крывавай разні ў Любероне ў 1545 г. (паўднёвы ўсход Францыі), калі за вальдэнсамі замацоўваецца слава роўнапакутнікаў (нягледзячы на тое, што яны аказвалі супраціў, у тым ліку і праз паспяховую апеляцыю да вышэйшай адміністрацыі)[8].

Развіццё Рэфармацыі ў Еўропе, і асабліва палеміка паміж каталікамі і пратэстантамі наконт крыніцы паходжання Рэфармацкай Царквы і веры, рэзка актуалізавала пытанне менавіта сярэднявечных ерасяў. І адзін, і другі бок бачылі ў ерэтыках папярэднікаў "рэфарматараў". Але калі для каталікоў вальдэнсы – гэта тыя ерэтыкі, змагацца з якімі ім далі запавет яшчэ Айцы Царквы, то для пратэстантаў яны – "страчанае звяно" паміж імі і самім Хрыстом. Пратэстанцкія аўтары старанна пераказваюць у якасці гістарычных звестак сярэднявечныя легенды, напрыклад, аб паходжанні вальдэнсаў прама ад Апосталаў[9]. Адной з першых работ такога кшталту з'яўляецца "Гісторыя вальдэнсаў", надрукаваная ў 1618 г. у Жэневе пад аўтарствам гугеноцкага святара Жана Поля Перына[10] па замове саміх

---

[6] Ottavio Palombaro, "Reality and Representations of the Doctrine of Justification in Early Waldensian Preaching," *Medieval Sermon Studies* 64, no. 1 (January 2020): pp. 77–84, https://doi.org/10.1080/13660691.2020.1815435, 83.

[7] Arthur Sundstedt, *Valdes – der Ketzerprediger: An der Schwelle zur Inquisition* (Kreuzlingen: Dynamis-Verlag, 1992).

[8] Euan Cameron, "From the Reformation to the Past," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 499–534, 502–505.

[9] C. H. Strong, *A Brief Sketch of the Waldenses* (Lawrence, Kan.: J.S. Boughton, 1893), 38.

[10] Jean Paul Perrin, *Histoire des Vaudois. Divisée en trois parties* (A Geneve: Pour Pierre & Iaques Chouët, 1569), https://play.google.com/store/books/details?id=ucQAAAAAcAAJ&rdid=book-ucQAAAAAcAAJ&rdot=1.

вальдэнсаў[11]. Гэта была першая спроба доказу гугеноцкай дактрыны, што ўзнікла падчас рэлігійных войнаў у Францыі, аб тоеснасці альбігойцаў і вальдэнсаў як сярэднявечных носьбітаў сапраўднай пратэстанцкай веры, якія былі несправядліва абвінавачаныя ў "дуалізме" і "маніхействе" каталіцкімі інквізітарамі і, такім чынам, з'яўляліся пакутнікамі за веру. Паколькі Перын працаваў у асноўным у найбагацейшым Жэнеўскім архіве, у яго працы згадана і прама працытавана вялікая колькасць крыніц па гісторыі вальдэнсаў, што заклала аснову для іх далейшага навуковага даследавання. Яшчэ больш старанна да вывучэння і публікацыі дакументаў паставіўся Джэймс Усшэр, які працаваў у бібліятэцы Дубліна (і па сёння дублінскі Трыніці Каледж захоўвае вялікую калекцыю вальдэнскіх манускрыптаў). Ён прапанаваў тэзіс пра вальдэнсаў як протапратэстантаў, якія прапаведавалі яшчэ да Вальдэса. А таксама спрычыніўся і да блытаніны з назвамі, сцвярджаючы, што вальдэнсы і альбігойцы – адно і тое ж, і іх варта адрозніваць ад нешматлікіх катараў і маніхеяў[12]. Увогуле Пратэстанцкая Царква бачыла вывучэнне ерасяў адной са сваіх асноўных задач, каб адшукаць у іх свае карані, прычым не толькі ў вальдызме, але напачатку нават у катарстве[13]. Гэтая спроба "састарвання" гісторыі пратэстантызму была абвергнутая ўжо ў XVII ст.[14]

У XIX ст. вельмі актыўна ў палеміку наконт евангельскай прыроды вальдэнскага руху ўключаюцца англіканскія пастары[15]. Пратэстанцкая Англія ў Ранні Новы Час, асабліва ў часы Пратэктарату, выступала на міжнароднай арэне на баку вальдэнсаў, калі супраць іх разгортваліся крыжовыя паходы. У Вялікабрытаніі выходзяць ілюстраваныя кнігі на некалькі соцень старонак кожная, аўтары якіх імкнуцца падкрэсліць як у назве, так і ў змесце "першасную чысціню"[16], месіянскі характар[17] і заўзятую барацьбу вальдэнсаў супраць папскага прастола[18]. З супрацьлеглай пазіцыі выступіў Андрэ Харвац,

---

[11] Benedetti, *"Fratelli Barlotti,"* 46.

[12] Cameron, "From the Reformation to the Past," 512–513.

[13] Daniel Walther, "Were the Albigenses and Waldenses Forerunners of the Reformation?," in *Andrews University Seminary Studies*, vol. 6.2, pp. 178–202, accessed 22.10.2022, https://digitalcommons.andrews.edu/auss/vol6/iss2/5, 186–190.

[14] Daniel Toti, "Sulle prime historiae di catari e valdesi: dall'unità alla diversità attraverso la repressione," in *Predicazione e repressione. Processi e letteratura religiosa* (Torino: Claudiana, 2018), pp. 41–64, 43–51.

[15] Hill Dawe Wickham, *An Historical Sketch of the Italian Vaudois: From the First Age of Christianity to the Present Day; with Some Account of Their Ancient Documents* (London: Seeley, Burnside & Seeley, 1847).

[16] William Stephen Gilly, *Waldensian Researches during a Second Visit to the Vaudois of Piemont: with an Introductory Inquiry into the Antiquity and Purity of the Waldensian Church* (London: C. J. G. & F. Rivington, 1831).

[17] Alexis Muston, *Israel of the Alps* (The Baptist Standard Bear, 2001).

[18] Adam Blair, *History of the Waldenses: With an Introductory Sketch of the History of the Christian Churches in the South of France and North of Italy, till These Churches Submitted to the Pope, When the Waldenses Continued as Formerly Independent of the Papal See*, vol. 1 (Edinburgh: A. Black, 1832).

каталіцкі біскуп Пінерола (Ламбардыя, горад-"брама" ў вальдэнскія даліны; менавіта ў яго юрысдыкцыі знаходзіўся цэнтр вальдызму Торэ Пелічэ), які ў 1836 г. апублікаваў у Парыжы сваю кнігу "Паходжанне вальдэнсаў і характар іх ранняй дактрыны" (перакладзена на італьянскую мову ў 1838)[19].

Іншая сітуацыя назіраецца ў нямецкамоўным рэгіёне (тэрыторыя сучасных Германіі, Аўстрыі і нямецкамоўных кантонаў Швейцарыі). У справе вывучэння сярэднявечных ерасяў на гэтых землях можна вылучыць дзве тэндэнцыі:

1. Актыўная публікацыя крыніц. Першы вялікі збор крыніц па гісторыі вальдэнсаў "Паведамленні пра гісторыю вальдэнсаў у сярэднія вякі" Вільгельма Прэгера[20] выходзіць ужо ў 1875 г. "Паведамленні пра гісторыі сектаў у сярэднія вякі", сабраныя і апрацаваныя Ігнацам фон Дзёлінгерам[21], актуальныя і да сённяшняга часу. У гэты перыяд вывучэнне вальдэнсаў яшчэ не было цалкам аддзелена ад вывучэння іншых ерэтычных рухаў, такіх, як катары і інш.[22] Іх не толькі разглядалі разам, але і часам блыталі. Недахопам гэтых зборaў з'яўляецца адсутнасць у іх анатацый да апублікаваных крыніц і тэксталагічнага разбору. Няма і ўказанняў на розначытанні ў рукапісах.

2. Распрацоўка гісторыі вальдэнсаў не толькі на сучасных нямецкіх землях, але і на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Звязана гэта было ў першую чаргу з тым, што распаўсюджанне вальдызму ў гэтым рэгіёне ішло поруч з нямецкай каланізацыяй, і носьбітамі ерасі былі ў абсалютнай большасці выпадкаў нямецкія перасяленцы. Гэтая тэндэнцыя набыла асаблівае развіццё ў XX ст.

У расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі спецыяльных работ, акрамя асобных кароткіх артыкулаў, прысвечаных вальдэнсам, не сустракаецца[23]. У фундаментальным даследаванні Мікалая Асокіна "Гісторыя альбігойцаў і іх часу"[24], у якой гісторыі вальдэнсаў адведзена дзве главы, але адсутнічае разгорнутая сістэма спасылак, некаторыя дадзеныя не пац-

---

[19] André Charvaz, *Origine dei valdesi e carattere delle primitive loro dottrine* (Torino: Presso G. Bocca, 1838).

[20] Wilhelm Preger, "Beiträge zur Geschichte der Waldesier im Mittelalter," in *Abhandlungen der Königlich-bayerischen Akademie der Wissenschaften München, Historische Classe*, vol. 13 (München, 1875), pp. 182–250.

[21] Ignaz von Döllinger, *Beiträge zur Sektengeschichte des Mittelalters* (München: Beck, 1890).

[22] Godfrid Edmund Friess, "Patarener, Begharden und Waldenser in Oesterreich während des Mittelalters," in *Österr. Vierteljahresschr. Für Katholische Theologie*, vol. 11 (Wien: Wilhelm Braumüller, 1872), pp. 209–272; Herman Haupt, *Waldensertum und Inquisition im südöstlichen Deutschland* (Freiburg: Mohr, 1890); Johann Jakob Herzog, *Die romanischen Waldenser: ihre vorreformatorischen Zustände und Lehren, ihre Reformation im 16. Jahrhundert und die Rückwirkungen derselben, hauptsächlich nach ihren eigenen Schriften dargestellt* (Halle: Eduard Anton, 1853).

[23] Laura Ronchi de Michelis, "Il movimento valdese nella storiografia russa e sovietica," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 144 (1978): pp. 71–76, 71.

[24] Николай Осокин, *История альбигойцев и их времени* (Москва: Изд-во "АСТ", 2000).

вярджаюцца ні па якіх крыніцах (напрыклад, пра тое, што нерухомая маёмасць "бедных каталікоў" стала матэрыяльнай асновай для дамініканскага ордэна[25]).

Вылучаюцца даследаванні Льва Платонавіча Карсавіна, які дэталёва займаўся пытаннямі рэлігійнага жыцця Італіі ў працах "Очерки средневековой религиозности" і "Основы средневековой религиозности в XII–XIII веках"[26]. Менавіта яго прапрацоўка рэлігійнага фонду вызначанага перыяду дае магчымасць высветліць месца вальдэнсаў у структуры сярэднявечнай рэлігійнасці (насельніцтва Ламбардыі мела вялікія арганізацыйныя навыкі, а пастаяннае суседства з іншымі сектамі рабіла для вальдэнсаў Італіі адасабленне проста неабходным[27]). Карыснымі бачацца яго меркаванні наконт пытання "ерэтычнасці" вальдэнства[28]. Погляды даследчыка наконт не толькі агульных момантаў, але і некаторых пытанняў унутранай структуры вальдэнскага руху (адміністрацыйныя функцыі "сабрата"[29]) не страцілі актуальнасці і па сённяшні дзень.

У другой палове XX ст. гістарыяграфія вальдэнскага руху выходзіць на якасна новы ўзровень. Адкрывае перыяд самы поўны на сённяшні дзень двухтомны "Збор вальдэнскіх крыніц" да пачатку XIV ст., падабраных, апрацаваных і каментаваных Жанам Ганэ[30]. Гэтае выданне выпраўляе ўсе недахопы папярэдніх зборнікаў дакументаў: адабраны крыніцы (і нават вытрымкі з іх), датычныя менавіта вальдэнсаў, да кожнай маецца ўступ і тэксталагічны разбор. Пабачыў свет манументальны збор каментаваных крыніц "Крыніцы па гісторыі вальдэнсаў" пад рэдакцыяй Аляксандра Пачоўскага і Курта-Віктара Зэльге[31]. Прыцягвае ўвагу пераклад на англійскую мову і каментарыі да найважнейшых з іх у "Ерасях Высокага Сярэднявечча. Выбраныя крыніцы, перакладзеныя і анатаваныя" Уолтэра Л. Вакефілда і Осціна Патэрсана Эванса[32]. Таксама пачынаючы з гэтага перыяду выданне і каментаванне становіцца неабходным складнікам вальдэнскай гістарыяграфіі, гэтым пытаннем займаюцца тыя ж спецыялісты, якія пішуць уласна гістарычныя даследаванні.

Некаторыя даследчыкі, напрыклад, Р. І. Мур, называюць гэты паварот 1960–1970 гг. "гістарыяграфічнай рэвалюцыяй". Менавіта тады на Захадзе было канчаткова даказана, што ерасі Высокага Сярэднявечча не выжылі

---

[25] Осокин, *История альбигойцев*, 219, 424.

[26] Лев Карсавин, "Очерки средневековой религиозности," в *История ересей: Сборник* (Москва: Изд-во "АСТ", 2007); Карсавин, *Сочинения*.

[27] Карсавин, "Очерки средневековой религиозности," 122.

[28] Карсавин, *Сочинения*, 34–36.

[29] Карсавин, *Сочинения*, 133.

[30] Giovanni Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1. Du IIIe Concile de Latran au Synode de Chanforan (1179–1532) (Torre Pellice: Claudiana, 1958); Giovanni Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2. De la fin du XIIe au début du XIVe siècle (Torino: Claudiana, 1998).

[31] Patschovsky and Selge, *Quellen*.

[32] Walter L. Wakefield and Austin Patterson Evans, *Heresies of the High Middle Ages: Selected Sources Translated and Annotated* (New York: Columbia University Press, 1991).

з часоў Антычнасці і не экспартаваліся з Візантыі (хоць яе ўплыў і нельга выключыць цалкам), а сталі вынікам паступовага развіцця заходнееўрапейскай цывілізацыі[33].

Тэматычна большасць работ канца XX ст. была звязана з асобнымі рэгіёнамі і перыядамі ў развіцці руху, хоць пачалі з'яўляцца і артыкулы, прысвечаныя асобным аспектам з яго гісторыі па-за геаграфічным ці храналагічным падзеламі. Напрыклад, праца Сюзанны Трыш "Вальдэнскі паварот да гвалту"[34] прымушае адмовіцца ад погляду на сярэднявечных вальдэнсаў як на абсалютных пацыфістаў, прыводзяцца прыклады ўжывання імі гвалту для самаабароны і нават для застрашвання ворагаў. Праводзяцца міждысцыплінарныя даследаванні. Так, Джаванні Мікалі пры аналізе сацыяльнай структуры руху выкарыстоўваў метады сацыялогіі[35]. Нават для абагульняючых прац па гісторыі вальдызму былі характэрны адыход ад разгляду толькі тэалагічна-дактрынальных праблем і зварот да эканамічна-сацыяльных пытанняў. Гэта асабліва яскрава назіраецца ў "Гісторыі вальдэнсаў" Амедэа Мальнара. Ён разглядае сістэму здабывання інквізітарамі грошай з вальдэнсаў, якая працавала дзесяцігоддзямі[36].

Значнае месца ў сучасных вальдэнскіх даследаваннях займае гендэрная гісторыя. Выклікана гэта тым, што ў раннім вальдызме жанчынам таксама дазвалялася прапаведаваць[37]. Актыўна абмяркоўваюцца ролі прапаведніц і простых верніц у руху, прычыны ўзнікнення і заняпаду феномена жаночай пропаведзі[38].

Асноўнымі сучаснымі цэнтрамі вывучэння вальдызму сталі Германія, Аўстрыя, Францыя і Італія – з прычыны таго, што гісторыя вальдызму з'яўляецца часткай іх гісторыі, а таксама Вялікабрытанія і Злучаныя Штаты Амерыкі. Пануе плюралізм падыходаў і пунктаў погляду, хоць па-ранейшаму адчуваецца падзел на каталіцкія і пратэстанцкія пазіцыі.

---

[33] Robert Ian Moore, "Inventer l'hérésie ? Discours polémiques et pouvoirs avant l'inquisition," in *Inventer l'hérésie ? Discours polémiques et pouvoirs avant l'inquisition* (Nice: Centre d'Études Médiévales, Faculté des Lettres, Art et Sciences Humaines, Université de Nice Sophia-Antipolis, 1998), pp. 263–269, 264.

[34] Susanna K. Treesh, "The Waldensian Recourse to Violence," *Church History* 55, no. 3 (1986): pp. 294–306, https://doi.org/10.2307/3166819.

[35] Giovanni Miccoli, "La storia religiosa," in *Storia d'Italia*, vol. 2. Dalla caduta dell'Impero Romano al secolo XVIII (Torino: Einaudi, 1974), pp. 431–1079.

[36] Amedeo Molnár, *Storia dei valdesi*, vol. 1. Dalle origini all'adesione alla Riforma (Torino: Claudiana, 1989), 116.

[37] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 80–81.

[38] Marina Benedetti, "The Bible, Women Heretics, and Inquisitors," in *The High Middle Ages* (Atlanta: SBL Press, 2015), pp. 83–99; Kenneth M. Mick-Evans, "A Bastion of Feminine Equality? Women's Roles in the Waldensian Movement" (dissertation, 2014), https://www.academia.edu/12235874/A_Bastion_of_Feminine_Equality_Womens_Roles_in_the_Waldensian_Movement; Claudia Pinagro, "Eroine marginali nella storia: donne Valdesi tra storia e storiografia," 2007, https://www.academia.edu/36568848/Eroine_marginali_nella_storia_Donne_Valdesi_tra_storia_e_storiografia; Shulamith Shahar, *Women in a Medieval Heretical Sect: Agnes and Huguette the Waldensians* (Woodbridge: Boydell & Brewer, 2001).

Найбуйнейшым французскім спецыялістам у гісторыі вальдызму на сённяшні дзень з'яўляецца Габрыэль Аўдызіё. Яму належыць кніга "Вальдэнскі рух: пераслед і выжыванне". Ён па-новаму ставіць пытанні паходжання руху, выбару найбольш прымальнага імя яго заснавальніка (Valdès або Vaudès замест прынятага раней у гістарыяграфіі Valdo[39]), сувязі руху з іншымі ерэтыкамі. Французскімі навукоўцамі сумесна з замежнымі калегамі вядзецца актыўная праца па публікацыі (у тым ліку і ў інтэрнэце) інквізітарскіх архіваў[40], напрыклад, Doat 25–26[41]. Найноўшыя выданні ўтрымліваюць падрабязныя тэксталагічныя разборы і розныя паказальнікі, што дазваляе раскрываць новыя, раней невядомыя, аспекты з гісторыі вальдэнсаў і выкарыстоўваць колькасныя метады для апрацоўкі вялікіх масіваў дадзеных.

Англамоўная гістарыяграфія прадстаўлена найбольшай колькасцю разнастайных даследаванняў, ад агульных манаграфій да кароткіх вузкаспецыялізаваных артыкулаў. Эван Камеран з'яўляецца аўтарам грунтоўнай працы па гісторыі ранняга этапа вальдэнскага руху "Вальдэнсы: Непрыняцце Святой Царквы ў Сярэднявечнай Еўропе". Менавіта яму належыць пастаноўка найбольш актуальных пытанняў: аб колькасці вальдэнсаў на пачатку іх існавання і аб іх сацыяльным складзе[42]. На жаль, параўнальна невялікі аб'ём работы не дазволіў аўтару разгледзець усе аспекты вальдэнскага жыцця падрабязна. На вальдэнскае пытанне звяртаюць увагу і такія буйныя спецыялісты ў духоўным жыцці Сярэднявечча, як Пётр Білер[43] і Джэфры Б. Расэл[44]. Цікавыя факты і новыя тэорыі ўтрымліваюць працы па гісторыі сярэднявечных ерасяў, у якіх той ці іншы аспект гісторыі вальдэнскага руху раскрываецца ў агульнаеўрапейскім кантэксце[45].

---

[39] Gabriel Audisio, *The Waldensian Dissent: Persecution and Survival, c. 1170 – c. 1570* (Cambridge: Cambridge University Press, 1999), 9.

[40] Jean Duvernoy, *Le registre d'inquisition de Jacques Fournier: (Eveque de Pamiers), 1318–1325,* vol. 43 (Paris: Mouton, 1978).

[41] Peter Biller, *Caterina Bruschi, and Shelagh Sneddon, Inquisitors and Heretics in Thirteenth-Century Languedoc: Edition and Translation of Toulouse Inquisition Depositions, 1273–1282* (Leiden, Boston: Brill, 2011).

[42] Euan Cameron, *Waldenses: Rejections of Holy Church in Medieval Europe* (Oxford, UK, Malden, MA: Blackwell Publishers, 2001), 57–60.

[43] Peter Biller, "Bernard Gui, Peter Zwicker, and the Geography of Valdismo or Valdismi," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 200 (2007): pp. 31–43; Peter Biller, *The Waldenses, 1170–1530: Between a Religious Order and a Church* (Ashgate, 2001) і інш.

[44] Jeffrey Burton Russell, *Dissent and Order in the Middle Ages: The Search for Legitimate Authority* (Eugene, Or.: Wipf & Stock, 2005); Jeffrey Burton Russell, *Dissent and Reform in the Early Middle Ages* (Berkeley: University of California Press, 1965) і інш.

[45] Richard Kieckhefer, *Repression of Heresy in Medieval Germany* (Liverpool: Liverpool University Press, 1979); Beverly Mayne Kienzle, "Religious Poverty and the Search for Perfection," in *Christianity in Western Europe c. 1100 – c. 1500* (Cambridge: Cambridge University Press, 2009), pp. 39–53; Malcolm David Lambert, *Medieval Heresy: Popular Movements from the Gregorian Reform to the Reformation*, 3rd ed. (Oxford, UK; Malden, MA: B.H. Blackwell Ltd, 2002); Gordon Leff, *Heresy in the Later Middle Ages: The Relation of Heterodoxy to Dissent* (Manchester: Manchester

У італьянскай гістарыяграфіі вылучаецца работа Карла Папіні пра першы этап вальдэнскага руху (пераважна на тэрыторыі Італіі і некаторых французскіх землях) "Вальдо з Ліёна і бедныя духам: першае стагоддзе вальдэнскага руху (1170–1270)"[46]. Яе каштоўнасць палягае ў канчатковым пераадоленні аўтарам "канфесійнага" падыходу да даследавання вальдэнскай гісторыі, непрадузятага параўнання Вальдэса і Францыска з Асізі. Акрамя даследавання непасрэдна гісторыі Італіі, італьянскія навукоўцы займаюцца распрацоўкай пытанняў існавання вальдэнсаў у іншых землях. Чэзарэ Дж. дэ Мікеліс прапаноўвае тэзіс пра ўплыў вальдэнсаў на ерась "жидовствующих" у Вялікім Ноўгарадзе[47]. Сфера інтарэсаў Ромола Чэнья палягае ў гісторыі вальдызму напярэдадні ўзнікнення гусізму[48]. Узаемасувязь гэтых двух рухаў з'яўляецца асновай для ўсёй не толькі рэлігійнай, але і ў цэлым духоўнай гісторыі польскіх і чэшскіх зямель, бо вальдэнсаў часта пазіцыянуюць як папярэднікаў і натхняльнікаў гусізму, тых, хто здзяйсняў для абшчын Чэшскіх братоў першае рукапалажэнне. Але ў далейшым больш моцны і шматлікі гусіцкі рух фактычна паглынуў рух вальдэнскі.

Актыўную працу праводзіць Франчэска Таска, якая паралельна з даследчыцкай дзейнасцю займаецца арганізацыяй навуковых канферэнцый і семінараў, выданнем часопісаў і музейнай работай. На мой погляд, найбольш значнай яе працай з'яўляецца аналіз аповеду Лаонскай хронікі пра "паварот" Вальдэса, які традыцыйна ўспрымаецца ў гістарыяграфіі некрытычна. Франчэска Таска прапануе разглядаць яго як збор клішэ, якія павінны былі прывесці чытача да высновы пра Вальдэса як пра "блазна", а не як пра новага апостала[49]. Важным мерапрыемствам у даследаванні сярэднявечнага вальдызму стала правядзенне канферэнцыі, прысвечанай 800-годдзю вальдэнскай сустрэчы ў Бергама (1218–2018, знакавы момант у развіцці руху); матэрыялы выйшлі ў верасні 2019 г.[50]

Нямецкамоўная школа вывучэння гісторыі вальдэнскага руху вядзе свой адлік з XIX ст. і на дадзены момант з'яўляецца адной з самых моцных у свеце. Асабліва варта адзначыць работы Аляксандра Пачоўскага. На базе яго даследаванняў вядуцца сучасныя распрацоўкі па гісторыі вальдэнсаў

University Press, 1999); Robert Ian Moore, *The Formation of a Persecuting Society: Authority and Deviance in Western Europe, 950–1250* (Carlton: John Wiley & Sons, 2008).

[46] Carlo Papini, *Valdo di Lione e i «poveri nello spirito». Il primo secolo del movimento valdese (1170–1270)* (Torino: Claudiana, 2002).

[47] de Michelis, "Il valdismo e le terre russe (secc. XIV–XVI),"; Cesare G. de Michelis, *La Valdesia di Novgorod.*

[48] Romolo Cegna, *Medioevo cristiano e penitenza valdese: il «Libro espositivo» e il «Tesoro e luce della fede» (parte seconda)* (Torino: Claudiana, 1994); Romolo Cegna, "Il valdismo medievale come religione penitenziale," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 150 (1981): pp. 37–48 і інш.

[49] Francesca Tasca, "La prima predicazione di Valdo? Riflessioni sul «Chronicon Universale» di Laon," in *Predicazione e repressione. Processi e letteratura religiosa* (Torino: Claudiana, 2018), pp. 181–201.

[50] Francesca Tasca, *Maggio 1218: il colloquio di Bergamo un dibattito agli inizi della storia valdese* (Torino: Claudiana, 2020).

у Багеміі, Сілезіі і на Памор'і; ён у сваіх работах прааналізаваў усе даступныя на той час крыніцы датычна сярэднявечных вальдэнсаў у пазначаных рэгіёнах, зрабіў высновы пра пераважна нямецкае паходжанне ерасі на гэтых землях, сацыяльны склад і адрозныя рысы веравучэння[51]. Спецыфікай сучасных даследаванняў з'яўляецца вывучэнне вальдэнскай абшчыны канкрэтнага невялікага рэгіёну; найбольш грунтоўнымі з'яўляюцца работы Георга Мадэсціна і Катрын Утц Трэмп датычна інквізіцыйных працэсаў супраць вальдэнсаў і ведзьмаў канца XIV – пачатку XV ст., што актуалізуе пытанне ўзаемасувязей гэтых дзвюх груп[52].

У асобную групу можна вылучыць вывучэнне вальдэнскіх абшчын на тэрыторыі сучасных Польшчы, Чэхіі (у лацінамоўных крыніцах таго часу – Багеміі) і Венгрыі. З чэшскіх даследчыкаў самая грунтоўная праца належыць Рудольфу Галінку[53], напісаная ў першай палове XX ст. Яна ўяўляе сабой кароткае (каля 150-і старонак) апісанне вальдэнскай прысутнасці на поўдні сучаснай Чэхіі. Каштоўнай у ёй з'яўляецца публікацыя пералік мясцовых вальдэнскіх вераванняў[54]. З апошніх прац варта адзначыць артыкул Евы Далежалавай, дзе аўтар пасля статыстычнага аналізу інквізітарскіх крыніц прыходзіць да нечаканай высновы, што, калі параўнаць адносную колькасць ерэтыкоў на душу насельніцтва, то ў Чэхіі інквізітар Гал з Касорыц выкрыў больш вальдэнсаў, чым Бернард Гі на поўдні Францыі (вядомым ерэтычным цэнтры)[55].

У Польшчы найбольш аўтарытэтнымі даследчыкамі тэмы з'яўляюцца Станіслаў Быліна[56] і Ярослаў Шыманьскі[57], якія актыўна займаюцца вывучэннем гісторыі хрысціянства на польскіх землях. Магдалена Агурэк

---

[51] Alexander Patschovsky, *Der Passauer Anonymus: Ein Sammelwerk über Ketzer, Juden, Antichrist aus der Mitte des 13. Jahrhunderts. Schriften der Monumenta Germaniae Historica* (Stuttgart: Hiersemann, 1968); Alexander Patschovsky, *Die Anfänge einer ständigen Inquisition in Böhmen: Ein Prager Inquisitoren-Handbuch aus der ersten Hälfte des 14. Jahrhunderts* (Berlin (West): de Gruyter, 1975) і інш.

[52] Georg Modestin, *Ketzer in der Stadt: der Prozess gegen die Straßburger Waldenser von 1400* (Hannover: Hahnsche Buchhandlung, 2007); Georg Modestin, "The Anti-Waldensian Treatise *Cum dormirent homines*: Historical Context, Polemical Strategy, and Manuscript Tradition," in *Religious Controversy in Europe, 1378–1536: Textual Transmission and Networks of Readership* (Turnhout: Brepols, 2013), pp. 211–229; Kathrin Utz Tremp, *Quellen zur Geschichte der Waldenser von Freiburg im Üchtland: 1399–1439* (Hannover: Hahn, 2000) і інш.

[53] Rudolf Holinka, "Sektářství v Čechách před revolucí husitskou," *Sb. Filosofické Fakulty Univ. Komenského* 3, no. 6 (1929): pp. 34–181.

[54] Holinka, "Sektářství v Čechách," 175–181.

[55] Eva Doležalová, "The Inquisition in Medieval Bohemia: National and International Contexts," in *Heresy and the Making of European Culture: Medieval and Modern Perspectives* (Farnham: Ashgate, 2013), pp. 299–311, 301.

[56] Stanisław Bylina, "Heretycy w społeczeństwie: świadectwo czeskich źródeł inkwizycyjnych z XIV wieku," *Kwart. Hist.* R. 89, № 1 (1982): pp. 105–117; Stanisław Bylina, "Wizerunek heretyka w Polsce późnośredniowiecznej," in *Odrodzenie i Reformacja w Polsce*, vol. 30 (Warszawa: PWN, 1985), pp. 5–24 і інш.

[57] Jarosław Szymański, *Ruchy heretyckie na Śląsku w XIII i XIV wieku* (Katowice; Kraków: Fund. «Zamek Chudów» ; Inst. Książki, 2007) і інш.

прысвяціла сваю дысертацыю сярэднявечным вальдэнсам Сілезіі[58]. Гэтыя работы развіваюць накірункі, зададзеныя невялікай публікацыяй Казіміра Дабравольскага "Першыя ерэтычныя секты ў Польшчы", напісанай яшчэ ў 1924 г.[59] Вальдэнсы "Заходняй Польшчы" – Сілезіі і Памор'я – разгледжаныя дастаткова грунтоўна сіламі вышэйпералічаных нямецкіх і польскіх аўтараў, а вось стан даследавання іх прысутнасці або адсутнасці на цэнтральных польскіх землях застаецца на ўзроўні работы 100-гадовай даўніны.

Вывучэнне вальдэнсаў Венгрыі з-за іх нешматлікасці развітае значна менш, але варта назваць аўтара спецыялізаванага артыкула на гэтую тэму Густава Хамана[60], дзе прааналізаваны ўсе зафіксаваныя выпадкі згадак пра іх на венгерскіх тэрыторыях і інквізітарскія працэсы мяжы XIV і XV стст.

Выкарыстанне статыстычных метадаў дазволіла выявіць новыя тэндэнцыі і факты датычна гендэрнага складу ерэтыкоў (жанчын аказалася менш, чым гэта прынята лічыць), суровасці пакарання і інш.[61] Напісанне абагульняючай работы з улікам новых дадзеных можа карэнным чынам змяніць наша ўяўленне пра ерэтычныя рухі ў Цэнтральнай Еўропе, якія дагэтуль існуюць у цені гусізму.

На дадзены момант цэнтр вальдэнскага руху знаходзіцца ў італьянскім горадзе Торэ Пелічэ правінцыі П'емонт. Выходзіць навуковае перыядычнае выданне "Бюлетэнь таварыства вывучэння вальдэнсаў" (Bollettino della Societá di Studi Valdesi, з 2016 г. – пад назвай "Рэфармацыя і рэлігійныя рухі" (Riforma e movimenti religiosi)), дзе публікуюцца актуальныя даследаванні па гісторыі не толькі вальдэнскага, але і іншых ерэтычных рухаў, а таксама пратэстантызму. З 1985 г. Фонд вальдэнскага культурнага цэнтра (Fondazione Centro Culturale Valdese) выдае навукова-папулярны часопіс "La beidana"[62]. З канца XIX ст. у рэгіёне гістарычнага рассялення вальдэнсаў "Вальдэнскія даліны" (Valli valdesi, на захадзе П'емонта) функцыянуе сістэма музеяў, прысвечаных гісторыі і культуры вальдэнсаў. Найбуйнейшы – "Вальдэнскі гістарычны музей" (Museo Storico Valdese), рэструктураваны і ўзбуйнены ў 2018 г. У Турыне, сталіцы П'емонта, працуе вальдэнскае

---

[58] Magdalena Ogórek, *Beginki i Waldensi na Śląsku i Morawach do końca XIV wieku* (Racibórz: Wydawn. i Agencja Wydawn. WAW Grzegorz Wawoczny, 2012).

[59] Kazimierz Dobrowolski and Kazimierz Chodynicki, "Pierwsze sekty religijne w Polsce," in *Reformacja w Polsce*, vol. R. 3, № 11/12 (Warszawa: T-wo do badania dziejow reformacji w Polsce, 1924), pp. 160–211.

[60] Gustav Hammann, "Waldenser in Ungarn, Siebenbürgen und der Slowakei," *Zeitschrift für Ostforschung: Länder und Völker im östlichen Mitteleuropa* Bd. 20, № 3 (1971): pp. 428–441.

[61] James Buchanan Given, "A Medieval Inquisitor at Work: Bernard Gui, 3 March 1308 to 19 June 1323," in *Portraits of Medieval and Renaissance Living: Essays in Memory of David Herlihy* (Ann Arbor: University of Michigan Press, 1996), pp. 207–232.

[62] La beidana – сельскагаспадарчы інструмент тыпу секатара, выкарыстоўваўся для высякання падлеску, а таксама як зброя ў Вальдэнскіх далінах. З XVII ст. стаў сімвалам супрацьстаяння пратэстанцкага насельніцтва П'емонта правячай Савойскай дынастыі.

выдавецтва "Claudiana". Маецца вышэйшая навучальная ўстанова – Факультэт вальдэнскай тэалогіі, якая была перанесена з Фларэнцыі ў Рым сынам вядомага вальдэнскага гісторыка і святара Эмілія Комба – Эрнэста Комба. Менавіта іх кнігі да сярэдзіны XX ст. з'яўляліся афіцыйным поглядам саміх вальдэнсаў на сваю гісторыю як на гісторыю сапраўднай хрысціянскай Царквы сярод "ганенняў няпраўды"[63]. Пытаннямі гістарыяграфіі першых вальдэнсаў займаецца Града Джавані Мерло, гэтаму ён прысвяціў двухтомнік "Вальдэнсы і сярэднявечныя вальдызмы" і некалькі асобных артыкулаў[64]. Менавіта гэты даследчык з'яўляецца аўтарам тэзіса пра адсутнасць адзінства вальдэнскага руху ў сярэднявечнай Еўропе[65].

У апошнія два дзесяцігоддзі ў заходняй гістарычнай навуцы назіраюцца дзве выразныя тэндэнцыі: "вяртанне" вальдэнсаў у гістарычны кантэкст – даследаванні адыходзяць ад разбору непасрэдна асаблівасцяў вальдэнскага руху і акцэнтуюцца на ўключэнні яго ў агульнагістарычныя рэаліі; а таксама знікненне карэляцыі паміж паходжаннем даследчыка, мовай работы і тэрытарыяльнай прывязкай даследавання.

У 2022 г. пабачыла свет найноўшая[66] калектыўная манаграфія, прысвечаная гісторыі сярэднявечнага вальдызму ад вытокаў да Рэфармацыі – "Спадарожнік вальдэнсаў у Сярэднія Вякі" пад рэдакцыяй прызнаных спецыялістаў Марыны Бенедэцці і Эвана Камерана[67]. Гэтая работа стала падсумаваннем паўтысячагадовай заходняй гістарыяграфічнай традыцыі вывучэння вальдызму. Расстаўлены многія кропкі над "і", абвергнуты некаторыя гістарыяграфічныя міфы. Разам з тым падкрэсленыя пытанні, якія застаюцца без адказу, прапанаваныя гіпотэзы, што адкрываюць новыя шляхі да вальдэнскіх даследаванняў.

У савецкай гістарыяграфіі не было створана спецыяльных прац, прысвечаных вальдэнсам, бо навукоўцы СССР перанялі тэзіс Фрыдрыха Энгельса пра тое, што "вальдэнская ерась" – гэта "рэакцыя патрыярхальных альпійскіх пастухоў на пранікненне да іх феадалізму"[68]. Асноўная ўвага

---

[63] Emilio Comba, *History of the Waldenses of Italy, from Their Origin to the Reformation* (London: Truslove & Shirley, 1889); Ernesto Comba and Luigi Santini, *Breve storia dei valdesi*, 5th ed. (Torino: Claudiana, 1966); Ernesto Comba, *Storia dei valdesi* (Torre Pellice: Claudiana, 1950).

[64] Grado Giovanni Merlo, "Pietro da Verona – San Pietro martire. Difficoltà e proposte per lo studio di un inquisitore beatificato," in *Culto dei santi, istituzioni, e classi sociali in età preindustriale* (L'Aquila: L U Japagre, 1984), pp. 471–488; Grado Giovanni Merlo, "Sul valdismo «colto» tra il XII e il XIV secolo," in *I valdesi e l'Europa* (Torre Pellice: Società di Studi Valdesi, 1982), pp. 67–98 і інш.

[65] Grado Giovanni Merlo, *Valdesi e valdismi medievali. Itinerari e proposte di ricerca* (Torino: Claudiana, 1984), 142.

[66] У красавіку 2024 г. у Італіі (Турын, вальдэнскае выдаведства Claudiana) таксама выйшла калектыўная манаграфія "Гісторыя вальдэнсаў: як новыя апосталы (XII–XV)" ("Storia dei valdesi: Come nouvi apostoli (secc. XII–XV)") пад агульнай рэдакцыяй Франчэскі Таскі, але ў мяне пакуль не было магчымасці з ёй азнаёміцца.

[67] Marina Benedetti and Euan Cameron, *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022).

[68] Фридрих Энгельс, *Крестьянская война в Германии* (Москва: Госполитиздат, 1952), 34.

надавалася ўзаемасувязям ерэтычных і народных рухаў[69], ролі беднасці і апазіцыі Каталіцкай Царкве як феадальнаму інстытуту[70]. Некаторыя савецкія і сучасныя аўтары паўтараюць распаўсюджаную памылку пра тоеснасць катараў і вальдэнсаў[71], абвергнутую нават у рускамоўнай гістарыяграфіі яшчэ да рэвалюцыі[72].

У беларускай гістарыяграфіі вальдэнскае пытанне ўвогуле не ўздымалася да гэтага часу.



[69] Виктор Рутенбург, *Народные движения в городах Италии XIV – начало XV в.* (Москва: Изд-во Акад. наук СССР, 1958).

[70] Сергей Сказкин, *Из истории социально-политической и духовной жизни Западной Европы в Средние века* (Москва: Наука, 1981), 126–127.

[71] Всеволод Керов, *Народные восстания и еретические движения во Франции в конце XIII – начале XIV века* (Москва: Изд-во Ун-та дружбы народов, 1986), 32; Сергей Нефедов, История Средних веков (Москва: ВЛАДОС, 1996), 55.

[72] Иоанн Арсеньев, *От Карла Великого до Реформации: (Историческое исследование о важнейших реформационных движениях в Западной церкви в течение восьми столетий)* (Москва: Типолитогр. т-ва И. Н. Кушнерев и К°, 1913), 173.

Крыніцы

Ужо на раннім этапе свайго развіцця рух вальдэнсаў прыцягваў да сябе даволі пільную ўвагу з боку грамадскасці, што абумовіла наяўнасць вялікай колькасці крыніц ужо ў першыя два з паловай стагоддзі існавання секты. Можна вылучыць пяць вялікіх груп крыніц[1]:

I. Дакументы, створаныя самімі вальдэнсамі

II. Заканадаўчыя крыніцы

1. *Булы Папы Рымскага Інакенція III* і яго наступнікаў.

2. *Пастановы гарадскіх і царкоўных уладаў, указы імператараў і каралёў і каноны царкоўных сабораў.* У іх коратка паведамляецца пра забарону таго ці іншага аспекту веравучэння (радзей), пра асуджэнне пэўных асоб як ерэтыкоў і выгнанне іх з горада/дзяржавы (часцей).

III. Тэалагічныя і палемічныя працы, а таксама працы дамініканцаў-інквізітараў, прысвечаныя шляхам барацьбы з ерэтыкамі

Гэтыя трактаты ўяўляюць сабой разгорнутыя апісанні "ерэтычных" сектаў, іх дактрыны і ладу жыцця; часам яны суправаджаюцца выкладаннем "правільнага каталіцкага меркавання" з выкарыстаннем цытат з Біблії і твораў Айцоў Царквы (auctoritas) і лагічных аргументаў (ratio). У ідэале з такіх тэкстаў можна атрымаць поўнае апісанне вераванняў любога руху. У рэчаіснасці гэтыя творы маюць вельмі сур'ёзныя абмежаванні і асаблівасці, якія неабходна ўлічваць пры аналізе. Галоўнае – яны пісаліся не з мэтай "даць праўдзівае апісанне той ці іншай групы", а з мэтай "абвяржэння памылак і выкрыцця ворагаў, якія пагражаюць Святой Рымскай Каталіцкай Царкве". Люсі Саквіль у сваім маштабным даследаванні "Ерасі і ерэтыкі" падсумавала найбольш частыя палемічныя прыёмы, якія выкарыстоўвалі каталіцкія аўтары пры нападах на сваіх апанентаў (яе даследаванне было дапоўнена пасля Эмануэлем Бэнам). Палемісты ўжывалі наступныя пастулаты:

1. Ерэтыкі неадукаваныя, а Рымская Царква мае веды ад Бога. Сярод наіўных падманутых вернікаў-ерэтыкоў вылучаюцца і іх лідары-сафісты[2].

---

[1] Падрабязнае апісанне будзе дадзена ў другой частцы кнігі асобна для кожнай крыніцы.

[2] Sackville, *Heresy*, 20; Emmanuel Bain, "Aux sources du discours antihérétique ? Exégèse et hérésie au XIIe siècle," in *Aux marges de l'hérésie inventions, formes et usages polémiques de l'accusation d'hérésie au Moyen Age* (Rennes: Presses Universitaires de Rennes, 2018), pp. 47–77, 59.

2. Ерэтыкі падзеленыя і варагуюць паміж сабой, а сапраўдная Царква павінна быць адзінай[3]. У дадатак, стварэнне класіфікацыі ерэтычных рухаў і пошук адрозненняў мог праводзіцца не столькі для рэальнага выкарыстання, колькі дзеля самога працэсу класіфікацыі і ўпарадкавання[4].

3. Кантраст знешняй чысціні ерэтыка і яго ўнутранага зла. Ерэтыкі – гэта лжывыя прарокі, апісаныя ў Бібліі[5].

4. Ерэтыкі – маральна слабыя, распусныя, аддаюцца праміскуітэту ў цемры[6].

5. Ерэтыкі дзейнічаюць таемна (нават калі прапаведуюць публічна)[7].

6. Тыповыя "характарыстыкі" ерэтыкоў:

a. Маленькія лісы[8];

b. Атрута і зараза[9];

c. Ідалапаклонства;

d. Сабакі, якія вяртаюцца да сваіх ванітаў[10].

Такія трактаты не былі ўнікальнымі па сваім змесце. У Сярэднявеччы не існавала паняцця аўтарства ў сучасным разуменні гэтага слова. Складальнікі новых трактатаў шырока карысталіся працамі сваіх папярэднікаў, не лічылі абавязковым ставіць спасылкі, кажучы сённяшняй мовай – займаліся плагіятам. У той час "пошук ісціны ў мінулым" цаніўся нашмат больш, чым вынаходніцтвы і адкрыцці, і нярэдка аўтары выдавалі свае думкі за "прачытаныя ў старых кнігах". Таму пры чытанні сярэднявечных рукапісаў вельмі часта сустракаюцца цалкам або часткова аднолькавыя пасажы. Напрыклад, працы Райнэрыя Саконі, Давіда Аўгсбургскага і Ананіма з Пасаў пабудаваныя па адной схеме (і часта з аднымі і тымі ж дадзенымі з аўтарскімі дапаўненнямі): Гісторыя паходжання – Характарыстыка самой

---

[3] Sackville, *Heresy*, 33–36.

[4] David Zbiral, "The Medieval Inquisitors' Theory of Sects: Towards One Religious Theory of Religion," accessed 22.10.2022, https://www.academia.edu/16594628/The_Medieval_Inquisitors_Theory_of_Sects_Towards_One_Religious_Theory_of_Religion.

[5] Sackville, *Heresy*, 38

[6] Sackville, *Heresy*, 57

[7] Sackville, *Heresy*, 59.

[8] Bain, "Aux sources du discours antihérétique ?," 61.

[9] Bain, "Aux sources du discours antihérétique ?," 63; Beverly Mayne Kienzle, "Holiness and Obedience: Denouncement of Twelfth-Century Waldensian Lay Preaching," in *The Devil, Heresy and Witchcraft in the Middle Ages: Essays in Honor of Jeffrey B. Russell* (Leiden: Brill, 1998), 270–272; Reima Välimäki, "Imagery of Disease, Poison and Healing in the Late Fourteenth-Century Polemics against Waldensian Heresy," in *Infirmity in Antiquity and the Middle Ages: Social and Cultural Approaches to Health, Weakness and Care* (London: Routledge, Taylor & Francis Group, 2016), pp. 137–152.

[10] Sackville, *Heresy*, 155

групы – Пералік памылак – Апісанне звычаяў[11]. Рэйма Валімакі адкрыў, што Пётр Цвікер карыстаўся творамі Ананіма з Пасаў, Давіда Аўгсбургскага, Манеты Крэмонскага і нават чытаў перапіску паміж аўстрыйскімі і італьянскімі вальдэнсамі, якая ўтрымлівае "Кнігу Выбраных"[12].

Шырокае распаўсюджанне палемічнай літаратуры можна патлумачыць тым, што каталіцкія аўтары глядзелі на ерась як на "памылковае тлумачэнне Біблii". Існавала перакананне, што калі пытанне будзе правільна патлумачана, ерэтыкі ўсё зразумеюць і вернуцца ў лона Рымскай Царквы. У той час як для вальдэнсаў іх вучэнне было больш практычным пытаннем, давала інструкцыі для штодзённага жыцця[13].

Кантэкстуальны аналіз палемічных трактатаў, якія ўзніклі ў Паўночнай Італіі ў сярэдзіне XIII ст., паказвае іх у тым ліку "палітычную" замову: "Пакуль гібеліны абаранялі ерэтыкоў, у гарадах, адваяваных гвельфамі, папская інквізіцыя жорстка пераследавала іх. У гэтай сітуацыі расквітнела і напісанне антыерэтычных трактатаў, падрыхтаваных па схаластычным метадзе («памылкі» ерэтыкоў супрацьпастаўляліся праўдзе вучэння Каталіцкай Царквы)"[14].

10. Матэрыялы інквізітарскіх допытаў

Падчас працы з гэтым тыпам крыніц неабходна мець на ўвазе, што выкладзеная ў іх вальдэнская дактрына з'яўляецца не сістэмай поглядаў саміх зняволеных, а будуецца на аснове інквізітарскага апытальніка, што можа абумовіць яе няпоўнасць (не спыталі – не сказалі). Базавы апытальнік паходзіць з Францыі з пачатку XIII ст., уласна кажучы, ад самага пачатку зараджэння інквізіцыі. Звычайна ён меў наступную структуру:

1. Ці ведаў/бачыў ерэтыкоў;
2. Ці быў з імі разам і пры якіх абставінах;
3. Ці верыў, што яны – "добрыя людзі";
4. Ці меў ерэтычныя кнігі ці мошчы спаленых[15];
5. Ці дапамагаў ерэтыкам;
6. Ці атрымліваў што ад ерэтыкоў.

Такі апытальнік відавочна скіраваны больш на выяўленне паслядоўнікаў ерэтыкоў і іх дзеянняў, але пакідае па-за кадрам іх вераванні і ўнутраную матывацыю. Пералом у сітуацыі адбываецца напрыканцы XIV ст.,

---

[11] Sackville, *Heresy*, 152.

[12] Reima Välimäki, *Heresy in Late Medieval Germany: The Inquisitor Petrus Zwicker and the Waldensians* (Woodbridge: York Medieval Press, 2019), 17.

[13] Raoul Manselli, "Una 'Summa auctoritatum' antiereticale (Ms 47 della Bibliothèque Municipale di Albi)," *Atti della Accademia nazionale dei Lincei* 28/6 (1985): pp. 324–397, 332.

[14] Kathrin Utz Tremp, "Ein Ausweg aus der Kontroverse um den «Katharismus»?," *Deutsches Archiv für Erforschung des Mittelalters* 77 (2021): pp. 651–668, 654.

[15] Апошняе фактычна не ўласціва вальдэнсам.

калі Пятром Цвікерам і яго паплечнікам Марцінам Пражскім[16] распрацоўваецца новы апытальнік, ужо больш скіраваны не на дзеянні, а на перакананні[17].

Таксама варта заўважыць, што царкоўныя тэксты могуць як завышаць, так і заніжаць ролю, моц і распаўсюджанне ерасяў[18], але сама колькасць гэтых тэкстаў сведчыць пра вялікую ролю вальдэнсаў[19]. Сучасныя даследчыкі ў прынцыпе настойваюць на максімальна крытычным стаўленні да інквізіцыйных матэрыялаў і вельмі пільнай увагі да абставінаў напісання працы і нават моўных канструктаў, якія ўжывае аўтар[20]. Зафіксавана, што многія інквізітары мелі асабісты маёмасны інтарэс[21]. Напрыклад, у фінансавай справаздачы інквізітара Францыска Пакапалья ад 1307 г. прама запісана, што пры ўсіх яго выдатках (коні, каб дабрацца да аддаленых далінаў; дрэва для спалення ерэтыкоў-рэцыдывістаў; грашовая ўзнагарода тым ерэтыкам, што выдавалі адзінаверцаў; харчаванне вязняў і самога інквізітара і г.д.) прыбытак ад канфіскацый быў большым[22]. На поўдні Францыі прыбытак мог пераважаць выдаткі ў восем разоў[23]. Такую сітуацыю можна вытлумачыць тым фактам, што непасрэдна аплата працы інквізітараў была вельмі нізкай[24].

На следства ўплывала і палітычная сітуацыя ў пэўным рэгіёне. Інквізіцыйныя працэсы маглі спрыяць і ўмацаванню палітычнай кар'еры асобных біскупаў[25]. Нават запісы матэрыялаў допытаў дайшлі да нас

---

[16] Таксама вядомы як "Марцін з Амберга".

[17] Välimäki, *Heresy in Late Medieval Germany*, 6, 132, 136, 258.

[18] Peter Biller, "Christians and Heretics," in *Christianity in Western Europe c. 1100 – c. 1500* (Cambridge: Cambridge University Press, 2009), pp. 170–186, 185.

[19] Всеволод Керов, "Народное еретическое движение бегинов юга Франции и Петр Иоанн Оливи," в *Французский ежегодник, 1968* (Москва: Акад. наук СССР, Ин-т истории, 1970), стр. 5–33, 33.

[20] David Zbiral, "Inkviziční záznamy jako pramen historického bádání: Možnosti, omezení, strategie čtení," *Studie a Eseje* 2 (2012), https://www.academia.edu/37846101/Inkviziční_záznamy_jako_pramen_historického_bádání_Možnosti_omezení_strategie_čtení_Inquisitorial_Records_as_a_Historical_Source_Their_Potential_Limitations_and_Strategies_of_Reading.

[21] Peter Biller, "Waldensians in the Inquisition Registers in the Bibliothèque Nationale de France, Collection Doat Manuscrits 21–26," in *Predicazione e repressione. Processi e letteratura religiosa* (Torino: Claudiana, 2018), pp. 23–39, 29; Dinora Corsi, "Per la storia dell'inquisizione a Firenze nella seconda metà del secolo XIII," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 132 (1972): pp. 3–16, 4; Kieckhefer, *Repression*, 71.

[22] Gerolamo Biscaro, "Inquisitori ed eretici lombardi (1292–1318)," in *Miscellanea di Storia Italiana* (Torino, 1922), pp. 448–557, 528–557, 548.

[23] Simone Balossino and Jacques Chiffoleau, "Valdesi e mondo comunale in Provenza nel Duecento," in *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca* (Torino: Claudiana, 2009), pp. 61–102, 92–93.

[24] James Buchanan Given, *Inquisition and Medieval Society: Power, Discipline, and Resistance in Languedoc* (Ithaca, NY: Cornell University Press, 2018), 196–197.

[25] Reima Välimäki, "Bishops and the Inquisition of Heresy in Late Medieval Germany," in *Dominus Episcopus: Medieval Bishops between Diocese and Court* (Stockholm: Kungl. Vitterhets Historie och Antikvitets Akademien, 2018), pp. 185–206, 194–95.

у скажоным выглядзе: інквізітар мог іх выпраўляць як лічыў патрэбным[26], нягледзячы на тое, што, у адрозненне ад палемічных твораў, матэрыялы допытаў з'яўляюцца ўнутранай дакументацыяй[27].

З публікацыяй інквізітарскіх матэрыялаў у поўным аб'ёме (а не асобных цытат і вытрымак, як гэта было раней) з'явілася магчымасць праводзіць іх больш глыбокі аналіз, у тым ліку статыстычны. Адным з найлепшых прыкладаў з'яўляецца праца Жана-Поля Рэ, прысвечаная інквізітарскім пратаколам 1245–1246 гг.[28] Галоўная выснова аўтара – інквізітараў насамрэч цікавіла не выкрыванне ерасі і знаходжанне ўсіх магчымых ерэтыкоў, а канструяванне абвінавачання супраць вузкага кола ўплывовых сем'яў. Да прыкладу, пры адказе на тыповае інквізітарскае пытанне "а хто яшчэ ўдзельнічаў у гэтым?" пасля пералічэння некалькіх цікавых следчым прозвішчаў яны спынялі допыт і запісвалі ў пратакол фразу "і іншыя", замест таго, каб падрабязна апытаць усіх і занатаваць усе дадзеныя[29]. Усё паказвае на тое, што гэты інквізіцыйны працэс быў палітычна заказаны. Прычыны такога заказу на дадзены момант невядомыя, але ўжо сам факт яго наяўнасці змяняе наш погляд на верагоднасць дадзеных, якія мы атрымліваем з гэтага тыпу крыніц.

D. Хронікі

Галоўная каштоўнасць хронік палягае ў дакладнай храналагічнай і геаграфічнай прывязцы пэўных груп і асоб вальдэнсаў.

Асобна стаіць "Песня пра Альбігойскі крыжовы паход", напісаная трубадурам Гіёмам Тудэльскім на старафранцузскай мове, якая ўтрымлівае павярхоўную згадку пра вальдэнскі рух: крыжакі выпраўляюцца супраць патарэнаў[30] і вальдэнсаў[31].

---

[26] Caterina Bruschi, *The Wandering Heretics of Languedoc* (Cambridge: Cambridge University Press, 2009), 21.

[27] Bruschi, *The Wandering Heretics*, 37.

[28] Jean-Paul Rehr, "Re-Mapping the 'Great Inquisition' of 1245–1246: The Case of Mas-Saintes-Puelles and Saint-Martin-Lalande," *Open Library of Humanities* 5, no. 1 (2019): pp. 1–52.

[29] Rehr, "Re-Mapping the 'Great Inquisition'," 36–38.

[30] Першапачаткова патарэны – прадстаўнікі рэлігійнага антыцаркоўнага руху на поўначы Італіі, які распачаўся ў Мілане ў XI ст. Паступова так сталі называць розных ерэтыкоў і проста тых, хто выказваў непадпарадкаванне царкоўным уладам. Gabriele Zanella, *Itinerari ereticali. Patari e Catari tra Rimini e Verona* (Roma: Istituto storico italiano per il Medio Evo, 1986), 13.

[31] Henri Gougaud and Michel Zink, *La Chanson de la croisade albigeoise: texte original* (Paris: Librairie générale française, 1989), 47. Даступна ў перакладзе на рускую мову: Гильем Тудельский, *Песнь об Альбигойском Крестовом походе* (Москва: Квадрига, 2010).

Удадрозненне ад многіх іншых рэлігійных сярэднявечных рухаў, якія ў той ці іншы перыяд былі прызнаныя Апостальскім Прастолам ерэтычнымі, само існаванне руху вальдэнсаў ніколі не выклікала ў даследчыкаў сумневу. У той час, калі, да прыкладу, "ерасі 1000 года" маглі разглядацца як сацыяльныя выступленні, страх перад канцом свету, сведчанне ўплыву багамілаў з Усходу, палітычная барацьба паміж групоўкамі знаці або паміж біскупамі і манастырамі, вальдэнсы ў вачах даследчыкаў (за выключэннем прац радыкальных паслядоўнікаў Фрыдрыха Энгельса) ніколі не гублялі "апостальскага" элемента ў сваёй гісторыі. Больш за тое, іх гісторыю можна прасачыць амаль без перапынку на працягу 850-і гадоў. Згадкі пра вальдэнсаў сустракаюцца ў вялікай колькасці ўжо даследаваных і апублікаваных крыніц, і, верагодна, многія яшчэ чакаюць сваіх першаадкрывальнікаў у бібліятэках і архівах. Такім чынам, гісторыя вальдэнскага руху – гэта своеасаблівая "чырвоная нітка", якая праходзіць праз Высокае і Позняе Сярэднявечча. Гэта значыць, што і гісторыю астатніх падобных рухаў і груп можна вывучаць з апорай і ў дачыненні да гісторыі вальдэнсаў.

З гэтага вынікае і важнасць удасканалення нашых ведаў пра іх, "патаўшчэння" гэтай чырвонай ніткі. Такое ўдасканаленне магчыма дзякуючы не толькі адкрыццю новых крыніц, але і развіццю і пашырэнню метадалогіі вывучэння ўжо вядомых матэрыялаў.

Гісторыкі многіх краін бачаць і разумеюць важнасць вальдэнскай тэматыкі, ілюстрацыяй чаму з'яўляецца найбагацейшая гістарыяграфія. Унёскам у яе з'яўляецца і гэта кніга, якая прапаноўвае не толькі шырокі агляд вальдэнскай гісторыі для беларускамоўнага чытача, але і адказы на некаторыя нявысветленыя раней пытанні, якія, у сваю чаргу, ставяць новыя пытанні для гісторыкаў будучыні.

Глава 2

"Класічны" вальдызм



Зараджэнне руху (1170-я гг. – 1215 г.)

Назва руху

Заснавальнікам руху лічыцца заможны жыхар Ліёна Вальдэс. Гэты факт пазней аспрэчваўся самімі вальдэнсамі (*гл. Раздзел "Горныя даліны Заходніх Альпаў"*) і некаторымі палемістамі[1], але пацвярджаецца гістарычнымі крыніцамі[2], такімі, як трактат сучасніка Вальдэса, знакамітага паэта, філосафа і тэолага Алана Лільскага "Супраць вальдэнсаў": "Яны называюцца вальдэнсы ад іх ерэсіярха, чыё імя – Вальдэс (Waldus)"[3]. У некаторых крыніцах гэтае імя ўжывалася і ў іншых формах, часцей за ўсё – Valdesis/Valdesius[4]. Менавіта так называе свайго былога паплечніка звернуты ў каталіцтва вальдэнс Дуранд з Оскі[5].

Некаторыя навукоўцы сцвярджаюць, што Valdesius – не імя, а прыметнік, і азначае жыхара vaude (і вытворныя ад яго – Vaux, Vaulx etc.), г.зн. урадлівай узгорыстай вясковай мясцовасці, правінцыі, або таго, хто паходзіць з яе. Слова vauda і цяпер захавалася ў некаторых назвах п'емонцкіх мястэчак[6]. Вядома, што ў эпоху, калі яшчэ не існавала прозвішчаў або сямейных імёнаў, абазначэнні паходжання з пэўнага рэгіёну эвалюцыянавалі ў прозвішчы, а за імі ў асабістыя імёны. І калі імя Вальдэс абазначае яго паходжанне (што падаецца верагодным), то ён яго атрымаў пасля пераезду ў Ліён – горад, які ва ўсіх дакументах пазначаўся як яго "родны". Назву Vaux носіць і памежны з Ліёнам швейцарскі кантон – некаторыя даследчыкі мяркуюць, што Вальдэс мог прыехаць адтуль[7].

---

[1] Напрыклад, Мішэль Жа лічыць, што вальдызм існаваў і да Вальдэса, але пад іншай назвай: раней вальдэнсы – гэта паслядоўнікі Пятра з Бруі і Генрыка. Michel Jas, *Le saint, le pauvre et l'hérétique: essai critique sur François d'Assise, le «saint,» le modeste Valdès de Lyon, le «pauvre» et le curieux Nicétas, théologien du catharisme, presque irréel* (Maison-Laffitte: Ampelos Editions, 2017), 7.

[2] З іншага боку, шукаць карані назвы ерасі ў імені яе заснавальніка было палемічнай традыцыяй, распачатай яшчэ Ісідорам Севільскім (падрабязней гл. Sackville, *Heresy*, 184). Магчыма, многія цытаваныя ніжэй аўтары знаходзіліся пад яго ўплывам.

[3] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 103. [II.v]

[4] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 37; vol. 2, 15; Patschovsky and Selge, *Quellen*, 29 etc.

[5] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 42. [I.iii]

[6] Papini, *Valdo di Lione*, 85.

[7] Heinrich Fichtenau, *Heretics and Scholars in the High Middle Ages: 1000–1200* (University Park: The Pennsylvania State University Press, 2010), 67.

Імя "Пётр", пад якім заснавальнік вальдызму вядомы цяпер, зусім не сустракаецца ў тагачасных крыніцах. Першая згадка – у вальдэнскім трактаце "Кніга Выбраных" (пачатак XIV ст.) у сувязі з легендай аб "сапсаванні" Царквы ў выніку "Канстанцінавага дару", паходжанні вальдэнсаў ад той часткі, што не скампраметавала сябе супрацоўніцтвам з Папам Сільвестрам. Імя "Пётр" павінна было адсылаць чытача да Святога Пятра, які заснаваў першапачатковую, "апостальскую" Царкву, прамымі і адзінымі пераемнікамі якой лічылі сябе вальдэнсы. У згаданай кнізе знаходзіцца і перайначанае імя "Вальдэс" – "з Валле" (Petrus de Walle)[8]. Нягледзячы на большасць сучасных даследаванняў, і па сёння ў некаторых навуковых выданнях можна сустрэць памылковыя дадзеныя, што вальдэнсы – гэта "людзі горных далін" Італіі, а Пётр з Ліёна проста запазычыў іх дактрыну[9].

Існавала і альтэрнатыўнае напісанне імя Вальдэса – Gualdensis. Яго ўжывалі Сальва Бурчы (1235 г.) і Пётр Пакутнік з Вероны (1235–1240 гг.)[10]. Гэта форма адносіцца да шэрагу Vald=Wald=Gualdo (лес); і цяпер сустракаецца ў назвах населеных пунктаў у італьянскіх Альпах. Першым паралель паміж іменем Вальдэс і словам "лес" зняважліва праводзіць манах-палеміст Бернард з Фанкода: "выпадкова абраўшы сабе імя з прагнозам на будучыню, былі названыя вальдэнсамі (valdenses), імя, якое, пэўна, паходзіць ад «глухі лес», паколькі яны ўсё глыбей праваліліся ў прорву і глухую цемру памылак"[11].

Але саманазва ў вальдэнсаў была іншая (пазітыўная, у адрозненне ад знешняй, негатыўнай)[12] – часцей за ўсё ў XIII ст. яны называлі сябе "беднымі духам" (pauperes spiritu), што найлепшым чынам раскрыта ўжо ў працы інквізітара Стэфана дэ Бурбона, напісанай у Ліёне ў 1249–1261 гг. "Самі ж сябе называюць «беднымі духам», бо Бог сказаў «дабрашчасныя ўбогія духам» (Мф 5:3)[13]. Сапраўды, яны бедныя духам – у духоўных бласлаўленнях і ў Духу Святым"[14]. Ён жа ўказвае і на іншую, распаўсюджаную ўжо больш сярод інквізітараў, назву: "Яны таксама называюцца «бедныя з Ліёна», паколькі ў гэтым горадзе яны распачалі сваё жыццё ў беднасці"[15]. Града Джавані Мерло прыводзіць поўны спіс саманазваў сярэднявечных вальдэнсаў (тут даецца пераклад з лаціны): "тыя новай веры"; "добры народ"; "добрыя людзі, бо не падманваюць і не клянуцца"; "спазнаныя людзі, якія трымаюцца апостальскіх законаў"; "апостальскі народ і спазнаныя людзі"; "бедныя Хрыста і тыя, хто трымаецца праўдзівай дарогі"; "добрыя людзі,

---

[8] Döllinger, *Beiträge*, 357. [V.iii.b]

[9] Przemysław Bieniek, "Myśl Kacerska i Ruch Dysydencki na przykładzie Waldensów," *Biuletyn Biblioteki Jagiellońskiej*, 2006, pp. 83–88, 83.

[10] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 66 [II.xi], 80. [II.xii]

[11] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 65. [II.ii]

[12] Benedetti, *"Fratelli Barlotti,"* 44.

[13] Цытаты з Біблііі даюцца паводле перакладу Васіля Сёмухі.

[14] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 209. [II.xiv.a]

[15] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 209. [II.xiv.a]

якія трымаюцца прамой дарогі паводле Евангелляў і Боскага Пісання/законаў Бога і апосталаў/выратавальных законаў і дарогі, якіх трымаўся Хрыстос"[16]. Канатацыя гэтых назваў таксама відавочная: арыентацыя на Пісанне і на vita apostolica (апостальскае жыццё).

Яшчэ адзін славуты інквізітар-дамініканец, Бернард Гі, указвае на іншую назву – "неабутыя" (insabbatati)[17]. Сустракаецца варыянт "абутыя ў сандалі", "таму што калісьці ад самага пачатку вальдэнскія «дасканалыя»[18] паказвалі спецыяльны знак, як быццам бы зразаючы верхнюю частку абутку, і гэтым знакам яны ад іншых сваіх паплечнікаў (complicibus) адрозніваліся"[19].

Тэрмін "секта" для апісання вальдэнсаў пачалі прымяняць іх каталіцкія апаненты пачынаючы ўжо з Гідэфрыда з Асэра з канца XII ст.[20]

Такім чынам, найбольш прыдатнай формай імені заснавальніка руху ўяўляецца "Вальдэс" ад лацінскага Valdesius. Можна зрабіць выснову, што імя гэта ўласнае, бо яго значэнне як паказчыка паходжання з'яўляецца ў крыніцах параўнальна позна. Імя "Пётр" адназначна позняе і мае ідэалагічна-пазітыўны характар, як і спробы вывесці "Вальдэса" ад прыметнікаў "з вёскі" ці "з лесу", якія маюць характар ідэалагічна-негатыўны. У любым разе яны не першапачатковыя і не павінны ўжывацца ў навуковым дыскурсе.

Дата ўзнікнення руху

Пачаткі вальдэнскага руху апісаны не толькі ў хроніках, але і ў шматлікіх успамінах і палемічных працах тагачасных аўтараў[21], згадваюцца ў каралеўскіх загадах[22]. Асноўнымі лічацца наступныя 5 крыніц:

1. "Споведзь веры" (confessio) самога Вальдэса (1180 г.)[23].
2. "Пра справы курыі" Вальтэра Мэпа (1181–1183 гг.).

---

[16] Grado Giovanni Merlo, "Identità religiose tra le popolazioni delle Alpi occidentali nel basso Medioevo," *Studi di Storia Medioevale e di Diplomatica – Nuova Serie* 10 (2018): pp. 85–106, https://riviste.unimi.it/index.php/SSMD/article/view/9715, 94.

[17] Дакладны пераклад гэтага слова невядомы. Таксама можа перакладацца як "суботнікі".

[18] Пад "дасканалым" (perfectus) хутчэй за ўсё трэба разумець не столькі "ідэальнага", колькі "закончанага", "таго, які прайшоў поўны абрад пасвячэння". Падрабязней гл. Sackville, *Heresy*, 201.

[19] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis haeretica pravitatis* (Paris: Alphonse Picard, 1886), 245. [III.vi.2]

[20] Grado Giovanni Merlo, "Pauperes spiritu valdesi," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 219, no. 133 (2016): pp. 15–26, 17.

[21] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 64–90, [II.ii] 126–128 [I.iv.f, e]; Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 83–98 [II.xiii], 140–144 [II.xvii].

[22] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 91–94 [I.iv.a-c], 141–142 [I.iv.h].

[23] Kurt-Victor Selge, *Die ersten Waldenser*, vol. 2. Der *Liber antiheresis* des Durandus von Osca (Berlin: de Gruyter, 1967), 3–6. [I.ii.a]

3. "Наконт Апакаліпсіса" Гідэфрыда з Асэра (1181–1184 гг.)[24].

4. Лаонская хроніка (да 1220 г.)[25].

5. "Пра сем падарункаў Святога Духа" Стэфана дэ Бурбона (1251–1261 гг.)[26].

Між тым шматлікія пытанні застаюцца дагэтуль спрэчнымі. Сярод іх – дакладная дата паходжання руху. Сучасныя вальдэнсы вядуць адлік сваёй гісторыі ад "павароту" (conversio) Вальдэса[27]. Ён меў жонку і дачок і вёў цалкам свецкі лад жыцця, але раптоўна раздаў палову сваёй маёмасці бедным, палову пакінуў жонцы і на пасаг дочкам, а сам сышоў жыць на вуліцу і прасіць міласціну, прымаючы яе ад усіх, акрамя сваёй жонкі. Прычыны гэтага ўчынку застаюцца невядомымі, бо тагачасныя крыніцы прыводзяць сведчанні, падобныя хутчэй да традыцыйных жыццяў святых, чым да аповедаў пра рэальныя падзеі, да таго ж яны розняцца між сабой. Найбольш дэталёвым з'яўляецца апісанне з Лаонскай хронікі: "Усё яшчэ працягваўся 1173 г. ад Яго Увасаблення, быў у Ліёне гараджанін, якога звалі Вальдэс (Valdesius), які з-за празмерных прыбыткаў назапасіў вялікія грошы. У адзін з дзён нядзельных ён, калі ўбачыў натоўп, які сабраўся вакол блазна, накіраваўся да яго, і яго [блазна] словы моцна ўразілі яго [Вальдэса], і ён адвёў яго ў свой дом, і там пастараўся ўважліва яго выслухаць. Гэта была тая частка яго аповеду, у якой святы Алексій знайшоў свой дабраславенны спакой у доме свайго бацькі. Назаўтра раніцай вышэйзгаданы гараджанін паспяшаўся атрымаць параду для сваёй душы ў школе тэалогіі; і запытаўся ён у настаўніка[28]: многія шляхі вядуць да Бога, які ж з іх больш пэўны і дасканалы? І настаўнік адказаў словамі боскімі: «калі хочаш дасканалым быць, ідзі, прадай маёмасьць тваю і раздай убогім» (Мф 19:21). І сышоў ад сваёй жонкі, і даў ёй выбар, што яна хоча пакінуць сабе рухомага і нерухомага з таго, што ён меў на землях і водах, лясах і лугах, у прыбытковых дамах, вінаградніках, а таксама млынах і хлебапякарнях. Тая, відавочна моцна засмучаная, што гэта трэба рабіць, абрала з нерухомага"[29]. З аднаго боку, такі сюжэт з'яўляецца досыць тыповым для сярэднявечнай жыційнай літаратуры. З іншага – тое, што Вальдэс "звярнуўся да веры" пасля прамовы менавіта блазна (а не, да прыкладу, калекі ці прапаведніка), кідае цень на ўвесь яго паварот, робіць яго вычварным, супрацьпастаўляе Царкве[30]. У выніку і Вальдэс як

---

[24] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 45–47. [II.i]

[25] "Ex Chronico universali anonymi Laudunensis," 447–449. [I.viii.a]

[26] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 104–108. [II.xiv]

[27] Joseph Visconti, *The Waldensian Way to God: Following the Light through Eight Centuries of Darkness and Discord* (Longwood, Fl.: Xulon Press, 2003), 36.

[28] Тут і далей слова "настаўнік" будзе выкарыстоўвацца для перакладу лацінскага тэрміна "магістр" як найбольш адпаведнае па сэнсе.

[29] "Ex Chronico universali anonymi Laudunensis," in *Monumenta Germaniae Historica. Scriptores.*, vol. 26, 1882, pp. 442–457, 447. [I.viii.a]

[30] Разам з тым, незадоўга перад Вальдэсам да веры (такая ж гісторыя з блазнам) звярнуўся Айберт з Турнэ (Aybert of Crespin), што не зашкодзіла яму стаць каталіцкім святым. Roach,

бы сімвалічна апынаецца па-за межамі Царквы як ерэтык, які скажае веру, хай і словамі з Евангелля[31]. Апісанне павароту з'яўляецца надзвычай важным элементам любога жыція святога, а наяўнасць добрага жыція – адна з неабходных умоў для яго кананізацыі[32].

Асобна варта спыніцца на самім факце выбару менавіта жыція Святога Алексія. Дагэтуль невядома, наколькі гэтая дэталь адпавядае рэчаіснасці ці была сфармулявана ў асяроддзі саміх вальдэнсаў. Упершыню такую гіпотэзу выказаў Курт-Віктар Зэльге[33]. Яна выглядае цалкам верагоднай, бо Алексій значна адрозніваецца ад класічнага святога або пакутніка: ён не быў ні манахам, ні ерэмітам, а правёў усё сваё жыццё ў вялікіх гарадах. Ён таксама не зварочваў нікога ў хрысціянскую веру і не здзейсніў ніводнага цуду[34]. Вобраз Святога Алексія дзіўным чынам адпавядае вобразу самога Вальдэса і яго першых паслядоўнікаў. Яго жыціе нібыта легітымізуе выбар першых вальдэнсаў, якія вялі аскетычнае жыццё, але не прынялі манаскіх зарокаў. Адначасова апеляцыя да рыма-каталіцкага святога, не згаданага ў Бібліі, паказвае на першапачатковую "каталіцкасць" вальдэнскага руху, які на мяжы XII–XIII стст. яшчэ не супрацьпастаўляў сябе Папскаму Прастолу. У адваротным выпадку апелявалі б да біблейнага вобразу, як і здарылася пасля з ператварэннем проста Вальдэса ў Пятра Вальдэса як адсылкі да заснавальніка самой Царквы Святога Пятра.

У сувязі з гэтым у гісторыкаў узнікае заканамернае пытанне: кім быў па прафесіі Вальдэс, калі ён мог сабраць прыкладна да сарака гадоў столькі маёмасці? Традыцыйна даследчыкі лічаць яго гандляром тканінамі, іншыя ж выказваюць меркаванне, што Вальдэс мог кіраваць царкоўнай маёмасцю[35]. Пётр Білер называе асноўнай крыніцай багацця Вальдэса ліхварства[36]. Усе варыянты не ўзаемавыключальныя.

The Devil's World, 28. Падрабязней пра амбівалентную постаць сярэднявечнага блазна-скамароха ў дачыненні да Вальдэса гл.: Aliaksandra Valodzina "Labelling the Waldenses: othering a medieval religious movement." In *The New Europe College Yearbook – Gerda Henkel Program 2022–2023 (forthcoming 2024)*. ISSN 1584-0298

[31] Tasca, "La prima predicazione di Valdo?", 194–195.

[32] James Howard-Johnston and Peter Brown, "The Cult of Saints in Late Antiquity and the Middle Ages Essays on the Contribution of Peter Brown," in *The Cult of Saints in Late Antiquity and the Middle Ages Essays on the Contribution of Peter Brown* (Oxford: Oxford University Press, 2000), pp. 1–24, 6.

[33] Kurt-Victor Selge, *Die ersten Waldenser*, vol. 1. Untersuchung und Darstellung (Berlin: de Gruyter, 1967), 231.

[34] Ulrich Mölk, "La Chanson de saint Alexis et le culte du saint en France aux XIe et XIIe siècles," *Cahiers de civilisation médiévale* 21, no. 84 (1978): pp. 339–355, https://doi.org/10.3406/ccmed.1978.2088, 355.

[35] Michel Rubellin, "Au temps où Valdès n'était pas hérétique: hypothèse sur le rôle de Valdès à Lyon (1170–1183)," *Église et société chrétienne d'Agobard à Valdès*, 2003, pp. 455–478, https://doi.org/10.4000/books.pul.19224.

[36] Peter Biller, "Helping the Poor and Healing the Sick," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 422–444, 424.

"Гэта ж дзейсна і для рухомага: калі што-небудзь ад каго-небудзь несправядліва займеў, вярнуў. Вялікую частку грошай заплаціў за дзвюх сваіх маленькіх дачок, якіх, у абыход іх маці, аддаў у кляштар Фантаўро; большую ж частку маёмасці патраціў на карысць бедных. Бо па ўсёй Галіі і Германіі лютаваў тады найстрашнейшы голад[37]. Згаданы ж гараджанін Вальдэс (Valdesius) тры разы на тыдзень ад Пяцідзясятніцы [25 мая] да свята паланення Св. Пятра [1 жніўня] раздаваў усім, хто да яго прыходзіў, хлеб і мясныя стравы"[38].

Варта нагадаць, што з 1157 г. архібіскуп Ліёна меў судовы імунітэт ад Свяшчэннай Рымскай Імперыі, атрыманы па Залатой Буле Фрыдрыха Барбаросы[39]. Падаецца верагодным, што выступленне Вальдэса, яго сацыяльны пратэст (ён адмовіўся ад жонкі і маёмасці, але стаў не манахам, а жабраком)[40] былі магчымыя толькі ва ўмовах непаўнаты імперскай улады пры дамінаванні Царквы. Хоць акурат на той момант пазіцыі Ліёнскай Царквы таксама былі аслабленыя: у 1173 г. скончыўся яе доўгі маёмасна-палітычны канфлікт з графскім родам дэ Фарэ на карысць апошняга. Жабрацтва ніколі не ўхвалялася свецкімі ўладамі, хоць і было бліжэй да першапачаткова апостальскага ідэалу (Пар. Мф 19:21). Царква, хоць яго і асуджала, але ставілася да яго больш паблажліва. На 1312 г., калі горад увайшоў у склад Францыі і юрысдыкцыя змянілася, вальдэнсаў там ужо не было.

Звяртае на сябе ўвагу лёгкасць, з якой жонка Вальдэса атрымала прыватную і, хутчэй за ўсё, даволі працяглую аўдыенцыю ў архібіскупа Гвічарда дэ Панціньі, і тое, колькі ўвагі апошні надаў вырашэнню пытання асобнага чалавека ў падначаленым яму горадзе. Гэта дае падставу меркаваць, што Вальдэс у свецкім жыцці быў набліжанай асобай да архібіскупа, дзякуючы маёмаснаму стану і/або аўтарытэту. Другое магчымае тлумачэнне выказаў даследчык жыцця і дзейнасці архібіскупа Ф. Паўзэ і развіў Мішэль Рубелін: Гвічард вельмі цікавіўся рэфарматарскай дзейнасцю Вальдэса, якая адпавядала яго памкненням па паляпшэнні маральнага аблічча ліёнскага кліру[41]. У такім выпадку становіцца зразумелым, чаму Вальдэс быў так цёпла прыняты на III Латэранскім саборы Папам Аляксандрам. Справа ў тым, што абранне Гвічарда на пасаду біскупа праходзіла ў вельмі канфліктнай атмасферы, і Папа ўпершыню ў гісторыі рашуча ўмяшаўся ў

---

[37] Пётр Білер прыводзіць сведчанні іншых даследчыкаў, што голад меў месца насамрэч на два гады пазней, у 1175–1177, хутчэй за ўсё, у 1176. Biller, "Helping the Poor and Healing the Sick," 423–424.

[38] "Ex Chronico universali anonymi Laudunensis," 447–448. [I.viii.a]

[39] Frédéric Barberousse. "Bulle d'or 1157" (Lyon, n.d.), accessed 22.10.2022.

[40] Francesca Tasca, "La famiglia dell'eretico: dalla normalità all'esclusione. Una fonte emblematica," in *Verwandtschaft, Freundschaft, Bruderschaft: Soziale Lebens- und Kommunikationsformen im Mittelalter* (Berlin: Akademie Verlag, 2009), pp. 330–342, 339.

[41] Philippe Pouzet, *La vie de Guichard, abbé de Pontigny, 1136–1165 et archevêque de Lyon, 1165–1181* (Lyon: Impr. M. Audin, 1929), 141. Падрабязней гл. Rubellin, "Au temps où Valdès n'était pas hérétique".

працэдуру выбараў і настаяў на кандыдатуры Гвічарда. Джорджыо Турн прапануе іншае тлумачэнне: ён сцвярджае, што Гвічард наўмысна падаграваў канфлікт паміж Папам і Імператарам, каб пашырыць сваю ўладу, а Вальдэс, у сваю чаргу, быў прадстаўніком новага сацыяльнага пласта – эканамічна актыўных гараджан, які шукаў свайго месца ў грамадстве[42].

"На наступны дзень, выйшаўшы з царквы, ён звярнуўся да нейкага грамадзяніна са свайго былога атачэння з просьбай падаць яму на ежу ў імя Божае. Той адвёў яго ў свой дом і сказаў: «Пакуль я жывы, у цябе будзе ўсё неабходнае». Калі гэты выпадак дайшоў да ведама яго жонкі, яна была не проста крыху засмучана, але як быццам бы звар'яцела і пабегла да архібіскупа горада; і скардзілася яму, што, як вядома, муж яе міласціну ад усіх, акрамя яе, прымае, і ўсё гэта яна расказала ў прысутнасці Яго Міласці ў слязах. Тады загадам Яго Міласці яго прывялі як госця ў прысутнасці Яго Міласці. Жанчына працягнула свайму мужу хлеб і сказала: «Ці не будзе лепш, о чалавек, калі я праз міласціну сваю выкуплю свае грахі, а не чужынцы?» І з таго часу загадам архібіскупа яму не дазвалялася ва ўсім горадзе прымаць ежу ад каго-небудзь, акрамя жонкі..."[43].

Разыходжанне ў абставінах павароту цягне за сабой і разыходжанне ў датах: ад 1170[44] да 1177 г. Другая дата ставіцца паводле Лаонскай хронікі: "Вальдэс, ліёнскі гараджанін, пра якога мы казалі раней, даў зарок Богу, які на нябёсах, што на працягу ўсяго свайго жыцця не будзе валодаць ні золатам, ні срэбрам, не будзе клапаціцца пра заўтрашні дзень, і ў яго ўчынкаў пачалі з'яўляцца прыхільнікі, якія прытрымліваліся яго прыкладу, усю сваю маёмасць раздалі бедным і сталі настаўнікамі добраахвотнай беднасці. І пачалі яны паступова, як публічна, так і прыватна, настаўляць і спавядаць свае грахі і чужыя."[45].

Цалкам упэўнена можна гаварыць, што паслядоўнікі ў Вальдэса былі ўжо ў 1179 г., бо ён разам з імі і выкананым на яго замову перакладам Біблії прысутнічаў на III Латэранскім саборы ў Рыме, куды накіравалася невялікая дэлегацыя на чале з ім і яго вучнем Віветам[46], каб атрымаць аўдыенцыю ў пантыфіка. Тэкст дэкрэтаў гэтага сабора да нас не дайшоў, але маюцца сведчанні хранікаў. Спачатку Вальдэс атрымаў, дзякуючы падтрымцы кардынала Апуліі, прыватную аўдыенцыю ў Папы, які нават абняў яго. І хоць гэтыя абдымкі былі часткай рытуалу, а не выказваннем братніх пачуццяў, можна меркаваць, што першапачаткова Папа быў настроены прыязна[47].

---

[42] Giorgio Tourn, "Piotr Waldes," in *Heretycy: Panorama dziejów myśli kacerskiej i ruchu dysydenckiego w chrześcijaństwie* (Gdynia: Uraeus, 1997), pp. 26–30, 26.

[43] "Ex Chronico universali anonymi Laudunensis," 448. [I.viii.a]

[44] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 18

[45] "Ex Chronico universali anonymi Laudunensis," 449. [I.viii.a]

[46] Comba and Santini, *Breve storia dei valdesi*, 17.

[47] Comba, *Storia dei valdesi*, 37–38.

Найбольш дэталёвае апісанне гэтага візіту пакінуў англійскі клірык Уолтэр Мэп у сваёй працы "Пра справы курыі"[48]. На пачатку свайго аповеду ён сцвярджае, што вальдэнсы прывезлі з сабою кнігу, напісаную на "гальскай мове", якая ўтрымлівала Псалмы і іншыя тэксты і законы[49]. Мэпу было даручана праэкзаменаваць гэтых "простых і неадукаваных" людзей. Ён стаў ім задаваць наступныя пытанні: "Ці верыце вы ў Бога Айца?" – "Мы верым". – "А ў Бога Сына?" – "Мы верым". – "А ў Бога Святога Духа?" – "Мы верым". – "А ў маці Хрыста?" – "Мы верым". Тут кансіліум літаральна лёг ад смеху, таму што згодна з тагачасным багаслоўем формула "мы верым" ужывалася ў дачыненні толькі да Бога, але ні ў якім разе ні да Дзевы Мары ці іншых, несумненна святых, асоб. Нягледзячы на такую грубую багаслоўскую памылку, вальдэнсы былі пакінуты на ласку мясцовай царкоўнай адміністрацыі, да вялікага незадвальнення Мэпа. Ён ужо тады зазначыў: "Гэта напачатку яны выглядаюць такімі сціплымі, што нагу за парог не рашаюцца паставіць, але калі мы ім дазволім – яны выкінуць нас"[50].

Улічваючы адлегласць паміж Ліёнам і Рымам, паварот Вальдэса не мог адбыцца пазней за 1178 г. Сальва Бурчы ўказвае нам на 1175 г.[51] Далейшы лёс Вальдэса губляецца. Вядома, што ў 1180 г. ён трымаў справаздачу на саборы ў Ліёне, адкуль быў выгнаны праз некалькі гадоў новым архібіскупам. Ні дата смерці, ні тым больш месца пахавання невядомыя.



[48] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 121–124.
[49] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 122.
[50] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 123.
[51] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 64. [II.xi]

Спробы легальнага існавання (1215–1260-я гг.)

Наступным рубяжом існавання "класічнага" вальдызму выступае IV Латэранскі сабор 1215 г., які правёў мяжу паміж вальдэнсамі-каталікамі і вальдэнсамі-ерэтыкамі.

Гэты прадстаўнічы сход быў арганізаваны Папам Інакенціем III, адным з найбольш дзейсных пантыфікаў за ўсю гісторыю Каталіцкай Царквы. Трэцім яго канонам (пастановай) было прынята адлучэнне ўсіх ерэтыкоў. Цікава, што ні "вальдэнсы", ні "катары", ні "альбігойцы" ў дакуменце не згадваюцца, увогуле няма ніводнага пазначэння, проста напісана: "Мы адлучаем і абвяшчаем анафему ўсім ерэтыкам, што ўздымаюцца супраць святой прававерпай Каталіцкай Царквы ... якімі б імёнамі іх не апісвалі"[1]. Да таго ж, не раз падкрэсліваецца, што прапаведаваць могуць толькі спецыяльна прызначаныя біскупамі людзі, а значыць, вальдэнсы з іх "Боскай місіяй" аказваліся па-за законам.

Такім чынам, на IV Латэранскім саборы вальдэнсы разам з іншымі ерэтыкамі (з пункту гледжання Каталіцкай Царквы) былі адлучаны ад яе. І паколькі яны адмовіліся раскаяцца, то пасля завяршэння гэтага сабора ў Рыме сабраўся яшчэ адзін, які аб'явіў іх схізматыкамі (раскольнікамі, г.зн. тымі, хто аддзяліўся ад Царквы) і асудзіў як ерэтыкоў[2].

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што паваротным момантам у іх гісторыі трэба лічыць 1192 г., калі кароль Арагона Альфонс пісаў у сваім загадзе: "а менавіта Вальдэнсаў, або суботнікаў (insabbatati)[3], якія самі сябе называюць іншым іменем – бедныя з Ліёна, а таксама ўсіх іншых ерэтыкоў, якіх лікам не злічыць, адлучаных Святой Царквой "[4]. Гэты ўказ быў паўтораны ў 1197 г. яго пераемнікам Педра II Арагонскім, дзе той загадвае "бедным з Ліёна" пакінуць яго ўладанні[5].

Вольфрам Бенцыгер выказаў вельмі цікавае меркаванне, што вальдэнсы сталі ахвярай станаўлення інквізіцыйнай сістэмы, якая радыкальна падзяліла каталікоў на "ерэтыкоў" і "не ерэтыкоў" без уліку блізкасці або далёкасці іх поглядаў ад каталіцтва, і жорстка пераследвала тых, каму не пашчасціла трапіць у першую катэгорыю[6].

---

[1] "Concilium Lateranese IV a. 1215." Roma, 2008. http://www.internetsv.info/Archive/CLateranense4.pdf.

[2] Audisio, *The Waldensian Dissent*, 22.

[3] Або "неабутыя".

[4] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 91. [I.iv.b]

[5] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 93–94. [I.iv.c]

[6] Wolfram Benziger, "La legislazione papale in materia di eresia e i poveri di Lione," in *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca* (Torino: Claudiana, 2009), pp. 39–52.

У згаданы перыяд на фоне разгортвання пропаведзі вальдэнсамі і фарміравання іх арганізацыйнай структуры вырастаюць характэрныя рысы вальдэнскага вучэння, якія будуць вылучаць гэты рух сярод іншых ерэтычных рухаў: рашучае адмаўленне клятвы, чыстца і права свецкай улады на здзяйсненне гвалту, небіблейных царкоўных абрадаў; дазвол жанчынам прапаведаваць, а міранам – здзяйсняць еўхарыстыю; данатызм.

Нягледзячы на фармальнае адлучэнне падчас IV Латэранскага сабора, вальдэнсы не ўспрымаліся як ерэтыкі да канца Альбігойскіх войнаў (1209–1229)[7]. Магчыма, гэта было з-за таго, што іх не назвалі адкрыта ерэтыкамі ў заканадаўчых дакументах, а, можа, яны не выглядалі такімі з-за параўнальна невялікіх разыходжанняў у вучэнні з Каталіцкай Царквой на фоне катараў.

Пераклад Бібліі Вальдэса на "народную" мову ў вольных імперскіх і біскупскіх гарадах

Акрамя мірской пропаведзі, царкоўныя традыцыі парушыў пераклад Бібліі на "народную" мову[8], прафінансаваны Вальдэсам. Першы раз вальдэнскі пераклад згадваецца пры апісанні падзей III Латэранскага сабора 1179 г., зробленым яго ўдзельнікам – англійскім клірыкам Уолтэрам Мэпам. Ён сцвярджае, што вальдэнсы прывезлі з сабою кнігу, напісаную на "гальскай мове", якая ўтрымлівала Псалмы і іншыя тэксты і законы[9].

У 1216 г. гэты пераклад згадаў Рычард з Пуацье, клюнійскі манах, у сваёй выкрывальнай працы, прысвечанай ерэтыкам: "[Вальдэс] зрабіў сабе спіс з Евангелля, некаторых кніг Бібліі і Айцоў Царквы на народнай мове, якія назваў «Падсумаванне»"[10].

Асноўныя звесткі пра пераклад паходзяць з трактата "Пра сем падарункаў Святога Духа" вышэйзгаданага інквізітара-дамініканца Стэфана дэ Бурбона.

"Секта ж пачала гэты шлях, згодна з тым, што я чуў ад некаторых асоб, хто бачыў самых першых іх [членаў секты], і ад аднаго святара па імені Бернард Ідрас, які сам быў даволі паважаным і дабрадзейным чалавекам у горадзе Ліёне, сябрам нашага брата-дамініканца; калі той быў маладым і пісцом, запісаў названаму Вальдэсу за ўзнагароду на народнай мове (in romano) першыя кнігі, якія займелі тыя людзі, перакладзеныя (transferente) і надыктаваныя яму адным вучоным, па імені Стэфан з Анса,

---

[7] *L'inquisition en Quercy: Le registre des pénitences de Pierre Cellan 1241–1242* (Castelnaud La Chapelle: L'Hydre éd., 2001), 24.

[8] Лічыцца, што асновай для перакладу паслужыла не толькі Вульгата, але і папярэднія лацінскія пераклады (т. зв. Vetus Latina). Jean Jalla, *La Bibbia nella storia valdese* (Catania: La veloce, 1938), 5.

[9] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 122.

[10] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 165. [II.x]

які, прэбендарый (beneficiatus) кафедральнага сабора ў Ліёне, пазней нечакана памёр, зваліўшыся з даху дома[11], які ён будаваў; я яго часта сустракаў.

Адзін багацей у названым горадзе, названы Вальдэс, які не быў добра адукаваны, але, слухаючы Евангеллі, захацеў даведацца, пра што яны кажуць, заключыў дамову з названымі святарамі, што адзін перакладзе (transferret) іх на народную мову, а другі запіша пад дыктоўку, што яны і зрабілі; падобным чынам былі [сабраныя] многія кнігі Бібліі і многія сентэнцыі з Айцоў Царквы (auctoritates sanctorum), згрупаваныя па тэмах, якія яны назвалі «Меркаванні»"[12]. Хто былі згаданыя Айцы Царквы, удакладняе Бернард Гі: Аўгусцін Блажэнны, Св. Іеранім, Св. Амвросій і Грыгорый Вялікі[13].

Хутчэй за ўсё, перакладам Вальдэс зацікавіўся яшчэ да канчатковай адмовы ад маёмасці – у 1160 г.[14] Гэта лагічна, таму што "перакладчыкам" трэба плаціць, і зразумела, што такімі грашыма валодае не вандроўны прапаведнік, а заможны гандляр. Захаваўся тастамент Стэфана з Анса, дзе згадваецца "хлебапякарня, што належала Вальдэсу" (furnum qui fuit Valdesii), якая, магчыма, і стала аплатай за пераклад[15].

Ва ўсіх каталіцкіх антыерэтычных трактатах, прысвечаных вальдэнсам, яны тым ці іншым чынам называюцца "неадукаванымі і непісьменнымі" (ydioti et illiterati). Для сучаснага чытача слова "ідыёт" мае адназначна негатыўнае гучанне, між тым яно паводле Герберта Грундмана атрымала такое адценне толькі пасля 1838 г.[16] Гэтае ўстойлівае спалучэнне паходзіць з Бібліі, з Дзеяў Апосталаў 4:13, дзе такімі словамі былі апісаныя апосталы Пётр і Ян (а, значыць, яны мелі адназначна станоўчую канатацыю). Але паступова тэрмін змяняецца, і так пачынаюць называць міран, якія не ведалі лаціны. У XIII ст. яму надаецца новае адценне. Пад гэтым тэрмінам разумеюцца як невуцтва і адмова ад духоўнай самарэалізацыі, так і ўвогуле адмова ад грамадскага статусу і таго, што сёння назвалі б "сацыяльнай адаптацыяй, прыстасаванасцю, нормай"[17]. Безумоўна, для гэтай добраахвотна ўзятай на сябе сацыяльнай ролі таксама існуе новазапаветная норма: яна з'яўляецца ў выказванні Апостала Пятра пра юродства пропаведзі (1 Кар 1:21) і пра праўдзівае хрысціянства як "нямудрае" ў вачах свету, пра тое, што Бог выбраў "буянае сьвету, каб пасароміць мудрых, і нямоглае

---

[11] Раптоўная смерць магла трактавацца як Божае пакаранне за супрацоўніцтва з ерэтыкамі. Pekka Tolonen, "Medieval Memories of the Origins of the Waldensian Movement," in *History and Religion: Narrating a Religious Past* (Berlin, München, Boston: de Gruyter, 2015), pp. 165–188, 175.

[12] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 15–16. [II.xiv]

[13] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 244 [III.vi.1]; Giorgio Tourn, *I valdesi: La singolare vicenda di un popolo-chiesa (1170–1976)*, 2nd ed. (Torino: Claudiana, 1993), 9.

[14] Jean Rodolphe Peyran, *An Historical Defence of the Waldenses or Vaudois, Inhabitants of the Valleys of Piedmont* (London: C. & J. Rivington, 1826), 166.

[15] Alexander Patschovsky, "The Literacy of Waldensianism from Valdes to c. 1400," in *Heresy and Literacy: 1000–1530* (Cambridge: Cambridge University Press, 1994), pp. 112–136, 115.

[16] Herbert Grundmann, *Herbert Grundmann (1902–1970): Essays on Heresy, Inquisition, and Literacy* (Woodbridge: York Medieval Press, 2019), 56.

[17] Эксле, *Действительность и знание*, 198–199.

сьвету выбраў Бог, каб пасароміць моцнае; і бязроднае сьвету і пагарджанае і нічога ня значнае выбраў Бог, каб зьнясіліць значнае" (1 Кар 1:27–28). Менавіта гэтую ролю прымаюць на сябе ерэтыкі, у тым ліку і вальдэнсы. Так іх часта называюць, мяркуючы абразіць, каталіцкія аўтары. Гэта стандартны для тагачаснай каталіцкай літаратуры прыём супрацьпастаўлення "непісьменных ерэтыкоў" і Каталіцкай Царквы з яе пісьмовымі тэкстамі і адукаванымі мужамі.

Да таго ж, назваць кагосьці "дурным" значыла падкрэсліць яго схільнасць да ерасі, бо лічылася, што "зараза ерасі" можа закрануць толькі "неадукаваных і мёртвых унутры"[18].

Тэрмін "пісьменны" таксама патрабуе асобнага тлумачэння: у Сярэднявеччы, калі дамінантнай мовай справаводства і культуры была лаціна, "непісьменным" называлі таго, хто не ўмеў чытаць і пісаць менавіта на лаціне. Тым больш, што Вальдэс, як заможны гандляр або царкоўны функцыянер з рэгіёну, дзе рымская традыцыя ніколі не перарывалася, не мог быць непісьменным у сучасным разуменні гэтага слова. Але для самастойнага чытання і разумення Евангелля на лаціне яго ведаў было яўна недастаткова. Да размовы пра "пісьменнасць" ці "непісьменнасць" вальдэнсаў варта згадаць наступную цытату з інквізіцыйнага абвінавачання жанчыны-вальдэнкі на поўдні Францыі ў 1244 г.: "хворым вальдэнскім жанчынам чытала Евангелле ад Святога Яна"[19] – значыць, умела чытаць і мела кнігу.

З-за адсутнасці першапачатковага тэксту перакладу[20] цяпер немагчыма высветліць, на якую канкрэтна мову ён быў зроблены. Найбольш раннія з захаваных спісаў паходзяць з канца XIII – пачатку XIV ст. і напісаны па-правансальску і па-нямецку[21]. Паміж зонамі выкарыстання гэтых моў ляжыць Ліён (горад, дзе быў зроблены першы пераклад), цэнтр арпітанскай (франка-правансальскай) мовы. Калі ж прааналізаваць арэал распаўсюджання гэтай мовы, то можна заўважыць, што ён амаль супадае з рэгіёнам і найбольшай прысутнасці і актыўнасці вальдэнсаў, такімі, як Ліён, Фрыбур і Заходнія Альпы (дзе вальдэнсы жывуць да нашага часу), а таксама Апулія[22] (паўднёвы рэгіён існавання вальдэнства, адкуль паходзіў нават вальдэнскі "Папа"). З гэтага можна зрабіць выснову, што вучэнне Вальдэса лягчэй распаўсюд-

[18] Susan R. Kramer, *Sin, Interiority, and Selfhood in the Twelfth-Century West* (Toronto: Pontifical Institute of Mediaeval Studies, 2015), 127.

[19] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 63–65. [III.i.g]

[20] Уладзімір Агрыгорааэй выказаў меркаванне, што такога перакладу ўвогуле не існавала, а Вальдэс проста замовіў сабе кампендыум з ужо існуючых франкамоўных тэкстаў. Падрабязней пра "неерэтычную" традыцыю франкамоўных біблейскіх перакладаў гл. Vladimir Agrigoroaei, "Préambule à une étude sur l'hérésie et la traduction biblique au Moyen Âge et à l'aube de la modernité," *Biblicum Jassyense. Romanian Journal for Biblical Philology and Hermeneutics* 8 (2021): pp. 15–92.

[21] Giovanni Gonnet, "La Bibbia e i Valdesi medioevali," *Bollettino della Socità di Studi Valdesi* 149 (1979): pp. 3–20, 9–10.

[22] Лацінскі тэрмін "Апулія" мае два значэнні: тэрыторыя сучаснай італьянскай аднайменнай правінцыі, а таксама паўднёвы ўсход Апенінскага паўвострава ў цэлым.

жвалася носьбітамі арпітанскай мовы сярод сваіх супляменнікаў. Звяртае на сябе ўвагу, што не знойдзена вальдэнскага перакладу на італьянскую мову, хоць на працягу XIII–XIV стст. найбольш моцным вальдэнскім асяродкам была Ламбардыя. Існуе меркаванне, што такі пераклад існаваў, проста не дайшоў да нашага часу[23]. З іншага боку, магчыма, што носьбіты італьянскай мовы на той час збольшага разумелі напісанае ў Вульгаце, таму не мелі такой вострай патрэбы ў перакладзе. Перад самай Рэфармацыяй атрымаў хаджэнне вальдэнскі пераклад Біблії на французскую мову[24].

Пасля таго, як біскуп Меца Бертрам паскардзіўся на тое, што вальдэнсы распаўсюджваюць "Боскія кнігі, перакладзеныя на гальскую мову", не звяртаючы ўвагі на пратэсты прадстаўнікоў Царквы, Папа Інакенцій III у 1199 г. паслаў у Мец трох абатаў для высвятлення абставін. Апошнія канфіскавалі пераклады і спалілі іх, а вальдэнсы былі выгнаныя з горада[25].

З часам недавер афіцыйнай Царквы да "народнай" мовы павялічыўся да такой ступені, што пытанне мовы стала яшчэ адной лініяй супрацьстаяння: паміж лацінай як мовай Царквы і "народнай" мовай яе крытыкаў. Чым шырэй ёю карысталіся ерэтыкі, тым больш недаверу яна выклікала ў царкоўных іерархаў, і часам толькі наяўнасці любых рэлігійных кніг на "народнай мове" было дастаткова, каб трапіць пад падазрэнне[26]. Разам з тым ад кліру патрабавалася валоданне мясцовымі мовамі[27]. У 1201 г. Папа Інакенцій III загадаў знішчыць кожны пераклад Святога Пісання на нямецкую і французскую мовы, які трапіць у рукі біскупам Льежа (Фландрыя)[28]. Там амаль паралельна з Вальдэсам (у XIII ст.) робяцца спробы перакладу Біблії сярод першых бегінак[29]. Гэты рэлігійны рух узнік прыкладна адначасова з вальдэнскім у Брабанце і праіснаваў у актыўнай форме той жа час, што і "класічны" вальдызм. Бегінкі (і мужчынскі варыянт руху – бегарды) мелі жыццёвы лад, блізкі да манаскага, але маглі ўступаць у шлюб і вельмі актыўна займаліся дабрачыннасцю. Часта абвінавачваліся ў ерасі.

Справа дайшла да таго, што ў 1229 г. царкоўны сабор у Тулузе забараніў свецкім людзям чытаць Стары і Новы Запавет[30]. Гэта было прапісана ў сёмым артыкуле канона сабора: "Мы таксама забараняем, каб міранам было дазволена мець кнігі Старога і Новага Запаветаў, акрамя хіба калі яны з набожнасці

---

[23] Православная Энциклопедия, доступ 22.10.2022, http://www.pravenc.ru/text/209473.html#part_42.

[24] Aline Pons and Matteo Rivoira, "Le lingue dei valdesi," *Riforma e Movimenti Religiosi (RMR): Rivista della Società di Studi Valdesi* 3 (June 2018): pp. 379–395, 380.

[25] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 95 ; Georg Modestin, "Western Germany Including Strasbourg," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 184–206, 184–185. [I.v]

[26] Bruschi, *The Wandering Heretics*, 37.

[27] Euan Cameron, *The European Reformation* (Oxford: Clarendon Press, 1991), 52.

[28] Jalla, La Bibbia nella storia valdese, 9. [I.iv.d]

[29] Patschovsky, "The Literacy of Waldensianism," 116.

[30] Paul Tice, *History of the Waldenses: From the Earliest Period to the Present Time* (Escondido, CA: Book Tree, 2003), 54.

не захочуць мець Псалтыр або брэвіярый для імшаў Госпаду, ці пагадзінныя малітвы да Дзевы Марыі для вячэрніх і ранішніх чытанняў. Катэгарычна забараняецца, каб гэтыя кнігі былі перакладзены на «народную» мову"[31]. Гэтыя забароны былі паўтораны на саборах у Рэймсе (1230/1231 гг.), Трыры (пад 1231 г. там было выяўлена тры ерэтычныя школы, якія мелі пераклад Пісання на "тэўтонскую" мову[32]), Тарагоне (1234 г.[33], з дадаткам, што калі хто мае такія кнігі ў перакладзе, то павінен цягам 8-і гадзін прынесці іх біскупу для спалення[34]), Безье (1246 г.) *(карта А1)*.

Верагодна, што існаванне гэтага перакладу, з аднаго боку, паспрыяла адлучэнню вальдэнсаў ад Царквы, а з іншага – вызначыла іх скіраванасць на вывучэнне Святога Пісання (у тым ліку і на памяць), арыентацыю на "пісанае слова". Тым больш, што далей вальдэнсы лічыліся аднымі з найбольш дасканалых знаўцаў Бібліі. Пра наяўнасць Евангелляў на "народнай мове" ў нямецкамоўным рэгіёне сведчаць Пасаўскі ананім[35] і Давід Аўгсбургскі[36].

Табліца 1. Гарады, дзе зафіксаваны найбольш раннія згадкі пра вальдэнсаў

Горад	**Час першай згадкі**	**Статус горада на гэты момант**
Ліён	1170-я	Біскупскі горад
Верона	1184	Папская рэзідэнцыя
Мец	1192	Імперскі горад
Туль	1192	Біскупскі горад
Пам'е	1207	Рэзідэнцыя графа дэ Фуа
Эльн (Элен)	1210	Біскупскі горад
Генуя	1212	Горад-дзяржава
Тарагона	1208	Сталіца Арагона
Мілан	1209	Камуна
Крэмона	1212	Біскупскі горад
Бергама	1218	Камуна
Страсбург	1184	Біскупскі горад
Трыр	1230	Біскупскі горад
Турын	1212	Біскупскі горад у складзе Савоі

[31] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 33.
[32] "Synodus Dioecesana Trevirensis," in *Sacrorum conciliorum nova et amplissima collection* (Venezia, 1779), col. 241–242.
[33] Henry C. Vedder, "Origin and Early Teachings of the Waldenses, According to Roman Catholic Writers of the Thirteenth Century," *The Amer. J. of Theology* 4, no. 3 (1900): pp. 465–489, 478.
[34] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 33.
[35] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 71; Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 112–113. [V.i]
[36] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 153. [V.ii]

Калі прааналізаваць карту А1, то становіцца відавочным, што большасць гэтых гарадоў (за выключэннем Рэймса) знаходзілася па-за межамі прамога ўплыву французскага караля (або толькі ўвайшлі ў іх (Тулуза)) і імператара Свяшчэннай Рымскай Імперыі. Тарагона належала Арагону. Гарады, дзе было непасрэдна зафіксавана існаванне перакладаў Біблії і саміх вальдэнсаў – Ліён, Мец, Туль, Трыр і Льеж – гэта вольныя імперскія гарады пад кантролем біскупаў у Фландрыі, Латарынгіі і Бургундыі.

Існавала юрыдычная розніца паміж вольнымі (ням.: freie Städte) і імперскімі (ням.: Reichsstädte) гарадамі. Вольныя гарады раней кіраваліся князем-біскупам (у табліцы – біскупскія гарады). Хоць юрыдычныя дэталі з часам змяняліся, вольныя гарады першапачаткова мелі больш правоў і прывілеяў, чым імперскія. Яны павінны былі толькі падтрымліваць імператара ў крыжовых паходах і арганізоўваць сваю ўласную абарону, у той час як імперскія гарады мусілі таксама плаціць падаткі імператару і пастаўляць войскі для яго ваенных кампаній. Але для развіцця вальдэнскага руху гэта розніца не мела прынцыповага значэння, вызначальным быў менавіта высокі ўзровень сацыяльнага і эканамічнага развіцця пры адсутнасці моцнай цэнтралізаванай улады (такі прывілей выкупаўся гараджанамі ў імператара).

Такім чынам, першапачаткова рух вальдэнсаў пашыраўся менавіта ў гарадах, прычым у гарадах з мясцовым самакіраваннем/падуладным Царкве, удалечыні ад каралеўскай і імператарскай улады. Другой спецыфічнай рысай гэтых гарадоў быў высокі ўзровень эканамічнага развіцця, пераважна ў сферы гандлю (у якой рэалізоўвалі сябе многія вальдэнсы).

Дзейнасць Дуранда з Оскі

Былі вальдэнсы, якія адмовіліся ад сваіх "памылковых поглядаў". У 1207 г. адбываўся царкоўны сабор у Пам'е. З каталіцкага боку прысутнічалі біскуп кастыльскага горада Озмы дон Дыега са сваім набліжаным кафедральным прыёрам Дамінікам (будучы заснавальнік дамініканскага ордэна), біскупы тулузскі і каркасонскі. Вальдэнсаў прадстаўляў Дуранд з Оскі. Для правядзення дыспуту паміж каталікамі і вальдэнсамі быў выдзелены палац сына графа дэ Фуа, Раймонда Ражэ, жонка і дачка якога таксама былі прыхільніцамі Вальдэса. Хоць каталікі і прайгралі дыспут, але Раймонду як прадстаўніку мясцовай адміністрацыі давялося пакараць некаторых асабліва радыкальных вальдэнсаў за выказванне ерэтычных меркаванняў[37].

Хутчэй за ўсё, паварот самога Дуранда ў каталіцтва адбыўся менавіта на гэтым дыспуце дзякуючы красамоўству Дамініка[38] (што можа быць

[37] Осокин, *История альбигойцев*, 218; Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 126–128. [I.viii.d]

[38] Brenda Bolton, "Tradition and Temerity: Papal Attitudes to Deviants, 1159–1216," *Studies in Church History* 9 (1972): pp. 79–91, https://doi.org/10.1017/s042420840000574x, 82.

дадатковым аргументам на карысць далейшага далучэння паслядоўнікаў першага ў ордэн другога).

Звестак пра самога Дуранда захавалася вельмі мала. Лакалізацыя "Оскі" даволі спрэчная: гэта Оск у Руэргу (Osques, Rouergue, Францыя), Уэска ў Арагоне (Huesca, Aragon, Іспанія) і Лоск (Losque, Францыя, даліна Роны) паміж Наякам і Сэн-Антанэн-Нобль-Валем, адкуль паходзілі некаторыя паплечнікі Дуранда[39]. Апошнія звесткі сведчаць на карысць Уэскі, бо, па-першае, Дуранд жыў некалькі гадоў у Каталоніі[40], а, па-другое, у кафедральным саборы Уэскі знаходзіцца дакумент 1181 г., падпісаны "пісар Дуранд"[41].

Дуранд і яго паплечнікі актыўна палемізавалі з катарамі. У выніку гэтай палемікі ён напісаў "Кнігу супраць ерасяў"[42] (яшчэ да свайго вяртання ў каталіцтва, каля 1191–1192 гг.) і "Кнігу супраць маніхеяў" (складзеная Дурандам ужо як кіраўніком групы "бедных каталікоў" у 1222–1223 гг.)[43].

З лістоў Папы Інакенція III архібіскупам і біскупам Марсэля, Барселоны, Оска/Уэскі, Мілана, Нарбоны, Утыкі, Тараконы і Генуі *(карта A2)*, а таксама іх падначаленым, кардыналам-легатам і, у некаторых выпадках, гарадскім капітулам, напісаных у 1208, 1209 і 1212 гг., вядома, што Дуранд са сваімі паплечнікамі Дурандам з Наяка, Гвілельмам з Сэн-Антанэн-Нобль-Валя, Янам з Нарбоны, Эрменгаўдам, Бернардам з Безье, Раймундам з Сан-Паўла і Эбрінам, а таксама яго паплечнікамі (socii) звярнуліся ў 1208 г. да Святога Прастола з просьбай аб прызнанні іх сапраўднымі сынамі Царквы, а таксама падалі прашэнне пра зацвярджэнне новага ордэна "бедных каталікоў"[44].

Арэал дзейнасці "бедных каталікоў" можна вывесці з пераліку біскупстваў, кіраўнікам якіх былі накіраваныя лісты *(карта A2)*. Да таго ж, у пасланні да службовых асоб Мілана гаворыцца, што да просьбы Дуранда далучаюцца і браты, якія самі не здолелі прыехаць у Рым, а "засталіся ў Італіі".

---

[39] Yves Dossat, "A propos du prieur des pauvres catholiques Durand de Huesca, ou de Losque, en Rouergue?," *Bulletin philologique et historique (jusqu'à 1610) du comité des travaux historiques et scientifiques* II (1967): pp. 673–685.

[40] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 127.

[41] *Colección diplomática de la Catedral de Huesca*, vol. 1 (Zaragoza: Consejo Superior de Investigaciones Cientificas, Escuela de Estudios Medievales, Instituto de Estudios Pirenaicos, 1965), 362–363, doc. 373.

[42] Гэта кніга аказала ўплыў на ўсю пазнейшую палеміку супраць катараў. Падрабязней гл. Aliaksandra Valodzina, "The Topoi of «Three Orients» and Translatio Studii in Waldensian Anti-Cathar Polemic." В *Проблемы современного востоковедения* [Электронный ресурс]: материалы III Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 29–30 июня 2023 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. Р. Боровой (гл. ред.) [и др.]. (Минск : БГУ, 2023), стр. 19–25. [I.iii]

[43] Mary A. Rouse and Richard H. Rouse, "The Schools and the Waldensians: a New Work by Durand of Huesca," in *Christendom and Its Discontents: Exclusion, Persecution and Rebellion, 1000–1500* (Cambridge: Cambridge University Press, 2002), pp. 86–111, 87. Некаторыя аўтары налічваюць 5 твораў Дуранда. Maria Pia Alberzoni, "Innocent III et Les Pauvres Catholiques Du Midi," *Cahiers de Fanjeaux* 50, no. 1 (2015): 311–336, https://doi.org/10.3406/cafan.2015.2231, 316.

[44] PL 215:1509–1514; 216:29–30, 73–74, 255–256, 274–275, 601–602, 607–609. [I.ii.b]

Для пацвярджэння свайго намеру стварыць новы ордэн вышэйадзначаныя прыхільнікі Дуранда і яшчэ некалькі чалавек прадставілі пантыфіку сваю Споведзь веры і Статут "бедных каталікоў". Папа накіраваў праверку на чале з мясцовым іерархам, якая пацвердзіла праўдзівасць слоў вальдэнсаў. Яны ўжо мелі памяшканне, падараванае ім адным з заможных прыхільнікаў у дыяцэзіі Элен ля Перпіньяна ў Русільёне (сучасная Францыя, тады – Арагон)[45]. Але Інакенцій III адмоўна ставіўся да новых ордэнаў: забарона на іх стварэнне нават была ўнесена асобным, XIII, канонам у "канстытуцыю" IV Латэранскага сабора[46]. Не дапамагла пратэкцыя магутнага кардынала Леона Бранкалеонэ. Дуранд з Оскі яшчэ не раз апеляваў да Інакенція III і наступных пантыфікаў, для чаго наведваў Рым агулам тры разы (першы раз – ад верасня 1207 да канца 1208, другі раз – ад ліпеня 1209 да мая 1210, і трэці раз – вясной 1212 г.). Вядома, што падчас гэтых падарожжаў ён прапаведаваў у Паўночнай Італіі, дакладна – у Мілане і Павіі[47]. Адказ быў па-ранейшаму адмоўным. Па некаторых дадзеных, на паслядоўнікаў Дуранда нават быў накладзены інтэрдыкт Ліёнскім саборам 1247 года[48].

Нягледзячы на імкненне да аскетычнага манаскага жыцця, спалучанага з пропаведдзю супраць ерэтыкоў ("праз выратавальную дактрыну выяўляць людскія памылкі і прыцягваць усімі спосабамі да веры і вяртаць у лона Святой Рымскай Царквы"), "бедныя каталікі" не знайшлі падтрымкі з боку Каталіцкай Царквы, і да канца 1240-х гг. рассеяліся між іншых ордэнаў. Па розных меркаваннях, большай часткай яны ўвайшлі або ў дамініканскі ордэн[49] (якому перайшла іх нерухомая маёмасць)[50], або ў новастворaны ордэн ерэмітаў Святога Аўгусціна (аўгусцініянцаў)[51]. Між тым, вальдэнсы як пагроза працягвалі непакоіць царкоўную адміністрацыю Тарагонскага архібіскупства – на мясцовым саборы 1242 г. вальдэнсы былі адзначаны асобна[52].

Але нашмат больш агульнага ў "бедных каталікоў" было з ордэнам францысканцаў. Гэтае падабенства адзначылі многія даследчыкі[53]. Некаторыя бачаць нават сувязь паміж гэтымі двума аб'яднаннямі[54], бо на

---

[45] Cameron, *Waldenses*, 53.

[46] "Concilium Lateranese IV a. 1215."

[47] Rouse and Rouse, "The Schools and the Waldensians», 93–95.

[48] Amedeo Molnár, *La protesta valdese e la prima Riforma* (Gioventu evangelica italiana, 1966), 7.

[49] Damian J. Smith, "The Early Waldenses and the Catholic Poor in the Crown of Aragon (12th–13th Centuries)," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 78–97, 93.

[50] Осокин, *История альбигойцев*, 219, 424.

[51] Grado Giovanni Merlo, "Valdo (or Valdesius) of Lyons and the Poor in Spirit," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 11–33, 29.

[52] Smith, "The Early Waldenses," 78.

[53] Audisio, *The Waldensian Dissent*, 22–23; Papini, Valdo di Lione, 264.

[54] Dennis McCallum, *Waldensian Movement from Waldo to the Reformation*, accessed 22.10.2022, https://dwellcc.org/learning/essays/waldensian-movement-waldo-reformation; Volpe, *Movimenti Religiosi*, 59.

пачатковым этапе яны сутыкаліся з аднолькавымі праблемамі, а менавіта недавер і падазрэнне ў ерасі з-за іх пропаведзяў і жабрацкага ладу жыцця[55]. Для высвятлення прычын такога падабенства і наступнага выбару на карысць дамініканцаў будуць прааналізаваны статуты францысканцаў, "бедных каталікоў" і аналагічнага ламбардскага "ордэна" "бедных ізноў далучаных"[56].

Знешняя, рытуальная частка ва ўсіх трох ордэнаў падобная: шматразовыя штодзённыя малітвы, доўгія пасты, прадпісаныя Рымскай Царквой. Былі строгімі абмежаванні ў вопратцы і абутку: простае штодзённае адзенне, якое атрымлівалася як міласціна, просты абутак, – усё сведчыць пра надзвычайную пакору і запавет беднасці. "Бедныя каталікі" настолькі строгія да саміх сябе, што рэгламентуюць нават колер ніжняй бялізны і абяцаюць не спаць на ложку (за выключэннем выпадкаў хваробы). Адмаўленне грошай: не браць ні золата, ні срэбра, ні ў якім разе ні ў якім выглядзе. "Бедныя ізноў далучаныя" (*падрабязней гл. Раздзел "Паўночна-італьянскія гарады-камуны"*) удакладняюць: нават у якасці аплаты сваёй працы. "Бедныя каталікі" ўвогуле абмяжоўваюць сваю працу выключна дабрачыннай дзейнасцю, а менавіта: утрыманне прытулку для вандроўнікаў, пакінутых дзяцей і жабракоў, дапамога пры родах, раздача міласціны. Францысканскі статут пакідае сваім паслядоўнікам поўную свабоду дзеянняў у галіне дабрачыннасці. Большую гнуткасць францысканцы праяўляюць і ў правілах датычна жанчын, "бедным ізноў далучаным" увогуле забараняецца размаўляць з прадстаўнікамі супрацьлеглага полу, Св. Францыск толькі раіць асцерагацца двухсэнсоўных размоў. Дастаткова строгія абмежаванні накладзены на валоданне маёмасцю: ні адзін з членаў не мае права на асабістую маёмасць, настойліва рэкамендуецца перад далучэннем да ордэна раздаць яе бедным.

Самыя істотныя адрозненні датычацца двух найважнейшых пытанняў: пра ўнутранае падпарадкаванне і пропаведзь. Статут францысканцаў прадугледжвае жорсткую ўнутраную субардынацыю, ні ў адным з вальдэнскіх статутаў пытанне ўнутранай арганізацыі ўвогуле не падымаецца. Асабліва пільная ўвага паўсюдна надаецца пропаведзі. Тут францысканцы праяўляюць нетыповую для іх катэгарычнасць. Яны жорстка патрабуюць, каб, па-першае, прапаведнік меў дазвол ад мясцовага біскупа (чым у свой час пагарджаў Вальдэс, чаму і атрымаў адлучэнне); па-другое, каб будучыя прапаведнікі былі праэкзаменаваныя генеральным міністрам[57]; па-трэцяе, даюцца ўказанні пра агульны напрамак пропаведзі. "Бедныя каталікі" падыходзяць да справы з прынцыпова іншай пазіцыі. У іх прысутнічае згадка пра неабходнасць атрымання ўхвалення ад прэлата і дазвол

[55] Erbstösser, *Ketzer im Mittelalter*, 108, 112.

[56] Устав ордена францисканцев, утвержденный буллой [1223 год] Библиотека Якова Кротова. Доступ 22.10.2022. http://krotov.info/acts/13/1/1223ustav.htm; PL 216:289–293, 601–602, 646–650.

[57] Кіраўнік ордэна.

прадстаўнікоў Царквы, але акцэнт робіцца на адукацыйным узроўні прапаведніка, яго знаёмстве з творамі Айцоў Царквы, свабоднай арыентацыі ў Святым Пісанні, уменні весці дыспуты. "Бедныя каталікі" і "бедныя ізноў далучаныя" прапаведвалі пераважна сярод катараў.

Вальдэнсы, якія вярнуліся ў каталіцтва, ставілі на першае месца нават барацьбу з ерассю (у тым ліку і са сваімі былымі паплечнікамі)[58] і дабрачыннае жыццё (у імкненні супрацьстаяць абвінавачанням у супрацьлеглым), пагарджаючы пры гэтым адміністрацыйным складнікам; французскія, наадварот, зрабілі стаўку на выразную ўнутраную структуру і працу з вернікамі, а таксама праявілі большую гнуткасць у пытаннях аскезы і дабрачыннасці. Пантыфік палічыў больш эфектыўным зацвердзіць арганізаванае таварыства беднякоў, а не хісткую групоўку інтэлектуалаў[59]. І ў святле вышэйсказанага цалкам натуральна, што ў далейшым большасць "бедных каталікоў" улілася ў ордэн прапаведнікаў (дамініканцаў), а не ў ад пачатку больш блізкі да іх ордэн францысканцаў.

Такім чынам, другі перыяд існавання "класічнага" вальдызму прывёў да якаснага змянення прыхільнікаў руху: шэраг адукаваных дзеячаў (патэнцыйных лідараў) вярнуліся да каталіцызму. Рух стаў вызнавацца афіцыйнай Царквой адназначна як ерэтычны. Для таго, каб выжыць у варожым асяроддзі, вальдэнсам трэба было або кансалідавацца, або прыстасавацца, або зрабіць і першае, і другое адначасова. Трэба ўлічваць, што лінія на прыстасаванне магла прывесці да памяншэння колькасці прыхільнікаў руху.

Супрацьстаянне вальдэнсаў з катарамі

У навуковых працах і дагэтуль часам атаясамліваюць катараў, вальдэнсаў і альбігойцаў. Тры гэтыя тэрміны сустракаюцца ў самых розных спалучэннях. Напрыклад, М. Асокін лічыў, што альбігойцы – гэта ерэтыкі поўдня Францыі часоў Высокага Сярэднявечча, якія ўключаюць у сябе катараў і вальдэнсаў[60].

---

[58] Claire Taylor, "A Presence in Languedoc (12th–13th Centuries)," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 35–77, 40.

[59] Прычын "поспеху" францысканцаў у параўнанні з вальдэнсамі магло быць болей. Бернар Фелікс бачыць яго прычыны ў тым, што, па-першае, Св. Францыск прапаведаваў у той час, калі ерасей баялiся менш, бо катарызм быў знішчаны (гэтае сцвярджэнне не адпавядае ісціне, бо, па-першае, катарызм існаваў яшчэ як мінімум 100 гадоў пасля Альбігойскага крыжовага паходу; па-другое, страх ерасей у Каталіцкай Царкве з цягам часу толькі ўзрастаў, і ганенні ўзмацняліся, што бачна па дзейнасці інквізіцыі, якая пачала актыўна развівацца акурат пасля 1229 г.; па-трэцяе, часовая прыкмета нерэлевантна для абсалютна сінхронных францысканцам "бедных ізноў далучаных"). Па-другое, вучоны сцвярджае, што асабіста Св. Францыск змог лепш прасунуць свае ідэі – з гэтым нельга не пагадзіцца, гледзячы на поспех яго ордэна. Падрабязней гл. Bernard Félix, *L'hérésie des pauvres: vie et rayonnement de Pierre Valdo* (Genève: Labor et Fides, 2002), 176–180.

[60] Николай Осокин, "Еретические верования," в *История ересей: Сборник* (Москва: АСТ, Хранитель, 2007), pp. 267–416, 410.

Сярод навукоўцаў не існуе кансэнсусу наконт паходжання катараў. Класічная канцэпцыя палягае ў тым, што катарскае вучэнне ў Еўропе з'явілася пад прамым уплывам багамільскага руху з Балкан[61]. Але існуе група рэвізіяністаў, якая сцвярджае, што гэты рух узнік без гэтага ўплыву, а як вынік чыста заходняй біблейнай экзэгезы (вывучэння Бібліі)[62]. Паміж гэтымі дзвюма групамі ў 2019 г. адбыўся калёквіум у Фанжо[63], дзе хоць і не быў дасягнуты кансэнсус, але былі прадстаўлены новыя крыніцы і іх інтэрпрэтацыі, якія адкрываюць шлях да новых даследаванняў.

Першай згадкай пра катараў на захадзе традыцыйна лічыцца 1143 г., калі канонік-прэманстрант Эвервін Штэйнфельдскі ў лісце да Св. Бернарда Клервоскага расказаў пра двух схопленых у Кёльне ерэтыкоў[64]. Сама назва "катары" паходзіць ад грэцкага καθαρός, што абазначае "чысты". Бенедыкцінскі манах Экберт з Шёнаў, які ўвёў у выкарыстанне гэты тэрмін для ерэтыкоў з Кёльна ў 1163 г., запазычыў яго разам з абазначэннем з прац Папы Інакенція I (401–417 гг.) пра познеантычныя ерасі[65]. Уве Брун, які дапусціў, што тэрмін "катары" мог быць і саманазвай, прасачыў яго шлях ад Экберта з Шёнаў праз пасярэдніцтва імперскага архіканцлера ў Італію да Папы, дзе ён спачатку пашырыўся на італьянскіх рэлігійных дысідэнтаў, а затым, праз працу Райнэрыя Саконі ў 1250 г., на французскіх "альбігойцаў"[66]. Тэрмін "катары" атрымаў распаўсюджанне пераважна на поўдні сучаснай Францыі, у ваколіцах горада Альбі (адсюль – "альбігойцы"[67]). Таксама яны сустракаюцца ў хроніках пад назвамі "балгары" (за сувязь з багаміламі) і "маніхеі" (за дуалістычныя ідэі). Саманазвамі для катараў (як, дарэчы, і для вальдэнсаў у XIV ст.) былі "добрыя людзі"[68] і "добрыя хрысціяне" – тыповыя для ерэтыкоў матывы супрацьпастаўлення сваёй Царквы як Царквы апостальскай і Царквы Рымскай як д'ябальскай.

---

[61] Théofanis Drakopoulos, *"L'unité de Bogomilo-Catharisme d'après quatre textes latins analysés à la lumière des sources byzantines"* (dissertation, 2010).

[62] Piotr Czarnecki, "If Not Bogomilism than What? the Origins of Catharism in the Light of the Sources," *Studia Ceranea. Journal of the Waldemar Ceran Research Centre for the History and Culture of the Mediterranean Area and South-East Europe* 11 (2021): pp. 51–73, https://doi.org/10.18778/2084-140x.11.03, 52.

[63] Jean-Louis Biget et al., *Le «Catharisme» en questions*, vol. 55 (Fanjeaux: Centre d'études historiques de Fanjeaux, 2020).

[64] Энрико Рипарелли, *Христианские ереси. Вчера и сегодня* (Москва: Ниола-Пресс: Вече, 2010), 57.

[65] Julien Théry-Astruc, "The Heretical Dissidence of the 'Good Men' in the Albigeois," in *Cathars in Question* (Woodbridge: York Medieval Press, 2016), pp. 79–111, 101.

[66] Uwe Brunn, *Des contestataires aux cathares: discours de réforme et propagande antihérétique dans les pays du Rhin et de la Meuse avant l'Inquisition* (Paris: Institut d'Études Augustiniennes, 2006), 364, 545, 547.

[67] Йозеф Лортц, *История Церкви рассмотренная в связи с историей идей* (Москва: Христианская Россия, 1999), http://krotov.info/spravki/1_history_bio/20_bio/lortz.html.

[68] Цяпер у гістарыяграфіі прасочваецца тэдэнцыя адмовы ад тэрміна "катары" на карысць тэрміна "добрыя людзі". Utz Tremp, "Ein Ausweg aus der Kontroverse um den «Katharismus»?," 666.

Цалкам рэканструяваць вучэнне катараў няма ніякай магчымасці таму, што яно вядома ў асноўным з тэкстаў палемічнага характару, складзеных праціўнікамі катараў, а таксама рэестраў інквізіцыі. Трактатаў, якія былі напісаны самімі катарамі і якім удалося пазбегнуць знішчэння, захавалася зусім няшмат. Адзін з іх, прысвечаны філасофскім развагам пра існаванне двух пачаткаў, дайшоў у складзе антыерэтычнага трактата Дуранда з Оскі.

Наступнае кароткае выкладанне катарскай дактрыны з'яўляецца найбольш кампрамісным і агульнапрынятым у сучаснай гістарыяграфіі.

Вучэнне катараў было заснавана на дуалізме. Вартасць для іх меў толькі дух і ўсё духоўнае. Матэрыяльны свет, на іх думку, гэта і ёсць пекла, у адрозненне ад свету духоўнага, у якім пануе дабро, праўда і прыгажосць. Яны адмаўлялі цялеснае ўвасабленне Хрыста (т. зв. дакетызм: Хрыстос валодаў толькі бачнасцю цела), супрацьпастаўлялі Новы і Стары Запаветы (вартасць мае толькі першы: побач з добрым богам Новага Запавету, які стварыў духоўны свет, існуе злы пачатак са Старога Запавету, які стварыў гэты свет і людзей у якасці цялеснай вязніцы для анёлаў). Паколькі яны катэгарычна не прымалі ўсё матэрыяльнае, а значыць, і цела як зло, то былі рэзкімі праціўнікамі царкоўных таінстваў, а асабліва еўхарыстыі. Галоўным сродкам атрымання Боскай ласкі, што дае поўнае адпушчэнне грахоў, з'яўлялася consolamentum (суцяшэнне) – абрад накладання рук, які здзяйсняўся "дасканалым" – членам секты, які атрымаў "суцяшэнне" раней і строга трымаўся вызначаных абмежаванняў. Секта падзялялася на нешматлікіх "дасканалых", якія вялі надта аскетычнае жыццё (не елі ніякіх прадуктаў жывёльнага паходжання, у тым ліку яек, малака, сыру; не ўступалі ў плоцевыя сувязі, нават не датыкаліся да супрацьлеглага полу, для чаго насілі пальчаткі; не кляліся і ўстрымліваліся ад любога гвалту), і простых вернікаў, якія прымалі "суцяшэнне" перад самай смерцю. Сярод вернікаў "дасканалыя" карысталіся безумоўным аўтарытэтам, выконваючы фактычна функцыі каталіцкіх святароў.

Сувязь катараў і маніхеяў, якая да сярэдзіны XIX ст. выглядала бясспрэчнай, можа быць лёгка абвергнута наступнымі доказамі: адсутнасць у Заходняй Еўропе нават згадвання пра пакланенне прароку Мані – фундаменту маніхейства, а таксама любых гімнаў і малітваў у яго гонар (катары, як і вальдэнсы, прызнавалі толькі адну малітву – "Ойча наш", хоць і выкарыстоўвалі яе ў зменены выглядзе). Таксама ў Заходняй Еўропе адсутнічала складаная касмагонія маніхеяў, няма нават намёку на распрацаваную іканаграфію і музычнае мастацтва, якія адыгрывалі значную ролю ў маніхействе. У апошнім яўна прасочваецца гнастычная аснова, у той час як у катарызме выратаванне ішло не праз веды, а праз абрад "суцяшэння".

Катарызм, у адрозненне ад вальдызму, не мае звестак пра дакладную дату ўзнікнення або асобу заснавальніка. Наўрад ці катары ўзніклі ў 1143 г., калі яны згадваюцца першы раз, хутчэй за ўсё, катарскі рух ужо меў доўгую гісторыю: у 1167 г. у Сэн-Фелікс (вёска ў Лангедоку) адбыўся сабор прадстаўнікоў катарскіх абшчын пад кіраўніцтвам святара Ніцэтаса,

які спецыяльна прыехаў з Канстанцінопаля. На ім прысутнічалі катарскія "біскупы", а таксама былі вызначаны межы іх "біскупстваў". Там праявілася рыса, якая (побач з дуалізмам) будзе кардынальна адрозніваць катарызм ад іншых сярэднявечных ерасяў: мэтай было не рэфармаванне Каталіцкай Царквы / паварот да яе вытокаў часоў апосталаў, а яе поўная замена[69].

Асабліва шырокае распаўсюджанне катары атрымалі на поўдні сучаснай Францыі і на поўначы Італіі. У XII і XIII стст. на фоне раздробленасці ўлады і моцнага антыклерыкалізму ўзнікае пагадненне паміж праціўнікамі Каталіцкай Царквы – з аднаго боку як палітычнага інстытута, а з другога – як рэлігійнай улады.

Рэшткі руху ў Францыі і Італіі былі знішчаны да пачатку XIV ст. інквізіцыяй, створанай адразу пасля крыжовага паходу спецыяльна з гэтымі мэтамі. Тыя, хто выжыў, сыходзяць у цяжкадаступныя горныя раёны Пірэнеяў і Заходніх Альпаў, дзе змешваюцца з вальдэнсамі і іншымі ўцекачамі.

Найбольш часта блытаюць між сабой катараў і вальдэнсаў. Тэндэнцыя гэта паходзіць яшчэ з першых антыерэтычных трактатаў[70]. Іх аўтары ў большасці сваёй былі прадстаўнікамі духавенства і абапіраліся на творы Айцоў Царквы, у тым ліку Грыгорыя Багаслова, Амвросія Медыяланскага і Грыгорыя Ніскага. У патрыстыцы ўтрымліваецца вялікая колькасць прац, прысвечаных барацьбе з ерэтыкамі: арыянамі, пелагіянамі, нестарыянамі і многімі іншымі. І паколькі іх творы лічыліся прыкладам, падрабязна вывучаліся, і раннехрысціянскія ерасі былі добра вядомымі, то іх рысы, а часам і назвы пераносіліся на рухі Высокага Сярэднявечча. Гэта другая прычына таго, што катары ў ерэтычных працах атрымалі назву "маніхеі", добра вядомую па творах Аўрэлія Аўгусціна. Часам пад гэта ж вызначэнне трапляюць і вальдэнсы. А з распаўсюджаннем назвы "катары" тэндэнцыя змяшэння катараў (як больш масавага і ўплывовага руху[71]) з вальдэнсамі становіцца пануючай. "Хроніка Альберта" можа служыць выразным прыкладам такой блытаніны; там у запісе пад 1233 г. апавядаецца аб смерці

---

[69] На дадзены момант у гістарыяграфіі пашыраецца меркаванне, што звесткі пра гэты сабор маглі быць падробкай XVII ст. Падрабязней у Peter Biller, "Heretics Doing Things Secretly," in *Secrets and Discovery in the Middle Ages. Proceedings of the 5th European Congress of the Fédération Internationale des Instituts D'études médiévales (Porto, 24 to 29 June 2013)*, vol. 90 (Turnhout: Brepols, 2018), pp. 15–26, 17; Jörg Feuchter, "The Heretici of Languedoc: Local Holy Men and Women or Organized Religious Group? New Evidence from Inquisitorial, Notarial and Historiographical Sources," in *Cathars in Question* (Woodbridge: York Medieval Press, 2016), pp. 112–130; Jean-Louis Biget, "Retour sur le 'concile de Saint-Félix'," in *Le «Catharisme» en questions*, vol. 55 (Fanjeaux: Centre d'études historiques de Fanjeaux, 2020), pp. 81–110; Utz Tremp, "Ein Ausweg aus der Kontroverse um den «Katharismus»?," 655. Але ў версіі, што сабор ўсё ж такі быў, ёсць свае прыхільнікі, напрыклад Bernard Hamilton, "Cathar Links with the Balkans and Byzantium," in *Cathars in Question* (Woodbridge: York Medieval Press, 2016), pp. 131–150, 141; Biller, "Goodbye to Catharism?," 293.

[70] Claire Taylor, "Catharism and Heresy in Milan," in *Heresy and the Making of European Culture: Medieval and Modern Perspectives* (Farnham: Ashgate, 2013), pp. 383–401, 172.

[71] Walter L. Wakefield, *Heresy, Crusade and Inquisition in Southern France, 1100–1250* (Berckeley: University of California Press, 1974), 188.

Конрада Марбургскага, які "ўзброены стараннем у веры супраць хітрых бедных з Ліёна", "імкнуўся выявіць калісьці таемную ерась маніхейскіх дачок"[72]. З іншага боку, самі інквізітары ў сваіх працах імкнуліся размежаваць гэтыя два рухі. Напрыклад, Пётр Селан задаваў удакладняльныя пытанні наконт перавагаў у ежы таго ці іншага ерэтычнага настаўніка, трымаючы пад увагай, што катарскія "дасканалыя" былі пераважна веганамі[73].

Для такога змяшэння павінны быць больш аб'ектыўныя прычыны, чым простая блытаніна тэрмінаў, бо калі вальдэнсаў часта называюць катарамі, адваротных прыкладаў амаль не сустракаецца. Гэта можа сведчыць пра ўплыў катарскай дагматыкі на вальдэнсаў. Ён мог быць абумоўлены, па-першае, тым, што арэалы іх дзеяння супадалі (хоць некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што вальдэнсы маглі перасяляцца на нейкія тэрыторыі спецыяльна, каб весці палеміку з катарамі[74]). Па-другое, само станаўленне дагматыкі паплечнікаў Вальдэса (мяжа XII і XIII стст.) прыпадае на максімальны росквіт альбігойства. Па-трэцяе, фактычна, узнікненне абедзвюх гэтых ерасяў было выклікана ў тым ліку і неабходнасцю адказу на нявырашаныя дагматычныя пытанні: агульным для іх было аспрэчванне манаполіі духавенства на рэлігійную сферу; спроба рэагавання на сацыяльна-эканамічныя змены, якія адбываліся ў грамадстве (узрастанне ролі грошай, маёмаснае расслаенне ўнутры саслоўяў і г. д.); катары ж таксама спрабавалі вызначыць дакладнае месца Д'ябла ў светабудове і знайсці прычыну зла на Зямлі.

Найбольш відавочным шляхам уплыву на вальдэнсаў катараў як больш моцнага, шматлікага і распаўсюджанага руху (хоць з цягам часу сітуацыя змянілася на супрацьлеглую[75]) магло стаць запазычанне першымі элементаў дуалістычнай і гнасеалагічнай дагматыкі. Пэўныя рысы і сапраўды прасочваюцца ў поглядах вальдэнскіх груп пачатку XIII ст. Іншыя сустракаюцца і ў канцы XIV ст. у тых рэгіёнах, дзе вальдэнсы найбольшы час суіснавалі поруч з катарамі. У 1387–1388 гг. інквізітарамі дамініканцамі Антоніем Сёмым з Савільяна і Томасам з Казаска была праведзена маштабная акцыя супраць вальдэнсаў Пінерола. Першае, што кідаецца ў вочы пры аналізе матэрыялаў допытаў, – гэта велізарная колькасць "маніхейскіх/катарскіх" элементаў вучэння, хоць гэтыя назвы ні разу не сустракаюцца ў тэксце, а вось "вальдэнсы" – шматкроць. Гаворка ідзе пра адмаўленне цялеснай прыроды Хрыста, яго пакут і ўваскрэсенне, "бо Бог не мог і не хацеў настолькі сябе прынізіць, каб прыняць людскую плоць"[76]. Таксама стваральнікам зямлі быў "вялікі дракон", які "мацнейшы за Бога

[72] "Chronica Alberici monachi Trium Fontium a monacho Novi Monasterii Hoiensis interpolata," in *Monumenta Germaniae Historica. Scriptores*, vol. 23, 1874, pp. 631–950, 931. [I.viii.c]
[73] Taylor, "A Presence in Languedoc," 42.
[74] Taylor, "A Presence in Languedoc," 36.
[75] Moore, *The Formation of a Persecuting Society*, 35.
[76] Döllinger, *Beiträge*, 259. [IV.iv]

ў гэтым свеце, таму яму трэба падпарадкоўвацца"[77]. Не раз рознымі дапытанымі згадваецца і тыпова катарскае "суцяшэнне" (consolamentum), якое прымалася часцей за ўсё перад смерцю, або тымі, хто хацеў стаць "святарамі", бо яно накладвала велізарныя абмежаванні: "настаўнік, які называецца сярод іх дасканалым, не павінен ніколі ні грашыць, ні датыкацца да чаго-небудзь зямнога; у знак гэтага яны заўсёды носяць з сабой пальчаткі, каб гэтага пазбегнуць, і маюць падрыхтаваны посуд, абмыты дзевяць разоў, з якога ядуць і п'юць"[78]. У канцы XIV ст. у Рэгенсбургу інквізітар Марцін Пражскі абвінаваціў вальдэнсаў у правядзенні абраду "суцяшэння"[79]. Магчыма, меў месца перанос паняццяў адной ерасі на другую, што было ўласціва тагачасным інквізітарам, або гэта – назва, дадзеная Марцінам вальдэнскаму абраду "ўскладання рук", які замяняў каталіцкае святарскае пасвячэнне.

Але асноўная роля катараў заключаецца ў станаўленні вальдэнскага руху як руху прапаведніцкага. Калі б катарызм не быў да такой ступені распаўсюджаным, не было б такой пільнай неабходнасці ў пропаведзі, і тым больш не ставілася б пытанне аб удзеле вальдэнсаў у нейкім змаганні супраць адступнікаў. А між тым менавіта гэта станавілася адной з асноўных мэт вальдэнскага руху. Нагадаем, што менавіта прага пропаведзі прывяла да выгнання вальдэнсаў з Ліёна, а потым і да канчатковага разрыву з Каталіцкай Царквой.

Тыя групы вальдэнсаў, якія пажадалі вярнуцца ва ўлонне Рымскай Царквы, неаднаразова ў сваіх статутах падкрэслівалі намер змагацца з ерэтыкамі. "Бедныя каталікі", якія сталіся папярэднікамі ордэна дамініканцаў, ужо ў сваёй Споведзі веры і статуце выяўляюць цвёрдую скіраванасць на барацьбу з ерэтыкамі. Кандыдаты ў шэрагі паслядоўнікаў Дуранда павінны быць дасведчаныя ў прапаведаванні і дыспутах супраць ерэтыкоў. Спачатку прыводзіўся тэзіс, затым ішлі auctoritates – доказы-цытаты пераважна са Святога Пісання, зрэдку з Айцоў Царквы, а затым rationes – лагічныя доказы. Далей прыводзіліся ў аналагічным парадку пазіцыі суразмоўцаў[80].

"Бедныя зноў далучаныя" паўтараюць апошнюю частку і дадаюць са свайго боку: "Але больш паважаных і дасведчаных у Законе Божых і ў прамовах Святых Айцоў мы прызначылі выкладаць слова Госпада, па дамоўленасці і ўзгадненні з прэлатамі Царквы, братам і сёстрам, клірыкам і міранам, каб вучыліся неабходнаму для пераваротy ерэтыкоў"[81]. "З іншага боку, мы маем наказ маліцца, каб Бог даў працаўнікоў у жніво сваё, гэта значыць прарокаў у народ свой, якія павінны пакорліва і прыніжана вымольваць, каб найвышэйшы пантыфік і прэлаты Царквы далі ім да-

[77] Döllinger, *Beiträge*, 259. [IV.iv.b]
[78] Döllinger, *Beiträge*, 272. [IV.iv.b]
[79] Leff, *Heresy*, 478–479.
[80] Biller, "Goodbye to Catharism?," 299.
[81] PL 216:649. [I.ii.c.137]

звол, каб яны маглі падахвочваць і прапаведаваць у выратавальнай дактрыне і супраць усіх ерэтыкоў пры падтрымцы міласці Божай, з усёй мужнасцю і стараннем душы, упарта працаваць, каб яны павярнуліся да веры каталіцкай, і вернікаў іх шляхам прыватных і публічных угаворванняў, як належыць, ад іх вераванняў і ерасі аддзяляць, і ў вышэйназваную Царкву ўключаць, і ад усіх заган і грахоў, і, натуральна, ад гордасці, пустой славы, зайздрасці, гневу, пыхі і сквапнасці, крыважэрнасці, раскошы, ілжы, рабаўніцтва, блюзнерства, нянавісці, падману, клятваадступніцтва і забойства стрымліваць, як саміх сябе, так і сваіх слухачоў!"[82]

Барацьба з катарамі магла прыводзіць не толькі да канфліктаў з-за права прапаведаваць, але і да выразна ерэтычных дзеянняў, такіх, напрыклад, як самавольнае, мірское здзяйсненне абраду еўхарыстыі. Прычашчэнне да Цела Хрыстова магло мець сэнс толькі ў тым выпадку, калі гэтае цела матэрыяльна прысутнічала і было свяшчэнным, што катэгарычна адмаўлялася катарамі. Для іх усё плоцевае было грахоўным, нячыстым. І, каб даць магчымасць сапраўдным хрысціянам, якія вымушаны жыць у "варожым" атачэнні, далучыцца да царкоўных таінстваў, "бедныя зноў далучаныя" арганізоўвалі свае Святыя Вячэры: "бо ніколі [гэта] не было зроблена ні з прычыны папярэджання, ні з прычыны пагарды да ахвярапрынашэння святара, але з прычыны старання веры і павагі ды з прычыны ўдумлівых разваг, каб не закасцянелі простыя верныя, што заставаліся між ерэтыкоў і не прымалі таінства еўхарыстыі"[83].

Аналіз споведзяў веры Вальдэса, Дуранда з "бедных каталікоў" і Бернарда з "бедных ізноў далучаных", праведзены Ж. Ганэ[84], паказвае, што іх некаторыя пункты напісаны спецыяльна "ў піку" катарам. На яго думку, гэта: Ушэсце Хрыста, хрышчэнне немаўлят, боскае паходжанне абодвух Запаветаў, прырода Д'ябла, уваскрэсенне ў сваёй плоці і непарушнасць шлюбу (бо ён заключаны на нябёсах, з катарскага ж пункту погляду – ён плоцевы, таму зямны). Але калі яшчэ раз звярнуцца да гэтых споведзяў, пададзены вышэй спіс можна дапоўніць наступным: прызнанне Тройцы; святасці Яна Хрысціцеля; шматразовае падкрэсліванне плоцевай існасці Ісуса, яго цялеснай смерці і цялеснага ўваскрэсення; узвялічванне Царквы, па-за якой няма выратавання, а таксама царкоўнай іерархіі, абрадаў і дзесяцін; антыданатызм; прызнанне святасці ўсіх таінстваў; уваскрэсенне ў сваёй плоці і магчымасць дапамогі жывых мёртвым[85]. Фактычна, гэта ўсе пункты яго споведзі, што абазначае вырашальны ўплыў катарскага вучэння на фарміраванне дактрыны вальдэнсаў.

---

[82] PL 216:291–292. [I.ii.c.96]

[83] PL 216:291. [I.ii.c.96]

[84] Giovanni Gonnet, *Le confessioni di fede valdesi prima della Riforma* (Torino: Claudiana, 1967), 9–53.

[85] PL 216:289–292. [I.ii.c.96]

Для доказу сваёй данатысцкай пазіцыі вальдэнсы Ламбардыі каля 1235 г. прапанавалі велізарную колькасць цытат з Айцоў Царквы і Свяшчэннага Пісання, прычым, як з Новага, так і са Старога Запаветаў, што вельмі выразна падкрэслівае іх дыстанцыяванне ад катараў. Гэта вельмі важны момант, бо з падачы першых інквізітараў, якія часта не асабліва спрабавалі разабрацца ў сутнасці ерасі, у частцы больш позняй гістарыяграфіі замацаваўся памылковы пункт погляду пра атаясамленне вальдэнсаў і катараў, а таксама петрабрузіянцаў[86] (або апошніх маглі лічыць прамымі папярэднікамі вальдэнсаў[87]).

Такім чынам, не выклікае сумненняў антыкатарская скіраванасць вальдэнсаў да 1230-х гг. Ёсць усе падставы сцвярджаць, што ў супрацьстаянні з катарамі рух радыкалізаваўся, выкрышталізаваў сваю дактрыну цягам публічных дыспутаў і нават вымушаны быў парваць з Каталіцкай Царквой з-за забароны ім прапаведаваць. З іншага боку, некаторыя даследчыкі адзначаюць, што гэтае супрацьстаянне знікае пасля Альбігойскага крыжовага паходу (1209–1229 гг.), бо рэшткі катараў і вальдэнсы, якія канчаткова апынуліся па-за межамі каталіцкага свету, вымушаны былі супрацоўнічаць дзеля выжывання[88].

Заканчэнне другога перыяду існавання "класічнага" вальдызму адносіцца да 1260-х гг. Яго характэрнымі рысамі былі: вяртанне некаторых вальдэнсаў да каталіцызму, пераход часткі вальдэнсаў у катарызм, кансалідацыя вальдэнскага веравучэння падчас дыспутаў з каталікамі і катарамі. У выніку на першым плане была мірская пропаведзь, якую распачаў сам Вальдэнс.

Менавіта яго прапаведніцкая дзейнасць і жаданне атрымаць легітымізацыю ад самога Папы Рымскага сталі цэнтральнай воссю, вакол якой пачала ўтварацца першая вальдэнская абшчына, спачатку неарганізаваная, што складалася з вандроўных прапаведнікаў, якія імкнуліся пашыраць ідэі Вальдэса ў тым выглядзе, у якім яны самі іх разумелі. Частковае відазмяненне гэтых ідэй па меры аддалення ад цэнтральнай восі – асобы Вальдэса, а таксама канфлікт з мясцовымі ўладамі з-за забароны мірской пропаведзі прывёў да супрацьстаяння з Каталіцкай Царквой і, як вынік, забароны вальдэнскага руху як ерэтычнага.

---

[86] Thomas Armitage, *A History of the Baptists: Traced by Their Vital Principles and Practices, from the Time of Our Lord and Saviour Jesus Christ to the Year 1886* (Paris (Ark.): Baptist standard bearer, 2001), 302.

[87] Raoul Manselli, *Studi sulle eresie del secolo XII*, 2nd ed. (Roma: Istituto storico italiano per il medio evo, 1975), 74, 91–92.

[88] Molnár, *La protesta valdese*, 7–8.

"Класічны" вальдызм і яго адметнасці

Структура вальдэнскай абшчыны

Ужо ў часы Вальдэса фарміруецца структура вальдэнскай абшчыны, якая існавала на працягу стагоддзяў амаль ва ўсіх рэгіёнах распаўсюджання руху. Яна адпавядала пашыранай у тыя часы схеме падзелу ўсіх вандроўных ерэтычных рухаў апостальскай беднасці, карані якой можна назіраць у Патарыі XI ст. У цэнтры знаходзілася клерыкальнае ядро, абкружанае шырокім колам звычайных вернікаў. Такая "тэкстуальная супольнасць" аб'ядноўвалася вакол пісьмовага тэкста (Бібліі) і пашыралася праз пропаведзь[1]. Ад самага пачатку секта падзялілася на "вандроўных" (бо "той, хто вандруе, бліжэй да Бога"[2]) "настаўнікаў/дасканалых" (яшчэ сустракаюцца назвы "ўладар" (dominus), "спаведнік" (confessor), "прапаведнік" (predicator), "ерэсіярх" (heresiarchus) і інш.) і проста "вернікаў"[3]. Іншыя крыніцы называюць "настаўнікаў", напрыклад, "братамі і сёстрамі", а вернікаў – "сябрамі і сяброўкамі"[4]. Падобны падзел усіх паслядоўнікаў руху на тых, хто вядзе свецкае жыццё, і на тых, хто вядзе духоўнае, назіраецца як у альбігойцаў, так і ў францысканцаў.

Знешнія прыкметы першай групы

"Гэтых дасканалых ерэтыкоў адных называюць «абутымі ў сандалі» (sandaliati), а іншых – «новенькімі» (novellani)", – піша аўтар трактата "De vita"[5] пра "ступені" "настаўнікаў"[6]. Пётр з Во-дэ-Сэрнэ каля 1213 г. сцвярджае, што першую назву яны атрымалі з-за прагі да "выказвання сваёй выключнасці ў нашэнні сандаляў па прыкладзе апосталаў"[7]. Размежаванне паміж дзвюма групамі магло знаходзіць адлюстраванне і ў знешнасці:

---

[1] Brian Stock, *The Implications of Literacy: Written Language and Models of Interpretation in the Eleventh and Twelfth Centuries* (Princeton: Princeton University Press, 1983), 235.

[2] *Raymond de Sainte-Foy, Deacon of the Vaudois Sect. Confession 3*, accessed 22.10.2022, https://www.sjsu.edu/people/nancy.stork/jacquesfournier/Raymond-de-Sainte-Foy-FINAL.pdf, 24. [III.iv.a]

[3] Caterina Bruschi, "De vita et actibus Pauperes de Lugduno," in *Texts and the Repression of Medieval Heresy* (Woodbridge: York Medieval Press, 2003), pp. 196–207, 196. [III.vii]

[4] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 42. [I.vii]

[5] "Пра жыццё і дзеі бедных з Ліёна" (De vita et actibus Pauperes de Lugduno), далей De vita – апісанне вальдэнскай абшчыны ваколіц Тулузы другой чвэрці XIV ст. [III.vii]

[6] Bruschi, "De vita et actibus Pauperes de Lugduno," 196. [III.vii]

[7] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 168; Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 240–241. [II.ix]

"таму што калісьці ад самага пачатку вальдэнскія дасканалыя спецыяльны знак паказвалі, як быццам бы зразаючы верхнюю частку абутку, і гэтым знакам яны ад іншых сваіх набліжаных (complicibus) і вернікаў адрозніваліся", – піша Бернард Гі ў сваім падручніку для інквізітараў (1323 г.)[8]. "Таксама абутыя ў сандалі сярод іх, якія называюцца святарамі, носяць адну доўгую туніку і ходзяць босымі або абутымі ў адкрытыя зверху сандалі"[9]. Спецыфічны абутак (сандалі) становіцца адрознай прыкметай вандроўных вальдэнскіх прапаведнікаў нароўні з арыентацыяй на Пісанне[10] і нават дае альтэрнатыўную назву ўсяму руху: "таксама хочуць называцца «тымі, хто носіць сандалі» (xabatentes) ад назвы грубых сандаляў (xabata) нават больш, чым хрысціянамі ад Хрыста" (каля 1210–1212 г.)[11]. Гэта невыпадкова, бо пытанне адзення і прычоскі (манаскай танзуры) было пытаннем статусу ў Сярэднявеччы. Нашэнне вальдэнсамі "манаскіх" сандаляў успрымалася каталіцкімі іерархамі, як парушэнне манаполіі Рымскай Царквы ў духоўнай сферы[12]. Да сярэдзіны XIV ст. вальдэнскія "святары" дэманстравалі свой статус амаль адкрыта (у тым ліку праз абутак), пазней, у сувязі з узмацненнем інквізіцыйнага вышуку, згадкі пра асаблівы іх абутак або адзенне знікаюць з крыніц.

Згадка пра адкрыты абутак вальдэнсаў сустракаецца толькі ў крыніцах датычна Францыі і Італіі, часткова паўднёва-заходняй Германіі, але адсутнічае адносна ўсходніх і паўночных тэрыторый. Мяркую, што гэта было звязана з неспрыяльнымі кліматычнымі ўмовамі.

Акрамя сандаляў, некаторыя вальдэнсы насілі манаскі строй, што выклікала абурэнне з боку афіцыйнага кліру[13]. Вядома таксама, што вальдэнак можна было адрозніць знешне па вопратцы[14].

Абавязкі розных груп

Розныя групы паводле крыніц маюць розныя абавязкі: першыя "не працуюць, нічога не набываюць і не атрымліваюць прыбытку, на які маглі б выжываць, але на даброты і міласціну сваіх сяброў і вернікаў існуюць і жывуць, шчыра клапоцячыся пра навучанне. А іх сябры і вернікі маюць маёмасць і бяруць шлюб, гандлююць, вядуць справы, набываюць і атрымліваюць прыбытак для сваіх ерэтыкоў-дасканалых, якія іх наведваюць, прапаведуюць і ратуюць"[15], – тлумачыць складальнік "De vita".

---

[8] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 245. [III.vi.2]

[9] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 142. [II.xvii.12]

[10] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 59–62.

[11] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 144. [II.vi]

[12] Adam L. Hoose, "The 'Sabatati': the Significance of Early Waldensian Shoes, c. 1184 – c. 1300," *Speculum* 91, no. 2 (April 2016): pp. 356–373, https://doi.org/10.1086/685025, 357.

[13] "Burchardi et Cuonradi Urspergensium Chronicon," in *Monumenta Germaniae Historica. Scriptores*, vol. 23 (Hannoverae: impensis bibliopolii Hahniani, 1974), pp. 333–390, 376. [I.viii.b]

[14] Peter Biller, "Interrogation of Waldensians," in *Medieval Christianity in Practice* (Princeton, N.J: Princeton University Press, 2009), pp. 231–237, 235.

[15] Bruschi, "De vita et actibus Pauperes de Lugduno," 196. [III.vii]

У інквізітарскіх матэрыялах XIII ст. удакладняецца: вернікі "часта наведваліся вальдэнсамі[16], ці слухалі іх пропаведзі, ці прымалі іх, ці рабілі ім іншыя паслугі, і прымалі ад іх пацалунак міру"[17]; "быў пад уплывам ерэтыкоў-вальдэнсаў на працягу сарака гадоў, наведваўся імі і грошы і іншае ім аддаваў"[18]; "...многія і многія разы прымала, ведаючы, што гэта ерэтыкі-вальдэнсы, ела з імі хлеб, бласлаўлёны вальдэнсамі, за Вячэрай Гасподняй у доме тваім, і слухала іх пагібельныя нагаворы"[19]. У гэтым яны нагадвалі тэрцыярыяў. Колькасць тэрцыярскіх арганізацый імкліва расце акурат у часы Інакенція III[20], і вальдэнскія "вернікі" цалкам упісваюцца ў гэты шаблон.

Праўда, цвёрдасць такіх "вернікаў" была слабая, бо падчас інквізіцыйных працэсаў яны часта раскайваліся, а ранейшыя паводзіны тлумачылі сваёй верай у тое, што "вальдэнсы – добрыя людзі і сябры Бога, і ў стане выратавацца, і гэтаму выратаванню вучаць іншых, калі хто хацеў далучыцца да іх, і ты прымала іх па той прычыне, што верыла, што яны – добрыя людзі"[21]. Калі ж высвятлялася, што гэтыя "добрыя людзі" адлучаныя ад Царквы, – многія вернікі ад іх адварочваліся.

Такім чынам, абавязкі "настаўнікаў" складаліся з:

1. Пропаведзі (галоўная тэза на першым этапе развіцця руху; з узмацненнем інквізіцыйнага пераследу публічная пропаведзь знікае, саступаючы месца навучанню);

2. Навучання (у шматлікіх крыніцах згадваюцца вальдэнскія "школы", але "праграма" іх застаецца невядомай: дакладна практыкавалася завучванне вытрымак з Біблії на памяць, магчыма – чытанне і пісьмо. Наконт астатняга вядуцца спрэчкі. Прынамсі, пры пераходзе ў "настаўнікі" ўзровень адукацыі не павышаўся[22]);

3. Прыняцця споведзі і адпускання грахоў. "Свае грахі спавядалі вальдэнсам, як павінны былі спавядаць святарам"[23];

4. Бласлаўлення віна, хлеба і рыбы, правядзення Святой Вячэры: "ужывалі хлеб і рыбу ў дні вячэры згодна з праклятым сваім звычаем па бласлаўленню вальдэнсаў ... бо верылі, што вальдэнсы так асвячаюць Цела Гасподняе"[24].

---

[16] У абсалютнай большасці інквізіцыйных матэрыялаў "вальдэнсамі" (або сінонімамі руху) называлі толькі прадстаўнікоў першай групы. Herbert Grundmann, *Religious Movements in the Middle Ages: The Historical Links between Heresy, the Mendicant Orders, and the Women's Religious Movement in the Twelfth and Thirteenth Century, with the Historical Foundations of German Mysticism* (Notre Dame: University of Notre Dame Press, 2005), 52.

[17] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 50–54. [III.i.a]

[18] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 55–56. [III.i.b]

[19] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 59–62. [III.i.e]

[20] Powell, "Religious Diversity," 367.

[21] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 59–62. [III.i.e]

[22] Patschovsky, "The Literacy of Waldensianism," 129.

[23] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 50–54. [III.i.a]

[24] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 50–54. [III.i.a]

У некаторых рэгіёнах "настаўнікі" атрымлівалі прафесіі, якія б хавалі іх перамяшчэнні. Часцей за ўсё гэта быў гандаль[25] (або гандаль фіктыўны[26]). Але ў Керсі згаданыя рэдкія для вальдэнсаў спецыяльнасці бондара[27], урача[28] і "асобы, якая мыла галовы"[29]. Магчыма, апошнія дзве прафесіі спалучаліся і з духоўнай дапамогай.

Кіраўніцтва асобнымі абшчынамі і ўсім рухам

Сістэма кіраўніцтва складваецца пасля смерці Вальдэса, які быў рашуча супраць любога кіраўніцтва. Яна была выбарнай: "выбіраюць разам пажыццёвых старшыняў (praepositosa eternaliter) ці часовых кіраўнікоў (rectores ad tempo)"[30]. Ламбардскую абшчыну ў 1218 г. узначальваў "сабрат" (confrater) Ота з Рамецэла. Праз сто гадоў пасля яго смерці Бернард Гі пазначае: "вальдэнсы маюць і паставілі сабе адзінага галоўнага над сабой, якога называюць сваім Найвялікшым (Majoralem), якому ўсе падпарадкоўваюцца, як усе каталікі ў падпарадкаванні Уладару Папу"[31]. Важныя звесткі ёсць у адным з вроцлаўскіх манускрыптаў: для ўсёй нямецкамоўнай вальдэнскай зоны існаваў "галава ўсіх Апосталаў", т. зв. "самы галоўны" (supremus). У XIV ст. ім з'яўляўся Ганс з Польшчы, сын нямецкіх сялянаў, якія перасяліліся на польскія землі ў пачатку стагоддзя[32]. Інквізітары дамініканец Антоній Сёмы з Савільяна і францысканец Томас з Казаска ў 1387–1388 гг. запісалі ад вальдэнса Пінерола (Савоя) звесткі, што "найвышэйшы пантыфік (summus Pontifex) паходзіць з яго секты і пражывае ў Апуліі"[33]. Вядома, што згаданы вальдэнскі "Папа" даслаў свайго "міністра" Яна Барыдона[34].

У лісце ламбардскіх вальдэнсаў сваім нямецкамоўным адзінаверцам пра сваю сустрэчу з прадстаўнікамі французскай галіны руху, якая адбылася ў 1218 г. у Бергама (далей – Рэскрыпт), ёсць згадкі пра савет абшчыны, праўда, нічога канкрэтнага не гаворыцца, што не дазваляе выказаць якія-небудзь абгрунтаваныя меркаванні пра яго функцыі, склад, паўнамоцтвы і г. д. Магчыма, гэта быў галоўны орган абшчыны, а "сабрат" выконваў толькі адміністрацыйныя функцыі[35]. На падставе Рэскрыпта можна зрабіць выснову, што абшчына валодала таксама судовымі функцыямі: згадваецца абвінавачаны брат Томас, які павінен быў перад ёй апраўдацца[36].

---

[25] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 164.
[26] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 249.
[27] *L'inquisition en Quercy*, 136. [III.ii]
[28] *L'inquisition en Quercy*, 36, 58, 124 і інш. [III.ii]
[29] *L'inquisition en Quercy*, 92. [III.ii]
[30] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 23. [I.vii]
[31] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 248. [III.vi.5]
[32] Jarosław Szymański, "*Articuli secte Waldensium* na tle antyheretyckich zbiorów rękopiśmiennych Biblioteki Uniwersytetu Wrocławskiego," *Studia Źródłoznawcze* 42 (2004): pp. 85–96, 92. [VII.v.f]
[33] Döllinger, *Beiträge*, 252. [IV.iv.b]
[34] Döllinger, *Beiträge*, 253. [IV.iv.b]
[35] Карсавин, *Сочинения*, 133.
[36] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 26. [I.vii]

У трактаце "De vita" ўтрымліваюцца найкаштоўнейшыя звесткі пра эканамічны аспект жыцця вальдэнскіх абшчын: "большасць грошай, на якія яны [французскія вальдэнсы] жылі, паходзіла з Германіі"; і іх унутраную арганізацыю – на кожным вальдэнскім сінодзе (capitulum generale) прысутнічалі тры ці чатыры нямецкія вальдэнсы[37]. Падобныя звесткі даюць і акты Каркасонскай інквізіцыі: "Таксама робяць зборы са сваіх вернікаў і сяброў, і тое, што дадзена і сабрана, перадаюць свайму кіраўніцтву. Таксама кожны год трымаюць ці праводзяць адзін ці два генеральныя капітулы (capitula generalia)"[38]. У 1231 г. у Аналах горада Марбах паведамляецца, што нямецкія вальдэнсы кожны год высылалі ў Мілан "аброк"[39]. Яшчэ больш звестак даюць матэрыялы інквізіцыйных допытаў Пятра Цвікера ў Памор'і ў канцы XIV ст.: арганізацыйна невялікая абшчына магла мець свайго скарбніка, які ў тым ліку збіраў грошы на "ўтрыманне" вандроўных вальдэнсаў[40]. Невядома, ці скарбнік праходзіў абрад рукапакладання, бо ў крыніцах няма звестак пра выкананне ім "магістарскіх" абавязкаў, за выключэннем хрышчэння дзяцей. Я лічу, што раз няма доказаў таго, што яны прымаюць споведзі і накладаюць пакаянне, няма падстаў казаць пра іх высокі статус. Хутчэй, гэта была чыста адміністрацыйная пасада, якая сведчыла аб становішчы вальдэнсаў у Заходнім Памор'і. Такая ступень складанасці ў структуры секты магла ўзнікнуць толькі ва ўмовах працяглага пражывання вялікай колькасці яе паслядоўнікаў у адным месцы.

У вальдэнсаў існавалі "гаспіцыі" (дамы для вандроўнікаў), дзе спыняліся вальдэнсы падчас вандровак. У кожнага з такіх дамоў быў свой кіраўнік, абавязкова з "настаўнікаў" (бо здзяйсняў навучанне і бласлаўленне ежы, а таксама іншыя "святарскія" абавязкі), у тэрміналогіі крыніцы – "рэктар"[41]. Гаспіцыі маглі быць двух тыпаў: выключна жаночыя на ўзор катарскіх[42], або дзе жанчыны і мужчыны жылі сумесна "два ці тры ў кожным гаспіцыі, з дзвюма ці трыма жанчынамі, якія прыкідваюцца іх сёстрамі ці жонкамі"[43]. П'ерэт Параві мяркуе, што вальдэнскі "настаўнік" Раймунд дэ ла Коста таксама жыў у падобным гаспіцыі на манер тых, што існавалі таксама ў Сэн-Жылі, Монпелье і Тулузе: такое задзіночанне сяброў, дзе жыве "настаўнік", яго слуга, пажылая жанчына, якая клапоціцца пра дабрабыт, а таксама вернікі, якія сваёй працай забяспечваюць існаванне дома. Туды ж

---

[37] Bruschi, "De vita et actibus Pauperes de Lugduno," 201–202. [III.vii]

[38] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 248. [III.vi.5]

[39] "Annales Marbacenses a. 631–1375," in *Monumenta Germaniae Historica. Scriptorum*, vol. 17, 1861, pp. 142–180, 176.

[40] Edward Rymar, "Waldensi z «kacerskich» okolic Chojny w XIV–XV wieku," in *Rocznik Chojenski: pismo historyczno-społeczne* (Chojna: Stow. Hist.-Kulturalne „Terra incognita», 2009), pp. 7–33, 17; Szymański, *Ruchy heretyckie na Śląsku*, 64; Wilhelm Wattenbach, Über die Inquisition gegen die Waldenser in Pommern und der Mark Brandenburg (Verlag der Königl. Akademie der Wissenschaften, 1886), 22.

[41] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 180. [III.vii]

[42] PL 216:601.

[43] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 180. [III.vii]

прыходзяць іншыя вернікі і тыя, хто ім спачувае, каб паслухаць пропаведзь і разнесці пра яе весткі далей[44].

Натуральна, што такі тып жыцця "ўперамешку" крытыкаваўся і Царквой, і грамадствам[45]. Варта падкрэсліць, што з'яўленне падобных "прамежкавых" ступеняў было магчыма толькі ў рэгіёнах, дзе "вернікі" пражывалі стала, працяглы час і вялікімі групамі. Храналагічна такое ўскладненне структуры адбылося прыкладна праз 100 гадоў пасля ўзнікнення руху.

Царкоўныя чыны сярод "дасканалых"

Унутры "дасканалых" ідзе падзел на царкоўныя чыны: існуе інстытут біскупства (біскуп мог называцца "галоўны" або "міністр"), прэсвітарыят і дэканат[46]. Пасвячэнне ў сан падрабязна апісана ў Рэскрыпце: у абшчыне "ламбардцаў" у выбары біскупаў прымалі ўдзел усе вернікі, "лiёнцы" ж дапускалі толькі тых, хто падняўся да ступеняў дыяканаў і прэсвітараў[47]. У апісанні непасрэдна механізму сустракаюцца розначытанні:

✠ Пасаўскі ананім увогуле абвяргае існаванне працэдуры пасвячэння: "Пра таінства пасвячэння кажуць, што гэта нішто, таму што апосталы былі міране"[48].

✠ Ансельм з Александрыі, наадварот, сцвярджае: "іх святары і біскуп уступаюць у сан праз накладанне рук"[49]. Аналагічны рытуал адзначае ў 1318 г. інквізітар Жан Фурнье ў Францыі[50].

✠ Разгорнутае апісанне цырыманіялу пераходу чалавека з "вучнёўскага" стану да паўнавартасных прапаведнікаў (які ўключаў у сябе рукапакладанне) апісаны інквізітарам Пятром Цвікерам у 1391 г.[51]

Але тэрміны, якія ўжывалі ў дачыненні да вальдэнсаў інквізітары (тыпу "біскуп" або "пантыфік"), на дадзены момант з'яўляюцца спрэчнымі. Няма пацвярджэння выкарыстання іх самімі вальдэнсамі, нават калі гэтыя словы ўкладзены ў вусны дапытаных, як у "спісе памылак пражскага магістра" Якуба з Петрыкава ад 1395 г. "ёсць толькі тры царкоўныя чыны, а менавіта: свяшчэнства, біскупства і дыяканат"[52]. Магчыма, ідзе гаворка пра механічнае перанясенне каталіцкімі аўтарамі структуры Рымскай Царквы.

---

[44] Paravy, *De la chrétienté romaine à la Réforme en Dauphiné*, 929.
[45] Augusto Armand-Hugon, *La donna nella storia valdese* (Torre Pellice: Società di studi valdesi, 1980), 4.
[46] Döllinger, *Beiträge*, 128. [III.iv.a]
[47] Giovanni Gonnet, *Il valdismo medioevale: Prolegomeni* (Torre Pellice: Società di Studi Valdesi, 1942), 50–51.
[48] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 89. [V.i]
[49] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 142. [II.xvii.12]
[50] Döllinger, *Beiträge*, 128. [III.iv.a]
[51] Döllinger, *Beiträge*, 367–369. [VII.v.a]
[52] Holinka, "Sektářství v Čechách," 181. [VI.vi]

Напачатку вальдызму, як і ўсім ерэтычным рухам, быў уласцівы эгалітарызм[53] і "свабода" па кантрасце з афіцыйнай Царквой[54]. Але з цягам часу структура абшчыны ўскладнілася, ад імітацыі Апосталаў вальдэнсы паступова, з сярэдзіны XIII ст., пераходзяць да арганізаванай пастырскай структуры[55]. На пачатак XV ст. вальдэнскую абшчыну можна прадставіць у выглядзе наступнай схемы:



Структура вальдэнскай абшчыны

На дадзены момант адкрытымі застаюцца наступныя пытанні: "Supremus" нямецкамоўнага рэгіёну і "найвышэйшы пантыфік" з Апуліі – гэта адзін і той жа чалавек ці розныя? Наколькі маналітным быў рух? Але яны яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

Веравучэнне "класічнага" вальдызму паводле Пасаўскага ананіма

Вельмі дакладную карціну кансалідаванага "класічнага" вальдызму нямецкамоўнага рэгіёну прапануе Пасаўскі ананім – адзін з найбольш маштабных твораў па гісторыі вальдэнсаў XIII ст. Адрозная рыса крыніцы – адсутнасць падзелу саміх вальдэнсаў на дзве вышэйапісаныя групы. Паводле яго ўсе павінны прапаведаваць, прычым на "народнай" мове[56], і мужчыны,

[53] Stock, *The Implications of Literacy*, 94.
[54] Bruschi, *The Wandering Heretics*, 117.
[55] Bruschi, *The Wandering Heretics*, 126.
[56] Зазначым, што ідэя пропаведзі на "народнай" мове падзялялася таксама і каталіцкімі палемістамі. Reima Välimäki, "Transfers of Anti-Waldensian Material from a Polemical Treatise to a

і жанчыны, і нават дзеці прымалі ўдзел у навучанні. "Мужчыны і жанчыны, стары і малы, дзень і ноч не перастаюць вучыць і вучыцца... вучаць таксама ў лепразорыі... Таксама кажуць, што кожны чалавек, у тым ліку жанчына, павінен прапаведаваць"[57]. Напісана, што вальдэнскія "школы" былі ў дзесяці гарадах: Анзбаху, Олерсбаху, Санкт-Пётр-ін-дэр-Аў, Штайеры, Сірнінгу, Кематэне, Нойхофене, Энсе, Штратцынгу і Ленгенфельдзе. "Ва ўсіх гарадах Ламбардыі і ў правінцыі Праванс, і ў многіх каралеўствах і землях ёсць тэалагічныя ерэтычныя школы"[58].

Практыкаваліся самыя простыя таінствы. У супрацьвагу каталіцкім святарам, якія крытыкаваліся за накладанне вельмі цяжкіх пакаянняў, самі вальдэнсы, падобна Хрысту, накладвалі рукі і адпускалі са словамі "ідзі і не грашы больш". Яны практыкавалі штодзённае прычасце (якое маглі здзяйсняць як мужчына, так і жанчына) і адмаўлялі імшы: іх супольная вячэра з бласлаўленнем ежы была хутчэй не еўхарыстыяй, а праявай групавой салідарнасці.

Тэкст у той частцы, дзе аўтар перадае цытатамі пункт погляду саміх вальдэнсаў, утрымлівае не толькі вытрымкі з Біблії, але і з Св. Амброзія і Грацыяна[59], што паказвае на надзвычай высокі адукацыйны ўзровень, прынамсі, вярхоў вальдэнсаў[60]. З іншага боку, агульнавядома, што яшчэ ў сярэдзіне XIII ст. нямецкія царкоўныя аўтары лепш валодалі лацінскімі лексічнымі клішэ, чым багаслоўскай тэрміналогіяй роднай мовы, якая яшчэ не ўстаялася[61].

Аўтар Пасаўскага ананіма, хоць і быў каталіком, адзначае не толькі адмоўныя з яго пункту гледжання, але і станоўчыя моманты ў ладзе жыцця вальдэнсаў: "... леаністы знешне маюць вялікую набожнасць, і ўсе ў Бога вераць ... У звычаях сваіх яны напраўду ўраўнаважаныя і стрыманыя: фанабэрыі ў вопратцы не маюць, гэта значыць, ні раскошным, ні вельмі вульгарным не карыстаюцца. Гандляры не карыстаюцца ні падманам, ні клятвамі, ні лжывымі адгаворкамі, але жывуць з працы рук сваіх, як працаўнікі; нават іх дактары – гэта ткачы і шаўцы. Багацця не памнажаюць, задавальняюцца толькі неабходным. Леаністы – самыя цнатлівыя. Стрыманыя ў ежы і пітве. У шынкі не ходзяць, карагоды не водзяць і пустога не робяць. Гнеў стрымліваюць. Яны заўсёды або працуюць, або вучаць і вучацца,

Didactic Text," *Medieval Worlds* 7 (2018): pp. 153–169, https://doi.org/10.1553/medievalworlds_no7_2018s153, 153.

[57] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 70–80. [V.i]

[58] Margaret Anne Eugenie Nickson, "The «Pseudo-Reinerius» Treatise, the Final Stage of a Thirteenth Century Work on Heresy from the Diocese of Passau," *Archives d'histoire doctrinale et littéraire du Moyen Âge* 34 (1967): pp. 255–314, 294.

[59] Дэкрэты Грацыяна – адна з найбольш цытуемых заканадаўчых крыніц, падрабязней гл. Lucy E. Bosworth, *Perceptions of the Origins and Causes of Heresy in Medieval Heresiology* (University of Edinburgh, 1995), http://hdl.handle.net/1842/18041, 39.

[60] Patschovsky, "The Literacy of Waldensianism," 121–122; Katarzyna Skrzypiec, "Sekretna wieczerza, czyli o heretykach budzących sympatię," *Mówią Wieki* 4 (2009): pp. 33–37.

[61] Николай Бондаренко, "Давид Аугсбургский как мастер традиционной словесности," *Символ* 51 (2007): стр. 331–378, 347–348.

а таму мала моляцца. Таксама яны для выгляду ходзяць у царкву, ахвяруюць, спавядаюцца, прымаюць прычасце і прысутнічаюць на пропаведзях – але для таго, каб правесці пропаведзь у размовах"[62].

Традыцыйна згадваюцца адмаўленне клятвы і права свецкай улады на здзяйсненне гвалту: "Суддзяў і першых асоб асуджаюць". "Кажуць, што клясціся – смяротны грэх"[63].

Калі ўсё вышэйпералічанае ў цэлым можна трактаваць як станоўчыя рысы вальдэнсаў, то да негатыўных аўтар адназначна залічвае абвінавачанні ў бок Каталіцкай Царквы: "Першая памылка леаністаў і рункарыяў [паслядоўнікі Яна з Ронка – "бедныя ламбардцы"] у тым, што [яны думаюць, што] Рымская Царква – гэта не Царква Ісуса Хрыста, але Царква зласлоўя і блудніца, што ў Апакаліпсісе (17:3) сядзіць вярхом на жывёліне, і што яна прыйшла ў заняпад з часоў Сільвестра, калі ў Царкву пацякла атрута мірскога. І што яны самі – Царква Ісуса Хрыста, якая трымаецца евангельскай дактрыны і апостальскіх слоў"[64].

Вялікую частку дакумента складае пералік царкоўных таінстваў і абрадаў, якія адмаўляюцца вальдэнсамі. Гэта ўсе таінствы (акрамя хрышчэння і еўхарыстыі, і тое з агаворкай, што іх павінны праводзіць іх "святары", чыстыя перад Богам, па строга вызначаным абрадзе). Не прымаюцца ніякія звычаі, не апісаныя прама ў Бібліі, такія, як імшы, клопат аб душах памерлых, чысцец, дзесяціна, пасты, царкоўныя будынкі з алтарамі, пакланенне крыжу, святым і іконам.

Усё іншае, акрамя адсутнасці падзелу на "прапаведнікаў" і "міран", будзе характэрна ў той ці іншай ступені для ўсіх вальдэнсаў.

Сацыяльны склад вальдэнсаў у розных рэгіёнах

Вальдэнсы, якія пачынаюць сваю гісторыю ад Вальдэса як ерась "гарадская", з распаўсюджаннем па Еўропе і ўзмацненнем інквізіцыйнага ціску паступова становяцца ерассю "вясковай"[65].

Дадзеныя наконт сацыяльнага статусу "настаўнікаў" адсутнічаюць, сустракаюцца – толькі пра іх прафесіі, і то для канца XIV ст.: шавец, кравец, каваль, селянін. Калі прагледзець манускрыпты, дзе згадваюцца прафесіі вальдэнскіх "настаўнікаў", то там указаны ткачы "з ваўняных нітак і з шоўку", "тыя, хто кроіць", але пераважаюць краўцы і шаўцы з сялянскіх сем'яў; маецца сын млынара і сын майстра па вырабе капелюшоў.

---

[62] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 73–74. [V.i]

[63] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 103. [V.i]

[64] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 77–79. [V.i]

[65] Gabriel Audisio, "La Montagne: un refuge pour les vaudois ?" *Clergés, communautés et famille des montagnes d'Europe*, 2005, pp. 237–242, https://doi.org/10.4000/books.psorbonne.64184; Grado Giovanni Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento: con l'edizione dei processi tenuti a Giaveno dall'inquisitore Alberto de Castellario (1335) e nelle valli di Lanzo dall'inquisitore Tommaso di Casasco (1373)* (Torino: Claudiana, 1977), 108–109. [IV.ii]

Такім чынам, гаворка ідзе пра дробных рамеснікаў і гандляроў, пераважна звязаных з тканінамі і адзеннем. У некаторых рэгіёнах да вальдэнсаў далучаліся каталіцкія святары[66]. Асобна можна вылучыць прафесіі, якія дазвалялі "легітымізаваць" перамяшчэнні і кантакты з вялікай колькасцю людзей: карчмары, уладальнікі заезных дамоў, гандляры, кавалі і ўрачы. Вызначыць першапрычыну – ці тое прадстаўнікі гэтых прафесій з-за сваіх частых размоў з вальдэнскімі прапаведнікамі мелі большую схільнасць "упадаць у ерась", ці то ўжо "настаўнікі" абіралі прафесію для прыкрыцця сваёй прапаведніцкай дзейнасці – немагчыма. Хутчэй за ўсё, мелі месца абодва варыянты з перавагай другога.

Асобна варта спыніцца на прафесіях, звязаных з ткацтвам. Каталіцкія прапаведнікі традыцыйна асуджалі ерэтыкоў і ткачоў разам, параўноўваючы ерэтычныя сеткі з павуціннем. "Ерась была дачкой воўны"[67]. Гэтае паняцце таксама прыжылося ў агульнай свядомасці, цэлыя гарадскія вуліцы, населеныя ткачамі, маглі лічыцца "ерэтычнымі"[68]. Але больш праўдападобную тэорыю вылучае Г. Грундман: менавіта вандроўныя ерэтычныя прапаведнікі (прычына) станавіліся ткачамі або купцамі (наступства), таму што гэтая справа адпавядае вандроўнаму ладу жыцця[69].

Асаблівасцю ўсходненямецкіх земляў, Памор'я і Чэхіі была вялікая ўдзельная вага сярод вальдэнсаў сялян і іх парабкаў абодвух палоў. Часам ерэтычнымі прызнаваліся цэлыя вёскі. Сярод вернікаў пераважаюць дробныя рамеснікі: майстры па вырабе капелюшоў, мастакі, краўцы, будаўнікі, ткачы, гарбары, піварары, кавалі, а таксама карчмары і дробныя гандляры. У 1381 г., праз паўстагоддзя пасля вынішчальнага антывальдэнскага працэсу ў Багеміі, архібіскуп пражскі Ян быў занепакоены вялікай колькасцю "праклятых сялян-вальдэнсаў" на заходніх межах сваёй дыяцэзіі[70]. У пераліку рэдка сустракаюцца асобы з вышэйшых пластоў грамадства. Іх удзел тыповы для Цэнтральнай Еўропы[71], але больш характэрны для Заходніх Альпаў[72] і гарадоў на нямецка-швейцарскім памежжы.

Немагчыма вызначыць адназначную залежнасць паміж сацыяльным статусам чалавека і яго становішчам у абшчыне. Ёсць заканамернасць, што ў тых рэгіёнах, дзе вальдэнсы паходзілі пераважна з ніжэйшых пластоў грамадства, члены руху выразна вылучалі і супрацьпастаўлялі сябе каталіцкаму атачэнню. У выніку, у другой палове XIII – XIV ст. трансфарму-

---

[66] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5. Das Formelbuch des Domherrn Arnold von Protzan: Namens des Vereins für Geschichte und Alterthum Schlesiens (Breslau: Max, 1862), 54–55. [VII.i.d.69]

[67] Walther, "Were the Albigenses and Waldenses Forerunners of the Reformation?," 182.

[68] Stanisław Bylina, *Ruchy heretyckie w średniowieczu* (Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1991), 119.

[69] Grundmann, *Religious Movements in the Middle Ages*, 15.

[70] Karl Adolf Constantin Höfler, *Concilia Pragensia 1353–1413; Prager Synodal-Beschlüsse, zum ersten Male zusammengestellt und mit einer Einleitung versehen* (Prag: K. Seyfried, 1862), 26–27.

[71] Bylina, "Heretycy w społeczeństwie," 108.

[72] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 103–104. [IV.ii]

ецца саманазва секты. У вальдэнсаў Заходніх Альпаў стала распаўсюджана назва "de recognoscentia", у вальдэнсаў Чэхіі – "noti et probi homines"; абедзве назвы могуць быць перакладзены як "вядомыя, пазначаныя", "выпрабаваныя" або "праведныя" людзі.

Звесткі пра нізкае сацыяльнае становішча вальдэнсаў абумоўлены тым, што пры пасвячэнні ў сан "настаўніка" кандыдат павінен быў вырачыся ўсіх сваіх багаццяў, таму ў матэрыялах інквізітараў ён пазначаўся як бедны, без указання на папярэдняе (магчыма, высокае) маёмаснае становішча.

Беднасць, як не раз ужо адзначалася, была адной з адрозных рыс вальдызму. Але немагчыма знайсці сацыяльную або эканамічную аснову руху вальдэнсаў з-за адсутнасці ў іх дактрыне выразных заклікаў да змены існуючага сацыяльнага ладу. Заклік да адмовы ад маёмасці і сцвярджэнне д'ябальскага паходжання свецкай улады маюць выразна біблейнае паходжанне і не звязаныя з класавай або сацыяльнай барацьбой. Такая барацьба была тым больш немагчымая з-за адмаўлення большасцю вальдэнсаў усялякага гвалту.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што рух вальдэнсаў ад пачатку меў рэлігійны характар і грунтаваўся на Бібліі. Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і этнічныя абставіны толькі нязначна відазмянялі першапачаткова закладзеныя Вальдэсам дагматы.

Неабходна адзначыць той факт, што разам з арыентацыяй "французскіх" вальдэнсаў на добраахвотную беднасць, у XIII ст. на поўдні Францыі іх вернікі паходзілі пераважна з сярэдняга і вышэйшага пластоў насельніцтва мястэчак[73]. У той самы час "Святыя Вячэры" вальдэнсаў былі менш сацыяльна эксклюзіўнымі, чым катарскія, бо катарскія вернікі займалі больш высокае сацыяльнае становішча[74]. Чым больш звестак з інквізітарскіх працэсаў мы атрымліваем, тым вышэйшым аказваецца сацыяльны склад ерэтыкоў. Гэта дазваляе выказаць тры гіпотэзы: па-першае, з укараненнем вальдэнсаў на пэўнай тэрыторыі павышалася ступень іх сацыяльнай адаптацыі ў грамадстве, яны паступова станавіліся ўсё больш заможнымі. Па-другое, абвінавачванні, агучаныя супраць уплывовых гараджан, маглі мець насамрэч палітычны характар, а ерась была проста зручным інструментам для пабудовы працэсу. Па-трэцяе, магчыма, што інквізіцыя больш цікавілася праяўленнямі ерасі сярод заможных пластоў грамадства, у якіх была магчымасць правесці канфіскацыю маёмасці на сваю карысць, таму мы маем больш звестак пра іх рэлігійнае жыццё. Апошняе не выключае, што вальдэнскія ідэі маглі быць распаўсюджаныя і сярод найбяднейшых пластоў грамадства, інфармацыя пра якіх у сваёй большасці не трапляе на старонкі гістарычных крыніц. У любым разе на прыкладзе Францыі можна канстатаваць нарастанне разыходжання штодзённай практыкі вальдэнскіх вернікаў з першапачатковым апостальскім ідэалам па меры атрымання імі больш высокага сацыяльнага і маёмаснага статусу.

---

[73] Balossino and Chiffoleau, "Valdesi e mondo comunale in Provenza nel Duecento," 95.

[74] Feuchter, "The Heretici of Languedoc," 121–122.

Антывальдэнскія працэсы ў гарадах на паўднёвым захадзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі

Найбольш ярка гэтыя змены праявіліся ў канцы XIV ст. на паўднёвым захадзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі ў рэгіёне, які непасрэдна межаваў з іншым моцным цэнтрам вальдэнсаў – Заходнімі Альпамі *(карта А4)*.

Табліца 2. Антывальдэнскія працэсы ў гарадах паўднёвага захаду Свяшчэннай Рымскай Імперыі

Горад	**Год**	**Статус горада на гэты момант**
Аўгсбург	1393	Вольны горад
Берн	1399	Вольны горад
Майнц	1380, 1391–1393	Вольны горад
Нюрнберг	1332–1379, 1399	Вольны горад
Страсбург	1390–1400	Біскупскі горад
Фрыбур	1399, 1430	Вольны горад

Ёсць сведчанні, што вальдэнсы ўваходзілі ў склад гарадскога савета Берна. Хутчэй за ўсё, яны былі звязаны між сабой роднаснымі сувязямі праз шлюбы ўнутры абшчыны (вядома, што ў вальдэнсаў часта практыкавалася эндагамія)[75] і выхаванне дзяцей у сваёй веры. Вальдэнсы рэгіёну, хутчэй за ўсё, пераважна займаліся ткацтвам і гандлем тканінамі (хоць магчыма, гэта проста з'яўлялася часткай зборнага негатыўнага вобразу ерэтыка, звязанага з ткацтвам).

Аўгсбург

Інквізіцыйны працэс у Аўгсбургу распачаўся з пропаведзі мясцовага святара (таксама ідэнтыфікаваны як "вандроўны прапаведнік з Бамберга" Гайнрых Ангермайер[76]), які пазней атрымаў мандат на правядзенне следства супраць вальдэнсаў ад мясцовага біскупа (апошні і надалей трымаў ход працэсу пад сваім кантролем). За гэта адзін з вальдэнсаў напаў на Ангермайера з нажом[77]. 34 ерэтыкі з Аўгсбурга (па іншых крыніцах – 36 або нават 46) падчас інквізіцыйнага працэсу 1393 г. былі шаблонна абвінавачаны ў: адмаўленні чыстца, індульгенцый[78], царкоўных таінстваў, асвячэння цэркваў і могілак, пальмавага лісця і травы; таемных начных сустрэчах

[75] Georg Modestin, "Augsburger Waldenserprozess und sein Strassburger Nachspiel (1393–1400)," *Zeitschrift des Historischen Vereins für Schwaben* 103 (2011): pp. 43–68, 63.

[76] Eugene Smelyansky, *Heresy and Citizenship: Persecution of Heresy in Late Medieval German Cities* (New York: Routledge, Taylor & Francis Group, 2021), 53.

[77] Modestin, "Augsburger Waldenserprozess", 52.

[78] У каталіцкай царкве індульгенцыя – вызваленне ад часовай кары за грахі, у якіх грэшнік ужо пакаяўся, і віна за якія ўжо даравана ў таінстве споведзі, у прыватнасці, вызваленне ад накладзенай царквой епітым'і.

у лёхах; распусце[79]; узаемнай споведзі. Разыходжаннем з астатнім вальдэнскім светам з'яўляецца сцвярджэнне ў дакументах, што секта павінна існаваць у таямніцы да Страшнага суда, але адкрыта праявіць сябе пасля прыходу Іліі і Еноха[80]. Большасць публічна пакаялася і, прынамсі, знешне вярнулася ў каталіцтва. 14 з іх вельмі пакутавалі ад прымусовага нашэння нашытых на вопратцы крыжоў і звярнуліся да біскупа з просьбай скасаваць ім гэта пакаранне, прапанаваўшы за такую паслугу 70 гульдэнаў. Біскуп, які меў сур'ёзныя матэрыяльныя праблемы, пагадзіўся. Калі пра гэта даведаліся іншыя гараджане, яны спалілі пецярых з гэтых чатырнацаці[81], астатніх прымусілі і далей насіць крыжы, удзельнічаць у прыніжальных публічных працэсіях са свечкамі і здзяйсняць паломніцтвы; быць акропленымі святой вадой, чытаць на могілках "Вітай, Марыя" і "Ойча наш", маліцца за памерлых – г. зн. здзяйсняць усё тое, што разыходзілася з вальдэнскімі вераваннямі, і такім чынам "вяртацца ў сапраўдную веру"[82]. Прычым хронікі адзначаюць, што многія з пакараных былі заможнымі і паважанымі членамі абшчыны, сябрамі ткацкай гільдыі, некаторыя нават майстрамі, і такая расправа падарвала магутнасць гэтага цэха[83]. Ёсць верагоднасць, што многія эмігравалі ў Страсбург, дзе потым былі выкрыты ў працэсе 1393–1400 гг.[84]

Страсбург

У нямецкіх гарадах у канфлікце паміж біскупам і ерэтыкамі горад мог выступаць як асобны суб'ект, расцэньваючы інквізіцыйны вышук як умяшальніцтва ў свае справы. Падобным чынам на папскую інквізіцыю маглі глядзець і самі біскупы[85]. У той жа час, калі справу разглядаў свецкі, а не царкоўны суд, яна кваліфікавалася як злачынства не супраць веры, а супраць гонару горада[86]. Адным з нямногіх прыкладаў дзейнасці мясцовага гарадскога савета ў якасці інквізіцыйнага органа з'яўляецца Страсбургская справа сакавіка-красавіка 1400 г. У самім горадзе ў гэты перыяд вядома згуртаванне вальдэнсаў каля 50-і чалавек.

---

[79] У XIII ст. распуста разглядалася як грэх супраць шлюбных клятваў, а значыць, як злачынства супраць веры, і вельмі часта "спадарожнічала" ерасі ў інквізітарскіх і палемічных дакументах. Irene Bueno, *Defining Heresy: Inquisition, Theology, and Papal Policy in the Time of Jacques Fournier* (Leiden: Brill, 2015), 120–121.

[80] Modestin, "Augsburger Waldenserprozess", 61–64.

[81] На думку Яўгена Смалянскага, галоўная віна палягала не столькі ў дачы хабару – звычайнай справы ў Сярэднявеччы – колькі ў тым, што за змяншэннем пакарання вальдэнсы звярнуліся не да магістрата, які яго прызначыў, а да біскупа, які ў той час канфліктаваў з магістратам і меў сядзібу па-за горадам. Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 78–79.

[82] Modestin, "Augsburger Waldenserprozess", 63.

[83] Kieckhefer, *Repression*, 66–70.

[84] Modestin, "Augsburger Waldenserprozess", 48.

[85] Välimäki, "Bishops and the Inquisition of Heresy," 197.

[86] Georg Modestin, "Les vaudois de Strasbourg devant leurs juges. Une étude comparative. Berne (1399) – Fribourg/Suisse (1399) – Strasbourg (1400)," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 203, no. 125 (December 2008): pp. 3–14, 8.

Спальваць вальдэнсаў у Страсбургу пачалі яшчэ ў 1212-м, а працягнулі ў 1224 г.[87] У канцы XIV ст. галоўным следчым паспрабаваў выступіць дамініканец Ян Арнольдзі, які атрымаў на гэта права ў Майнцы ў 1380-я гг. Многія з вальдэнсаў былі членамі гарадскога савета і ўдзельнічалі ў гандлі з Фрыбурам. Узначальваў групу дваранін Ян Блюменштайн, надзвычай уплывовы чалавек з шырокім кругаглядам. Пра яго ўплыў можа сведчыць тое, што падчас працэсу ён не толькі не спрабаваў прызнаць свае грахі, але і папярэдзіў інквізітара, што калі той не пакіне вальдэнсаў у спакоі, рызыкуе быць забітым. Магчыма, гэта былі не пустыя словы: падчас пазнейшага следства выявілася, што ў 1374 г. страсбургская вальдэнская абшчына наняла забойцу для свайго былога паплечніка Ганса Вайдэнхофера, які перавярнуўся ў каталіцызм і патэнцыйна мог выдаць сваіх былых адзінавернцаў[88]. 4 красавіка 1390 г. Арнольдзі па асабістай просьбе быў вызвалены ад сваіх абавязкаў[89]. Яго месца заняў і ў далейшым кіраваў працэсам дамініканец Нікалас Бёкелер – былы член Генеральнага капітула ў Каркасоне[90], які раней праводзіў антывальдэнскія рэпрэсіі ў Майнцы ў 1390–1393 гг.[91] Вынікам яго работы стала таемнае адрачэнне ад ерасі членаў вальдэнскай абшчыны ў доме вышэйзгаданага Блюменштайна[92]. Гэта можа значыць, што для іх працэс 1400 г. – паўторны, а значыць, яны мусілі быць асуджаныя як мінімум на пажыццёвае зняволенне (пры ўмове раскаяння), а хутчэй – на смерць.

У 1400 г. антывальдэнскі працэс распачаўся як рэакцыя на выкрывальны ліст Бернскага магістрата[93] і на калядную пропаведзь 1399 г. дамініканца з Базэля Пятра Мангольда[94]. 27 чалавек, сярод іх і прадстаўнікі багатых і заможных сем'яў гандляроў і рамеснікаў (у тым ліку ў сферы вытворчасці тканін), былі высланы з горада. Бернцы атрымалі адказ, у якім колькасць вальдэнсаў была заніжана, як і іх сацыяльны статус. Гэта было зроблена для мацавання прэстыжу горада, значна пашкоджанага

---

[87] Генри Чарльз Ли, *История инквизиции. Том 2. Инквизиция в различных христианских землях.* 3 тома. Москва: Эксмо, 2007. http://www.e-reading.club/bookreader.php/141261/Li_-_Istoriya_inkvizicii._tom_2.html.

[88] Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 72–73.

[89] Kieckhefer, *Repression*, 59–60.

[90] Georg Modestin, "Ein Mainzer Inquisitor in Strassburg: Ketzerverfolgung und Ordensreform Auf Dem Lebensweg von Nikolaus Böckeler OP (1378–1400)," *Mainzer Zeitschrift: Mittelrheinisches Jahrbuch für Archäologie, Kunst und Geschichte* 102 (2007): pp. 167–173, 167.

[91] Майнцкі працэс быў распачаты новым архібіскупам Конрадам II Вайнсбергам у рамках умацавання сваёй палітычнай улады ў горадзе.

[92] Modestin, "Ein Mainzer Inquisitor", 167.

[93] Падчас Бернскага антыерэтычнага працэсу была выкрыта група вальдэнсаў, якія мелі цесныя сувязі са сваімі страсбургскімі і фрыбурскімі адзінаверцамі. Бернскі магістрат даслаў лісты ў абодва гарады з паведамленнем пра наяўнасць "ерэтычнай заганнасці", прозвішчамі меркаваных вальдэнсаў, а таксама спісам з 15-і вальдэнскіх "памылак". [V.v]

[94] Georg Modestin, *Quellen zur Geschichte der Waldenser von Straßburg: (1400–1401)*, vol. 22 (Hannover: Hahnsche Buchhandlung, 2007), 58–63.

меркаванай ерэтычнай прысутнасцю[95]. Не было вынесена ніводнага смяротнага прысуду. Прычыны, па якіх гэтага не адбылося, не раз абмяркоўваліся Георгам Мадэсцінам у працытаваных вышэй публікацыях, але застаюцца да канца не высветленымі. Мне падаецца найбольш верагоднай яго гіпотэза, выказаная ў публікацыі ад 2008 года: паколькі справу вёў свецкі суд і галоўным пытаннем было рэнамэ горада, аказалася дастатковым проста пазбавіцца ад "забруджвальных" элементаў[96], якія былі выкрытыя толькі з-за ўмяшальніцтва ў яго ўнутраныя справы дамініканскага прапаведніка "звонку", з Базэля, і зняславілі горад[97]. Больш за тое, як адзначае Рычард Кікхефер, выгнанне ерэтыкоў не дасягнула мэтаў Царквы па барацьбе з ерассю, гэта значыць, рэфармавання і вяртання ерэтыкоў, якія пакаяліся, да каталіцтва. Наадварот, выгнанне проста рабіла ерась чужой праблемай ці нават садзейнічала распаўсюджванню ерэтычных ідэй[98]. Парадокс сітуацыі ў тым, што Ян Блюменштайн не проста не быў пакараны, а нават прадстаўляў горад на саборы ў Канстанцы[99].

Што датычыцца "памылак" страсбургскіх вальдэнсаў, то яны вядомы на аснове матэрыялаў допытаў пяці жанчын[100], у асноўным Кунігунды Штрусін (удавы, муж якой быў пакараны смерцю як ерэтык у Аўгсбургу ў 1393 г.) і яе дачок. Кунігунда сцвярджала, што вальдэнскі рух паходзіць ад Вальдэса, а не ад апосталаў[101]. Астатнія элементы веравучэння тыповыя для нямецкамоўнага рэгіёну: адмаўленне пакланення святым, у тым ліку і Дзеве Марыі (але некаторыя ўсё адно маліліся)[102], чыстца, вартасці таінстваў, неабходнасці наведваць царкву (можна рабіць выключна для выгляду)[103]. У адрозненне ад Майнца, страсбургскія вальдэнсы не здзяйснялі еўхарыстыю самі, а "карысталіся паслугамі" каталіцкіх святароў[104]. Яны спавядаліся і прымалі пакаянні ад сваіх вандроўных "настаўнікаў". Георг Мадэсцін мяркуе, што пасля маштабнага выкрыцця вальдэнскіх прапаведнікаў іх візіты скараціліся, што прывяло да крызісу ў абшчыне[105].

Хутчэй за ўсё, Кунігунда і яе дочкі ўвогуле пазбеглі пакарання[106].

Берн

Акты Бернскай справы не захаваліся. Звесткі пра яе дайшлі ў дзвюх хроніках, у якіх паведамляецца пра 130 абвінавачаных абодвух полаў

---

[95] Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 55.
[96] Modestin, "Les Vaudois de Strasbourg," 13–14.
[97] Modestin, "Western Germany," 195.
[98] Kieckhefer, *Repression*, 76.
[99] Modestin, *Quellen*, 233–235.
[100] Апісанне дадзена на аснове артыкулаў Георга Мадэсціна.
[101] Herzog, *Die romanischen Waldenser*, 122.
[102] Modestin, "Western Germany," 198.
[103] Modestin, "Augsburger Waldenserprozess," 45.
[104] Modestin, "Western Germany," 198.
[105] Modestin, "Western Germany," 197.
[106] Modestin, "Augsburger Waldenserprozess," 48.

з горада і рэгіёну, "як можных[107] і багатых, так і бедных". Паколькі яны былі схопленыя ўпершыню, то ім захавалі жыццё[108]. Вядомы толькі кароткі пераказ справы: у 1399 г. дом "на ценявым баку вуліцы" быў разбураны загадам інквізіцыі за ерась, але пасля яго набывае адзін знатны чалавек, Петэрман фон Крёхталь, які публічна сарваў нашыты крыж са свайго чалавека Пятра Сагера, былога ерэтыка. Апошні быў паўторна схоплены па абвінавачанні ў вальдызме і спалены ў 1430 г. У яго была паплечніца, жанчына па імені Рыдэр, якую таксама спалілі, але ўжо па абвінавачанні ў вядзьмарстве[109]. Адметны датычна ўнутрыцаркоўных узаемаадносін той факт, што Берн, які фармальна належаў да Лазанскага архібіскупства, для правядзення гэтай справы выпісаў дамініканскага інквізітара з Базэля (тлумачыцца гэта тым, што падчас царкоўнага расколу Берн і Базэль падтрымалі "прарымскага" лазанскага архібіскупа, які ў той час быў адхілены ад ўлады ў Лазане і часова знаходзіўся ў Базэлі, а Фрыбур – "праавіньёнскага").

Фрыбур

Справа ў Фрыбуры пачалася з-за сустрэч, якія адбываліся паміж бернскімі і фрыбургскімі дэлегатамі ў вёсачцы Вюнэнвіль, што ляжала на сярэдзіне шляху паміж двума гарадамі. Члены фрыбургскага гарадскога кіравання атрымалі паведамленне ад калег з Берна са спісам з пералікам 15-і вальдэнскіх "памылак" і імёнамі 54-х фрыбурскіх вальдэнсаў (26 мужчын і 28 жанчын), выкрытых падчас бернскага працэсу[110]. Фрыбур, у адрозненне ад Страсбурга і Берна, у справе інквізіцыйнага вышуку цалкам трымаўся працэдуры: быў накіраваны запыт у метраполію, у Лазану, з просьбай даслаць інквізітара з лазанскага дамініканскага кляштара. Але канфлікт паміж дзвюма царкоўнымі адзінкамі быў настолькі моцным, што, калі лазанскі інквізітар даслаў запыт у Берн да свайго базэльскага калегі выслаць яму дакументы працэсу, то атрымаў адмову. К. Утц Трэмп мяркуе, што гэта паспрыяла адносна мяккаму ходу працэсу, нароўні з тым, што горад па сутнасці не хацеў увогуле заводзіць аніякі працэс, ідэя якога была навязаная яму Бернам[111].

Саміх ерэтыкоў у Фрыбуры пражывала каля 100, прычым многія з іх таксама займалі высокае становішча ў грамадстве[112]. Іх лідарамі была старажытная патрыцыянская сям'я Штудэр, якая спецыялізавалася на гандлі з Іспаніяй; адна з самых старажытных і вядомых заможных сем'яў гандляроў, члены гарадскога савета дэ Прараман; гандлёвая сям'я Бонвізін;

---

[107] Прадстаўнікі вярхоў феадальнага / шляхецкага саслоўя, буйныя землеўласнікі, знаць.
[108] Modestin, "Les Vaudois de Strasbourg," 11.
[109] Gertrude Barnes Fiertz, "An Unusual Trial under the Inquisition at Fribourg, Switzerland, in 1399," *Speculum* 18, no. 3 (1943): pp. 340–357, https://doi.org/10.2307/2853709, 341.
[110] Modestin, "Les Vaudois de Strasbourg," 5.
[111] Katrin Utz Tremp, "Fribourg (Switzerland)," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 207–222, 214–215.
[112] Biller, *The Waldenses*, 1170–1530, 113–116.

члены грабарскага цэха Мос (іх родзічы засядалі ў гарадскім савеце і былі настаяцелямі сабора); адзін з найбольш важных людзей горада Францыск Бушылон з жонкай і інш. Але судзілі не толькі іх, а яшчэ і тых, хто ім спачувае або спрыяе (сярэдні клас – сем'і Кастэлз, Фервер, Цэрлендэн і інш.). Большая частка належала да так званай "новай буржуазіі" і мела эканамічныя стасункі з Бернам. Усе абвінавачаныя былі апытаны паводле 15-і пунктаў[113] ерэтычных памылак (агульных з Бернам), якія яны адмовілі ў стылі строгага каталіцтва. У абодвух гарадах "на першы раз" былых вальдэнсаў у большасці сваёй прабачылі, некаторых прыгаварылі да нашэння нашытых на вопратцы крыжоў.

Такім чынам, маецца апісанне веры вальдэнсаў мяжы XIV–XV стст.: яны падкрэслівалі сваю апазіцыю Рымскай Царкве і ўсім яе абрадам і палажэнням, адмаўлялі чысцец, практыкавалі ўзаемную споведзь і ўсхвалялі пакутнікаў за сваю веру[114].

Паказальным для асэнсавання месца вальдэнсаў у тагачасным грамадстве з'яўляецца тое, што кожны з абвінавачаных у Фрыбуру змог знайсці па два сведкі сваёй невінаватасці – і гэта ўлічваючы тую смяротную рызыку, якой падвяргаліся ўсе звязаныя з ерассю. Найбольш важным бачыцца той факт, што ўсе тыя, хто стаяў перад трыбуналам, былі цалкам апраўданы, і нават не атрымалі грашовых штрафаў[115]. Аднак, многіх з іх паўторна схапілі і спалілі ў 1430 г.[116], у тым ліку і таму, што яны мелі пераклад Евангелляў на "народную" мову[117].

Высокі статус "выяўленых і пакараных" вальдэнсаў мог быць звязаны з непасрэдным матэрыяльным інтарэсам распачынальнікаў інквізіцыйнага вышуку, якія атрымлівалі канфіскаваную маёмасць. Ужо тагачасныя храністы звярталі ўвагу, што бедных хутчэй адпускалі, а заможных – пасылалі на вогнішча[118].

Аналагічна з гарадамі, дзе былі зафіксаваны першыя згадкі пра вальдэнсаў *(табліца 1)*, разгледжаныя ў гэтым раздзеле мясціны *(табліца 2)* таксама з'яўляюцца вольнымі імперскімі гарадамі з высокім узроўнем эканамічнага развіцця. Менавіта іх асяроддзе было спрыяльным для росквіту вальдызму і яго пашырэнню сярод вышэйшых гарадскіх пластоў і/ці пад'ёму былых бедных вальдэнсаў па сацыяльнай лесвіцы.

---

[113] Fiertz, "An Unusual Trial under the Inquisition at Fribourg," 344.
[114] Utz Tremp, *Quellen zur Geschichte der Waldenser von Freiburg*, 585–636.
[115] Fiertz, "An Unusual Trial under the Inquisition at Fribourg," 345.
[116] *Geheime Schriften mittelalterlicher Sekten* (Pattloch, 1997), 321.
[117] Fiertz, "An Unusual Trial under the Inquisition at Fribourg," 354.
[118] Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 54.

Знікненне "класічнага" вальдызму (пачатак XV ст.)

Армальным канцом класічнага вальдызму мог бы лічыцца першы крыжовы паход супраць вальдэнсаў з-за іх непадпарадкавання свецкай адміністрацыі і парушэнняў закону. Арганізаваны ён быў у даліне Праджэлата жыхарамі суседніх далін пад кіраўніцтвам свецкіх улад, турынскага біскупа і інквізітараў зімой 1400 г. Большая частка вальдэнсаў была знішчана, а тыя, хто адступіў вышэй, на суседнюю гару (якая з таго часу носіць назву, якую можна перакласці з італьянскай мовы як "прытулак"), загінулі ад холаду[1]. Але праблема палягае ў тым, што паход гэты апісаны толькі трыма вальдэнскімі гісторыкамі XVII ст., якія не спасылаюцца на дакументы і ў некаторых месцах разыходзяцца ў сваіх звестках. Таму існаванне гэтага паходу ставіцца пад вялікі сумнеў: езуіт Марцэлін Фарнье, які дэтальна вывучыў прадстаўленыя Жанам Полем Перынам доказы пра гэты крыжовы паход, небеспадстаўна выказаў здагадку, што гаворка ішла пра звычайны бандыцкі налёт, а не пра арганізаваную царкоўную акцыю[2]. Хутчэй за ўсё, у свядомасці пазнейшых вальдэнсаў адбылося падваенне памяці пра маштабны крыжовы паход 1487–1488 гг.[3], расказы пра які перадаваліся з вуснаў у вусны праз многія пакаленні[4].

У любым разе з гэтага часу вальдэнсы канчаткова пераходзяць на таемную пропаведзь (якая застаецца галоўным абавязкам "настаўніка"[5]), бо аказваюцца па-за законам, што прымушае іх перабудаваць унутраны склад абшчыны і радыкалізаваць дактрыну. Чэшскія "настаўнікі" прыходзілі да сваіх вернікаў выключна ўночы. У "патаемны пакой" дома павінен быў весці "схаваны праход"[6]. Адбываецца замыканне абшчыны: выратаванне

---

[1] Perrin, *Histoire des Vavdois*.

[2] Цытуецца па Euan Cameron, "The Dauphiné (13th–14th Centuries)," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 273–289, 286.

[3] Филипп Шафф, *История Христианской Церкви*, vol. 6. Средневековое христианство. От Бонифация VIII до протестантской Реформации. 1294–1517 гг. (Санкт-Петербург: Библия для всех, 2009), 326–327; Marina Benedetti, "A Forgotten Crusade," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 445–458; Philip Schaff, *The Creeds of Christendom, with a History and Critical Notes*, vol. 1. The history of creeds (Whitefish, Mt.: Kessinger Publishing, 2009), 492.

[4] Giuseppe Boffito, "Eretici in Piemonte al tempo del Gran Scisma (1378–1417)," *Studie e Documenti di Storia e Diritto* 18 (1897): pp. 381–432, 413–418. [IV.v]

[5] Bylina, "Heretycy w społeczeństwie," 112–113.

[6] Holinka, "Sektářství v Čechách," 69.

па-за яе межамі немагчыма ("...І я запытаў яго, ці верыць ён, што яго секта мае сапраўдную каталіцкую веру, і па-за яе межамі ніхто не выратуецца, і ён адказаў, што так, таму што так казалі яму ерэсіярхі"[7].) Паказальна, што гэтыя вальдэнсы ўжо не ведалі апостальскага Сімвала веры, ужываючы свой, створаны на аснове першага Сімвала веры самога Вальдэса ад 1179–1180 гг.[8]

У выніку ганенняў XIV ст. "класічны" вальдызм спыніў сваё існаванне. Вонкавай адзнакай гэтага стаў зафіксаваны ў крыніцах факт, што ў XV ст. паняцце "вальдэнсы" пачало змешвацца з паняццем "ведзьмы"[9].

Зліццё паняццяў "вальдызму" і "вядзьмарства" ў Заходняй Еўропе

Для такога зліцця існаваў шэраг прычын, пра якія яшчэ дыскутуюць даследчыкі. Па адной з тэорый, на "ведзьмаў" проста перайшло традыцыйнае для шматлікіх ерэтычных груп абвінавачанне ў шабашах[10]. Па другой – справа была ў пошуку ворагаў, бо абвінаваціць у сувязях з Д'яблам прасцей, чым у ерасі; і калі "сапраўдныя" ерэтыкі скончыліся – інквізітары перайшлі да "д'яблапаклоннікаў"[11]. Па трэцяй – вальдэнсы прызнаваліся ў вядзьмарстве пад інквізітарскімі катаваннямі[12]. У надзвычайных выпадках яны, як і яўрэі, абвінавачваліся ў канібалізме[13]. Але сучасны еўрапейскі даследчык вядзьмарства Вольфганг Берынгер паставіў слушнае пытанне: навошта інквізітарам, якія маглі спаліць вальдэнсаў проста па бясспрэчным абвінавачанні ў ерасі, дадаваць ім звышнатуральныя вядзьмарскія здольнасці накшталт уменя лятаць?[14] Гэты вучоны мяркуе, што для такога змяшэння паняццяў былі рэальныя падставы, карані якіх сягалі яшчэ ў папярэднія стагоддзі.

Адной з прычын атаясамлівання вальдэнсаў і ведзьмаў магла стаць легенда, вядомая ад пачатку XIII ст., пра пакланенне ерэтыкоў кату: у мовах народаў Свяшчэннай Рымскай Імперыі слова "ерэтык" паходзіць ад слова

---

[7] Dietrich Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns* (Berlin, NY: de Gruyter, 1975), 79–80. [VII.v.e.2]

[8] Cegna, "Il valdismo medievale come religione penitenziale," 37–38. [VII.v.f]

[9] Boffito, "Eretici in Piemonte," 431. [IV.v]

[10] Norman Cohn, *Europe's Inner Demons: The Demonization of Christians in Medieval Christendom* (Chicago: University of Chicago Press, 2000), 230–231.

[11] Gary K. Waite, *Heresy, Magic, and Witchcraft in Early Modern Europe* (New York, NY: Palgrave Macmillan, 2003), 116.

[12] William E. Monter, *Witchcraft in France and Switzerland: The Borderlands during the Reformation* (Ithaca and London: Cornell University Press, 1976), 19–24.

[13] Timothy Fitzgerald, *Discourse on Civility and Barbarity* (Oxford: Oxford University Press, 2007), 111.

[14] Wolfgang Behringer, "How Waldensians Became Witches: Heretics and Their Journey to the Other World," in *Communicating with the Spirits* (Budapest; New York: Central European University Press, 2005), pp. 155–192, 155.

"кот" (параўн. у ням. Ketzer – Katze, італ. gazzart – gatto)[15]. Лічылася, што, як і каты, ерэтыкі хаваюцца і любяць "лашчыцца" да людзей. Існавала ўяўленне, што кот п'е гной рапухі (як і чуткі, што ерэтыкі ўжываюць экскрэменты рапухі для прыгатавання рытуальных напояў[16]), рапуха ж, у сваю чаргу, сімвалізавала смяротны грэх[17].

Паміж 1428 і 1437 гг. у Савоі быў створаны рукапісны ананімны трактат "Памылкі ерэтыкоў або тых, хто спрабуе катацца на веніку або посаху" (Errores Gazariorum seu illorum qui scopam vel baculum equitare probant)[18]. Крыніцай для трактата паслужыла праца французскага інквізітара Понса Фёжэрона (Ponce Feugeyron) пра выяўленні і спаленні ерэтыкоў/ведзьмаў у 1428 г.[19] Важна падкрэсліць, што гэты дакумент паслужыў шаблонам для шматлікіх інквізітарскіх антывядзьмарскіх працэсаў у альпійскім рэгіёне ў другой палове XV ст. У ім даецца першае апісанне вядзьмарскага шабашу. Тут тэрмін "gazzart" з'яўляецца простым сінонімам "вальдэнса". Вытокі ўяўлення пра тое, што адбывалася на шабашы, можна назіраць на поўдні Савоі, у заходнеальпійскай даліне Пінерола, дзе дапытаны і затым спалены вальдэнс Якуб Рысталаксій у 1388 г. так апісваў "вечары ў сінагозе"[20]: "ядуць і п'юць з вялікай радасцю, пачынаючы, калі людзі на пачатку ночы паднімуцца з зямлі ў спальні, пасля піцця і ежы тушаць святло, кажучы: «хто мае, трымае», і тыя мужчыны і жанчыны наступным крокам адно да аднаго прыціскаюцца, і так застаюцца да світання"[21]. Як бачым, ужо ў гэтым творы паказаныя асноўныя складаючыя элементы тыповага вядзьмарскага шабашу: празмернае ўжыванне ежы і оргія. У "Памылках ерэтыкоў" справа ад празмернага ўжывання ежы пераходзіць да канібалізму[22]. Нагадаем, што гэта не новыя элементы ў абвінавачванні вальдэнсаў: "сужыццё з жанчынамі" вальдэнсам прыпісвалі з самага пачатку руху, калі вандроўнымі прапаведнікамі маглі быць і жанчыны таксама, і яны заставаліся начаваць разам з паплечнікамі-мужчынамі або ў дамах мужчын-вернікаў. Таксама частка вальдэнсаў ужывала мяса ў посныя дні,

---

[15] Brunn, *Des contestataires aux cathares*, 345–347.

[16] Döllinger, *Beiträge*, 258. [IV.iv.b]

[17] Bernd-Ulrich Hergemöller, *Krötenkuss und Schwarzer Kater: Ketzerei, götzendienst und Unzucht in der Inquisitorischen Phantasie des 13. Jahrhunderts* (Warendorf: Fahlsbuch, 1996), 286.

[18] Silvia Bertolin, "Processi per Stregoneria in Val d'Aosta (1398–1434)," in *Predicazione e repressione. Processi e letteratura religiosa* (Torino: Claudiana, 2018), pp. 79–88, 81.

[19] Georg Modestin, "The Metamorphoses of the Anti-Witchcraft Treatise Errores Gazariorum," in *Demonology and Witch-Hunting in Early Modern Europe* (Abingdon, Oxon: Routledge, Taylor & Francis Group, 2020), pp. 49–64, 51. Марцін Астарэро мяркуе, што Понс мог нават быць аўтарам. Martine Ostorero, "Des papes face à la sorcellerie démoniaque (1409–1459): une dilatation du champ de l'hérésie ?," in *Aux marges de l'hérésie. Inventions, formes et usages polémiques de l'accusation d'hérésie au Moyen Âge* (Rennes: Presses universitaires de Rennes, 2017), pp. 153–184, 157–158.

[20] Слова "сінагога" як месца збору ерэтыкоў і д'яблапаклоннікаў запазычана з Біблії, у Вульгаце Апак 2:9 і 3:9.

[21] Döllinger, *Beiträge*, 257–258. [IV.iv.b]

[22] Modestin, "The Metamorphoses," 50.

што магло трактавацца як абжорства. Такі стандартны набор абвінавачванняў, уключаючы сексуальную разбэшчанасць, канібалізм і інфантацыд (забойства дзяцей), мае свае карані ў Антычнасці і прымяняўся супраць абшчынаў першых хрысціянаў, а пасля Каталіцкай Царквой – супраць ерэтыкоў.

І апошні неабходны элемент шабашу – пакланенне Д'яблу (Люцыферу) – быў "засведчаны" ў вальдэнсаў Германіі[23], Свідніцы[24] і ў аўстрыйскім Крэмсе. У 1311 і 1313–1315 гг. там былі затрыманы больш за 100 чалавек, некалькі дзясяткаў з іх былі спалены на вогнішчы[25]. Захаваліся матэрыялы допытаў вальдэнсаў, дзе іх памылкова аб'ядноўваюць з пашыранай тады сектай люцыферыян[26]. Уяўленне пра ерэтыкоў як слуг Д'ябла панавала ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе ў XIV ст.[27] З іншага боку, у канцы таго ж стагоддзя Пётр Цвікер адмаўляў тоеснасць гэтых дзвюх сектаў[28]. Бліжэй да Альпаў вальдэнсаў "прыслужнікамі Д'ябла" называлі яшчэ ў 1220 г. у Мецы[29].

Што ж датычыцца шляху на шабаш, а менавіта "палёту", то тут адна з першых згадак – гэта ілюстрацыя на палях парыжскага манускрыпта аўтарства сакратара герцага Амадэя VIII Савойскага (Антыпапы Фелікса V) Марціна Ле Франка "Абаронца жанчын" (1451 г.). На 105-м аркушы рукапісу паказаны дзве жанчыны на мётлах (першая ў гісторыі выява), якія падпісаны "вальдэнкі" (des vaudoises)[30]; фота змешчана ў канцы главы. Звесткі пра "новую секту", члены якой – пераважна жанчыны (ведзьмы), што лятаюць на мётлах, паступаюць з розных частак альпійскага рэгіёну на працягу ўсёй першай паловы XV ст. Прыкладам можа стаць працэс у дыяцэзіі Аосты 3 студзеня 1449 г. супраць мясцовай жыхаркі Янеты[31].

Прычыны суаднясення вальдэнсаў з паўднёвафранцузскімі ведзьмамі дагэтуль не высветленыя[32]. Інквізітар Клод Тулузскі, які вёў антывядзьмарскія справы ў Савоі з 1428 г., піша пра паходжанне гэтай секты "з Ліёна" (не называючы вальдэнсаў прама, але нагадаем, што адна з іх саманазваў –

---

[23] Döllinger, *Beiträge*, 316–317.

[24] Alexander Patschovsky, "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315," *Deutsches Archiv für Die Erforschung des Mittelalters* 36 (1980): pp. 137–176, 164 і далей. [VII.i.b]

[25] Erbstösser Martin, *Sozialreligiöse Strömungen im späten Mittelalter: Geissler, Freigeister und Waldenser im 14. Jahrhundert* (Berlin: Akademie-Verlag, 1970), 120.

[26] "Annales Matseenses," in *Monumenta Germaniae Historica. Scriptorum*, vol. 9, 1851, pp. 823–837, 825–827.

[27] Alexander Patschovsky, "Der Ketzer als Teufelsdiener," in *Papsttum, Kirche und Recht im Mittelalter: Festschrift für Horst Fuhrmann zum 65. Geburtstag* (Tübingen: Niemeyer, 1991), pp. 317–334, 317; Ogórek, *Beginki i Waldensi*, 117–118.

[28] Behringer, "How Waldensians Became Witches," 170.

[29] Caesaris Heisterbacensis, *Dialogus Miraculorum* (Cologne: Heberle, 1851), 299. [I.v.b]

[30] Martin Le Franc, *Sorcières partant au sabbat. Des Vaudoises passe Martin Le Champion des Dames.* (Bibliothèque nationale de France), accessed 02.11.2022, https://images.bnf.fr/#/detail/730227/45.

[31] Bertolin, "Processi per Stregoneria in Val d'Aosta," 87.

[32] Behringer, "How Waldensians Became Witches," 161–163.

"бедныя з Ліёна", роднага горада Вальдэса). У Ліёне ж і быў выдадзены ўпершыню трактат Ле Франка. Непасрэдна вальдэнсамі гэтая секта была названа Папам Яўгенам IV у буле ад 23 сакавіка 1440 г.: "якія па-народнаму называюцца ведзьмы або вальдэнсы (Waudenses)"[33]. Гаворка ў буле ішла пра яго палітычнага апанента, вышэйзгаданага Амадэя VIII Савойскага (Антыпапу Фелікса V), які называўся ім "архітэктарам схізмы" і першародным сынам Сатаны, які паўстаў супраць царкоўнай еднасці, спакушаны тымі самымі ведзьмамі/вальдэнсамі, якія былі асабліва шматлікімі ў Савоі[34].

Чым далей, тым больш пашыралася слава Ліёна як "вядзьмарскага" горада. Напрыканцы 1430-х быў складзены і набыў вірусную папулярнасць трактат "Вальдэнства з Ліёна – скарочана" (Vauderye de Lyonois en brief). Апісаныя ў ім з'явы не мелі нічога агульнага з вальдэнскім вучэннем, гаворка ішла пра распуснікаў, д'яблапаклоннікаў і ворагаў усяго чалавецтва. Трэба адзначыць, што ўлады горада Ліёна вельмі балюча ставіліся да такіх абвінавачванняў і нават афіцыйна звярнуліся ў 1455 г. да Папы Рымскага з просьбай выключыць з імшы радок "супраць бедных з Ліёна"[35].

Такое суаднясенне адбывалася і па той бок Альпаў. У юрыдычнай сферы гарадоў Ламбардыі XV ст. тэрмін barilòto (або barilòt) мог прымяняцца як у дачыненні да вальдэнсаў, так і да ведзьмаў, без выразнага падзелу паміж імі[36]. З часам абвінавачванні супраць вальдэнсаў-чараўнікоў абрасталі шакуючымі дэталямі. У 1403 г. падчас працэсу ў Сузе (Савоя) вальдэнсы на сваіх сходах нібыта не толькі займаліся распустай, але і варылі дзяцей, народжаных ад інцэсту, для стварэння магічнай мазі, а таксама пакланяліся дэманам у вобразах катоў і казлоў[37].

Не толькі ўяўныя вальдэнкі маглі выяўляцца як ведзьмы. У гэты перыяд на шматлікіх антывальдэнскіх працэсах вядомы выпадкі, калі адзін і той жа чалавек спачатку абвінавачваўся ў вальдызме, а потым заканчваў жыццё на вогнішчы за вядзьмарства. Такая з'ява мела месца ў Фрыбуры пры працэсе 1430 г. Яго пратаколы былі напісаныя па-французску, і абвінавачаныя ў ім былі падпісаныя "vaudois", а іх злачынствы – "vaudoisie", што першапачаткова было проста перакладам "вальдэнс" і "вальдызм", а пасля стала абазначаць таксама "чараўнік, ведзьма" і "чарадзейства, вядзьмарства" адпаведна. Праблема ў тым, што мы не ведаем, калі мелася на ўвазе

---

[33] Joseph Hansen, *Quellen und Untersuchungen zur Geschichte des Hexenwahns und der Hexenverfolgung im Mittelalter. Mit einer Untersuchung der Geschichte des Wortes Hexe* (Bonn: C. Georgi, 1901), 409.

[34] Ostorero, "Des papes face à la sorcellerie démoniaque," 162.

[35] Franck Mercier and Martine Ostorero, "The 'Waldensian Sect': Heresy and Witchcraft," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 395–421, 405–406.

[36] Benedetti, *"Fratelli Barlotti,"* 50.

[37] Luca Patria, "«Sicut canis reddiens ad vomitum»: lo spaesamento dei valdesi nel balivato sabaudo della diocesi di Torino fra Tre e Quattrocento," in *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca* (Torino: Claudiana, 2009), pp. 121–161, 130–135.

першае значэнне, а калі – другое[38]. Канчаткова трансфармацыя тэрміна ў гэтым рэгіёне завяршылася да працэсу 1447 г.

Парадыгма атаясамлення вальдэнсаў з ведзьмамі няўхільна пашыралася і да 1460 г. паміж гэтымі двума паняццямі ўпэўнена стаяў знак роўнасці[39]. Ян Цінктар, які піша ў 1470–1480 гг. кнігу, прысвечаную выкрыццю "вальдызму ў Арасе", калі ў 1460 г. па палітычна сфабрыкаванай "вядзьмарскай" справе былі асуджаны шматлікія жыхары гэтага горада і ваколіц, прыводзіць шматлікія ілюстрацыі вальдэнска-вядзьмарскіх пакланенняў Д'яблу ў вобразе казла і палётаў на шабаш[40].

Шлях ад першых абвінавачванняў у служэнні Люцыферу да поўнай міграцыі тэрмінаў "вальдэнс" ад ерэтыка да чараўніка заняў паўтара стагоддзя і можа быць коратка падсумаваны ў наступнай табліцы:

Табліца 3. Этапы суаднясення вальдэнсаў і ведзьмаў

Год	**Месца**	**З'ява**
1315	Крэмс і Свідніца	вальдэнсы пакланяюцца Люцыферу
1388	Альпійскія даліны	вальдэнсы ладзяць шабашы з оргіямі і вядзьмарскімі напоямі
1427	Альпійскія даліны	насельнікі займаюцца чараўніцтвам
1428	Альпійскія даліны	секта тых, хто лятае на мётлах, паходзіць з Ліёна
1428	Альпійскія даліны	gazzart = вальдэнс
1430	Фрыбур	vaudois = і вальдэнсы, і ведзьмы
1440	Альпійскія даліны	вальдэнсы = ведзьмы
1447	Фрыбур	vaudois = ведзьмы
1449	Альпійскія даліны	вальдэнка Янета – як ведзьма, лятае на мятле
1451	Ліён і Савоя	жанчыны, якія лятаюць на мётлах, падпісаныя "вальдэнкі"
1460	Арас	вальдэнсы = ведзьмы

Такім чынам, відавочныя паралелі абвінавачанняў вальдэнсаў і ведзьмаў (пакланенне Д'яблу, у тым ліку і ў выглядзе ката, празмернае ўжыванне ежы, оргіі і г. д.). Пытанне ў тым, ці было ў вальдэнскай дактрыне і практыках нешта "звышнатуральнае", што магло навесці саміх вернікаў на падобныя паралелі? Вышэйзгаданы Вольфганг Берынгер піша пра вальдэнсаў, якія з'яўляліся адначасова пасрэднікамі паміж двума сусветамі,

[38] Kathrin Utz Tremp, "Von der Häresie zur Hexerei. Waldenser- und Hexenverfolgungen im heutigen Kanton Freiburg (1399–1442)," *Schweizerische Zeitschrift für Geschichte* 52 (2002): pp. 115–121, 117.

[39] Behringer, "How Waldensians Became Witches," 168.

[40] Jean Tinctor, *Adoration du bouc. Traité du crime de vauderie* (Bibliothèque nationale de France), accessed 02.11.2022, http://expositions.bnf.fr/flamands/grand/fla_212.htm.

маглі бачыць і гаварыць з памерлымі[41]. Сілу сваю яны атрымалі ад саміх апосталаў[42], як і абавязак лячыць (Мф 10:1, 8). Пётр Білер выказвае меркаванне, што лячэнне магло быць часткай "апостальскага шляху", нароўні з беднасцю і пропаведдзю[43].

У прысудах інквізітарскіх допытаў з Керсі, праведзеных у 1240–1241 гг. інквізітарам Пятром Селанам[44], сустракаецца рэдкая (але не выключная для вальдэнсаў[45]) прафесія ўрача. Праўда, інквізіцыя асудзіла потым не толькі саміх лекараў, але і іх пацыентаў[46]. Было зафіксавана, што мясцовыя вернікі-міране, як вальдэнскія, так і катарскія, звярталіся да вальдэнскіх "настаўнікаў" па ўрачэбную дапамогу, напрыклад, мазь[47]. З тэкстаў прама не вынікае нейкі звышнатуральны характар такой дапамогі. Пётр Білер лічыць, што гаворка магла ісці пра накладанне рук[48]. На аснове пратаколаў можна зрабіць выснову, што вальдэнсы карысталіся "немагічнымі" спосабамі лячэння, хутчэй за ўсё, яны выкарыстоўвалі гэтую прафесію нароўні з прафесіяй гандляра для перамяшчэння і наведвання дамоў сваіх вернікаў, не выклікаючы падазрэнняў з боку ўладаў і суседзяў. Дуранд з Оскі ўтрымліваў шпіталь[49]. У Новы Час вальдэнскія "настаўнікі" альпійскага рэгіёну ў сваёй большасці ўсе валодалі рэальнымі ўрачэбнымі навыкамі[50].

Важную ролю адыгрываў сам рэгіён, у якім пачаўся і найбольш актыўна развіваўся анты-вальдэнска-вядзьмарскі пераслед: горныя даліны Альпаў. Альпійскія даліны ва ўспрыняцці каралеўскіх двароў Еўропы – месца дзікае, якое цяжка кантраляваць[51]. Пётр Вялікашаноўны каля 1138–1141 гг., на світанку заходнееўрапейскай антыерэтычнай палемікі, так пісаў пра паходжанне ерасі Пятра з Бруі: "Я думаў, што абледзянелыя Альпы і пакрытыя вечным снегам вяршыні прынеслі вашым жыхарам варварства, і што зямля, адрозная ад усіх іншых земляў, нарадзіла народ, адрозны ад усіх іншых, і, такім чынам, чужое вучэнне лягчэй пранікае ў дзікія норавы і да неадукаваных людзей"[52]. Фернан Брадэль адзначаў,

---

[41] Behringer, "How Waldensians Became Witches," 173–176.

[42] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 85. [VII.v.e.2]

[43] Biller, "Helping the Poor and Healing the Sick," 425–426.

[44] *L'inquisition en Quercy*, 36, 124, 136 і інш. [III.ii]

[45] Peter Biller, "Cathars and Material Women," in *Medieval Theology and the Natural Body*, vol. 1 (Woodbridge: York Medieval Press, 1997), pp. 61–108, 104–105.

[46] Ли, *История инквизиции*.

[47] *L'inquisition en Quercy*, 134. [III.ii]

[48] Peter Biller, "Medicine and Heresy," in *Religion and Medicine in the Middle Ages* (Woodbridge: York medieval Press, 2001), pp. 155–174, 106.

[49] PL 216:601–602.

[50] Biller, "Helping the Poor and Healing the Sick," 432.

[51] Marco Fratini, "Storie di frontiera e pratiche di confine nelle Valli valdesi," *La Beidana* 47 (2003): pp. 1–18, 8.

[52] *Corpus Christianorum continuatio mediaevalis: aelredi rievallensis opera omnia*, vol. 10 (Turnholti: Typographi Brepols Editores Pontificii, 1971), p. 10, paragr. 6, lines 7–12.

што менавіта ў горных рэгіёнах былі пашыраны павер'і пра д'ябла і ведзьмаў[53]. А паколькі формы барацьбы супраць ерэтыкоў і ведзьмаў супадалі[54], то некаторыя навукоўцы пісалі пра маштабную вайну феадальнага грамадства супраць свету гор (у дадзеным кантэксце – гэта тып сярэднявечнай цывілізацыі, які сфарміраваўся пераважна ў Альпах і прадугледжваў існаванне грамадства, якое было слаба звязана з іншымі супольнасцямі, з'яўлялася эканамічна і культурна замкнёным, не схільным да зменаў, сінкрэтычным у сваім светапоглядзе): спачатку ў форме барацьбы з ерасямі, а потым – з ведзьмамі[55].

Што б ні паспрыяла развіццю "д'ябальскіх" сюжэтаў у Альпах, менавіта гэты рэгіён адыграў асаблівую ролю ў лёсе сярэднявечных вальдэнсаў: менавіта тут яны ўзніклі, развіліся і "зліліся" ў інквізітарскай свядомасці з ведзьмамі, што вывела іх пераслед на новы ўзровень і тым самым падвяло рысу пад цэлай эпохай іх існавання.

Калі ж падсумаваць прычыны, што прывялі да такога зліцця вобразаў вальдэнскай жанчыны і ведзьмы, то варта пералічыць наступныя:

- традыцыйна высокая роля жанчыны сярод вальдэнсаў;
- "звышнатуральныя" здольнасці вальдэнскіх "настаўнікаў" (уяўленні пра іх хаджэнні на той свет, размовы з памерлымі і лекаванне), атрыманыя ад апосталаў, што прывяло да сакралізацыі асобы "настаўніка" (як і святара ў каталіцтве);
- падабенства знешняй атрыбутыкі вальдэнскай сустрэчы і шабашу ведзьмаў (патаемнасць, начны час, прысутнасць мужчын і жанчын разам);
- збор ахвяраванняў для "настаўнікаў", што магло трактавацца як "схаваны скарб";
- абвінавачанні ў пакланенні "раз не Рымскай Царкве – значыць, не Богу – значыць, Д'яблу" ў вобразе ката або казла, якое магло ўзнікнуць з-за адмовы наведваць каталіцкія імшы і прымаць таінствы ("бо д'ябал не дазваляў").

Усё гэта і навяло інквізітараў на думку, што вальдэнсы займаліся чараўніцтвам, у чым іх і прымушалі прызнавацца пад катаваннямі.

---

[53] Фернан Бродель, *Средиземное море и средиземноморский мир в эпоху Филиппа II*, доступ 02.11.2022, http://samlib.ru/z/zubkow_a_w/braudel.shtml.

[54] Lavenia Vincenzo, *The Alpine Model of Witchcraft. The Italian Context in the Early Modern Period.* Accessed 02.11.2022. https://www.academia.edu/29857735/The_Alpine_Model_of_Witchcraft_The_Italian_Context_in_the_Early_Modern_Period, 153.

[55] Merlo, "Identità religiose," 89; Hugh Redwald Trevor-Roper, "The European Witch-Craze of the 16th and 17th Centuries," in *The Crisis of the Seventeenth Century Religion, the Reformation, and Social Change* (Indianapolis: Liberty Fund, 2001), pp. 62–115, 94–98.

Вальдэнсы ў Цэнтральнай Еўропе і вучэнне Яна Гуса

Паляванне на ведзьмаў ахоплівала не ўсіх вальдэнсаў. Частка з іх пачала схіляцца ў бок руху, які нарадзіўся пад уплывам "класічнага" вальдызму, – гусітаў.

Рух гусітаў, як і вальдэнсаў, атрымаў назву ад імя свайго духоўнага натхняльніка Яна Гуса, але распачаўся толькі пасля яго смерці на вогнішчы ў Канстанцы ў 1415 г. Гусіты асуджалі назапашванне багацяў Царквой і духавенствам, заклікаючы вярнуцца да "евангельскай беднасці"; лічылі, што для таго, каб кожны чалавек мог зразумець "Закон Божы", набажэнствы павінны здзяйсняцца на чэшскай/роднай мове (усе гэтыя ідэі ўжо былі раней агучаны вальдэнсамі); крытыкавалі каталіцкае прычасце для духавенства хлебам і віном, а для свецкіх асоб толькі хлебам; даказвалі, што ў першапачатковым хрысціянстве ўсе прычашчаліся аднолькава.

Вялікі ўплыў вальдэнсаў на гусіцкую дактрыну доўгі час лічыўся даказаным, бо яшчэ сярэднявечныя палеміcты пісалі, што Чэхія была "інфіцыраваная чумой вальдызму"[56], а некаторыя навукоўцы бачылі ў ім нават самі карані гусізму[57]. Іншыя сцвярджалі, што вальдэнсы падтрымлівалі гусітаў фінансава[58]. Найвялікшую павагу да паслядоўнікаў Вальдэса мелі табарыты (радыкальныя гусіты)[59]. З іншага боку, сам Ян Гус адмаўляў усялякую сувязь з ерэтыкамі; у крыніцах, акрамя абвінавачванняў з боку каталікоў, няма прамых указанняў на сувязь паміж раннімі гусітамі і вальдэнсамі[60]. У любым разе, найбольш успрымальнымі да гусіцкай дактрыны аказаліся паўднёвыя рэгіёны Чэхіі, дзе перад гэтым былі заўважаны вальдэнсы[61]. Але, згодна з апошнім грунтоўным даследаваннем Альберта дэ Ланге, гусіты нават калі і мелі кантакты з вальдэнсамі, то ніяк не з чэшскімі, а з нямецкімі, але, па яго меркаванні, гэтыя кантакты не аказалі значнага ўплыву на фарміраванне ўтраквісцкага (памяркоўнага гусіцкага) вучэння[62].

Чэшская рэфармацыя была шырока падтрымана ў Венгрыі[63]. І ўжо ў XV ст. венгерскія вальдэнсы сустракаюцца пад назвай "гусіты"[64]. У гісторыі

---

[56] Välimäki, "Imagery of Disease, Poison and Healing," 148.

[57] Romolo Cegna, "Eresie e movimenti religiosi in Polonia e in Boemia-Moravia nel Medioevo (Repubblica Ceca)," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 174 (1994): pp. 109–125, 119.

[58] Thomas A. Fudge, *Heresy and Hussites in Late Medieval Europe* (Farnham–Burlington: Ashgate, 2014), 222.

[59] Romolo Cegna, "Valdismo e Ussitismo: mito e storia tra i fogli dei Codici II-3320 della Biblioteca Nazionale di Varsavia e Mil IV 77 della Biblioteca Universitaria di Wroclaw," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 144 (1978): pp. 27–44, 30.

[60] Albert de Lange, "Waldenses in Bohemia, 13th–16th Centuries," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 139–161, 148, 150.

[61] Doležalová, "The Inquisition in Medieval Bohemia," 310.

[62] de Lange, "Waldenses in Bohemia," 150.

[63] Josef Macek, "Die böhmische und die deutsche radikale Reformation bis zum Jahre 1525," *Zeitschrift für Kirchengeschichte* 85 (1974): pp. 149–173, 6.

[64] Hammann, "Waldenser in Ungarn," 434.

вальдэнсаў Польшчы, як і суседняй Чэхіі, памежнай датай з'яўляецца распаўсюджанне ідэй Яна Гуса. За кошт многіх агульных рыс у веравучэнні гэтыя два рухі вельмі моцна ўплывалі адзін на аднаго, што прывяло да сімбіёзу[65] і змен у дактрыне вальдэнсаў[66].

Абшчына крайніх гусітаў Чэшскіх братоў (іншыя назвы: Багемскія, Мараўскія, Аб'яднаныя браты, Unitas fratrum) – група памяркоўных табарытаў і радыкальных утраквістаў, якая пасля разгрому пад Ліпанамі адасобілася ад гусіцкага руху. Ядро секты склалі паслядоўнікі ідэй Пятра Хельчыцкага, што дастаткова выразна аформіліся ўжо ў 1440-я гг. Арганізацыйна абшчына ўтварылася вакол былога францысканскага манаха з Эмаўскага кляштара ў Празе (які захоўваў славянскую літургію), пляменніка ўтраквісцкага пражскага біскупа Яна Ракіцаны, Ржэгара. 1 сакавіка 1457 г. з дапамогай Ракіцаны імі быў атрыманы дазвол чэшскага караля Іржы з Падэбрад на пасяленне ў мястэчку Кунвальд у гарах Сілезіі, дзе і была ўтворана першая абшчына. У хуткім часе да яе далучыліся вальдэнсы і рэшткі табарытаў[67]. Сярод актыўных дзеячаў абшчыны былі тэолаг Марцін Лупач, спалены інквізіцыяй у Вене ў 1467 г., і былы каталіцкі святар Міхаіл Брадач.

Першыя перамовы Чэшскіх братоў з вальдэнсамі адбыліся ў 1460 г.[68], а ў 1467 г. для пасвячэння першых трох абраных па жэрабю біскупаў абшчыны ў вёсачцы Хотхе (бліз Рэйехаў) былі запрошаны менавіта вальдэнскія святары, бо толькі яны вызнаваліся ў абшчыне Unitas fratrum (якія на сённяшні дзень з'яўляюцца асобнай Царквой) за сапраўдных носьбітаў "харысмы" (Божага дару). Выбар паў на Стэфана з Базэля, але паколькі той неўзабаве быў схоплены інквізіцыяй, гэтую справу даручылі Марціну "з немцаў". Менавіта ён пасвяціў Чэшскага брата Мацвея[69]. Пасля смерці ў 1474 г. аскетычна настроенага Ржэгара абшчына Чэшскіх братоў перажывае ўнутраную эвалюцыю, аналагічную вальдэнскай у гарадах Свяшчэннай Рымскай Імперыі, і яшчэ больш набліжаецца па сваім унутраным уладкаванні да вальдэнскай. На чале абшчыны сталі браты Лука, Лаўрэнцій і Пракоп, якія вырашылі правесці рэформу і выпрацаваць новую дагматыку абшчыны. Доступ у яе быў адкрыты багатым і вучоным людзям, а братам дазвалялася займацца гандлем і рамяством, што прыбрала апошняе прынцыповае разыходжанне паміж гэтымі рухамі.

Наступныя палажэнні веры Хельчыцкага і Чэшскіх братоў былі агульнымі для іх і вальдэнсаў.

---

[65] Rymar, "Waldensi z «kacerskich» okolic Chojny," 28.

[66] Romolo Cegna, "Il Valdismo nel '300 come alternativa alla Chiesa di Roma," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 148 (1980): pp. 49–56, 50.

[67] Артур Озолин, *Из истории гуситского революционного движения* (Саратов: Изд-во Саратовского университета, 1962), 172.

[68] Rudolf Říčan, *Die Böhmischen Brüder, ihr Ursprung und ihre Geschichte* (Berlin: Union Verlag, 1961), 20.

[69] Molnár, *Storia dei valdesi*, 187.

✠ І адны, і другія прызнавалі трайны ідэал веры, любові і надзеі, а з ім і Апостальскі, Нікейскі і Афанасьеўскі сімвалы веры.

✠ Шырока прапагандавалася неабходнасць пропаведзі, якая залежыць выключна ад боскага натхнення, і ніякім чынам не ад свецкай улады. Існуе меркаванне, што місіянерская дзейнасць Чэшскіх братоў аднавіла, хоць і ў новым гістарычным кантэксце, ужо крыху забытую ініцыятыву першых паслядоўнікаў Вальдэса[70].

✠ Вялікае значэнне мела Біблія[71]; перавага аддавалася Новаму Запавету, дзве публікацыі якога выйшлі ў 1518 і 1525 гг. у перакладзе на чэшскую мову. Гэтыя пераклады былі зроблены з Вульгаты, а ў 1564 і потым у 1568 гг. братам Янам Бласлявам з грэчаскага арыгінала. Гэта дэманструе высокі адукацыйны ўзровень лідараў абшчыны. Богаслужэнні праводзіліся на мове мясцовага насельніцтва[72].

✠ Здзяйсняліся ўсе сем таінстваў[73]. Ёсць звесткі пра выкарыстанне нямецкімі вальдэнсамі трактатаў аб таінствах Лукі Пражскага (з братоў) як блізкага па веры. Вялікае значэнне надавалася літургіі, Нагорнай пропаведзі, малітве.

✠ Скрозь быў распаўсюджаны данатызм[74]; і для Чэшскіх братоў, і для вальдэнсаў сумежных рэгіёнаў была ўласціва катэгарычная фраза "не святы свяшчэннік не з'яўляецца свяшчэннікам".

✠ Не прызнаваліся карныя правы свецкай улады і гвалтоўныя сродкі барацьбы[75]. Абедзве абшчыны прапаведавалі пацыфізм (выступалі супраць узброенага змагання табарытаў), таму што над усім перамогу атрымлівае ісціна (II Езд 3:12).

✠ Ідэалізавалася пакутніцтва, а разам з ім і крайні аскетызм. Эталонам жыцця быў шлях апосталаў. З гэтага вынікала, што толькі першыя хрысціяне трымаліся цалкам запаветаў Хрыста, выкладзеных у Евангеллі. Яны лічылі, што ўсё дададзенае да вучэння першапачатковай Царквы паходзіць ад Антыхрыста. Пасля прыняцця Папам Сільвестрам "Канстанцінавага дару", што адбылося па намове Д'ябла, Царква канчаткова скампраментавала сябе і сышла з праведнага шляху[76].

---

[70] Molnár, *Storia dei valdesi*, 273.

[71] Озолин, *Из истории гуситского революционного движения*, 178.

[72] Гилер Лившиц, *Реформационное движение в Чехии и Германии* (Минск: Вышэйшая школа, 1978), 125–127.

[73] Николай Ястребов, *Этюды о Петре Хельчицком и его времени* (Из истории гуситской мысли), том 89 (Санкт-Петербург: тип. Министерства путей сообщения (т-ва И.Н. Кушнерев и К°), 1908), 234–242.

[74] Озолин, *Из истории гуситского революционного движения*, 177; Ястребов, *Этюды о Петре Хельчицком и его времени*, 127.

[75] Озолин, *Из истории гуситского революционного движения*, 173, 180–81.

[76] Озолин, *Из истории гуситского революционного движения*, 174–175.

✠ Пётр Хельчыцкі пераняў вальдэнскую легенду пра Сільвестра, згодна з якой Пётр Вальдэс быў "socius", які трымаўся сапраўднай веры, чым вырак сябе на нелегальнае патаемнае існаванне ў лясах і пячорах[77]. Працягвалася крытыка пасляканстанцінаўскай сістэмы царкоўнага будаўніцтва, распачатая вальдэнсамі[78]. Хельчыцкі ўзняў праблему сацыяльнай структуры таго часу і заявіў, што саюз духоўнай і свецкай улады асвячае сацыяльную несправядлівасць. З яго пункту гледжання падзел грамадства на тры саслоўя ні ў якім разе не апраўданы законам Божым[79]. Ён адзначыў, што ў Нагорнай пропаведзі Хрыста няма ні слова пра палітычную ўладу, а таму ён, як і вальдэнсы, уступіў у супрацьстаянне з тымі, хто валодае ўладай.

У сваёй Споведзі веры ў 1538 г. абшчына Unitas fratrum афіцыйна заявіла пра сваё духоўнае братэрства з вальдэнсамі[80]. Такім чынам, паслядоўнікі Вальдэса аказалі значны ўплыў як на арганізацыйнае, так і на тэалагічнае развіццё абшчыны Чэшскіх братоў.

Але ўплыў гэты не быў аднабаковым. Наадварот, больш магутны і больш масавы гусіцкі рух зацягваў вальдэнсаў, уплываў на іх веру і лад жыцця. Больш за тое, нават ва ўспрыманні інквізітараў гэтыя дзве "ерасі" пачалі зліваццa ў адну пад агульным імем "гусіты".

Безумоўна, вальдэнсы не зліліся з гусітамі. Але перыяд "класічнага" вальдызму закончыўся.

Першы перыяд (1170-я гг. – 1215 г.) ахоплівае ўзнікненне вальдэнскага руху ў "біскупскім" горадзе Ліёне ў 1170-я гг. як спробу часткі грамадства даць адказ на два пытанні, якія ў той час стаялі вельмі востра: пытанне пра літаральнае прытрымліванне біблейных запаветаў (беднасць, адмова ад клятвы і інш.) і пытанне пра "мірскую пропаведзь". На гэтым этапе вызначальную ролю ў крышталізацыі вальдэнскай дактрыны адыграў рух катараў. Да "мірской пропаведзі" вальдэнсаў змусіла менавіта неабходнасць супрацьстаяць пашырэнню гэтага вучэння, відавочна аддаленага ад "артадаксальнага" разумення Біблii, безумоўны аўтарытэт якой прызнаваўся ўсімі вальдэнсамі. Першыя споведзі веры вальдэнскіх правадыроў складаюцца як фактычнае адмаўленне катарскага вучэння. "Класічны" вальдызм сфарміраваўся з дзвюх частак: максімальнае набліжэнне да апостальскага ладу жыцця і адмаўленне катарызму.

---

[77] Jaroslav Bidlo, *Akty Jednoty bratrské*, vol. 1 (Brno: Historická komise při Matici moravské, 1915), https://archive.org/details/aktyjednotybratr01bidluoft; Alberto Cadili, "Il veleno di Costantino. La Donazione di Costantino tra spunti riformatori ed ecclesiologia ereticale (secoli XII–XVI)," in *Enciclopedia Costantiniana*, 2013, pp. 621–624, 635.

[78] Озолин, *Из истории гуситского революционного движения*, 173.

[79] Ястребов, *Этюды о Петре Хельчицком и его времени*, 127–129, 144–148.

[80] Romolo Cegna, "Valdismo e Ussitismo," 27–28.

Калі б апошні не быў да такой ступені распаўсюджаны, не было б такой пільнай неабходнасці ў пропаведзі, і тым больш не ставілася б пытанне аб удзеле вальдэнсаў у нейкім змаганні супраць адступнікаў. Менавіта прага пропаведзі прывяла да выгнання вальдэнсаў з Ліёна, а потым і да іх канчатковага разрыву з Каталіцкай Царквой.

Гэты разрыў адбыўся ў другім перыядзе (1215–1260-я гг.). Была сфарміравана класічная вальдэнская абшчына з яе падзелам на вандроўных прапаведнікаў-настаўнікаў і аселых вернікаў. Працягвалася актыўная пропаведзь, у тым ліку і публічная, бо, нягледзячы на афіцыйную забарону, у многіх мясцовасцях вальдэнсы не ўспрымаліся як ерэтыкі. Таксама ў гэты час крышталізуюцца найбольш знакавыя рысы вальдэнскага вучэння: літаральнае разуменне Евангельскіх запаветаў, забарона клятвы і прымянення гвалту, завучванне вялікіх урыўкаў Святога Пісання на памяць не толькі "настаўнікамі", але і вернікамі. Набывае акрэсленасць сацыяльны склад вальдэнскага руху ў кожным рэгіёне распаўсюджання.

У трэцім перыядзе (1260-я гг. – пачатак XV ст.) падчас узмацнення інквізітарскага пераследу найбольш ярка праяўляюцца мясцовыя варыянты вальдэнскага вучэння. У гэты час вальдэнсы сустракаюцца ў вольных імперскіх/біскупскіх гарадах. Гэтыя гарады адначасова былі аддаленыя ад цэнтральнай улады, валодалі правам на самакіраванне ці падпарадкоўваліся царкоўным прэлатам і мелі высокую ступень сацыяльна-эканамічнага развіцця. Неабходнымі ўмовамі для паспяховай вальдэнскай пропаведзі ў такіх гарадах была наяўнасць вялікай колькасці гандляроў і ткачоў – значнай часткі аўдыторыі вальдэнскіх прапаведнікаў. Члены абшчыны паспяхова адаптаваліся ў гарадскім асяроддзі і мелі высокае сацыяльнае становішча, адмаўляючыся для гэтага ад базавых вальдэнскіх каштоўнасцяў пра недапушчальнасць гвалту, клятвы і ўзбагачэння. Такія змены сведчылі пра глабальную эвалюцыю ўсёй вальдэнскай абшчыны: павышаецца іх сацыялізацыя, нягледзячы на супрацьстаянне з Рымскім Прастолам; яны здолелі ўмацаваць сваё матэрыяльнае становішча і нават ідэалагічна адаптавацца да тагачаснага грамадства. Канчаткова фарміруецца легенда пра "апостальскае" паходжанне Вальдэнскай Царквы, чые шляхі з каталіцызмам разышліся ўжо ў часы Папы Сільвестра. Вальдэс і адзін з яго паплечнікаў (Вівет або Ян з Ронка) атрымліваюць біблейныя апостальскія імёны Пётр і Ян, аказваюцца пасвечанымі ў сан. З гэтых гарадоў вальдэнсы зніклі падчас пераследаў з боку інквізітараў, біскупаў і гарадскіх уладаў у чацвёртым перыядзе.

Чацвёрты перыяд закранае пачатак XV ст., звязаны з узнікненнем у Цэнтральнай Еўропе руху яшчэ больш моцнага, шматлікага і ўплывовага, чым вальдэнсы, – руху гусітаў. Глеба для яго ўзнікнення ў свой час была падрыхтавана менавіта вальдэнсамі, яны адыгралі ролю своеасаблівых "духоўных настаўнікаў" для некаторых гусіцкіх абшчын. Разам з тым больш магутны гусіцкі рух таксама ўплываў на рух вальдэнскі, часткова паглынаючы яго, асабліва на старонках сярэднявечных хронік і трактатаў.

"Класічны" вальдызм перастае існаваць, яму на змену прыходзіць своеасаблівы гусіцка-вальдэнскі сімбіёз.

Калі на ўсходзе Еўропы канец існавання "чыстага вальдызму" быў выкліканы ўплывам гусітаў, то на захадзе вальдэнсаў у абазначаны перыяд пачалі ўсё часцей блытаць з ведзьмамі, што звязана, у першую чаргу, з пераарыентацыяй інквізіцыйнага вышуку на барацьбу з вядзьмарствам. Такое змяшэнне, у адрозненне ад прыведзенай вышэй сітуацыі з гусізмам, не прывяло да змянення вальдэнскай дактрыны, але ўскладніла даследчыкам працу з крыніцамі і паказала на кардынальныя змены ў стаўленні да самога феномена ерасі ў грамадстве.



Глава 3

Гісторыка-геаграфічныя асаблівасці ўзнікнення і пашырэння руху вальдэнсаў



Нягледзячы на артадаксальнасць поглядаў самога Вальдэса, ён заставаўся міранінам, а значыць – яму было забаронена прапаведаваць. Але Вальдэс не пагадзіўся і паўтарыў словы Святога Пятра, сказаныя да гэтага "ерэсіярхам" Генрыкам: "трэба слухацца болей Бога, чым людзей" (Дзеі 5:29)[1]. Прамоўлены гэтыя словы былі перад новым архібіскупам ліёнскім – Янам з Кентэрберы[2], які ў 1181 г. (і да 1193-га) змяніў на гэтай пасадзе Гвічарда. У адрозненне ад апошняга, Ян належаў да белага духавенства і быў прызнаным барацьбітом з ерасямі.

Таму зразумела, што такога непадпарадкавання біскуп не змог дараваць, і вальдэнсы ў 1182/1183 г. былі выгнаны з Ліёна. Некаторыя даследчыкі, якія лакалізуюць дом Вальдэса ў квартале ля царквы Сан-Нізье[3], сцвярджаюць, што вуліца, дзе некалі жыў Вальдэс, пасля гэтага на працягу некалькіх стагоддзяў называлася "Праклятай"[4].

Вальдэнсы не маглі працягваць сваю дзейнасць у Ліёне і сталі вандроўнікамі. Іх рух ахапіў Бургундыю, Дафінэ, Ламбардыю, Савою і Лангедок, дзе ў гэты час было пашырана альбігойства, потым – іншыя часткі Свяшчэннай Рымскай Імперыі, а таксама некаторыя рэгіёны Арагонскага Каралеўства[5].

Вальдэнсы ў сваіх вандроўках не заўсёды звярталі ўвагу на дзяржаўныя межы, часта перамяшчаючыся з-пад адной юрысдыкцыі ў іншую. Для многіх тэрыторый вызначыць дакладную прыналежнасць бывае даволі складана, бо, да прыкладу, Савоя і некаторыя гарады Швейцарскай Канфедэрацыі фармальна знаходзіліся ў падначаленні Свяшчэннай Рымскай Імперыі, але фактычна праводзілі незалежную палітыку. Некаторыя тэрыторыі, напрыклад, Сілезія, пераходзілі з рук у рукі. Да таго ж, пры вывучэнні рэлігійных рухаў найбольшае значэнне мае не столькі палітычны, колькі дыяцэзіяльны падзел (тая ж Сілезія палітычна знаходзілася ў падпарадкаванні Імперыі, а царкоўна – польскага прымаса ў Гнезна). Інквізіцыйныя акругі наогул мелі свой асобны падзел. Улічваючы гэтыя абмежаванні, рэгіянальнае вывучэнне гісторыі вальдэнсаў будзе грунтавацца на ўнутраных асаблівасцях самога руху, а не на палітычных межах.

---

[1] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 17. [I.vii]

[2] Згадваецца ў крыніцах пад шырока распаўсюджанай у сярэднявеччы мянушкай de Bellis Manibus/Belesmains/Beles-Mayns, што на беларускую мову можа быць перакладзена як "Праведныя Рукі".

[3] Сёння Rue de la Poulaillerie, 13.

[4] Armitage, *A History of the Baptists*, 294; Papini, *Valdo di Lione*, 95–96.

[5] Comba, *Storia dei valdesi*, 42.

Лангедок і Бургундыя

Вялікім дапушчэннем можна сказаць, што Ліён знаходзіцца ў цэнтры паміж гэтымі дзвюма рэгіёнамі. У крыніцах паўднёвафранцузскія вальдэнсы часта называюцца "ўльтрамантанамі" ("тымі, хто з-за гор" з пункту гледжання італьянскіх вальдэнсаў).

У гэтым рэгіёне галоўным "ворагам" вальдэнсаў была не Каталіцкая Царква, а іншы рух – катары. Гэта абумовіла спецыфіку рэгіёну:

- ✠ Фактычная адсутнасць падзелу на "сваіх" і чужых". Вальдэнсы тут слаба вылучалі сябе з агульнай масы каталіцкіх вернікаў, але даволі выразна праводзілі мяжу паміж сабой і катарамі.
- ✠ Найменшая (у параўнанні з астатнімі рэгіёнамі) схільнасць да данатызму і талерантнасць да каталіцкага кліру;
- ✠ Найбольшая колькасць згадак пра самастойнае здзяйсненне еўхарыстыі.
- ✠ Найбольшая (але не выключная) колькасць згадак пра пераклады Біблії на "народную" мову – сведчанне таго, што мова перакладу адпавядала мове рэгіёну.
- ✠ Найбольшая (але не выключная) колькасць згадак пра абрэзаны зверху абутак (сандалі).
- ✠ Моцны акцэнт на забароне праліцця крыві і адсутнасць звестак пра ўзброены супраціў (у 1321 г. у рэгіёне былі забітыя два інквізітары, але ўдзел вальдэнсаў не пацверджаны[6]).

На працягу XIII ст. вальдэнскія прапаведнікі актыўна дзейнічалі па ўсім рэгіёне, прычым некалькі першых дзесяцігоддзяў абсалютна адкрыта – іх нават ведалі пад сваім імем: "ёсць вальдэнсы, або бедныя духам, або бедныя з Ліёна"[7], і лічыліся вельмі станоўчымі асобамі, зусім не ерэтыкамі: "вальдэнсы – добрыя людзі ці нават святыя"[8]. Многія мясцовыя каталікі імкнуліся і сваім знешнім выглядам, і паводзінамі быць падобнымі да вальдэнсаў[9]. Але інквізіцыя працавала актыўна – вальдэнсы былі схоплены ў ваколіцах Кастра на рацэ Агу, потым Гурдоне, Манкюку і перш за ўсё ў Мантабане[10].

---

[6] Paravy, *De la chrétienté romaine à la Réforme en Dauphiné*, 949.
[7] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 50–54. [III.i.a]
[8] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 50–54. [III.i.a]
[9] Biller, "Waldensians in the Inquisition Registers," 24.
[10] Molnár, *Storia dei valdesi*, 113.

У 1241–1242 гг. інквізітар Пётр Селан пісаў пра вялікую добра арганізаваную групу з цэнтрам у Мантабане (каля двухсот чалавек абодвух полаў). Па сацыяльным складзе гэтыя вальдэнсы, у супрацьлегласць катарам, паходзілі пераважна з ніжэйшых пластоў грамадства, за выключэннем некаторых знатных асоб. Адзін са сведак сцвярджаў, што сам "часта наведваў школу вальдэнсаў і чытаў з імі"[11]. Вальдэнская абшчына таксама ўтрымлівала шпіталь і могілкі, што было магчыма толькі да таго часу, пакуль яны не "крыміналізаваліся" ў вачах навакольнага каталіцкага насельніцтва. А пакуль яны "навучалі" публічна "па вуліцах і па завулках"[12], і нават "чыталі і спявалі разам з клірам у царкве". Некаторыя лячылі з дапамогай накладання рук[13], што з пункту гледжання Касцёла выглядала падобна да цудаў Хрыста, было неверагоднай дзёрзкасцю і народнай магіяй. Ёрг Фёхтэр звяртае ўвагу на факт адсутнасці ў вальдэнсаў рэгіёну кроўных сувязяў з мясцовым насельніцтвам і выказвае меркаванне, што яны былі эмігрантамі[14].

У якасці пакарання вальдэнсаў (як і некаторых катараў) Пётр Селан адпраўляў у паломніцтвы[15]. Ніводнага смяротнага прысуду ці пажыццёвага зняволення не зафіксавана (што суадносіцца з адсутнасцю прызнанняў "дасканалых" і "рэцэдывістаў"). У той жа час нельга выключыць, што такія выпадкі былі, проста запісы пра іх не дайшлі да нашага часу. У прызнаннях не згадваецца адмаўленне індульгенцый і чыстца (але мы не можам дакладна вызначыць, гэта было не важна для саміх апытаных ці для тых, хто задаваў пытанні), але сустракаецца апісанне еўхарыстыі, што ўказвае на важнасць супрацьстаяння з катарамі. У той самы час многія вернікі-міране ахвотна слухалі пропаведзі прадстаўнікоў абедзвюх сектаў, і нават ладзілі паміж імі дыспуты[16]. Згодна са статыстычным аналізам крыніцаў, большасць сем'яў вернікаў з ахвотай слухалі "настаўнікаў" з абедзвюх сектаў[17].

Ацаніць прысутнасць вальдэнсаў у даліне Роны не ўяўляецца магчымым з-за спарадычнасці звестак. Вядома, што ў 1226 г. папскі легат абвінавачваў жыхароў Авіньёна, які на той час належаў Свяшчэннай Рымскай Імперыі, што яны "доўгі час прымалі вальдэнсаў" (хоць па сутнасці гэта магло быць толькі палемічным прыёмам)[18].

---

[11] *L'inquisition en Quercy*, 132. [III.ii]

[12] Алюзія на Песн 3:2.

[13] Cameron, *Waldenses*, 71; Molnár, *Storia dei valdesi*, 113; Biller, "Waldensians in the Inquisition Registers," 31; *L'inquisition en Quercy*, 36, 58, 124 etc. [III.ii]; Biller, "Cathars and Material Women," 104–105.

[14] Jörg Feuchter, "All'ombra dei catari. Valdesi nella società «pluri-ereticale» della Linguadoca nel primo Duecento," in *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca* (Torino: Claudiana, 2009), pp. 53–60, 56–57.

[15] *L'inquisition en Quercy*, 24. [III.ii]

[16] *L'inquisition en Quercy*, 68. [III.ii]

[17] Taylor, "A Presence in Languedoc," 57.

[18] Chiffoleau, "Religious Dissidence," 107–108.

У 1248 і 1280 гг. інквізітарскія крыніцы кажуць пра вальдэнсаў у Арлі, Безансоне і ваколіцах[19]. Прысутнасць вальдэнсаў была заўважана ў дыяцэзіях Німа і Нарбоны (у 1240 г. у Нарбонскай дыяцэзіі быў разбураны дом, дзе былі знойдзены дзве вальдэнскія жанчыны; каля 1240 г. Яна з Бургундыі асудзілі на пажыццёвае зняволенне, у 1251 г. нейкія жанчыны атрымалі аналагічны прысуд[20]). У Авіньёне і Арлі было арганізавана маштабнае знішчэнне вальдэнсаў каля 1273–1275 гг. Імігранты з Бургундыі сфарміравалі вальдэнскія супольнасці ў дыяцэзіях Радэз і Астарак[21]. Выяўленыя ў ваколіцах Авіньёна вальдэнсы (мужчыны і жанчыны) належалі да розных сацыяльных пластоў, у тым ліку і да шэрагаў людзей заможных і ўплывовых. Гэта значыць, што вальдэнсы ў той час – гэта не толькі прапаведнікі, але і добра ўладкаваныя міране. Жак Шыфалё бачыць прычыну папулярнасці вальдэнскага вучэння ў даўніх антыцаркоўных традыцыях рэгіёну[22].

У 1262–1263 гг. вальдэнсы (або асобы, непраўдзіва абвінавачаныя ў вальдызме) трапілі ў вір барацьбы паміж прыхільнікамі французскага караля Людовіка IX, Карла Анжуйскага, гарадской знаці і дамініканцамі, з аднаго боку, і праімператарскімі францысканцамі, з другога. У вальдызме былі абвінавачаны 17 прадстаўнікоў гарадскога патрыцыяту. Паказальна, што для многіх падобных працэсаў адсутнічаюць непасрэдныя паказанні "ерэтыкоў", што не дазваляе ацаніць ступень іх "ерэтычнасці" і схіляе да канстатацыі палітычнай матываванасці працэсу[23].

Падчас працы інквізіцыі ў Тулузе некалькі чалавек былі абвінавачаны ў вальдызме. Падазраваныя актыўна адмаўлялі свае сувязі з вальдэнскімі "настаўнікамі" і абвінавачвалі ў іх сваіх суседзяў, якія па іх сведчаннях падчас імшаў выкарыстоўваюць Біблію, напісаную на сумесі лаціны і "раманскай" мовы[24].

Каля 1310 г. інквізіцыя Тулузы загадала арыштаваць па падазрэнні ў вальдызме і пасадзіць у турму вялікую колькасць жыхароў Гасконі, якія імігравалі туды з Бургундыі ў 1280–1290 гг. Зафіксаваны незвычайны факт, што адзін з інквізітараў па імені Жан Філіберт быў настолькі ўражаны верай гасконскіх вальдэнсаў, што перайшоў у вальдызм, а пазней быў выкрыты і спалены на вогнішчы[25]. Арышты па падазрэнні ў вальдызме паўтараліся і ў будучым, што прымусіла некаторых вальдэнсаў шукаць прытулку ў Пірэнеях[26]. Гэтыя эпізоды сталі часткай вялікай кампаніі супраць ерасяў, якую разгарнулі ў 1320-я гг. Бернард Гі і Жак Фурнье (будучы

---

[19] Balossino and Chiffoleau, "Valdesi e mondo comunale in Provenza nel Duecento," 187.
[20] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 56–59. [III.i.c]
[21] Molnár, *Storia dei valdesi*, 113–114.
[22] Chiffoleau, "Religious Dissidence," 111–112.
[23] Balossino and Chiffoleau, "Valdesi e mondo comunale in Provenza nel Duecento," 96–99.
[24] Peter, Bruschi, and Sneddon, *Inquisitors and Heretics*, 580.
[25] Given, *Inquisition and Medieval Society*, 197.
[26] Ли, *История инквизиции*.

Папа Бенедыкт XII). Яе вынікі былі падсумаваныя ў працы "Кніга прысудаў Тулузскай інквізіцыі ад года Хрыстова 1307 па 1323"[27]. Саманазвай мясцовай групы вальдэнсаў з'яўлялася простае "браты" (inter se vocabant se fratres)[28], а інквізітары называлі іх "бедныя з Ліёна" і "вальдэнсы". У большасці сваёй прапаведнікі былі мужчынамі і свецкімі асобамі, і іх узровень адукацыі выглядае ніжэйшым, чым нават у вальдэнсаў з Рэскрыпта, хоць і пастулюецца апора на Святое Пісанне. Споведзі праводзіліся не кожны раз пры сустрэчы прапаведнікаў са сваімі вернікамі (як гэта стане пазней), але толькі ў асобных выпадках, і толькі найважнейшым з вандроўнікаў. Інквізатарамі асабліва падкрэсліваецца, што вернікі спавядаліся "настаўнікам" і верылі ў дзейснасць іх адпушчэнняў, хоць і ведалі, што тыя не з'яўляюцца пасвечанымі святарамі. Пакаянні, якія накладалі "настаўнікі", былі даволі тыповыя: пост і малітва "Ойча наш". Сустракаецца своеасаблівая форма агульнай малітвы: пасля супольнага прыняцця ежы ўсе ўкленчваюць на лаўцы і чытаюць некалькі разоў "Ойча наш". Нідзе не ўказана, на якой мове прамаўляецца малітва, але падкрэсліваецца, што сама пропаведзь праходзіць на "агульнай" мове, прычым многія часткі чыталіся па памяці. Галоўныя правілы, якія заставаліся "ў галовах" вернікаў пасля пропаведзі, – гэта забарона клятвы і смяротнага пакарання, а таксама адмаўленне чыстца і індульгенцый. "Вальдэнсамі" ў дадзеным працэсе называлі пераважна вандроўных "настаўнікаў". Сярод іх згадваецца таксама Раймунда дэ Кастрыс (Raymunda de Castris)[29]. Гэта дазваляе выказаць меркаванне, што жанчыны таксама маглі прапаведаваць. Радзей сустракаецца крытыка каталіцкага кліру: яго імкненне да багацця і пераследу "сапраўдных" вернікаў.

Для вальдэнсаў Дафінэ, якія не паспелі ўцячы ў Ламбардыю, працэс Жака Фурнье скончыўся вялікім вогнішчам у Пам'е ў 1320–1321 гг. Адразу зазначым, працэс гэты быў скіраваны ў асноўным супраць катараў, вальдэнсаў было толькі 90 чалавек, што складала 14,3% ад агульнай колькасці пакараных[30], спалена ж было ўсяго толькі 8,4%[31], але гэты працэнт быў большы, чым у катараў[32]. Большасць асуджаных прыгаворвалася да турэмнага зняволення і нашэння нашытага на адзенне крыжа (маркіравала чалавека як былога ерэтыка, чым істотна паніжала яго сацыяльна-прававы статус), на другім месцы па ўжыванасці пакарання – спаленне і пілігрымкі[33]. Цікава адзначыць, што, у адрозненне ад нямецкамоўных рэгіёнаў, толькі

[27] Philippus van Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae ab anno Christi MCCCVII ad annum MCCCXXIII* (Amstelodami: Apud H. Wetstenium, 1692). [III.v]
[28] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 366. [III.v]
[29] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 200–201. [III.v]
[30] Given, "A Medieval Inquisitor at Work," 211.
[31] Given, "A Medieval Inquisitor at Work," 222.
[32] Given, "A Medieval Inquisitor at Work," 232.
[33] Given, "A Medieval Inquisitor at Work," 224.

траціну ад агульнай колькасці асуджаных складалі жанчыны[34]. Па выніках працэсу большасць "настаўнікаў" так і не была схоплена, а вернікі адракліся і атрымалі пакаянні ў выглядзе нашэння крыжоў на вопратцы і інш.

Для гэтага рэгіёну ёсць унікальная магчымасць прасачыць эвалюцыю, па-першае, вальдэнскіх вераванняў, а па-другое, інквізітарскіх пакаранняў (праз параўнанні працэсаў Пятра Селана і Жака Фурнье). Вынікі параўнання сведчаць, па-першае, пра паступовае змяншэнне размежавання паміж катарамі і вальдэнсамі, па-другое, пра радыкалізацыю вальдэнскага антыкаталіцкага вучэння ў рэгіёне, а па-трэцяе, – пра павелічэнне жорсткасці інквізітарскага пераследу.

Рост інквізітарскай актыўнасці прама звязаны з пераездам папскай рэзідэнцыі ў Авіньён у 1309 г.[35] Фіскальная машына папства расце, і было нават аб'яўлена ерэтычным меркаванне, што Ісус і апосталы выступалі супраць усялякай маёмасці (асноўны дагмат францысканцаў-спірытуалістаў), што выкарыстоўвалася і супраць вальдэнсаў. У гэтым папству актыўна дапамагала каралеўская і імператарская ўлада: у 1315 г. французскі кароль Людовік X працягнуў антыерэтычныя намаганні імператара Фрыдрыха II[36]. Працягвалася і "зачыстка" тэрыторыі вакол самога Авіньёна – так, у 1335 г. Папа Бенедыкт XII арганізаваў пераслед вальдэнсаў у Валентынуа. Ёсць звесткі пра судовыя працэсы ў ваколіцах Ліёна і інш.[37]

Рэшткі абшчыны вальдэнсаў на працягу некаторага часу яшчэ захоўваліся ў Брабанце (сучасныя Нідэрланды). Змаганне супраць іх распачалося ў 1241 г.[38] Пранікаюць вальдэнсы ў Брабант з Францыі ў сярэдзіне XIII ст. – яны ўжо ў 1230 г. "маглі дайсці ад Антверпэна да Рыма, штораз начуючы ў сваіх адзінаверцаў"[39]. Апошні антывальдэнскі інквізіцыйны працэс пачаўся тут у 1459 г.[40]

---

[34] Given, "A Medieval Inquisitor at Work," 227.

[35] *Гісторыя Сярэдніх Вякоў*, 2 тома. Заходняя Еўропа і Візантыя (Мінск: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2003), 110.

[36] *Ordonnances des roys de France de la troisieme race, recueillies par ordre chronologique*, vol. 1 (Paris: Imprimerie royale, 1723), 610–611.

[37] Paravy, *De la chrétienté romaine à la Réforme en Dauphiné*, 955.

[38] Paul Frédéricq, *Corpus documentorum inquisitionis haereticae pravitatis neerlandicae: Verzameling van stukken betreffende de pauselijke en bisschoppelijke inquisitie in de Nederlanden*, vol. 1. 1025–1520 (Gent: J. Vuylsteke, 1889), 113–114.

[39] Charles Homer Haskins, *Studies in Medieval Culture* (New York: Oxford University Press, 1929), 199.

[40] Paul Frédéricq, *Corpus documentorum inquisitionis haereticae pravitatis neerlandicae: Verzameling van stukken betreffende de pauselijke en bisschoppelijke inquisitie in de Nederlanden*, vol. 3. 1236–1513 (Gent: Vuylsteke, 1906), 89–113.

Паўночнаітальянскія гарады-камуны

Ламбардыя (гістарычны рэгіён, які ўключаў тэрыторыю да Фларэнцыі, дзе ў 1245 г. адбыўся працэс супраць Адэліны, жонкі Альбіццо Трыбальдзі, якія прымалі ў сябе дома "бедных з Ліёна"[1]) невыпадкова стала рэгіёнам пераважнага распаўсюджання вальдэнсаў у Італіі: тут перасякаліся вельмі важныя гандлёвыя шляхі, як наземныя, так і водныя. Гэтая зямля была надзвычай "урадлівай" для самых розных рэлігійных плыняў[2]. Храналагічна распаўсюджанне тут вальдэнсаў супадае з агульным росквітам ерасяў – у XIII ст. іх было значна больш, чым у XIV ст.[3]

Да канца XIV ст. менавіта ў Ламбардыі збіраліся агульнавальдэнскія сіноды – "савет ці капітул, які мае звычку праводзіцца ў вялікім кірмашовым горадзе, куды прыходзіць шмат людзей, каб самі яны [вальдэнсы] паміж імі [прыйшлымі людзьмі] маглі схавацца"[4]. У тыя часы не існавала дакладнай працэдуры для праверкі падазроных асоб уладамі[5].

Гісторыя Ламбардыі гэтага перыяду ў многім вызначаецца палітычнай барацьбой унутры гарадоў-камун. Некаторыя аўтары схіляюцца да думкі, што ерась – гэта ўвогуле рух пратэсту супраць сіньярыі (форма арганізацыі гарадской улады)[6]. З іншага боку, многія члены гарадскіх саветаў працівіліся ўключэнню палажэнняў супраць ерэтыкоў у камунальныя законы[7], бо выступалі супраць папства як палітычнай сілы, а ўсё тое, што магло быць паказана як нязгода з Апостальскім Прастолам, успрымалася як рэлігія[8]. Папства ж, наадварот, імкнулася да стварэння гарадскіх рэлігійных суполак, якія працавалі ў звязцы з інквізіцыяй[9]. Ды і вальдэнсы таксама часам выкарыстоўвалі палітычныя рознагалоссі паміж гарадскімі

---

[1] Felice Tocco, *Quel che non c'è nella Divina commedia, o Dante e l'eresia. Con documenti e con la ristampa delle questioni dantesche* (Bologna: Zanichelli, 1899), 10–11.

[2] Paolo Montanari, "Valdesi a Milano tra XII e XIII secolo," *Revue de l'histoire des Religions* 217, no. 1 (2000): pp. 59–74, https://doi.org/10.3406/rhr.2000.1071, 60.

[3] Marvin B. Becker, "Debate Heresy in Medieval and Renaissance Florence. A Comment," *Past and Present* 62, no. 1 (1974): pp. 153–161, https://doi.org/10.1093/past/62.1.153, 158.

[4] Döllinger, *Beiträge*, 367–369. [VII.v.a]

[5] Colin Morris, *The Papal Monarchy: The Western Church from 1050 to 1250* (Oxford: Clarendon Press, 1991), 349.

[6] Robert Ian Moore, "The Birth of Popular Heresy: A Millennial Phenomenon?," *Journal of Religious History* 24, no. 1 (2002): pp. 8–25, https://doi.org/10.1111/1467-9809.00098, 25.

[7] Powell, "Religious Diversity," 378.

[8] Diana M. Webb, "The Pope and the Cities: Anticlericalism and Heresy in Innocent HI's Italy," *Studies in Church History. Subsidia* 9 (1991): pp. 135–152, https://doi.org/10.1017/s0143045900001915.

[9] Norman J. Housley, "Politics and Heresy in Italy: Anti-Heretical Crusades, Orders and Confraternities, 1200–1500," *The Journal of Ecclesiastical History* 33, no. 2 (1982): pp. 193–208, https://doi.org/10.1017/s0022046900029584, 197–198.

і царкоўнымі ўладамі, напрыклад, як у сітуацыі з апеляцыяй вальдэнсаў да Папы наконт іх нерухомасці ў Мілане[10].

З'яўленне вальдэнсаў у Ламбардыі рэканструюецца па ўскосных дадзеных. Большасцю даследчыкаў выказваецца меркаванне аб тым, што сам Вальдэс, вяртаючыся з Рыма, дзе ён сустракаўся ў 1179 г. на III Латэранскім саборы з Папам Аляксандрам III, мог прапаведаваць сярод мясцовага насельніцтва[11], распаўсюджваючы такім чынам свой пераклад Біблії на "народную" мову. У 1184 г. вальдэнсы згадваюцца падчас Веронскага сабора ў буле Папы Луцыя II "Ad Abolendam"[12] разам з умільятамі (рэлігійны рух, распаўсюджаны пераважна сярод міран Ламбардыі; узнік у канцы XII ст., яго члены выступалі за абнаўленне Царквы згодна з раннехрысціянскімі ідэаламі, беднасць і жыццё за кошт фізічнай працы).

Аддзяленне ламбардскай групы

З цягам часу ламбардская галіна аддзялілася ад першапачатковага ядра руху. Паколькі пра аддзяленне згадваюць толькі "італьянскія" аўтары, такія, як Сальва Бурчы, Пётр Пакутнік, Райнэрый Саконі і Ансельмі Александрыйскі, гэтае аддзяленне не аказала ўплыву на вальдэнскі рух па-за межамі Італіі. Згаданыя аўтары апісваюць не толькі сам факт падзелу, але і адрозненні паміж групамі. Выключэнне складае праца француза Бернарда Гі, дзе ён згадвае пра падзел між іншым, без аніякіх падрабязнасцяў[13].

Пачаткам падзелу паміж "ультрамантанамі" / "вальдэнсамі" / "леаністамі" / "беднымі з Ліёна" / "беднымі па гэты бок ад гор" (Citramontanos) і "ламбардцамі" / "італьянцамі" (ytalici), як мяркуецца, стала "схізма" 1205 г. Дата гэтая ставіцца паводле сведчанняў Сальва Бурчы, які напісаў у 1235 г.: "бедныя ламбардцы аддзяліліся ад бедных ліёнцаў, і гэтаму каля 30-і гадоў"[14]. Дата "1205 г." важная і ў кантэксце біяграфіі Вальдэса. Як сцвярджае Сальва Бурчы, у гэтым годзе той быў дакладна жывы і яшчэ не стаў, як дапускаюць некаторыя аўтары, ахвярай інквізіцыі[15]. На момант сустрэчы дзвюх груп у Бергама (1218 г.) ён быў дакладна мёртвы, бо ідзе спрэчка паміж групамі пра тое, на нябёсах ён ці не.

Падставамі для раздзялення маглі стаць:

✠ аддаленасць ад цэнтра вальдызму і слабасць зносін з ім;

---

[10] Montanari, "Valdesi a Milano tra XII e XIII secolo," 72.

[11] Antonino de Stefano, *Riformatori ed eretici del Medioevo* (Palermo: F. Ciuni, 1938), 273, 283; William Jones, *The History of the Waldenses: Connected with a Sketch of the Christian Church from the Birth of Christ to the Eighteenth Century*, 2nd ed., vol. 2 (London: Gale & Fenner, 1816), 12; Papini, *Valdo di Lione*, 222.

[12] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 50–53.

[13] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 247. [III.vi.4]

[14] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 64. [II.xi]

[15] Giorgio Tourn, *I valdesi: identitá e storia* (Torino: Claudiana, 2003), 31.

✠тое, што насельніцтва Ламбардыі валодала большымі арганізацыйнымі навыкамі, а пастаяннае суседства з іншымі сектамі рабіла такое адасабленне неабходным[16].

Магчыма, адасабленню спрыялі пералічаныя ніжэй асаблівасці вучэння абедзвюх груп:

1. *Пытанне працы.* Розныя погляды на "правільныя" шляхі атрымання сродкаў існавання: праца ў "ламбардцаў", якія мелі "злучэнне працоўных" (laborantium congregatio), і выключна міласціна ў "ультрамантанаў". Гэта магло быць звязана з тым, што італьянцы знаходзіліся пад моцным уплывам умільтаў, якія таксама мелі такія суполкі, і ў прынцыпе гуртаваліся ў італьянскіх гарадах-камунах з моцнымі традыцыямі менавіта працоўна-прафесійных саюзаў; а французы больш трымаліся "жабрацкага" ладу жыцця самога Вальдэса.

2. *Пытанне кіравання суполкай.* Ламбардцы выбралі сабе пажыццёвага старшыню Яна з Ронка[17] па мянушцы Добры[18], не зважаючы на тое, што "Вальдэс казаў, што ён не хоча, каб іншы ў абшчыне ўльтрамантанскай ці італьянскай між братоў меў перавагу ні пры жыцці, ні пасля смерці"[19]. На гэта накладалася і спрэчка пра месца Вальдэса і яго паплечніка Вівета: французы былі цвёрда ўпэўненыя, што яны ўжо на нябёсах, італьянцы ж мелі на гэты конт сумневы[20].

3. *Данатызм і права на здзяйсненне еўхарыстыі.*

У 1218 г. абедзве абшчыны сышліся на тым, што "наконт праламлення хлеба ў рэшце рэшт прызнана намі, што гэта таінства [еўхарыстыя] не можа здзяйсняцца ні міранамі, ні жанчынамі, а толькі святарамі"[21]. Прычым французы не зважалі на маральнае аблічча святара, "пакуль абшчына хрышчоных падтрымлівае яго імшы"[22]. Радыкалізм італьянцаў у гэтым пытанні быў узмоцнены ўплывам шматлікіх суседніх ерэтычных груп з даўняй гісторыяй антыцаркоўнага супрацьстаяння. Прорва паміж ламбардцамі і Рымскай Царквой узмацняецца, і праз 30 гадоў "Наконт жа Цела Гасподняга думаюць яшчэ горш, чым першыя, кажучы, што агульнавядома, што любы чалавек, які не здзейсніў смяротнага граху, яго асвячае"[23] (г. зн. неабавязкова каталіцкі святар). Заўважым, што паралельна з аддаленнем ад афіцыйнай Царквы будзе ісці працэс збліжэння вальдэнскіх груп, і яшчэ праз 20 гадоў "Ультрамантаны кажуць, што любы чалавек, ці добры,

---

[16] Карсавин, "Очерки средневековой религиозности," 122.
[17] Merlo, *Valdesi e valdismi medievali*, 13–14.
[18] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 141. [II.xvii.10]
[19] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 22. [I.vii]
[20] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 27–29. [I.vii]
[21] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 30. [I.vii]
[22] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 36–37. [I.vii]
[23] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 110. [II.xv]

ці дрэнны, нават не будучы святаром, можа асвячаць і праводзіць іншыя таінствы"[24]. Нязменным застаецца толькі пытанне працы.

Ламбардскія вальдэнсы прадстаўлены дзвюма групамі: "бедных ламбардцаў" (вылучэнне якіх з агульнай колькасці вальдэнсаў адбылося не раней за 1200 г.[25]) і "бедных ізноў далучаных".

"Бедныя ламбардцы" ("італьянцы" з Рэскрыпта)[26] здолелі арганізаваць групы "сяброў", якіх у 1350 г. апісвалі як гарбароў, шаўцоў, пекараў, гандляроў зелянінай і перш за ўсё ткачоў, – жыхароў такіх гарадоў, як Мілан, Леньяна, Павія, П'ячэнца, Бергама, Брэшыя, Крэмона і Верона[27]. Магчыма, яны займалі ў гэтых гарадах цэлыя кварталы, аб'яднаныя не толькі рэлігійна і прафесійна, але і геаграфічна[28]. Сацыяльны склад і палітычная сітуацыя там надзвычай спрыялі ўключэнню вальдэнсаў у барацьбу паміж буржуазіяй і гандлярамі, з аднаго боку, і біскупамі, нязменна падтрыманымі Папамі, – з другога. У супрацьстаяннях гвельфаў (прыхільнікі Папы Рымскага) і гібелінаў (прыхільнікі Імператара) апошнія часта знаходзілі падтрымку менавіта сярод ерэтыкоў, а то і самі ўспрымаліся Царквой як такія[29]. З іншага боку, вальдэнсы не аказалі такога значнага ўплыву на ход гэтай барацьбы, як, напрыклад, катары. Але сацыяльная актыўнасць італьянскіх гарадскіх камун не заўсёды была на карысць ерэтыкам – у тым жа XIII ст. набіраюць папулярнасць пракаталіцкія свецкія згуртаванні ў гонар Дзевы Марыі для дапамогі хворым. У 1227 г. жанчынам-вальдэнкам у Падуі ўдалося пазбегнуць пераследу, але ў цэлым праца інквізіцыі была паспяховай, што прывяло да фактычнага знікнення гэтай групы да канца стагоддзя.

Група Бернарда Прыма

"Бедныя ізноў далучаныя" пажадалі вярнуцца ва ўлонне Каталіцкай Царквы. "Адныя з тых бедных леаністаў, як з ультрамантанаў, так і з ламбардцаў, якія калісьці з Бернардам Прымам былі перавернутыя ў каталіцкую веру, і сталі называцца – бедныя ізноў далучаныя"[30].

Гэтая група вальдэнсаў, верагодна з Крэмоны (бо адзін з лістоў Папы Інакенція III наконт Бернарда Прыма адрасаваны непасрэдна біскупу гэтага горада), у нейкі момант усвядоміла ўсю згубнасць сваіх паводзінаў (яны падзялялі веравучэнне "класічнага" вальдызму) і звярнулася да Святога Прастола з просьбай выбачыць ім іх ранейшыя памылкі і даць магчымасць апраўдацца ад паклёпаў, а таксама паспрабавала аформіць сваё

---

[24] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 140. [II.xvii.10]
[25] Selge, *Die ersten Waldenser*, vol. 1, 172.
[26] Merlo, "Pauperes spiritu valdesi," 23.
[27] Molnár, *Storia dei valdesi*, 88.
[28] Eugenio Dupré-Theseider, "Gli eretici nel mondo comunale italiano," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 114 (1963): pp. 3–23, 15.
[29] Dupré-Theseider, "Gli eretici nel mondo comunale italiano," 4.
[30] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 82. [II.xii]

прававое становішча ў якасці новага ордэна. У Рым былі накіраваны дэлегаты, Бернард Прым і Вілельм Арналд, на той момант ужо знаныя прапаведнікі[31]. Яны прыбылі туды ў 1210-м і заставаліся да 1212 г., калі іх там і ўбачыў храніст Конрад з Урсперга[32].

У лістах Папы Інакенція III змешчана "Споведзь веры" вальдэнсаў, але гэта – выказванне групы, якая жадае быць прынятай ва ўлонне Каталіцкай Царквы, таму з'яўляецца хутчэй крыніцай па духоўным жыцці вальдэнсаў-каталікоў, чым вальдэнсаў-ерэтыкоў. "Ерэтычную" частку вераванняў дазваляюць раскрыць дзве крыніцы: урывак з Урспергскай хронікі, дзе "ерэтычныя памылкі" падаюцца ў якасці прычын, з якіх Папа адмовіў вальдэнсам у зацвярджэнні ордэна, і яго ліст № 96[33], дзе прыводзяцца апраўданні і пакаянні саміх вальдэнсаў. Пасля аналізу гэтых крыніц можна прадставіць наступныя асаблівасці групы Бернарда Прыма:

i. Вальдэнсы самастойна здзяйснялі еўхарыстыю, не звяртаючыся да дапамогі рымскіх святароў: "з прычыны старання веры і павагі ды з прычыны ўдумлівых разваг, каб не закасцянелі простыя верныя, што заставаліся між ерэтыкоў [катараў] і не прымалі таінства еўхарыстыі".

ii. Пропаведзь без дазволу прэлатаў. Той самы тэзіс, з чаго пачалося разыходжанне між Вальдэсам і Рымскай Царквой.

iii. Непрызнанне клятвы.

iv. Адмаўленне права свецкай улады на кровапраліццё.

v. Адмаўленне падпарадкавання "бязбожнаму" чалавеку.

vi. Данатызм (Ін 9:31).

vii. Адмаўленне святасці Рымскай Царквы. Можна параўнаць са сведчаннем пра іх і ўмільятаў Конрада з Урсперга: "у іх прыватных размовах, якія яны звычайна маюць у таемных месцах, яны зняважліва гавораць аб Царкве Божай і аб святарстве".

viii. Дазвол прапаведаваць жанчынам (1 Кар 11.).

ix. Непрызнанне індульгенцый.

x. Магчымасць выратавання па-за Царквой, толькі праз набожнае жыццё.

xi. Сужыццё з жанчынамі. Гэтую цьмяную фармулёўку тлумачыць Урспергскі храніст: "мужчыны і жанчыны адпраўляліся ў падарожжа разам, і звычайна жылі ў адным доме, і часам ляжалі ў адным ложку". Ён жа апісвае і некаторыя іншыя адрозныя рысы іх групы, а менавіта:

---

[31] Papini, *Valdo di Lione*, 260; Audisio, *The Waldensian Dissent*, 24.

[32] Wickham, *An Historical Sketch of the Italian Vaudois*, 63; "Burchardi et Cuonradi Urspergensium Chronicon," 376.

[33] PL 216:291–292. [I.ii.c]

ғіі. "Яны жывуць апостальскім жыццём, не прагнуць валодаць ніякай маёмасцю ці якім-небудзь пэўным месцам жыхарства". Даволі станоўчая характарыстыка, але з тэксту не зразумела, ці то яны самі так пра сябе гавораць, ці гэта ўласная думка храніста.

ғііі. "Яны абразалі верхнюю частку іх абутку, і хадзілі тыпу босымі. Больш за тое, хоць яны насілі нешта накшталт клабука, нібы яны належалі да нейкага манаскага ордэна, яны не падстрыгалі свае валасы ў адрозненне ад міран".

Такім чынам, можна сцвярджаць, што былыя разыходжанні "бедных ізноў далучаных" з Каталіцкай Царквой насілі хутчэй не дагматычны, а арганізацыйны характар, і мелі наступныя вытокі:

1. неабходнасць супрацьстаяць катарам (пункты і, іі, viii, хі). Вядома пра дыспут Бернарда Прыма з катарскім "дасканалым" у 1208 г. у Лораку (Аквітанія);[34]

2. літаральнае разуменне і выкананне Евангельскіх запаветаў (iii, iv, v, vi, ix, xii, xiii);

3. непрыманне тых парадкаў у Каталіцкай Царкве, якія не знаходзяць пацвярджэнняў у Бібліі (vii, x).

Але калі іх просьбы аб паўторным далучэнні да Царквы задаволілі, то вось у стварэнні новага ордэна ім было адмоўлена.

Канец гэтай групы амаль аналагічны з групай "бедных каталікоў": яны ўступілі ў розныя каталіцкія манаскія ордэны, у тым ліку дамініканскі і ерэмітычны ордэн св. Аўгусціна (у 1256 г.)[35]. Але ў літаратуры існуе і меркаванне, што яны зліліся з паслядоўнікамі Дуранда з Оскі[36]. Найбольш радыкальныя далучыліся да "бедных ламбардцаў".

У саміх гарадах-камунах вальдэнсы страчваюць свае пазіцыі разам з гібелінамі, і амаль знікаюць да канца XIII ст.[37] З-за актыўнай дзейнасці інквізіцыі, падтрыманай законамі Фрыдрыха II[38], былы "ерэтычны рай" перамяшчаецца з Ламбардыі ў зацішныя і аддаленыя альпійскія даліны, куды інквізітарам было найцяжэй дабрацца. Хутчэй за ўсё, першыя ерэтыкі былі выгнаны ў Турынскае біскупства з Фаэнцы яшчэ ў 1206 г. Інакенціем III[39].

---

[34] Taylor, "A Presence in Languedoc," 68.

[35] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 82; Merlo, *Eretici ed eresie medievali*, 55.

[36] Карсавин, *Сочинения*, 112; Рипарелли, *Христианские Ереси*, 52.

[37] Dupré-Theseider, "Gli eretici nel mondo comunale italiano," 9–10.

[38] Вис, *Фридрих II Гогенштауфен*, 135–139; Fridericus II imperator, "Coronatio Romana," in *Monumenta Germaniae Historica. Legum*, Tomus II (Hannoverae: Impensis Bibliopolii Aulici Hahniani, 1837), pp. 240–248, 241. [I.iv.k]

[39] Ли, *История инквизиции*. [I.iv.f]

Горныя даліны Заходніх Альпаў

Гэты рэгіён – "тэрыторыя ў П'емонце, вельмі аддаленая і небяспечная, у якой знаходзяцца ерэтыкі [катары] і вальдэнсы, якія жывуць на землях, падпарадкаваных уладару каралю Роберту[1], уладару Дафінэ, уладару князю Ахайскаму, уладару маркізу Салуцца і ўладарам Люцэрны"[2] – традыцыйна лічыцца самай "вальдэнскай" тэрыторыяй Еўропы. Менавіта тут гэты рух праіснаваў фактычна ад самага свайго пачатку і да сённяшняга дня. Зараз гэтыя тэрыторыі падзеленыя паміж Францыяй і Італіяй. Вальдэнсы XXI ст. таксама пражываюць на тэрыторыі Італіі, у П'емонце. У XIV ст. асабліва "ерэтычнымі" лічыліся Дафінэ і наступныя П'емонцкія даліны: Кунэа, Пінерола, Салуцца, Сангонэ, Суза, Ланца і К'ерэзэ[3]. Вядома пра шматлікія кантакты паміж вальдэнсамі далін па абодвух баках Альпаў – да прыкладу, у 1335 г. дапытаныя інквізітарамі расказвалі пра "настаўнікаў", якія прыходзілі "з-за гор"[4]. Увогуле, даліны паміж Турынам і Дафінэ, а менавіта ў радыусе 30-і км вакол Джавэна, далі шмат вядомых прапаведнікаў і святароў на працягу некалькіх стагоддзяў[5].

Першы раз згадкі пра вальдэнсаў у Альпах сустракаюцца ў 1210 г., калі імператар Атон IV загадаў новаму турынскаму біскупу Карызіа выгнаць іх са сваёй дыяцэзіі[6]. Таксама ў статутах Пінерола (1220 г.) згадваюцца вальдэнскія вандроўныя місіянеры[7], напрыканцы XIII ст. у даліне Кізона дзесяць чалавек былі асуджаны інквізіцыяй "за вальдызм" (de vaudixia)[8].

Сучасныя жыхары вальдэнскіх далінаў (Пелічэ, Ангроні, ваколіцаў Торэ Пелічэ) маюць свае меркаванні датычна гісторыі вальдэнсаў *(запісана мной)*:

- многія мясцовыя вальдэнсы ведаюць свой радавод як мінімум да XV ст., а некаторыя і да Высокага Сярэднявечча;
- яны лічаць, што прыхільнікі вальдэнскага веравучэння пражывалі ў гэтых далінах яшчэ да прыезду Вальдэса, і гэта хутчэй ён запазычыў ад іх некаторыя ідэі, а не наадварот;
- сама назва "вальдэнсы" (valdesi) паходзіць ад слова "даліны" (valli).

---

[1] Не ўдалося ідэнтыфікаваць – на той момант каралём Германіі (але не каранаваным імператарам) быў Альберт I Габсбург.

[2] Biscaro, "Inquisitori ed eretici lombardi (1292–1318)," 545.

[3] Merlo, "Distribuzione Topografica", 4.

[4] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 182, 183, 191. [IV.ii]

[5] Cameron, *Waldenses*, 155–158.

[6] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 141–142. [I.iv.h]

[7] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 18–19. [I.iv.i]

[8] Grado Giovanni Merlo, "Who Were the Waldenses in Fourteenth-Century Piedmont?," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 225–241, 227.

Дакументальных гістарычных пацвярджэнняў такія звесткі не маюць, але існуюць у вуснай народнай традыцыі.

Дакладна вядома пра аселых прыхільнікаў руху становіцца толькі ў канцы XIII ст. У 1307–1316 гг. ёсць запісы пра вышук інквізітара Францыска Пакапалья супраць розных ерэтыкоў, у тым ліку вальдэнсаў, але яго непасрэдныя пратаколы не захаваліся. Пасля 1300 г. колькасць вальдэнсаў у рэгіёне ўзрасла настолькі значна, што ў 1336 г. байлі[9] Амброна, цэнтральнага горада рэгіёну, уключыў у запыт кампенсацыі выдаткаў, накіраваны вышэйшай адміністрацыі, і радок на "пераслед вальдэнсаў"[10], а ў 1338 г. гэты горад быў выбраны цэнтральнай сядзібай інквізіцыі спецыяльна для антывальдэнскага вышуку[11]. Інквізітары адразу арганізавалі маштабную акцыю супраць вальдэнсаў з канфіскацыяй іх маёмасці ў даліне Пута, распачаўшы такім чынам практыку здабывання грошай з вальдэнсаў, якая працавала дзесяцігоддзямі[12].

Да 1330 г. вальдэнсы ўжо надзейна ўсталяваліся ў далінах Пелічэ, Ангроньі, Сузы і г. д.; гэты рэгіён на доўгія стагоддзі стаў надзейным прытулкам усім, хто ўцякаў ад празмернай увагі царкоўных улад. Разам з тым іх імёны, мова, культура і веданне мясцовых рэалій паказваюць, што яны мелі тут даўнія і надзейныя карані. Вераванні вальдэнсаў гэтага рэгіёну моцна адрозніваліся ад астатніх: менавіта тут узнікалі дзіўныя легенды, што падзел Царквы распачаўся ўжо сярод апосталаў, бо чацвёра з іх умелі чытаць і мелі кнігі Хрыста (ад іх і пайшлі вальдэнсы), а астатнія – не, і захацелі трымацца "жыцця індульгенцый"[13].

Прапарцыянальна ўкараненню вальдэнсаў ў рэгіёне расла і ступень іх самаўпэўненасці і агрэсіўнасці. У буле ад 1332 г. дадзена апісанне сітуацыі: вальдэнсы адкрыта збіраюцца на сходы да 500 чалавек, і нават паўсталі са зброяй у руках супраць парафіяльнага святара і мясцовага інквізітара[14] (*падрабязней гэты і іншыя прыклады гл. Раздзел "Права на здзяйсненне гвалту ў мэтах самаабароны"*).

Захаваліся дакументы антывальдэнскага вышуку ў Джавэна (каля Турына) інквізітара Альберта дэ Кастэлярыа ад 1335 г. З іх вынікае, што існавалі цесныя сувязі паміж двума рэгіёнамі па абодва бакі ад Альпаў, якія падтрымліваліся вандроўнымі "настаўнікамі". Верагодна, аб'яднальным фактарам з'яўлялася таксама франкаправансальская мова, тыповая для старэйшага пакалення італьянскіх вальдэнсаў і па сёння (пад назвай

---

[9] Службовая асоба.

[10] Cameron, "The Dauphiné (13th–14th Centuries)," 277.

[11] Molnár, *Storia dei valdesi*, 92–93.

[12] Molnár, *Storia dei valdesi*, 116.

[13] Cameron, *Waldenses*, 152–153.

[14] *Bullarium Franciscanum: sive Romanorum Pontificum constitutiones epistolae diplomata tribus ordinibus Minorum Clarissarum Poenitentium ... a Sancto Francisco Institutis ab eorum originibus ad nostra usque tempora concessa*, vol. 5. Benedicti XI, Clementis V, Ioannis XXII Monumenta (Vatican: Typis Sacrae Congregationis de Propaganda Fide, 1898), 530, doc. 987. [IV.i]

"патуа"). У гэтых пратаколах прысутнічае ўказанне арыентацыі вальдэнсаў на Свяшчэннае Пісанне, чаго не прасочваецца ў матэрыялах допытаў з другой паловы XIV ст. Нельга зрабіць выснову, што Біблія перастала быць важнай для вальдэнсаў (гэта абвяргаецца ўсёй іх наступнай гісторыяй), але адназначна бачна зніжэнне адукацыйнага ўзроўню і пераход да вуснай пропаведзі. Магчыма, скарачэнне колькасці згадак пісаных кніг было выклікана і ўзмацненнем інквізіцыі – трапіць у рукі да следства з кнігай у руках было нашмат больш небяспечна[15].

Наступны буйны вышук, дакументы ад якога не захаваліся, прайшоў у Амброне ў 1353 г., а ў 1366 г. інквізіцыя Дафінэ (Грэнобля) дапытвала вальдэнса "турынскай юрысдыкцыі" з-за нядбайнасці мясцовых спецыялістаў[16].

Канец XIV ст. абвастрыў сітуацыю ў Паўночнай Італіі. З пачаткам Вялікай Схізмы 1378 г. (таксама вядомай як "Вялікі заходні раскол" і "Папскі раскол" – перыяд у гісторыі Рымскай Царквы, калі папскі тытул набылі адначасова некалькі чалавек, падтрыманых па палітычных прычынах рознымі групоўкамі і дзяржавамі) і без таго палітычна нестабільная і раздробненая Ламбардыя падзялілася на прыхільнікаў розных папаў, што наклалася на даўнюю барацьбу паміж рознымі гарадамі і манаскімі ордэнамі. Царкоўная дысцыпліна падала ўжо з 1370 г., нягледзячы на ўсе намаганні па вырашэнні сітуацыі, якія прадпрымаў новы біскуп Турына Джавані дзі Рывальта. Ён ініцыяваў шматлікія антыерэтычныя акцыі, аб'ядноўваючы пры гэтым інквізіцыю і мясцовую ўладу, што было нялёгка, бо Паўночная Італія – рэгіён са "старадаўнімі ерэтычнымі традыцыямі". Свецкія сеньёры ахвотна прыкрывалі праціўнікаў Царквы перад вачыма інквізіцыі: у 1354 г. інквізітар націснуў на князя Джакомо Ахайскага, каб той, у сваю чаргу, прымусіў сеньёраў Люцэрны арыштаваць з дзясятак ерэтыкоў з далінаў[17]. Папа Грыгорый XI пісаў 7 мая 1375 г. графу Савойскаму Амадэю VI: "некаторыя са знаці з тваіх зямель, пагарджаючы Божым гневам у спрыянні, не дазваляюць той самай Інквізіцыі дзейнічаць супраць іх, з-за чаго памножыліся вартыя праклёну ерасі, і з-за гэтай бяздзейнасці, о гора! Колькасць ерэтыкоў у гэтай і бліжэйшых землях працягвае ўзрастаць"[18]. Аналагічны ліст быў дасланы каралю Францыі Карлу V у дачыненні да Дафінэ[19].

Гэтыя лісты дасягнулі сваёй мэты: у 1380 г. тут распачаў сваю вынішчальную дзейнасць інквізітар-францысканец Францыск Барэлі. Восенню 1384 г. ім быў арганізаваны (і ў красавіку 1385 г. праведзены) крыжовы паход супраць вальдэнсаў даліны Кізона (з удзелам сотні ўзброеных людзей, накіраваных кастэлянам суседняга замка): у Папы Клімента VII

---

[15] Taylor, "A Presence in Languedoc," 49.

[16] Cameron, "The Dauphiné (13th–14th Centuries)," 279.

[17] Merlo, "Distribuzione Topografica", 7.

[18] Boffito, "Eretici in Piemonte," 385 [IV.v]; *Annales Minorum seu Trium Ordinum a s. Francisco Institutorum*, vol. 8. 1347–1376 (Quaracchi prope Florentiam: Ad Claras Aquas, 1932), 365. [IV.iii]

[19] Grado Giovanni Merlo, "La repressione antiereticale in Piemonte nel secolo XIV," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 138 (1975): pp. 3–13, 8; *Annales Minorum* vol. 8, 364–365. [IV.iii]

быў план па заснаванні ў суседняй даліне Вальпута францысканскага кляштара[20]. Даліна была спустошана: канфіскавана ўся маёмасць вальдэнсаў, у тым ліку свойская жывёла і начынне. Жыхары былі вымушаны ўцячы, многія з іх ніколі не вярнуліся да сваіх разбураных хацін[21]. Некаторыя пасля згадваліся ў пратаколах інквізітара Антонія з Савільяна ў Пінерола. На працягу пяці гадоў Францыскам былі апытаныя сотні чалавек, дзясяткі перададзеныя ў рукі свецкіх уладаў. Працягнуць катаванні яму перашкодзіў толькі недахоп сродкаў (на арганізацыі вышукаў, харчаванне абвінавачаных да прывядзення ў дзеянне смяротнага пакарання і г. д.)[22].

У 1394–1395 гг. у Турыне быў разгорнуты вялікі працэс супраць жыхара прадмесця Карманьёліа Якуба Рысталаксія. Працэс доўжыўся некалькі месяцаў, але падчас яго не было нават ужыта катаванне, бо абвінавачаны ахвотна расказваў пра сваю веру і адмовіўся ад памілавання, бо чакаў ганаровага ўваскрэсення праз тры дні. Яго вераванні ўяўляюць сабой змяшэнне самых розных адхіленняў ад каталіцкай веры[23], і ніводнага з дагматаў "класічнага" вальдызму (напрыклад, ён адмаўляў еўхарыстыю, але дазваляў клятву), і тым не менш ён ідэнтыфікуецца як вальдэнс. Заўважым, што ў сваіх вераваннях ён значна адыходзіць ад прызнанняў вальдэнсаў Пінерола, апытаных на 10 гадоў раней інквізітарамі-дамініканцамі Антоніем Сёмым з Савільяна і Томасам з Казаска: яго папярэднікі, хоць і выказвалі некаторыя тыпова катарскія ідэі, тым не менш, у адрозненне ад Рысталаксія, трымаліся і вальдэнскага адмаўлення клятвы і царкоўных рытуалаў. Такая недакладная ідэнтыфікацыя (што ў цэлым вельмі характэрна для інквізітарскіх крыніц, асабліва XIII ст.[24]) можа быць звязана з традыцыйным для Паўночнай Італіі збліжэннем розных ерэтычных рухаў з-за ўзмацнення інквізіцыйнага ўціску[25], калі адбывалася вельмі моцнае ўзаемапранікненне розных вучэнняў.

Такое змяшэнне прыводзіла да таго, што ў канцы XIV ст. "вальдэнсам" сталі называць любога ерэтыка[26]. З іншага боку, у 1403 г. прапаведнік-дамініканец Вінцэнт Ферэр апісвае альпійскія даліны як "вальдэнскія, так і вычварных гадзараў (gazariorum)[27], асабліва ў Турынскай дыяцэзіі"[28]. Ён хваліцца ў лісце, што праз пропаведзь вярнуў мясцовых ерэтыкоў у каталіцтва, але далейшая гісторыя паказала, што менавіта даліны на захад ад Турына засталіся вальдэнскім прытулкам і да сёння.

---

[20] Па выніку кляштар быў заснаваны ў Брыянсоне.

[21] Merlo, "La repressione antiereticale in Piemonte nel secolo XIV," 12.

[22] Cameron, "The Dauphiné (13th–14th Centuries)," 280–282.

[23] Boffito, "Eretici in Piemonte," 381–432. [IV.v]

[24] Martin Schneider, *Europäisches Waldensertum im 13. und 14. Jahrhundert: Gemeinschaftsform, Frömmigkeit, sozialer Hintergrund* (Berlin: de Gruyter, 1981), 103.

[25] Molnár, *Storia dei valdesi*, 94.

[26] Boffito, "Eretici in Piemonte," 407. [IV.v]

[27] Сярэднявечная назва ерэтыкоў; абазначала ў розныя часы катараў, вальдэнсаў, патарэнаў, проста ерэтыкоў без канкрэтызацыі і г.д.

[28] P. H. O. Fages, *Notes et documents de l'histoire de Saint Vincent Ferrier* (Louvain u.a.: Uystpruyst u.a., 1905), 110. [IV.vii]

Паўднёвая Італія

Вальдэнскія абшчыны на поўдні Італіі сфарміраваліся цалкам з імігрантаў і захоўвалі сваю адасобленасць ад навакольнага насельніцтва на працягу доўгага перыяду. Сваім суседзям мясцовыя вальдэнсы былі вядомыя як "людзі з-за гор", якія размаўлялі на франка-правансальскім дыялекце. Перыяд адносна мірнага існавання гэтых абшчынаў пад апекай дзяржавы скончыўся прыкладна ў 1560 г.[1]

Калабрыя

На дадзены момант існуе тры верагодныя тэорыі наконт датавання перасялення вальдэнсаў з Ламбардыі ў Калабрыю і прылеглыя тэрыторыі.

Паводле першай вялікія міграцыі з цэнтра мацерыка на поўдзень Апенінскага паўвострава былі распачаты яшчэ Карлам I Анжуйскім (1265–1285 гг.) для падтрымкі ўласнай дынастыі і нейтралізацыі сарацынскага ўплыву. Пры яго пераемніку Карле II (1285–1309 гг.) да ваенных мэт даваліся эканамічныя: ён хацеў наладзіць вытворчасць ваўняных тканін (даўняя спецыялізацыя як вальдэнсаў, так і большасці ерэтыкоў таго перыяду[2]), для чаго з поўначы запрасіў майстроў. Правадыром першай партыі паўночнаітальянскіх вальдэнскіх перасяленцаў з'яўляўся Дзаніно дэль Поджа з ламбардскага дваранства, які атрымаў на поўдні зямельны надзел ад самога Карла Анжуйскага[3]. Пытанне прыналежнасці згаданага дваранiна да вальдэнсаў з'яўляецца на дадзены момант спрэчным[4].

Згодна з другой тэорыяй, хутчэй за ўсё каля 1315 г., "з-за Альпаў" прыехала наступная партыя імігрантаў[5]. Г. Ч. Лі ўвогуле злучае дзве гэтыя міграцыі ў адну, сцвярджаючы, што першая група перасяленцаў прыбыла ў 1315 г. з Савоі пад кіраўніцтвам міланскага арыстакрата на загадзя прапанаваныя прывілеі[6].

Паводле трэцяй тэорыі, адлік пераезду вальдэнсаў у гэты рэгіён вядзецца ад сустрэчы ў турынскай карчме паміж знатным чалавекам з Калабрыі і групай вальдэнсаў з даліны Праджэлата[7].

---

[1] Cameron, "The Dauphiné (13th–14th Centuries)," 479.

[2] Нина Сидорова, "Народные еретические движения во Франции в XII–XIII веках," в *Французский ежегодник*, 1961 (Москва: Акад. наук СССР, Ин-т истории, 1962), стр. 429–433, 431.

[3] Enzo Stancati, Arturo Genre, and Attilio Merlo, *I calabro-valdesi. Guida ai luoghi storicii* (Torino: Claudiana, 1986), 9.

[4] Vincenzo Tedesco, "Le comunità valdesi in Calabria dall'insediamento alla repressione del 1561. Status quaestionis e prospettive di ricerca," *Rogerius* 17/2 (2014): pp. 45–58, 48.

[5] Molnár, *Storia dei valdesi*, 96.

[6] Ли, *История инквизиции*.

[7] Cameron, "The Dauphiné (13th–14th Centuries)," 481–482.

У выніку перасялення асноўнымі заняткамі паўднёваітальянскіх вальдэнсаў стала земляробства, выраб і гандаль тканінамі, а таксама гарбарства[8]. Прычын перасялення можа быць некалькі: перанаселенасць горных далінаў, спробы ўцячы ад Чорнай смерці (эпідэміі чумы), беднасць рэгіёну, імкненне вальдэнсаў Праванса аддаліцца ад Папскага Прастола, які пераехаў у Авіньён у 1309 г.[9] У 1353 г. Папа Інакенцій VI напісаў у сваёй буле, што з-за пераследу ў Дафінэ шмат ерэтыкоў пакінулі свае горныя прытулкі ў ваколіцах Амброна і накіраваліся ў Калабрыю. П'ерэт Параві датуе гэтую падзею 1358 годам[10].

Пра жыццё вальдэнсаў у Калабрыі на працягу двух стагоддзяў вядома вельмі мала. Да канца XIV ст. інквізітарскіх працэсаў супраць іх не зафіксавана[11]. Верагодна, што перасяленне працягвалася ў некалькі хваляў. Былі заснаваны дзве калоніі ў рэгіёне Монтальта, у вёсках Сан Сіста і Гвардыя П'емантэзе, на адлегласці каля 10-і км адна ад адной, і пражывалі невялікія групы ў вёсках Вакарыца (Vaccarizzo) і Сан Вінчэнца. Імігранты не выстаўлялі напаказ сваю веру і наведвалі каталіцкія імшы, таму іх доўгі час не турбавалі. Існавала эндагамія ўнутры абшчыны[12].

Вальдэнсы былі не адзінымі мігрантамі ў Калабрыі – сюды масава перасяляліся яўрэі-сефарды, якія ўцякалі ад пераследаў у Іспаніі, і праваслаўныя албанцы, вымушаныя пакінуць родныя землі з-за асманскіх заваёваў[13]. На працягу больш чым паўтысячагоддзя тут пражывалі мусульмане (сарацыны). Такім чынам, і ў гэтым рэгіёне зонай распаўсюджання вальдэнсаў з'яўляецца тэрыторыя са змешаным насельніцтвам.

Апулія і Сардзінія

Абшчына Апуліі была нецэнтралізаваная і, верагодна, уключала ў сябе вялікую колькасць членаў. У матэрыялах допытаў 1387–1388 гг. з Пінерола згаданы вальдэнскі "Пантыфік" з Апуліі, які даслаў туды "настаўніка" Яна Барыдона[14]. Інквізітар-прапаведнік Вінцэнт Ферэр у 1403 г. піша, што вальдэнсаў П'емонта адсюль наведвалі два разы на год[15].

Згодна з дадзенымі XVII ст., каля 1400 г. апулійскія вальдэнсы пабудавалі пяць умацаваных вёсак: Монтэлеонэ, Монтаратра, Фаэта, Чэле і Мота[16].

---

[8] Stancati, Genre, and Merlo, *I calabro-valdesi*, 12.

[9] Tedesco, "Le comunità valdesi in Calabria," 49–51.

[10] Pierrette Paravy, "Waldensians in the Dauphiné (1400–1530): from Dissidence in Texts to Dissidence in Practice," in *Heresy and Literacy: 1000–1530* (Cambridge: Cambridge University Press, 1994), pp. 160–175, 163.

[11] Peyronel Susanna Rambaldi and Marco Fratini, *1561. I valdesi tra resistenza e sterminio. In Piemonte e in Calabria* (Torino: Claudiana, 2011), 38.

[12] Cameron, *Waldenses*, 201.

[13] Tedesco, "Le comunità valdesi in Calabria," 52.

[14] Döllinger, *Beiträge*, 252–253. [IV.iv.b]

[15] Fages, *Notes et documents de l'histoire de Saint Vincent Ferrier*, 110. [IV.vii]

[16] Cameron, *Waldenses*, 204.

На пачатку XV ст. прайшоў працэс у Даліне Сузы супраць Яна Сэнсі з Сардзініі, які па дарозе да П'емонта з Апуліі праехаў праз усю Цэнтральную Італію, у тым ліку Манопалі, Барлету і Бріндзізі[17]. Гэта дазваляе рэканструяваць шляхі перамяшчэння вальдэнсаў па невальдэнскіх тэрыторыях.

Асноўная частка дакументаў пра гісторыю вальдэнсаў указанага рэгіёну датычыцца больш позняга часу, што выходзіць за рамкі дадзенага даследавання. У XVI ст. паўднёваітальянскія абшчыны таксама падтрымалі Рэфармацыю і зведалі вялікі пераслед з боку інквізіцыі.



[17] Marco Fratini, "Fra le Valli valdesi e il Subappennino dauno. Itinerari della predicazione e della storiografia alla vigilia della Riforma," in *Valdesi: da Monteleone di Puglia a Guardia Piemontese. Direzioni di ricerca storica tra Medioevo ed Età Moderna* (Angri – Salerno: Gaia, 2009), pp. 25–38, 33.

Вальдэнсы ў нямецкамоўных землях: Германія, Аўстрыя і Швейцарыя

На працягу XIII–XIV стст. нямецкамоўны арэал распаўсюджання вальдэнсаў быў не менш стабільны і моцны, чым французска-італьянскі[1].

Асаблівасцю вальдэнскай прысутнасці на гэтых тэрыторыях было тое, што яны ніколі не дзейнічалі адкрыта, як "каталікі", а прыйшлі ўжо ў часы свайго "падпольнага" існавання[2]. Прышэльцы паступова асімілююць і выцясняюць катараў[3]. Інквізіцыя, спачатку біскупская, а потым манаская, пачынае захады па супрацьдзеянні ерэтыкам, хоць непасрэдна самі вальдэнсы ніколі не згадваюцца ў папскіх і імператарскіх дакументах у Свяшчэннай Рымскай Імперыі[4]. Першы інквізіцыйны працэс супраць вальдэнсаў правёў Конрад Марбургскі ў 1230–1233 гг.[5] у даліне Рэйна і горадзе Трыры. Потым, бліжэй да сярэдзіны стагоддзя, пераслед змяшчаецца ў бок Баварыі[6]. У 1250 г. вандроўны прапаведнік Бертальд Рэгенсбургскі піша пра вялікую колькасць вальдэнсаў у Германіі[7]. Пасля 1260 г. пераслед разгараецца ў Цюрынгіі і на Памор'і.

Інквізіцыйны вышук у Свяшчэннай Рымскай Імперыі вызначаўся тым, што працавалі пераважна вандроўныя інквізітары, а не мясцовыя сталыя трыбуналы: таксама вышук мог праводзіцца з ініцыятывы мясцовага біскупа, калі папская інквізіцыя была занадта пасіўнай, або яны не маглі наладзіць супрацу[8]. Вальдэнсы жылі вялікімі групамі, і калі знаходзілі аднаго члена абшчыны (лепш за ўсё – "настаўніка"), то ён з-за катаванняў выдаваў сваіх паплечнікаў. Часцей у такіх выпадках абвінавачаныя стараліся называць імёны або ўжо памерлых, або ўжо выкрытых ерэтыкоў.

Пасаўскі ананім сведчыць, што ў 1260-х гг. у аўстрыйскіх землях было сорак дзве вальдэнскія парафіі[9]. "І яны маюць шмат слухачоў, многа

---

[1] Merlo, *Identità valdesi*, 36.

[2] Schneider, *Europäisches Waldensertum*, 95.

[3] Daniela Müller, *Frauen vor der Inquisition: Lebensform, Glaubenszeugnis und Aburteilung der Deutschen und Französischen Katharinnen* (Mainz: P. von Zabern, 1996), 48–59.

[4] Kieckhefer, *Repression*, 93.

[5] Silviu Ghegoiu, *Waldensians at the Turn of the Fifteenth Century in the Duchy of Austria: Perception of Eresy and Action against Heretics: Master of Arts Thesis in Medieval Studies* (Budapest: Central European University, 2008), 7.

[6] Audisio, *The Waldensian Dissent*, 34.

[7] Lambert, *Medieval Heresy*, 166.

[8] Välimäki, "Bishops and the Inquisition of Heresy," 187–188.

[9] de Lange, "Waldenses in Bohemia," 125.

дыскутуюць, і людзей склікаюць на ўрачыстыя сходы на плошчах і ў палях, і прапаведуюць у логавах. Няма таго, хто мог бы перашкодзіць ім, такія шматлікія і магутныя іх заступнікі"[10].

У 1311–1313 гг. інквізіцыя змагаецца з ерэтыкамі ў Штырыі, Карынтыі і Крайне[11], у 1312–1315 гг. праходзіць вялікі працэс у Крэмсе[12]. Вальдэнсаў знаходзяць у Штайеры, Шытэрхаўфене, Санкт Пёльтэне і нават Вене[13]. Спалены ў 1315 г. у Санкт Пёльтэне вальдэнскі "біскуп" Ноймайстар казаў: "калі б наша вера яшчэ на працягу 15-і гадоў заставалася некранутай, то мы думалі б, як абвясціць і абараняць яе"[14]. Ноймайстар "займаў біскупскі прастол" на працягу больш за пяцьдзясят гадоў. Ёсць дадзеныя пра вальдэнскага біскупа ў Анзбаху; магчыма, гэта той самы Ноймайстар.

Паміж 1327 і 1341 гг., захаваліся інквізітарскія даносы з Клостэрнойбурга, Штайра, Энга і Лорха, хоць нельга дакладна вызначыць, да якой менавіта ерасі яны адносяцца.

У сярэдзіне XIV ст. назіраецца перапынак у інквізіцыйным пераследзе – на вальдэнсаў забываюцца з-за іх вялікага падабенства да каталікоў, або з-за Чорнай смерці. За гэты час яны паспелі звярнуць у сваю веру вялікую колькасць рамеснікаў і сялян і "запаланілі ўсю Германію сваімі паслядоўнікамі"[15]. Між тым нямецкамоўнае грамадства заўсёды вельмі непрыхільна ставілася да любой рэлігійнай дэвіяцыі, асабліва ў гарадах, дзе наяўнасць ерэтыкоў лічылася вялікай ганьбай. Яны прыраўноўваліся да садамітаў[16]. З гэтага можна зрабіць выснову, што галоўным у пераследзе была не столькі сама ерась, колькі адрознасць ад іншых, што з'яўляецца неад'емнай часткай традыцыйнага сярэднявечнага светапогляду. Непрыязнасць гарадскіх уладаў да вальдэнсаў магла тлумачыцца яшчэ і тым, што ў пачатку XV ст. вальдэнсы ў гарадах прадстаўлялі ўжо новую буржуазію (напрыклад, у Фрыбуры і Страсбургу), якая ўступала ў палітычны канфлікт са старой буржуазіяй – гарадскім патрыцыятам[17].

Новыя вялікія пераследаванні вальдэнсаў адбыліся ў 1360-я і 1370-я гады. Перасле́даванні ў Нюрнбергу адбывалася ў 1332, 1333, 1354, 1379 і 1390-я гг., калі 7 чалавек былі спалены; усяго ў Нюрнбергу 24 чалавекі былі выселены з горада за ерась, 39 – публічна пакаяліся, многія атрымалі іншыя пакаранні[18]. У 1377, 1381 і 1382 гг. інквізітары працавалі ў Рэгенсбургу[19]. Як вальдэнскія гарады вылучыліся Эрфурт, Дрэздэн

---

[10] Nickson, "The «Pseudo-Reinerius» Treatise," 294.
[11] Hammann, "Waldenser in Ungarn," 430.
[12] de Lange, "Waldenses in Bohemia," 129.
[13] Friess, "Patarener, Begharden und Waldenser," 209–272.
[14] Schneider, *Europäisches Waldensertum*, 99.
[15] Ли, *История инквизиции*.
[16] Kieckhefer, *Repression*, 67–68.
[17] Kieckhefer, *Repression*, 69.
[18] Leff, *Heresy*, 479.
[19] Kieckhefer, *Repression*, 54.

і Магдэбург, дзе ў 1370 г. асобным указам асудзілі данатызм вальдэнсаў[20]. Але нельга сказаць, што высілкі інвізітараў былі паспяховымі: інквізітар Марцін Пражскі вяртаецца ў 1391 г. у Вюрцбург, а ў 1399 – у Нюрнберг і Бамберг[21].

Паміж 1360 і 1370 гг. аўстрыйскі герцаг Альберт III даслаў інквізітара Генрыка з Оламаўца для правядзення шэрагу пасяджэнняў інквізіцыі ў Штайры. Непасрэдна самі інквізітарскія акты да нас не дайшлі, але вядома, што былі асуджаны некалькі вальдэнсаў, у тым ліку трохгадовае дзіця[22].

Асноўны пік актыўнасці інквізітара Пятра Цвікера і яго калегаў прыпадае на 1390–1400-я гг., калі адбываецца рэзкая інтэнсіфікацыя антыерэтычных пераследаў ва ўсім рэгіёне[23]. Між тым Аўстрыя заставалася адным з найважнейшых вальдэнскіх цэнтраў[24]. Згодна з інфармацыяй са страчаных зараз аналаў манастыра ў Гарстэне, паміж 1395 і 1399 гг. ім было дапытана каля 1000 чалавек, і да 10% з іх былі спалены на вогнішчы[25]. Гэты працэс распачаўся пасля поўнага непакою ліста Пятра Цвікера нашчадку памерлага аўстрыйскага герцага Альберта III, з просьбай і далей падтрымліваць антыерэтычныя акцыі[26]. Акрамя вельмі падрабязнага спіса з амаль 100 вальдэнскіх памылак, у ім утрымліваецца трывожная гісторыя пра спаленае вальдэнсамі гумно інквізітарскага памагатага. Цалкам верагодна, што такая вялікая колькасць смяротных прысудаў стала адказам трыбунала на гвалт з боку ерэтыкоў. У студзені 1401 г. у Штырыі актыўна працуюць інквізітары Пётр Цвікер і Марцін Пражскі, адправіўшы ў выніку на вогнішча тры жанчыны за паўторны зварот у ерась[27].

Дакладная колькасць вальдэнсаў на нямецкамоўных землях не паддаецца падліку, можна прасачыць толькі колькасць тых, хто быў рэпрэсаваны (дадзеныя на канец XIV ст.): 130 у Берне, 53 у Фрыбуры, 42 у Эйхштэце, 39 у Бінгене[28], каля 30-і у Аўгсбургу, 27 у Страсбургу, у іншых гарадах гэтая колькасць была меншай. 11 лістапада 1393 г. 10 чалавек спалены ў Вемдынгу; 6 снежня таго ж года ў Донаўвёрфе выяўлена 40 ерэтыкоў, з іх спалены 10 мужчын і 16 жанчын; у Дзінкельсбюлі былі спалены ў тым жа годзе толькі 2 ерэтыкі;

---

[20] *Concilia Germaniae, quae celsissimi principis Joannis Mauritii, archiepiscopi Pragensis sumptu Joannes Fridericus Schannat magna ex parte primum collegit*, vol. 4. Ab anno MCCXC. Ad MCCCC (Coloniae Augustae Agrippinensium: typo viduae Joan. Wilhelmi Krakamp et haeredum Christiani Simonis, Bibliopolarum, 1761), 412–413.

[21] Modestin, *Ketzer in der Stadt*, 7.

[22] Ли, *История инквизиции*.

[23] Smelyansky, *Heresy and Citizenship*.

[24] Schneider, *Europäisches Waldensertum*, 98.

[25] Modestin, "The Waldensians of Upper Austria," 173–174.

[26] Döllinger, *Beiträge*, 305–311. [VII.v.c]

[27] Georg Modestin, "The Waldensians of Upper Austria (1395–1399): The Middle Ages' 'Forgotten Heretics' in Historical Fact and Literary Fiction," in *New Perspectives on Heretical Discourse and Identitites. The Waldensians in Historical Context* (Oxford/Bern/Berlin, 2021), pp. 165–185, 172; Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 52.

[28] Хутчэй за ўсё, гэта былі уцекачы з Майнца: 36 у 1392 і 3 у 1393 г. Modestin, "Western Germany," 190–192.

апошнія тры працэсы былі рэхам аўгсбургскай справы 1393 г.[29] Між тым допыты Пятра Цвікера сведчаць пра існаванне цэлых вальдэнскіх вёсак у Брандэнбургу і Аўстрыі, хоць і не ў такой колькасці, як у Паўднёвай Еўропе[30].

Пачаткам кар'еры вышэйзгаданага інквізітара-цэлесцінца Пятра Цвікера стаў трыбунал у Эрфурце, праведзены разам з Марцінам Пражскім у 1391 г., вынікам якога стала складанне двух знакамітых спісаў вальдэнскіх памылак: доўгага і кароткага, з указаннем месцаў паходжання вальдэнскіх "настаўнікаў" і кароткім апісаннем іх веравання і звычаяў[31]. Такія выпадкі здараліся таксама ў Рэгенсбургу і іншых нямецкіх гарадах у другой палове XIV ст. Гэтыя самыя перавернутыя "настаўнікі" маглі каталізаваць далейшыя вышукі: выдаваць сваіх былых адзінаверцаў і адпраўляцца прапаведаваць да іх, станавіцца каталіцкімі святарамі, але часцей за ўсё беспаспяхова. Магчыма, яны былі святарамі і перад тым, як стаць вальдэнскімі прапаведнікамі[32]. Пяцёра былі забіты сваімі ж паплечнікамі за тое, што пакінулі секту[33] (нягледзячы на дэкларованае вальдэнсамі непрыняцце гвалту).

Пытанне пра прычыны такога пераваротy сярод самых, здаецца, трывалых членаў абшчыны застаецца адкрытым: можна толькі меркаваць пра магчымы страх перад выкрыццём або расчараванне ў былых ідэалах[34]. Адступніцтва здаралася і сярод простых вальдэнсаў: у інквізіцыйных матэрыялах сустракаецца прызнанне аднаго дапытанага, што ён аднойчы слухаў "настаўніка", але другі раз не пайшоў на пропаведзь, а аддаў перавагу піву[35]. Апытаны ў 1400 г. вальдэнс Боршан з Дылінгена заявіў Марціну Пражскаму, што не мог сысці з секты, бо ў гэтым выпадку яго таварышы па веры пакінулі б яго без працы і гэтым выраклі на галоднае існаванне. А паколькі ў яго былі малыя дзеці, то ён вырашыў застацца ў абшчыне[36]. Працэсы ў асобных нямецкамоўных гарадах разгледжаныя ў раздзеле *"Сацыяльны склад вальдэнсаў у розных рэгіёнах/ Антывальдэнскія працэсы ў гарадах на паўднёвым Захадзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі"*.

Канцом маштабнай вальдэнскай прысутнасці ў гэтым рэгіёне можа лічыцца 1430 г., калі многія ерэтыкі былі асуджаны, пасаджаны ў турму або спалены (у тым ліку і па абвінавачанні ў вядзьмарстве).

---

[29] Modestin, "Augsburger Waldenserprozess", 66–67. Усё гэта было справай аднаго зацятага інквізітара, Гайнрыха Ангермайера. Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 71–72.

[30] Kieckhefer, *Repression*, 61–62.

[31] Döllinger, *Beiträge*, 330–331, 367–369. [VII.v.a-b]

[32] Hammann, "Waldenser in Ungarn," 434.

[33] Döllinger, *Beiträge*, 330. [VII.v.b]

[34] Kieckhefer, *Repression*, 57–58.

[35] Kieckhefer, *Repression*, 63.

[36] Эрнст Вернер, "Идеология немецко-австрийского вальденства в XIV в.," в *Средние века: Сборник*, том 25 (Москва: Акад. наук СССР, Ин-т истории, 1964), стр. 113–127, 123.

Чэхія

Самыя раннія дадзеныя пра з'яўленне вальдэнсаў на тэрыторыі сучаснай Чэхіі звязаныя з самім заснавальнікам гэтага руху: нібыта першыя вальдэнсы, пазбягаючы пераследу, накіраваліся ў далёкую Багемію[1], а потым рушылі следам за Вальдэсам і яго бліжэйшым паплечнікам Віветам[2]. Але гэтыя звесткі запазычаны з больш позніх крыніц – з прац Сільвіа Пікаламіні XVI ст. Аўтар "Чэшскай хронікі" Вацлаў Гаек з Лібачан піша пра пранікненне вальдэнсаў у Чэхію з Германіі ўжо ў 1176 г. Аналіз урыўка, прысвечанага ім, паказвае шмат агульнага з трактатам Бернарда Гі[3], таму магчыма, аўтар проста запазычыў з яго апісанне французскіх вальдэнсаў. Гэта не абавязкова сведчыць пра прысутнасць вальдэнсаў на чэшскіх землях.

У другой палове XIII ст. у Цэнтральнай Еўропе, безумоўна, дамінавала Каралеўства Багемія на чале з прадстаўнікамі дынастыі Пржэмыславічаў: Атакарам II (які абвясціў сябе абаронцам веры[4] і быў ініцыятарам інквізіцыйнага вышуку на сваіх землях), Вацлавам II і Вацлавам III. У гэты час на падуладнай ім тэрыторыі і сумежных землях *(карта А3)* пашырыўся вальдэнскі рух. Арэал распаўсюджання вальдэнсаў супадае з памежжам Багеміі і суседніх тэрыторый (Сілезіяй, якая часта змяняла сваю палітычную прыналежнасць; паўночна-заходняй Венгрыяй і паўночнай Аўстрыяй), што яшчэ раз паказвае, што вальдэнсы лягчэй пранікалі на тэрыторыі са змешаным насельніцтвам і нестабільнай палітычнай сітуацыяй.

Ерэтычныя рухі ў Чэхіі, у адрозненне ад суседняй Польшчы, мелі масавы характар[5]. Цэлыя рэгіёны "славіліся запаланеннем" ерэтыкоў, чараўнікоў і варажбітак. Тут у вялікай колькасці сустракаліся бегінкі і бегарды, "браты вольнага духу"[6] і іншыя ерэтыкі, але перавагу мелі вальдэнсы[7]. Часта адзін

---

[1] Jane Louisa Willyams, *A Short History of the Waldensian Church in the Valleys of Piedmont, from the Earliest Period to the Present Time* (London: Nisbet, 1855), 51.

[2] Blair, *History of the Waldenses*, 256; Comba, *Storia dei valdesi*, 47.

[3] Цыт. па Holinka, "Sektářství v Čechách," 40–41.

[4] Holinka, "Sektářství v Čechách," 35.

[5] Václav Chaloupecký, "K dejinám Valdenských v Cechách pred hnutím husitským," *Český Časopis Historický* 2 (1925): pp. 369–382.

[6] На дадзены момант гісторыкамі даказана, што такой секты не існавала, яна была цалкам сфабрыкаваная інквізітарамі. Deane, *A History of Medieval Heresy and Inquisition*, 156–157. І тым не менш некаторыя даследчыкі працягваюць гаварыць пра іх як пра актуальны рух, напрыклад John Van Engen, *Sisters and Brothers of the Common Life: The Devotio Moderna and the World of the Later* (University Of Pennsylvani, 2014), 24–25.

[7] Bylina, "Heretycy w społeczeństwie," 106–107.

і той жа чалавек мог быць членам некалькіх сектаў[8], або секты былі настолькі цесна звязаныя між сабой, што цяжка было вызначыць дакладную прыналежнасць іх вернікаў[9].

Прысутнасць вальдэнсаў у гэтым рэгіёне прасочваецца да канца XIV ст.[10] Спасылка на гэта змяшчаецца ў буле Папы Рымскага Аляксандра IV да чэшскага караля Атакара II ад 17 красавіка 1257 г[11].:

"Бо адкуль у некаторых частках каралеўства і валадарства найдаражэйшага сына нашага ў Хрысце Святлейшага Караля Багеміі і памежных польскіх землях[12] памылкі нявер'я ўзмацніліся настолькі, што многія сышлі з прамога шляху праўды ў адваротны бок на бездарожжа памылак, самі сябе апаганіўшы рознымі і разнастайнымі ерасямі, сканструявалі механізм для гібельнага хістання муру артадаксальнай веры, і маюць намер зруйнаваць яе лжывымі доказамі. Апостальскі Прастол старанна выкарыстоўваў належныя лекі супраць такіх падступных хітрыкаў, каб не распаўсюдзілася паціху гэтая хвароба, выкарыстоўваючы такіх вартых мужоў, якія б звярталі [у каталіцкую веру] сваім пачэсным прыкладам чысціні, а іх вучонае красамоўства ўмацуе выратавальнае вучэнне, каб іх святым служэннем пазначаныя мясцовасці былі ачышчаныя ад такіх пачварных пошасцяў"[13].

У буле не называецца секта, але некаторыя даследчыкі лічаць, што гаворка ідзе пра вальдэнсаў[14]. У ёй шмат разоў падкрэсліваецца права інквізітараў на працу выключна ў межах чэшскіх дыяцэзій: "не адмяняем забароны на дзейнасць па-за межамі частак дыяцэзій [Оламаўцкай і Пражскай], у якія па гэтай [буле] вы цяпер накіраваны Апостальскім Прастолам"[15]. Мяркую, што калі б на тэрыторыі сумежнай з імі Вроцлаўскай дыяцэзіі знаходзілася значная колькасць ерэтыкоў, то да іх або даслалі б асобнага

---

[8] Ogórek, *Beginki i Waldensi*, 257–258.

[9] François-André-Adrien Pluquet and Jacques Paul Migne, *Dictionnaire des hérésies, des erreurs et des schismes. Suivi d'un Dictionnaire des jansénistes* (Paris: Chez l'éditeur, 1853), 497.

[10] Holinka, "Sektářství v Čechách," 67.

[11] Аналагічная була была накіравана французскаму каралю Людовіку IX. Wincenty Swoboda, "Początki herezji na ziemiach polskich," in *Europa – Słowiańszczyzna – Polska. Studia ku uczczeniu Prof. Kazimierza Tymienieckiego* (Poznań: Uniwersytet, 1970), pp. 385–396, 390.

[12] Фармуліроўка "на польскім памежжы" ("Regis Boemorum et Polonie confiniis") можа мець два варыянты перакладу з лаціны: "на тэрыторыі Польшчы на памежжы з Чэхіяй" і "ў Чэхіі на мяжы з Польшчай". Хутчэй за ўсё, мелася на ўвазе Сілезія. Я мяркую, што гаворка ідзе пра тыя землі, якія на 1257 год знаходзіліся ў межах Каралеўства Багемія, бо далей у тэксце ўказана: "мы адправілі вас у тыя ж часткі вышэйадзначанага каралеўства".

[13] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae: Urkundensamml. zur Geschichte Mährens*, vol. 3. Ab annis 1241–1267 (Brünn: Verl. des Mährischen Landes-Ausschusses, 1841), 238. [VI.i]

[14] Bolesław Kumor, Kazimierz Dola, and Zdzisław Obertyński, *Historia Kościoła w Polsce*, vol. 1. Do roku 1764. Cz. 1, Do roku 1506 (Poznań: Pallottinum, 1974), 259; Szymański, *Ruchy heretyckie na Śląsku*, 18–19; Magdalena Ogórek, "Świdniccy heretycy w 1315 roku," *Zeszyty Naukowe / Wyższa Szkoła Zarządzania i Prawa im. Heleny Chodkowskiej w Warszawie* 15, no. 2 (2010): pp. 143–153, 144; František Palacký, "O stycích a poměru sekty Waldenské k někdejším v Čechách," Čas. Musea Království Českého 42, no. 4 (1868): pp. 291–320, 296.

[15] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae*, vol. 3, 239. [VI.i]

інквізітара, або пашырылі б правы чэшскіх. Таксама нельга пакінуць па-за ўвагай меркаванне Яраміра Мікулкі, што зварот караля Багеміі Пржэмысла II Атакара да Папы, у адказ на які быў напісаны дадзены ліст, мог быць выкліканы не толькі і не столькі значнай колькасцю ерэтыкоў, колькі палітычнымі матывамі. Як вядома, кароль шукаў палітычнай падтрымкі ў Апостальскага Прастола. Апошні, у сваю чаргу, максімальна спрыяў усім барацьбітам з ерэтыкамі[16]. Можна выказаць гіпотэзу, што колькасць ерэтыкоў на гэтых тэрыторыях у рэчаіснасці магла быць нязначнай (або іх увогуле не было).

Першыя вальдэнсы Чэхіі – гэта выхадцы пераважна з Пасаўскай дыяцэзіі. Усё XIII ст. і далей працягвалася нямецкая каланізацыя Багеміі і Маравіі. Сюды перасялялася шмат серваў (найбольш абмежаваная ў правах катэгорыя прыгонных сялян), якія ўцякалі ад сваіх гаспадароў і шукалі вольных зямель, дзе яны маглі б спыніцца. Мясцовыя феадалы вельмі часта ішлі ім насустрач, каб павялічыць колькасць насельніцтва. І тут патрабаваліся ў тым ліку вальдэнсы, якія мелі добры вопыт у сельскай гаспадарцы. Хто сябе добра зарэкамендаваў – меў магчымасць запрасіць новых каланістаў.

Пытанне пра этнічную прыналежнасць вальдэнсаў усходу Свяшчэннай Рымскай Імперыі і іх мову застаецца адкрытым. Дакладна можна сцвярджаць, што ўсе (без выключэння) рэгіёны, дзе было засведчана існаванне гэтых ерэтыкоў, з'яўляліся адначасова рэгіёнамі нямецкай каланізацыі. І нават тыя нешматлікія імёны вальдэнсаў, якія дайшлі да нас у інквізіцыйных матэрыялах, адносяцца да агульнахрысціянскіх (Сымон, Павел, Ганна) або нямецкіх (Херамайстар, Ханс, Готфрыд, Эльс, Кунэль, Бератунсгот), колькасць славянскіх імёнаў зусім нязначная. Таму можна зрабіць выснову, што распаўсюджанне вальдызму ішло поруч з нямецкімі перасяленцамі. Варта адразу ж заўважыць, што не ўсе нямецкія каланісты былі вальдэнсамі, але ўсе яны заўсёды мелі сваіх асобных прапаведнікаў[17].

Нельга сказаць дакладна, колькі сярод перасяленцаў было вальдэнсаў, але памежныя зоны мелі вельмі спрыяльную сітуацыю для ерэтычнай пропаведзі. Вышэйзгаданы Ноймайстар сцвярджаў, што яго паплечнікі ў Багеміі і Маравіі "незлічоныя"[18]. У буле Папы Рымскага ад 1 красавіка 1318 г. да пражскага біскупа Яна IV гаворка ідзе пра яго недасканалую барацьбу з ерэтыкамі, якія маюць свайго архібіскупа, 7 біскупаў, а кожнаму з іх, у сваю чаргу, падпарадкоўваюцца 30 ерэтыкоў[19]. Аляксандр Пачоўскі выказаў меркаванне, што іх колькасць у аўстра-багемскім рэгіёне была

---

[16] Jaromír Mikulka, *Polské země a herese v době před reformací* (Praha: Ústav dějin východní Evropy ČSAV, 1969), 15.

[17] Bylina, *Ruchy heretyckie w średniowieczu*, 28.

[18] Lambert, *Medieval Heresy*, 169.

[19] Holinka, "Sektářství v Čechách," 45.

значна большай, чым у Лангедоку часоў Бернарда Гі[20]. Флацыус Ілірыкус адзначаў таксама, што ў 1330-я гг. у рэгіёне было безліч вальдэнсаў, якімі кіравалі з Ламбардыі[21]. У той час як Флацыус упэўнены ў ідэнтыфікацыі ерэтыкоў, абат Ян Віктрынскі, сучаснік апісаных падзей, у сваёй "Кнізе некаторых гісторый", напісанай каля 1335 г., пад 1328 г. указвае на шматлікасць ерэтыкоў (неідэнтыфікаваных) у многіх гарадах Аўстрыі і Багеміі[22].

Праца Гала з Касорыц і Пятра з Начырадца

У 1335 г. Папа Бенедыкт XII прызначыў двух новых інквізітараў у Пражскую і Оламаўцкую дыяцэзіі[23]: дамініканца Гала з Касорыц і францысканца Пятра з Начырадца[24] адпаведна. Першы паходзіў з Йіндржыхува Градца, другі належаў да шляхецкага роду Вітковічаў. Інквізіцыя пачала сваю працу ў Градцы ў кастрычніку 1335 г. і адразу ўзялася за жыхароў Вялікага Беднарца і навакольных вёсак. Падчас следства высветлілася, што ў цэнтральнай вёсцы каталікамі засталіся толькі консул[25], лазеншчык і пастух[26]. Вальдэнсы былі выяўлены ў Празе, Градцы Кралавэ, Чэскіх Будзеёвіцах, Йіндржыхуве Градцы, Брно, Знойме, Прахаціцэ і іншых больш дробных мястэчках. Такі шырокі абсяг і колькасць прадстаўнікоў вальдэнскай ерасі не маглі ўзнікнуць за кароткі перыяд, таму магчыма, што вальдэнсы жылі на чэшскіх землях на працягу стагоддзя[27].

Захаваліся матэрыялы допытаў амаль 300 чалавек, з якіх каля 180-і былі прызнаны вальдэнсамі. Многіх з іх спалілі. Усяго ж апісваюцца справы больш чым 4400 ерэтыкоў, прычым 2640 з іх – вальдэнсы. Суадносіны паказальныя, бо і далей да з'яўлення гусітаў вальдэнсы складалі большасць ерэтыкоў у Багеміі[28]. Калі параўнаць адносную колькасць ерэтыкоў на душу насельніцтва, то ў Чэхіі Гал выкрыў больш вальдэнсаў, чым Бернард Гі на поўдні Францыі – прызнаным ерэтычным цэнтры[29].

Падазрэнне падала на тых, хто мелі лад жыцця, адрозны ад іншых, гаварылі між сабой "па-асабліваму", і жылі адасоблена. Для чэхаў абшчына немцаў (а вышэйадзначаныя вальдэнсы былі немцамі, за выключэннем чатырох чалавек са славянскімі імёнамі, што магло сведчыць як аб пранікненні

---

[20] Цытавана па Peter Biller, "Through a Glass Darkly: Seeing Medieval Heresy," in *The Medieval World*, 2nd ed. (Abingdon and New York: Routledge, 2018), pp. 345–367, 348.

[21] Holinka, "Sektářství v Čechách," 63.

[22] Iohannis abbatis Victoriensis, *Liber certarum historiarum*, vol. 2 (Hannoverae: impensis bibliopolii Hahniani, 1910), 130.

[23] Audisio, *The Waldensian Dissent*, 41.

[24] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae: Urkundensamml. zur Geschichte Mährens*, vol. 7. Ab annis 1334–1349 (Brünn: Georg Gastl's typographischer Anstalt, 1858), 52–56.

[25] Прадстаўнік мясцовай адміністрацыі.

[26] Alexander Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition im 14. Jahrhundert* (Weimar: Hermann Böhlaus Nachfolger, 1979), 238. [VI.ii.b]

[27] Lambert, *Medieval Heresy*, 170.

[28] Doležalová, "The Inquisition in Medieval Bohemia," 311.

[29] Doležalová, "The Inquisition in Medieval Bohemia," 301.

чэхаў у нямецкую абшчыну, так і пра запазычанне славянскіх імёнаў немцамі[30]) увогуле ўспрымалася як абшчына "чужынцаў", у яе мог быць свой асобны святар, свая мова і звычаі. Адасабленне немцаў ад чэхаў магло ісці ў тым ліку і праз сваю веру – вальдызм, якую маглі спавядаць цэлыя сем'і.

Пры такім размежаванні не назіраецца выразных канфліктаў паміж вальдэнсамі і навакольным чэшскім насельніцтвам, якое магло быць у меншасці. Паколькі вальдэнсы былі рамеснікамі, іх паслугамі карысталіся, яны маглі нават уваходзіць у мясцовыя радныя органы. Выключанымі з іх былі толькі названыя інквізітарамі ерэтыкамі і прыгавораныя да нашэння нашытых на вопратцы крыжоў[31]. Панавала ўзаемаразуменне паміж чэхамі-сялянамі і вальдэнсамі[32], таму што ў рэгіёнах са змешаным насельніцтвам заўсёды з'яўляліся групы людзей, якія гаварылі на абедзвюх мовах, што ў тым ліку спрыяла і пранікненню вальдэнскіх ерэтычных ідэй ад немцаў да чэхаў. Інквізіцыі вызваўся дапамагаць толькі мясцовы святар Мікулаш, які выступаў пад прысягай як сведка[33]. У той жа час самі дапытаныя выразна аддзялялі сябе ад каталікоў: "Называем сябе прызнанымі і выпрабаванымі людзьмі (notos et probos homines)"[34].

Сходы "апосталаў" (вальдэнсы называлі так сваіх "настаўнікаў"; пайменна называюцца Альберт і Готфрыд[35]) адбываліся ў дамах простых вернікаў. "Ён быў спытаны, як часта прыходзілі такія людзі, адказаў, што тры разы на год, і калі-небудзь заставаліся на тры ці чатыры тыдні, а калі-небудзь на менш"[36]. Адзін са сведкаў паведаміў, што яны вялі выключна цнатлівае жыццё, "бо ніхто не можа быць настаўнікам, калі не будзе цнатлівым, і не цнатлівага не прымаюць у вучні; і заставаўся ён вучнем дванаццаць гадоў, і пасля гэтага стаў настаўнікам"[37]. "Апосталы" трымалі кантакты з Прагай, Зноймам і Баварыяй. Перамяшчаліся яны на калясцы – ахвяраванні вальдэнскай абшчыны.

Мясцовыя консулы сцвярджалі, што ерась у іх край прыйшла з Прагі[38] і Знойма[39], што ў Празе адбываліся чатырохтыднёвае навучанне на "настаўніка"[40] і пасвячэнні ў "настаўнікі"[41]. Вядома, што ў чатырох мястэчках у ваколіцах Вялікага Беднарца, як і ў самім горадзе, былі вальдэнскія школы[42].

---

[30] Ogórek, *Beginki i Waldensi*, 145.
[31] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 180, 208, 214, 252. [VI.ii.b]
[32] Molnár, *Storia dei valdesi*, 109.
[33] Holinka, "Sektářství v Čechách," 68.
[34] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 203–204. [VI.ii.b]
[35] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 253. [VI.ii.b]
[36] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 235. [VI.ii.b]
[37] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 250. [VI.ii.b]
[38] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 179. [VI.ii.b]
[39] Holinka, "Sektářství v Čechách," 69.
[40] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 250. [VI.ii.b]
[41] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 182. [VI.ii.b]
[42] Holinka, "Sektářství v Čechách," 69.

Згодна з захаванымі пратаколамі інквізітараў, вераванні чэшскіх вальдэнсаў былі тыповымі. Квінтэсэнцыя змяшчаецца ў фразе "Што не павінны клясціся, і што мы – верныя (fidelis), і што існуе толькі дзве дарогі, а менавіта на неба і ў пекла, і што чыстца душаў не існуе"[43]. Сказана гэта было вандроўным настаўнікам-міранінам падчас пропаведзі. Таксама гэтыя "настаўнікі" прымалі споведзі, нягледзячы на тое, што яны не з'яўляліся святарамі нават у вачах сваіх вернікаў. Быў пашыраны данатызм. З адмаўлення чыстца вынікае непрызнанне вартасці малітваў і ахвяраванняў за памерлых, а таксама царкоўных таінстваў, рытуалаў, пастоў, устаноўленых святаў і нядзельных дзён, ды і саміх царкоўных будынкаў. Праліццё крыві нават па судзе лічылася грахоўным.

У 1339 г. інквізітары напісалі справаздачу Папу Рымскаму ў Авіньён аб паспяховым сканчэнні працэсу, бо раней звярталіся да яго з просьбай аб дапамозе, перш за ўсё грашыма[44]. (*Працяг гл. "Права на здзяйсненне гвалту ў мэтах самаабароны"*).

Але барацьба з вальдэнсамі на гэтым не спынілася. У 1337 г. інквізіцыя працягнула сваю работу ў Празе, у дамініканскім кляштары, і знайшла сляды руху ў Градцы Кралавэ ва ўсходняй Багеміі, а таксама ў самой Празе. Магчыма, ерэтыкі пранікалі ў краіну пад выглядам / у якасці гандляроў тканінамі.

І надалей свецкая і духоўная ўлады аб'ядноўваліся ў змаганні супраць ерэтыкоў Йіндржыхува Градца. Сам Карл IV, кароль Багеміі і імператар Свяшчэннай Рымскай Імперыі, у 1350 г. загадаў знішчыць ерэтыкоў, а першы архібіскуп Прагі Эрнэст з Пардубіц заснаваў у горадзе пастаянны інквізіцыйны трыбунал.

У 1358 г. інквізітар Святабор з Длугай Весі быў дасланы ў гарады Пісек і Бехін. У 1377 г. побач, у ваколіцах замка Козі, былі арыштаваны тры ерэтыкі-немцы, двое з Вялікага Беднарца (таго самага, супраць якога быў крыжовы паход 1340 г.). Магчыма, гэта былі вальдэнсы, якія ратаваліся ад інквізітарскага пераследу.

У 1372 г. у Опаве была выкрыта цэлая "вуліца ерэтыкоў" (platea haereticum), заселеная вальдэнсамі-каланістамі нямецкага паходжання; у 1380 г. у Маравіі "вальдэнскае пустазелле" квітнела буйным цветам[45] (як ні змагаўся з ім у 1360–1370 гг. інквізітар Йіндржых з Оламаўца[46]). Інквізітар Арнст у другой палове XIV ст. сцвярджаў, што канчаткова перарваў вальдэнскую традыцыю на поўдні Чэхіі[47].

Але цалкам "вытравіць" вальдэнсаў было немагчыма. Іх прысутнасць адзначаная на сінодзе ў Празе ў 1381 г.[48] У тым жа годзе оламаўцкі біскуп

---

[43] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 203–204. [VI.ii.b]
[44] Holinka, "Sektářství v Čechách," 66–67.
[45] Hammann, "Waldenser in Ungarn," 431.
[46] Holinka, "Sektářství v Čechách," 86.
[47] Holinka, "Sektářství v Čechách," 83.
[48] Höfler, *Concilia Pragensia*, 26. [VI.iii]

Пётр Йелітаў быў абвінавачаны ў нядбайнасці, якая давяла да таго, што "пустазелле, пасеянае вальдэнскімі ерэсіярхамі, настолькі разраслося, што цяпер ужо цяжка будзе вырваць з коранем такое зло і страх перад імі"[49]. Праз чатыры гады Мацвей Кракаўскі ў сваёй пражскай пропаведзі згадвае менавіта вальдэнсаў як ворагаў Каталіцкай Царквы[50]. У 1394 г. біскуп оламаўцкі Мікалай пісаў Папу, што некаторыя ерэтыкі з секты вальдэнсаў вярнуліся ва ўлонне Каталіцкай Царквы[51]. У запісаных яшчэ праз год 20-і вальдэнскіх "памылках" да згаданых у пратаколах Гала з Касорыц і Пятра з Начырадца дадаюцца адмаўленне індульгенцый, неабходнасці хрышчэння ўвогуле, пакланення абразам і крыжу[52]. Такім чынам, вальдэнсы не толькі не знікаюць, але яны радыкалізуюцца.

У канцы XIV – пачатку XV ст. ананімны каталіцкі аўтар скардзіцца на надзвычайнае распаўсюджанне вальдэнсаў у Аўстрыі і Багеміі. Ён пералічвае ўсё тыя ж асноўныя рысы дактрыны вальдэнсаў: непавага да Папы і Айцоў Царквы; адмаўленне малітваў за мёртвых і міласціны, святых і абразоў; адмаўленне клятвы і гвалту; данатызм[53].

І ў 1410 г. не сціхае пераслед вальдэнсаў на чэшска-баварскім памежжы. У 1415 г. паплечнік Яна Гуса Якубек Стршыбршскі з тугой успамінае тых, хто не здрадзіў сапраўднай Царкве ў часы Канстанціна і праз стагоддзі захоўваў сваю веру, не баючыся пераследу[54].

Неабходна дадаць у завяршэнне: Альберт дэ Ланге выказвае меркаванне, што фактычна вальдэнсы ў Чэхіі знікаюць пасля пераследаў 1390-х гг., бо няма прамых звестак пра іх існаванне[55]. Калі прыслухацца да яго думкі, то можна прапанаваць гіпотэзу, што каталікі працягвалі палемізаваць з вальдэнсамі больш у сілу звычкі і традыцыі, чым з-за сапраўднай пагрозы. Але з прычыны адсутнасці інквізітарскіх пратаколаў або дакументаў менавіта вальдэнскага паходжання гэтае пытанне застаецца адкрытым.

---

[49] "Bischof Peter von Olmütz Wegen Begünstigung der Schismatiker," in *Archiv für Österreichische Geschichte*, vol. 55 (Karl Gerold's Sohn, 1877), pp. 364–372, 368.

[50] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 318–323. [VI.iv]

[51] *Monumenta Vaticana res gestas Bohemicas illustrantia, sumptibus comitiorum regni Bohemiae ediderunt ad recensendos historiae Bohemicae fontes delegati*, vol. 5. Acta Urbani VI. et Bonifatti IX, 1378–1404 (Pragae: Typis Gregerianis, 1903), 469, č. 858. [VI.v]

[52] Holinka, "Sektářství v Čechách," 181. [VI.vi]

[53] Augustin Neumann, "Nové doklady k dějinám Valdenských v Čechách," *Čas. pro Katolické Duchowenstwo* 9/10 (1925): pp. 674–681, 679–680. [VI.vii]

[54] Holinka, "Sektářství v Čechách," 136.

[55] de Lange, "Waldenses in Bohemia," 157.

Сілезія, Памор'е і Польскае Каралеўства

Польскае Каралеўства

Першая згадка пра ерэтыкоў непасрэдна на тэрыторыі Польскага Каралеўства адносіцца да папскай булы ад 1318 г., дзе гаворка ідзе не толькі пра вышэйзгаданыя чэшскія дыяцэзіі (Прага і Оламаўц), але і Вроцлаў, тагачасны чэшскі (а потым нямецкі) Майсэн, а таксама польскі Кракаў. Тут прама пазначана не толькі "Каралеўства Багемія", але і "Польшча"[1]. У іншых булах таго ж года гэта выказана яшчэ дакладней: "у некаторых частках Каралеўства Багеміі і Польшчы, і ў памежных землях іх, а пераважна ў Кракаўскай і Вроцлаўскай дыяцэзіях"[2]. З тэксту самога ліста, адрасаванага ў тым ліку герцагу вроцлаўскаму[3], можна зрабіць выснову, што гаворка ідзе пра афіцыйнае заснаванне інквізіцыі на вышэйзгаданых землях. У той жа час некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што адпраўка інквізітараў у гэтыя правінцыі мела выключна прэвентыўны характар[4].

Па звестках булы ад 1326/1327 г., колькасць інквізітараў (гэтым разам дамініканцаў, а не францысканцаў) далей павялічвалася[5]. Але гаворка пакуль не ідзе пра стварэнне трыбуналаў у іншых дыяцэзіях, а ўвогуле пра "Каралеўства Польскае". У булах Папы 1327 і 1330 гг. напісана, што ерэтыкі трапілі ў Венгерскае Каралеўства з Германіі і Польшчы (адпаведна, у Славакію з Малапольшчы)[6]. У 1327 г. у біскупстве Камень-Паморскім адбывалася інквізіцыйнае пасяджэнне. Менавіта тады Папа Ян XXII паведаміў біскупу аб стварэнні ў польскай дамініканскай правінцыі інквізіцыйнага трыбунала, каб судзіць "ворагаў крыжа", якія ўцякалі ў Польшчу з Германіі і Чэхіі. У Кракаве ёсць згадка пра ерэтыкоў у 1350 г.[7]

---

[1] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae: Urkundensamml. zur Geschichte Mährens*, vol. 6. Ab annis 1307–1333 (Brünn: Georg Gastl's typographischer Anstalt, 1854), 104. [VII.ii]

[2] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae*, vol. 6, 101. [VII.ii]

[3] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae*, vol. 6, 106. [VII.ii]

[4] Bylina, "Wizerunek heretyka w Polsce późnośredniowiecznej," 7; Jerzy Wyrozumski, "Z dziejów waldensów w Polsce średniowiecznej," *„Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Jagiellońskiego», t. 469, Prace Historyczne* 56 (1977): pp. 39–50, 50.

[5] Abraham Stanisław Bzowski, *Propago D. Hyacinthi thavmatvrgi Poloni, seu de rebus praeclare gestis in Prouincia poloniae Ordinis Praedicatorum commentarivs* (Venetiis: apud Societatem Minimam, 1606), 63.

[6] Dobrowolski and Chodynicki, "Pierwsze sekty religijne w Polsce," 180; Swoboda, "Początki herezji na ziemiach polskich," 396.

[7] Bzowski, *Propago D. Hyacinthi thavmatvrgi Poloni*, 69.

Але ні ў адной са згаданых вышэй крыніц не ідзе гаворка непасрэдна пра вальдэнсаў. Адзіная прамая згадка сустракаецца ў трактаце "Каталог тэкстаў ісціны" Флацыуса Ілірыкуса, але гэтая крыніца паходзіць са значна больш позняга часу, з XVI ст.: "Таксама ж у Германіі, а асабліва ў Эльзасе і ў наваколлях Рэйна, а таксама ў Багеміі, а адтуль далей ў Саксонію, Сілезію, Маравію і Польшчу дактрына іх [вальдэнсаў] перад [1]300-і гадамі пашырылася"[8].

На тэрыторыі сучаснай Польшчы вальдэнсы сустракаліся пераважна ў яе заходняй частцы, а менавіта ў Ніжняй Сілезіі і на Заходнім Памор'і, якія ў Сярэднявеччы знаходзіліся па-за межамі Польскага Каралеўства. Наконт Малапольшчы звесткі адсутнічаюць, хоць некаторыя сучасныя даследчыкі ўпэўненыя, што вальдэнсы там былі[9].

Ніжняя Сілезія

У другой палове XIII ст. землі Сілезскага герцагства былі неад'емнай часткай лацінамоўнай супольнасці еўрапейскай культуры. У гэтым кантэксце неабходна падкрэсліць характэрную для Вроцлаўскай зямлі спрэчку паміж духавенствам і свецкімі ўладамі[10]. У свядомасці гараджан парушалася манаполія царкоўнай улады, а значыць, падарваўся і аўтарытэт каталіцкага духавенства. Тут можна прасачыць відавочную аналогію з паўночнаітальянскімі гарадамі-дзяржавамі, якія з XI ст. былі ерэтычнымі цэнтрамі.

Пачаць трэба з самага ранняга працэсу, які адбыўся да афіцыйнага з'яўлення інквізіцыі на польскай зямлі. Як паведамляюць Любяжскія аналы: "У лета Божае 1315 каля дня свята святога Якуба [прыкладна 25 ліпеня 1315 г.] многія ерэтыкі колькасцю каля пяцідзесяці ці больш, разам са сваімі жонкамі і дзецьмі, былі спалены ў Свідніцы; у Вроцлаве і іншых гарадах таксама многія былі спалены"[11].

Ініцыятарам інквізіцыйнага працэсу стаў вроцлаўскі архібіскуп Генрык Вежбненскі (1302–1319 гг.). Па невядомых дагэтуль прычынах ён быў раней адлучаны ад Царквы і выкліканы папскім судом у Авіньён[12], дзе прабыў чатыры гады: з 1310-га па 1314-ты. Адтуль вярнуўся вельмі заклапочаны справамі дыяцэзіі. Магчыма, такім чынам ён хацеў даказаць сваю

---

[8] Matthias Flacius Illyricus, *Catalogus testium veritatis* (Basel: Per Ioannem Oporinum, 1556), 719–720. [VII.iv]

[9] Tomasz Gałuszka, *Henry Harrer's Tractatus Contra Beghardos: The Dominicans and Early Fourteenth Century Heresy in Lesser Poland* (Kraków: Wydawnictwo Esprit, 2015), 49–50; Edward Potkowski, *Heretycy i inkwizytorzy* (Warszawa: Bellona, 2011), 144.

[10] Henryk Samsonowicz, "Śląsk w Europie w czasach Henryka IV Probusa," in *Śląsk w czasach Henryka IV Prawego* (Wrocław: Uniwersytet Wrocławski, Instytut Archeologii, 2005), pp. 7–11, 7.

[11] "Annales Lubenses a. 1241–1315," in *Monumenta Germaniae Historica. Scriptorum*, vol. 19 (Hannoverae: Impensis Bibliopolii Aulici Hahniani, 1866), pp. 548–549, 549. Гэтыя ж звесткі дубліруюцца ў "Кароткай хроніцы Сілезіі". "Breve Chronicon Silesiae," in *Scriptores Rerum Silesiacarum*, vol. 1 (Breslau: Max, 1835), pp. 33–37, 36. [VII.i.a]

[12] У 1309–1377 гг. Авіньён быў Папскай рэзідэнцыяй.

лаяльнасць Папу. Ён склікаў трыбунал дамініканцаў, францысканцаў і свецкіх уладаў пад старшынствам свайго памочніка Паўла з Банча, цыстэрцыянца з кляштара ў Любяжы (сам біскуп не прысутнічаў).

Захаваліся спіс фігурантаў справы і матэрыялы допытаў, але сама назва ерасі не абазначана[13]. Характэрна, што ў спісе абвінавачаных згадваецца не толькі прозвішча, але і прафесія. Вось тры найбольш цікавыя выпадкі:

1. Генрык "retro hospitale". Яраслаў Шыманскі лічыць, што ён быў "неяк звязаны са шпіталем св. Міхаіла ў Свідніцы"[14]. У той час у Свідніцы было ажно 5 шпіталяў, і прыналежнасць Генрыка ні да аднаго з іх не ўстаноўлена[15]. З іншага боку, мне падаецца магчымым, што гэта быў "гаспіцый" – форма прытулку вальдэнсаў, дзе яны спыняліся падчас сваіх падарожжаў. На карысць гіпотэзы аб тым, што Генрык быў "кіраўніком гаспіцыя", сведчыць яго статус: ён быў адным са "старэйшых сярод усіх". Магчыма, выконваў дадатковыя святарскія функцыі. У выяўленай групе вальдэнсаў не было ніводнага, хто быў бы прафесійна звязаны з духавенствам, а шпіталі знаходзіліся ў сферы ўплыву Касцёла[16]. Супраць гіпотэзы пра тоеснасць шпіталя і гаспіцыя гаворыць тое, што вальдэнсы-вандроўнікі спыняліся ў нейкай удавы (а не ў гаспіцыі).

Пытанне, ці можа "retro hospitale" быць раўназначным "rector hospicii", пакуль застанецца адкрытым. Тут мы ступаем на хісткую глебу інтэрпрэтацыі падвойнага перакладу: невядома, на якой мове вёўся допыт абвінавачаных, але зразумела, што не на лаціне. Гэта значыць, што пратаколы допытаў перакладаліся, часта пісарамі не вельмі высокага майстэрства. І калі першапачаткова ўступныя пытанні задаваліся на лаціне, іх трэба было перакласці абвінавачанаму, а потым адказы зноў перакладаць на лаціну. Ці быў у свідніцкіх вальдэнсаў гаспіцый? Ці ўжывалі яны гэты тэрмін у судзе? Ці ведалі пра існаванне такога тэрміна канкрэтны інквізітар, які прадыктаваў пратакол, або пісар, які яго напісаў? Як менавіта праходзіла першая інквізіцыя на гэтых землях? З-за адсутнасці адказаў на гэтыя пытанні немагчыма адназначна адказаць і на першае з іх.

Трэцяй, найменш верагоднай, тэорыяй з'яўляецца пераклад "retro hospitale" як "былы госць"[17], гэта значыць – нядаўні перасяленец.

2. Ткачыха Чусха (Czuscha). Пытанне аб суадносінах прафесійнага ткацтва і ерэтыкоў заўсёды ўздымаецца ў даследаваннях сярэднявечных рэлігійных плыняў. На першы погляд, у дачыненні да вальдэнсаў узаема-

---

[13] Patschovsky, "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315," 163–176. [VII.i.b]. Каментары Szymański, *Ruchy heretyckie na Śląsku*, 25–50; Ogórek, *Beginki i Waldensi*, 173–186.

[14] Szymański, *Ruchy heretyckie na Śląsku*, 29–33.

[15] Jan Drabina, *Życie codzienne w miastach śląskich XIV i XV w.* (Wrocław: Wydawnictwo «Skryba», 1998), 83.

[16] Drabina, *Życie codzienne w miastach śląskich*, 84.

[17] Такім тэрмінам часта называлі каланістаў. Jan Maria Piskorski, *Kolonizacja wiejska Pomorza Zachodniego: w XIII i w początkach XIV wieku na tle procesów osadniczych w średniowiecznej Europie* (Poznań: PTPN, 2005), 59.

адносіны відавочныя: сярод іх вандроўных "настаўнікаў" было шмат ткачоў[18]. Але ў гэтай крыніцы ткачыха, пра якую ідзе гаворка, не фігуруе як прапаведніца; яна таксама была адзінай прадстаўніцай гэтай прафесіі ў групе. Таму ў дадзеным выпадку больш верагодна, што яе перакананні не паўплывалі на выбар прафесіі, і яна проста выступае ў ролі прадстаўніка гарадскіх рамеснікаў. Згаданая жанчына, мяркуючы па імені, магла быць славянскага паходжання, што таксама зніжае верагоднасць таго, што яна была вандроўнай прапаведніцай з нямецкіх земляў і прынесла з сабой вучэнне вальдэнсаў. Гэта звязана з тым, што як у Польшчы, так і ў суседняй Чэхіі вальдызм практыкаваўся ў асноўным сярод нямецкіх каланістаў, для якіх любая ерась магла быць спосабам захаваць уласную ідэнтычнасць[19]. Я мяркую, што ў выпадку антывальдэнскага працэсу ў Свідніцы гэты факт застаецца недаказаным, бо адзіны, хто гаворыць пра замыканне абшчыны (яе эндагамію)[20], – акурат не немка[21], а славянка Чусха. У Сілезіі большаць вальдэнсаў былі, верагодна, купцамі[22]. Першыя нямецкія каланісты тут з'яўляюцца прыкладна за 100 гадоў да гэтых падзей, у пачатку XIII ст.[23]

3. Сіботан. Так звалі аднаго з сукіраўнікоў секты. Яго імя выглядае вельмі падобна на славянскае "Субоцін" – так звычайна называлі людзей, народжаных у суботу. Такое самае імя сустракаецца ў вучня Д'ябла ў балгарскай легендзе пра паходжанне ерэтычнай секты паўлікіянаў[24]. Магчыма, гэтым іменем аўтар хацеў даць адсылку да д'ябальскага паходжання секты, а, магчыма, на іх узаемадачыненні з яўрэямі, чый святы дзень – субота.

Аднак, калі гаворка ідзе пра знешнія ўплывы на рэлігійную сітуацыю ў Сілезіі, мы не можам абмяжоўвацца толькі нямецкім кантэкстам. Некаторыя князі знаходзіліся пад ўплывам Чэхіі[25], дзе вальдэнсы з'явіліся ў першай палове XIII ст. Прамога ўказання на ўплыў чэхаў няма: у самой Чэхіі ерась таксама была прадстаўлена пераважна нямецкімі каланістамі. Але не выключана, што вальдэнсы ў Польшчу прыйшлі не непасрэдна з нямецкіх зямель, а праз Чэхію[26]. Вядома, што ў той час Прага была адным з самых багатых і ўплывовых гарадоў Еўропы (самым значным у "маладой" Еўропе). Шмат дробных рыцараў прыбыло туды ў пошуках шчасця, але,

---

[18] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 73–74; Mikulka, *Polské země a Herese*, 14.

[19] Jarosław Szymański, "Johannes Swenkenfeldt – inquisitor et martyr," *Śląski Kwartalnik Historyczny Sobótka* 1 (2003): pp. 1–17, 1.

[20] Patschovsky, "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315," 175. [VII.i.b]

[21] Hans Bahlow, *Schlesisches Namenbuch* (Kitzingen/Main: Holzner, 1953), 75.

[22] Romolo Cegna, "Idea wolności w Ruchach Heretyckich Późnego Średniowiecza; Waldyzm Europejski," *Kwartalnik Historyczny* 86, no. 4 (1979): pp. 951–964, 962.

[23] Kazimierz Popiołek, *Historia śląska od pradziejów do 1945 roku* (Katowice: Śląsk, 1984), 32.

[24] Nina G. Garsoïan, *The Paulician Heresy: A Study of the Origin and Development of Paulicianism in Armenia and the Eastern Provinces of the Byzantine Empire*, 2nd ed. (Berlin: De Gruyter Mouton, 2011), 133.

[25] Popiołek, *Historia śląska*, 50.

[26] Stanisław Kotełko, *Średniowieczne herezje w Świdnicy*. Accessed 05.11.2022. http://um.swidnica.pl/media/Encyklopedia/czescV.pdf.

не знайшоўшы сабе месца, перабраліся на ўскраіны сілезскіх герцагстваў, дзе было лягчэй праявіць сябе. Магчыма, такія ж матывы былі і ў жыхароў горада.

Па сваім сацыяльным складзе група была дастаткова неаднароднай: акрамя згаданай вышэй рамесніцы Чусхі ў яе ўваходзіў, напрыклад, лаўнік Людвік з Горліча[27]. Сваёй адрознай рысай ад каталікоў яе ўдзельнікі разумелі адмаўленне ад клятвы ("не кажуць клятваў (truwin)")[28] і споведзь сваім настаўнікам-міранам. Таксама яны адхілялі хрышчэнне і заступніцтва святых, адмаўлялі беззаганнасць Дзевы Марыі. Удзельнікі групы трымалі пост і былі гатовыя памерці за свае ідэалы.

Магдалена Агурэк сцвярджае, што яна выявіла апытальнік, якім карыстаўся інквізітар падчас допыту ўдзельнікаў гэтай групы[29]. Аднак адказы асуджаных не супадаюць з пытаннямі, пастаўленымі ў ім. Асабліва важна тое, што ў адказах не згадваецца стаўленне да чыстца і данатызму, хоць гэтая тэма ўздымаецца ў некалькіх пунктах апытальніка.

Акрамя агульнавальдэнскіх перакананняў, дапытаныя таксама прызналі пакланенне Люцыферу, сексуальную распусту, оргіі і інцэст. Вядома, што ў цэлым большая частка паказанняў давалася пасля абяцання інквізітараў паменшыць пакаранне пры прызнанні[30]. Такім чынам, традыцыйна гісторыкі звязваюць такія доказы з "інквізітарскімі перабольшваннямі", сцвярджаючы, што ў асноўным вобраз вальдэнсаў у Польшчы быў азмрочаны "д'ябальскай сілай"[31]. Яраслаў Шыманскі, аднак, ставіць лагічнае пытанне: чаму мы прымаем частку крыніцы, датычную клятвы і іншых хрысціянскіх дагматаў, а "непрыстойную" адкідаем? Да нашых дзён дайшло шмат сведчанняў, што ў той жа час на землях вакол Сілезіі распаўсюджваўся культ Люцыфера[32]. Цяжка сцвярджаць, наколькі гэта адпавядала рэчаіснасці, бо ерэтыкі традыцыйна ўяўляліся як слугі Д'ябла[33]. Пра тое, што вальдэнсы не былі люцыферыянамі, сведчыў той факт, што люцыферыянам, у адрозненне ад вальдэнсаў, не дазвалялася пакаянне і вызваленне ад спалення на вогнішчы[34]. На пацвярджэнне пазіцыі Шыманскага дадам: калі б задача інквізітараў заключалася ў атрыманні любога неартадаксальнага прызнання, то, па-першае, адной адмовы заступніцтва святых дастаткова, каб атрымаць асуджэнне; па-другое, гэтыя прызнанні выглядаюць занадта падрабязнымі, каб быць адвольна ўстаўленымі

---

[27] Szymański, *Ruchy heretyckie na Śląsku*, 29.

[28] Patschovsky, "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315," 163. [VII.i.b]

[29] Ogórek, *Beginki i Waldensi*, 178.

[30] Bruschi, *The Wandering Heretics*, 15.

[31] Adam Regiewicz, *Wizerunek heretyka w średniowiecznym piśmiennictwie polskim* (Katowice: Biblioteka Śląska, 2002), 140.

[32] Szymański, *Ruchy heretyckie na Śląsku*, 37–47.

[33] Wrzesiński Szymon, *Inkwizycja na ziemiach polskich* (Zakrzewo: Replika, 2009), 30–31.

[34] Cheryl Petreman, *Peter Zwicker: A Fair but Fervent German Inquisitor*, accessed 30.06.2015, https://www.academia.edu/7519093/Peter_Zwicker_A_Fair_but_Fervent_German_Inquisitor.

інквізітарамі[35]. Калі пагадзіцца з Агурэк, што знойдзены ёю апытальнік выкарыстоўваўся ў Свідніцы, то становіцца відавочным: інквізітары не былі ініцыятарамі пытанняў пра культ Люцыфера, а таксама пра сексуальную распусту. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што падсудныя ў Свідніцы вальдэнсы па невядомых нам прычынах дадалі да сваіх паказанняў факты пра спавяданне культу Люцыфера і свае амаральныя паводзіны, то-бок гэтыя паказанні не былі прадыктаваныя ўдзельнікамі інквізіцыйнага трыбунала. Пытанне аб суаднясенні гэтых прызнанняў з рэчаіснасцю застаецца адкрытым.

Такім чынам, на падставе аналізу пратаколаў інквізіцыі і ацэнкі кантэксту можна зрабіць выснову, што вераванні даследаванай групы належалі да вальдэнскіх. Аднак з-за сваёй аддаленасці ад першапачатковага цэнтра руху яны набылі значныя рэгіянальныя характарыстыкі, такія, як непрыняцце Старога Запавету, характэрнае для катарскай ерасі, і пакланенне Люцыферу. Такія дадзеныя нельга растлумачыць як надуманыя інквізітарамі.

У выніку працэсу на вогнішча трапілі як мінімум чатыры чалавекі. Таксама прымяняліся канфіскацыя маёмасці і высылка. Не зусім зразумела, як суадносяцца паміж сабой звесткі з пратакола, дзе колькасць абвінавачаных удвая меншая, з тымі, што прыведзены ў Любяжскіх аналах. Магчыма, на дадзены момант нам вядомыя не ўсе пратаколы. Альбо ў хроніцы ўлічаныя не толькі вальдэнсы, але і бегінкі з бегардамі[36]. У буле Папы Яна XXII да біскупа Генрыка ад 1315 г. пазначана, што былі пакараныя многія ерэтыкі ў Свідніцы і адзін у Нісе[37]. Там таксама не згадваюцца "вальдэнсы", гэта проста "ерэтыкі".

У іншых лістах Папы Яна XXII, змешчаных у Сілезскім дыпламатычным кодэксе, мы маем спасылкі на некаторых прапаведнікаў, якія, верагодна, мелі дачыненне да вальдызму. Пісар, які "нядаўна ў Вроцлаў аднекуль прыбыў", выкладае Святое Пісанне "патаемна"[38].

Яшчэ адзін ліст быў прысвечаны непрымальным паводзінам вікарыя касцёла св. Елізаветы ў Вроцлаве Хельрэгіля. Ён "падазраецца ў ерэтычнай заганнасці" і "ў сваёй пропаведзі, якую ён прамовіў у прысутнасці народу, хоць і не атрымаў дазволу ні на якія прапаведніцкія справы, паколькі хто не быў дасланы нашай уладай, не павінен атрымліваць права прапаведаваць, непачцівымі вуснамі пасеяў публічна пустыя словы, наколькі блюзнерскія і амаральныя, настолькі схізматычныя і вар'яцкія, што з-за яго ганьбы і нечысціні не толькі быў выгнаны, але і прымусіў жахнуцца

---

[35] Больш падрабязна пра дыскусіі наконт культу Люцыфера ў вальдэнсаў можна азнаёміцца ў кнізе (Ogórek, *Beginki i Waldensi,* 102–104, 111–118), а таксама ў названых там даследаваннях.

[36] Magdalena Ogórek, "Echa z przesłuchań waldensów na średniowiecznym Śląsku i Morawach," *Zeszyty Naukowe* 2 (27) (2007): pp. 124–134, 134.

[37] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5, 54–55. [VII.i.d.69]

[38] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5, 40–41. [VII.i.d.52]

ўсіх цнатлівых вернікаў, пры гэтым нехта з яго слухачоў, які быў спужаны з-за лёгкасці і схільнасці чалавека да граху, звaліўся ў прорву"[39]. Мяркуючы па адносна (для актыўнага прапаведніка) мяккім пакаранні – канфіскацыі маёмасці і высылцы з горада замест пажыццёвага зняволення або спалення – мясцовыя ўлады не залічылі яго да ерэтыкоў.

Барацьбу з ерэтыкамі (бегінкамі, неідэнтыфікаванымі ерасіярхамі Пятром Піраненсісам і Янам Лютцэбургенам) працягнулі біскуп Нанкер і інквізітар Ян Швенкенфельд[40].

Яркім прыкладам рэлігійнага перасяленца з'яўляецца вальдэнс Генслі Фервер, гісторыю якога раскрыла ў фрыбурскім архіве К. Утц Трэмп. Па яе словах, ён эміграваў з вялікага гандлёвага горада Вроцлава ў далёкі маленькі Фрыбур па рэкамендацыі вандроўных "настаўнікаў" у 1371 г., бо ў Фрыбуры на той момант не было антывальдэнскіх пераследаў. Дзякуючы сваім рэлігійным поглядам ён змог хутка ўліцца ў абшчыну мясцовых вальдэнсаў і нават ажаніўся з вальдэнкай з добрай сям'і, што дапамагло яму дасягнуць эканамічнага і палітычнага поспеху. Па словах даследчыцы, такі поспех стаў магчымы менавіта дзякуючы сувязям унутры вальдэнскага руху[41].

Антыерэтычны працэс у Свідніцы можа быць звязаны з палітычнымі амбіцыямі згаданага архібіскупа Генрыка, які з'яўляўся таксама князем[42], гэта значыць яшчэ і свецкім уладаром Вроцлава і ваколіц. З крыніц рэдка можна даведацца пра канкрэтны момант "узнікнення" або пранікнення ерасі ў той ці іншы горад. Часцей за ўсё гаворка ідзе пра момант, калі Царква звяртае на яе ўвагу і пачынае пераслед. Розніца ў часе паміж першым і другім момантамі можа складаць некалькі дзесяцігоддзяў. Адзін з апытаных, Габель, сказаў "Мы такое кажам ужо 30 гадоў"[43]. Аб пашырэнні ерэтычных вучэнняў у Сілезіі красамоўна сведчаць спробы царкоўных уладаў прадухіліць "рэлігійную" эміграцыю, а праз яе і распаўсюджванне ерасі. Жорсткае пакаранне накладаецца не толькі на саміх ерэтыкоў, але і на тых, хто аказвае ім якую-небудзь дапамогу[44]. Нельга сказаць, што ерась часцей з'яўлялася ў біскупскіх гарадах. Можна сцвердзіць толькі тое, што яна там часцей выяўлялася. Магчыма, гэта звязана з жаданнем біскупа, ужо як свецкага адміністратара, умацаваць свой аўтарытэт.

---

[39] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5, 49–50. [VII.i.d.64]

[40] Abraham Stanisław Bzowski, *Tutelaris Silesiae seu de vita rebusque praeclare gestis B. Ceslai Oorovansii, ordinis Praedicatorum commentarius* (Cracoviae: Officina Andrea Petricouij Anno Domini, 1608), 27.

[41] Kathrin Utz Tremp, "Une contribution à la Bible vaudoise?: Le 'Miroir de Souabe' de Hensli Ferwer (Fribourg, 1410)," in *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca* (Torino: Claudiana, 2009), pp. 113–120.

[42] Józef Pater, "7. Złote biskupstwo (1301–1376)," *Z dziejów archidiecezji wrocławskiej*, accessed 05.11.2022, https://www.archidiecezja.wroc.pl/index.php?option=com_content&view=article&id=17:7-zote-biskupstwo-1301-1376&catid=6:historia&Itemid=15.

[43] Patschovsky, "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315," 165–166. [VII.i.b]

[44] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5, 54–55 [VII.i.d.64], 72–74 [VII.i.d.89].

У кантэксце сказанага не дзіўна, што чарговы віток антыерэтычнай барацьбы ў Сілезіі супаў з прыходам да ўлады новага архібіскупа Вацлава (1382–1417 гг.), які як князь крыві меў і духоўную, і свецкую ўладу[45]. Падчас яго дзейнасці быў арыштаваны нейкі Стэфан; пасля допытаў і трох гадоў турмы за адмову адрачыся ад ерэтычных перакананняў ён быў пакараны смерцю (у 1398 г.). Нягледзячы на тое, што ў літаратуры пра вальдэнсаў Стэфан згадваецца радзей, яго вера, здаецца, значна бліжэйшая да вучэння вальдэнсаў, чым погляды яго папярэднікаў са Свідніцы. Ён адмаўляў усе каталіцкія асновы веры, акрамя Святога Пісання, якое цытаваў па памяці (што было адметным знакам настаўнікаў-вальдэнсаў). Ён адмаўляў клятвы і чысцец, прапаведаваў данатызм і цвёрдае перакананне ў неабходнасці вучыць, нават без бласлаўлення афіцыйнай Царквы[46]. Выключэнне складалі толькі спецыфічныя погляды на еўхарыстыю. У той час у каталіцызме ўжо прыжыўся дагмат аб транссубстанцыі, гэта значыць пераўтварэнні хлеба і віна ў Цела і Кроў Хрыста. "Містычнае" разуменне транссубстанцыі спарадычна сустракалася ў ерэтыкоў, у тым ліку і ў Стэфана. У той жа час у спісе яго "памылак" няма звестак пра культ Люцыфера і г. д.

З вышэйсказанага можна зрабіць наступныя высновы пра вальдызм у Сілезіі XIV ст.:

- ✠ Вальдызм у Вроцлаве і суседніх гарадах пашыраўся ва ўмовах, аналагічных камунальнаму руху ў Ламбардыі (высокі эканамічны ўзровень развіцця, у першую чаргу гандлю; рэлігійна-палітычная барацьба гарадскіх эліт).
- ✠ Вальдэнсы ў Сілезіі былі прадстаўлены ў асноўным гарадскім насельніцтвам з сярэднім і высокім статусам.
- ✠ На пачатку погляды апісаных ерэтыкоў маюць рысы катарызму, люцыферыянства і іншых ерэтычных плыняў, але ў канцы XIV ст. засталіся толькі тыя, якія былі характэрныя для вальдэнсаў усёй Еўропы.
- ✠ Згадванне культу Люцыфера і сексуальнай распусты зусім не было неабходным элементам вобраза ерэтыка ў познесярэднявечнай Польшчы. С. Быліна лічыць, што вера ў Д'ябла ў Польшчы была адносна слабая[47].
- ✠ Звесткі аб прысутнасці вальдэнсаў у рэгіёне храналагічна супадаюць не са значнымі міграцыямі насельніцтва або з узмацненнем ерэтычных пропаведзяў, а са спробамі князёў-біскупаў умацаваць сваю ўладу.

---

[45] Józef Pater, "8. Upadek biskupstwa w późnym średniowieczu (1376–1482)," *Z dziejów archidiecezji wrocławskiej*, accessed 05.11.2022, https://www.archidiecezja.wroc.pl/index.php?option=com_content&view=article&id=18:8-upadek-biskupstwa-w-ponym-redniowieczu-1376-1482&catid=6:historia&Itemid=15; "Catalogus Abbatum Saganensium," in *Scriptores Rerum Silesiacarum*, vol. 1 (Breslau: Max, 1835), pp. 180–528, 251.

[46] "Catalogus Abbatum Saganensium," 250–252. [VII.iii]

[47] Stanisław Bylina, *Religijność późnego średniowiecza: Chrześcijaństwo a kultura tradycyjna w Europie Środkowo-Wschodniej w XIV–XV w.* (Warszawa: Neriton, 2009), 176.

Заходняе Памор'е

Сітуацыя ў Заходнім Памор'і кардынальна адрозніваецца ад сітуацыі ў Сілезіі. Па-першае, тут вальдэнсы ўжо згадваюцца непасрэдна па імені, напрыклад: "У 1394 г. брат Пётр, правінцыял братоў ордэна цэлесцінцаў у Германіі, інквізітар...: у дыяцэзіі Камень-Паморскай больш чым 400 ерэтыкоў абодвух полаў з секты вальдэнсаў выявіў, дапытаў, выкрыў і наклаў пакаянне, сярод якіх чатыры ніжэйпазначаныя асобы былі знойдзеныя не ў названай, але ў Познаньскай дыяцэзіі"[48].

Па-другое, захавалася больш за 200 пратаколаў допытаў абвінавачаных у ерасі; вытрымкі з іх апублікаваныя ў 1975 г. Дзітрыхам Курцэ[49].

У 1392–1394 гг. Пётр Цвікер узначальваў інквізіцыйны трыбунал у Шчэціне (цэнтральным горадзе рэгіёну), дзе секта ўпершыню згадваецца ў 1366 г.[50] Падчас судовага разбору як мінімум 443 вальдэнсы былі выкрытыя і выкліканыя на допыт. У выніку быў вынесены толькі адзін смяротны прысуд, астатнія абвінавачаныя пакаяліся і вярнуліся (ці зрабілі выгляд, што вярнуліся) ва ўлонне Рымскай Царквы. З іншага боку, апраўдальны прысуд таксама быў толькі адзін. Лічыцца, што Пётр Цвікер не прымяняў у дадзеным выпадку катаванні, але некаторыя навукоўцы падвяргаюць гэтую інфармацыю сумневу[51]. Падлічыць працягласць існавання вальдызму ў рэгіёне складана. Напрыклад, васьмідзесяцігадовая Коппе Сібе належала да секты з сямнаццаці гадоў, гэта значыць, яна ўступіла ў яе ўжо ў 1320-х гг.[52]; гэта ўскосна паказвае на самую раннюю вядомую дату з'яўлення вальдэнсаў на паўночным захадзе Польшчы. Варта адзначыць, што нават гэтая дата можа аказацца адносна позняй, таму што нямецкая калонія ў Шчэціне існавала з канца XII ст.[53], гэта значыць амаль на паўтара стагоддзя раней. Таму нельга сказаць, што "ўцекачы"-вальдэнсы былі першапраходцамі на невядомых землях. Мяркуючы па матэрыялах допытаў, яны маглі ў спакойнай абстаноўцы пераехаць у рэгіён усімі сем'ямі, часта да сваякоў і адзінаверцаў. У мясцовай абшчыне адзначаны вялікі працэнт удоваў, якім выдавалася матэрыяльная дапамога[54]. Па сацыяльным складзе вальдэнсы Памор'я – у асноўным сяляне і дробныя рамеснікі, звязаныя з сельскай гаспадаркай; а таксама наймiты: рабочыя, слугі, пастухі.

Рэканструяваць вераванні вальдэнсаў гэтага рэгіёну можна, па-першае, па згаданых вышэй пратаколах, а па-другое – па "Артыкулах секты вальдэнсаў", запісаных адначасова з працэсам Пятром Цвікерам і яго паплечнікам Марцінам Пражскім. Вальдэнсы традыцыйна адмаўлялі клятву

---

[48] Wattenbach, *Über die Inquisition*, 68.

[49] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*. [VII.v.e.2]

[50] Rymar, "Waldensi z «kacerskich» okolic Chojny," 9.

[51] Janusz Władysław Szymański, *Waldensi* (Goleniów: Oficyna Wydawnicza "Ston 2," 2015), 62.

[52] Rymar, "Waldensi z «kacerskich» okolic Chojny," 11.

[53] Gerard Labuda, *Historia Pomorza*, vol. 1. Do roku 1466. Cz. 2 (Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1969), 110.

[54] Szymański, *Waldensi*, 71.

і права свецкай улады на праліццё крыві (а часта і саму ўладу), іх "настаўнікі" прапаведавалі і прымалі споведзі, хоць і былі міранамі. Не надавалася аніякай каштоўнасці царкоўным "новаўвядзенням", такім, як індульгенцыі, паломніцтвы, бласлаўленне розных прадметаў, святарскія ўборы і ўпрыгожванне цэркваў і г. д. Безумоўна, адмаўляўся чысцец і неабходнасць клопату аб душах памерлых[55].

У адказах дапытаных няма сцвярджэнняў, якія карэнным чынам адыходзілі б ад асноўнай вальдэнскай дактрыны. У некаторых анкетах яны прама адмаўляюць веру ў Люцыфера і распусту[56].

Выразна прысутнічае падзел абшчыны на клерыкальнае ядро і шырокае кола вернікаў. Праўда, вера апошніх не была маналітнай. Многія з іх, напрыклад:

- ✠ працягвалі звяртацца па дапамогу да Багародзіцы і святых, хоць ведалі, што "настаўнікі" іх не ўхваляць[57];
- ✠ маліліся за душы памерлых[58];
- ✠ верылі ў сілу святой вады[59];
- ✠ "для выгляду" прымалі ўдзел у каталіцкіх набажэнствах[60] і нават шчыра хадзілі ў пілігрымкі[61].

Вера ў надзвычайную сілу асвечанай вады і ўвогуле зварот па дапамогу да звышнатуральных сілаў мае дачыненне не толькі да каталіцызму, але і да народнай магіі, што дазваляе аднесці гэтыя асаблівасці дактрыны заходнепаморскіх вальдэнсаў не да рэгіянальных адаптацыйных стратэгій, а да народнага хрысціянства. Станіслаў Быліна лічыць, што ўплыў народнага хрысціянства быў яшчэ мацнейшым, але інквізітары спрабавалі гэта схаваць[62].

Пры гэтым усе апытаныя прытрымліваліся асноўных прынцыпаў вальдэнсаў: адмаўляцца ад клятвы, не прызнаваць чысцец і асуджаць любое забойства. Цвёрдасць простых вернікаў была слабая, і падчас інквізіцыйнага працэсу яны часта раскайваліся і вярталіся (магчыма, няшчыра) ва ўлонне Каталіцкай Царквы.

Прычыны для распаўсюджвання вальдэнсаў у рэгіёне палягаюць у заняпадзе маральнасці сярод духавенства і агульным крызісе царкоў-

---

[55] Cegna, "Il valdismo medievale come religione penitenziale," 40–41 [VII.v.f]; Szymański, "*Articuli secte Waldensium*," 88. [VII.v.f]

[56] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 88, 132. [VII.v.e.2]

[57] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 80, 82, 85 і інш. [VII.v.e.2]

[58] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 86, 87 і інш. [VII.v.e.2]

[59] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 155 і інш. [VII.v.e.2]

[60] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 88, 113, 119 і інш. [VII.v.e.2]

[61] Szymański, *Waldensi*, 77.

[62] Bylina, *Ruchy heretyckie w średniowieczu*, 217.

най сістэмы[63]. Паміж шляхецкімі і патрыцыянскімі сем'ямі ішла барацьба за абацтвы, парафіі і нават біскупскія пасады з выкарыстаннем зброі і хабару. Людзі, якія займалі гэтыя пасады, часта вялі свецкі лад жыцця, часам распусны, а часам крымінальны[64]. Другой, не менш значнай, прычынай было распаўсюджанне на гэтых тэрыторыях так званага "тэўтонскага права", якое давала больш эканамічных свабод рэгіёну. Гэта, у сваю чаргу, прыводзіла да свабод рэлігійных[65]. Трэцяй прычынай было супрацьстаянне мясцовых знатных родаў, напрыклад, Вітэльсбахаў, з духавенствам[66], што яшчэ больш змяншала і без таго невысокі ўплыў Царквы.

Амаль усе вальдэнсы, пра якіх захаваліся звесткі, былі нямецкімі імігрантамі[67]. Выключэнне складаюць 4 чалавекі:

- ✠ вышэйзгаданая ткачыха Чусха (Свідніца);
- ✠ два вальдэнскія "настаўнікі"-"палякі" Ян і Мікалай[68]. Магдалена Агурэк лічыць, што яны паходзяць з Сілезіі[69];
- ✠ "маці Готслава, якая была славянкай"(muter Gotslawa que fuit Schlava) са спіса апытаных Цвікерам[70].

У дадзеным выпадку мы нават маем указанне на мову, на якой вяліся слуханні: у дакументах Цвікера захаваліся шаблоны адмоў на нямецкай мове, падрыхтаваныя для вальдэнсаў, якія раскаяліся[71].

Магчыма, у гэтым прычына нешматлікасці альбо нават адсутнасці вальдэнсаў на ўсходніх тэрыторыях – там было значна менш нямецкіх каланістаў[72]. Сярод іх саміх іншая вера магла стаць адным з механізмаў адзінства і супрацьстаяння варожаму асяроддзю. Як ужо згадвалася вышэй, да каталікоў ставіліся як да "чужых" (frömden)[73]. У сваю чаргу для каталікоў любое "дзівацтва" каланістаў было падставай для абвінавачванняў у ерасі. Аднак сучасныя польскія навукоўцы сцвярджаюць, што ў той перыяд ерасі ў прынцыпе не былі шырока распаўсюджаныя ў Польшчы[74].

---

[63] Rymar, "Waldensi z «kacerskich» okolic Chojny," 14; Wincenty Swoboda, "Waldensi na Pomorzu Zachodnim i w Nowej Marchii w świetle protokołów szczecińskiej inkwizycji z lat 1392–1394," in *Materialy Zachodniopomorskie*, vol. 19 (Szczecin: Muzeum Pomorza Zachodniego, 1973), pp. 493–509, 506.

[64] Labuda, *Historia Pomorza*, vol. 1. Cz. 2, 272.

[65] Cegna, "Idea wolności," 963.

[66] Swoboda, "Waldensi na Pomorzu Zachodnim," 507.

[67] Cegna, "Eresie e Movimenti Religiosi in Polonia e in Boemia-Moravia," 111.

[68] Döllinger, *Beiträge*, 367. [VII.v.a]

[69] Ogórek, "Świdniccy heretycy w 1315 roku," 146.

[70] Wattenbach, *Über die Inquisition*, 18.

[71] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 75–77. [VII.v.e.2]

[72] Regiewicz, *Wizerunek heretyka*, 41–42.

[73] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 74. [VII.v.e.2]

[74] Bylina, "Wizerunek heretyka w Polsce późnośredniowiecznej," 7; Jerzy Kłoczowski, *A History of Polish Christianity* (Cambridge: Cambridge University Press, 2000), 76; Regiewicz, *Wizerunek*

Падсумаваць гісторыю вальдызму на сучасных польскіх землях можна наступным чынам. Іх галоўным дагматам была адмова ад клятвы. Мяркуючы па 100% распаўсюджанасці гэтай тэзы ў адказах свідніцкіх вальдэнсаў, яна была вызначальнай для саміх вернікаў. Хутчэй за ўсё, менавіта паводле гэтага дагмату было праведзена адрозненне паміж "вядомымі людзьмі" (вальдэнсамі) і "чужымі". З іншага боку, роля данатызму была невялікай, бо ў XIV ст. вальдэнсы стварылі ўласную святарскую сістэму і не звярталі ўвагі на каталіцкіх святароў. Святары-вальдэнсы разглядаліся як "апосталы", г. зн. "святыя людзі", і пытанне аб іх грэшнасці ўвогуле не ставілася. Таінствы, якія здзяйснялі каталіцкія святары, прымаліся ў першую чаргу, каб адцягнуць увагу, і не ацэньваліся з пункту гледжання святасці, таму іх маглі здзяйсняць і грэшныя святары. У крыніцах практычна не згадваецца аўтарытэт Святога Пісання, навучанне пісьму або чытанне Бібліі, на якіх грунтавалася вучэнне вальдэнсаў у першыя дзесяцігоддзі руху. Вроцлаўскі пісар Стэфан быў адзіным выключэннем. Гэта сведчыць аб зніжэнні агульнага ўзроўню адукацыі сярод вальдэнсаў, асабліва сярод вернікаў Заходняга Памор'я.

Інквізіцыйны вышук звычайна пачынаўся праз 30 гадоў пасля з'яўлення вальдэнсаў у вызначаных рэгіёнах і праз 50–100 гадоў пасля прыбыцця туды каланістаў. Такі зрух у часе абумоўлены тым, што распачынанне судовага працэсу звязана не з дасягненнем пэўнай канцэнтрацыі ерэтыкоў у пэўным месцы, а з ініцыятывай біскупаў-князёў у Ніжняй Сілезіі і інквізітара Пятра Цвікера на Памор'і.



heretyka, 104; Szymański, *Ruchy heretyckie na Śląsku*, 17; Cegna, "Eresie e Movimenti Religiosi in Polonia e in Boemia-Moravia," 112.

Венгерскае Каралеўства

Дзейнасць вальдэнсаў на тэрыторыі Венгрыі, Славакіі і Трансільваніі вывучана надзвычай слаба. Нямецкі даследчык Г. Хаман вылучае тры прычыны гэтага:

1. Паводзіны саміх вальдэнсаў: яны ўсімі сіламі імкнуліся не вылучацца з навакольнага асяроддзя.

2. Інквізітары працавалі вельмі старанна і знішчылі самі сляды іх існавання.

3. Змяшэнне вальдэнсаў з гусітамі[1]: "вальдэнсы... у Венгрыі... пад... кіраўніцтвам караля Сігізмунда, які стаў каралём у 1386 годзе, ... нарэшце прынялі імя гусітаў"[2].

Самыя раннія згадкі пра вальдэнсаў на тэрыторыі Венгерскага Каралеўства дае Пасаўскі ананім, і датычацца яны тэрыторыі сённяшняй Славакіі, горада Дэвіна (цяпер фактычна прыгарад Браціслвы на шляху да Вены): адсюль паходзіць ерэсіярх Херамайстар. Па прафесіі ён быў рамеснікам – "вырабніком пальчатак". З іншага боку, гэта можна перакласці і як "той, хто носіць пальчаткі" – магчыма, ён прыняў "суцяшэнне" (consolamentum) па катарскім прынцыпе і да канца жыцця насіў пальчаткі, каб не парушыць забарону датыкацца да чалавека супрацьлеглага полу[3].

Ужо ў 1273 г. оламаўцкі біскуп Бруна піша, што ў сваёй дыяцэзіі ён нічога не чуў пра ерэтыкоў, а вось у Венгерскім Каралеўстве поўна ерэтыкоў і схізматыкаў[4]. У 1303 г. у хроніцы папскага легата ў Венгрыі ідзе гаворка пра "патарэнаў, якія насамрэч з'яўляюцца вальдэнсамі". Гэтыя людзі мелі сваіх святароў, не пасвечаных у Каталіцкай Царкве, якія былі публічна адлучаны ад Царквы не толькі на мясцовых імшах, але ўсім клірам краіны і самім Папам[5].

Вядомы лісты Папы Рымскага Яна XXII, датаваныя 1 кастрычнікам 1326 г. і 1 лютым 1327 г., у якіх ён просіць дамініканскага прыёра ў Венгрыі быць пільным, бо ў каралеўстве шмат ерэтыкоў "з Германіі і Польшчы". Копіі гэтых лістоў былі накіраваны Саламону, графу Брашова (сёння ў румынскай Трансільваніі), з просьбай дапамагчы інквізітарам[6].

---

[1] Hammann, "Waldenser in Ungarn," 429.
[2] Hammann, "Waldenser in Ungarn," 434
[3] Döllinger, *Beiträge*, 271. [IV.iv.b]
[4] Holinka, "Sektářství v Čechách," 40.
[5] Hammann, "Waldenser in Ungarn," 432.
[6] *Documente privind istoria României: C. Transilvania*, Veacul XIV, vol. 2: 1321–1330 (Bucureşti: Editura Academiei Republicii Populare Române, 1953), 201, 212–214, 384–385.

Вальдэнсы ва Усходняй Еўропе былі прадстаўлены пераважна нямецкімі каланістамі, у той час, як у акрэсленым рэгіёне адзначана вялікая колькасць перасяленцаў з Саксоніі[7]. У 1330 г. вальдэнсы заўважаны і ў Спішскім Градзе на тагачасным венгерска-польскім памежжы (сёння Славакія)[8]. Зусім не абавязкова, што гэтыя булы датычыліся менавіта вальдэнсаў. У гэты час ля паўднёвых межаў Венгерскага Каралеўства квітнела багамільская ерась, якая была нашмат больш далёкая ад асноў каталіцызму, чым вальдэнская, і ўяўляла большую пагрозу для Рыма. Таксама вялікую трывогу яшчэ Папы Інакенція III выклікала магчымая ерэтычная скіраванасць "Баснійскай Царквы"; гэтая трывога падагравалася венгерскімі каралямі з мэтай палітычнага падпарадкавання Босніі[9]. У пачатку XIV ст. Папскім Прастолам былі арганізаваны падтрыманыя венгерскімі каралямі крыжовыя паходы супраць багамілаў.

Самым паўнавартасным дакументам, які дайшоў да нас і апісвае вальдэнсаў у Венгерскім Каралеўстве, з'яўляецца справаздача пра судовы працэс над імі, праведзены Пятром Цвікерам і Марцінам Пражскім у венгерскай правінцыі Шопран зімой 1401 г., куды яны пераехалі пасля завяршэння вышуку ў Трнаве (таксама Славакія сёння) у верасні 1400 г. Віна вернікаў-вальдэнсаў, па іх асабістых прызнаннях, заключалася ў тым, што яны з-за пропаведзі "прышлых ерэсіярхаў" "сабе выдумалі і выбралі [у святары] добрых людзей і апосталаў вікарыяў Хрыста, аднак не пасвечаных прэсвітараў; Святую Дзеву і іншых нябесных святых не паважалі, іх малітваў, дабрачыннасцей і парад не прасілі, у чысцец пасля гэтага жыцця і заступніцтва Царквы за мёртвых не верылі"[10]. З тэксту прысуду вельмі выразна відаць метады працы Пятра Цвікера: прымусіць ерэтыкоў раскаяцца і адразу праявіць сваё раскаянне: рэгулярна ў малітвах у царкве (куды яны раней не хадзілі) у прысутнасці каталіцкага святара (якога яны раней не паважалі) заклікаць у дапамогу Дзеву Марыю і святых (якім яны раней не пакланяліся). З крыніцы вядома, што не было вынесена ніводнага смяротнага прысуду. Але, з іншага боку, пакаранне не было такім лёгкім: многія дамы вальдэнсаў былі разбураны, а ўсе былыя ерэтыкі аказваліся ў прыніжаным становішчы з-за блакітных крыжоў на вопратцы, якія адразу дэманстравалі грамадству іх нядобранадзейнасць. Паказальна, што крыжы нельга было здымаць пры пераездзе на іншае месца жыхарства, каб мясцовыя адразу паставіліся да былых ерэтыкоў з недаверам і не былі спакушаныя іх вучэннем.

---

[7] Mihai-Florin Hasan, "O privire asupra ereziei din Ungaria medievală: Cazul Transilvnean [Sec. XIV–XV]," accessed 06.11.2022, http://www.medievistica.ro/texte/discipline conexe/istoria bisericii/Erezia.htm.

[8] Ogórek, *Beginki i Waldensi*, 237.

[9] Gábor Barabás, "Heretics, Pirates, and Legates. The Bosnian Heresy, the Hungarian Kingdom, and the Popes in the Early 13th Century," *Specimina Nova Pars Prima Sectio Mediaevalis* 9 (2017): pp. 35–58, https://doi.org/10.15170/spmnnv.2017.09.02, 37.

[10] Haupt, *Waldensertum und Inquisition*, 114–116.

Пётр Цвікер у двух спісах былых вальдэнскіх "настаўнікаў" пералічвае чатыры імені: Сымон з Галіча[11], Готфрыд[12], Якуб з Буды (сталіца Венгерскага Каралеўства) і Пётр з Трансільваніі[13] (сённяшняя Румынія). Але магчыма, як і ў выпадку з двума "польскімі настаўнікамі", гэта не дакладная лакалізацыя, а спроба перанесці радзіму ерэсіярхаў на далёкі і варожы Усход.

Тут, у дыяцэзіі Вак, у 1404 г. і завяршылася кар'ера Пятра Цвікера як інквізітара[14]. Па іншых звестках, ён прысутнічаў на працэсах у Вене ў 1401 і 1404 гг. пасля вяртання з Венгрыі, а пасля знайшоў свой спачын у бенедыкцінскім кляштары Гарстэна[15].

Такім чынам, у XIII–XIV стст. рух вальдэнсаў ахапіў фактычна ўсю Заходнюю і Цэнтральную Еўропу ад Пірэнеяў да Карпатаў. Нераспаўсюджанасць яго на тэрыторыі Іберыйскага паўвострава можна патлумачыць спецыфічнай сітуацыяй, якая склалася там падчас Рэканкісты, калі менавіта Каталіцкая Царква ў звязцы з каралеўскай уладай стала кансалідуючай сілай у грамадстве. Мы маем прыклад, як кароль Арагона, калі толькі тэрыторыі з вальдэнсамі трапілі пад яго ўплыў, адразу забараняе гэтую секту[16].

Па меры распаўсюджання ў Еўропе вальдэнсы набываюць шэраг асаблівасцяў у веравучэнні, сацыяльным складзе і паводзінах. На іх аснове можна вылучыць пяць вялікіх рэгіёнаў: Лангедок і Бургундыя, паўночнаітальянскія гарады-камуны, горныя даліны Заходніх Альпаў, вольныя імперскія гарады на паўднёвым захадзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі (апісаныя ў папярэдняй главе) і Цэнтральная Еўропа.

У першым рэгіёне да ўсталявання ў ім моцнай каралеўскай адміністрацыі вальдэнсы на трэцім этапе свайго развіцця адчувалі сябе адносна разняволена. Яны супрацьпастаўлялі сябе не столькі Каталіцкай Царкве, колькі катарскаму руху (да другой чвэрці XIV ст. гэтыя дзве тэндэнцыі змяніліся на адваротныя). Для ўмацавання "сапраўднай евангельскай веры" настаўнікі-вальдэнсы шырока праводзілі еўхарыстычныя вячэры для сваіх вернікаў, актыўна і публічна прапаведавалі, карыстаючыся сваімі перакладамі Бібліі. Французскія "настаўнікі" не працавалі, а жылі з міласціны. "Дасканалага" вальдэнса з поўдня Францыі можна было вызначыць па яго абрэзаным зверху абутку і радыкальным адмаўленні гвалту.

Гісторыя "гарадскіх" паўночнаітальянскіх вальдэнсаў была цесна зніцявана з "камунальным рухам" у гэтых гарадах, а таксама з барацьбой

---

[11] Падрабязней пра лакалізацыю Галіча гл. Аляксандра Валодзіна і Мирослав Волощук, "Вальденський Магістр Symon de Galicz de Ungaria," Галич. Збірник наукових праць 8 (2023): 105–128.

[12] Döllinger, *Beiträge*, 367. [VII.v.a]

[13] Döllinger, *Beiträge*, 330. [VII.v.b]

[14] Modestin, "The Waldensians of Upper Austria," 172.

[15] Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 53.

[16] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 91. [I.iv.b–c]

паміж гвельфамі і гібелінамі, у якой вальдэнсы традыцыйна прымалі бок апошніх. Мясцовыя вернікі былі прадстаўленыя ў асноўным дробнымі гарадскімі рамеснікамі (пераважна ткачамі), у сваім веравучэнні настойвалі на неабходнасці працы сваімі рукамі. Італьянскія вальдэнсы ад пачатку актыўна выступалі супраць нізкага маральнага ўзроўню каталіцкіх святароў. Прычынай такіх асаблівасцяў стаў уплыў іншых ерэтычных рухаў, паслядоўнікі якіх пражывалі і вандравалі па гэтых гарадах. Імклівы эканамічны рост і суседства іншых рэлігійных рухаў напачатку спрыялі развіццю вальдызму і дазвалялі яго прыхільнікам быць незаўважнымі для ўладаў у XIII і пачатку XIV стст., але з узмацненнем супрацы паміж гарадской вярхушкай і інквізіцыяй цэнтр вальдэнскага руху перамясціўся ў цяжкадаступныя заходнеальпійскія даліны.

Гэты працэс пацягнуў за сабой трансфармацыю італьянскага вальдызму з гарадскога ў местачкова-вясковы. Невядома, ці былі ерэтыкі ў гэтых далінах да прыходу вальдэнсаў/вальдэнскіх вераванняў, але з XIII ст. яны распаўсюдзіліся настолькі шырока, што самі даліны сталі называцца "вальдэнскімі". Пры патуранні (а часам і прамым спрыянні) мясцовай знаці вальдэнсы аказвалі супраціў інквізітарам. Назіраўся пэўны "ерэтычны сінкрэтызм" – пранікненне ў вальдызм асобных катарскіх элементаў. Нягледзячы на жорсткі і крывавы пераслед з боку інквізітараў і каталіцкіх уладаў Савоі, цэнтр сучаснага вальдызму да гэтага часу размяшчаецца менавіта ў альпійскай даліне Пелічэ.

У Цэнтральную Еўропу вальдызм прыносяць нямецкія каланісты. Адпаведна вальдэнскае вучэнне распаўсюджваецца ў нямецкамоўным асяроддзі сярод імігрантаў з ніжэйшых пластоў грамадства, фактычна не закранаючы мясцовае насельніцтва. Вальдэнсы былі прадстаўлены ў асноўным дробнымі рамеснікамі і сялянамі. Вылучаецца сітуацыя ў Свідніцы, дзе сацыяльна-эканамічныя ўмовы былі блізкія хутчэй да ламбардскіх гарадоў-камунаў. Вальдэнсы-гараджане, у тым ліку і з вышэйшых слаёў грамадства, звязаных з гандлем, прапаведавалі ва ўмовах барацьбы паміж прапапскім біскупам, які знаходзіўся ў падпарадкаванні польскаму прымасу ў Гнезна, і нямецкай праімперскай гарадской вярхушкай. Ва ўсім рэгіёне адсутнічаюць звесткі пра жаночую пропаведзь і дэбаты па пытаннях веры з каталікамі ці неартадаксальнымі групамі, а таксама сведчанні пра высокі адукацыйны ўзровень "настаўнікаў". Прычына палягае ў тым, што з-за нераспаўсюджанасці на гэтых землях катарызму ў мясцовых вальдэнсаў не было неабходнасці ў спецыялізаванай тэалагічнай падрыхтоўцы. Вальдэнсы ўсяго рэгіёну рашуча трымаліся забароны клятвы, таму што іх сацыяльнае становішча не было настолькі высокім, каб залежаць ад яе прынясення, а, значыць, адмова ад яе прынясення не стала адаптацыйным механізмам, як у гарадах Свяшчэннай Рымскай Імперыі. Дактрынальнае адрозненне паміж "чэхамі" і "палякамі" праходзіць па лініі стаўлення да каталіцкага святарства: у той час, калі першыя былі строгімі данатыстамі,

апошнія карысталіся для ўсіх важных таінстваў паслугамі сваіх "настаўнікаў" і не акцэнтавалі ўвагі на маральным абліччы кліру.

Яшчэ адно адрозненне паміж сілезскімі, памеранскімі і чэшскімі вальдэнсамі палягае ў спосабах змагання з імі: калі ў Каралеўстве Багемія з ініцыятывай іх перасследу выступіла папская інквізіцыя, падтрыманая мясцовымі ўладамі, а ў Памераніі – вандроўны інквізітар Пётр Цвікер, то ў Сілезіі антывальдэнскія працэсы былі арганізаваныя мясцовымі біскупамі, якія сканцэнтравалі ў сваіх руках яшчэ і палітычную ўладу. Разгорнутыя пратаколы допытаў Пятра Цвікера з Заходняга Памор'я дазваляюць глыбей вывучыць вераванні вальдэнсаў, і нават вылучыць у іх элементы народнага хрысціянства.

Глава 4

Агульныя і рэгіянальныя рысы вучэння вальдэнсаў



Цэнтрам узнікнення і першапачатковага пашырэння вальдызму былі землі французска-"імперскага" памежжа на рубяжы XII–XIII стст. Веравучэнне, распаўсюджанае ў гэтым рэгіёне, рэпрэзентуе "класічны" варыянт вальдызму. У працэсе прыстасавання да мясцовых рэалій яго ідэі трансфармаваліся і дапаўняліся. Але нават улічваючы ўсе варыяцыі, можна прасачыць найбольш тыповыя рысы.

Сціслы выклад агульных палажэнняў веравучэння вальдэнсаў утрымлівае трактат "Пакуль людзі спяць" аўтарства Пятра Цвікера: падзел усіх вальдэнсаў на вандроўных "настаўнікаў" (спецыяльным чынам пасвечаных у сан мужчын (а часам і жанчын) высокай маральнай чысціні, якія спавядалі і прапаведавалі) і аселых "вернікаў" (якія маглі жыць сямейным жыццём і наведваць каталіцкую царкву). П. Цвікер называе тыповай слухачкай вальдэнса-прапаведніка "маленькую жанчыну", часта менавіта яна займалася пераваротам свайго мужа, бацькоў і дзяцей, а не сам "настаўнік". Па яго словах, вальдэнсы лічылі, што асаблівага ўшанавання заслугоўвае толькі Бог і адзіная вартая да яго малітва – "Ойча наш". З гэтага вынікае адмаўленне: культу Дзевы Марыі, святых (у тым ліку іх абразоў) і паломніцтваў да іх мошчаў; усіх іншых малітваў, царкоўных гадзін і спеваў; чыстца, малітваў за душы памерлых і царкоўных пахаванняў; індульгенцый і правамоцнасці царкоўных адлучэнняў. Яны ўспрымалі асвячэнне цэркваў, вады, свечак і іншага як бессэнсоўнае дзеянне, Каталіцкую Царкву лічылі прыстанкам граху з часоў Сільвестра, яе святароў – распуснікамі, п'яніцамі і прагнымі да грошай людзьмі. Агульнымі для большасці сярэднявечных вальдэнсаў былі данатызм, непрыняцце клятвы і мірская пропаведзь. Апісаная П. Цвікерам група вылучалася адсутнасцю адукацыі (магчыма, мелася на ўвазе, што яны не ведаюць лаціны, старажытнагрэчаскай і старажытнаяўрэйскай моў, а чытаюць Біблію на "народнай мове").

Неабходна яшчэ раз падкрэсліць, што нашы веды пра веравучэнне сярэднявечных вальдэнсаў у сваёй большасці паходзяць з твораў іх праціўнікаў. Скажэнне дадзеных магло ісці ў двух напрамках: акцэнтаваная розніца ў "ерэтычных" вучэннях магла быць палемічным прыёмам дэманстрацыі раз'яднанасці ерэтыкоў, а іх падабенства – тым, што інквізітары розных рэгіёнаў актыўна спісвалі адзін ў аднаго[1].

У рамках даследавання было прааналізавана 77 разнастайных крыніц (у 67-і з іх – прысутнічае апісанне хаця б аднаго элемента веравучэння), на аснове якіх была складзена наступная табліца.

---

[1] Cameron, *The European Reformation*, 76–77.

Табліца 4. Частата згадак элементаў дактрыны вальдэнсаў

Элемент дактрыны	**за**	**супраць**	**агулам**
Мірская пропаведзь	49	0	49
Прызнанне клятвы грахоўнай	37	3	40
Споведзь сваім "настаўнікам"	35	1	36
Прызнанне чыстца	0	34	34
Мэтазгоднасць клопату аб душах памерлых	0	34	34
Забарона праліцця крыві	32	1	33
Еўхарыстыя	28	3	31
Валоданне маёмасцю	2	22	24
Пакланенне святым дае плён	1	23	24
Нявартасць індульгенцый	23	1	24
Арыентаванасць на Біблію	23	0	23
Неабходнасць посту	10	13	23
Данатызм	21	1	22
Жаночая пропаведзь	20	2	22
Царкоўныя рытуалы	2	19	21
Царкоўныя таінствы (без канкрэтызацыі)	8	11	19
Святасць будынка царквы	1	16	17
Пакланенне абразам і крыжу	1	16	17
Праца рукамі	3	13	16
Падзел на сваіх і чужых	15	1	16
Абавязковасць хрышчэння немаўлят	6	10	16
Хрышчэнне ўвогуле	9	6	15
Адмаўленне свецкай улады	13	1	14
Паломніцтвы	1	11	12
Праца ў нядзелю	6	6	12
Дзявоцкасць Маці Божай	10	2	12
Сумеснае пражыванне жанчын і мужчын	9	1	10
Развод	9	1	10
Адмысловы "абрэзаны" абутак і адзенне	10	0	10
Прызнанне каталіцкіх артыкулаў веры	5	3	8
Некаталіцкія ўяўленні пра Хрыста	5	1	6
Пакутніцкая смерць	5	1	6
Традуцыянізм[1]	5	0	5
Цнатлівасць "настаўнікаў"	4	1	5

[1] Традуцыянізм – канцэпцыя Цертуліяна, згодна з якой душа дзіцяці фарміруецца з душаў бацькоў – супярэчыць крэацыянізму, што душа дзіцяці ствараецца Богам.

Агульныя рысы сярэднявечнага вальдызму

Мірская пропаведзь (у тым ліку жаночая)

Усупрацьстаянне з Рымскай Царквой вальдэнсы ўступаюць з-за сваёй прагі да мірской пропаведзі (на першым месцы з вялікім адрывам па частаце згадак, 49 – і ўсе станоўчыя). Царква сфарміравала вельмі дакладныя параметры таго, што магло лічыцца "правільнай" пропаведдзю:

A. Прапаведнік павінен падпарадкоўвацца рашэнням каталіцкіх святароў.

B. Прапаведнік можа дзейнічаць толькі па даручэнні царкоўнага іерарха, "быць пасланым".

C. Прапаведнік мусіць мець адпаведную адукацыю.

D. Прапаведнік павінен быў карыстацца "дапаможнай літаратурай" на лацінскай мове.

E. Прапаведнік – нежанаты мужчына.

F. Пропаведзі маглі праходзіць толькі публічна[2].

Як ужо было апісана вышэй, Вальдэс сваёй уласнай ініцыятывай "знізу" парушыў правіла B, адмовай падпарадкавацца забароне ліёнскага архібіскупа – A, біблейнымі перакладамі – D, дазволам прапаведаваць усім, не зважаючы на адукацыю, у тым ліку і жанчынам, – E і C.

Жан Ганэ абсалютна слушна сцвердзіў, што менавіта з-за свайго ўпартага імкнення да пропаведзі вальдэнсы сталі ерэтыкамі[3]. У канцы XII – пачатку XIII ст. і вальдэнсы, і каталікі, і катары – усе адстойвалі сваю пазіцыю ў адкрытых дыспутах і выступалі з пропаведзямі[4]. Пропаведзь у канцэпцыі Грыгорыя Вялікага ўспрымалася як "міласціна слова", што прывяло тэолагаў да ідэі "ачышчэння Царквы праз выратавальную пропаведзь"[5]. На такіх дыспутах абмяркоўваліся, у тым ліку, і пытанні падпарадкавання прэлатам, права на пропаведзь і інш., што бачна на прыкладзе дыспуту

---

[2] Kienzle, "Holiness and Obedience," 263.

[3] Giovanni Gonnet, "La prédication vaudoise à ses origines," in *La prédication sur un mode dissident: laïcs, femmes, hérétiques ... (XI.–XIV.) ; actes du 9. colloque du Centre d'Études Cathares/René Nelli, Couiza, 26–30 août 1996* (Carcassonne: Centre National d'Études Cathares, 1999), pp. 93–121.

[4] Claire Taylor, "«Heresy» in Quercy in the 1240s: Authorities and Audienses," in *Heresy in Medieval France: Dualism in Aquitaine and the Agenais, 1000–1249* (Farnham: Ashgate, 2013), pp. 239–256, 249–250.

[5] Buc, "Vox clamantis in deserto?," 10, 25.

ў Нарбоне, праведзенага паміж каталікамі і вальдэнсамі[1]. У абсалютнай большасці каталіцкія аўтары выступалі супраць дазволу міранам прапаведаваць. Такая забарона знайшла адлюстраванне, у тым ліку, у найбольш поўным зборніку кананічнага права сваёй эпохі – Дэкрэтах Грацыяна: "Жанчыне, якой бы яна ні была вучонай і святой, не дазваляецца навучаць мужчын на сходах. Мужчыну-міраніну таксама не дазваляецца навучаць у прысутнасці кліру, калі толькі яны самі настойліва не папросяць"[2]. Выключэнне складаюць толькі працы Пятра Кантара самага канца XII ст., дзе ён адкрыта выступае ў гэтым пытанні на баку вальдэнсаў[3].

Пашырэнне самога руху вальдэнсаў адбывалася дзякуючы актыўнай пропаведзі, на якую, як яны лічылі, іх паслаў сам Хрыстос: "і ходзячы, прапаведуйце, што наблізілася Царства Нябеснае" (Мф 10:7). Прычым пропаведзь гэта была цесна звязана з беднасцю: каб прапаведаваць, трэба было быць бедным, бо беднасць азначала свабоду ад маёмасці, грошай, спраў, сям'і, дома і прыхільнасцяў[4]. Так і Вальдэс распачаў свае казанні. "Прапаведуючы на вуліцах і перакрыжаваннях Евангеллі і тыя рэчы, якія ён завучыў на памяць, ён прыцягнуў да сябе шмат мужчын і жанчын, якія павінны былі рабіць тое самае, і ўмацоўваў іх у Евангеллі. Ён таксама пасылаў людзей нават самых нізкіх прафесій прапаведаваць у навакольных вёсках. Мужчыны і жанчыны разам, дурныя і неадукаваныя, разышоўшыся па вёсках і пранікаючы ў дамы, прапаведуючы на плошчах і нават у цэрквах, і заклікалі іншых рабіць тое ж самае"[5], – абурана піша Стэфан дэ Бурбон.

У справе пропаведзі выяўляецца выразная эвалюцыя: спачатку вальдэнсы прапаведавалі актыўна на вуліцах і нават у цэрквах, але з-за інквізітарскага пераследу паступова пераходзяць да таемных казанняў у дамах сваіх вернікаў: "Клірыкі іх [вальдэнсаў] пераследуюць, і таму не асмельваюцца прыходзіць адкрыта з-за клірыкаў, якія іх пераследуюць, але прыходзяць таемна, як Хрыстос прыходзіў[6]". У інквізітарскіх крыніцах XIV ст. назіраецца адмова вальдэнсаў у неспрыяльных знешніх умовах ад шырокай пропаведзі і дыспутаў (магчыма, з-за зніжэння агульнаадукацыйнага ўзроўню "настаўнікаў"). Тым не менш, пропаведзь (навучанне) сваіх вернікаў нароўні з прыняццем споведзі застаецца галоўным абавязкам вандроўнага настаўніка-вальдэнса.

Важна адзначыць, што ў той час, калі ў шырокай свядомасці канцэпцыя апостальства як "камунальнага", абшчыннага руху змянялася на больш

---

[1] Comba, *History of the Waldenses of Italy*, 47–51.

[2] "Decretum magistri Gratiani," Decretum Gratiani (Kirchenrechtssammlung), accessed 05.11.2022, https://geschichte.digitale-sammlungen.de/decretum-gratiani/online/angebot, 23:29.

[3] Buc, "Vox clamantis in deserto?," 44–46.

[4] Franco Giampiccoli and Carlo Papini, *L'eredità del valdismo medievale* (Torino: Claudiana, 1974), 5–7.

[5] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 209–210. [II.xiv.a]

[6] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 198. [IV.ii]

асабістую, "евангельскую"[7], больш інтраверсіўную "devotio moderna" (новую набожнасць), вальдызм заставаўся "апостальскім" у першасным, раннецаркоўным значэнні гэтага слова. Пётр Білер бачыць у таемных вандроўках вальдэнскіх "настаўнікаў" іх частку самаідэнтыфікацыі, суаднясення з апосталамі[8]. Не выключаючы такой магчымасці, я лічу, што гэта больш звязана з неабходнасцю падтрымліваць сувязі паміж вернікамі, якія ва ўмовах інквізіцыйнага пераследу былі вымушаныя жыць таемна на вялікіх прасторах і не мелі іншай магчымасці камунікацыі.

На раннім этапе сярод вальдэнсаў прапаведаваць дазвалялася і жанчынам[9] (у суме 20 згадак за і 2 супраць). У тагачасных лацінскіх крыніцах вальдэнскія прапаведніцы атрымліваюць назву "бедныя жанчыны" (mulieres pauperes) або "дурненькія жанчынкі" (mulierculae). Біблеісты бачаць у такім стаўленні процідзеянне навучанню сярод жанчын у ранняй Царкве[10]. Згадкі пра вальдэнскіх прапаведніц маюцца фактычна ў кожным раннім творы[11]. Праўда, праціўнікі вальдэнсаў сцвярджалі, што апошнія дазвалялі жанчынам не прапаведаваць, а хутчэй спакушаць, як Ева спакусіла Адама[12]. На маю думку, гэта звязана з тым, што для каталіцкіх палемістаў ідэалам з'яўлялася маўклівая Марыя (Божая Маці)[13]. Паказальна, што ў дадзеным пераліку крыніц няма менавіта вальдэнскіх; гэта значыць, што да нас не дайшлі звесткі, як самі вальдэнсы абгрунтоўвалі жаночае права на пропаведзь, ці было яно ў іх вачах увогуле роўным мужчынскаму. Магчыма, унутры абшчыны роля жанчыны ад пачатку ўспрымалася хутчэй як дапаможная. У лацінскай мове існуюць такія тэрміны, як уласна "прапаведаваць" (praedicare), так і "падбадзёрваць" (exhortare) і "даваць парады" (admonere). У прынцыпе, на сучасную беларускую мову мы можам перакласці ўсе тры як "прапаведаваць", але ў Сярэднявеччы першае мела нашмат больш моцную рэлігійную нагрузку і хутчэй успрымалася як "зарэзерваванае" за асобамі, якія мелі адмысловы дазвол, у той час як іншыя два маглі дапускацца і для астатніх. У сваім "статуце" Дуранд з Оскі выка-

---

[7] Giles Constable, "Renewal and Reform in Religious Life: Concepts and Realities," in *Renaissance and Renewal in the Twelfth Century* (Cambridge, MA: Harvard University Press, 1982), pp. 37–67, 55.

[8] Biller, "Heretics Doing Things Secretly," 22.

[9] Падрабязней гл. Mick-Evans, "A Bastion"; Shahar, *Women.*

[10] Beverly Mayne Kienzle, "The Prostitute-Preacher: Patterns of Polemic against Medieval Waldensian Women Preachers," in *Women Preachers and Prophets through Two Millennia of Christianity* (Berkeley: University of California Press, 1998), pp. 99–113, 101.

[11] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 80–81 [II.ii], 100 [II.viii], 104 [II.v], 155 [II.vii], 165 [II.x]; Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 141 [II.xvii], 158 [V.ii]; PL 216:292 [I.ii.c.96]; Patschovsky and Selge, *Quellen*, 76 [V.i.D]; "Burchardi et Cuonradi Urspergensium Chronicon," 376 [I.viii.b].

[12] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 158 [V.ii]; Jones, The History of the Waldenses, 25.

[13] Kienzle, "The Prostitute-Preacher," 103, 105.

рыстоўвае "exhortare" для апісання сваіх намераў прапаведаваць[14]. Пётр Кантар у сваёй абароне свецкай пропаведзі карыстаецца апошнімі двума тэрмінамі[15]. А каталіцкія аўтары ў сваіх абвінавачваннях у адрас вальдэнсаў абіраюць першы тэрмін. Гэта дазваляе выказаць гіпотэзу, што вальдэнсы зусім не абавязкова дазвалялі сваім жанчынам прапаведаваць у найбольш радыкальным значэнні гэтага слова[16]; каталіцкія ж палемісты імкнуліся падкрэсліць маштаб ерэтычнай праблемы і ўзмацніць свае нападкі.

Роля жанчыны

Узрастанне ролі жанчын у рэлігійных рухах спачатку назіраецца ў катарстве[17], а таксама ў руху т. зв. "бегінак", а да пачатку XIII ст. набывае распаўсюджанне і ў вальдэнсаў[18], бо для жанчын ерась – трэці шлях самарэалізацыі (па-за сямейным жыццём і кляштарам)[19]. У цэлым ў Лангедоку і вакольных тэрыторыях стаўленне да жанчыны было лепшым, чым у астатнім заходнееўрапейскім свеце[20], таму лагічна, што масавая жаночая пропаведзь знаходзіць прыхільнікаў менавіта на поўдні Францыі і прылеглых рэгіёнах. Наогул, узаемаадносіны жанчын і Біблії ў Сярэднявеччы даследуюцца ў большасці на падставе звестак пра вальдэнак[21]. Актыўных жанчын сярод вальдэнсаў было нават больш, чым сярод катараў[22].

Прыкладна праз 50–70 гадоў сітуацыя змяняецца, і мы хутчэй сустракаем жанчын-вальдэнак (не проста верніц, а "пасвечаных") або ў сваіх дамах[23], або ў "гаспіцыях"-прытулках, але не ў вандроўцы[24]. У некаторых рэгіёнах існавала асобная працэдура для "пасвячэння" жанчын, яны мелі права не толькі прапаведаваць, але і здзяйсняць еўхарстыю[25]. У 1323 г. сярод захопленых ерэтыкоў у Лангедоку "дасканалай" была толькі адна

---

[14] PL 215:1513, 216:29–30, 275, 601. [I.ii.b]

[15] Buc, "Vox clamantis in deserto?," 45.

[16] Напрыклад, мы маем дакладныя звесткі пра жанчыну, якая чытала Евангелле ад Яна хворым сяброўкам (Patschovsky and Selge, *Quellen*, 63). [III.i.g]

[17] Kienzle, "Religious Poverty", 39–53; Müller, *Frauen vor der Inquisition: Lebensform, Glaubenszeugnis und Aburteilung der Deutschen und Französischen Katharinnen* (Mainz: P. von Zabern, 1996), 24.

[18] Beverly Mayne Kienzle, *Cistercians, Heresy, and Crusade in Occitania, 1145–1229: Preaching in the Lord's Vineyard* (Woodbridge: York Medieval Press, 2001), 205.

[19] Dinora Corsi, "«Interrogata dixit»: le eretiche nei processi italiani dell'inquisizione (secolo XIII)," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 194 (2004): pp. 73–98, 75.

[20] John H. Arnold, *"Heresy and Gender in the Middle Ages,"* Oxford Handbooks Online, August 27, 2015, https://www.academia.edu/15222947/Heresy_and_Gender_in_the_Middle_Ages, 3.

[21] Benedetti, "The Bible, Women Heretics, and Inquisitors," 85.

[22] Biller, "Through a Glass Darkly," 359.

[23] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 58–59. [III.i.d]

[24] Marina Benedetti, "La repressione delle parole: la predicazione delle donne valdesi," *Clio a. Crimen* 1 (2004): pp. 165–188, 167.

[25] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 246–247 [III.vi.3]; Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 14 [II.iii]; 16 [II.vii]; 110 [II.xv]; 186 [III.iii].

жанчына, Раймунда дэ Кастрыс[26]. Між тым, абсалютна памылковым з'яўляецца суаднясенне колькасці захаваных звестак пра вальдэнак-прапаведніц з маштабам з'явы, асабліва калі гаворка ідзе пра рэчы, якія самі ўдзельнікі імкнуліся схаваць ад чужых вачэй[27]. Тут жа трэба дадаць, што ў лацінскай мове, калі гаворка ідзе пра дзеянні прадстаўнікоў абодвух полаў адначасова, ужываецца мужчынскі род. Такім чынам, вальдэнкі ў лацінамоўных дакументах маглі быць "схаванымі за спінамі мужчынаў" ад вачэй чытачоў[28].

Дакладныя прычыны знікнення вандроўнай жаночай пропаведзі невядомыя. Хутчэй за ўсё, па меры ўсталявання зладжанай структуры ўнутры секты за прыклад была ўзята раннехрысціянская абшчына, дзе не сустракаюцца жанчыны-святары. Да таго ж з узмацненнем інквізітарскага пераследу вандроўныя адзінокія жанчыны (або жанчына з мужчынам) выклікалі больш падазрэнняў з боку ўлад. Нельга забывацца і на небяспеку такіх падарожжаў, асабліва на вялікія адлегласці – маштаб перамяшчэння пашыраўся разам з пашырэннем самога руху. Цяжка пераацаніць ролю жанчын у вальдэнскім руху – часцей за ўсё ў ролі "верніц" і "слухачак" выступалі менавіта яны, але кіруючай ролі ніколі не адыгрывалі[29].

Чалавек, які жыў у шлюбе, не можа стаць "настаўнікам" – ён/яна павінен/павінна пакінуць сваю жонку/мужа перад канчатковым уступленнем у секту. У адной з крыніц, а менавіта ў прызнанні вальдэнскага дыякана Раймунда дэ ла Косты, знаходзіцца самае радыкальнае меркаванне адносна гэтага: "Таксама, што яны ні пры якіх абставінах не прымаюць цнатлівых дзяўчын або жанчын, бо яны не могуць ні прапаведаваць, ні станавіцца дыяканамі; таксама не прымаюць тых, хто быў жанаты, з-за небяспекі, што яны будуць не ў стане жыць у чысціні і ўстрыманні"[30]. Тады ж адначасова з Раймундам быў дапытаны вальдэнс Ян з В'ена і яго жонка Угуэта, названая ў дакуменце "дасканалай ерэтычкай" (haeretica perfectae)[31], што відавочна не стасуецца з папярэднім сцвярджэннем. Таксама ў гэтай жа калекцыі дакументаў сустракаецца інфармацыя пра яшчэ дзвюх жанчын, якія былі ў выніку спаленыя на вогнішчы. Але мы не ведаем, ці былі яны проста верніцамі ці кімсьці большым[32].

Жанчына ў вальдызме ніколі не мела роўных правоў з мужчынам, але дакладна яе роля была вышэйшай, чым у каталіцтве. Паступова сітуацыя змянілася ў бок прыпадабнення да традыцый Рымскай Царквы[33]. Разам

---

[26] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 623. [III.v]

[27] Peter Biller, "The Waldenses 1300–1500," *Revue de l'histoire des Religions* 217, no. 1 (2000): pp. 75–99, https://doi.org/10.3406/rhr.2000.1072, 90.

[28] Jörg Feuchter, "Waldenserinnen im Mittelalter," in *Zur Geistesgeschichte des Mittelalters und der frühen Neuzeit* (Heidelberg: Verlag Regionalkultur, 2003), pp. 47–68, 54.

[29] Arnold, "Heresy and Gender in the Middle Ages," 12.

[30] Döllinger, *Beiträge*, 131. [III.iv.a]

[31] Döllinger, *Beiträge*, 144.

[32] Feuchter, "Waldenserinnen im Mittelalter," 61.

[33] Lutz Kaelber, "Other- and Inner-Worldly Asceticism in Medieval Waldensianism: A Weberian Analysis," *Sociology of Religion* 56, no. 2 (1995): pp. 91–119, https://doi.org/10.2307/3711758, 104.

з тым узрастае роля і колькасць жанчын сярод аселых вернікаў: менавіта яны часцей за ўсё становяцца ініцыятаркамі прыняцця ў доме вандроўнага прапаведніка.

Святарства міран: еўхарыстыя і споведзь

Значнае месца ў любым інквізіцыйным допыце займае пытанне аб тым, хто мае права здзяйсняць розныя царкоўныя таінствы і абрады, і асабліва еўхарыстыю (31 згадка, з іх 28 – за права саміх вальдэнсаў і толькі 3 – супраць) і прымаць споведзь (36 згадак). Ужо з пачатку руху вальдэнсы настойвалі, што яны "маглі асвячаць Цела Гасподняе, нават калі не былі пасвечаныя ў святары паводле царкоўнага абраду"[34], бо "ёсць таксама іншыя асобы, пасвечаныя і Богам, і людзьмі, калі святары, пасвечаныя людзьмі, таксама трымаюцца Боскіх загадаў, бо Бог не прыслухоўваецца да грэшнікаў"[35]. Разам з тым шматкроць адзначаецца, што добрым чалавекам можа быць і каталіцкі святар – яркае адрозненне "французаў" ад больш радыкальных у гэтым пытанні "італьянцаў".

Неабходна падкрэсліць, па-першае, што ў ранняй Царкве, прыкладна да VII ст., слухаць споведзі і накладаць пакаянні маглі не толькі святары, але і проста харызматычныя мужчыны і жанчыны[36]. Між тым сярод вальдэнсаў споведзь жанчынам, у адрозненне ад жаночай пропаведзі, фактычна не сустракаецца і часам нават прама забараняецца[37]. Невядома, ці ведалі вальдэнсы ўвогуле пра такую асаблівасць ранняй Царквы.

Па-другое, цікавасць вальдэнсаў да споведзі расла разам з павышэннем цікавасці Царквы да яе[38]. Гэта дазваляе выказаць наступнае меркаванне: паколькі большасць крыніц па гісторыі вальдэнсаў, якія мы маем, паходзяць з "каталіцкага" асяроддзя, то гэта не вальдэнсы былі сканцэнтраваныя на споведзі, а пра яе проста больш настойліва пыталіся інквізітары і пісалі палемісты.

У вальдэнсаў існаваў звычай супольнай вячэры, якая імітавала Вялікую Вячэру Ісуса[39], распачаты яшчэ ў першае дзесяцігоддзе XIII ст.: "ужывалі хлеб і рыбу на Вячэру згодна з праклятым сваім звычаем па дабраславенні вальдэнсаў ... бо верылі, што вальдэнсы так асвячаюць Цела Гасподняе"[40]. Але гэта не замена еўхарыстыі, гэта хутчэй нагадвае распаўсюджаную цяпер традыцыю бласлаўлення самай рознай ежы, бо яе потым прыносілі

---

[34] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 66. [III.i.h]
[35] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 348–349. [II.xiv.b]
[36] Rob Meens, *Penance in Medieval Europe, 600–1200* (Cambridge: Cambridge University Press, 2014), 224.
[37] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 30. [I.vii]
[38] Meens, *Penance in Medieval Europe*, 191–215.
[39] Döllinger, *Beiträge*, 130. [III.iv.a]
[40] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 50–54. [III.i.a]

дадому і размяркоўвалі паміж членамі сям'і[41]. У той жа час права грэшных святароў праводзіць еўхарыстыю (і ўвогуле любое царкоўнае таінства) аспрэчваецца: "ні нячысты не можа іншых ачысціць, ні звязаны іншых развязаць[42], ні вінаваты не можа судзіць іншага вінаватага, каб супакоіць свой гнеў, ні тыя, хто заблукаў, не могуць вывесці іншых на неба"[43]. Элементы данатызму ў той ці іншай ступені прасочваюцца ва ўсіх ерэтычных рухаў, у тым ліку патарэнаў і вальдэнсаў[44]. З часам італьянскія вальдэнсы перайшлі на духоўнае прыняцце еўхарыстыі, без непасрэднага ўжывання хлеба і віна[45].

Першымі праводзіць менавіта еўхарыстыю "ў хатніх умовах" сваімі сіламі пачалі "бедныя ізноў далучаныя" і "бедныя духам", якія дзейнічалі ў рэгіёнах вялікага распаўсюджання катарызму. Такі захад для гэтых груп азначаў барацьбу з катарамі, а не з Каталіцкай Царквой.

Ламбардскія вальдэнсы прызначалі сваіх святароў для здзяйснення еўхарыстыі: "Святара, узведзенага ў сан свяшчэннаслужыцеля па прызначэнні Хрыста"[46]; ультрамантанаў жа задавальняў каталіцкі клір: "Святар, узведзены ў сан Рымскай Царквой, ... калі возьме хлеб і віно і блаславіць іх у памяць Цела і Крыві Гасподняй, мы верым, што пасля бласлаўлення ад яго слоў стане Цела і Кроў Гасподня"[47]. У прынцыпе, такі погляд "бедных з Ліёна" цалкам натуральны, бо трэба памятаць, што Вальдэс да апошніх сваіх дзён лічыў сябе сапраўдным каталіком – нездарма ж ён хадзіў у Рым. Праўда, ужо тут прысутнічае агаворка пра падтрымку святара яго паствай, што ўказвае на адгалоскі данатызму і збліжае вальдэнсаў з арнальдыстамі (італьянскія ерэтыкі XII ст., змагаліся за чысціню Каталіцкай Царквы).

Акурат адносіны да права грэшных святароў на здзяйсненне таінстваў канчаткова падзяліла "ўльтрамантанаў" ("французаў") і "ламбардцаў" ("італьянцаў"). Пазіцыя ламбардцаў была цвёрдай: "Гасподзь не прымае імшаў зладзеяў і не слухае іх малітвы". І, як ужо адзначалася, ламбардцы прызначалі сваіх святароў (хутчэй за ўсё, менавіта для здзяйснення еўхарыстыі), што можна лічыць першым крокам да стварэння сваёй Царквы. Ансельм Александрыйскі пацвярджае і пашырае такую думку, даючы разгорнутую характарыстыку "вальдэнскіх" ламбардскіх святароў: "ніякі дрэнны святар не можа бласлаўляць, аднак вераць, што добры можа хрысціць і даваць добрыя парады. Адтуль тое, што мы называем «накласці пакаянне», яны называюць – «даць добрую параду». Таксама сказаў, што не вераць у

---

[41] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 61. [III.i.e]

[42] "Вязаць і развязваць" абазначае права святара адпускаць грахі і накладаць адлучэнні.

[43] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 251–252. [III.vi.6]

[44] Andrea Sossi, *Medioevo valdese, 1173–1315: Paupertas, Eucarestia e Predicazione: tra identità minoritaria e rappresentazione cifrata del rapporto tra l'uomo e l'Assoluto* (Trento: UNI Service, 2010), 146.

[45] Döllinger, *Beiträge*, 360–361. [V.iii.b]

[46] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 37. [I.vii]

[47] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 35–37. [I.vii]

тое, у што лiёнцы вераць, што дрэнны святар можа даваць апошняе мірапамазанне. Таксама іх святары і біскуп уступаюць у сан праз накладанне рук. Таксама не вераць у царкоўныя чыны, маюць свае ўласныя. Таксама абутыя ў сандалі сярод іх, якія называюцца святарамі, носяць адну доўгую туніку і ходзяць босымі або абутымі ў адкрытыя зверху сандалі. ... Таксама не робяць ніякіх пасвячэнняў ці ўсталяванняў"[48].

Адным з галоўных абавязкаў вальдэнсаў-святароў было прыманне споведзі, дзе яны складалі значную канкурэнцыю каталіцкім святарам, бо "няма неабходнасці чалавеку спавядаць свае грахі святару, калі побач ёсць міранін, якому можна спавядацца"[49]: "настаўнікі" працягвалі лічыцца міранамі, хоць і маглі прымаць пакаянні[50]. У вальдэнскіх вернікаў часта практыкавалася двайная споведзь: вандроўным "настаўнікам" і мясцоваму каталіцкаму святару. Першы раз споведзь "настаўніку" адбывалася звычайна ва ўзросце 12-і гадоў[51]. У той жа час "настаўнікі" прама не давалі міранам адпушчэння грахоў: апошні суд заўсёды пакідаецца за Богам. Бернард Гі пераказвае формулу адпушчэння грахоў наступным чынам: "Бог адпускае табе твае грахі; я са свайго боку заклінаю цябе раскаяцца і панесці тое пакаранне, якое я табе зараз прадпісваю". І пакаранне гэта заключалася ў посце і малітве[52]. Пост мог быць як на хлебе і вадзе, так на хлебе і піве (у Памор'і)[53], у якасці малітвы выкарыстоўвалася толькі "Ойча наш", якая павінна была чытацца вызначаную колькасць разоў у будні і звычайна падвойную колькасць па нядзелях.

Па словах "Кнігі Выбраных" (кароткага пераказу гісторыі вальдэнсаў), права на святарства тыя атрымліваюць прама ад апосталаў. Гэтае павер'е пашыраецца сярод усіх нямецка- і італамоўных вальдэнсаў з невялікімі выключэннямі. Кунігунда Штрусін са Страсбурга і яе дочкі ў 1390-я гг. усё яшчэ сцвярджалі, што вальдэнскі рух паходзіць ад Вальдэса, а не ад апосталаў[54].

Шлюб і развод

Пытанне магчымасці шлюбу і разводу сустракаецца ўжо ў Рэскрыпце 1218 г. Насуперак пазіцыі Рымскай Царквы абедзве галіны дапускалі развод у выпадках распусты ці ўзаемнай згоды, "бедныя з Лiёна" ж лічылі дастаткова важкім аргументам пункт гледжання абшчыны. Сальва Бурчы ў сваю чаргу сцвярджае, што развод дзеля далучэння да руху быў прымусо-

---

[48] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 142. [II.xvii.12]
[49] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 109. [II.v]
[50] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 204. [VI.ii.b]
[51] Cegna, "Eresie e Movimenti Religiosi in Polonia e in Boemia-Moravia," 49.
[52] Comba, *Storia dei valdesi*, 54.
[53] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 79–80, 119–120. [VII.v.e.2]
[54] Herzog, *Die romanischen Waldenser*, 112.

вым: "... і таму вы дагэтуль аддзяляеце мужа ад жонкі супраць волі мужа, і наадварот"[55].

З іншага боку, абмеркаванне пытанняў разводу дае падставу сцвярджаць, што большасць ламбардцаў жыла сямейным жыццём, цэлібат быў выбарам асобных членаў секты. Вядома, што палавыя сувязі прызнаваў яшчэ Вальдэс у сваёй споведзі 1180 г.[56]

Дазвол сямейнага жыцця, безумоўна, даваў магчымасць "бедным ламбардцам" мацней уплываць на прыхільнікаў і выклікаць больш сімпатый у шырокіх мас. Тым больш што гэта адпавядала іх завядзёнцы абшчыннага жыцця і працы. А таксама спрыяла больш хуткаму станаўленню арганізацыі.

Пры крышталізацыі структуры вальдэнскай абшчыны мы сустракаемся з увядзеннем цэлібату для вандроўных "настаўнікаў": калі яны мелі жонак, то павінны былі іх пакінуць перад прыняццем пасвячэння. У чатырох крыніцах пазначана нават патрабаванне абсалютнай цнатлівасці для "дасканалых": сведчанні Раймунда дэ Коста[57], авіньёнскім пратаколе дапытанага вальдэнса канца XIV ст.[58], прызнанні аднаго з апытаных з Багеміі 1330-х[59] і дакуменце аўтарства Пятра Цвікера[60]. Адначасова зафіксавана сведчанне Майнцкай хронікі па антывальдэнскай справе 1390 г., што "ніякі святар не можа асвячаць Цела Хрыстова, але толькі жанаты чалавек з іх секты можа такое рабіць"[61]. У апошнім выпадку найбольш верагодным уяўляецца спроба апаганіць вобраз вальдэнскага прапаведніка ў параўнанні са цнатлівым каталіцкім святаром.

Непрыняцце гвалту

Першая згадка гэтага элемента дактрыны вальдэнсаў знаходзіцца ў трактаце знакамітага Алана Лільскага, дзе ён апісвае сцвярджэнне вальдэнсаў пра тое, што чалавек не можа быць забіты "ні ў якім разе і ні па якой прычыне, ні на якой падставе"[62]. Праз 300 гадоў дапытаны вальдэнс з Памор'я "не верыў, што нават злачынцаў можна забіваць без граху"[63]. Магчыма, каталізатарам развіцця ў вальдэнсаў такога ўяўлення выступілі катары (хоць і абгрунтаванне гэтай забароны ў іх абсалютна рознае[64]), з

[55] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 74. [II.xi]
[56] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 35. [I.ii.a]
[57] Döllinger, *Beiträge*, 131. [III.iv.a]
[58] Antoine Dondaine and Yves Dossat, *Les hérésies et l'inquisition, XIIe – XIIIe siècles: documents et études* (Aldershot: Variorum, 1990), 274–275. [II.xviii]
[59] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 250. [VI.ii.b]
[60] Döllinger, *Beiträge*, 368. [VII.v.a]
[61] *Chronicon Moguntinum* (Hannoverae: Hahn, 1885), 63. [V.iv.b]
[62] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 115. [II.v]
[63] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 173. [VII.v.e.2]
[64] Giovanni Scuderi, "I fondamenti teologici della non violenza nel valdismo anteriore al XVI secolo," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 129, no. 92 (1971): pp. 3–14, 13.

якімі вальдэнсы распачынаюць палемізаваць прыкладна ў 1180 г.[65] З іншага боку, на дадзены момант не знойдзена сведчанняў, што катары прытрымліваліся гэтага дагмату раней за вальдэнсаў. Алан Лільскі, адзін з самых ранніх аўтараў, які піша пра катараў і вальдэнсаў, згадвае пра непрыняцце гвалту апошнімі, а датычна ж першых такія звесткі ў яго адсутнічаюць[66]. Таму існуе верагоднасць, што вальдэнсы развілі гэты элемент дактрыны незалежна ад катараў або нават самі паўплывалі на іх.

Пазней інквізітары іранічна адзначалі, што ерэтыкі выступаюць супраць права свецкай улады на гвалт, каб самім не быць спаленымі[67].

У адмаўленні смяротнага пакарання вальдэнсы не так далёка адышлі ад Каталіцкай Царквы часоў грыгарыянскай рэформы, калі Папа Аляксандр II (1061–1073 гг.) пісаў у лісце да архібіскупа Нарбоны: "і царкоўныя законы, і грамадзянскія забараняюць праліццё чалавечай крыві"[68].

Некаторыя даследчыкі бачаць у выказваннях вальдэнсаў не толькі адмаўленне аўтарытэту пануючай Царквы, але і свецкай улады[69]. Пра гэта прама пішуць Сальва Бурчы[70], Манета Крэмонскі[71] і інквізітары Пётр Цвікер з Марцінам Пражскім, складаючы пералік вальдэнскіх памылак[72]. Але ў трактаце "De vita" сцвярджаецца, што, наадварот, вальдэнсы "моляцца за каралёў, князёў і губернатараў, каб Бог іх наставіў такім чынам кіраваць светам, каб было ўсё для Яго славы і выратавання"[73]. Праўда, такі выпадак – толькі адзін, калі не лічыць пакаянных лістоў Дуранда з Оскі і Бернарда Прыма.

Цікавую заўвагу пакідае Стэфан дэ Бурбон: "[вальдэнсы] ставяцца як да забойцаў і знішчальнікаў душаў да тых, хто прапаведуе вайну"[74], што пераклікаецца з амаль аналагічным і адначасовым выказваннем Пасаўскага ананіма. Адмова ад клятвы і гвалту звязаны між сабой супрацьпастаўленнем існуючаму парадку, сакралізацыі імператарскай улады[75]. Адмаўленне саслоўнай структуры сустракаецца (як і, дарэчы, максімальнае набліжэнне беднасці добраахвотнай да беднасці рэальнай), акрамя ерэтыкоў, у Францыска Асізскага. Гэты барацьбіт за ўсеагульны мір (нездарма дэвізам ордэна і па сёння з'яўляецца "мір і дабро" (pax et bonum)) выступаў за згоду паміж саслоўямі, проціпастаўляючы ім "братоў-мінарытаў" (fratres minores). Апошнія ўяўляліся хутчэй не як асобнае саслоўе, а як асаблівы лад жыцця, які палягае ў прызнанні адносным існавання ўсіх саслоўяў і

---

[65] Selge, *Die ersten Waldenser*, vol. 1, 156–157.
[66] Peter Biller, *The Waldenses*, 1170–1530, 81.
[67] Holinka, "Sektářství v Čechách," 71.
[68] Giampiccoli and Papini, *L'eredità del valdismo medievale*, 49.
[69] Molnár, *Storia dei valdesi*, 79.
[70] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 71. [II.xi]
[71] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 87. [II.xiii]
[72] Szymański, "*Articuli secte Waldensium*," 88. [VII.v.f]
[73] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 180. [III.vii]
[74] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 105. [II.xiv]
[75] Scuderi, "I fondamenti teologici della non violenza nel valdismo," 4, 14.

прынцыпова ставіць пад сумненне ўсё саслоўнае грамадства – пры тым, што дапускае яго існаванне[76]. І адпаведна са сваёй мірнай канцэпцыяй Францыск не нападае ні на няверных, ні на ерэтыкоў, што было незвычайна і незразумела для той эпохі.

Такім чынам, тэзіс пра недапушчэнне гвалту, нават па судзе, пастаянна прысутнічаў у вальдызме розных рэгіёнаў, без выключэння. Разам з тым тэорыя часам разыходзілася з практыкай, што падрабязна разгледжана ніжэй (*у раздзеле "Права на здзяйсненне гвалту ў мэтах самаабароны"*).

Чысцец

Адмаўленне "агню чыстца" і звязаных з гэтым розных клопатаў пра душы памерлых сустракаецца сярод вальдэнсаў паўсюдна (34 згадкі). Логіка выглядае наступным чынам[77]: паколькі "душа, якая выйшла з цела, ідзе напрамкі на неба ці ў пекла", то "міласціна, пасты, правядзенне імшы і іншыя малітвы жывых не прыносяць карысці верным, якія ўжо памерлі"[78], бо іх шлях ужо прадвызначаны добрымі ці дрэннымі справамі на зямлі. У розныя часы ў розных мясцовасцях з гэтага будуць зроблены высновы пра частковае або поўнае адмаўленне пастоў-малітваў-міласціны і г. д., або пра іх карысць толькі непасрэдна для тых, хто іх робіць, або пра адмаўленне/прыняцце гэтых пунктаў у самых розных камбінацыях, але выразна чысцец не прызнае ніхто з вальдэнсаў. Наадварот, інтэнсіўнасць адмаўлення чыстца ўзрастае прама прапарцыйна распрацоўцы дагмату чыстца каталіцкімі тэолагамі[79]: у сваю чаргу сам клір настойваў і развіваў гэта вучэнне насуперак ерэтычным рухам[80]. Не падобна, каб самі вальдэнсы надавалі свайму адмаўленню чыстца вялікае значэнне. Хутчэй, гэта падкрэслівалі інквізітары, якія бачылі ў гэтым найцяжэйшы грэх[81].

Разам з тым варта адзначыць яшчэ раз, што адмаўленне чыстца не было выключна вальдэнскай рысай. На падставе аднаго толькі гэтага тэзіса немагчыма зрабіць выснову пра прыналежнасць таго ці іншага ерэтычнага прызнання да вальдызму.

Пытанне з шанаваннем святых і просьбай іх заступніцтва больш неадназначнае, чым з іншымі клопатамі аб душах памерлых[82]. Адна і тая ж

---

[76] Эксле, *Действительность и знание*, 174.

[77] Прычыны такога адмаўлення маглі адрознівацца ў розных рэгіёнах, больш падрабязна гл.: Bylina, *Ruchy heretyckie w średniowieczu*, 207–209.

[78] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 210–213.

[79] Kathrin Utz Tremp, "'Parmi les hérétiques…': la Vierge Marie dans le registre d'inquisition de L'évêque Jacques Fournier de Pamiers (1317–1326)," in *Marie. Le culte de la Vierge dans la société médiévale* (Paris: Beauchesne, 1996), pp. 533–560, 537.

[80] Жак Ле Гофф, *Рождение чистилища* (Москва: АСТ, 2009), http://www.e-reading.club/bookreader.php/1034038/Goff_-_Rozhdenie_Chistilischa.html.

[81] Bylina, *Ruchy heretyckie w średniowieczu*, 207.

[82] Гэтая праблема была мной падрабязна разгледжаная ў артыкуле "The Waldensian concept of catholic saints: total rejection or hidden faith." In *Saints in the Slavic Christian World – Assessing*

крыніца можа ўтрымліваць супрацьлеглую інфармацыю, што паказвае адсутнасць згоды ў гэтым пытанні сярод вальдэнсаў. Ідэя пакланення святым і апосталам была распаўсюджанай сярод вальдэнсаў-міран, нягледзячы на спробы "настаўнікаў" настойваць на малітве толькі самому Богу. Розніца больш звязана з прычынамі такой адмовы (таму што святыя не згадваюцца ў Бібліі – гэта значыць "фальшывыя"; не слухаюць; з'яўляюцца толькі пасрэднікамі, не могуць дапамагчы, не могуць пачуць у шчаслівым стане Блажэннага Бачання; не вартыя ўвагі наогул). Такая разнастайнасць поглядаў паказвае важнасць пакланення святым для вернікаў, якія цікавіліся прычынай яго забароны ў сваіх "настаўнікаў" і атрымлівалі розныя адказы. Але, у адрозненне ад выпадку з чыстцом ці клятвамі, па гэтым пытанні ў вальдызме не існавала адзінага меркавання. Вернікі не прасілі дапамогі для сваіх памерлых у каталіцкіх святых і не выдумлялі сваіх святых, але пастаянна змагаліся са спакусай прасіць дапамогі ў апосталаў і біблейных святых "у выпадку неабходнасці". Гэта азначае, што ні афіцыйная Царква, ні "ерэтычная" не змаглі кантраляваць і кіраваць народнай рэлігіяй.

Супрацьстаянне з Апостальскім Прастолам і непрыняцце царкоўных абрадаў

Не выклікае здзіўлення апазіцыя вальдэнскага руху Апостальскаму Прастолу[83]. Усе дапытаныя інквізітарамі вальдэнсы, акрамя Раймунда дэ ла Коста (магчыма, ён зрабіў прызнанне аб лаяльнасці да Рыма пад ціскам), адмаўляюцца ад падпарадкавання гэтаму "апірышчу зла". "І адсюль вырастаюць іх мітуслівыя пустыя зласлові, якія яны прамаўляюць супраць самой Царквы, кажучы, што яна блудніца, і змяінае гняздо, і звер. І вы, неразумныя, гэта ж кажаце"[84], – піша Сальва Бурчы. Да яго ў адзін голас далучаюцца Райнэрый Саконі і Ансельм Александрыйскі. "Рымская Царква – не Царква Ісуса Хрыста ... гэта Царква граху, звер і блудніца, якая апісана ў Апакаліпсісе"[85]. "Рымская Царква – не Царква Божая, але блудніца ... трымаецца шляху не Царквы Хрыста, а Царквы зла"[86].

З адмаўлення аўтарытэту каталіцкага кліру ў пытаннях веры вынікае і стаўленне да індульгенцый: "насміхаючыся, аб'яўляе нявартымі свайго кошту індульгенцыі, якія выдаюцца прэлатамі Рымскай Царквы"[87], – піша пра аднаго са сваіх апытаных Бернард Гі. Гэта дзейнічае і ў адваротны бок –

power, religion and language in religious literature, ed. by Emil Bjørn Hilton Saggau, Mihai Dragena and Wawrzyniec Kowalski. Peter Lang (*forthcoming 2024*) .

[83] Giovanni Rostagno, *I valdesi italiani: le loro lotte e la loro fede* (Torino: Chiese Valdesi d'Italia, 1938), 12.

[84] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 63. [II.xi]

[85] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 120. [II.xv]

[86] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 141–142. [II.xvii]

[87] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 246–247. [III.vi.3]

Стэфан дэ Бурбон зазначае: "Яны пагарджаюць царкоўнымі адпушчэннямі грахоў і адлучэннямі, бо, як яны кажуць, толькі Бог можа адлучаць"[88]. Вальдэнс Памор'я "не верыць у карысць індульгенцый ... таму што казалі, што гэта прыдумана з-за сквапнасці кліру, і тое ж самае з адлучэннем"[89].

Некаторыя крыніцы нават сцвярджаюць, што для ўступлення ў секту патрабавалася адрачыся ад папярэдняга каталіцкага хрышчэння і прыняць новае[90], або што яно ўвогуле непатрэбнае[91], і нават спрабавалі яго "змыць"[92], але такія выпадкі адзінкавыя. Адмаўленне неабходнасці/выратавальнасці хрышчэння немаўлят сустракаецца часцей, але амаль столькі ж разоў у іншых крыніцах прысутнічае і прызнанне яго абавязковасці. Гэта дазваляе зрабіць выснову, што праблема хрышчэння немаўлят была спрэчнай унутры вальдызму і не мела храналагічнай або рэгіянальнай прывязкі[93]. Альтэрнатыўны варыянт тлумачэння – яно цікавіла толькі аўтараў асобных крыніц, таму меркаванні большай часткі вальдэнсаў засталіся для нас невядомымі.

Царкоўныя абрады (пакланенне іконам, крыжу і алтару, паломніцтвы, наведванне храмаў) абвяргаліся вальдэнсамі як неапісаныя і прама не згаданыя ў Евангеллях. Пілігрымкі, на думку вальдэнсаў П'емонта, служаць толькі для таго, "каб збіць у іх абутак"[94]. Шырока практыкавалася ўжыванне мяса падчас посту і праца ў святы і нядзелі (за выключэннем апостальскіх святаў і дзён, прысвечаных Дзеве Марыі). Сярод малітваў згадваецца толькі Хрыстова малітва, апісаная ў Біблії, – "Ойча наш". "Уся зямля аднолькава асвечаная і бласлаўлёная Богам. Яны пагарджаюць хрысціянскімі могілкамі і цэрквамі; пагарджаюць царкоўнымі спевамі і святымі імшамі, заяўляючы, што той, хто прысвячае свае звароты Яму, выглядае так, як быццам бы высмейвае Бога, як быццам бы Той не можа зразумець, пакуль Яму не праспяваюць песню або не памоляцца ў выглядзе песні"[95], – падсумоўваў Стэфан дэ Бурбон. Бернард з Фанкода выступаў: "супраць тых, хто адмаўляецца маліцца ў царкве і хто аб'яўляе, што царква не вартая свайго імя"[96], дадаючы, што будынак царквы для вальдэнсаў – проста камяні. У XIV ст. вальдэнсы актыўна будуць сцвярджаць, што няма розніцы, дзе

---

[88] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 377. [II.xiv]

[89] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 124. [VII.v.e.2]

[90] Дмитрий Сергеевич Бирюков, Книга еретиков: антология (Санкт-Петербург: Амфора, 2011), 343–344; Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 156. [II.vii]

[91] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 141 [II.xvii]; Döllinger, *Beiträge*, 259 [IV.iv.b].

[92] Patschovsky, "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315," 171. [VII.i.b]

[93] Манік Зэрнэр піша, што пытанне выратавання немаўлят без хрышчэння было актуальна ў XII ст., але страціла сваю вастрыню пасля ўзнікнення ў каталіцтве дактрыны "лімба". Monique Zerner, "L'hérétique Henri dans les sources de son temps (1135–1145)," *Revue Mabillon* 25 (2014): pp. 79–134, https://doi.org/10.1484/j.rm.5.105260, 95. Вальдэнскія матэрыялы не пацвярджаюць гэты тэзіс.

[94] Cameron, *Waldenses*, 159.

[95] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 348–349. [II.xiv]

[96] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 86. [II.ii]

маліцца – у царкве або ў хляве; алтар – гэта проста куча камянёў, і звычайнае поле нічым не горшае за асвечаны цвінтар. "Блаславёная вада, соль, попел і г. д. не вартыя даверу" сярод вальдэнсаў Памор'я ў канцы XIV ст.[97] (адмаўленне гэтых элементаў рытуалу не сустракаецца ў вальдэнскіх крыніцах да 1390 г.)[98].

Адзінае сведчанне існавання асобных вальдэнскіх могілак датаванае 1240-мі гг. і паходзіць з французскага рэгіёну Керсі: "жонка яго аддалася вальдэнсам у смерці і была пахавана на іх могілках"[99]. На жаль, адсутнічае апісанне, чым гэтыя могілкі адрозніваліся ад каталіцкіх.

На першы погляд меркаванні вальдэнсаў адносна посту вельмі неаднародныя: ён разглядаецца ў 23-х крыніцах, пры гэтым у 10-і – ухваляецца, а ў 13-і – адмаўляецца. Але пры больш дэталёвым разглядзе выяўляецца, што адмаўленне хутчэй тычыцца канкрэтных дзён, усталяваных Царквой, г. зн. царкоўнага рытуалу, а не самога канцэпту ўстрымання ад ежы для духоўнага самаўдасканалення.

Значная частка вальдэнсаў з той ці іншай доляй актыўнасці ўдзельнічала ў каталіцкіх абрадах, "каб пазбегнуць скандалу". "Калі быў у царкве, у той час як выносілі Святыя Дары, не глядзеў на Цела Хрыстова, а глядзеў толькі на сцяну перад сабой"[100]. Прыкметай ерасі маглі стаць адмова ад наведвання царквы (або наведванне замест яе могілак), адмова ад ускладання ахвяр, пагарда да кліру, няўдзел у калядаванні, праца ў святочныя дні, гучныя каментарыі Святога Пісання і царкоўных казанняў[101]. Увогуле пад падазрэнне траплялі ўсе, хто хоць на нейкі момант не ўдзельнічаў у агульнацаркоўным жыцці[102].

Асобнай увагі заслугоўваюць народныя вераванні вальдэнсаў Памор'я канца XIV ст., падрабязна зафіксаваныя ў інквізітарскіх пратаколах[103]. Там маглі сустракацца выпадкі веры ў звышнатуральныя ўласцівасці асвечанай вады, солі і інш. сярод простых вальдэнскіх вернікаў. Гэта з'яўляецца хутчэй вынікам міфалагічнага светаўспрымання, чым дактрынальнай асаблівасцю рэгіёну. А той факт, што мы не сустракаем падобных звестак датычна іншых мясцовасцей – асаблівасцю апытальніка Пятра Цвікера, які, у адрозненне ад сваіх калег, засяроджваў увагу на гэтых пытаннях.

---

[97] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 131. [VII.v.e.2]

[98] Välimäki Reima, "More Powerful than Mere Matter? Forbidden but Practiced Material Religion among the Late Medieval German Waldensians," in *Tangible Religion: Materiality of Domestic Cult Practices from Antiquity to Early Modern Era* (Roma: Institutum Romanum Finlandiae, 2021), pp. 239–253, 242.

[99] *L'inquisition en Quercy*, 130. [III.ii]

[100] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 181. [VI.ii.b]

[101] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 227. [VI.ii.b]

[102] Bylina, "Heretycy w społeczeństwie," 114.

[103] Напрыклад, Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 119–120. [VII.v.e.2]

Спецыфічныя вераванні: традуцыянізм і існасць душы

Традуцыянізм – канцэпцыя Цертуліяна, згодна з якой душа дзіцяці фарміруецца з душаў бацькоў – супярэчыць крэацыянізму, што душа дзіцяці ствараецца Богам. Была адхіленая афіцыйнай Рымскай Царквой, але падтрымлівалася Святым Аўгусцінам і (рэальна альбо ва ўяўленні каталіцкіх аўтараў) некаторымі ерэтычнымі дуалістычнымі рухамі.

Сальва Бурчы – адзіны, хто разгорнута пісаў пра традуцыянізм у вальдэнсаў. Сведчанні пра гэта змешчаны ў самым канцы яго трактата. Тэзіс вельмі кароткі: "Верым, што дух паходзіць ад духу і плоць ад плоці; і гэта адбываецца падчас сувязі паміж мужчынам і жанчынай; слухайце, бо гэта ісціна"[1]. Ускосныя пацвярджэнні традуцыянізму вальдэнсаў ёсць у кароткім пасажы з манускрыпта італьянскай інквізіцыі, які адносіцца да другой паловы XIII ст., і ў двух фрагментах антыерэтычнага трактата французскай інквізіцыі канца XIII ст. або першай дэкады XIV ст.[2] Ансельм з Александрыі проста ўспамінае, што "душы перадаюцца"[3], не ўдакладняючы падрабязнасцей.

Катарскі ўплыў на вальдэнсаў праяўляўся не толькі знешне, у запазычанні назвы "дасканалыя" для "настаўнікаў", але і ў некаторых вераваннях наконт існасці душы. Шырэй за ўсё пра гэта піша Стэфан дэ Бурбон: "душа першага чалавека была часткай боскай субстанцыі; на нябёсах няма ніякага духу, акрамя духу Бога, хто сам ёсць Бог" і "душа кожнага добрага чалавека – сапраўды Святы Дух, які ёсць Бог, і гэты добры чалавек, пакуль ён застаецца добрым, не мае іншай душы, акрамя як Святога Духа, або Бога"[4]. У матэрыялах допытаў можна сустрэць сцвярджэнні: "Таксама казаў той Бернард, прапаведуючы, што са смерцю цела душа памірае"[5]. У дадзеным выпадку мае месца або механічны перанос царкоўнымі аўтарамі катарскіх ідэй на вальдэнсаў (у ранні перыяд, да канца XIII ст.), або сапраўднае змяшэнне вераванняў. На карысць апошняга сведчаць прызнанні Якуба Бека, ерэтыка з Пінерола, які названы вальдэнсам, але яны ўтрымліваюць рысы абедзвюх плыняў: "Любы мужчына ці жанчына складаецца

---

[1] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 74. [II.xi.e]

[2] da Milano, "Il «Liber supra Stella»," *Aevum* 17, 113; Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 186. [III.iii]

[3] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 143. [II.xvii]

[4] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 345–347. [II.xiv]

[5] Döllinger, *Beiträge*, 260. [IV.iv.b]

не з разумнай душы і цела, але адна частка – з дэманаў, якія грашаць, аб'яднаная з целам і ўкладае душу ў гэтае цела, і другая, якая будзе выратавана, выпраўлена з дапамогай анёлаў, якія спусцяцца з неба"[6]. Цяжэй патлумачыць наяўнасць меркавання "душам уласціва выходзіць за межы целаў"[7] у кароткім спісе вальдэнскіх памылак ад 1395 г. з Прагі, рэгіёну, дзе катарскі ўплыў быў надзвычай слабы. На дадзены момант адказ на гэтае пытанне даць немагчыма з-за недахопу звестак.



[6] Döllinger, *Beiträge*, 266. [IV.iv.b]
[7] Holinka, "Sektářství v Čechách," 181. [VI.vi]

Адрозныя рысы ў веравучэнні розных абшчын і прычыны іх узнікнення

Гэрытарыяльнае пашырэнне веравучэння вальдэнсаў прывяло да пагаршэння камунікацыі паміж асобнымі абшчынамі, што дало апошнім больш аўтаноміі пры вырашэнні розных жыццёвых праблем, якія ўзнікалі амаль штодзённа. Змест праблемы і рэакцыя на яе непасрэдна залежалі ад умоў, якія існавалі ў канкрэтным рэгіёне знаходжання абшчыны. Відавочна, што яны былі розныя, а значыць, і вырашэнні праблем таксама не супадалі. Дадзены аб'ектыўны фактар прывёў да фарміравання тэрытарыяльных варыянтаў веравучэння вальдэнсаў *(дадатак Б)*.

Табліца 5. Размеркаванне спецыфічных вальдэнскіх вераванняў па рэгіёнах да пачатку XV ст.

Рэгіён	**Клятва**	**Праца**	**Маёмасць**	**Гвалт**
Поўдзень сучаснай Францыі	–	–	–	–
Ламбардыя	–	+	+	–
Савоя	+	?	?	+
Нямецкамоўныя тэрыторыі Цэнтральнай Еўропы	–	+	–	–
Вольныя гарады ў канцы XIV – пачатку XV ст.	+	+	+	+

Адмова ад клятвы

Праз усё XIII і XIV стст. вызначальным пры інквізіцыйным допыце вальдэнсаў было іх адмаўленне клясціся (40 згадак, 37 супраць клятвы і толькі 3 за). Першая згадка сустракаецца ў Алана Лільскага: "Ні ў якім разе нельга клясціся"[1]. Падрабязна пра гэта піша Бернард Гі: "Усе клятвы, як на судзе, так і па-за судом, без усялякага выключэння і агаворак, Богам забароненыя, недазвольныя і грахоўныя па словах Святога Евангелля і Святога Апостала Якуба пра забарону клятвы"[2]. Відавочна, такая адмова базуецца на забароне з Нагорнай пропаведзі Хрыста[3] (за выключэннем вальдэнкі Перанеты ў 1335 г., якая на допытах спасылалася на 23-і

[1] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 114. [II.v]
[2] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 245–246. [III.vi.3]
[3] Мф 5:33–37.

псалом[4]) і літаральным разуменні вальдэнсамі Біблії. Паводле Бернарда Гі, па адносінах да клятвы падчас інквізітарскага допыту можна было вызначыць прыналежнасць ерэтыка да пэўнай секты. Згодна з вальдэнскімі ўяўленнямі, той, хто церпіць пераслед за адмаўленне клятвы, – пакутнік, падобны да Святога Стэфана: "Таксама, што той, хто пераследуе або адпраўляе на смерць каго-небудзь, хто не хоча клясціся ні на які конт, з'яўляецца забойцам, бо забівае таго, хто правільны і нявінны, і складае кампанію тым, хто кідаў камяні ў Святога Стэфана"[5]. З іншага боку, Стэфан дэ Бурбон сцвярджае: "я чуў, як некаторыя з іх казалі, што пад страхам смерці дазваляецца тым, хто не дасканалы, падманваць і прыносіць клятвы"[6]. Магчымасць адыходу ад клятвы для самаабароны крышталізавалася ва ўмовах узмацнення інквізіцыйнага пераследу да канца XIII ст.: "Кажуць, што любая клятва недапушчальная і з'яўляецца смяротным грахом, нават калі яна праўдзівая. Аднак так адрэгулявана, што можна клясціся, каб пазбегнуць цялеснай смерці, або іншага не выдаць, або захаваць у сакрэце сваё нявер'е"[7].

Упершыню забарона клятвы была вызначаная Царквой як ерэтычная ўжо ў папскай буле Ad abolendam ад 1184 г.[8] Далей адмова прынесці клятвы разглядалася як прыкмета ерасі нават міранамі-палемістамі ў XIII ст. Датычылася гэта абвінавачанне не толькі вальдэнсаў: такая забарона існавала таксама ў катараў і ўмільятаў[9], Св. Бенедыкт забараняў манахам клясціся[10]. Разам з тым клятва не з'яўлялася гарантыяй бяспекі – прысяга на судзе асоб, якія падазраваліся ў ерасі, не мела юрыдычнай сілы (у звычайных сітуацыях пры адсутнасці доказаў віны клятва давала чалавеку свабоду)[11]. А паколькі сваякі, якія павінны былі клясціся разам з абвінавачаным, мусілі быць вартымі даверу, то ў некаторых рэгіёнах, населеных ерэтыкамі, усе жыхары маглі быць скампраментаваны[12].

З пратаколаў допытаў чэшскіх вальдэнсаў сярэдзіны XIV ст. бачна, наколькі вальдэнсы стараліся абысці пытанне клятвы з дапамогай выразаў тыпу "Я ахвотна паклянуся, калі Вы загадаеце"[13]. У сваіх запісах інквізітар так рэкамендуе размяжоўваць "дасканалага" ерэтыка ад "недасканалага" (маюцца на ўвазе вандроўныя прапаведнікі/настаўнікі і простыя вернікі): трэба было задаць пытанне: "Адрачэцеся клятвенна ад ерасі?" Калі ён

---

[4] Benedetti, "The Bible, Women Heretics, and Inquisitors," 90.

[5] Döllinger, *Beiträge*, 126. [III.iv.a]

[6] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 346.

[7] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 153. [V.ii]

[8] Bueno, *Defining Heresy*, 54.

[9] Luigi Zanoni, Gli umiliati nei loro rapporti con l'eresia, l'industria della lana ed i Comuni nei secoli XII e XIII sulla scorta di documenti inediti (Milano: Hoepli, 1911), 43–44.

[10] Zanoni, *Gli umiliati nei loro rapporti con l'eresia*, 122.

[11] Antonia Fiori, "Et si haereticus non sit... La condanna dei sola suspicione notabiles," *Rivista Internazionale di Diritto Comune* 27 (2016): pp. 185–225, 190.

[12] Fiori, "Et si haereticus non sit," 206.

[13] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 185. [VI.ii.b]

"дасканалы", то адкажа: "Не клянуся, бо Хрыстос забараніў клясціся". Калі ж ён "недасканалы", то адкажа: "Калі я павінен клясціся, то паклянуся". Тады інквізітар кажа падсуднаму: "Я не загадваю табе клясціся, але калі ты хочаш, каб я табе паверыў, паклянiся". Калі кажа ерэтык: "Я не ведаю, як клясціся, навучыце мяне форме клятвы", значыць ён выкарыстоўвае ўсе гэтыя і падобныя ўхіленні, каб пераканаць сябе, што ён не клянецца, а толькі паўтарае фармулёўку клятвы за суддзёй[14].

Разам з тым у XIV ст. назіраецца адыход ад літаральнага трымання гэтай забароны. Прамых сведчанняў у крыніцах няма, але можна меркаваць, што тыя вальдэнсы з вольных імперскіх гарадоў, якія ўвайшлі ў склад магістрата або з'яўляліся цэхавымі майстрамі, былі вымушаны даваць клятву, бо камуна – інстытуцыя, заснаваная на клятве[15]. Вальдэнсы Заходніх Альпаў адмаўлялі падман і клятву, але на судзе, калі прысутнічалі ў якасці сведкаў ці абвінавачаных, давалі яе без вагання. Гэта таксама паказвае на іх аддаленне ад "класічнага" вальдызму.

Катрын Утц Трэмп паказвае залежнасць паміж супрацьстаяннем вальдэнсаў Царкве і ўсталяваннем ёй нейкага дагмата. Згодна з яе меркаваннем, зніжэнне супрацьстаяння вальдэнсаў клятве звязана са змяшчэннем фокуса ўвагі ад чыстца да культу Дзевы Марыі, які вальдэнсы на злосць Царкве сталі адмаўляць больш рашуча[16]. Прымаючы верагоднасць гэтай гіпотэзы, варта адзначыць, што пазіцыя Каталіцкай Царквы ўплывала ў дадзеным выпадку хутчэй на меркаванні інквізітараў і аўтараў палемічных трактатаў, праз "акуляры" якіх мы і назіраем сёння за сярэднявечнымі вальдэнсамі. Іншымі словамі, мы ведаем не тое, у што вальдэнсы насамрэч верылі, а тое, пра што іх запыталіся.

Пытанне працы

Вальдэнсы Ламбардыі лічылі магчымым сумяшчэнне апостальскага жыцця з ручной працай. Вальдэс жа быў строга супраць гэтага: "калі наконт усяго астатняга былі мір і згода паміж ім і італьянскімі братамі, акрамя толькі злучэнняў працоўных, якія ў тыя часы былі ў Італіі, калі, такім чынам, яны [ламбардцы] з імі [злучэннямі працоўных] не расстануцца, міру з ім мець яны не маглі"[17]. Магчыма, наяўнасць такой працоўнай арганізацыі – след уплыву на вальдэнсаў з боку ўмільятаў[18]. З аднаго боку, Вальдэса можна зразумець: перад яго вачыма быў яскравы прыклад багатых кляштараў, якія відавочна не прытрымліваліся зароку беднасці, і ён баяўся паўтарыць іх лёс. Існуе нават думка, што свецкі аскетычны лад жыцця з'яўляецца

[14] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 185. [VI.ii.b]
[15] Powell, "Religious Diversity," 370–371. Zanoni, *Gli umiliati nei loro rapporti con l'eresia*, 124.
[16] Utz Tremp, "'Parmi les hérétiques…'," 537.
[17] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 24. [I.vii]
[18] Charvaz, *Origine Dei Valdesi*, 2; Erbstösser, *Ketzer im Mittelalter*, 109.

не толькі і не столькі спосабам прыпадабнення да манаскай і апостальскай беднасці, колькі спосабам пазбягання царкоўнага паслушэнства[19].

У XII –XIII стст. назіралася агульная тэндэнцыя падзення прэстыжу ручной працы, бо яна звязвалася з грахоўным узбагачэннем[20]. З іншага боку – Апостал Павел не цураўся працы. Такім чынам, прыкладам для паслядоўнікаў Вальдэса з Ліёна, якія настойвалі на жабрацкім жыцці, быў місіянерскі шлях Ісуса і апосталаў, а для вальдэнсаў Ламбардыі – абшчына першых хрысціян. Для ліёнцаў праца – гэта мірскія сувязі, перашкоды, імкненне да багацця, а для ламбардцаў – форма служэння, форма выканання запавету, якая выяўляецца ў канкрэтным жыцці. "Бедны з Ліёна" першых дзесяцігоддзяў існавання руху – гэта вандроўны місіянер, накшталт менестрэля, які адцураўся ад свету, вольны спявак пакаяння. Да таго ж сама пропаведзь, па словах апалагета Вальдэса Дуранда з Оскі, – гэта ўжо "духоўная праца"[21]. "Ламбардскі вальдызм" мае цэнтральнай фігурай перш за ўсё рамесніка, часальшчыка, занятага ў тэкстыльнай індустрыі (вельмі цяжкай у тыя часы), працаўніка, максімум – уладальніка заезнага двара[22].

Само паняцце беднасці як неабходнай умовы ўваходжання ў Царства Нябеснае не было адназначным і простым, яно развівалася паралельна з самім развіццём хрысціянства. Да прыкладу, Цертуліян ставіў акцэнт на адсутнасці маёмасці, у той час як Аўгусцін ужо змяшчае яго на пакору Богу. Канцэпцыя добраахвотнай матэрыяльнай беднасці, сімвалам якой стаў Святы Алексій, расквітнела пасля крыжовых паходаў у Святую Зямлю, дзе заходняя цывілізацыя ўпершыню сутыкнулася з "мясцінамі Хрыста". З гэтага моманту Святое Пісанне для многіх становіцца прамым жыццёвым кіраўніцтвам[23].

Хрыстос прыраўняў пропаведзь Евангелля да фізічнай працы, змяніўшы яе значэнне на станоўчае, у параўнанні з антычнай культурай. З гэтага часу праз усю гісторыю чалавецтва праходзіць эвалюцыя суаднясення працы з беднасцю, прычым з беднасцю абодвух тыпаў: "духоўнай і добраахвотнай" з "рэальнай і матэрыяльнай". Аскеты Высокага Сярэднявечча пастаянна імкнуліся да набліжэння першай да другой[24], прычым, відавочна, "бедныя з Ліёна" пры такім стаўленні да працы аказваліся бліжэй да гэтага ідэалу, бо галоўнай была "беднасць духам" (нездарма іх другая назва – "бедныя духам"), г. зн. не прагнуць багацця, добраахвотна адмовіцца ад яго ў

---

[19] Сергей Сказкин, "Первое послание Дольчино," в *Из истории социально-политических идей. Сб. ст. к семидесятипятилетию акад. В. П. Волгина* (Москва: Академия наук СССР, 1955), стр. 122–129, 126–129.

[20] Milena Santerini, "Durando d'Osca e il Liber Antiheresis: Predicazione e povertà, vocazione dei primi valdesi," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 148, no. 98 (1978): pp. 53–69, 64–65.

[21] Santerini, "Durando D'Osca e Il Liber Antiheresis," 61–62.

[22] Cinzio Violante, "Eresie urbane e eresie rurali in Italia dall'XI al XIII secolo," in *Medioevo ereticale* (Bologna: Il Mulino, 1977), pp. 185–212, 194.

[23] Tadeusz Manteuffel, *Narodziny herezji* (Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 2008), 7–13.

[24] Эксле, *Действительность и знание*, 190–191.

душы сваёй. Гэтая тэндэнцыя была вырашальнай на першым этапе еўрапейскага руху добраахвотнай беднасці, калі знешнія праявы яе маглі быць нават неабавязковымі. Яны сталі абавязковымі толькі праз некаторы час з-за сваёй прастаты і відавочнасці, што да XIII ст. часам прыводзіла да атаясамлення жабрака са святым. З іншага боку, Ісус, згодна з Бібліяй, ніколі не прасіў міласціны. Завяршае працэс паніжэння статусу працы Тама Аквінскі, калі запазычвае ў Арыстоцеля яго тэорыю пра тое, што фізічныя намаганні – лёс рабоў[25]. Лепш за беднасць магла быць толькі прыгнечанасць плоці і цнатлівасць. І зноў тут бачыцца "лёгкі" шлях – ішлі ад відавочнага: "не кранаць, не хацець, не думаць".

Вельмі цікавую ідэю канатацыі беднасці і пропаведзі прапаноўвае Р. Мур: беднасць, на яго думку, у Сярэднявеччы была звязана не толькі і не столькі з адсутнасцю грошай, колькі з адсутнасцю правоў, таму бедныя – гэта тыя, хто не мае права прапаведаваць[26].

Як бачым, неадрыўна ад пытання працы ідзе пытанне аб валоданні маёмасцю.

Валоданне маёмасцю

У агульным значэнні бедным лічылі таго, хто пастаянна ці перыядычна знаходзіцца ў стане слабасці, галечы, неўладкаванасці, прычым гаворка ідзе не толькі пра адсутнасць фізічных сіл і матэрыяльнага дабрабыту (грошай, ежы, адзення), але і ў цэлым пра недахоп сацыяльнай "заможнасці", якая з'яўляецца вынікам сацыяльнай павагі, уплыву, уменні валодаць зброяй і прававога пазіцыянавання, пачуцця абароненасці пры дапамозе сацыяльных сувязяў, а таксама ведаў і палітычнай улады. Таму для Высокага Сярэднявечча "бедны" (pauper) супрацьпастаўляецца не толькі "багатаму" (dives), але і "магутнаму" (potens)[27]. Рух добраахвотнай беднасці, які ставіць за мэту максімальна наблізіцца да беднасці рэальнай, уяўляецца не толькі як імкненне да "апостальскага жыцця" (vita apostolica), але і як пэўнае процістаянне вышэйшым пластам грамадства, яго сістэме ў цэлым.

Пра існаванне ў італьянскіх вальдэнсаў зямельнай уласнасці сведчыць наяўнасць у іх нерухомай маёмасці ў Мілане (урывак з булы Інакенція III міланскаму архібіскупу): "Той жа Дуранд і гэтыя яго паплечнікі паведамлялі нам праз лісты, што ты гаворыш далучаным да Царквы братам таго самага [Дуранда], што каля 100 іншых таксама хацелі б быць далучанымі, калі б не нейкі луг, які калісьці ім ахвяравала абшчына Мілана, на якім іх школа пабудавана, якую твой светлай памяці папярэднік разбурыў, і дзе яны прывыклі збірацца, а таксама дзе браты падбадзёрвалі адно аднаго

[25] Жак Ле Гофф, *Интеллектуалы в Средние века* (Санкт-Петербург: Санкт-Петербургский университет, 2003), http://yanko.lib.ru/books/temp/goff-intellectuala_v_sred_veka.pdf, 98.
[26] Robert Ian Moore, *The Origins of European Dissent* (Oxford: Blackwell, 1985), 281.
[27] Эксле, *Действительность и знание*, 201–202.

і сяброў, між тым [яны] з-за адлучэння былі кінуты ў турму, і зараз ізноў [гэтая Царква] узнімаецца, каб ты сам захацеў бы дараваць, каб яны мелі магчымасць вольна збірацца для ўзаемнага падбадзёрвання братоў і сяброў. Адтуль яны нас прыніжана малілі, каб мы вышэйадзначаны луг ізноў зрабілі падараваннем, каб выкладанне Слова Божага зноў стала звычайным"[28]. Рэакцыя міланскіх уладаў на папскі ліст нам невядомая, але ў 1233 г. вальдэнсы пералічваюцца сярод іншых ерасяў, распаўсюджаных у Мілане[29], "патарэнскім" горадзе[30], які не раз згадваецца як ерэтычны цэнтр у старажытных хроніках[31].

Імкненні італьянскіх вальдэнсаў валодаць маёмасцю разыходзіліся з характарыстыкамі першаснага вальдызму, што практыкаваўся і быў запатрабаваны самім Вальдэсам, які раздаў усю сваю маёмасць бедным. Гэта ілюструе напісаная амаль праз паўстагоддзя пасля расколу руху праца Ансельма Александрыйскага: "не працуюць ні на сябе, ні на іншых за грошы, не гандлююць чым-небудзь, не служаць ... за грошы, але іх паплечнікі (socius) за іх, не служаць каму-небудзь за штодзённую ежу, і носяць толькі адну туніку"[32]. Увесь гэты абзац – відавочная алюзія на 26-ы верш 6-й главы Евангелля ад Мацвея, а таксама на заклік Хрыста не браць торбу ў дарогу, а толькі адну туніку, і нікога не прымушаць да працы[33]. Французскія вальдэнсы XIII ст. старанна падтрымлівалі рэнамэ наступнікаў апосталаў. Не выключаючы прыватнай уласнасці, прыклад "бедных каталікоў" Дуранда з Оскі дазваляе меркаваць, што палі і дамы "бедных ламбардцаў" былі пераважна ў калектыўнай уласнасці, што прыводзіла ў гармонію працу і карыстанне здабытым працай.

З цягам часу вальдэнсы адмаўляюцца ад актыўнай пропаведзі і "місіянерскага апостальскага" жыцця ў беднасці, што было "жывым ферментам" у першыя стагоддзі іх развіцця[34]. Прыкладам гэтаму могуць служыць апісаныя вышэй Страсбург, Фрыбур, Берн і г. д., у якіх вальдэнсы займалі высокае сацыяльнае становішча і, адпаведна, валодалі маёмасцю. У 1369–1378 гг. Ян Лезер піша пра вельмі заможны стан вальдэнсаў, чаго раней

---

[28] *Bullarium Ordinis Eremitarum S. Augustini: Periodus formationis 1187–1256* (Würzburg: Augustinus-Verlag, 1964), 5; PL 216:29–30 [I.ii.b.17]. Больш падрабязна пра міланскі дом вальдэнсаў, яго функцыянальнае прызначэнне і дакладную лакалізацыю гл. Luigi Zanoni, "Valdesi a Milano nel secolo XIII," *Archivio Storico Lombardo* 39 (1912): pp. 5–22.

[29] *Gli Atti del Comune di Milano nel secolo XIII*, vol. 2, pt. 1: 1251–1262 (Alessandria: Tip. Ferraris, 1982), 452.

[30] Taylor, "Catharism and Heresy in Milan," 386; Alfredo Lucioni, "L'età della Pataria," in *Diocesi di Milano*, 2nd ed. (Brescia: La Scuola, 1990), pp. 167–194.

[31] *Lettres de Jacques de Vitry: (1160/1170–1240) évêque de Saint-Jean-D'Acre* (Leiden: Brill, 1960), 72; Matthi Parisiensis, Monachi Santi Albani, *Chronica Majora*, vol. 3. 1216–1239 (London: Longman, 1876), 375.

[32] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 141. [II.xvii]

[33] *Эпоха крестовых походов* (Смоленск: Русич, 2005), 252.

[34] Raoul Manselli, "Dai movimenti religiosi popolari ai movimenti sociali del Trecento," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 146 (1979): pp. 38–49, 41.

не сустракалася ў крыніцах: на валоданне амфарамі, а таксама срэбрам і золатам[35]. Фактычна замацоўваецца падзел руху на дзве няроўныя групы: бедных вандроўных прапаведнікаў-настаўнікаў і аселых вернікаў (*Падрабязней глядзі раздзел "Структура вальдэнскай абшчыны"*). Апостальскі шлях становіцца лёсам выключна першых, якія перад сваім пасвячэннем павінны былі прынесці "зарокі чысціні, беднасці і падпарадкавання названаму Галоўнаму і яго таварышам"[36].

Права на здзяйсненне гвалту ў мэтах самаабароны

З узмацненнем інквізіцыйнага ўціску ў 1260-я гг. – пачатку XV ст. развіццё вальдэнскага руху ідзе з нарастаннем агрэсіі ў саміх вальдэнсаў. Ад пачатку яны адмаўлялі ўсялякі гвалт (у тым ліку забойствы на вайне і выкананні смяротных прысудаў)[37]. Больш за тое, забаранялася нават кранаць зброю рукамі: "І калі так ішлі, на дарозе знайшлі ў пыле нейкую жалезную дзіду, і той спытаўся, ці можа гэтую дзіду падняць і прыняць, і тады названы Ян з Кастанья[38] сказаў яму: «Калі ты з нашай секты, ты ні ў якім разе не возьмеш гэтага жалеза»"[39]. Але з цягам часу сітуацыя радыкальна змянілася: вальдэнсы пачалі прымяняць гвалт для самаабароны. "Таксама кажуць, што нікому не павінна быць дазволена забіваць, а самі асабіста не забіваюць, колькі б ні насілі без прычыны для выгляду меч ці шчыт, аднак даюць зразумець сваім набліжаным (complices), што яны возьмуць на сябе адказнасць пры ўмове, калі тыя заб'юць каго-небудзь з тых, хто пагражае іх знішчыць"[40]. Варта паўтарыць думку Яўгена Смелянскага: аповеды пра гвалт з боку вальдэнсаў, што сустракаюцца ў каталіцкіх крыніцах, маглі быць палемічным прыёмам для перабольшвання небяспекі, якую неслі ерэтыкі[41]. Прыкладам могуць служыць працэсы, разгледжаныя вышэй у раздзеле *"Сацыяльны склад вальдэнсаў у розных рэгіёнах/ Антывальдэнскія працэсы ў гарадах на паўднёвым Захадзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі"*.

Рос і ўзровень гвалту з боку ўладаў. Напрыклад, з 1312 па 1395 г. у Турынскай дыяцэзіі, што большай сваёю часткай належала да юрысдыкцыі дамініканскай інквізіцыі (акрамя дзвюх заальпійскіх далін, дзе справы вялі францысканцы), былі пакараны смерцю за ерась 22 чалавекі (20 спаленняў, адно ўтапленне і адно павешанне), з іх тры жанчыны[42]. Сустракаліся

---

[35] Giovanni Gonnet, "I valdesi d'Austria nella seconda metà del secolo XIV," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 111 (1962): pp. 3–41, 25.

[36] Döllinger, *Beiträge*, 108. [III.iv.a]

[37] Walter Nigg, *Das Buch der Ketzer* (Zürich: Artemis-Verlag, 1949), 220.

[38] Ніжэй указана, што названы Ян меў жонку. [III.iv.b–c]

[39] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 171. [IV.ii]

[40] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 169. [V.ii]

[41] Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 72.

[42] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 136. [IV.ii]

і больш мяккія пакаранні, такія, як канфіскацыя маёмасці (у тым ліку і памерлых), нашэнне нашытых на адзенні крыжоў і розныя віды пакаянняў (паломніцтвы, пасты, малітвы і інш.). Усяго ад пераследу пацярпела каля 250-і чалавек[43], што непараўнальна менш за агульную колькасць ерэтыкоў, пра якую было вядома царкоўным уладам.

У 1332 г. інквізітар П'емонта і Верхняй Ламбардыі Альберта дэ Кастэлярыа паведамляе, што ерэтыкоў у далінах Люцэрны і Перозы стала столькі, што яны збіраюцца больш чым па пяць соцень у адным месцы. Калі ж ён хацеў арганізаваць там інквізіцыйны вышук, вальдэнсы Ангроны, падазраючы, што іх парафіяльны святар Гвілельм выдасць іх інквізіцыі, забілі яго адразу пасля імшы на цэнтральнай плошчы горада. Потым яны асадзілі Альберта ў яго замку і вымусілі адмовіцца ад намеру правесці інквізіцыйны вышук. Глава ерэтыкоў П'емонта, Марцін Пастрэ, якога не здолелі арыштаваць п'емонцкія інквізітары, у той час знаходзіўся ў турме марсэльскага інквізітара Яна з Бадзіса[44]. Але праз тры гады дэ Кастэлярыа ўсё адно правёў вялікі інквізіцыйны працэс у крэпасці Джавэна, дзе былі асуджаныя каля 40 вальдэнсаў.

І гэта не адзіны прыклад, калі ерэтыкі (вальдэнсы ці катары) паўставалі супраць інквізітараў і іх памагатых – мясцовых святароў. Лорд Люцэрны атрымаў загад схапіць ерэтыкоў у сваіх землях у 1354 г., але тыя адказалі на гэта ўсплёскам гвалту. У 1363–1364 гг. супраць вальдэнсаў пад ціскам Папы Урбана IV аб'ядналіся марсэльскі і турынскі біскупы, граф Амадэй VI Савойскі і сенешаль Праванса, што прывяло да паўстання 1365 г.[45] У 1365 г. у Сузе быў забіты П'етра дзі Руфіа, інквізітар П'емонта[46]. У 1374 г. у Брыкеразіа адразу пасля пропаведзі быў забіты дамініканскі інквізітар Антоній Павота з Савільяна[47]. Іншага інквізітара, Барталамео да Чэрверэ, спасціг аналагічны лёс двума гадамі пазней. Насельнікі далін валодалі вялікім духам салідарнасці і часта выступалі, прычым не толькі са зброяй у руках супраць сваіх прыгнятальнікаў. Былі і спробы жыхароў даліны Перозы даць хабар службовым асобам герцага Савойскага Амадэя VIII у памеры 500 фларынаў штогадова ўзамен на недапушчэнне інквізіцыі ў сваю даліну[48].

На аўстрыйскіх землях, дзе супраць вальдэнсаў разгортваецца інквізіцыйны вышук, яны таксама адказваюць гвалтам: у 1328 г. у Крэмсе быў забіты інквізітар[49]. У Верхняй Аўстрыі ў 1395 г. у Штайры пад кіраўніцтвам пасаўскага біскупа Георга фон Гогенлоэ і Пятра Цвікера распачаўся

---

[43] Merlo, "La repressione antiereticale in Piemonte nel secolo XIV," 3–13.
[44] *Bullarium Franciscanum*, 530, doc. 987. [IV.i]
[45] Ли, *История инквизиции*.
[46] Cameron, *Waldenses*, 161; Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 151.
[47] Molnár, *Storia dei valdesi*, 93.
[48] Girolamo Amati, "Processus Contra Valdenses in Lombardia Superiori, Anno 1387," *Archivio Storico Italiano* 2, no. 1 (1865): pp. 3–61, 51.
[49] Leff, *Heresy*, 476–477.

інквізіцыйны пераслед. Тут з апошнім супрацоўнічалі свецкія ўлады: кашталян Генрых з Елкінгена і прыхадскі бенедыкцінскі святар Фрыдрых, які знайшоў інквізітару прытулак. У знак пратэсту вальдэнсы 8 верасня 1393 г. спалілі гумно Фрыдрыха (па некаторых звестках, дом разам з жыхарамі), і ў якасці папярэджання вывесілі на варотах галавешку і акрываўлены нож[50]. Той жа лёс чакаў і яго наступніка. З іншага боку, і сам П. Цвікер дзейнічаў тут больш радыкальна, чым на поўначы, у Шчэціне: колькасць спаленых намнога большая, тагачасныя хронікі налічваюць каля 1000 абвінавачаных і ад 80-і да 100 спаленых па абвінавачанні ў ерасі[51].

У 1340 г. на чэшскага інквізітара Гала быў здзейснены напад нейкім Альбертам[52], магчыма, вальдэнскім "настаўнікам", які помсціў за здзекі са сваіх адзінаверцаў[53]. У 1338 г. інквізітары вяртаюцца ў Йіндржыхув Градзец, але на гэты раз жыхары ідуць на ўзброенае паўстанне. "Найлепшы горад" графа Ульрыха III быў спалены[54]. Ён хацеў арганізаваць крыжовы паход у свае землі супраць ерэтыкоў, удзельнікі якога атрымалі б прывілеі аналагічна крыжакам у Святой Зямлі. Да гэтага часу захаваліся адпаведныя роспісы ў адной з залаў яго замка. Сам магнат накіраваўся разам з інквізітарам Галам у Авіньён, і па выніку атрымаў ад Папы Бенедыкта XII булу 6 сакавіка 1340 г., якая дазваляла яму знішчыць ерэтыкоў – "чужынцаў і немцаў". Акрамя духоўных, Ульрых павінен быў атрымаць і значныя эканамічныя даброты ад паходу: траціна канфіскаванага ішла на патрэбы інквізіцыі, астатняе – непасрэдна ў яго скарбніцу. Схопленых было настолькі многа, што яны не змяшчаліся ў турмы Йіндржыхува Градца і замка Ландштайн і таму былі часткова пераведзены ў Прагу. Папы Бенедыкт XII і Клемент VI у 1341 і 1346 гг. адпаведна давалі распараджэнні пра пабудову новых месцаў утрымання[55].

У гвалтоўных нападах на інквізітараў і манастыры, якія іх прымалі, маглі ўдзельнічаць не толькі самі вальдэнсы, але і каталікі-міране, якія ім спачувалі[56].

Адмаўленне гвалту застаецца, па меркаванні інквізітараў, характэрнай рысай веравучэння вальдэнсаў да самага канца XIV ст., але на практыцы ва ўмовах узмацнення інквізіцыйных рэпрэсій члены руху адыходзяць ад пацыфісцкіх перакананняў.

---

[50] Döllinger, *Beiträge*, 311 [VII.v.c]; Ghegoiu, *Waldensians at the Turn of the Fifteenth Century*, 13–15.

[51] Kieckhefer, *Repression*, 64; Välimäki, "Transfers of Anti-Waldensian Material," 157.

[52] "Cancelleria Arnesti. Formelbuch des Ersten Prager Erzbischofs Arnest von Pardubitz. Nach einer Handschrift der k. k. Universitätsbibliothek zu Prag," in *Archiv für Österreichische Geschichte*, vol. 61, 1880, pp. 267–597, 405.

[53] Holinka, "Sektářství v Čechách," 77.

[54] Holinka, "Sektářství v Čechách," 67.

[55] Molnár, *Storia dei valdesi*, 110.

[56] Ames, *Medieval Heresies*, 214.

Такім чынам, калі вылучыць вальдэнскія дагматы па найбольш прадстаўнічых крыніцах еўрапейскіх рэгіёнаў да пачатку XV ст., становіцца відавочным іх падзел на агульныя для ўсіх вальдэнсаў і адрозныя па розных частках Еўропы. Да агульных можна аднесці: адмаўленне чыстца, інстытута Каталіцкай Царквы і смяротнага пакарання; сцвярджэнне права міран (у далейшым – "настаўнікаў") на правядзенне таінстваў (у першую чаргу – прыняцця споведзі і адпушчэння грахоў) і неабходнасці пропаведзі. Важна адзначыць, што хоць апошні пункт з цягам часу пад уздзеяннем знешніх фактараў (інквізіцыйны ўціск) трансфармаваўся з пропаведзі публічнай у пропаведзь таемную, а таксама паўсюдна знікалі згадкі пра прапаведніц, але адбывалася гэта ва ўсіх рэгіёнах без істотных адрозненняў. Паўсюль прасочваецца высокая роля жанчын у станаўленні і развіцці руху, якая пачынаецца ад публічнай пропаведзі, але паступова абмяжоўваецца пропаведзю ўнутры сям'і і гасціннасцю ў дачыненні да вандроўных прапаведнікаў-настаўнікаў. Нягледзячы на вялікі тэрытарыяльны ахоп руху, сувязь паміж асобнымі рэгіёнамі існуе і ажыццяўляецца вандроўнымі прапаведнікамі, што дазваляе захаваць адзінства вальдызму.

З пачатку XIII ст., прыкладна з 1205 г. ("схізма" ламбардцаў і ўльтрамантанаў), праяўляюцца адрозненні ў вальдэнскім руху: адносна дапушчальнасці клятвы, працы і валодання маёмасцю, а таксама ўзброенага супраціўлення ўладам. Максімальнае разыходжанне з "класічным" вальдызмам (дзе ўсё пералічанае было строга забаронена) назіраецца ў XIV ст.

У XIV ст. у вальдэнскім руху максімальна праявіліся адаптыўныя рысы, адрозныя для кожнага рэгіёну. Ламбардыя застаецца духоўным цэнтрам руху, але з узмацненнем сіньярыяльнай улады ў гарадах-камунах вялікая колькасць вальдэнсаў перамяшчаецца ў цяжкадаступныя горныя раёны Заходніх Альпаў. Там яны атрымліваюць падтрымку мясцовага насельніцтва (пашыраючыся за яго кошт) і апеку феадалаў, што дазваляе ім выступаць супраць інквізіцыйнага пераследу са зброяй у руках, адкінуўшы забарону гвалту. Тое самае адбываецца і ў нямецкамоўных рэгіёнах, дзе вальдэнсы выразна адасабляюць сябе ад каталікоў.

У вольных імперскіх гарадах вальдэнскія абшчыны настолькі набіраюць моц, што іх члены займаюць найвышэйшыя пасады ў гарадскім магістраце. Гэта стала магчымым з-за адмовы ад першапачатковай забароны клясціся. Крыніцы ўказваюць на ўзбагачэнне некаторых вальдэнсаў. Умацаванне пазіцый руху вядзе да станаўлення легенды пра паходжанне вальдэнскага вучэння прама ад апосталаў.

Ва ўсіх вышэйпералічаных рэгіёнах забарона працы захавалася толькі для вальдэнскіх вандроўных прапаведнікаў-настаўнікаў; для простых вернікаў, наадварот, праца прымае значэнне выключнай важнасці, настолькі, што яны працуюць нават па нядзелях і па большасці царкоўных свят. Гэтая тэндэнцыя прасочваецца па ўсёй Еўропе, што дазваляе яшчэ раз засведчыць адзінства вальдэнскага руху.

Заключэнне

Рух вальдэнсаў нараджаецца з самой сутнасці заходнееўрапейскага грамадства канца XII ст., калі розныя яго групы чарговы раз сутыкнуліся з разыходжаннем першапачатковага апостальскага ідэалу з актуальным ладам жыцця каталіцкага духавенства. У сітуацыі адсутнасці на поўдні Францыі буйных ваенных канфліктаў і царкоўных рэформаў (Грыгарыянская рэформа ў свой час прыпыніла хуткае развіццё ерасяў) актыўная частка грамадства захацела спрычыніцца да пазітыўных змен у духоўным жыцці. Вальдэс, заможны жыхар горада Ліёна, шчыры каталік, быў часткай гэтага працэсу. З палымянай заўзятасцю ён аддаецца пашырэнню Божага слова, аплачвае пераклад Бібліі на "народную" мову і пачынае яе прапаведаваць. Натхняючыся правобразам каталіцкага "гарадскога святога" Алексія і апосталаў, ён і яго найбліжэйшыя паслядоўнікі выступаюць супраць тых, хто, з іх меркавання, парушае Гасподнія запаветы, – катараў. Фактычная забарона мірской пропаведзі Апостальскім Прастолам выводзіць вальдэнсаў за рамкі Каталіцкай Царквы і ў рэшце рэшт прыводзіць да асуджэння іх як ерэтыкоў. Выключэнне склалі групы "бедных каталікоў" і "бедных ізноў далучаных", якія на самым пачатку XIII ст. пажадалі вярнуцца ва ўлонне Каталіцкай Царквы для легальнай актыўнай супрацькатарскай асветніцкай і прапаведніцкай дзейнасці. З цягам часу з пасіянарнай часткі каталіцкага грамадства вальдэнсы ствараюць адасобленую хрысціянскую Царкву, у аснове вучэння якой ляжыць літаральнае разуменне біблейных запаветаў. Паступова рух дзеліцца на дзве непрапарцыйныя групы: адукаванае "святарскае" ядро і шырокае кола вернікаў. Чальцы першай падпарадкоўваліся строгім абмежаванням і займаліся навучаннем і споведдзю прадстаўнікоў другой.

Зараджэнне і першапачатковае распаўсюджанне руху адбываецца ў "біскупскім" горадзе Ліёне, у якім з 1173 г. (фактычна дата "павароту" Вальдэса) усёй паўнатой улады валодае архібіскуп. Калі горад апынуўся ў складзе Францыі, вальдэнсаў у ім ужо не было. І ў далейшым усе гарады, у якіх на пачатку свайго існавання сустракаюцца вальдэнсы, з'яўляліся вольнымі/імперскімі гарадамі. У гарадах заходняй часткі Свяшчэннай Рымскай Імперыі праходзілі найбольш маштабныя інквізіцыйныя працэсы над вальдэнсамі да пачатку XV ст. Абсалютная большасць гарадоў, дзе вальдэнсы сустракаліся ў вялікай колькасці, не знаходзіліся пад прамым кантролем цэнтральнай адміністрацыі, а кіравалася біскупамі і гарадскімі ўладамі. Гэта ўсё – развітыя гарады з моцнай эканомікай і вялікай колькасцю рамеснікаў і гандляроў, з якіх і паходзілі першыя вальдэнсы. Вальдызм найбольш лёгка пашыраўся ў памежных зонах, транзітных рэгіёнах

са змешаным насельніцтвам і эканамічна развітых гарадах, дзе існавала магчымасць лягчэй пазбегнуць інквізітарскага пераследу.

Ужо з канца XII ст. арыентацыя Вальдэса на пропаведзь абумовіла актыўны характар распаўсюджання вальдэнскага руху. У кожным рэгіёне ён ахопліваў свой пласт грамадства ў залежнасці ад грамадска-палітычнай сітуацыі на месцы.

У вольныя гарады, падначаленыя камунальным уладам або біскупам, вальдэнсы пранікалі найбольш лёгка, атрымліваючы падтрымку заможных купцоў і рамеснікаў. Асабліва хутка іх вучэнне знаходзіла сабе прыхільнікаў сярод ткачоў і гандляроў тканінамі. Гэта тэндэнцыя ярка праявіла сябе ў Фрыбуры, Страсбургу, Берне, Вроцлаве (Свідніцы), а таксама сярод ламбардскай галіны вальдэнсаў, якія нават стваралі асобныя "працоўныя злучэнні" ў гэтай сферы. Вальдэнскія вернікі (а, магчыма, і "настаўнікі") не цураліся працы, для паляпшэння свайго сацыяльнага статусу яны давалі клятвы і не звярталі ўвагу на негатыўныя маральныя наступствы валодання маёмасцю. Пры неабходнасці для сваёй абароны яны маглі прымяняць супрацьзаконныя метады, такія, як хабар і гвалт. Аднак, у адрозненне ад вальдэнсаў заходнеальпійскіх далінаў, якія карысталіся тымі самымі метадамі, "гарадскія" вальдэнсы былі выкрытыя інквізіцыяй і мясцовымі ўладамі да пачатку XV ст. Поспех карных аперацый супраць іх можа тлумачыцца адноснай нешматлікасцю і лёгкадаступнасцю гарадскога насельніцтва ў параўнанні з "горным". Акрамя гэтага, асаблівасцю ламбардскай галіны было развіццё ва ўмовах узаемаўплываў з іншымі ерэтычнымі рухамі на фоне палітычнай барацьбы гвельфаў і гібелінаў. У Сілезіі аналагічная барацьба праходзіла паміж польскімі біскупамі і нямецкімі гарадскімі элітамі. Параза апошніх паскорыла і змяншэнне вальдэнскай прысутнасці.

Распаўсюджванне руху на тэрыторыі Лангедока, Дафінэ, Бургундыі і Арагона ў першыя дзесяцігоддзі яго існавання адбывалася ва ўмовах актыўнай публічнай антыкатарскай пропаведзі членаў вальдэнскай абшчыны. Яны не проста не хаваліся, але нават вылучаліся сваім адзеннем і абрэзаным зверху абуткам, карысталіся сваім перакладам Біблії, аказвалі вернікам урачэбную дапамогу і праводзілі агульныя абеды на манер Святой Вячэры Хрыста. Але існаванне на гэтай тэрыторыі вальдэнсаў было найбольш кароткім: усе вандроўныя прапаведнікі і актыўныя члены руху былі выкрытыя і асуджаныя да сярэдзіны XIV ст., большасць вернікаў адвярнулася ад іх, а іншыя эмігравалі.

З пачатку XIV ст. на першы план выходзіць цяжкадаступны Заходнеальпійскі рэгіён, дзе вальдэнсы атрымліваюць падтрымку сярод усіх пластоў – ад буйных землеўладальнікаў Савоі (якая сама праводзіла асцярожную знешнюю палітыку, накіраваную на падтрыманне незалежнасці) да альпійскіх пастухоў. У сувязі з гэтым на фоне ўзмацнення інквізітарскага вышуку ў XIV ст. найбольшая канцэнтрацыя вальдэнсаў назіраецца менавіта тут, і менавіта ў альпійскіх далінах рух існуе і да нашых дзён.

Не ў апошнюю чаргу дзякуючы таму, што вальдэнсы гэтага рэгіёну адмовіліся ад першапачатковых забаронаў клятвы і гвалту.

На тэрыторыі Заходняга Памор'я і сучаснай Чэхіі вальдэнскі рух быў распаўсюджаны амаль выключна сярод нямецкамоўных каланістаў. Яго сацыяльнай апорай, у адрозненне ад вышэйзгаданых вольных гарадоў і гарадоў-камунаў, сталі дробныя гандляры і рамеснікі (часцей за ўсё ткачы) і часткова сяляне. Сярод іх назіраецца жорсткі падзел на вандроўных настаўнікаў-прапаведнікаў, выключна мужчынаў, і шырокія колы простых вернікаў, якія для выгляду наведвалі каталіцкія храмы, але, тым не менш, рэзка супрацьпастаўлялі сябе, "знаных і выпрабаваных людзей", "чужым" каталікам. Усе вальдэнсы рэгіёну прынцыпова не давалі клятвы, бо не былі шчыльна інтэграваныя ў мясцовае грамадства і маглі пазбегнуць яе публічнага прынясення, не выклікаючы падазрэнняў. Няма звестак пра высокі ўзровень пісьменства. На поўдні Багеміі, дзе колькасць вальдэнсаў была нават большай, чым на поўдні Францыі, зафіксаваны выпадак прымянення гвалту да інквізітара.

Верхняй храналагічнай мяжой для існавання вальдэнсаў у Заходняй Еўропе становіцца іх змяшэнне ў інквізітарскай практыцы і часткова масавай свядомасці з ведзьмамі на пачатку XV ст. З гэтага часу інквізітарскія працэсы перастаюць разглядаць вальдэнсаў асобна, часта блытаючы іх з ведзьмамі. Нельга сказаць, што вальдэнсы ў гэтым рэгіёне канчаткова знікаюць. Хутчэй мы перастаём атрымліваць дастаткова звестак пра іх, бо матэрыялы інквізітарскіх допытаў больш увагі пачынаюць надаваць ведзьмам. Праз стагоддзе маецца ўжо дастатковая колькасць непасрэдна вальдэнскіх крыніц, але тут вальдэнсы далучаюцца да больш маштабнага рэлігійнага руху – пратэстантызму, уліваючыся ў яго.

У Цэнтральнай Еўропе "пераходным" этапам ад чыстага вальдызму да пратэстантызму паслужыў гусіцкі рух. З моманту яго распаўсюджання (сярэдзіна XV ст.) крыніцы пачынаюць аб'ядноўваць паняцце "гусіт" і "вальдэнс", пераносячы першае, як больш шырокае, на другое, што не дазваляе праводзіць грунтоўныя даследаванні менавіта вальдызму. Да таго ж гусіцкая ідэалогія змяняе і само вальдэнскае вучэнне, усё больш і больш аддаляючы яго ад першапачатковых ідэй Вальдэса.

Такім чынам, існаванне "чыстага" вальдызму ўкладваецца ў перыяд паміж двума найбольш масавымі еўрапейскімі рэлігійнымі рухамі: катарскім і гусіцкім. Вальдэнсы ўзнікаюць на хвалі першага і часова гінуць у хвалях другога. У заходнеальпійскім рэгіёне пачынаючы з XV ст. вальдэнсы "хаваюцца" за вобразамі ведзьмаў, якія захопліваюць усе думкі інквізітараў.

Вызначальныя палажэнні веравучэння вальдэнсаў сфарміраваліся і былі выяўлены яшчэ першымі інквізітарамі ў канцы XII ст. Праз усе рэгіёны прасочваецца адмаўленне асноўных царкоўных палажэнняў, звязаных з чыстцом і ўвогуле клопатам пра замагільнае жыццё: ад выбару месца пахавання да "добрых спраў" на карысць памерлых; таксама адмаўленне ад правядзення асноўных абрадаў каталіцкімі святарамі, замяняючы іх

на сваіх вандроўных "настаўнікаў". Увогуле па ўсіх рэгіёнах пачынаючы з XIII ст. вальдэнсы супрацьпастаўляюць сябе Рымскай Царкве ў цэлым і Папу Рымскаму ў прыватнасці.

Паўсюдна супадала арганізацыя ўнутры абшчыны: вандроўныя "настаўнікі" знаходзіліся на ўтрыманні аселых вернікаў, якім яны прапаведавалі, у якіх прымалі споведзь і праводзілі сумесныя вячэры з асвячэннем хлеба. Гэтая традыцыя ўзнікла на сутоках двух памкненняў: літаральнага імітавання жыцця апосталаў у сімвалічнае супрацьстаянне з катарамі, якія адмаўлялі еўхарыстыю.

З аналізу крыніц вынікае адзіная арганізацыя вальдэнсаў Еўропы. Мелі месца пастаянныя міграцыі вальдэнскага насельніцтва і асабліва прапаведнікаў, якія праходзілі навучанне ў Ламбардыі.

Ва ўсіх рэгіёнах прасочваецца сінхроннае змяншэнне ролі жанчыны і ўзроўню адукаванасці "настаўніка". На раннім этапе існавалі вальдэнкі-прапаведніцы, якія нават мелі права здзяйсняць еўхарыстыю, а высокаадукаваныя "настаўнікі" цытавалі Гарацыя. Напрыканцы XIV ст. удзел жанчын у жыцці абшчыны канчаткова абмяжоўваецца ўцягненнем у секту мужа і дзяцей і гасцінным прыёмам "настаўнікаў". Апошнія цытуюць Біблію па памяці і вучаць ёй сваіх вернікаў, умеюць чытаць і пісаць, але малавераго дна, што змаглі б весці дэбаты на ўзроўні каталіцкіх біскупаў. Абшчыны ў розных частках Еўропы праходзяць розныя адрэзкі ў гэтай эвалюцыі. Шлях вальдэнсаў паўднёвай Францыі абрываецца на сярэдзіне, у той час як вальдэнсы-каланісты Польшчы і Чэхіі стартуюць ужо з апошняга этапа.

Усё гэта дазваляе пэўна абвергнуць тэзіс аб існаванні ў адзначаны час розных "вальдызмаў" і сцвярджаць аднароднасць, хоць і з рэгіянальнай спецыфікай, вальдэнскага руху.

Так званы "класічны" вальдызм з яго актыўнай прапаведніцкай пазіцыяй, адмовай ад працы для "настаўнікаў", маёмасці, клятвы і кровапраліцця сустракаецца ў чыстым выглядзе толькі на сваёй Радзіме – на поўдні сучаснай Францыі.

Вальдызм пачаўся з перакладу Бібліі і літаральнага трымання евангельскіх запаветаў. Але жыццё ў грамадстве ва ўмовах інквізіцыйнага перасле ду вымагала ад шараговых вернікаў прыстасавання і змякчэння суровых патрабаванняў Апосталаў. У такіх абставінах вальдэнская дактрына страчвае сваю біблійную скіраванасць і пурызм. У дадзеных, запісаных Пятром Цвікерам ад заходнепаморскіх вальдэнсаў, можна нават засведчыць элементы магіі. Усё гэта набліжае вальдэнскае вучэнне XIV ст. да народнай рэлігійнасці.

Народнае хрысціянства праяўляецца не толькі ў веры ў звышнатуральныя ўласцівасці асвечаных у царкве прадметаў. Вальдэнсы розных рэгіёнаў адмаўляюць каталіцкі дагмат пра чысцец і не надта клапоцяцца пра лёс душаў памерлых. Мала дадзеных пра вальдэнскія малітвы і дабрачыннасць, каб забяспечыць сваіх блізкіх лепшай доляй на тым свеце. Разам з тым ім неабходна дапамога святых у гэтым, рэальным жыцці, часта для

ўплыву на падзеі, якія знаходзяцца па-за кантролем чалавека, такія, як засуха або хвароба. Макс Вэбер вызначаў спробу такога ўздзеяння на боства з дапамогай сімвалічна рацыяналізаванай магіі як галоўнага элемента народнай рэлігійнасці. Вальдэнскія вернікі розных рэгіёнаў не адмаўляюць катэгарычна існавання святых, але звяртаюцца да сваіх "настаўнікаў" з просьбамі аб тлумачэннях, чаму святыя і Дзева Марыя не вартыя шанавання. Вальдэнскія "настаўнікі" выступаюць як пасярэднікі паміж гэтым і тым светам: яны лечаць накладаннем рук і "ходзяць да Бога" на той свет па кансультацыі, будучы яшчэ жывымі.

Вальдэнсы канца XIV ст. – ужо не проста "тэкстуальныя абшчыны", аб'яднаныя вакол напісанага тэксту. Наадварот, з развіццём руху назіраюцца нават канфлікты паміж выкшталцонымі "настаўнікамі", якія спрабуюць настойваць на літаральным трыманні Евангелля, і простымі вернікамі, якія ўсё адно звяртаюцца да Дзевы Марыі, ходзяць у паломніцтвы, цалуюць мошчы і часам аддаюць перавагу піву перад слуханнем пропаведзі.

Паблажлівае стаўленне да евангельскай забароны клятвы і кровапраліцця, заклікі адмовіцца ад працы дзеля назапашвання багацця, якія праяўляліся ў многіх рэгіёнах з цягам развіцця вальдэнскага руху, многімі даследчыкамі разглядаюцца як распад яго адзінства на многія "вальдызмы".

Я ж прапаную разгледзець гіпотэзу, што такая разнастайнасць стала вынікам пераходу вальдызму як дактрыны малой групы, якая вылучае сябе з грамадства, у народнае хрысціянства. Як сказаў мне ў 2021 г. вальдэнскі пастар, усе запаветы, якія мы маем ад Бога, накіраваныя на тое, каб спрасціць наша жыццё, а не ўскладніць яго. І калі нейкі запавет ускладняе наша жыццё – значыць, калісьці, для нашых продкаў, ён яго спрашчаў, а зараз патрабуе пераасэнсавання. Такім чынам і вальдэнскае вучэнне па меры яго пашырэння і набліжэння да шырокага кола вернікаў спрашчалася і трансфармавалася. Дазвалялася клятва, каб убудавацца ў феадальнае грамадства. Вальдэнсы бралі зброю ў рукі, каб абараніць сваё жыццё ад інквізітараў і крыжакоў, пры гэтым не адракаючыся ад сваёй веры, а, наадварот, заклікаючы Бога на дапамогу ў бітве.

Пераклады



I. Першыя дакументы па гісторыі вальдэнсаў

I.i Кніга відзежаў і цудаў

"Кніга відзежаў і цудаў" (Liber Visionum et Miraculorum)[1] – манускрыпт, які паходзіць з абацтва ў Клерво, з'яўляецца кампіляцыяй самых розных тэкстаў, што апісваюць тыповыя сярэднявечныя ўяўленні пра невытлумачальнае і звышнатуральнае. У апошняй, чацвёртай, частцы змяшчаецца сціслае апісанне павароту Вальдэса[2]. Дакумент не мае дакладнай даты, але мяркуецца, што ён быў складзены прыкладна ў 1178–1179 гг., што робіць яго самым раннім захаваным дакументам датычна вальдэнскага руху.

У Ліёнскай мітраполіі быў нейкі вельмі багаты і знакаміты чалавек, які раздаў беднякам усё што меў, і нічога сабе не пакінуў. Ён стаў настолькі бедным, што жабраваў і хадзіў ад аднаго дома да іншага, як і астатнія беднякі, у горадзе, дзе ён быў вядомы годнасцю і слаўны багаццем, выпрошваючы міласціну ў сваіх суседзяў, якія адварочваліся ад яго з агідай. Яны сабраліся вакол яго, каб даведацца прычыну такой раптоўнай і нечаканай, дзіўнай і ўражвальнай змены, і ён даў ім такі адказ: "Калі б, кажа ён, вы маглі б бачыць і верыць таксама, як і я бачыў будучыя катаванні і веру [у іх][3], то, магчыма, вы зрабілі б тое ж самае. Толькі праўда схаваная ад вашых вачэй, але хочаце вы ці не хочаце, даведаецеся на вопыце пра тое, у што цяпер адмаўляецеся верыць і чаго баіцеся"[4].

---

[1] У круглых дужках змяшчаюцца складаныя словы (некаторыя тапонімы і антрапонімы, назвы прафесій, рэчаў і г.д.) у тым выглядзе, як яны занатаваны ў крыніцы.

[2] Франчэска Таска не падзяляе меркавання пра тое, што гаворка ў тэксце ідзе пра Вальдэса. Francesca Tasca, "Sulla conversione religiosa di Valdesio. Per una rilettura dell'exemplum «De quodam divite sponte sua facto paupere»," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 197 (2005): 113–132.

[3] У квадратных дужках змяшчаюцца словы і выразы, якіх не было ў арыгінале крыніцы, але якія неабходны пры перакладзе для лепшай перадачы сэнсу.

[4] Rubellin, "Au temps où Valdès n'était pas hérétique".

I.ii Споведзі веры Вальдэса і яго паслядоўнікаў Дуранда з Оскі і Бернарда Прыма, а таксама статуты апошніх

I.ii.a Споведзь веры Вальдэса

У 1180 г. у Ліён для разбору спраў ерэтыкоў прыбыў кардынал-легат Генрык Марсі з Клерво, біскуп Альбана (прызначаны потым кардыналам-архібіскупам міланскім), а таксама Гідэфрыд з Асэра, абат Аткомба (таксама цыстэрцыянец, як і біскуп ліёнскі, але па сутнасці яго вораг[5]). Быў арганізаваны мясцовы сабор, на якім разглядаліся і справы вальдэнсаў[6]. На гэтым прадстаўнічым кансіліуме Вальдэс выступіў са сваім Веравызнаннем/Статутам (Propositum vitae). Ён прызнаваў: Тройцу; Апостальскі, Нікейскі і Афанасьеўскі сімвалы веры; боскае паходжанне Старога і Новага Запаветаў; боскае натхненне Яна Хрысціцеля; сапраўднае ўвасабленне Сына Божага і зямную прыроду Хрыста; адзіную Каталіцкую Царкву; сем таінстваў, нават калі яны здзяйсняюцца грэшнымі святарамі; Д'ябла, які робіць зло па сваім уласным жаданні, а не ад прыроды; неграхоўнасць ужывання мяса; уваскрэсенне ў сваёй уласнай плоці і ні ў якой іншай; дзейснасць дапамогі душам памерлых праз міласціну, малітвы і іншыя добрыя справы. Ніякіх звестак пра асуджэнне Вальдэса на гэтым саборы не засталося. Гідэфрыд з Асэра пазначае, што Вальдэс і яго прыхільнікі раскаяліся ў тым, што прапаведавалі, не атрымаўшы на гэта дазволу.

Захаваны запіс выступу Вальдэса мог не адлюстроўваць пункт погляду яго самога, а быць напісаным спецыяльна для яго царкоўнымі "экзаменатарамі"[7]. За аснову выступу ўзята споведзь Герберта дэ Аўрылака перад архібіскупам рэймскім у 991 г. Карані сягаюць значна глыбей, да Статута Старажытнай Царквы (Statuta Ecclesiae Antiqua) – калекцыі тэкстаў, якая ўзнікла ў Правансе напрыканцы V ст. і была ўключана ў шматлікія сярэднявечныя кодэксы, у тым ліку і ў Дэкрэты Грацыяна[8]. Але, у параўнанні са Статутам Старажытнай Царквы, да споведзі Вальдэса дададзеныя асабліва актуальныя для канца XII ст. адмаўленне разводу, пералік царкоўных таінстваў і важнасць ахвяраванняў і добрых спраў на карысць душаў памерлых[9]. Пазней формула Вальдэса паўсюдна выкарыстоўвалася пры паўторным далучэнні ерэтыкоў[10].

Споведзі веры Дуранда з Оскі, Бернарда Прыма з'яўляюцца цалкам каталіцкімі, у іх не прасочваецца ніякіх адрозных ад каталіцызму ідэй. Асноўная іх значнасць у раскрыцці пытання вальдэнскай гісторыі палягае ў выбары

---

[5] Rubellin, "Au temps où Valdès n'était pas hérétique".

[6] Тут і далей назва руху "Вальдэнсы" будзе пісацца з вялікай літары для візуальнага вылучэння ў тэксце.

[7] Molnár, *La protesta valdese*, 5.

[8] Rubellin, "Au temps où Valdès n'était pas hérétique".

[9] Michel Lauwers, "Dicunt vivorum beneficia nichil prodesse defunctis. Histoire d'un thème polémique (XIe–XIIe siècles)," in *Inventer l'hérésie ? Discours polémiques et pouvoirs avant l'inquisition* (Nice: Centre d'Études Médiévales, Faculté des Lettres, Art et Sciences Humaines, Université de Nice Sophia-Antipolis, 1998), pp. 157–192, 162.

[10] Russell, *Dissent and Reform*, 196-97.

тэзісаў, якія пастулююцца: гэта фактычнае адмаўленне ад катарскай дактрыны. Умоўна тэзісы можна падзяліць на чатыры групы:

1. настойлівае прызнанне дагмату аб Тройцы;
2. прызнанне ролі Бога ў стварэнні матэрыяльнага Сусвету;
3. шырокае прызнанне царкоўных парадкаў: павага да царкоўнай іерархіі, яўна антыданатысцкія пазіцыі, поўны спіс царкоўных таінстваў, важнасць дзеянняў на карысць памерлых...;
4. аб'яўленне кірунку на апостальскае жыццё[11].

Больш інфармацыі пра вальдэнскае вучэнне дае разгорнутая споведзь Бернарда Прыма, у якой ён раскайваецца ў былых "памылках". Ужо ў гэтым тэксце Вальдэс ужывае для самаідэнтыфікацыі прыметнік "бедныя"[12], што будзе потым з'яўляцца базавым элементам саманазвы розных вальдэнскіх груп.

У імя Айца, і Сына, і Святога Духа, а таксама самай праведнай і заўсёды беззаганнай Марыі. Няхай будзе вядома між усімі вернікамі, што я, Вальдэс (Valdesius), і ўсе мае браты, маючы перад усім нашы свяшчэнныя Евангеллі, сэрцам верым, спасцігаем душой, вуснамі вызнаём і простымі словамі сцвярджаем, што Айцец, і Сын, і Святы Дух – тры асобы, адзіны Бог, і ўся Боская Тройца, суіснуючая, суадзінаісная, і сувечная, і ўсемагутная, і кожная асоба ў Тройцы – Бог, і ўсе тры асобы – адзіны Бог, як і ў Credo in Deum, і ў Credo in unum Deum, і ў Quicumque vult[13] утрымліваецца.

І ён – Айцец, і Сын, і Святы Дух – адзіны Бог, пра якога наша прамова, творца, і аўтар, і валадар, у належным месцы і ў належны час, распарадчык усяго бачнага і нябачнага, нябесных целаў і паветраных, водных і зямных, сэрцам і вуснамі верым і сцвярджаем.

Мы верым, што ў Новага і Старога Запаветаў, а менавіта ў законаў Мацвея, у Прарокаў, і апосталаў, адзін і той жа аўтар – Бог, які ў Тройцы, як было сказана, прабывае, ён стварыў усё; і што Ян Хрысціцель ад свайго нараджэння святы і справядлівы і напоўніўся Святым Духам ва ўлонні маці сваёй.

Сэрцам верым і вуснамі сцвярджаем, што боскае ўвасабленне адбылося не ў Айцы, не ў Духу Святым, а толькі ў Сыне, як ён быў у боскасці Бога Айца Сын, Бог сапраўдны ад Айца, а сапраўдны чалавек ад маці, мае сапраўдную плоць ад матчынага ўлоння, і разумную чалавечую душу, у ім разам падвойная натура, а менавіта Бог і чалавек, адна асоба, адзіны Сын, адзіны Хрыстос, адзіны Бог з Айцом і Духам Святым, валадар і творца ўсяго [існага], народжаны ад Дзевы Марыі сапраўдным цялесным нараджэннем; ён і еў, і піў, і спаў, і адпачываў, стомлены ад дарогі; ён, які цярпеў пакуты ад сваёй сапраўднай плоці і які памёр сапраўднай цялеснай сваёй смерцю, уваскрос сапраўдным уваскрэсеннем сваёй плоці і ўзнаўленнем душы, у якой [плоці] пасля еў і піў, узнёсся на неба, сядзіць па правы бок ад Айца і які ў гэтай жа [плоці] пойдзе судзіць жывых і мёртвых, сэрцам верым і вуснамі сцвярджаем.

Верым у адзіную каталіцкую, святую, апостальскую і бязгрэшную Царкву, па-за якой ніхто не выратуецца.

---

[11] Rubellin, "Au temps où Valdès n'était pas hérétique".

[12] Merlo, "Pauperes spiritu valdesi," 16.

[13] Сімвалы веры: Апостальскі, Нікеа-Царградскі і Афанасьеўскі адпаведна.

Таінствы ж, якія ў ёй здзяйсняюцца, пры садзеянні незлічонай і нябачнай ласкі Духа Святога, могуць адпраўляцца грэшнымі святарамі, пакуль Царква гэта прымае, мы ніякім чынам не асуджаем і не ўзводзім паклёп на царкоўныя імшы[14] ці дабраславенні, што імі ажыццяўляюцца, а, наадварот, прымаем добразычліваю душою як ад самага праведнага.

Мы ўхваляем, такім чынам, хрышчэнне немаўлят, каб, калі яны памруць пасля хрышчэння, але перш, чым саграшыць, мы верым, што яны будуць выратаваныя.

Мы верым, што ў сапраўдным хрышчэнні ўсе грахі, як першародны грэх, так і тыя, што здзяйсняюцца па сваёй волі, адпускаюцца.

Мы лічым, што і канфірмацыя таксама, якая здзяйсняецца біскупам праз ускладанне рук, павінна прымацца як святое і вартае шанавання.

Мы цвёрда верым і проста сцвярджаем, што ахвяра, гэта значыць – хлеб і віно, пасля асвячэння – Цела і Кроў Ісуса Хрыста, ад добрага святара здзяйсняецца не больш, а ад дрэннага не менш.

Мы згаджаемся, што грэшнікам, якія раскайваюцца сэрцам і спавядаюцца вуснамі, [а таксама] справамі паводле Біблііі апраўдваюцца, можа быць дадзена міласць ад Бога, і з імі з найвялікшай радасцю злучаемся.

Мы шануем памазанне нямоглых асвечаным алеем.

Мы не адмаўляем, што паводле Апостала шлюбы павінны быць заключаны, мы забараняем разрываць [шлюб], сапраўды заключаны згодна з правіламі, а таксама асуджаем паўторныя шлюбы.

Мы пакорліва ўсхваляем і шчыра шануем царкоўныя пасады, якімі з'яўляюцца [пасады] біскупа ды прэсвітара і астатнія, [што] вышэй і ніжэй, і ўсё, што ў Царкве па парадку святым прымаецца ці абвяшчаецца.

Мы верым, што Д'ябал робіць зло не праз стварэнне[15], а па адвольным жаданні.

Менш за ўсё асуджаем мы ўжыванне мяса/спазнанне плоці[16].

Сэрцам верым і вуснамі сцвярджаем уваскрэсенне ў той плоці, якую мы пакуль носім, і ніякай іншай.

Мы цвёрда верым і сцвярджаем, што будзе суд і на ім кожны ў адпаведнасці з тым, якую плоць меў, атрымае ці ўзнагароду, ці пакаранне. Мы не сумняваемся, што міласціна, ахвярапрынашэнні і іншыя дабрачыннасці вернікаў могуць быць карыснымі памерлым.

І паколькі вера, паводле слоў Апостала Якуба, "бязь дзеяў мёртвая" (Іак 2:26), [то] мы адракліся ад свету і ад таго, што мелі, як было прадпісана Богам, і раздалі [маёмасць, грошы] бедным і вырашылі [самі] быць беднымі; такім чынам, паколькі мы не клапоцімся пра заўтрашні дзень, [то] ні золата, ні срэбра ці што-небудзь такое іншае, акрамя харчу і адзежы паўсядзённай, ад каго-небудзь мы не прымаем[17].

Мы прынялі рашэнне трымацца евангельскіх парад, як прадпісана.

---

[14] Лацінскія тэрміны "officium" і "messa" ў значэнні царкоўнай цырымоніі будуць перакладацца як "імша".

[15] Д'ябал робіць зло не таму, што яго такім стварыў Бог і ён не можа інакш, а па сваім уласным жаданні.

[16] Роўнамагчымы абодва варыянты перакладу.

[17] Алюзія на Мф 10.

Мы прызнаём і верым, што, з іншага боку, тыя, хто застаецца ў свеце са сваёй маёмасцю, але з яе ахвяруюць міласціну і робяць іншыя добрыя справы, тыя, хто трымаецца прадпісанага Богам, будуць, бясспрэчна, выратаваныя.

Таму мы цалкам пакідаем на ваша вырашэнне, што калі здарыцца так, што некаторыя прыйдуць да вас, кажучы, што яны ад нас, не прымаючы б гэтай веры, вы б дакладна ведалі, што яны не ад нас[18].

I.ii.b Булы Папы Рымскага Інакенція III датычна Дуранда з Оскі

Гэтыя булы былі накіраваныя Дуранду з Оскі, прэлатам Тарагоны, Мілана, Нарбоны, Элена, Марсэля, Барселоны, а таксама каралю Арагонскаму ў 1208–1212 гг.

Вальдэнс Дуранд з Оскі выказаў поўную лаяльнасць да Папы і стварыў аб'яднанне "бедных каталікоў" (якое планавалася зацвердзіць як манаскі ордэн), да якога прапанаваў далучыцца ўсім вальдэнсам. Але пагадзілася толькі невялікая частка, астатнія адмовіліся.

[18] Selge, *Die ersten Waldenser*, vol. 2. 3–6.

CXCVI. ARCHIEPISCOPO ET SUFFRAGANEIS TERRACONENSIS ECCLESIAE. De negotio Durandi de Osca et sociorum ejus. [1510A]

[1509] Ejus exemplo qui non est Deus dissensionis, sed pacis, volens omnes homines salvos fieri et ad agnitionem veritatis venire, venientes ad apostolicam sedem dilectos filios Durandum de Osca et socios ejus paterna benignitate suscepimus, et ea quae nobis tam pro se quam pro fratribus suis exponere curaverunt pleno concepimus intellectu. Ex iis ergo quae nobis de articulis fidei et sacramentis Ecclesiae diligenter examinati dixerunt cognovimus eos fidem sapere orthodoxam et Catholicam astruere [1510B] veritatem. Ad majorem tamen expressionem appositis evangeliis, et scripto confessionis eorum imposito super illa, recepimus ab eis hujusmodi juramentum: Ego, inquit, Durandus de Osca inter manus tuas consecratas, summe pontifex domine Innocenti, Deum invoco testem in animam meam quod ita simpliciter et veraciter credo sicut in hoc scripto per omnia continetur, et contrarium nunquam credam, sed contrarium credentibus pro posse resistam.

196. АРХІБІСКУПУ І ПАДНАЧАЛЕНЫМ ЯГО Ў ЦАРКВЕ ТАРАГОНЫ. Пра справу Дуранда з Оскі і яго паплечнікаў.

Па прыкладу таго, хто з'яўляецца не Богам разладу, а міру, які хоча, каб усе людзі былі беззаганныя і прыйшлі да пазнання ісціны, мы прынялі з бацькоўскай ласкай улюбёнага сына Дуранда з Оскі і яго паплечнікаў, якія прыбылі да Апостальскага Прастола, і мы цалкам прымаем тое, што яны паклапаціліся звярнуцца да нас як за сябе, так і за сваіх братоў. З гэтага вынікае, што яны былі намі старанна апытаны па дагматах веры і царкоўных таінствах, і мы зразумелі, што яны спавядаюць артадаксальную і каталіцкую веру і ўмацоўваюць ісціну. Аднак для большай упэўненасці, паклаўшы Евангеллі і запісаўшы іх споведзі веры, складзеныя над імі, мы ўзялі з іх такую клятву: Я, сказаў, Дуранд з Оскі, у тваіх асвечаных руках, Найвышэйшы Пантыфік Уладар Інакенцій, заклікаю Бога сведкам у маёй душы, што так проста і сапраўды веру, як у гэтым тэксце сказана, і нічому процілегламу не паверу,

Tibi vero tanquam beati Petri apostoli successori et archiepiscopis et episcopis aliisque praelatis in quorum dioecesibus vel parochiis commorabor obedientiam et reverentiam exhibebo tam debitam quam devotam. Scriptum autem confessionis est tale.

[1510C] «Pateat omnibus fidelibus quod ego Durandus de Osca et I. et E. et B. et omnes fratres nostri corde credimus, fide intelligimus, ore confitemur, et simplicibus verbis affirmamus Patrem et Filium et Spiritum sanctum tres personas esse, unum Deum, totamque Trinitatem coessentialem et consubstantialem et coaeternalem et omnipotentem, et singulas quasque in Trinitate personas plenum Deum; sicut in Credo in Deum, et in Credo in unum Deum, et in Quicunque vult continetur. Patrem quoque et Filium et Spiritum sanctum unum Deum, de quo nobis sermo, esse creatorem, factorem, gubernatorem et dispositorem omnium corporalium et spiritualium, visibilium et invisibilium, corde credimus et ore confitemur. Novi et Veteris Testamenti [1510D] unum eumdemque auctorem credimus esse Deum, qui in Trinitate, ut dictum est, permanens de nihilo cuncta creavit, Joannemque Baptistam ab ipso missum esse sanctum et justum et in utero matris suae Spiritu sancto repletum. Incarnationem divinitatis non in Patre nec in Spiritu sancto factam, sed in Filio tantum, corde credimus et ore confitemur; ut qui erat in divinitate Dei Patris Filius, Deus verus ex Patre, esset in humanitate hominis Filius, homo verus ex matre, veram carnem habens ex visceribus matris [1511A] et animam humanam rationabilem, simul utriusque naturae, id est Deus et homo, una persona, unus Filius, unus Christus, unus Deus cum Patre et Spiritu sancto, ominium auctor et rector, natus ex Virgine Maria vera carnis nativitate, manducavit et bibit, dormivit et fatigatus ex itinere quievit, passus vera carnis suae

[а] тым, хто верыць у адваротнае, па магчымасці буду процістаяць. Табе ж, як праведнаму Апосталу Пятру, і архібіскупам, і біскупам, і іншым прэлатам, у чыіх дыяцэзіях ці парафіях я спынюся, я павінен набожна выказваць павагу і павінавацца так, як трэба. Запісаная споведзь веры ж такая:

"Няхай будзе вядома ўсім вернікам, што я, Дурандз Оскі, і І., і Е., і В. і ўсе браты нашы сэрцам верым, спасцігаем душой, вуснамі вызнаём і простымі словамі сцвярджаем, што Айцец, і Сын, і Святы Дух – тры асобы, адзіны Бог, і ўся Тройца, суіснуючая, суадзінаісная, і сувечная, і ўсемагутная, і кожная асоба ў Тройцы – Бог, як і ў Credo in Deum, і ў Credo in unum Deum, і ў Quicumque vult[19] утрымліваецца. І Айцец, і Сын, і Святы Дух – адзіны Бог, пра якога наша прамова, творца, і аўтар, і валадар, і распарадчык усяго цялеснага і духоўнага, бачнага і нябачнага, сэрцам і вуснамі верым і сцвярджаем. Мы верым, што ў Новага і Старога Запаветаў адзін і той жа аўтар – Бог, які ў Тройцы, як было сказана, прабывае, ён стварыў з нічога ўсё; і што Ян Хрысціцель ад свайго нараджэння святы і справядлівы і напоўніўся Святым Духам ва ўлонні маці сваёй. Сэрцам верым і вуснамі сцвярджаем, што боскае ўвасабленне адбылося не ў Айцы, не ў Духу Святым, а толькі ў Сыне, як ён быў у боскасці Бога Айца Сын, Бог сапраўдны ад Айца, а сапраўдны чалавек ад маці, мае сапраўдную плоць ад матчынага ўлоння і разумную чалавечую душу, у ім разам падвойная натура, а менавіта Бог і чалавек, адна асоба, адзіны Сын, адзіны Хрыстос, адзіны Бог з Айцом і Духам Святым, валадар і творца ўсяго [існага], народжаны ад Дзевы Марыі сапраўдным цялесным нараджэннем; ён і еў, і піў, і спаў, і адпачываў, стомлены ад дарогі; ён, які

[19] Сімвалы веры: Апостальскі, Нікеа-Царградскі і Афанасьеўскі адпаведна.

passione, mortuus vera corporis sui morte, et resurrexit vera carnis suae resurrectione et vera animae ad corpus resumptione; in qua postquam manducavit et bibit, ascendit in coelum, sedet ad dexteram Patris, et in eadem venturus est judicare vivos et mortuos. Corde credimus et ore confitemur unam Ecclesiam, non haereticorum, sed sanctam Romanam catholicam et apostolicam, extra quam neminem salvari credimus. Sacramenta quoque [1511B] quae in ea celebrantur inaestimabili atque invisibili virtute Spiritus sancti cooperante, licet a peccatore sacerdote ministrentur, dum Ecclesia eum recipit, in nullo reprobamus, nec ecclesiasticis officiis vel benedictionibus ab eo celebratis detrahimus, sed benivolo animo tanquam a justissimo amplectimur; quia non nocet malitia episcopi vel presbyteri neque ad baptismum infantis, neque ad eucharistiam consecrandam, nec ad caetera ecclesiastica officia subditis celebrata. Approbamus ergo baptismum infantium; qui si defuncti fuerint post baptismum antequam peccata committant, fatemur eos salvari et credimus; et in baptismate omnia peccata, tam illud originale peccatum contractum, quam illa [1511C] quae voluntarie commissa sunt, dimitti credimus. Confirmationem ab episcopo factam, id est impositionem manuum, sanctam et venerande accipiendam esse censemus. Sacrificium, id est panem et vinum, post consecrationem esse verum corpus et verum sanguinem Domini nostri Jesu Christi firmiter et indubitanter corde puro credimus et simpliciter verbis fidelibus affirmamus; in quo nihil a bono majus, nec a malo minus perfici credimus sacerdote; quia non in merito consecrantis, sed in verbo efficitur Creatoris et in virtute Spiritus sancti. Unde firmiter eredimus et confitemur quod quatumcunque quilibet honestus religiosus sanctus et prudens sit, non potest nec debet eucharistiam consecrare nec altaris sacrificium conficere nisi sit

цярпеў пакуты ад сваёй сапраўднай плоці і які памёр сапраўднай цялеснай сваёй смерцю, уваскрос сапраўдным уваскрэсеннем сваёй плоці і ўзнаўленнем душы, у якой [плоці] пасля еў і піў, узнёсся на неба, сядзіць па правы бок ад Айца і які ў гэтай жа [плоці] пойдзе судзіць жывых і мёртвых, сэрцам верым і вуснамі сцвярджаем. Верым у адзіную, не ерэтычную, а святую Рымскую, каталіцкую і апостальскую Царкву, па-за якой ніхто не выратуецца. Таінствы ж, якія ў ёй здзяйсняюцца, пры садзеянні незлічонай і нябачнай ласкі Духа Святога, могуць удзяляцца грэшнымі святарамі, пакуль Царква гэта прымае, мы ніякім чынам не асуджаем і не ўзводзім паклёп на царкоўныя імшы ці дабраславенні, што імі ажыццяўляюцца, а, наадварот, прымаем добразычліваю душою як ад самага праведнага, бо заганнасць ні біскупа, ні прэсвітара не шкодзіць ні хрышчэнню немаўля, ні асвячэнню еўхарыстыі, ні астатнім абрадам, якія праводзяцца Царквой. Мы ўхваляем, такім чынам, хрышчэнне немаўлят, каб, калі яны памруць пасля хрышчэння, але перш, чым саграшыць, мы верым, што яны будуць выратаваныя. Мы верым, што ў хрышчэнні ўсе грахі, як першародны грэх, так і тыя, што здзяйсняюцца па сваёй волі, адпускаюцца. Мы лічым, што канфірмацыя, якая здзяйсняецца біскупам праз ускладанне рук, павінна прымацца як святое і вартае шанавання. Мы цвёрда і без сумневу чыстым сэрцам верым і простымі надзейнымі словамі сцвярджаем, што ахвяра, гэта значыць – хлеб і віно, пасля асвячэння – сапраўды Цела і сапраўды Кроў Госпада нашага Ісуса Хрыста, ад добрага святара здзяйсняецца не больш, а ад дрэннага не менш; бо вы асвячаеце не ў віне, а ў слове, якое было сказана Творцам, і ў сіле Духа Святога. Адкуль цвёрда верым і спавядаем, што любы, які б не быў дабрачынны, набожны, разважны і святы, не можа і

presbyter a visibili [1511D] et tangibili episcopo regulariter ordinatus. Ad quod officium tria sunt, ut credimus, necessaria, scilicet certa persona, idem presbyter ab episcopo, ut praediximus, ad illud proprie officium constitutus, et illa solemnia verba quae a sanctis Patribus in canone sunt expressa, et fidelis intentio proferentis. Ideoque firmiter credimus et fatemur quod quicunque sine praecedenti ordinatione episcopali, ut praediximus, credit et contendit se posse sacrificium eucharistiae facere, haereticus est et perditionis Chore et suorum complicum est particeps atque consors et ab omni sancta Romana Ecclesia segregandus. Peccatoribus [1512A] vere poenitentibus veniam concedi a Deo credimus, et eis libentissime communicamus. Unctionem infirmorum cum oleo consecrato veneramur. Conjugia carnalia esse contrahenda secundum Apostolum non negamus, ordinarie vero contracta disjungere omnino prohibemus. Hominem quoque cum sua conjuge salvari credimus et fatemur; nec etiam secunda vel ulteriora matrimonia condemnamus. Carnium perceptionem minime culpamus. Non condemnamus juramentum, imo credimus puro corde quod cum veritate et judicio et justitia licitum sit jurare. [[(113) [1512D] Haec addita sunt ex libro XIII.] de potestate saeculari asserimus quod sine peccato mortali potest judicium sanguinis exercere, dummodo ad inferendam vindictam, non odio, sed judicio, non incaute sed consulte procedat.] Praedicationem [1512B] necessariam valde et laudabilem esse credimus; tamen ex auctoritate vel licentia summi pontificis vel praelatorum permissione illam credimus exercendam. In omnibus vero locis ubi manifesti haeretici manent, et Deum et fidem sanctae Romanae Ecclesiae abdicant et blasphemant, credimus quod disputando et exhortando modis omnibus secundum Deum debeamus illos confundere et eis verbo Dominico, veluti Christi et Ecclene павінен ні здзяйсняць еўхарыстыю, ні асвячаць алтары, калі не з'яўляецца прэсвітарам, пасвечаным у сан біскупам згодна з правіламі бачна і матэрыяльна. Для гэтых абрадаў неабходна, як мы верым, тры ўмовы, а менавіта вызначаны чалавек, такі як прэсвітар, прызначаны, як мы сказалі раней, біскупам для здзяйснення гэтага абраду, і гэтыя ўрачыстыя словы, якія замацаваны ў каноне святымі Айцамі, і сіла веры таго, хто [абрад] здзяйсняе. І таму мы цвёрда верым і абвяшчаем, што калі хто-небудзь без папярэдняга біскупскага пасвячэння, як мы ўжо казалі, верыць і сцвярджае, што ён можа здзяйсняць абрад еўхарыстыі, [то] ён – ерэтык і замешаны ў пагібелі звязаных з ім, а таксама родных, і павінен быць адлучаны ад усёй святой Рымскай Царквы. Мы верым, што грэшнікам, якія сапраўды раскайваюцца, дадзена міласць ад Бога, і з імі з найвялікшай радасцю злучаемся. Мы шануем памазанне нямоглых свяшчэнным алеем. Мы не адмаўляем, што паводле Апостала шлюбы павінны быць заключаны, мы забараняем разрываць [шлюб], сапраўды заключаны згодна з правіламі. Мы верым і прызнаём, што чалавек, які мае сужэнца, выратуецца, а таксама не асуджаем паўторныя шлюбы. Менш за ўсё мы асуджаем ужыванне мяса/спазнанне плоці[20]. Не асуджаем клятвы, наадварот, мы верым чыстым сэрцам, што з ісцінай, праўдзівасцю і справядлівасцю дазволена клясціся. (Адносна свецкай улады мы прызнаём, што суд можа без смяротнага граху здзяйсняць кровапраліццё, пакуль не для здзяйснення помсты, не з нянавісці, але дзеля судовай справы, не нядбала, а абачліва дзейнічае)[21]. Мы верым, што пропа-

[20] Роўнамагчымы абодва варыянты перакладу.

[21] Выдавец пазначыў, што гэты сказ дададзены з амаль аналагічнага іншага ліста.

siae adversariis, fronte usque ad mortem libera contraire. Ordines vero ecclesiasticos et omne quod in sancta Romana Ecclesia sancitum legitur aut canitur humiliter collaudamus et fideliter veneramur. Diabolum, non per conditionem, sed per arbitrium, malum esse factum credimus. Corde credimus et ore confitemur hujus [1512C] carnis quam gestamus et non alterius resurrectionem. Judicium quoque per Jesum Christum esse futurum, et singulos pro iis quae in hac carne gesserunt recepturos vel poenas vel praemia firmiter credimus et affirmamus. Eleemosynas, sacrificium, caeteraque beneficia fidelibus posse prodesse defunctis credimus. Remanentes in saeculo et suas possidentes eleemosynas et caetera ex rebus suis agentes, praecepta Domini servantes salvari fatemur et credimus. Decimas, primitias et oblationes ex praecepto Domini credimus clericis persolvendas.»

ведзь вельмі неабходна і ўхвальна; але мы верым, што гэта здзяйсняецца з прадпісання ці права Вярхоўнага Пантыфіка, ці з дазволу прэлатаў. Ва ўсіх жа месцах, дзе застаюцца яўныя ерэтыкі і выракаюцца Бога і святой Рымскай Царквы і блюзнераць, мы верым, што, вытлумачваючы і пабуджаючы ўсімі спосабамі згодна з Богам, мы павінны іх далучыць, і ім, па словах Дамініка, як праціўнікам Хрыста і Царквы, да самай смерці неабмежавана процідзейнічаць. Мы пакорліва ўсхваляем і шчыра шануем царкоўныя пасады і ўсё, што ў святой Рымскай Царкве святым прымаецца ці абвяшчаецца. Мы верым, што Д'ябал робіць зло не праз стварэнне[22], а па адвольным жаданні. Сэрцам верым і вуснамі сцвярджаем уваскрэсенне ў той плоці, якую мы пакуль носім, і ніякай іншай. Мы цвёрда верым і сцвярджаем, што будучы суд Ісуса Хрыста таксама адзіны адносна таго, хто якую плоць меў, прыме ці ўзнагароду, ці пакаранне. Мы верым, што міласціна, ахвярапрынашэнні і іншыя дабрачыннасці вернікаў могуць быць карыснымі памерлым. Мы прызнаём і верым, што тыя, хто застаецца ў свеце, і іх маёмасць, і міласціна, і іншыя іх [жывых] справы, калі трымаюцца прадпісанага Богам, будуць, бясспрэчна, выратаваныя. Мы верым, што дзесяціна, першыя плады і ахвяраванні выплачваюцца клірыкам па настаўленні Гасподнім".

Quia vero non solum fides recta, sed bona etiam operatio exigitur ad salutem, quoniam sicut sine fide impossibile est placere Deo, ita fides sine operibus mortua [1512D] est, propositum quoque conversationis eorum praesenti paginae duximus adnotandum; cujus tenor est talis:

Паколькі да выратавання прама вядуць не толькі вера, але і добрыя справы, бо як без веры немагчыма падабацца Богу, так і вера "бязь дзеяў мёртвая" (Іак 2:26), і таму намеры іх дзеянняў змешчаныя ў лісце з заўвагамі, які мы прыкладаем. Яго тэкст такі:

[22] Д'ябал робіць зло не таму, што яго такім стварыў Бог і ён не можа інакш, а па сваім уласным жаданні.

«Ad honorem Dei et ejus Ecclesiae Catholicae, et ad salutem animarum nostrarum, fidem Catholicam per omnia et in omnibus integram et inviolatam corde credere et ore proposuimus confiteri sub magisterio et regimine Romani pontificis permanendo. Saeculo abrenuntiavimus, et quae habebamus, velut a Domino consultum est, pauperibus erogavimus, et pauperes esse decrevimus; ita quod de crastino solliciti esse non curamus, nec aurum nec argentum [1513A] vel aliquod tale praeter victum et vestitum quotidianum a quoquam accepturi sumus. Consilia evangelica velut praecepta servare proposuimus, orationi juxta horas canonicas septies insistentes, dicendo quindecies Pater noster, insuper Credo in Deum, et Miserere mei, Deus, et orationes alias. Cum autem ex magna parte clerici simus et pene omnes litterati, lectioni, exhortationi, doctrinae et disputationi contra omnes errorum sectas decrevimus desudare. Disputationes tamen a doctioribus fratribus in fide catholica comprobatis et instructis in lege Domini dispensentur, ut adversarii catholicae et apostolicae fidei confundantur. Per honestiores autem et instructiores in lege Domini et in sanctorum Patrum sententiis verbum Domini censuimus [1513B] proponendum in schola nostra fratribus et amicis, cum praelatorum vero licentia et veneratione debita, per idoneos et instructos in sacra pagina fratres, qui potentes sint in sana doctrina arguere gentem errantem et ad fidem modis omnibus trahere et in gremio sanctae Romanae Ecclesiae revocare. Virginitatem et castimoniam continuam inviolabiliter conservando, duas quadragesimas et jejunia secundum ecclesiasticam regulam instituta annis singulis facere proposuimus. Religiosum et modestum habitum ferre decrevimus, qualem consuevimus deportare, calceamentis desuper apertis ita speciali signo compositis et variatis ut aperte et lucide cognoscamur nos esse, sicut corde, sic

“Да славы Бога і яго Каталіцкай Царквы і для выратавання душаў нашых мы заявілі, што будзем належаць да веры каталіцкай, чыстай і непарушнай, праз усё і ад усяго сэрца прызнаваць, што мы знаходзімся пад кіраўніцтвам Рымскага Пантыфіка. Мы адракліся ад свету і ад таго, што мелі, як было прадпісана Богам, і раздалі грошы і маёмасць бедным, і вырашылі самі быць беднымі. Такім чынам, паколькі мы не трывожымся за заўтрашні дзень, то ні золата, ні срэбра, ні штонебудзь такое іншае, акрамя харчу і адзення штодзённага, мы ні ад кога не прымаем[23]. Мы прынялі рашэнне трымацца евангельскіх парад, як прадпісана, мы аддаёмся малітвам у кананічныя часы сем разоў, прамаўляючы пятнаццаць разоў “Ойча наш”, а ў дадатак “Сімвал веры” і “Змілуйся над намі” і іншыя. З іншага боку, паколькі ў большасці сваёй мы з’яўляемся клірыкамі і амаль усе пісьменныя, мы вырашылі старанна змагацца супраць усіх сектаў падману праз тэксты, казанні, навуковыя працы і дыспуты. Аднак дыспуты кіруюцца самымі адукаванымі братамі, якія даказалі адданасць каталіцкай веры і дасведчаны ў Законе Божым, каб заблытаць праціўнікаў каталіцкай і апостальскай веры. Але больш паважаных і дасведчаных у Законе Божым і ў прамовах Святых Айцоў мы прызначылі выкладаць слова Госпада ў нашых школах братам і сябрам, згодна з дазволам і належным шанаваннем прэлатаў. Праз годных і дасведчаных у Святым Пісанні братоў, якія маглі б праз выратавальнае вучэнне выяўляць людскія памылкі і прыцягваць усімі спосабамі да веры і вяртаць у лона Святой Рымскай Царквы. Непарушна захоўваючы цнатлівасць і ўстрымліваючыся ад ежы ў час бесперапыннага посту, мы пастанавілі

[23] Алюзія на Мф 10.

et corpore, a Lugdunensibus [1513C] et nunc et in perpetuum segregatos, nisi reconcilientur catholicae unitati. Ecclesiastica sacramenta suscipiemus ab episcopis et sacerdotibus in quorum dioecesibus vel parochiis commorabimur, et eis obedientiam et reverentiam debitam impendemus. Si qui vero saecularium in nostro voluerint consilio permanere, consulimus ut exceptis idoneis ad exhortandum et contra haereticos disputandum, caeteri in domibus religiose et ordinate vivendo permaneant, res suas in justitia et misericordia dispensando, manibus laborando, decimas, primitias, et oblationes Ecclesiae debitas persolvendo.»

згодна з царкоўнымі нормамі, прынятымі для аднаго года, трымаць Вялікі і іншыя пасты. Мы вырашылі насіць набожнае і сціплае адзенне, якое мы прывыклі здабываць, абутак, зверху адкрыты, састаўны і адрозны, як спецыяльны сімвал, каб адкрыта і выразна мы былі пазнаваныя як сэрцам, так і плоццю, і цяпер і пастаянна адрозныя ад Ліёнцаў[24], за выключэннем тых, што былі зноў далучаны да каталіцкай еднасці. Мы прымем царкоўныя таінствы ад біскупаў і святароў у тых дыяцэзіях, дзе мы спынімся, і паставімся да іх з належнай паслухмянасцю і павагай. Калі хто сапраўды свецкі захоча застацца ў нашай суполцы, мы раімся між сабой, каб прынятыя былі дасведчаныя ў прапаведаванні і дыспутах супраць ерэтыкоў, астатнія ў сваіх дамах застаюцца жыць набожна і ўпарадкавана, раздаючы сваю маёмасць на дабрачыннасць і міласэрнасць, працуючы рукамі, выплачваючы Царкве дзесяціну, першыя плады і іншыя належныя ахвяраванні".

Nos igitur habito fratrum nostrorum consilio per apostolica vobis scripta mandamus quatenus, recepto a caeteris fratribus simili juramento, reconcilietis [1513D] eos ecclesiasticae unitati, et denuntietis ipsos vere catholicos ac recte fideles, in praescriptis et alii eos secundum Deum ab omni scandalo et infamia servantes immunes, et in litteris testimonialibus et aliis adminiculis ipsos propter Deum misericorditer adjuvetis.

Datum Laterani, XV Kal. Januarii, pontificatus nostri anno undecimo.

Дык вось, паколькі мы маем параду братоў нашых, мы перадаём вам апостальскім лістом, каб вы, прымаючы ад астатніх братоў падобную клятву, далучалі іх да царкоўнага адзінства і лічылі іх за сапраўдных каталікоў і непахісных вернікаў. У прадпісаннях і іншых дакументах, іх, паводле волі Бога, ад усіх плётак і спакусаў лічылі вольнымі, і ва ўдакладняльных запісках і іншай падтрымцы ў імя Божае міласэрна дапамагалі.

Напісана ў Латэране, 15 календы студзеня, 11 год нашага пантыфікату [1208 г.][25].

[24] Так часам называлі вальдэнсаў як паслядоўнікаў ліёнца Вальдэса.
[25] PL 215:1510A–1513D.

197. ДУРАНДУ З ОСКІ І ЯГО БРАТАМ, ЯКІЯ ЎРАЧЫСТА НАЗЫВАЮЦЦА БЕДНЫМІ КАТАЛІКАМІ І ЗАСТАЮЦЦА Ў КАТАЛІЦКАЙ ВЕРЫ. Пра тое самае.

Каб ніхто з іншых перавернутых згодна з вашай прапановай не падвяргаўся несправядлівым скаргам, асабліва тыя, якія былі далучаныя да царкоўнага адзінства згодна з формай, якую мы выклалі ў іншых нашых лістах, мы прыводзім яе яшчэ раз у гэтым самым лісце з пазнакамі, каб падмацаваць нашу згоду нашай уладай.

Гаворка пра гэта:

Да славы Бога і яго Каталіцкай Царквы і для выратавання душаў нашых, і так далей, каб ва ўсім было выканана.

Дадзена ў Латэране, і так далей[26].

198. ДУРАНДУ З ОСКІ І ЯГО БРАТАМ, ЯКІЯ ЗАСТАЮЦЦА Ў КАТАЛІЦКАЙ ВЕРЫ. Каб не мелі дачынення да вайны, якая вядзецца супраць хрысціянаў.

Вы прасілі нас, каб тыя, якія застаюцца міранамі, да славы Божай і выратавання душаў сваіх прапанавалі застацца ў вашай суполцы, мы лічым неабходным настояць, каб іх не прымушалі ўвязвацца ў вайну супраць хрысціян або даваць клятвы па свецкіх пытаннях, як быццам бы пад ціскам грамады. Аднак мы дазваляем, каб яны гэта свядома рабілі, калі гэта магчыма без несправядлівасці і скандалу, а асабліва з дазволу свецкіх уладаў.

Дадзена ў Латэране, 15 календы студзеня, 11 год нашага пантыфікату [1208 г.][27].

17. АРХІБІСКУПУ СВЯТОМУ РЫМСКАЙ ЦАРКВЫ КАРДЫНАЛУ І МІЛАНСКАМУ КАПІТУЛУ. Аб справе Дуранда з Оскі і яго паплечнікаў.

З твайго ліста, брат архібіскуп, мы атрымалі па змесце, што, калі ўлюбёны сын Дуранд з Оскі і некаторыя іншыя яго паплечнікі, якія называюцца беднымі каталікамі, прыходзілі да цябе з нашымі лістамі, ты іх прыняў як належыць ласкава, і тое, што мы даверылі твайму братэрскаму клопату, імкнуўся для іх споўніць, і што ты далучыў [іх] да царкоўнага адзінства, некаторых з самога брацтва[28], тых самых, хто застаецца ў Італіі, паводле формы, якой той самы Дуранд быў далучаны ў нашай прысутнасці. Той жа Дуранд і гэтыя яго паплечнікі паведамлялі нам праз лісты, што ты гаворыш далучаным да Царквы братам таго самага [Дуранда], што каля 100 іншых таксама хацелі б быць далучанымі, калі б не нейкі луг, які калісьці ім ахвяравала абшчына Мілана, на якім іх школа пабудавана, якую твой светлай памяці папярэднік разбурыў, і дзе яны прывыклі збірацца, а таксама дзе браты падбадзёрвалі адзін аднаго і сяброў, між тым [яны] з-за адлучэння былі кінуты ў турму, і зараз ізноў [гэтая Царква] узнімаецца, каб ты сам захацеў бы дараваць, каб яны мелі магчымасць вольна збірацца для ўзаемнага падбадзёрвання братоў і сяброў. Адтуль яны нас прыніжана малілі, каб мы вышэйадзначаны луг ізноў зрабілі падараваннем, каб выкладанне Слова Божага ізноў стала звычайным. Хоць

---

[26] PL 215:1514A–1514B.

[27] PL 215:1514B–1514C.

[28] Ант'е Шруп мяркуе (праўда, неаргументавана), што само выкарыстанне ў лацінскім тэксце тэрміну "брацтва", а не "ордэн" ці "абшчына", намякае на прыналежнасць паслядоўнікаў Дуранда да мяшчан і гандляроў. Antje Schrupp, "Waldensi," in *Heretycy: Panorama dziejów myśli kacerskiej i ruchu dysydenckiego w chrześcijaństwie* (Gdynia: Uraeus, 1997), pp. 189–198, 139.

яны павінны быць далучаны да царкоўнага адзінства не з-за часовых спраў, а з-за вечнага пакарання, бо ніхто не здольны пазбегнуць труны, адпаведна, імкненне такога роду мы не прымаем з ухвалай, таму іх далучэнне не павінна такім чынам залежаць ад дадатковых умоў. Таму на ваш розум мы перадаем апостальскім лістом: у тым разе, калі яны захочуць, каб іх жыццё было далучана да погляду Бога і Царквы, то іх па той форме, па якой стаў ізноў далучаным у нашай прысутнасці вышэйадзначаны Дуранд, і якую табе, брат архібіскуп, мы апісвалі ў іншых лістах, вы задавольце з належнай мяккасцю іх вяртанне ў лона Царквы, і калі толькі вы ўбачыце згодна з дадзенай вам Богам разважлівасцю, што гэта спрыяе як павазе да Царквы, так і іх выратаванню, паколькі вышэйзгаданае поле або іншае вартае месца, дзе яны могуць збірацца для падбадзёрвання свайго і сяброў сваіх у боязі Божай, то вы таксама пагаджайцеся без вялікіх спрэчак, бо інакш яны павінны будуць мець стасункі з вычварэнцамі [ерэтыкамі], а не з перавернутымі [у каталіцкую веру].

Напісана ў Латэране, 3 ноны красавіка, у 12 год нашага пантыфікату [1209 г.][29].

67. АРХІБІСКУПУ НАРБОНСКАМУ І ЯГО ПАДНАЧАЛЕНЫМ. Пра тое ж самае.

Калі, як вы і два браты-цыстэрцыянцы паведамілі нам, Дуранд з Оскі са сваімі паслядоўнікамі перайшоў да нявер'я або збіраецца падмануць Рымскую Царкву, ці ўхіляцца ад кананічнай дысцыпліны, то іх будзе датычыцца тое, што наконт гэтага сказана ў Пісанні: "бязбожнікі будуць злоўлены беззаконьнем сваім" (Сал 11:6), бо мы цалкам праінфармаваныя пра падступнасць Сатаны. Калі ж ён сапраўды асцярожна трымаецца якой-небудзь з былых прымхаў, каб лягчэй можна было спаймаць лісак, якія хочуць знішчыць вырашчаны вінаградник Гасподні[30], то разважліва будзе пачакаць некаторы час, пакуль можна будзе распазнаць дрэва па пладах, і калі дзейнічае не з крыніцы ісціны ад чыстага сэрца, добрага сумлення і веры не падманнай, як сказаў Апостал Павел: "як што я хітры, дык хітрасьцю браў вас" (2 Кар 12:16), называючы разважлівасць падманам, які ён моцна імкнуўся схаваць, як душы, уведзеныя ў зман д'ябальскім падманам, ён вяртаў у многіх месцах і многімі спосабамі да Таго, Хто – шлях, ісціна і жыццё, калі і сам зрабіў выгляд, што ідзе далей, калі паказаўся двум сваім вучням у чужаземнай вопратцы. Але калі раптам ён не адвернецца зусім ад ранейшых звычаяў, пакідаючы сабе што-небудзь з таго, каб, захоўваючы сціпласць, як быццам бы пахавае з гонарам старыя правілы, то яго нельга цалкам выкрыць, пакуль, як мы сказалі раней, ён не адхіліцца ад крыніцы ісціны. Бо розніца ў звычаях, асабліва ў вопратцы, не выклікае вычварнасці ў Святой Царкве, як дапамагае дзясніцы Жаніха апранутая разнастайна каралева, як быццам бы абнесеная сценамі. Але мы не кажам, што такім чынам ухваляем зайздрасць, але што мы павінны трымацца прыкладу Таго, Хто стаў слабым для слабага, больш за тое, Хто стаў усім для ўсіх, каб усе маглі выйграць, Хто хацеў усіх людзей выратаваць і прывесці да спазнання ісціны. Ці варта такім чынам, найулюбёнейшыя браты, абвінавачваць урача, які радуе чым-небудзь менш здаровым хворага, які чаго-небудзь моцна прагне? Не, таму што тое, што трошкі шкодзіць аднаму, часам, аднак, іншаму можа быць вельмі карысным, як і корцы не проста так дазваляецца на пэўны час трымацца, абараняючы ранку, пакуль яна пад ім лепш не зацягнецца, і новыя пазногці, адрастаючы, не выдаляюць цалкам

[29] PL 216:29B–30B.

[30] Алюзія на Песн 2:15.

старыя. Вы ж, браты, такім чынам лепш з рахманым духам падтрымайце яго, не адпіхваючы, а прыцягваючы; бо людзі прасцей адгукаюцца на ўгаворы, чым на пагрозы, і ласкаваць міласці больш выпраўляе, чым суровасць дысцыпліны. Бо найперш належыць наліць алею, а потым, калі неабходна, то і даліць віна, хоць для перавернутых такім чынам алей варта наліваць пасля віна, бо зусім нядаўна заганныя былі працятыя мячом адлучэння, таму сапраўды перавернутыя павінны быць ахопленыя пяшчотай. Так і разважлівы хірург спачатку прымяняе пякучыя лекі, каб вылечыць жахлівую рану; але, калі яна ўжо пачала вылечвацца, дапаўняе свае клопаты салодкім мірам. Але калі шнар дрэнна зажыў, то часам прыкладае жалеза або агонь, каб здаровую частку не закранула гніенне. Так і вы, браты, рабіце па звычаі разважлівых урачоў, асабліва калі дазволяць лячыць іх ціхімі размовамі, не скажаючы прапанаванага імі павароту, які мы ўключаем выразна ў нашы да вас лісты, асабліва тыя, што былі дадзеныя ў той жа час з тымі, што зараз у вас, для перасцярогі, калі абдумаеце ўсе абставіны, то не бойцеся іх абвергнуць. Але калі яны будуць пагарджаць вашымі лекамі, як мага хутчэй давядзіце гэта да нашага ведама, каб мы маглі прымяніць той сродак, які лічым вырашальным. Паколькі мы маем намер адвярнуць тых, хто памыляецца, ад ерэтычнай заганнасці, бо мы хочам верных у каталіцкай веры падтрымаць, бо больш прымальна, калі заганныя ў сваёй заганнасці загінуць, чым праведныя ад сваёй праведнасці адхіляцца.

Дадзена ў Вітэрбо, 3 ноны ліпеня, 12 год нашага пантыфікату [1209 г.][31].

63. АРХІБІСКУПУ НАРБОНСКАМУ І ЯГО ПАДНАЧАЛЕНЫМ. Пра справу Дуранда з Оскі[32].

Паколькі майстэрства тых, каму даручана настаўленне душаў, павінна быць такім, каб яны зацята рупіліся не толькі аб навяртанні страчанай паствы пад пастырскую апеку Дамініка[33], але і аб ахінанні навернутых да яго бацькоўскай міласцю. Без сумневу нам і вам відавочна, што ўлюбёныя сыны Дуранд з Оскі і Гілельм з Сэн-Антанэн-Нобль-Валя са сваімі таварышамі, далучанымі да царкоўнага адзінства, так самі павінны быць падтрыманыя, каб, калі яны самі будуць радыя знайсці там [у царкоўным адзінстве] ласку ўлюбёнай чароўнасці, то іншыя па іх прыкладзе былі прымушаныя пакінуць памылкі сваёй слепаты. Вось таму мы брацтва ваша старанна ўгаворваем і заклікаем, апостальскім пісьмом вам прадпісваем, паставіцца з любоўю да тых, хто кіруецца Божымі прадпісаннямі, не дазваляйце, каб у вашых дыяцэзіях тыя ці іншыя прызначаныя, хто выдаткуе сваю маёмасць на дабрачыннасць, былі выпадкова патрывожаныя па якой-небудзь прычыне, для чаго належыць стрымліваць тых, хто супраціўляецца строгім царкоўным норавам. Калі ты не зможаш асабіста і г.д., то адным з вашых у гэтай дыяцэзіі тым не менш гэта павінна быць выканана.

Напісана ў Латэране, 4 іды мая 13 год нашага пантыфікату [1210 г.].

Такім жа чынам было напісана архібіскупу тарагонскаму і яго падначаленым. Дадзена, як і ў іншых. Такім жа чынам было напісана архібіскупу міланскаму і яго падначаленым. Дадзена, як і ў іншых[34].

---

[31] PL 216:73B–74D.

[32] Такі самы ліст быў напісаны ў Геную ў "2 календу чэрвеня 15 год нашага пантыфікату [1212 г.]". PL 216:608–609.

[33] Св. Дамінік, заснавальнік аднайменнага ордэна.

[34] PL 216:255–256.

78. АРХІБІСКУПУ ТАРАГОНСКАМУ І ЯГО ПАДНАЧАЛЕНЫМ. Пра тое ж самае.

З незлічонай каштоўнасцю крыві Ісуса Хрыста, якую мы захоўваем у душах выратаваных па ўскладзеным на нас апостальскім абавязку; нам належыць не толькі міласціва дараваць прабачэнне тым, хто сапраўды раскайваецца, але таксама настойліва заклікаць да раскаяння ўпартых грэшнікаў; мы выратуем іх калі не бацькоўскім звычаем, то іншымі пастырскімі клопатамі, мы ўбачым столькі той самай каштоўнасці збаўлення ў выратаванні, колькі ў самім нашым выратаванні мы змаглі захоўваць пільнасці. Таму мы прынялі з бацькоўскай сардэчнасцю Дуранда з Оскі (Durandum de Osca), і Гілельма з Сэн-Антанэн-Нобль-Валя (Guillelmum de sancto Antonino), і Яна з Нарбоны (Joannem de Narbona), і Эрменгаўда (Ermengaudum), і Бернарда з Безье (Bernardum Bitterrenses), і Раймунда з Сан-Паўла (Raymundum de Sancto Paulo), і Эбріна (Ebrinum), а таксама паплечнікаў іх, якія знаходзіліся да таго перад Апостальскім Прастолам, і мы цалкам зразумелі, што яны паклапаціліся прадставіць нам не толькі сябе, але і братоў сваіх. З гэтага вынікае, што яны былі старанна выпрабаваны ў артыкулах веры і таінствах Царквы, і мы праверылі па іх расказах, што іх вера артадаксальная і каталіцкая, і праўдзівасць [іх слоў] даказана. Аднак для большай выразнасці, узяўшы Евангеллі і паставіўшы над усім напісаныя іх Споведзі веры, узялі мы з іх такім чынам клятву. Я, кажа, Дуранд з Оскі і г.д.

А запісаная ж іх споведзь веры такая:

Няхай будзе вядома ўсім вернікам, і г.д., як і вышэй, але з некаторымі зменамі, якія пазначаныя на палях, каб задаволіць патрабаванні Царквы. Такім чынам мы, маючы параду братоў нашых, перадаём вам апостальскім пісьмом, каб была прынята ад астатніх братоў падобная клятва, і вы зноў далучылі іх да царкоўнага адзінства, і аб'явіце іх сапраўднымі католікамі і шчырымі вернікамі, у прадпісаннях і іншых [дакументах], лічачы іх перад Богам вольнымі ад усіх спакусаў і няслаўя, падтрымлівайце іх міласціва ў імя Бога ва ўсіх удакладняльных запісках і іншай дапамозе. Паколькі мы сапраўды [іх] прынялі па той прычыне, што яны ўсе разам трымаюцца атрыманага прадпісання, то яны [Дуранд і іншыя] прасілі, каб вамі было працягнута далучэнне па вышэйпрыведзенай форме яшчэ не далучаных да Царквы, і яны апраўдваюцца перад іншымі адно тым, што праз суровасць тваю яны адварочваюцца ад бясконцай міласэрнасці Бога, і з гэтай прычыны многія з тых, хто пакорліва прасіўся ўвайсці [у Царкву], як кажуць, да гэтага заставаўся па-за Царквой супраць свайго жадання, як і супраць нашага; і мы брацтву твайму перадаем апостальскім пісьмом і строга рэкамендуем, калі ты не зможаш сам асабіста прысутнічаць пры ажыццяўленні гэтага, то хай гэта будзе любы іншы прэлат у Тарагонскай правінцыі, і такім чынам ты, браце архібіскупе, задаволіш праігнараваны табой раней паварот тых, хто раскайваецца, [і] па належнай форме ізноў далучыш; наконт вышэйадзначаных Дуранда з Оскі і Вілельма з Сэн-Антанэн-Нобль-Валя, а таксама іх паплечнікаў: [калі яны] паводле папярэдняга дазволу ўсё ж дасягнуць поспеху і застануцца ў непахіснай веры і выратавальным вучэнні, то варта даць ім належныя час і месца для падбадзёрвання.

Напісана ў Латэране, 4 іды мая 13 год [1210 г.].

Такім жа чынам было напісана архібіскупу нарбонскаму і яго падначаленым[35].

[35] PL 216:274B–275C.

82. БІСКУПУ ЭЛЕНА. Пра справу Дуранда з Оскі і паплечнікаў.

Улюбёны сын Дуранд з Оскі (Durandus de Osca), які стаяў перад намі, і Д. з Наяка (D. De Naiaco), і Гілельм з Сэн-Антанэн-Нобль-Валя (Guillelmus Sancti Antonini), і іншыя бедныя каталікі паведамляюць нам у сваіх лістах, што для іх падбадзёрвання ў некаторых тваіх дыяцэзіях яны імкнуцца пакаяцца за сваё адступніцтва, пасля споведзі грахоў сваіх, яны вырашылі вярнуць усё дабро, чым яны валодалі законна і не зламысна, не ў якасці прыватнай маёмасці, а ў абшчыннай, і нікому не рабіць зла, яны абяцаюць захоўваць маральную чысціню і цнатлівасць, устрымліваючыся ад падманаў і недазволеных клятваў; яны прапаноўваюць таксама [насіць] белую ці шэрую бялізну, што будзе вызначаць дысцыпліну і знешні выгляд бедных каталікоў; і не будуць таксама спаць на ложках, калі б толькі іх да гэтага не прымусіла немач; і ад Дня Усіх Святых бесперапынна да Божага Нараджэння трымаць пост кожныя шэсць тыдняў, калі толькі выпадкова на Раство, ці Епіфанію, ці якое-небудзь іншае свята маючы начную імшу, здарыцца ім выходзіць [з посту], яны ўстрымаюцца ад спажывання рыбы, не будуць есці мяса ні ў другі, ні ў чацвёрты дзень тыдня, калі толькі не перарывае Раство, а ў Вялікі Пост перад Вялікднем за выключэннем нядзеляў не будуць есці рыбы; яны вызваляць ад посту восем дзён перад Пяцідзясятніцай, і будуць захоўваць усе іншыя пасты, устаноўленыя святой Рымскай Царквой; таксама яны будуць збірацца, каб паслухаць словы настаўлення, толькі па нядзелях, і, молячыся па сем разоў на тыдзень, тыя, хто пісьменныя, будуць спяваць па дзесяць разоў "Ойча наш", а ў дадатак Сімвал веры, а таксама "Змілуйся над намі"[36]; і клірыкі будуць выконваць кананічныя гадзіны Госпада Бога як належыць. І паколькі шэсць спраў набожнасці карысныя для ўратавання, яны пастанавілі прысвяціць сябе бедным у імя Бога; адзін хоча пабудаваць са сваёй асабістай спадчыны дом, у якім у адной з частак для мужчын, а ў другой – для рэлігійных жанчын будзе годны прыстанак, і таксама ля яго будзе дом для падарожных, у якім адновяць сілы стомленыя і адужаюць бедныя, нямоглыя атрымаюць дапамогу і будуць гадавацца немаўляты, пакінутыя [сваімі] мацеркамі, і жонкі бедных працаўнікоў, пакуль не змогуць сысці, будуць падтрымлівацца падчас родаў, а таксама па магчымасці з самога дома, калі здарыцца непагадзь, будуць даваць бедным адзенне; і туды ж таксама будзе дастаўлена 50 камплектаў пасцельнай бялізны, і ля самага дома будзе пабудавана Царква ў гонар Божай Маці Марыі, дзе браты з гэтага дома змаглі б слухаць боскае, дзе ў знак пакорнасці кожны год будуць сплачваць адзін безант Апостальскаму Прастолу. І адтуль яны прыніжана моляць нас, каб мы ўганаравалі [іх], дазволіўшы ім свабодна ажыццяўляць пропаведзь. Такім чынам мы, разважаючы, што гэта ўсё само па сабе добра, перадаём твайму братэрству апостальскім лістом, калі ты знаходзішся ў дыяцэзіі, каб ты больш поўна спазнаў ісціну, і калі ты даведаешся, што яны [бедныя каталікі] паходзяць з крыніцы каталіцкай чысціні, ты дазволіш з добразычлівасцю задаволіць іх жаданні; разважліва паклапаціўшыся загадзя, каб казанне аб словах падбадзёрвання слухалася толькі па нядзелях, а таксама каб гэта рабілася так, каб не маглі быць закранутыя асновы ні артадаксальнай веры, ні кананічнай дысцыпліны; трымаючыся, тым не менш, разумнай асцярожнасці сярод вышэйзгаданых мужчын і жанчын, каб хто-небудзь з іх не мог мець схільнасці да чаго-небудзь недазволенага ці падазронага. Таксама ўважліва сачы, [каб] згаданыя мужчыны патлумачылі, што будзе вызначаць дысцыпліну і знешні выгляд бедных католікаў,

[36] Каталіцкія малітвы.

каб такая дысцыпліна і знешні выгляд пасавалі да разумнай дактрыны і царкоўнай годнасці.

Напісана ў Латэране, 8 календы чэрвеня 15 год нашага пантыфікату [1212 г.][37].

90. БІСКУПУ МАРСЭЛЬСКАМУ. Аб справе Дуранда з Оскі і яго паплечнікаў.

Калі улюбёны сын Дуранд з Оскі (Durandus de Osca, акаліт)[38], і яго паплечнікі з секты Вальдэнсаў былі намі ізноў далучаны да царкоўнага адзінства, брацтву твайму мы перадаем апостальскім пісьмом, што, паколькі мы дапусцілі іх у каталіцкую паству, і прыязна [да іх] настроены з-за ліста, у якім яны парвалі з былым ладам жыцця, то ты не дазваляй, каб яны кім-небудзь выпадкова былі патрывожаны, наадварот, лічы, што ад усіх плётак і спакусаў яны вольныя, і міласэрна падтрымлівай у імя Божае як удакладняльнымі запіскамі, так і ў іншай дапамозе.

Напісана ў Латэране, 3 календы чэрвеня 15 год нашага пантыфікату [1212 г.].

Такім жа чынам было напісана біскупу Барселоны.

Такім жа чынам было напісана біскупу Оскі[39].

92. НАЙЯСНЕЙШАМУ КАРАЛЮ АРАГОНСКАМУ. Пра тое самае.

Каб ты рабіў шчаслівымі тых, па чыёй міласці ты атрымаў кіраванне каралеўствам, табе належыць клапаціцца пра ціхмяных і набожных, і выпраўляць адступніцтва вінаватых. Таму мы просім і ўгаворваем Вашу Каралеўскую Міласць, каб бедныя каталікі і іх госці, якія застаюцца ў каталіцкай веры і набожнай дзейнасці, каб ты не дапускаў, каб яны былі абцяжараныя якім-небудзь прыгнётам ці несправядлівымі прысудамі з боку твайго суддзі.

Напісана ў Латэране, 5 календы чэрвеня 15 год нашага пантыфікату [1212 г.][40].

93. АРХІБІСКУПУ НАРБОНСКАМУ І БІСКУПУ УТЫКІ ПАПСКАГА ПРАСТОЛУ ПАСЛАМ. Пра тое ж самае.

Паколькі бедныя каталікі Дуранд з Оскі, Дуранд з Наяка, Гілельм з Сэн-Антанэн-Нобль-Валя і іх таварышы былі зноў далучаныя да царкоўнага адзінства, то іх належыць ласкава гадаваць, быццам бы новы саджанец, вам перадаем апостальскім пісьмом, каб вы ў веры каталіцкай і дабрачыннай справе жыхароў настаўлялі міла і ласкава, не дазваляючы, каб яны кім-небудзь несправядліва трывожыліся, [і] падтрымлівалі міласэрна ва ўдакладняльных запісках і іншай дапамозе ў імя Божае.

Напісана ў Латэране, 4 календы чэрвеня 15 год нашага пантыфікату [1212 г.][41].

97. ДУРАНДУ З ОСКІ, ДУРАНДУ З НАЯКА, ГІЛЕЛЬМУ З СЭН-АНТАНЭН-НОБЛЬ-ВАЛЯ, ЯНУ З НАРБОНЫ, БЕРНАРДУ З БЕЗЬЕ І ІНШЫМ БЕДНЫМ КАТАЛІКАМ. Прымаюцца назад пад апеку Апостальскага Прастола.

Калі нас просяць, і г.д., пакуль не будзе атрыманы вынік. Таму, улюбёныя сыны Гасподні, па вашых справядлівых просьбах і г.д., пакуль вы не будзеце задаволеныя, мы прымаем пад абарону Святога Пятра і нашу і далучаем да нашага бацькоў-

---

[37] PL 216:601B–602B.

[38] Памочнік свяшчэнніка.

[39] PL 216:607B–607D.

[40] PL 216:608A–608B.

[41] PL 216:608B–608C.

скага заступніцтва вас і вашых блізкіх сяброў, якія застаюцца ў каталіцкай веры і набожнай дзейнасці, а таксама іх маёмасць. Такім чынам ніхто, і г.д., абароненых, і г.д., пакуль не здарыцца.

Напісана ў Латэране, 4 календы чэрвеня 15 год нашага пантыфікату [1212 г.][42].

I.ii.c Булы Папы Рымскага Інакенція III датычна Бернарда Прыма

Булы Інакенція III датычна спраў Бернарда Прыма і яго новаўтворанай групы "бедных ізноў далучаных", накіраваныя яму самому, "усім" прэлатам і біскупу крэмонскаму асобна, 1210–1212 гг.

96. УСІМ АРХІБІСКУПАМ І БІСКУПАМ, ДА ЯКІХ ЛІСТЫ ГЭТЫЯ ДАЙШЛІ.
Пра справу перавернутых Вальдэнсаў.

З незлічонай каштоўнасцю крыві Ісуса Хрыста і г.д.[43] Даследаваўшы вышэй у напісаных лістах гэтак жа сама ўсяго па чатыры разы ажно да[44]. Таму прыбыўшых да Апостальскага Прастола ўлюбёных сыноў Бернарда Прыма (Bernardum Primum), і Вілельма Арналда (Willelmum Arnaldi), і некаторых іншых мы з бацькоўскай сардэчнасцю прынялі, а таксама, што яны нам каб у той жа, і г.д., каб зразумець, і іх, якія былі старанна выпрабаваныя і прайшлі [выпрабаванне], мы ізноў далучылі такім чынам да царкоўнага адзінства. Я, сказаў Бернард Прым, паклаўшы Евангеллі, і паклаўшы на іх запіс Споведзі веры, даю гэту клятву між рук тваіх, Найвышэйшы Пантыфік, заклікаючы Бога ў сведкі ў душы маёй, што, такім чынам, і так далей[45] пакуль буду мець магчымасць процістаяць. Таксама я адкрыта заяўляю, што гэта не тая клятва, якую Хрыстос прызваў забараніць на Евангеллі, а тая, якая святым доктарам Аўгусцінам ды іншымі лічыцца найлепшай у выпадку неабходнасці з ісцінай, справядлівасцю і разважлівасцю. Запіс жа Споведзі веры такі:

"Няхай будзе вядома ўсім вернікам, што я, Бернард Прым, і ўсе браты мае ў прадпісанае нам найсвяцейшымі Евангеллямі сэрцам верым, спасцігаем душой, вуснамі вызнаём і простымі словамі, гэта значыць без падступства, надзейна сцвярджаем, што Айцец, і Сын, і Святы Дух – тры асобы, адзіны Бог, і ўся Тройца, суіснуючая, суадзінаісная, і сувечная, і ўсемагутная, і кожная асоба ў Тройцы – Бог, як і ў Credo in Deum, і ў Credo in unum Deum, і ў Quicunque vult[46] утрымліваецца, выспаведана кожнай думкай. Таксама сэрцам верым і вуснамі і сцвярджаем: Айцец, і Сын, і Святы Дух – адзіны Бог, пра якога наша прамова, творца, і валадар і, распарадчык усіх рэчаў бачных і нябачных, цялесных і духоўных. Таксама сэрцам верым і вуснамі і сцвярджаем: Айцец, і Сын, і Святы Дух – адзіны Бог, які даў закон Майсею, і сам у прарокаў прамову ўклаў, і Ян Хрысціцель ад свайго нараджэння святы і справядлівы і напоўніўся Святым Духам ва ўлонні маці сваёй. Таксама сэрцам верым і вуснамі і сцвярджаем: увасабленне Госпада нашага Ісуса Хрыста, як ён быў у боскасці Бога Сын, Айца нябеснага, чалавекам зрабіўся ў чэраве сваёй маці святой Марыі, які сапраўдную плоць прыняў ад матчынага ўлоння, народжаны

---

[42] PL 216:609C–609D.
[43] Гл. ліст 78 датычна Дуранда з Оскі.
[44] Гл. ліст 78 датычна Дуранда з Оскі.
[45] Гл. ліст 197 датычна Дуранда з Оскі.
[46] Сімвалы веры: Апостальскі, Нікеа-Царградскі і Афанасьеўскі адпаведна.

сапраўдным цялесным нараджэннем; ён і еў, і піў, і спаў, і адпачываў, стомлены на шляху, цярпеў пакуты ад сваёй сапраўднай плоці і памёр сапраўднай цялеснай сваёй смерцю, уваскрос сапраўдным уваскрэсеннем сваёй плоці; у якой [плоці] пасля сапраўды еў і піў, узнёсся на неба, сядзіць па правы бок ад Бога Айца ўсемагутнага, адтуль ідзе судзіць жывых і мёртвых. Таксама сэрцам верым і вуснамі і сцвярджаем адзіную Царкву, каталіцкую і апостальскую, святую і бязгрэшную, па-за якой ніхто не выратуецца, вызнаём. Таінствы ж, якія ў ёй здзяйсняюцца, пры садзеянні незлічонай і нябачнай ласкі Духа Святога, могуць удзяляцца грэшнымі святарамі, пакуль Царква гэта прымае, мы ніякім чынам не асуджаем і не ўзводзім паклёп на царкоўныя імшы ці дабраславенні, што імі ажыццяўляюцца, а, наадварот, прымаем добразычліваю душою як ад самага праведнага.

Мы ўхваляем таксама хрышчэнне немаўлят, і, калі яны памруць пасля хрышчэння, але перш, чым саграшыць, мы верым, што яны будуць выратаваныя. Мы лічым таксама, што канфірмацыя, якая здзяйсняецца біскупам праз ускладанне рук, павінна прымацца як святое і вартае шанавання. Прама сцвярджаем і верым: у таінстве еўхарыстыі, дзе былі хлеб і віно да асвячэння, пасля асвячэння – Цела і Кроў Ісуса Хрыста; ад добрага святара здзяйсняецца не больш, а ад дрэннага не менш. Мы згаджаемся, што грэшнікам, якія сапраўды раскайваюцца, дадзена міласць ад Бога, і з імі з найвялікшай радасцю злучаемся. Мы шануем памазанне нямоглых свяшчэнным алеем. Мы не адмаўляем, што паводле Апостала Паўла шлюбы павінны быць заключаны, мы забараняем разрываць [шлюб], сапраўды заключаны згодны з правіламі. Мы пакорліва ўсхваляем і шчыра шануем царкоўныя пасады, гэта значыць біскупаў і прэсвітараў і г.д., і ўсё, што ў святой Рымскай Царкве святым прымаецца ці абвяшчаецца. Таксама сэрцам верым і вуснамі і сцвярджаем уваскрэсенне ў той плоці, якую мы пакуль носім, і ніякай іншай, і вечнае жыццё, і што кожны чалавек будзе прыняты паводле дзеяў яго. Мы не сумняваемся, што міласціна, ахвярапрынашэнні і іншыя дабрачыннасці вернікаў карысныя памерлым. І паколькі "бязь дзеяў мёртвая" (Іак 2:26), як сказаў Апостал Якуб, мы адракліся ад свету і ад таго, што мелі, як было прадпісана Богам, і раздалі грошы і маёмасць бедным, і вырашылі самі быць беднымі. Такім чынам, паколькі мы не трывожымся за заўтрашні дзень, то ні золата, ні срэбра, ні што-небудзь такое іншае, акрамя харчу і адзення штодзённага, мы ні ад кога не прымаем[47]. Мы таксама прынялі рашэнне трымацца евангельскіх парад, як прадпісана. Мы прызнаём, што тыя, якія застаюцца [жыць] у свеце са сваёй маёмасцю, і вераць цвёрда і непарушна ў вышэйсказанае, і трымаюцца прадпісанняў Госпада, будуць выратаваны. Таму мы пастанавілі вышэйадзначаную веру вуснамі цвёрда спавядаць і перадаваць, і да самай душы і крыві супраць сектаў ерэтыкоў мужна змагацца да пабудовы ўсеагульнай святой Божай Царквы, і да выратавання душаў усіх, да вушэй каго дойдзе, як мы надзейна сэрцам верым, у імя Айца, і Сына, і Святога Духа, і найсвяцейшай Дзевы Марыі. Мы, што знаходзімся пад кіраўніцтвам і камандаваннем адзінага і сапраўднага правіцеля Госпада нашага Ісуса Хрыста, а таксама самага дабрадзейнага яго вікарыя Папы Інакенція і пераемнікаў яго, заўсёды застаемся як целам, так і духам у яднанні са святой Рымскай, а таксама ўсеагульнай Царквой, якая, мы верым, як мы казалі раней, святая, і каталіцкая, і апостальская, усе хрышчоныя ў імя Айца, і Сына, і Святога Духа, акрамя тых, хто ад вышэйназванай веры адмовіліся, бо кожны раз, калі добрыя з дрэннымі сустрэнуцца, натуральна, што

[47] Алюзія на Мф 10.

ўзнікае разлад між сынамі; мы верым, што вышэйназваны уладар Папа Інакенцій – галоўны пастыр гэтай царквы, і мы вызнаём і верым, што ён сам і ўсе біскупы і святары і іншыя ўзведзеныя ў сан, якія трымаюцца вышэйназванай веры, служкі ў гэтай царкве.

Таму менавіта ад іх, а не ад іншых, мы імкнёмся і прагнем прымаць царкоўныя таінствы. Асабліва ж гэта датычыцца Святой Вячэры, у чым мы былі абвінавачаны, мы казалі і кажам, бо ніколі [гэта] не было зроблена ні з прычыны ўпартасці, ні з прычыны пагарды да ахвярапрынашэння святара, але з прычыны старання веры і павагі ды з прычыны ўдумлівых развагаў, каб не закасцянелі простыя верныя, што заставаліся між ерэтыкоў і не прымалі таінства еўхарыстыі; бо зараз і бесперапынна надалей мы адмаўляем і адкідаем ды адмаўлялі за нас і ўсіх нашых вернікаў, паводле нашых сілаў, справамі і вераю верачы сэрцам і вуснамі пацвярджаючы, што ахвяра Цела і Крыві Хрыста не здзяйсняецца і не можа быць здзейснена [нікім], акрамя як святаром, бачна ўзведзеным у сан праз накладанне рук бачнага біскупа паводле звычаю Царквы. З іншага боку мы маем наказ маліцца, каб Бог даў працаўнікоў у жніво сваё, гэта значыць прарокаў у народ свой, якія павінны пакорліва і прыніжана вымольваць, каб найвышэйшы пантыфік і прэлаты Царквы далі ім дазвол, каб яны маглі падахвочваць і падбадзёрваць у выратавальнай дактрыне і супраць усіх ерэтыкоў пры падтрымцы міласці Божай, з усёй мужнасцю і стараннем душы, упарта працаваць, каб яны павярнуліся да веры каталіцкай, і вернікаў іх шляхам прыватных і публічных угаворванняў, як належыць, ад іх вераванняў і ерасі аддзяляць, і ў вышэйназваную Царкву ўключаць, і ад усіх заганаў і грахоў, і, натуральна, ад гордасці, фанабэрыі, зайздрасці, гневу, пыхі і сквапнасці, пражэрлівасці, раскошы, лжы, рабаўніцтва, блюзнерства, нянавісці, падману, клятваадступніцтва і забойства стрымліваць як саміх сябе, так і сваіх слухачоў! Але колькі б мы гэта ні заяўлялі, мы не асуджаем свецкую ўладу, якая здзяйсняе паводле законаў свой доўг у дачыненні да злачынцаў і ў гэтым не абвінавачваем, не кажам, і не верым.

Аднак, як сыны Царквы, мы абвяргаем вінаватых у кровапраліцці, набожна заступаючыся [за іх], бо напісана: Царква абвяргае вінаватых у кровапраліцці. З іншага боку, як бы для ўхілення ад парушэння клятвы ні было патрэбна пазбягаць клятвы, аднак тых, хто клянецца пасля абмеркавання з прычыны неабходнасці праўдзіва і справядліва, мы не абвінавачваем, і верым, што яны з-за гэтага не будуць асуджаныя. Ва ўсіх жа біскупствах, дыяцэзіях ці парафіях, у якіх мы ёсць і будзем, мы меркавалі пасціцца паводле закона і звычаю прэлатаў і каталіцкіх артадаксальных мужоў тых правінцый, як у начныя імшы, так і ў Сухія Дні і ў Вялікі Пост. Нават даступна кажа Хрыстос: належыць заўсёды маліцца, а не згасаць (Лк 18) і Апостал: Без затрымкі маліцеся (I Фес 5), аднак некаторыя з нас за 24 змены паміж днём і ноччу, іншыя 15, іншыя 12, хто ж менш, 7 на кожнага чалавека згодна з яго рангам моляцца. І хоць звычай наш галоўным чынам такі, які вядомы іншым, і ўсе, хто здольны да гэтага, падбадзёрвае, аднак часам здараецца, што мы працуем сваімі рукамі, [але] толькі тады, калі прымаем рашэнне не за плату. Калі хто нам давяраецца, што здзейсніў праз што-небудзь каму-небудзь якую-небудзь шкоду, неабходна, калі зможа і захоча намі суцешыцца, каб сам і не іншыя кампенсаваў. Бо мы добрасумленна сплачваем дзесяціны, і пяршыны, і ахвяраванні, і іншае паводле звычаю тых месцаў, у якіх мы жылі б, у дыяцэзіях, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні прэлату і іншым клірыкам: што ўсім вернікам-хрысціянам дзейсна раім".

Аднак у пісьмовых палажэннях, як мы ад іншых атрымалі, было аб'яўлена памылкова, што быццам бы толькі Богу трэба павінавацца, а калі чалавеку, то толькі справядліваму, які мае ў сабе Бога, а таксама дазваляць якому-небудзь міраніну, у тым ліку пісьменнаму, без дазволу прапаведаваць, і харошаму міраніну мець уладу для здзяйснення еўхарыстыі, дрэнны ніякім чынам не можа быць святаром, і яго малітвы і імшы ні жывым, ні мёртвым не дапамогуць, а таксама Рымская Царква ніякім чынам не Царква Божая, і таксама яны казалі, што ўстаноўлена, што клятвы паводле якога-небудзь артыкула, зробленая паводле ўзору Царквы, – смяротны грэх, самі аднак апраўдваюць сваю бязвіннасць на падставе вышэйзапісанай споведзі, у якой закрануты адзначаныя палажэнні, некаторыя прыпісваюць, што яны дадаюць, навучаючы таму, што, відавочна, жанчынам дазволена ў царкве выкладаць Евангеллі, а таксама індульгенцыі, што выдаюцца Найвышэйшым Пантыфікам ці іншымі біскупамі, не дапамагаюць, і што яны прызнаюць, што справядлівы міранін можа сам сябе вызваліць. І далей акрамя гэтага яны кажуць, што некаторыя святары ўводзяць у спакусу дурным прыкладам, асуджаючы іх па многіх пытаннях, мы рэзка выкрываем іх, у сілу таго паслушэнства, якое яны аказалі нам, больш строга загадваючы ім, што яны і самі абяцалі выконваць пры такім жа паслушэнстве, каб клірыкі мелі ўсю, якую належыць, павагу і гонар, [клірыкі] перапынялі б цалкам ганьбу ці зласлоўе на іх [перавернутых братоў], абвінавачваючы іх у тым, што яны ўсе без разбору саманадзейна прэтэндуюць на права пропаведзі, а не толькі тыя, хто быў выпрабаваны кіраўнікамі[48]. Выпрабаваўшы іх у разумнай і выратавальнай дактрыне Царквы, [клірыкі] даравалі ім дазвол падбадзёрваць, што яны і робяць у дамоўленыя часы і пад наглядам, і гэта наконт абатаў і імшаў; і хоць далі зарок устрымання, хай надалей пазбягаюць падазрэння ў сужыцці з жанчынамі; хто гэта і іншае паклянецца выконваць, абавязаныя выказваць нам адданае і належнае паслушэнства.

Такім чынам мы, параіўшыся з братамі нашымі, перадаём вам апостальскім пісьмом, каб вы, як толькі прымеце ад астатніх братоў такую ж клятву, ізноў далучылі іх да царкоўнага адзінства і аб'явілі іх сапраўднымі католікамі і добрымі вернікамі, у прадпісаннях і іншым лічачы іх паводле волі Бога не датычнымі да ўсіх спакусаў і ганьбы, дапамагайце ім у імя Божае міласэрна ў пацвярджальных паперах і іншым.

Напісана ў Латэране, 18 календы ліпеня, 13 год нашага пантыфікату [1210 г.][49].

137. БЕРНАРДУ ПРЫМУ І ЯГО БРАТАМ.
Апісваецца форма рэлігіі, якой трымаюцца[50].

Каб у далейшым немагчыма было сказіць ваш намер, як калісьці мы старанна выпрабавалі вашу веру, так і зараз разважліва паклапаціліся аб даследаванні вашага павароту, і ў абодвух апостальскіх лістах зрабілі відавочным, каб вы гэтаму мелі пацвярджэнне. План жа вашага павароту такі: "У імя Айца, і Сына, і Святога Духа, і найсвяцейшай заўсёды беззаганнай Дзевы Марыі, да пабудовы ўсеагульнай святой Божай Царквы, і да выратавання душаў нашых і ўсіх, да вушэй каго дойдзе. Мы пастанавілі веру каталіцкую праз усё і ва ўсім беззаганную і некранутую, як

[48] Тэрмін "кіраўнік" з'яўляецца прамым перакладам лацінскага "rector", якое ў наш час набыло новае значэнне.
[49] PL 216:289B–293A.
[50] Гл. ліст 82 датычна Дуранда з Оскі, і ліст 146.

мы надзейна сэрцам верым, дакладна так, як апісана ў лістах нашага выпрабавання, вуснамі цвёрда спавядаць, і перадаваць, і прапаведаваць, і паабяцалі да апошняга ўздыху і апошняй кроплі крыві супраць сектаў ерэтыкоў мужна змагацца, знаходзячыся пад кіраўніцтвам і камандаваннем адзінага і сапраўднага правіцеля Госпада нашага Ісуса Хрыста, а таксама самага дабрадзейнага яго вікарыя Папы Інакенція і пераемнікаў яго, заўсёды застаемся як целам, так і духам у яднанні са святой Рымскай, а таксама ўсеагульнай Царквой, якая святая, і каталіцкая, і апостальская, і прызнаём, што па-за ёй ніхто не будзе выратаваны, заўсёды і ўсюды вызнаём і прапаведуем. Але паколькі "бязь дзеяў мёртвая" (Іак 2:26), мы адракліся ад свету і ад таго, што мелі, як было прадпісана Богам, і раздалі грошы і маёмасць бедным, і вырашылі самі быць беднымі, такім чынам, паколькі мы не трывожымся за заўтрашні дзень, то ні золата, ні срэбра, ні што-небудзь такое іншае, акрамя харчу і адзення штодзённага, мы ні ад каго не прымаем[51]. Мы прынялі рашэнне трымацца евангельскіх парад, як прадпісана. І хоць абавязак наш пераважна ў тым, каб усе вучылі Пісанне і ўсё належнае, і ўсе здольныя прапаведуюць, аднак часам здараецца, што мы працуем сваімі рукамі, [але] толькі тады, калі прымаем рашэнне не за плату. Бо, з іншага боку, паколькі ў большасці сваёй мы з'яўляемся клірыкамі і амаль усе пісьменныя, мы вырашылі старанна змагацца супраць усіх сектаў падманаў праз тэксты, казанні, навуковыя працы і дыспуты, аднак дыспуты кіруюцца самымі адукаванымі братамі, якія даказалі адданасць каталіцкай веры і дасведчаны ў Законе Божым, каб праціўнікі каталіцкай і апостальскай веры спазнавалі ісціну і вызваліліся з пасткі д'ябальскіх памылак, у якія былі запалоненыя. З ісцінным дазволам і належным шанаваннем прэлатаў праз годных і дасведчаных у Святым Пісанні братоў, якія маглі б праз здаровую дактрыну выяўляць людскія памылкі і прыцягваць усімі спосабамі да веры, і пастараемся вярнуць у лона найсвяцейшай Рымскай Царквы. Нават даступна кажа Хрыстос: належыць заўсёды маліцца, а не згасаць (Лк 18) і Апостал: Без затрымкі маліцеся (I Фес 5), аднак некаторыя з нас за 24 змены паміж днём і ноччу, іншыя 15, іншыя 12, хто ж менш, 7 на кожнага чалавека згодна з яго рангам моляцца. Захоўваючы непарушна пастаяннае ўстрыманне і нявіннасць і цнатлівасць, пазбягаючы падазрэнняў у сужыцці з жанчынамі, каб ніхто з нашых не набліжаўся адзін да аднаго, у тым ліку і для размовы, акрамя як пры належных сведках і надзейных асобах, якія глядзяць і слухаюць. Ніколі браты і сёстры ў адным доме не рыхтуюцца спаць, ніколі за адзін стол не сядаюць. Мы прымем царкоўныя таінствы ад біскупаў і святароў у тых дыяцэзіях, дзе мы спынімся, і выкажам ім належную паслухмянасць і павагу. Але больш паважаных і дасведчаных у Законе Божым і ў прамовах Святых Айцоў мы прызначылі выкладаць слова Госпада, па дамоўленасці і ўзгадненні з прэлатамі Царквы, братам і сёстрам, клірыкам і міранам, каб вучыліся неабходнаму для пераварота ерэтыкоў. Ва ўсіх жа біскупствах, дыяцэзіях ці епархіях, у якіх мы ёсць і будзем, мы меркавалі пасціцца паводле закона і звычаю прэлатаў і каталіцкіх артадаксальных мужоў іншых правінцый, як у начныя імшы, так і ў Сухія Дні і Вялікі Пост. Тое ж таксама заўсёды будзе за сталом для збору ў доме, дзе мы будзем жыць і з якога выходзім у колькасці васьмі. Таксама дадзена бласлаўленне для пашырэння міласці трымацца бесперапынна маўчання, акрамя як для выпраўлення чытача або тлумачэння лекцыі. Калі ж хто са свецкіх нам давяраецца, што здзейсніў праз што-небудзь каму-небудзь якую-небудзь шкоду, неабходна, калі зможа і захоча

[51] Алюзія на Мф 10.

намі суцешыцца, каб сам і не іншыя кампенсаваў. Бо мы добрасумленна сплачваем дзесяціны, і пяршыны, і ахвяраванні, і іншае паводле звычаю месцаў, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні прэлату і іншым клірыкам, у дыяцэзіях ці парафіях, у якіх мы жылі б: што ўсім вернікам-хрысціянам дзейсна раім. Мы вырашылі насіць набожнае і сціплае адзенне, якое мы прывыклі здабываць праз малітву, карыстаючыся ў далейшым агульнапрынятым абуткам, па парадзе і загадах найвышэйшага пантыфіка, для падаўлення абурэння, якое выказвалася супраць нас з прычыны зверху адкрытага абутку, які раней мы мелі звычай выкарыстоўваць". Такім чынам вы трымайцеся вышэйзапісанага плана паваротy ад чыстага сэрца, і шчырага сумлення, і веры непрытворнай так, каб вы надавалі ўдзячную пакорнасць Богу і карысны прыклад людзям.

Напісана ў Сеньі, 10 календы жніўня, 15 год нашага пантфікату [1212 г.][52].

146. БІСКУПУ КРЭМОНЫ. Пра справу Бернарда Прыма і паплечнікаў.

Калі сляпыя і кульгавыя, а таксама нямоглыя не толькі павінны быць запрошаны ўвайсці на вяселле сыноў найвышэйшага Айца, але нават прымушаныя [прыйсці], то тым больш пажаданы тыя, хто на яго [вяселле] спяшаецца сам па сабе, ніяк не павінны быць адштурхнуты ад яго [вяселля]. Прынамсі так мы думалі, калі Бернард Прым і паслядоўнікі яго, якія былі аганьбаваны грахом ерасі, калісьці звярнуліся па настаўленне да найсвяцейшай Рымскай Царквы, і паабяцалі, што яны будуць гатовы пакорліва і з глыбокай пашанай прыняць нашы выпраўленні вучэння, і мы старанна выпрабавалі іх веру, а таксама нарэшце пранікнёна даследавалі іх план; адпаведна і вы павінны разважліва арганізаваць так, як мы лічым неабходным наконт іх арганізаваць, у абодвух апостальскіх лістах зрабілі відавочным, і каб яны былі пэўныя, каб ніхто не данасіў без прычыны на тых, хто знаходзіцца пад абаронай Святога Пятра і нашых падначаленых, і якія ў веры каталіцкай і набожнасці апостальскай застаюцца. Паколькі галава і часткі цела павінны адпавядаць адна адной, нагадваем твайму брацтву і больш старанна падштурхоўваем, праз апостальскі ліст табе перадаём, паколькі ты больш ахвотна прымаеш рэкамендаваных, выкажы параду, дапамогу і міласць паводле вышэйадзначанай формы тым, хто накіроўваецца ў храм Гасподні з мірам, як мужам надзейным і ісцінным каталікам.

Напісана ў Сеньі, календы жніўня, 15 год нашага пантыфікату [1212 г.][53].

I.iii Дурандa з Оскі. Кніга супраць ерасяў

"Кніга супраць ерасяў" (Liber Antiheresis)[54] была напісаная Дурандам з Оскі, верагодна, у 1180-х гг. (адрэдагаваная каля 1207 г.[55]) і накіраваная супраць катараў у абарону каталіцтва. Пабудавана яна па прынцыпе публічных дыспутаў,

[52] PL 216:647D–650A.

[53] PL 216:667D–668D.

[54] Kurt-Victor Selge, *Die ersten Waldenser*, vol. 2. Der *Liber antiheresis* des Durandus von Osca (Berlin: de Gruyter, 1967), 3–6.

[55] Monique Zerner, "Au temps de l'appel aux armes contre les hérétiques: du *Contra Henricum* du moine Guillaume aux *Contra hereticos*," in *Inventer l'hérésie ? Discours polémiques et pouvoirs avant l'inquisition* (Nice: Centre d'Études Médiévales, Faculté des Lettres, Art et Sciences Humaines, Université de Nice Sophia-Antipolis, 1998), pp. 119–156, 138.

якія тады шырока праводзіліся на поўдні Францыі паміж катарамі, каталікамі і вальдэнсамі (у розных варыяцыях). Вядома, што Дуранд быў і сам актыўным удзельнікам такіх дыспутаў.

Гэта кніга – адна з першых крыніц па гісторыі вальдэнскага руху (якая ўтрымлівае таксама і вышэйназваную Споведзь веры Вальдэса), напісаных менавіта яго ўдзельнікамі, а не іх апанентамі. Люсі Босварт называе працы Дуранда "аднымі з найбольш важных палемічных твораў усяго Сярэднявечча"[56].

З пралога

Але не цалкам закінуўшы сваіх людзей... сын усеагульнага бацькі... падобна да таго, як на пачатку сваіх пропаведзей [абраў] непісьменных рыбакоў, [як мог не абраць] цябе, спадар Вальдэс (domine Valdesi), які абраў апостальскую беднасць (aporsimate) і як цябе, так і тваіх абшчыннікаў (comites), паколькі не маглі атрымаць паўнамоцтвы (inposti), і як [Хрыстос] мог адвергнуць (renitatur), прыводзячы ў доказ памылкі[57].

З главы 5: пра Яна Хрысціцеля

Няма нікога, хто б прызнаваў, што Ян Хрысціцель асуджаны: аднак кажуць, што ён сумняваўся, калі дасылаў двух сваіх вучняў да Яго, кажучы: "ці Той Ты, Які павінен прыйсьці, ці чакаць нам другога?" (Мф 11:3) Супраць гэтай заразы мы старанна працуем.

З главы 14: пра хрышчэнне

Хрышчэнне ж дзяцей сярод вернікаў уважаецца за цноту таінства і неабходную ўмову імшы (responsionem offerencium).

З главы 15: пра ахвярапрынашэнне

Каго хрысціць п'яны, забойца, распуснік, хрысціць Ісус Хрыстос. Як? Бо не іменем сваім, а іменем Айца, Сына і Святога Духа хрысціць, як вучыў Хрыстос.

Благія біскупы не прычыняюць шкоды ні пры хрышчэнні немаўлят, ні пры асвячэнні царквы, ні пры еўхарыстыі, бо не ад чалавека святасць прымаюць, а ад Бога.

З главы 25: пра будучую аплату

Мы сказалі, што мы, усе як адзін, верым, што ў залежнасці ад таго, хто ў якім целе жыве, [яго і] атрымае ў апошні дзень.

З главы 26: пра працу

Калі б Бог хацеў, каб Апостал меў зямную працу і імкнуўся да назапашвання маёмасці, а не быў падобны да птушкі ў нябёсах ці лілей на полі, ён бы не стаў прапаведаваць ім ні першага, ні апошняга. Бо паколькі ён не быў уцягнуты ні ў якія зямныя справы, то мог свабодна прапаведаваць; каб пропаведзі, заахвочванню і будучаму выратаванню [апосталы] цалкам сябе прысвяцілі, не абцяжарваючы свае думкі зямным, іх ад зямной працы цалкам аддзяліў. На якую ж працу хацеў яго паслаць, паглыбіўся ў тым Евангеллі, калі свайму вучню кажа: "жніва многа, ды работнікаў мала; дык прасеце Гаспадара жніва, каб паслаў работнікаў

---

[56] Bosworth, *Perceptions of the Origins and Causes of Heresy*, 26.

[57] З-за пропускаў у тэксце пераклад прыблізны.

на жніво Сваё." (Мф 9:37–38). Але, моцна гэтаму пярэчачы, кажа іншы: Гэта было сказана менавіта Апосталам, але вы ж ніяк не з'яўляецеся апосталамі, слухайце, што Павел сказаў: "калі хто ня хоча працаваць, той і ня еш"! (2 Фес 3:10), – сказаў фесаланікійцам. Пры гэтым, як мы ведаем, сам Апостал шмат разоў пацвердзіў, што сам працаваў. Да гэтага мы кажам... што на самой справе папярэдняе пасланне адрасавана тым, хто мае зямлю, а не прапаведнікам і не тым, хто адмовіўся ад сваёй гаспадаркі.

Каб прага да багацця не перашкаджала нашым думкам, пропаведзям і малітвам, паводле міласці, падараванай нам міласцю Божай, мы паабяцалі цалкам прысвяціць сябе і аддаць у распараджэнне Богу, каб працаўнікам, а менавіта прапаведнікам, пасланым на жніво, гэта значыць у народ, мы пастанавілі заклікаць [звяртацца да Бога]. Звяртаючыся да часоў першаснай Царквы, калі, як мы чулі, Гасподзь навучаў працы 70[58] вучняў. Сказана ж...

Бо мы дастаткова казалі пра зямную працу ў тым, што датычыцца ерэтыкоў, звяртаючыся да каталікоў, мы карыстаемся навуковымі выказваннямі. Таму што некаторыя з каталікоў пра зямныя рэчы, калі сказаць папраўдзе, будучы сялянамі, нам пярэчачы, рабілі выснову: "калі хто ня хоча працаваць, той і ня еш!" Такім чынам, калі яны папраўдзе маюць на ўвазе, што есці не павінны тыя, хто фізічна не працуе, тады і царкоўных прэлатаў, якія мала альбо ўвогуле не працуюць, і саміх апосталаў асудзілі, якія таксама фізічна зусім не працавалі. Таму было б лепш, каб духоўны лад жыцця таксама быў прыняты. Таму павінна быць прынята да ведама наступнае: калі хто не хоча працаваць, гэта значыць, калі хто адмаўляецца ад Божай справы, то хай не есць, гэта значыць Цела Хрыстова не ўжывае для свайго судовага апраўдання ці асуджэння. Таксама пярэчаць, што Гасподзь у Эдэме сказаў пасля выгнання: "У поце твару твайго будзеш есьці хлеб" (Быц 3:19). Але ён гэта сказаў у выглядзе праклёцця, а не таго, чаго варта трымацца, у накладанне пакарання за іх правіну. Мы верым, што ад гэтага праклёцця Апостал вызвалены. Таксама так у таго, хто спявае псалмы: "Ты будзеш есьці ад працы рук тваіх; дабрашчасны ты, і добра табе!" (Пс 127(128):2). Але што можа быць больш недарэчным, чым іх падман, мы пісьмова дадалі. Не толькі таму, хто мае розум, відавочна, што папярэдні радок дададзены, каб з намі паспрачацца. Не толькі сказаў той, хто спявае псалмы "Ты будзеш есьці ад працы рук тваіх", але і ты, хто есць ад працы рук тваіх, дабраславёны. І не пра фізічнае казаў, а пра духоўнае. Дабраслаўлёныя не толькі ўсе тыя, хто здабывае сабе ежу фізічна сваімі рукамі, але і дактары, хто не фізічна, а маральна працу спасцігае. І не дзіва, што нас гэтым папракаючы, яны ўзнімаюць крык, як вашы папярэднікі папракалі Блажэннага Іераніма, і таксама многае іншае мы чуем. І адказаў на гэта сам Іеранім, які ва ўступе да Ёва згодна з грэчаскім удакладненнем так сказаў... Ні ў Старым, ні ў Новым Запавеце няма таго, каб Бог асудзіў каго-небудзь за тое, што фізічна не працаваў. Няхай маўчаць тыя, хто аддае перавагу зямной працы перад духоўнай, і імкнуцца мець працу, якая не можа прапасці і якая будзе ўзнагароджаная ў будучыні, бо зямны саступіць духоўным працаўнікам дарогу, якая вядзе ў царства нябеснае. Што можа быць для нас важнейшым за таго, хто жыве ў дасканалай Тройцы і валадарыць на векі вечныя. Амінь.

---

[58] Лічба "70" у царкоўных тэкстах невыпадковая. Акрамя 70-і мудрацоў, якія перакладалі Стары Запавет, былі яшчэ 70 ерэтычных сектаў, пералічаных у самай знакамітай энцыклапедыі таго часу Ісідора Севільскага, на якога арыентаваліся наступныя аўтары.

З главы 27: пра наканаванне

Вось чулі вы, што ўсіх [Бог] заклікаў і ўсіх хоча да пакаяння скіраваць. Але калі б хто-небудзь быў прадвызначаны, як сцвярджаюць некаторыя, а не Бог усіх заклікаў, і не хацеў бы, каб усе да пакаяння звярнуліся, у адваротным выпадку воля Яго, калі б яна такой была, была б супраць яго прапановы... Калі б такія дробязі выявіліся ў манастыры тых, хто кажа, што Бог так прадвызначыў усім да аднаго, што [ніхто] ніякім чынам не зможа выратавацца, ніякую добрую справу ажыццявіць, акрамя тых, каму было наканавана ад пачатку свету. Калі зробіцца так, як яны сцвярджаюць, то Бог не адмяніў бы таго, што наканаваў, і загадаў бы, каб апосталы прапаведавалі гэта агулам усім людзям.

Але моцна аспрэчваюць і кажуць ерэтыкі: Бог ведае ўсё і да таго, як што-небудзь стварыў у сусвеце, ведаў, што будзе ў будучыні; і калі ўсё ведаў, то, такім чынам, ведаў, каму належыць выратавацца, а каму належыць быць асуджаным: і ў гэтым прадвызначэнне. Мы ж сапраўды кажам, што ў гэтым у нас няма сумневу. Мы не пярэчым, што Ён усё ведае, і мы ніяк не аспрэчваем веды Бога. Бо сапраўды, хто можна быць настолькі вар'ятам, што не верыць, што Бог усё ведаў яшчэ да часу? Але, хоць ён і ведае, але не варта верыць, што благім будзе вынесены судом асуджальны вырак і яны выратавацца не змогуць, нават калі б яны вярнуліся з крывой сцежкі і панеслі пакаранне; ні што добрыя [прадвызначаныя] да выратавання і не могуць быць асуджаныя, нават калі б яны пакінулі прамую дарогу і ўблыталіся ў ганебныя ўчынкі. Але на самой справе калі б хто быў прадвызначаны да жыцця і запісаны ў кнігу жыцця, мы разумеем, што ў памяці Бога тыя, хто заганнасць пакідае, і да служэння Богу ўсім сэрцам аддаецца. Калі ж хто дабро пакідае і аддаецца благім справам, тады, без сумневу, з кнігі жыцця выдаляецца. Пра гэта сведчыць сам Гасподзь, які кажа праз прарока: ... [далей ідуць у вольным пераказе цытаты з Ісз 33:14–16; 18:21–24] Такім чынам, выратаванне або асуджэнне ў справах, а не ў прадвызначэнні лёсу. Бо сапраўды часцей за заслугі чалавека прыходзяць і дабро, і зло, і нават Бог адмяняе абяцанні свае, як Госпадам засведчана, які праз прарока Ерамію сказаў... (Іер 18:8–10). З гэтых доказаў і шматлікіх іншых належыць зразумець, што любога будуць судзіць не паводле прадвызначэння, а за [ягоныя] справы.

З главы 28: пра статус Царквы

Сучасныя ерэтыкі, якія падманваюць д'ябальскімі хітрыкамі, хоць яны ніякім чынам не маюць дачынення да боскай улады, робяць выснову ў выглядзе папрокаў, кажучы: нам ясна, якой будзе ваша новая дактрына, мы ж трымаемся нашай спрадвечнай, якую прымалі нашы папярэднікі, а не новай. Але гэтае іх меркаванне абвергнутае нашымі разважаннямі ў славу Божую.

З дапамогай любові Хрыстовай, найдаражэйшыя браты, ацэнена хітрасць Д'ябла, паколькі сілаў хапае, і [каб] іх пярэчанні цалкам стрымаць, і каб лягчэй іх глупоты распазнаваліся, хто такое кажа ў тлумачэнне іх пазіцыі. Кажуць так: не падабаецца нам ваш статут (religio) тым, што ён новы і дрэнны той час, калі ён быў распачаты. Мы ж кажам: гэта нішто і дробязь, і нам відавочна, што вы клапоціцеся адно толькі каб абапірацца на Пісанне, і што наша новая дарога – яна ж ваша старая, і вы сцвярджаеце, што найдаўжэй трымаецеся апостальскага вучэння. Але мы не дзівімся, што вы называеце новым шляхам той шлях, які, як мы чулі, называлі новым вашы папярэднікі. Аднак у Дзеях Апосталаў можна прачытаць, што калі Павел прапаведаваў афінянам, яны казалі ... (Дзн 17:18–20). Але мы

чыталі, што тое самае было сказана пра Госпада нашага Збавіцеля. Калі ж Гасподзь вызваліў кагосьці ад дэмана, казалі праціўнікі яго ... (Мк 1:27)[59]. Але мы верым, што тое новае – гэта тое, што было пацверджана Новым Запаветам. Мы можам пацвердзіць, што ўся наша вера грунтуецца на выратаванні, і засноўваем дарогі нашы на Новым Запавеце і іншых боскіх тэкстах. Бо гэта і ёсць тая самая дарога, пра якую казаў Апостал ... (Яўр 10:19–20).

Але кажуць цвёрда: дзе была Царква да прыходу Збавіцеля, а значыць, і да вашага прыходу? І чаму навучыла Вальдэса (Valdesium) яго дарога? Хіба ж ад іншага добрага чалавека пераняў, а не іншую дарогу абаронца гэтага вынайшаў? Мы ж кажам: бо заўсёды была Царква Божая, а значыць, задзіночанне верных, якія праўдзівай веры трымаліся і [добрымі] справамі поўніліся. Калі б вы сапраўды хацелі ведаць, чаму яго вучылі: ведайце, бо міласць Божая нябёсамі дадзеная, і голас дабравесця так кажа ... (Мф 5:3). Паўтараю, яго так голас настаўляў і навучаў.

Але кажуць цвёрда: ад каго пачуў? І хто яму сказаў добрую вестку, адкуль ведае, што гэта дарога – добрая? Мы ж кажам: Ад Пантыфікаў і святароў. На гэта яны кажуць, амаль смеючыся: А ці не фарысеі, якія былі Богам праклятыя, Вас вучылі? І якім чынам ад тых, якія нячыстыя і святога духу не маюць, вы можаце ўспрыняць добрыя справы? На гэта ж сапраўды адказваючы, мы кажам: Мы, колькі б ад гэтых галасоў слоў Божых не ўспрынялі, ні міласці, ні добрых спраў ад іх не прымалі, а толькі ад Бога, які даў веды і разуменне тым, хто баіцца Яго, па сведчанні Блажэннага Якуба, які пацвердзіў: "Усякае даньне добрае і ўсякі дар дасканалы зыходзіць згары, ад Айца сьвятла" (Іак 1:17) Мы верым, што ўсё дабро, што ёсць унутры нас, ад таго ж. Але жыццё святара таксама можа аказацца благім, аднак калі нешта добрае скажуць, так рабіць належыць, па сведчанні нашага Збавіцеля, які вучням і натоўпу аднолькава казаў "на Майсеевым пасадзе селі кніжнікі і фарысэі; дык вось, усё, што яны кажуць вам захоўваць, рабеце і захоўвайце; а паводле ўчынкаў іхніх не рабеце, бо яны гавораць, і ня робяць" (Мф 23:2–3). І таму мы слухаемся загадаў іх, бо згодна са Святым Пісаннем [ім] належыць падпарадкоўвацца, [але] жыцця іх мы пазбягаем. І з гэтай прычыны Вальдэс (Valdesius) словы Божыя ад іх прыняў і яго паплечнікі (socii) імкнуцца да іх выканання. Бо яны сапраўды пачулі са слоў Яго, якія не падманваюць: "хто сьледуе слову Майму, той ня ўбачыць сьмерці вавек" (Ін 8:51). У гэтай нашай новай дарозе мы прызнаёмся, бо гэта можна пацвердзіць Новым Запаветам. Бо наша вера і справа сапраўды падмацаваная евангельскімі доказамі. Калі запытаецеся, чаму мы бедныя? Адкажам, што мы чыталі, што наш Збавіцель і яго апосталы былі бедныя. І паколькі больш-менш такое мы кажам у нашай прапанове, мне хочацца данесці да аўдыторыі вашай секты, што гэта праўда.

Пэўна, вам можна выхваляцца, што Уладаром Ісусам Хрыстом вашы патроны называюцца ерэтыкамі, але я дзіўлюся, якім чынам вы рашыліся казаць, што вы трымаецеся апостальскага жыцця, калі вы выхваляецеся, што іх веру, і беднасць, і справу адмаўляеце, за невялікім выключэннем таго, што вы робіце, каб прыпадобніцца да нас. Але ж ніколі прыклад вашага жыцця не адпавядаў вучням Хрыста, а, хутчэй, вашы патроны супярэчылі ўсім вашым папярэднікам. Я ж кажу, калі Бог мне даў права, з каго вашы патроны бяруць вашы памылкі і жыццёвыя прыклады. У язычніцкіх кнігах мы чыталі пра аднаго філосафа, што завецца

[59] Спасылкамі на кнігі Бібліі ў дужках пасля шматкроп'я пазначаны пропускі біблейных цытат, якія прыводзіліся аўтарамі для доказу таго ці іншага сцвярджэння.

Піфагорам (piccagoras), які памылкі сфармуляваў. Казаў, што душа пасля смерці чалавека ў іншае цела, ці чалавека, ці скаціны, ці птушкі ўваходзіць, і таму [паяданнем] плоці апаганьваюцца. Гэтыя памылкі сабе прысвоілі тагачасныя людзі. І гэта быў пачатак іх секты. Мы чыталі, што ў тыя часы, калі прапаведаваў Апостал Ян у Азіі, былі Маркіён, Керынт і Эбіён (Marchionem, Cherintum et Ebionem), якія прапаведавалі супраць святога Яна Апостала, яны казалі, што Сын меншы за Айца і што ўсё часовае створана не Богам-Збавіцелем, а Злым. Таму Блажэнны Ян назваў іх Антыхрыстамі[60]. І ад іх вашы патроны перанялі гэтыя памылкі. Былі і іншыя ў Персіі, а менавіта Зараэн (Zeroen) і Арфаксат (Arfaxat)[61], якія, сярод іншых блюзнерстваў, казалі пра бога цемры як творцу Закона Майсея, чые памылкі былі адданыя праклёну Святым Мацвеем, Юдай і Сымонам. І вось іншыя патроны. Былі іншыя, а менавіта Іменей і Філет, якія, у процідзеянне Паўлу, зусім не верылі ва ўваскрэсенне, якія заслужана называліся садукеі (saducei). І іх вы таксама маеце за патронаў. Быў іншы, які быў пасвечаны Апосталам, па імені Мікалай (Nicholaus), які, паходзячы ад апосталаў, казаў, што гэта адзін і той жа грэх, калі чалавек жыве як са сваёй жонкай, ці з блудніцай, ці з якой іншай жанчынай. Ён падобным чынам прымаў прынцып дваістасці; гэта памылка была праклятая ў Апакаліпсісе, калі Гасподзь сказаў эфесянам праз анёла: "Аднак тое ў табе добрае, што ненавідзіш ты дзеі Мікалаітаў, якія і Я ненавіджу" (Апак 2:6). І гэтага вы падобным чынам маеце за патрона. Былі і іншыя, якія называліся гностыкамі, якія, між іншым, клятвенна сцвярджалі, што існуюць два багі, адзін добры і адзін злы. І іх таксама маеце як патронаў. Быў і іншы, па імені Маніхей, які аб'яўляў, што ўсё бачнае створана Д'яблам; быў і іншы, па імені Тацыян, які гідзіўся цела. І іх таксама маеце як патронаў. І таксама шматлікія іншыя, каго пералічваць занадта доўга. Гэта тыя, ад каго вашая секта бярэ пачатак. Але апосталамі і вучнямі Хрыста яна заўсёды абвяргалася, не толькі матэрыяльным мячом, але і Боскім Пісаннем. Калі вы таксама сціпласцю выхваляецеся і таму кажаце, што вы трымаецеся боскага жыцця, то вось іўдзеі, якія доўга трымаліся іўдаізму: але ці ж яны добрыя і ці змогуць выратавацца? Маўчыце лепш пра гэта, і калі захочаце пагаварыць пра выратаванне, звярніцеся да Новага Запавету, у якім без забароны знаходзіцца выратаванне. Той, хто будзе з усіх сіл імкнуцца трымацца гэтага, будзе выратаваны.

Але скажыце, што вам бачыцца наконт кліру? Увесь клір, які знаходзіцца ў падпарадкаванні Рымскай Царкве, калі трымаецца Боскай Царквы і ўзыходзіць да саміх апосталаў, і адзін за адным, пачынаючы ад Блажэннага Пятра ажно да сённяшняга дня пайменна могуць назваць усіх пантыфікаў, якія наследавалі адзін ад аднаго. Ці верыце вы, што гэта падстава, каб лічыць іх сцверджанні праўдзівымі? Ведаю напэўна, што не верыце, бо кажаце: не належыць верыць, што яны трымаюцца адзінай Царквы Божай, бо яны аддаюцца сіманіі, забойствам, блуду і распусце, і заўсёды пераследуюць сяброў Божых, што нечувана, каб апосталамі рабілася. Мы ж кажам: калі б па той прычыне не належала верыць, што яны Царквы Божай

---

[60] Алюзія на (1 Ін 2:18–27).

[61] Магі і чараўнікі, якія з'яўляюцца ў апокрыфах як ворагі вучняў Хрыста, дзейнічалі ў Эфіопіі, Персіі і Арменіі. James Keith Elliott, *The Apocryphal New Testament: A Collection of Apocryphal Christian Literature in an English Translation*, 2nd ed. (Oxford: Clarendon Press, 2009), 529. Магчыма, імёны паходзяць ад імёнаў багоў зараастрызму, падрабязней гл. Bosworth, *Perceptions of the Origins and Causes of Heresy*, 157.

не трымаюцца, бо не робяць справы Божай, то і вам не належыць верыць, бо веры Апостальскай, без якой немагчыма Богу спадабацца, а таксама справы іх [апосталаў] вы не маеце!

Але кажуць цвёрда: Вы заўсёды супраць нас, вы трымаецеся гэтай распуснай Рымскай Царквы! Мы ж у адказ кажам: ні распусты, ні чаго іншага недазволенага мы не трымаемся, ці благім святарам, ці іншай працы мы не прабачаем, але наадварот супрацьстаім, выкрываючы. З гэтай прычыны мы церпім шматлікія пераследы ад тых, хто нас ненавідзіць. Але веры ў Бога і царкоўных таінстваў не толькі супраць вас, але ж і супраць яўрэяў, язычнікаў і ўсіх сектаў, якія гэтым зганьбаваныя, да самай смерці будзем трымацца і вольна прапаведаваць (predicare), паводле міласці, дадзенай нам Богам, і мы пастанавілі, што не адступім ні перад кім з жывых. Гэта падштурхоўвае нас дзейнічаць дзеля выратавання тых, хто слухае, і славы таго, хто жыве ў дасканалай Тройцы і валадарыць на векі вечныя. Амінь.

З главы 30: пра прабачэнне пасля смерці

Мы казалі, што верым, што вернікі не могуць ахвяраваннямі, міласцінай ці іншымі добрымі справамі быць карыснымі памерлым.

Трэба верыць, што перад судом за некаторыя правіны ёсць ачышчальны агонь, пра які сапраўды сказана: "Бо калі хто блюзнерыў на Святы Дух, ні ў гэтым веку, ні ў будучым не будзе прабачэння яму". З гэтай фразы дадзена зразумець, што нейкая віна, атрыманая ў гэтым веку, можа быць адпушчана ў будучым... (з Грыгорыя Вялікага).

"У гэтым ачышчальным агні адныя пазней, іншыя раней будуць ачышчаныя адпаведна з тым, большую ці меншую схільнасць да пагібелі мелі" (з Кнігі выказванняў). Адкуль Аўгусцін: Пасля гэтага жыцця верагодна, што некаторыя верныя праходзяць праз ачышчальны агонь, наколькі больш ці менш блізкія да пагібелі былі, і так пазней ці раней выратуюцца.

Душы памерлых выратоўваюцца чатырма шляхамі: або ахвяраваннем святара, або адплатай святых, або міласцінай блізкіх, або пастом заступнікаў (з Грыгорыя Вялікага)[62].

I.iv Заканадаўчыя дакументы

I.iv.a IX артыкул сінадальнай пастановы Адона, біскупа Туля

> У гэтай пастанове упершыню згадваецца вальдэнская прысутнасць у даліне Рэйна (1192 г.).

З іншага боку, наконт ерэтыкоў, якія называюцца Вадуа (Wadoys), мы настаўляем усіх вернікаў, як клірыкаў, так і міран, у вызваленні ад іх грахоў, якія толькі хто-небудзь з іх [ерэтыкоў] сустрэне, моцна вяроўкамі звязаць і для пакарання да Тульскага прастола прывесці[63].

---

[62] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 36–45.

[63] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 91.

I.iv.b Эдыкт караля Арагонскага і графа Праванскага Альфонса II ад 1192 г.

Меркаванні наконт дакладнай даты выдання эдыкту разыходзяцца. Жан Ганэ прапануе 1192 г., а Даміян Дж. Сміт у сваім апошнім артыкуле абгрунтоўвае яго выдачу на саборы ў Лерыдзе ў 1194 г. Ён мяркуе, што выхаду эдыкту паспрыяў візіт папскага легата кардынала Грыгорыя з Сан-Анджэла[64].

Альфонс, Божай міласцю кароль Арагонскі, граф Барселонскі, маркіз Праванскі, усім архібіскупам, біскупам і іншым царкоўным прэлатам у каралеўстве, графам, віконтам, рыцарам і ўсім людзям у каралеўстве, каб вы ў рамках сваіх уладных паўнамоцтваў выказвалі павагу да дабрабыту і цэласнасці хрысціянскай рэлігіі. Паколькі Бог хоча, каб мы абаранялі свой народ варта і справядліва, то мы кіруем людзьмі з бесперапынным клопатам пра выратаванне і абарону гэтага народу. Таму, беручы ў прыклад нашых папярэднікаў і падпарадкоўваючыся кананічнаму праву, якія прадпісваюць ерэтыкоў адолець перад вачыма Бога і ўсіх католікаў, усюды асуджаць, а таксама пераследаваць: а менавіта Вальдэнсаў, або суботнікаў (insabbatati)[65], якія самі сябе называюць іншым іменем – бедныя з Ліёна, а таксама ўсіх іншых ерэтыкоў, якіх лікам не злічыць, адлучаных Святой Царквой, а таксама ўсяго нашага каралеўства, мы рэкамендуем усім надзеленым уладай не даць выслізнуць і ўцячы ўсім ворагам Крыжа Хрыстова, тым, хто апаганьвае хрысціянскую рэлігію, ворагам нашым і людзей каралеўства.

Такім чынам, ад гэтага дня і надалей, калі хто-небудзь з вышэйназваных Вальдэнсаў, суботнікаў і любых іншых ерэтыкоў, якіх бы тое не было заняткаў, у доме сваім будзе прымаць, або іх пагібельныя пропаведзі ў якім-небудзь месцы слухаць, ці свой хлеб ці якую-небудзь іншую паслугу ім шчодра аказваць, то спазнае на сабе, што такое быць ахвярай гневу ўсемагутнага Бога і нашага, то маёмасць яго без патуранняў канфіскуйце, так, як караецца вінаваты ў злачыннай абразе караля. І мы загадваем гэты наш эдыкт і вечнае пастанаўленне ўсім абшчынам, замкам і гарадам нашага каралеўства і валадарства, а таксама ва ўсіх землях пад нашай уладай чытаць па нядзелях, і біскупы ці іншыя царкоўныя кіраўнікі, а таксама намеснікі, байлі, суддзі, часовыя суддзі, начальнікі і ўсе людзі павінны пільна [яго] трымацца і запісваць усіх парушальнікаў прадпісанага пакарання.

Трэба таксама адзначыць, бо калі якой асобе, знатнай ці нязнатнай, становіцца вядома пра якія-небудзь шматразовыя названыя нягоднасці, якія паводле нашага эдыкта вы павінны ўстанавіць ужо за тры дні, у якім-небудзь рэгіёне нашага каралеўства [гэта асоба] знайшла тых, хто не ўцякае прама адразу, але ўпарта затрымліваецца і няспешна прагульваецца, то няхай не баіцца, што такім чынам стане ахвярай ніякага іншага пакарання за любое зло, ганьбу ці цяжар, за выключэннем усяго толькі смяротнага пакарання або адсякання часткі цела, што ім [ерэтыкам, якія не ўцякаюць] прычыніць, але яна [гэта асоба] будзе мілай і прыемнай у вачах нашых і спазнае на сабе, што заслужыла больш нашай міласці. Даём таксама тым нягоднікам перамір'е (хоць яно можа падацца нейкім чынам супраць належнага і супраць логікі) ажно да наступнага пасля Свята Усіх Святых дня, яны або хай пакінуць нашу зямлю, або хай пачнуць рыхтавацца да ад'езду,

---

[64] Smith, "The Early Waldenses," 79.

[65] Або "неабутыя".

інакш яны, распранутыя, будуць падлягаць збіццю, пакаранню бізунамі і іншаму ганебнаму абыходжанню[66].

I.iv.c Эдыкт караля Арагонскага Педра II ад 1197 г.

У 1197 г. вышэйцытаваны эдыкт перавыдаў са сваімі дапаўненнямі спадкаемца Альфонса, Педра II, і пацвердзіў на Саборы ў Жыроне ў лютым 1198 г. (пасля паўторнага візіту таго самага легата).

Новым тэрмінам для ерэтыкоў пакінуць тэрыторыю стаў Вялікдзень 1198 г. Паколькі фінансавая сітуацыя новага караля была больш нестабільнай, то ў дакуменце падрабязней апісаны механізм канфіскацыі: дзве траціны на карысць кароны і адна – на карысць асобы, якая ерэтыка выкрыла. Таксама былі прапісаныя штрафы для тых, хто не дапаможа службовым асобам у дзеяннях супраць ерэтыкоў, і самім службовым асобам[67].

Пачынаючы новае кіраванне, Педра, Кароль Арагонскі, сын Альфонса, у 1197 годзе ў Жыроне выдаў пастанаўленне, якое, прыстасоўваючыся да канонаў свяшчэннай Рымскай Царквы, якія вызначылі з Божай дапамогай, што ерэтыкі мусяць быць выключаныя, асуджаныя і падвяргацца пераследу, а менавіта Вальдэнсы, якія на народнай мове называюцца суботнікі, або бедныя з Ліёна, і ўсе іншыя ерэтыкі, сваёй каралеўскай уладай загадаў [ім] з'ехаць, каралеўскім міністрам пракантраляваць, каб ім загадалі з'ехаць да Вялікай Нядзелі, інакш да пакарання канфіскацыі маёмасці і спалення цела дадасца такое ж пакаранне тым міністрам, якія нядбала да справы паставіліся[68].

I.iv.d Статут біскупа Гі з Палестрыны, папскага легата ў Бельгіі, ад 1202 г.

У гэтым дакуменце згадваецца пераклад Бібліі на "народную" мову. Хутчэй за ўсё, гаворка ідзе пра дзейнасць не вальдэнсаў, а першых бегінак.

Усе кнігі Святога Пісання, напісаныя па-раманску або па-тэўтонску, павінны быць перададзеныя ў рукі біскупа[69], і ён верне тыя, якія палічыць патрэбным вярнуць[70].

I.iv.e Згадка пра дыспут, які адбыўся ў Каркасоне ў 1203 г.

Паміж легатамі Святога Прастола Арнальдам і Пятром, біскупам Каркасона Радульфам і каралём Педра Арагонскім з аднаго боку і некаторымі Вальдэнсамі з другога...[71]

---

[66] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 91–93.
[67] Smith, "The Early Waldenses," 80.
[68] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 93–94.
[69] Маецца на ўвазе Уг, біскуп Льежа.
[70] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 120.
[71] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 125.

I.iv.f Урыўкі з лістоў Папы Рымскага Інакенція III ад 1206 г. да падэста і консулаў Фаэнцы і Эмілі

... каб з вашага горада былі выгнаныя ерэтыкі, якія называюцца бедныя з Ліёна, а таксама патарэны ці любыя іншыя секты схізматыкаў.

... каб з вашага горада былі прыбраныя прыніжаныя бедныя з Ліёна ці любыя сектанты ерэтычнай заганнасці[72].

I.iv.g Саборная пастанова ад 1208 г. Ядона, біскупа Парыжа

Невядома, ці мае яна дачыненне да вальдызму, бо іншых сведчанняў іх прысутнасці ў Парыжы не знойдзена. Фрагмент прыведзены для ілюстрацыі шырокай актуальнасці спрэчкі пра мірскую пропаведзь у пачатку XIII ст.

... святарам строга забаронена дазваляць прапаведаваць каму-небудзь невядомаму або неадукаванаму, а таксама па-за царквой, ці то на вуліцах, ці то на плошчах, ці то ў якіх іншых месцах іх парафій: і няхай святары часцей навучаюць у дні нядзельныя, і стрымліваюць сваіх прыхаджанаў пад пагрозай адлучэння, каб яны не слухалі такіх людзей з-за небяспекі ерасі і памылак, якія тыя сеюць[73].

I.iv.h Пастанова імператара Свяшчэннай Рымскай Імперыі Атона IV супраць Турынскіх Вальдэнсаў ад 25 сакавіка 1210 г.

Першае сведчанне пра вальдэнсаў у Турынскай дыяцэзіі.

Атон, Божай міласцю Аўгусцейшы Імператар Рымскі, свайму ўлюбёнаму сыну біскупу турынскаму сваю міласць і добрую волю.

Шырока прасціраецца Божая спагадлівасць, якая выявіла бязбожныя ўдары памылкамі па ісціне веры сваіх верных. Шчыры жыве ў веры, хто ж не верыць, неадкладна будзе асуджаны. Такім чынам мы, хто дзякуючы веры не атрымлівае імператарскія [правы] дарма, усіх тых, хто верыць няправільна, хто спрабуе ў нашай імперыі патушыць святло каталіцкай веры ерэтычнымі заганамі, хочам сурова пакараць і ад абшчыны верных па ўсёй імперыі дакладна аддзяліць; асабліва дасылаючы табе ўладу, каб ты выгнаў імперскай уладай з усяго Турынскага біскупства ерэтыкоў Вальдэнсаў і ўсіх тых, хто ў Турынскай дыяцэзіі сее пустазелле падману ці каталіцкую веру атакуе якімі-небудзь памылкамі ці заганным вучэннем. Таксама мы пацвярджаем табе ўсемагчымыя свабоды, правы і паўнату ўлады, каб ты Турынскае біскупства праветрыў сваімі стараннымі клопатамі і ачысціў ад усіх заганаў, якія супярэчаць каталіцкай веры[74].

I.iv.i Пінерольскі статут

Выдадзены не раней за 1220 г. прыёрам абацтва Святой Марыі на карысць графа Томаса I Савойскага. Між іншым, ён дазваляў:

---

[72] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 126.

[73] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 128.

[74] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 141–142.

... што калі які-небудзь мужчына ці жанчына свядома дадуць прытулак якому-небудзь Вальдэнсу ці вальдэнцы на тэрыторыі, падначаленай Пінерола, будзе пакараны штрафам 10 солідаў за кожны раз, калі будзе даваць прытулак[75].

I.iv.k Статут імператара Свяшчэннай Рымскай Імперыі Фрыдрыха II супраць ерэтыкоў

Выдадзены 22 лістапада 1220 г. у якасці падзякі Папу Ганорыю III за каранацыю. Максімальна пашыраў правы Царквы. Паўтараў антыерэтычныя пастановы Веронскага Сабора 1184 г. і IV Латэранскага 1215 г. Прыведзены ўрывак з главы 6.

Катараў, патарэнаў, леаністаў, спераністаў, арнальдыстаў, абрэзаных і ўсіх ерэтыкоў абодвух полаў, без адрозненняў па імені, мы навечна пазбаўляем гонару і даверу, а таксама загадваем нашай дзяржаўнай уладай, разлічваючы, каб маёмасць, канфіскаваная ў такіх асоб, да іх пасля не вярталася, а таксама каб іх дзеці не маглі ўступіць у спадчынныя правы, бо нашмат горш абразіць спрадвечную ўладу, чым часовую...[76]

I.v Антывальдэнскі працэс у Мецы ў 1199 г.

I.v.a Вытрымкі з булаў Папы Рымскага Інакенція III у Мец

У 1199 г. Папа Інакенцій III атрымаў ад біскупа Бертрама звесткі пра мужчын і жанчын, якія чыталі пераклады свяшчэнных кніг і зневажалі святароў на таемных сходах (дакумент не захаваўся). 12 ліпеня ён запытаў больш падрабязнасцяў (хто рабіў гэтыя пераклады, з якой мэтай, у чым іх вучэнне і г.д.)[77], але, не атрымаўшы адказу, 9 снежня накіраваў для высвятлення абставінаў трох цыстэрцыянцаў-абатаў: Сіто, Марымонда і Ла Крэт[78].

Ніжэй прыведзены вытрымкі з гэтых лістоў.

Да ўсіх вернікаў горада і біскупства Меца

Наш паважаны брат біскуп Меца ахвотна паведаміў нам такім чынам, што вялікая колькасць міран і жанчын, як у біскупстве, так і ў самім горадзе Мецы, пераклала сабе на гальскую мову з Пісання Евангеллі, Пасланні Апостала Паўла, Псалтыр, каментары на Ёва[79] і многія іншыя кнігі, і з гэтымі перакладамі міране і жанчыны настолькі смела, але не настолькі асцярожна, саманадзейна маюць намер, каб на сваіх таемных сходках вырыгваць іх [пераклады] паміж сабой, і адзін аднаму па чарзе прапаведаваць: яны не змешваюцца, а таксама адвяргаюць тых супляменні-

[75] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 18–19.
[76] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 19–20.
[77] PL 214:698–699.
[78] PL 214:793–796; Modestin, "Western Germany Including Strasbourg," 184–185.
[79] Аўтарства Грыгорыя Вялікага.

каў[80], хто да іх падобны, хто да іх не прыслухоўваецца, і яны лічаць чужымі тых, хто вушы і душы да іх не схіляе; калі ж хто-небудзь з прыходскіх святароў захоча супраць іх выступіць з абвінавачаннямі, яны яму адкрыта супрацьстаяць, лязгаючы доказамі, выхапленымі з Пісання, што іх ніхто не павінен забараняць. Таксама некаторыя з іх пагарджаюць прастатой сваіх святароў; і калі тыя [святары] прамаўляюць ім [ерэтыкам] выратавальныя словы, то мармычуць сабе пад нос, што маюць лепшыя [словы] ў сваіх кнігах і могуць вытлумачыць іх больш дакладна.

Хоць і не забаронена жаданне вывучаць Боскае Пісанне і, згодна з ім жа, старанне яго распаўсюджваць, і нават пажадана, але тут належыць запярэчыць, што яны праводзяць гэта ў сваіх таемных сходках і ўзурпуюць права пропаведзі, прастаты святароў пазбягаюць, і абвяргаюць стасункі з тымі, хто гэтага не прытрымліваецца[81].

Да абатаў Сіто, Марымонда і Ла Крэт

Таму самаму біскупу Меца і яго капітулу мы аддалі загад, каб старанна шукаў праўду, хто выканаў гэтыя пераклады, з якой мэтай ён гэта зрабіў, якая вера карыстальнікаў [гэтых перакладаў], чаму яны вучаць; ці схіляюцца яны да павагі Апостальскага Прастола і ці ўсхваляюць Каталіцкую Царкву; такім чынам наконт гэтых і іншых пытанняў, якія неабходна даследаваць, каб выявіць усю праўду, гэтым лістом дакладна праінструктавана, бо нам належыць разумець больш поўна і ўсеабдымна, што трэба з гэтым рабіць. Таксама той біскуп у сваіх лістах да нас паведаміў, што некаторыя з тых, каго ён асабліва адзначыў у папярэдне адасланых лістах, адмаўляюцца падпарадкоўвацца Апостальскаму Прастолу; некаторыя з іх цішком, некаторыя ж публічна кажуць, што належыць падпарадкоўвацца толькі Богу[82].

I.v.b Цэзарый з Гайстарбаха. Дыялог пра цуды

Цэзарый (Caesarii Heisterbacensis) быў прыёрам цыстэрцыянскага кляштара ў Гайстарбаху (ля Кёльна). Напісаў некалькі твораў на лаціне, у тым ліку "Дыялог пра цуды" (Dialogus miraculorum) (1220–1221 гг.). Гэта зборнік пра 746 розных незвычайных падзеяў і з'яваў, пра якія аўтар чуў або быў сведкам. У адным з дыялогаў ідзе гаворка пра вальдэнсаў у Мецы.

Глава XX: Пра ерась Вальдэнсаў у горадзе Мецы.

Некалькі гадоў таму, падчас кіравання біскупа Бертрама, чалавека шырока адукаванага, паўстала ерась Вальдэнсаў (Valdosiana) у горадзе Мецы, і вось якім чынам. Калі гэты першасвятар у адзін са святочных дзён прапаведаваў у царкве перад народам, ён, заўважыўшы, што ў натоўпе знаходзяцца два служкі Д'ябла, сказаў: Бачу сярод вас пасланцаў Д'ябла. Гэта і былі яны, на якіх указаў яго палец, якія мне прадставіліся ў Манпелье сярод ерасяў асуджаных і выгнаных. Яны жорстка адказалі біскупу, будучы ў суправаджэнні аднаго шкаляра, які дурнавата брахаў супраць яго, як сабака, правакуючы яго на пакаранне. Выйшаўшы з царквы, яны сабралі вакол сябе мноства людзей і пачалі памылкі свае прапаведаваць.

---

[80] "Consortium" – тых, хто мае з імі аднолькавы лёс.

[81] PL 214:695.

[82] PL 214:794–795; Modestin, "Western Germany Including Strasbourg," 184–185.

Некаторыя з клірыкаў сказалі ім: Спадарства, ці не пра вас сказаў Апостал: "І як прапаведаваць, калі ня будзе пасланых?" (Рым 10:15) Мы хочам даведацца, хто вас паслаў гэта прапаведаваць; адказалі яны: Дух. Бо біскуп не мог прымусіць іх з-за нейкага з уплывовых гараджанаў, хто спрыяў ім з нянавісці да біскупа і каго аднойчы выгналі з царквы з-за нейкага памерлага родзіча-ліхвяра[83]. Насамрэч жа яны былі пасланыя падманным духам, якому моляцца ерэтыкі-Вальдэнсы, так названыя ў гонар аднаго з іх, якія ў тым жа горадзе былі пасееныя і яшчэ цалкам не знішчаныя[84].

I.vi Артыкулы веры страсбургскіх Вальдэнсаў

Гэта ўрывак з твора страсбургскага архітэктара Даніэля Спэкліна (памёр у 1589 г.). Ён згадваў, што бачыў "у трох старых кнігах" звесткі пра існаванне ў Страсбургу каля 1212 г. прыкладна 500 вальдэнсаў абодвух полаў, сярод якіх было нямала можных гараджанаў, гарадскога кіраўніцтва, манахаў і простага люду. Таксама ён узгадвае пра існаванне каля 300 артыкулаў веры. Іх кіраўніка звалі Ян, і яго супляменнікі жылі не толькі ў Эльзацы, але і ў Германіі, Багеміі, Швейцарыі і Італіі. У іх было два іншыя кіраўнікі, у Багеміі і Італіі, але самы галоўны знаходзіўся ў Мілане, ён акумуляваў грошы, сабраныя з вернікаў, размяркоўваў іх сярод бедных і накіроўваў вандроўных прапаведнікаў.

Вальдэнсы адмаўляюць сказанае святымі, і на ўсё выдумляюць супярэчанні ў сваёй секце. І яны, а менавіта Вальдэнсы, выдумляюць сваіх дактароў, аднак на гэтым яны не спыняюцца, і ў сваіх памылках на тры часткі падзяліліся і такім чынам ніяк не могуць заснаваць сваю Царкву, бо Царква павінна быць адзінай, як і вера павінна быць адна, а не шмат[85]. Такім чынам, гэтыя Вальдэнсы стварылі монстра, трохгаловага па сваёй прыродзе, які, як кажуць, створаны з адзіным целам, аднак мае тры галавы; адныя называюцца сваімі ерэсіярхамі рымлянамі (Romani), іншыя п'емонцамі (Pedemontani), іншыя немцамі (Allemani), і адзін над адным яны не маюць судовай ці выканаўчай улады, і да сказанага іншым не прыслухоўваюцца.

Пасля жорсткага пераследу біскупа адрачыся ад веры не захацелі 80 чалавек, сярод якіх 23 жанчыны, некаторыя з іх знатныя, 12 службовых асоб і сам Ян. Яны былі прыгавораныя да спалення на вогнішчы, але перад гэтым ім былі зачытаныя 17 найбольш страшных з пункту гледжання Царквы памылак:

1. Адмаўленне пакланення іконам;
2. Адмаўлення малітваў да Дзевы Марыі і дапамогі святых;

---

[83] Ліхвярства не абавязкова абазначала прафесійнае "даванне грошай пад працэнты". У тыя часы абвінавачванне ў ліхвярстве агулам дадавалася да спісу "грахоў" ворагаў Царквы. Падрабязней гл. Clément Lenoble, "L'économie des hérétiques: note sur le rapprochement entre usure et hérésie," in *Aux marges de l'hérésie. Inventions, formes et usages polémiques de l'accusation d'hérésie au Moyen Âge* (Rennes: Presses universitaires de Rennes, 2017), pp. 111–152, 129.

[84] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 25.

[85] Таму, мяркуюць аўтары выдання крыніцы, звесткі пра падзел на тры часткі могуць быць не фактам, а спробай даказаць марнасць апеляцый да адзінай царквы. Апеляцыя да падзеленасці ерэтычнага руху магла быць проста палемічным прыёмам для аргументацыі немагчымасці ерэтыкоў быць "сапраўднай царквой". Падрабязней Sackville, *Heresy*, 33–36.

3. Адмаўленне цэлібату святароў;
4. Адмаўленне пастоў;
5. Адмаўленне прыватнай споведзі;
6. Неіснаванне чыстца;
7. З гэтага вынікае бессэнсоўнасць добрых спраў на карысць мёртвых;
8. Бессэнсоўнасць добрых спраў[86];
9. Бессэнсоўнасць святых пасадаў;
10. Адмаўленне Папскіх прэрагатываў;
11. Адмаўленне таінстваў;
12. Данатызм;
13. Хрышчэнне можа праводзіцца слінай замест алею;
14. Прычасце і хлебам, і віном;
15. Беднасць як імітацыя Хрыста;
16. Начныя сходы;
17. Адпушчэнне грахоў не трэба, бо Хрыстос ужо памёр для гэтага на крыжы і прыняў усё на сябе[87].

I.vii Ліст прадстаўнікоў італьянскай галіны Вальдэнсаў да сваіх братоў па веры з Германіі або Аўстрыі

Гэты ліст (яго лацінская назва – Rescriptum heresiarcharum Lombardiae ad Leonistas in Alamania[88]), напісаны каля 1235 г. Знойдзены ён быў у некалькіх манускрыптах у Мюнхене і Вене, і як вынік мае некалькі варыянтаў назвы: «Рэскрыпт ерэсіярхаў Ламбардыі да ерэтыкоў Алеманіі/бедных з Ліёна, якія ёсць у Алеманіі/Рункарыяў». Таксама у яго спісах ёсць некаторыя розначытанні тэксту, якія датычацца ў асноўным займеннікаў, прыназоўнікаў і формаў дзеяслова і не нясуць сэнсавай нагрузкі. У дакуменце апісваецца сустрэча паміж італьянскай/ламбардскай галіной Вальдэнсаў з іх французскімі/ультрамантанскімі (у даслоўным перакладзе "тыя, якія за гарамі") адзінаверцамі, якая прайшла ў 1218 г. у Бергама (Ламбардыя).

Гэтая сустрэча была выклікана неабходнасцю (у крыніцы – жаданнем) усталяваць мір і гармонію паміж абедзвюма групамі. Ламбардцы, як неаднаразова падкрэсліваецца ў пасланні, настойліва імкнуліся да замірэння, якое не было дасягнута з-за памылак (з пункту гледжання ламбардцаў) веравучэння ультрамантанаў. З іншага боку, пазіцыя ультрамантанаў таксама была дастаткова жорсткай, так што іх імкненне да замірэння выклікае вялікі сумнеў.

На падставе гэтага ліста (адраса і пераліку "аўтараў") можна акрэсліць геаграфію пашырэння секты, яе палавы склад і ўнутраную структуру. Праз разгляд прычын разрыву можна зрабіць высновы пра найбольш актуальныя пы-

[86] Таго, што робіцца для выратавання душы: дапамога бедным, міласціна etc.

[87] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 47–49. Цалкам магчыма, што аўтар блытаў памылкі старажытных Вальдэнсаў са сваімі сучаснікамі – пратэстантамі або іншымі сярэднявечнымі ерэтыкамі – катарамі ці ортлібанамі. Modestin, "Western Germany Including Strasbourg," 186.

[88] Тэрыторыя сучаснай Аўстрыі або Германіі. Увогуле гэтую назву дакументу надалі даследчыкі XIX ст., але яна замацавалася ў навуковай літаратуры.

> танні веравучэння; але нельга сказаць, што маецца ўяўленне пра дагматыку руху ў цэлым: пытанні, па якіх погляды "французскай" і "італьянскай" галін супадалі, застаюцца па-за рамкамі ліста.

У гонар Айца і Сына і Святога Духа, амінь. Ота з Рамецэла (Ramezello), Божай міласцю пабрацім тых, хто бязвінна церпіць[89], Ян з Сарнага (Sarnago), Тадэус Марак (Marinus), Г. з Папіі (Papia), Ф. з Леганіа (Leganio/Lignanio), Г. з Мальтразіа (Moltrasio/Moltasio), І. з Муціны (Mutina), Ян Францыск[90], Іардан з Донье (Dogno), Бонан, а таксама Томас, любым братам і сёстрам у Хрысце, сябрам і сяброўкам, якія набожна жывуць за Альпамі ў праўдзівым вітанні [або ў выратавальнай ісціне], зычым здароўя[91] і сведчым вечную любоў.

Чуйнай і клапатлівай душы важна, каб шкоднае было пакінута, падзенне пазбегнута, чыстае падтрымлівалася, сапраўднае было ўспрынята. *"Дзякуем*[92] *Богу* нашаму *кожны раз, як згадваем вас, заўсёды ў кожнай малітве* нашай *за ўсіх вас з радасьцю молячыся, за ваш удзел у зьвеставаньні зь першага дня ажно да сёньня, упэўненыя, што той, хто пачаў у вас добрую дзею, будзе завяршаць яе да дня Ісуса Хрыста, як і трэба* нам *думаць пра ўсіх вас, бо* мы маем *вас у сэрцы, і ў абароне і ў сьцьверджаньні зьвеставаньня, вас усіх, як супольнікаў маіх у мілаце. Бог – сьведка, што* мы любім *усіх вас любоўю Ісуса Хрыста; і* молімся *за тое, каб любоў ваша яшчэ больш узрастала ў спазнаньні і ўсякім досьведзе, каб, спазнаючы лепшае, вы былі чыстыя і неспатыкнёныя ў дзень Хрыста, поўныя пладоў праведнасьці празь Ісуса Хрыста, на славу і хвалу Божую. Жадаем, браты, каб вы ведалі"*[93] пра спрэчкі, якія ўжо даўно пастаянна адбываюцца паміж намі і Ультрамантанамі (ultramontanos)[94], якія называюцца паплечнікамі Вальдэса (Valdesii), з якімі мы ў рэшце рэшт пасля шматлікіх пошукаў змаглі разам сабрацца ў год ад нараджэння Хрыста 1218 месяц травень побач з горадам Бергамам[95]. Перш за ўсё, такім чынам, да іх наша пытанне пра кіраўніцтва (preponimento), сэнс якога такі: "Пра тое перш за ўсё мы пытаемся ў вас, браты-Ультрамантаны, што, як мы чулі, Вальдэс казаў, што ён не хоча, каб іншы ў абшчыне Ультрамантанскай ці італьянскай (ytalici) між братоў меў перавагу ні пры жыцці, ні пасля смерці; ці ёсць жаданне трымацца гэтага, нічога не адымаючы і не дадаючы, або не?" – так яны паднеслі адказ у апісанні той жа лжывай паперы ў канцы, якую масарый[96] горада Вероны перадаў, дзе абвясціў: "І разам выбіраць старшыняў (praepositus) або кіраўнікоў (rector)", у падначаленні якім мы б спасцігалі [ісціну] проста і без перашкодаў; што абшчыны наша і іх [Ультрамантанаў], аб'яднаныя ў адно, як сказана, выбіраюць разам пажыццёвых старшыняў (praepositosa eternaliter) ці часовых кіраўнікоў (rectores ad tempo) згодна з тым,

---

[89] Алюзія на Мф 5:6.

[90] Магчыма, маецца на ўвазе "з Францыі".

[91] У прынцыпе, магчымы і іншыя варыяцыі перакладу, але агульны сэнс вітанняў захоўваецца.

[92] Курсівам вылучаны прамыя цытаты з Біблії.

[93] Флп 1:3–12.

[94] "Тымі, хто па той бок гор". У літаратуры гэта назва замацавалася за вальдэнсамі, якія жылі на поўдні Францыі – адпаведна, з іншага боку ад Альпаў, чым ламбардцы.

[95] Горад у Італіі, Ламбардыя.

[96] Пэўная пасада ў горадзе, дакладна не ідэнтыфікуецца. Уолтэр Л. Вакефілд і Осцін Патэрсан Эванс лічаць гэта ўвогуле ўласным іменем (Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 280).

што будзе больш карысна абшчыне ці што значна больш паслужыць справе міру. Гэта, як было зазначана, было адказана Ультрамантанамі наконт кіраўніцтва.

Таксама на пытанне наша пра прызначэнне святароў, сэнс якога такі: "Па-другое пытаемся мы, што вы думаеце пра пасвячэнне і як вы хочаце мець прызначэнне святароў?" – падобна так яны прынеслі адказ, што ў апісанні згаданай падманнай паперы змяшчалася: "І прызначэнне святароў, пастаяннае ці часовае, такім чынам здзяйсняюць: разам ці з нядаўна перавернутых[97], ці з сяброў пастаянных, згодна з тым, што будзе больш карысна абшчыне ці што значна больш паслужыць справе міру". І так пра святароў, як мы зазначылі, было Ультрамантанамі адказана.

На пытанне ж наша пра злучэнне працоўных (laborantium congregatio), сэнс якога такі: "Па-трэцяе пытаемся мы пра тое, што, як мы чулі, Вальдэс казаў, што калі наконт усяго астатняга былі мір і згода паміж ім і італьянскімі братамі, акрамя толькі злучэнняў працоўных, якія ў тыя часы былі ў Італіі, калі, такім чынам, яны [італьянцы] з імі [злучэннямі працоўных] не расстануцца, міру з ім мець яны не маглі; ці ёсць жаданне трымацца гэтага, нічога не адымаючы і не дадаючы, або не?" – безумоўна, адказ Ультрамантанаў на гэта пытанне быў між іншым відавочна абвешчаны ў шматразова ўзгаданай падманлівай цыдулцы: "Калі якая-небудзь асоба папросіць парады ў бедных, хацеўшы застацца працаваць на зямлі, [хай] атрымае параду паводле Слова Божага і Яго закона, незалежна ад таго, захоча зямлю пакінуць [сабе] ці злучыць сябе з многімі".

Гэтым запісам па трох раней названых пытаннях Ультрамантаны-паплечнікі Вальдэса адказалі, да слоў пра злучэнне працоўных дадаючы іншыя, пра што мы перадалі наступны адказ: "Жадаем, каб усю мякіну[98], якую браты-Ультрамантаны на нашых вачах італьянцам пералічылі, ці таксама іншую, калі яна ёсць, з працоўных злучэнняў выдалілі, што здзейсніўшы, мы прыніжана іх упрошвалі, пакуль адзначаных працаўнікоў абшчыны абодва таварыствы парадай і згодай да славы Божай не прызналі". І так па ўсіх трох найважнейшых прычынах, якія раней пакідалі нязгоду, мы прыйшлі да пагаднення; калі б па ўсіх іншых [пытаннях], што былі глыбока між намі і імі, мы былі згодныя, і калі б пра гэта самае чулі мы ад іх і яны ад нас, то ніякай бы нязгоды не засталося. Калі б, аднак, справамі пацвердзілі сказанае ўслых, і тое, што ў канцы той цыдулкі, што нам перадалі, абвешчана, да канца давялі! Там ёсць: "І гэтыя тры вышэйзгаданыя [прычыны], што мы пачулі ад іх, мы б хацелі іх вырашыць па волі Божай і Яго закона, проста і без перашкодаў, адрынуўшы ўсялякія спрэчкі і разважанні"[99].

Акрамя таго, на гэта яе[100] пытанне адносна хрышчэння мы далі такі адказ: "Кажам мы, што ніхто, абвяргаючы з пагардай справядлівае рэальнае хрышчэнне вадой, не зможа выратавацца; мы верым, што нехрышчоныя немаўляты ніяк не выратуюцца; молім мы, каб яны ў гэта верылі і [гэта] вызналі".

На іншае ж яе пытанне, датычнае шлюбу, сказалі мы, адказваючы: "Верым мы, як належыць па закону, што злучаныя [ў шлюбе] акрамя як з прычыны распусты

---

[97] Г. зн. тых, хто нядаўна далучыўся да секты.

[98] Маецца на ўвазе "ўсе правіннасці, грахі, недахопы". Параўн. "аддзяліць зерне ад пустазелля".

[99] Гэта відавочна цытата вышэйзгаданага ліста, таму суб'ектам у сказе з'яўляюцца ультрамантаны, а аб'ектам – ламбардцы.

[100] Цыдулы.

ці па ўзаемнай згодзе нікім не павінны быць разлучаныя; і ў гэта мы молім братоў-Ультрамантанаў верыць і вызнаваць".

З іншага боку на пытанне братоў-Ультрамантанаў, датычнае брата Томаса ці каго іншага, мы адказалі: "Мы хочам, каб, калі браты-Ультрамантаны брата Томаса ці іншых з нашых таварышаў абвінавацілі, вышэйадзначаны Томас і іншыя павінны зрабіць, а мы прыняць, справаздачу паводле Бога і Яго закону; гэтыя самыя вышэйадзначаныя Ультрамантаны самі падрыхтаваліся і іншых сваіх сясцёр падрыхтавалі; і таго ж брат Томас патрабуе і просіць".

На гэта такі быў адказ Ультрамантанаў: "На ваша пытанне пра хрышчэнне мы кажам, што мы верым, што ніхто не будзе выратаваны, калі толькі не будзе рэальна ахрышчаны ў вадзе. Кажам мы пра законны шлюб, што ён не можа быць разарваны, акрамя як па ўзаемным жаданні, або [можа] на законнай падставе скончыцца паводле таго, [як] абшчына палічыць патрэбным. Наконт таго, што было сказана пра Томаса і Яна з Францыгены[101] ці пра каго іншага, хто выдалены з абшчыны па асаблівых прычынах: што паводле Бога і Яго закону задавальняе нашу абшчыну, тое наша абшчына і зробіць і прыме ад іх паводле Бога і Яго закону".

Гэта, як зазначана, было сэнсам адказу Ультрамантанаў-паплечнікаў Вальдэса па справе хрышчэння, і шлюбу, і аддзялення Томаса ці якога іншага паплечніка нашага ад іх злучэння ці іх ад нашага па асаблівых прычынах. З гэтага вынікае, як мы казалі раней, што мы згодныя з папярэднім, а таксама з узаемнай споведдзю веры.

І калі б словы іх, як было адзначана раней, мелі эфект. І да гэтага наша пытанне, сэнс якога такі: "Мы пытаемся пра які-небудзь звычай ці вераванне (credulitas) ваша, якое вы не можаце адкрыта праз Пісанне прадэманстраваць, [якое] мае Божая Царква Хрыстова і мець павінна: ці хацелі вы і гэтага трымацца і да таго ж нас прымусова падвесці, ці не?" Адказ жа іх такі, сэнс якога: "Мы гаворым, што самі гэтага не прымаем і іншых не хочам прымушаць", – паўтараем, калі гэта іх, гэта значыць Ультрамантанаў-паплечнікаў Вальдэса, ісцінны адказ, то несумненна верым мы, і што мір цвёрды і згоду ўзаемную ўжо маем.

А па праўдзе адказалі ці не, з Божай дапамогай дасведчаны чытач, а таксама слухач, зможа спасцігнуць з наступнага. На зробленае ж раней іх пытанне датычна смерці Вальдэса і Вівета мы адказваем, што Вальдэс і Вівет, калі яны атрымалі прабачэнне ад Бога за ўсе іх грахі і правіннасці перад смерцю, могуць быць выратаванымі. Імёны пазначаных шасці Ультрамантанаў, якія рашуча (penitus) адверглі адказ, ёсць: Пётр з Рэланы і Берэнгарый з Аквавівы, якія абодва кіравалі імі па звычаях Ультрамантанаў у [гэтым] годзе, Г. з Цэрвіяна і Г. Турант, Опрант з Банату і Іуліян, якія, як мы ад іх чулі, перад саветам абшчыны іх таварыства сабраліся з такой жа колькасцю нашых братоў, імёны якіх такія: Ян з Сарнага, Тадэуш, Томас і Майфрэд, Ян Францыск і Іардан з Данье, каб паклапаціцца пра мір. Адзін з іх, я паўтаруся, натуральна ж, Пётр з Рэланы, без лішніх слоў у прысутнасці вышэйзгаданых нашых і іх братоў між іншым прамовіў: "Мы сцвярджаем, што Вальдэс знаходзіцца ў Божым раі", дадаючы, што калі мы тое ж самае, што і ён, пра Вальдэса не прызнаём, міру з намі быць не можа.

І гэта адно з двух, што затрымлівала нязгоду паміж намі і паплечнікамі Вальдэса; другое ж – Святая Вячэра Хрыстова (panis fraccione) ці ахвярапрынашэнне, наконт чаго погляды Ультрамантанаў, як мы чулі, мелі тры варыянты.

---

[101] Магчыма, маецца на ўвазе "з Францыі".

Першы з іх той, які прадставілі некаторыя паплечнікі-Вальдэнсы, што існасць хлеба і віна адным толькі прамаўленнем слоў Божых ператвараецца ў Цела і Кроў Хрыста, дадаючы: "Мы надаем дабрадзейнасць не людзям, а словам Божым". Гэтаму процілстаўлена, што калі толькі прамаўленнем слоў Божых хлеб і віно перамяняюць [сваю] існасць на Цела і Кроў Хрыста, то з гэтага вынікае, што хто б ні прамовіў словы Божыя над хлебам і віном, ці яўрэй, ці язычнік, пасля прамаўлення гэтага выразу створаць Цела і Кроў Хрыста; казаць такое – бясспрэчны грэх, які ніколі не можа быць прыняты як дакладны пункт погляду ці таксама меркаванне. Але, з іншага боку, некаторыя спрабавалі вышэйсказанае падтрымаць, прыводзячы ў якасці доказу гэты выраз Апостала: *"бо асьвячаецца словам Божым і малітваю"* (1 Цім 4:5). Мы адказалі, што Апостал у гэтым [выразе] тую памылку не даказвае, а, наадварот, абвяргае і разладжвае, бо датычна ежы – а не ахвяры! – Апостал, кажучы вышэйадзначаную фразу, не толькі выкарыстоўвае слова Божае, але і дадае малітву. Падыходзіць жа малітва да асвячэння або не – будзе зразумела, з Божае ласкі, далей з наступнага.

Другі погляд паплечнікаў Вальдэса наконт праламлення хлеба такі: "Ніхто не можа хрысціць, калі не ў стане Цела Хрыстова сатварыць". [Вось] тыя кароткія пярэчанні, якія павінны былі быць выказаны на такое палажэнне: ці Цела Хрыстова можа быць зроблена не толькі міранамі ці злодзеямі, але і жанчынамі, а таксама блудніцамі, ці ўвогуле ніхто ніколі не будзе ахрышчаны імі. Па-другое: відавочна, што ці міранамі Цела Хрыстова робіцца, ці таксама ніхто не можа быць ахрышчаны імі – таксама супраць споведзі веры тых, хто, як мы казалі вышэй, перад усёй Вальдэнскай абшчынай разам, каб мір бачыць, сабраліся: "Паколькі наконт праламлення хлеба ў рэшце рэшт прызнана намі, што гэта таінства не можа здзяйсняцца ні міранамі, ні жанчынамі, а толькі святарамі"[102].

Яны таксама казалі, што ніхто, ні харошы чалавек, ні дрэнны, а толькі той, хто ёсць Бог і чалавек, гэта значыць Хрыстос, можа бачна перамяняць існасць хлеба і віна на Цела і Кроў Хрыстову; і датычна гэтага трэцяга пытання з-за гэтага адказу іх пра таінствы мы з імі мелі згоду.

З тым жа, што яны дадалі, што малітва распусніка ці каго-небудзь злога, таго, хто збочыў са шляху сапраўднага, Госпадам чуюцца і прымаюцца, мы не згодны[103].

Таксама [тое], што Гасподзь не прымае імшаў злодзеяў і не слухае іх малітвы, з наступнага абсалютна зразумела[104].

Не толькі гэты запіс, але і многія іншыя доказы, якімі мы прызналі вышэйадзначаныя Вальдэнскія погляды абвергнутымі, мы чыталі ў Божым Пісанні. Калі ж хто сапраўды хацеў бы запярэчыць: *"Старажытнае мінула, цяпер усё новае"*[105].

---

[102] Гэта словы ламбардцаў.

[103] Далей ідуць шматлікія цытаты з Новага Запавету з мэтай падмацаваць папярэднюю заяву (Мф 5:13; Лк 15:34–35; Ін 9:31, 15:4, 15:5, 15:7; 2 Кар 6:14–16; Ціт 1:15–16).

[104] Аўтары пацвярджаюць гэта наступнымі біблейскімі цытатамі (Вых 12:43–45, 25:1, 28:1, 30:30, 32:33; Ляв 10:1–2, 21:16–17, 22:3, 22:25; Лікі 18:1–2, 18:6–7, 19:22; Другі закон 16:5–7; 1 Цар 2:27, 30, 15:22–24; Псалмы 13:2–5, 5:7, 26:5, 34:16–17, 66:18; Сал 1:28–29, 15:8, 15:29, 28:9; Ісая 1:10–11, 1:13–15, 59:1–2; Іер 14:11–12, 6:20; Езэк 8:18; Осія 9:4; Амас 5:21–22; Міхей 3:3–4; Мал 1:6–7, 1:10, 2:1–2, 2:8–9, 2:13). Варта адзначыць, што не ўсе цытаты на 100 адсоткаў супадаюць з Вульгатай. Магчыма аўтары карысталіся іншымі перакладамі, напрыклад Vetus Latina, альбо наогул цытавалі па памяці.

[105] 2 Кар 5:17. Далей ідуць цытаты з (Яўр 2:2–3, 10:28–29; Рым 3:19, 15:4).

Мы з пагардай абвяргаем споведзь Вальдэнсаў датычна Святой Вячэры, якая таксама запісана [і якую нам] прадставілі, так кажучы: "Па пытанні, якое намі было пастаўлена, – пра Святую Вячэру – так верым: святар, узведзены ў сан Рымскай Царквой, пакуль абшчына хрышчоных падтрымлівае яго імшы, будзь ён шчыры/законны або няшчыры/незаконны, калі возьме хлеб і віно і блаславіць іх у памяць Цела і Крыві Гасподняй, мы верым, што пасля бласлаўлення ад яго слоў стане Цела і Кроў Гасподня; датычна пытання, пастаўленага пра прыхаванага грэшніка, мы верым, што хлеб і віно, якія ён блаславіў, – Цела і Кроў Ісуса Хрыста" – гэта, мы кажам, споведзь Вальдэнсаў, супраць якой, аднак, шмат Гасподніх доказаў прывялі; і мы паклапаціліся аб паведамленні праз дадзены ліст вам адрозненняў у тым, што было папярэдне выказана, і што мы мацавалі публічна доказамі і словамі і таксама перадалі ў лісце.

Адказ італьянцаў пра Святую Вячэру ці ахвярапрынашэнне.

"Мы кажам, што ніхто, ні добры, ні дрэнны, калі толькі не той, хто сам Бог і чалавек, можа перамяніць існасць хлеба і віна яўна ў Цела і Кроў Хрыста. Адкуль [вынікае], што калі святар для здзяйснення гэтага падыходзіць – мы кажам пра святара, узведзенага ў сан свяшчэннаслужыцеля па прызначэнні Хрыста – і Бог малітву яго пачуў, мы верым, што існасць хлеба і віна пасля [яго] бласлаўлення ёсць Цела і Кроў Хрыста; менш за ўсё ад яго ці праз яго[106]. Разумеючы гэта так, тлумачым: "менш за ўсё" значыць, калі Бог яго не пачуў, каб было больш зразумела, больш відавочна, што не ў чалавечай, а толькі ў Божай сіле аказаць падтрымку: калі малітва святара не пачута, Госпада няма [з ім]. "Ад яго" – гэта значыць наколькі ад дурнога святара, таксама калі сам асмеліцца прыняць. "Ці праз яго" – гэта значыць праз яго малітвы, калі хто-небудзь іншы захоча перадаць. Аднак калі для прыняцця гэтага таінства прыступіць хто варты, што – хай не праз нявартых служкаў ці фальшывыя малітвы або бласлаўленні – у Госпада вымольвае, чаго прагне, г. зн. Цела Гасподняе для свайго збавення паводле свайго жадання прымае, спасылаючыся ўслед за гэтым на Пісанне[107]: *"Насычае дабротамі жаданьні твае"*[108], і тое ж: *"Жаданьне тых, што баяцца Яго, Ён выконвае, скаргі іхнія чуе, і ратуе іх"* [Псалмы 145[109]:19]. І зноў: *"Ты чуеш жаданьні лагодных, умацуй сэрца ім; адкрый вуха Тваё"* [10[110]:38]. Але нас не пахіснула, што некаторыя пра здрадніка Юду пярэчылі, бо не верым, што ён прымаў тое ж, што і астатнія апосталы; інакш адно і тое ж цела было б; Павел-сведка, ён пацвярджае: *"Адзін хлеб, і мы многія – адно цела; бо ўсе прычашчаемся адным хлебам"* [1 Кар 10:17]. І так на падобнае варта адказваць.

Мы верым, што пра службу тую, што чулася вартай датычна таінства, з далейшага вам будзе дастаткова ясна. Але з-за нявер'я, думаючы, што пра гэта ж кажа Апостал, настаўнікі нашы спрабуюць запярэчыць: што перадалі, нашы дактары

---

[106] Гаворка ідзе пра канцэпцыю, якая пазней атрымала ў каталіцтве назву "ex opere operato", што можа быць перакладзена як "у сілу самога факту дзеяння". Супрацьпастаўлялася "ex opere operantis" – "у сілу таго, хто дзейнічае". Сэнс у тым, што таінства залежыць не ад маральнага стану таго, хто гэта таінства здзяйсняе (сакральная сіла таінства ідзе не ад чалавека і не праз чалавека), а ад самога факту здзяйснення. Супрацьстаіць "данатызму" – вучэнню пра несапраўднасць таінстваў, якія здзяйсняюць грэшныя святары.

[107] Псалмы 103:5.

[108] У Вульгаце 102.

[109] У Вульгаце 144, але супадзенне не стоадсоткавае.

[110] У Вульгаце 10, але супадзенне не стоадсоткавае.

выслухалі, бо прадбачылі такую нявопытнасць[111]. Кіпрыян[112]: "Вядома, што еўхарыстыя не можа здзяйсняцца, бясспрэчна, любым чалавекам; калі няма надзеі і вера лжывая, тады ўсё адбываецца праз ману. Бо, [падобна] неразумным малпам, якія, хоць і не з'яўляюцца людзьмі, імітуюць чалавечае аблічча, ерэтык прыпісвае сабе Каталіцкую Царкву і [яе] ўладу і ісціну, хоць сам не ёсць у Царкве: бласлаўляючы, у той жа час ён ганіць Бога; абяцае жыццё, хоць [сам] мёртвы; заве Бога, а насамрэч блюзнерыць; кашчунны, прызначае святара; бязбожны, будуе алтары. Ад гэтага ўсяго ўзнікае і тое зло, што першасвяшчэннік д'ябла асмельваецца зрабіць прычашчэнне Хрыста, у той час як ні ахвяраванне не можа быць асвечана там, дзе няма Святога Духа, ні Гасподзь таму не дапаможа [ў адказ на] яго маленні і малітвы, хто сам Бога апаганьвае"[113]. Іеранім[114] на Сафонію[115]: "Святары, якія здзяйсняюць еўхарыстыю і кроў Гасподню раздаюць прыхаджанам[116], злачынна робяць па закону Хрыста, думаючы, што еўхарыстыю для вернікаў выконваюць словам, а не [сваім уласным] жыццём, і неабходныя шматлікія святочныя малітвы, а не вартасць [самога] святара; пра што сказана: *"Сьвятар, у якога на целе ёсьць хіба, не павінен падыходзіць, каб прыносіць ахвяры Госпаду"* [Ляв 21:21]. Тое ж на Агея[117]: "Якімі бы святымі не здаваліся і нават не прадстаўляліся, аднак, паколькі [да іх] дакрануўся той, хто апаганены ў душы[118], апаганьваюць усё". Грыгорый[119]: "Хто святыя[120] пасады прадае ці купляе, не можа быць святаром. Так сказана ў Пісанні: "Адлучаючы, сам будзеш адлучаны"[121]; гэта ерась сіманіі. З гэтага вынікае [пытанне]: калі яны адлучаныя і не святыя, [то ці] могуць яны асвячаць іншых? Калі іх няма ў Целе Хрыстовым, як яны могуць Цела Хрыстова даваць ці прымаць? Хто [сам] заганны, як можа бласлаўляць?" Тамсама: "Хто [ў жыцці] кіруецца багаццем, той рухаецца да таго, каб зрабіцца ерэтыком"[122]. З лістоў Папы Інакенція[123]: "Няхай слухаюць гэта тыя, хто, як аблудныя ерэтыкі, што пранікаюць адсюль і адтуль у сусвет, заражаюць святое цела Царквы, кажучы: "Я не сачу за сіманіта-

---

[111] Wakefield and Evans у *Heresies of the High Middle Ages*, паколькі асноўваюць свой пераклад на іншым выданні, даюць адрозны варыянт, гл. ст. 287.

[112] Св. Кіпрыян Карфагенскі (лат. Thascius Caecilius Cyprianus) – біскуп, адзін з Айцоў Царквы.

[113] Гэты урывак дайшоў да нас у складзе "Concordia discordantiam canonum" юрыста першай паловы XII стагоддзя Грацыяна (лат. Gratianus).

[114] Еўсевій Сафроній Іеранім Стрыдонскі (лат. Eusebius Sophronius Hieronymus), царкоўны пісьменнік, аскет, Настаўнік Царквы, стваральнік Вульгаты.

[115] Каментары да кнігі прарока Сафоніі.

[116] У каталікоў прычашчацца віном дазволена выключна духавенству, хоць канчаткова гэты канон замацаваны на Канстанцкім саборы ў пачатку XV стагоддзя.

[117] Каментары да кнігі прарока Агея.

[118] Магчыма, Д'ябал.

[119] Папа Грыгорый I Вялікі (лат. Gregorius PP. I), адзін з Айцоў Царквы.

[120] Маецца на ўвазе "царкоўныя".

[121] Цытата дакладна не ідэнтыфікавана. Падрабязней гл. Patschovsky and Selge, *Quellen*, 41.

[122] Крыніца дакладна не вызначана. Магчыма, "Libellus contra invasores et symoniacos".

[123] Дагэтуль невядома, на якую канкрэтна булу спасылаюцца вальдэнсы. Не вызначана нават, пра якога канкрэтна Інакенція ідзе гаворка. Гэта – безумоўны паказчык прызнання за Святым Прастолам права на духоўнае, няхай і не абсалютнае, кіраўніцтва. Таксама гэта сведчанне таго, што тэзіс аб сапсаванасці каталіцкай царквы з часоў апосталаў узнік пазней (Cameron, *Waldenses*, 46–47).

мі, а толькі за словамі бласлаўленняў, якія сыходзяць з іх вуснаў. О няшчасныя, нікчымнейшыя, чым усе людзі, яны жадаюць такімі святатацкімі вуснамі казаць паганае! Чаго вы не знайшлі таксама ў Саламона: *"Хто ўхіляе вуха сваё, каб ня слухаць закону, у таго і малітва – мярзота"* (Сал 28:9). І Гасподзь Малахіі, які прыроўнівае бласлаўленне дрэннага святара да блюзнерства, сказаў: *"Пракляну вашыя дабраславеньні"* (Малахія 2:2). І для гэтага больш чым дастаткова.

Коратка ж адказваем пра нашы даўнія вераванне ці споведзь наконт гэтага таінства, якія нам выстаўляюцца ў віну: *"Калі я быў дзіцем, дык па-дзіцячы гаварыў, па-дзіцячы мысьліў, па-дзіцячы разважаў; а як стаўся мужчынаю, дык пакінуў дзіцячае*[124]*"*. І з-за гэтай веры іншыя браты, якія набожна жывуць да наступлення Гасподняга[125], мы верым, не трапяць пад асуджэнне. Калі ж хто супрацьпаставіць: "Чаму, як вынікае, вы, яшчэ веруючы, так не спавядаеце?" Мы адказваем: "Таму што мы не можам цяпер верыць супраць сапраўднага Пісання, ні таксама – хай Вальдэнсы відавочна хацелі нам гэта ўнушаць – хочам спавядаць". *Трэба слухацца болей Бога, чым людзей*[126]. Бо нават Павел, як сам сведчыць, тым, хто хацеў аддаць яго ў рабства закону, дакладна не падпарадкоўваўся[127]: Так і вернікі не адмаўлялі з-за абразання пасля апісання пасвячэння, бачання і павароту Карнілія святым Пятром, хаця, як вядома, да гэтага ні Пётр, ні астатнія апосталы не верылі, што пройдзе час і язычнікі будуць дапушчаны да веры, нягледзячы на крайнюю плоць[128]; ці пра Стэфана, першапакутніка пасля пакутаў Гасподніх, які ў гэта таксама не верыў і быў выратаваны; і паміж братамі з-за гэтага не распалілася нязгода, бо яны казалі, праслаўляючы Госпада: *"Відаць, і язычнікам даў Бог пакаяньне ў жыцьцё"* (Дзн 11:18).

Мы палічылі карысным у агульных рысах расказаць, пакідаючы адрозненні, наконт ужо зазначанай нязгоды Вальдэнсаў і іх недапушчальных пярэчанняў, шмат да гэтага таксама вам даказваючы беспадстаўнасць [іх веры] і праз найдаражэйшых нашых Угаліна (Ugolinum) і Альгаса (Algossum) вам даслаць (ліст), у якім і звычка гэта даўняя ды дурная, і сапраўдная згода ўзвешчана, маючы вушы няхай пачуе[129]. Адкуль, найдаражэйшыя, у канцы прамовы, настойліва просім вашай разважлівасці, паколькі памятаем думкі наступныя: *"Слова Тваё – сьветач нагам маім і сьвятло сьцежцы маёй"* (Псалмы 119[130]:105) і *"наказ Госпада сьветлы, прасьвятляе вочы"* (19[131]:9) ды *"хто веруе ў Мяне, у таго, як сказана ў Пісаньні, «з чэрава пацякуць рэкі вады жывое»"* (Ін 7:38). Клапаціцеся адкрываць Хрыста ў сабе і слухачах вашых перад сіламі, і эпохамі, і міласцю, і мудрасцю, перад Богам і людзьмі. Гэта дасць вам тое, чым Адзіны ў трох асобах валодае на ўсе вякі вякоў, амінь. Наша абшчына вітае вас у Хрысце. Маліцеся за нас. *Мілата Госпада нашага Ісуса Хрыста, і любоў Бога Айца, і лучнасьць Сьвятога Духа з усімі вамі. Амінь*[132] [133].

---

[124] 1 Кар 13:11.
[125] Маецца на ўвазе "да сваёй смерці".
[126] Дзн 5:29.
[127] Паводле Гал 2:4.
[128] Паводле Дзн 10 і 11:1–18.
[129] Паводле Лк 14:35.
[130] У Вульгаце 118.
[131] У Вульгаце 18.
[132] 2 Кар 13:13.
[133] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 20–43.

I.viii Хронікі

I.viii.a Лаонская хроніка

"Універсальная ананімная Лаонская хроніка" (Chronicon universale anonymi Laudunensis) была напісаная ў першай палове XIII ст. у прэманстранцкім кляштары ў Лаоне (ля Рэймса). Ананімны аўтар, верагодна, меў англійскае паходжанне. Падзеі, якія датычацца 1169–1219 гг., апісаныя больш падрабязна і, пэўна, супадаюць з часам свядомага жыцця аўтара.

Усё яшчэ працягваўся 1173 г. ад Яго Увасаблення, быў у Ліёне гараджанін, якога звалі Вальдэс (Valdesius), які з-за празмерных прыбыткаў назапасіў вялікія грошы. У адзін з дзён нядзельных ён, калі ўбачыў натоўп, які сабраўся вакол блазна, накіраваўся да яго, і яго [блазна] словы моцна ўразілі яго [Вальдэса], і ён адвёў яго ў свой дом, і там пастараўся ўважліва яго выслухаць. Гэта была тая частка яго аповеду, у якой святы Алексій знайшоў свой дабраславенны спакой у доме свайго бацькі. Назаўтра раніцай вышэйзгаданы гараджанін паспяшаўся атрымаць параду для сваёй душы ў школе тэалогіі; і запытаўся ён у настаўніка: многія шляхі вядуць да Бога, які ж з іх больш пэўны і дасканалы? І настаўнік адказаў словамі боскімі: "калі хочаш дасканалым быць, ідзі, прадай маёмасць тваю і раздай убогім" (Мф 19:21). І сышоў ад сваёй жонкі, і даў ёй выбар, што яна хоча пакінуць сабе рухомага і нерухомага з таго, што ён меў на землях і водах, лясах і лугах, у даходных дамах, вінаградніках, а таксама млынах і хлебапякарнях. Тая, відавочна моцна засмучаная, што гэта трэба рабіць, абрала з нерухомага. Гэта ж дзейсна і для рухомага: калі што-небудзь ад каго-небудзь несправядліва займеў, вярнуў. Вялікую частку грошай заплаціў за дзвюх сваіх маленькіх дачок, якіх, у абыход іх маці, аддаў у кляштар Фантаўро; большую ж частку маёмасці патраціў на карысць бедных. Бо па ўсёй Галіі і Германіі лютаваў тады найстрашнейшы голад[134]. Згаданы ж гараджанін Вальдэс (Valdesius) тры разы на тыдзень ад Пяцідзясятніцы [25 мая] да свята паланення Св. Пятра [1 жніўня] раздаваў усім, хто да яго прыходзіў, хлеб і мясныя стравы. У дзень Успення Дзевы Марыі [15 жніўня], калі ўсе яго грошы па частачках былі раздадзены сярод бедных, ён усклікнуў, кажучы: "Ніхто не можа служыць двум гаспадарам: Богу і мамоне!" (Мф 6:24). Тады збегліся гараджане і вырашылі, што ён звар'яцеў; і ўзышоў ён на высокае месца, і сказаў: "О грамадзяне і сябры мае! На самой справе я не хворы, як вы думаеце, гэта помста мне ад ворагаў маіх, якія хацелі прымусіць мяне служыць ім, і каб я больш цаніў грошы, чым Бога, і больш служыў стварэнням, чым Творцу. Я ведаю, што многія асудзяць мяне, быццам бы я ўсё гэта зрабіў на публіку; але зрабіў я гэта для сябе і для вас, хто пераследуе мяне: для сябе, бо калі ў мяне ўбачаць найдалей грошы ў маёмасці, скажыце мне, што я вар'ят; але і для вас часткова зрабіў я гэта, каб навучыць вас ускладаць надзеі на Бога, а не спадзявацца на багацце". На наступны дзень, выйшаўшы з царквы, ён звярнуўся да нейкага грамадзяніна са свайго былога атачэння з просьбай падаць яму на ежу ў імя Божае. Той адвёў яго ў свой дом і сказаў: "Пакуль я жывы, у цябе будзе ўсё неабходнае". Калі гэты выпадак дай-

[134] Пётр Білер прыводзіць сведчанні іншых даследчыкаў, што голад меў месца насамрэч на два гады пазней, у 1175–1177 гг., хутчэй за ўсё, у 1176-м. Biller, "Helping the Poor and Healing the Sick," 423–424.

шоў да ведама яго жонкі, яна была не проста крыху засмучана, але як быццам бы звар'яцела і пабегла да архібіскупа горада; і скардзілася яму, што, як вядома, муж яе міласціну ад усіх, акрамя яе, прымае, і ўсё гэта яна расказала ў прысутнасці Яго Міласці ў слязах. Тады загадам Яго Міласці яго прывялі як госця ў прысутнасці Яго Міласці. Жанчына працягнула свайму мужу хлеб і сказала: "Ці не будзе лепш, о чалавек, калі я праз міласціну сваю выкуплю свае грахі, а не чужынцы?" І з таго часу загадам архібіскупа яму не дазвалялася ва ўсім горадзе прымаць ежу ад кагонебудзь, акрамя жонкі...

1177 г.

Вальдэс, ліёнскі гараджанін, пра якога мы казалі раней, даў зарок Богу, які на нябёсах, што на працягу ўсяго свайго жыцця не будзе валодаць ні золатам, ні срэбрам, не будзе клапаціцца пра заўтрашні дзень, і ў яго ўчынкаў пачалі з'яўляцца прыхільнікі, якія прытрымліваліся яго прыкладу, усю сваю маёмасць раздалі бедным і сталі настаўнікамі добраахвотнай беднасці. І пачалі яны паступова, як публічна, так і прыватна, настаўляць і спавядаць свае грахі і чужыя.

1179 г.

Латэранскі сабор быў сабраны Папам Аляксандрам, гэтага імені Трэцім ... Гэты сабор асудзіў ерасі і ўсіх спрыяльнікаў і абаронцаў ерэтыкоў. Вальдэс быў высока ацэнены Папам, быў ухвалены зарок добраахвотнай беднасці, а таксама забаронена было яму або іншым паплечнікам прапаведаваць, пакуль ім не дазволяць святары. Але гэтага прадпісання трымаліся нядоўгі час; і потым пачалося непадпарадкаванне, многія паддаліся спакусе і загубілі сябе [135].

I.viii.b Урспергская хроніка

"Універсальная Урспергская хроніка Бурхарда і Конрада" (Burchardi et Cuonradi Urspergensium Chronicon) была напісана ў 1226–1229 гг. у прэманстранцкім кляштары ва Урсперзе (ля Аўгсбурга) манахам Бурхардам, які быў у Рыме ў 1198 і 1210–1211 гг., а затым працягнута Конрадам з Ліхтэнаў. Апісаныя ва ўрыўку падзеі адбываюцца ў 1211 г.

Тады ў Царкве ўзніклі два манаскія ордэны, маладосць якіх аднавілася, як Арол, і якія былі ўхвалены Апостальскім Прастолам – а менавіта браты-мінарыты і прапаведнікі. Магчыма, яны былі зацверджаныя з той прычыны, што дзве секты, якія ўсё яшчэ існуюць, узніклі калісьці ў Італіі, адна з якіх называе сябе Умільяты, а другія бедныя з Ліёна, якіх Папа Луцый раней лічыў за ерэтыкоў, таму што сярод іх былі выяўлены прымхлівыя вераванні і абрады. Больш за тое, у некаторых таемных пропаведзях, якія яны звычайна маюць у сакрэтных месцах, яны зняважліва гавораць аб Царкве Божай і аб святарстве. Я бачыў у той час некаторых з іх, якія былі названы беднымі з Ліёна, перад Апостальскім Прастолам з нейкім іх лідарам, я мяркую – Бернардам: і яны імкнуліся, каб іх секта была ўхвалена і прывілеявана Апостальскім Прастолам. Яны распаўсюдзіліся па гарадах і вёсках, гаворачы, несумненна, што яны жывуць апостальскім жыццём, не прагнуць валодаць ніякай маёмасцю ці якім-небудзь пэўным месцам жыхарства. Уладар Папа, аднак, не ўхваліў некаторыя прымхлівыя моманты ў іх ладзе жыцця – а менавіта, што яны абразалі верхнюю частку іх абутку і хадзілі тыпу босымі. Больш за тое, хоць яны насілі

[135] "Ex Chronico universali anonymi Laudunensis," 447–449.

нешта накшталт клабука, быццам бы яны належалі да якога-небудзь манаскага ордэна, яны не падстрыгалі свае валасы, акрамя як у стылі міран[136]. І таксама адкрыўся адзін скандальны момант датычна іх – што мужчыны і жанчыны адпраўляліся ў падарожжа разам, і звычайна жылі ў адным доме і [як было сказана] часам ляжалі ў адным ложку. Аднак яны сцвярджалі, што ўсе гэтыя рэчы сыходзяць ад апосталаў. З гэтай прычыны Уладар Папа замест іх ухваліў іншых, якія ўзняліся на іх месца і называлі сябе беднымі меншымі, што абверглі вышэйназваныя прымхлівыя і скандальныя палажэнні, але хадзілі сапраўды босыя і зімой і летам і не прымалі нічога, ні грошай, ні чаго-небудзь яшчэ, толькі ежу, калі не здаралася так, што хто-небудзь мог бы па сваім жаданні прапанаваць ім якую-небудзь неабходную адзежу, але яны нікога ні пра што не прасілі. Яны, аднак, пасля абмеркавання таго, што часам гаварыць зашмат пра змірэнне становіцца выхваляннем, і што імя беднасці, якое лжыва прымалася вельмі многімі, было ганарлівым у вачах Бога, абралі за лепшае называцца меншымі братамі, чым беднымі меншымі, і ва ўсім падпарадкоўвацца Апостальскаму Прастолу[137].

I.viii.c Хроніка манаха Альберыка з Труа-Фантэн

Гэтая хроніка (Chronica Albrici Monachi Trium Fontium)была складзеная Альберыкам (у франкамоўнай традыцыі – Обры), цыстэрцыянцкім манахам з абацтва Труа-Фантэн у Шампані (Францыя) не пазней за 1252 г. і апісвае падзеі ад стварэння свету да 1241 года. У большасці сваёй з'яўляецца кампілятыўным творам з аўтарскімі дадаткамі розных цудаў і легендаў.

У ёй змешчаны аповед пра дзейнасць Конрада Марбургскага, якая была накіраваная не супраць вальдэнсаў, а супраць катараў. З іншага боку, прысутнасць ерэтыкоў, па апісанні падобных да вальдэнсаў (мелі кнігі, перакладзеныя на нямецкую мову, і не верылі ў карыснасць царкоўнага ўмяшальніцтва для душаў ужо памерлых), была заўважана ў гэты перыяд у Трыры[138].

1233 год

І пад Кёльнам была нейкая ерэтычная сінагога[139], дзе пакланяліся выяве Люцыфера, але калі каталіцкі святар прыйшоў туды і дастаў з кішэні скрыначку з Целам Хрыстовым – пагібельная выява звалілася.

Таксама адна дружбачка Люцыфера, асуджаная на спаленне, была схаваная дэманамі і [на вогнішча] не трапіла. І такім чынам шмат што было сказана і зроблена, і многія знатныя былі абвінавачаныя і многія, як кажуць, несправядліва зняслаўленыя; і з гэтай прычыны быў скліканы ў Майнцы сабор па пытаннях веры ў прысутнасці караля, каралеўскіх архібіскупаў і біскупаў, і прынцаў. На трэці дзень сабора быў забіты магістр Конрад Марбургскі, у дзень Адбона і Сенена[140], і з ім два мінарыты. З-за гэтага было праведзена падрабязнае даследаванне наконт гэтай пагібельнай секты люцыферыянаў і вышэйназваных, архібіскуп майнцкі і

---

[136] Маецца на ўвазе – не насілі танзуры.

[137] "Burchardi et Cuonradi Urspergensium Chronicon," 376.

[138] Modestin, "Western Germany Including Strasbourg," 187.

[139] Слова "сінагога" як месца збору ерэтыкоў і д'яблапаклоннікаў запазычана з Бібліі, у Вульгаце – Апак 2:9 і 3:9.

[140] 30 ліпеня.

брат Бернард з ордэна прапаведнікаў, які калісьці атрымаў пакаянне ад Уладара Папы, напісалі Уладару Папу такія словы:

Магістр Конрад, узброены стараннем у веры супраць хітрых бедных з Ліёна, настолькі імкнуўся выявіць калісьці таемную ерась маніхейскіх дачок, што калі не было такіх [ерэтыкоў], то браліся сведкі, якія павінны былі прызнаць, што ведалі ці прымалі ўдзел у нейкім іх злачынстве, і іх выказванні проста браліся на веру, такім чынам, каб абвінавачаны атрымаў магчымасць выбару: або прызнаўся па сваёй волі і застаўся жыць, або заявіць аб сваёй нявіннасці, за што павінен быў быць спалены. І вось несапраўдныя сведкі аб ерэтыках, якіх, як мы думаем, вораг прывёў подкупам: нейкая беззямельная жанчына Алейдзіс, узростам 20 гадоў, па паходжанні з Бінгена, прыдумала, што ёсць ерэтычка з той секты, да якой належаў яе муж, спалены пад Кронеборхам, і хацела, каб яе спалілі, паказваючы знакамі, што калі Царква вырашыць яе словам паверыць, то яна выкрые сакрэтных ерэтыкоў і іх прыхільнікаў. Тады яна была пасланая магістрам Конрадам, які ёй цалкам паверыў, спачатку ў вёску Клавельт, з якой паходзіла, і вымусіла спаліць сваіх сваякоў, знаёмых і суседзяў, што імкнуліся пакінуць яе без спадчыны, падгаварыўшы таксама нейкага Амфрыда, якога мы загадалі закаваць у кайданы. Ён прызнаўся, што многіх нявінных сваімі сведчаннямі давёў каго да вогнішча, каго да катаванняў з дапамогай прысудаў магістра Конрада. І такім чынам абвінавачанні паступова пачалі дасягаць ад сялян да паважаных гараджанаў і іх жонак, а ў рэшце рэшт да рыцараў і іх жонак, а затым і да кастэлянаў і знаці, і да графаў блізкіх і далёкіх. І магістр, якое б высокае становішча не займала асоба, не дазволіў законна абараняцца, а таксама спавядацца свайму святару, але абвінавачаны вымушаны быў выспаведацца, што з'яўляецца ерэтыком, і што таемна дае пацалункі міру рапухам, катам і бледнаму чалавеку[141]. Такім чынам некаторыя асуджаныя каталікі выбралі, каб іх спалілі невінаватымі і такім чынам выратавацца, чым зманіць пра такое найбрыдзейшае злачынства, якое яны не здзяйснялі, і такім чынам атрымаць прабачэнне. Некаторым сам магістр абяцаў пакутніцтва. Іншыя, слабыя, хутчэй выбіралі падмануць, чым быць спаленымі, аднак тады былі вымушаныя назваць сваіх саўдзельнікаў і адказвалі: "Не ведаю, каго абвінаваціць; назавіце мне імёны, пра каго падазрэнні маеце". Такім чынам было прапанавана імя графа Сайна, графа Арнсберга і графіні Лаона[142], то казалі, хочучы выратавацца: "Гэтыя каралі такія ж, як і я, і калі яны былі ў той секце, то і я быў". І абвінавачвалі брат брата, жонка мужа, гаспадар слугу свайго і слуга гаспадара. Іншыя давалі хабары клірыкам, каб тыя навучылі іх, якім спосабам гэтага пазбегнуць, і надоўга запанавала нечуваная блытаніна. Спачатку на магістра Конрада звярнуў увагу толькі адзін я, архібіскуп, пасля два архібіскупы кёльнскі і трырскі, каб ён выконваў свае абавязкі больш памяркоўна і разборліва ў гэтым пытанні. Але ён не супакоіўся, а наадварот насуперак нашаму папярэджанню прапаведаваў крыж у Майнцы. Пабачыўшы гэта, адзін з іх забіў яго пад Марбургам. У рэшце рэшт пад Франкфуртам сабраліся 25 архібіскупаў і біскупаў, і шматлікія імперскія прынцы, і на чацвёртую нядзелю Вялікага Посту[143] мы выпрабавалі графа Сайнскага і іншых, наконт якіх былі пытанні, і вярнулі ім іх гонар і ўладанні. На вінаватых у парушэнні клятвы было накладзена сямімесячнае

---

[141] Магчыма, алюзія на Вершніка Апакаліпсіса, які ездзіў на бледным кані, – Смерць.

[142] Loon, у франкамоўнай традыцыі Looz.

[143] 2 красавіка 1234 года.

пакаранне; тыя, хто абвінавачвалі нявінных, былі адасланыя да ног Папы; хто ж забіў магістра Конрада, былі адлучаныя; наконт маладых сектантаў, якія разам з іншымі прыгавораныя да спалення, то яны былі пераправеранныя, ці яны памыляюцца; наконт памерлых нявіннымі запытана парады Папы.

Што на гэта адпісаў Уладар Папа, нам невядома, акрамя таго, што моцна пакараў таго, хто надзяліў таго Конрада такімі вялікімі паўнамоцтвамі, што прывяло да такой блытаніны. Акрамя таго, у Германіі нядаўна адбыліся некаторыя падзеі, па якіх можна прапанаваць меркаванне, што той Конрад быў асуджаны[144].

I.viii.d Хроніка настаўніка Гіёма з Пюіларана

Гілельм з Подзіа-Лаўрэнціі (у франкамоўнай традыцыі – Гіём Пюіларанскі) – французскі храніст, клірык, непасрэдны сведка многіх падзей Альбігойскага крыжовага паходу, быў натарыусам пры тулузскім біскупе, супрацоўнічаў з інквізіцыяй[145]. Не пазней за 1275 г. скончыў "Гісторыю дзеяў Альбігойцаў" (Historia Albigensium), таксама вядомую як "Хроніка настаўніка Гіёма з Пюіларана" (Chronica Magistri Guillelmi de Podio Laurentii).

Калі сярод тых, чые справы датычацца прыкладна стогадовай даўніны, паміж нашымі морамі ў Еўропе[146], пра што вельмі важна памятаць, што, пачынаючы справу абароны каталіцкай веры і вынішчэння ерэтычнай заганнасці ў правінцыі Нарбона, а таксама ў дыяцэзіях Альбі, Руэрг, Каор, Ажэн і на некаторых землях князёў Тулузскіх уздоўж Роны, мы можам выявіць на працягу прыкладна 70-і гадоў тых, пра якіх па расказах захаваліся ў пазнейшых запісах звесткі, што пра іх або чулі, або бачылі, бо па справах будуць распазнаныя як вышэйшыя, сярэднія і ніжэйшыя, і на Божым судзе, які з-за людскіх грахоў вырашыць біць бізуном гэтыя няшчасныя землі. І належыць мне сказаць наконт грахоў людскіх, не выключаючы, аднак, адмаўлення прэлатамі ці кіраўнікамі, якія павінны быць скаламі для астатніх, пасланыя не столькі для таго, каб працай сваёй зямлю апрацоўваць добрым семенем, колькі каб ямы выраўняць выпусканнем чалавечай крыві, прыбіраючы пустазелле Ворага.

Але паколькі спяць тыя, хто павінен быць пільным, то былі дасланыя патаемна даўнім ворагам у тыя няшчасныя землі дзеці людской пагібелі, "з выгляду богабаязныя, а да сілы Божай варожыя" (2 Цім 3:5), чыё казанне распаўсюджваецца як пухліна, многіх заражае і спакушае. Але паколькі ніхто не ўзводзіць муру, каб абараняць веру супраць іх, то гэтыя ерэтыкі дайшлі да такой ступені зла, што, пачаўшы ад палёў і вінаграднікаў, займелі свае прытулкі ў гарадах і вёсках, запатрабаваўшы ў сваіх вернікаў велізарныя дамы, у якіх прапаведавалі.

І некаторыя з іх былі арыянамі, некаторыя маніхеямі, а некаторыя ж – Вальдэнсамі або Ліёнцамі. Яны, хоць паміж сабой і не мелі згоды, аднак усе разам аб'ядналіся супраць каталіцкай веры, што пагібельна для [іх] душаў.

---

[144] "Chronica Alberici monachi Trium Fontium," 931–932.

[145] Yves Dossat, "La 'Chronique' de Guillaume de Puylaurens," *Actes de la Société des historiens médiévistes de l'enseignement supérieur public* 8, no. 1 (1977): pp. 259–265, https://doi.org/10.3406/shmes.1977.1303.

[146] Магчыма, маюцца на ўвазе тэрыторыі паміж Міжземным і Паўночным морамі або паміж Міжземным морам і Атлантычным акіянам.

І некаторыя з тых Вальдэнсаў супраць іншых вельмі вынаходліва дыскутавалі, і з-за гэтай сваёй нянавісці былі дапушчаныя невукамі-святарамі...[147]

... Быў і іншы дыспут у Пам'е, на якім сястра Бернара-Ражэра, графа Фуа, адкрыта стала на бок ерэтыкоў. Наконт яе сказаў брат Стэфан з Мізэрыкордыі: "Ідзіце, спадарыня, прадзіце вашы ніткі, на гэтым зборы нікога не цікавіць вашае меркаванне". І быў той дыспут супраць Вальдэнсаў, пад кіраўніцтвам Арно з Кампаны, у той час свецкага клірыка, абранага бакамі ў якасці суддзі. Тыя з іх, хто саступілі яго прысуду, звярнуліся ў сваім сэрцы і далучыліся да Апостальскага Прастола, і прынялі пакаянне, атрымалі для сябе дазвол жыць згодна са статутам, і сярод іх прыёрам быў Дуранд з Оскі, які напісаў супраць ерэтыкоў некалькі прац. І некаторыя з іх у адной з частак Каталоніі шмат гадоў жылі, але пасля паступова адышлі. Відавочна, што былі і іншыя ерэтыкі, якія праявілі сваю варожасць на гэтым судзе. Я гэта кажу, бо чуў са слоў Уладара Біскупа Фулька, што Понцій Адэларый з Радэліі, праніклівы ваяр, так казаў гэтаму біскупу: "Мы ніяк не можам верыць, што Рым мае столькі дзейсных аргументаў супраць гэтых людзей. Наўрад ці, – запытаўся біскуп, – вы ведаеце, што яны не маюць пярэчанняў супраць нашых сіл? – Добра ведаем, – адказаў той. – Чаму ж тады, – запытаў біскуп, – вы іх з зямлі не зганяеце і не адпраўляеце ў выгнанне? На гэта сказаў: мы не можам, бо мы выраслі разам з імі і маем кроўных сваякоў сярод іх, і бачым, што яны жывуць годным жыццём". І там з'яўленне аднаго-адзінюткага пышнага сцябла падману адварочвала прэч ад ісціны нядбалых людзей[148].



[147] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 173–174.
[148] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 126–127.

II. Палемічныя творы

II.i Гідэфрыд з Асэра. Наконт Апакалінсіса (Super Apocalypsim)

Гідэфрыд (у франкамоўнай традыцыі Жафруа) з Асэра (Auxerre), цыстэрцыянец, абат Клерво (пасля смерці святога Бернарда напісаў яго біяграфію), затым Фасановы і напрыканцы Аткомба. Прысутнічаў разам з двума іншымі цыстэрцыянцамі (Генрыкам з Марсі, кардыналам-біскупам Альбана, і архібіскупам ліёнскім Гвічардам) на саборы ў Ліёне ў 1180 г., на якім абмяркоўвалася справа вальдэнсаў і дзе была заслухана Споведзь веры Вальдэса.

Да Чаму ж цябе, найсвятлейшая гальская каралева, чаму ж ізноў абвяргаюць і не паважаюць прывілеі, нададзеныя ў старажытнасці: "Галія не мае монстраў!" Ліён, першы прастол гальскі, стварыў новых апосталаў, і не пасаромеўся гэтых апосталаў прыняць. Гэтыя ліскі ідуць наперад, каб змарнаваць вінаградник Гасподні[1], асобы, вартыя жалю і абсалютна ганебныя, яны ўзурпавалі справу пропаведзі, цалкам ці амаль непісьменныя, а дакладней сказаць, бездухоўныя, як тут: "Жывёлы, Духу не маеце" (Яўд 1:19), абыходзяць гарады і вёскі, спасылаючыся на беднасць і апраўдваючыся пропаведдзю, бессаромна харчуюцца чужым хлебам, не працуючы сваімі рукамі. Словы складаныя і дакладна адабраныя прамаўляюць сваімі языкамі, прыпадабняючыся да новых папугаяў[2], не зважаючы на тое, пра што яны кажуць, што сцвярджаюць. Пасля выпускаюць сваю афарбаваную чамярыцу, а дакладней, выдуманыя словы, ганьбу і адмаўленне клірыкаў. Адрокся такім чынам на Ліёнскім саборы ад секты першы яе стваральнік, названы па месцы свайго нараджэння Wandesius, у прысутнасці і пад кіраўніцтвам паважанага айца нашага, уладара біскупа альбанскага, а таксама легата Папскага Прастола Генрыка, і светлай памяці Віскарда, архібіскупа той царквы, які нам у тым ціхмяна дапамагаў, сэрцам вялікую колькасць паважаных асоб, у большасці сваёй святароў, відавочнымі доказамі ў бязбожнай саманадзейнасці [Вальдэс] быў перакананы [вярнуцца да каталіцтва]. Але, вярнуўшыся да [сваіх] ванітаў[3], ён [Вальдэс] не перастаў збіраць і рассылаць вучняў, сярод якіх таксама былі нягодныя жанчынкі, якія ку-

---

[1] Алюзія на Песн 2:15.

[2] У гэтым поўным негатыўных канатацый тэксце асабліва цікавая адсылка да "новых папугаяў". Новых – таму што ў той час усё новае выклікала насцярожанасць. Папугаі ніколі не былі звыклым параўнаннем для ерэтыкоў. Тут Гідэфрыд спрабуе паказаць, што вальдэнскія прапаведнікі паўтараюць дакладна завучаныя евангельскія словы без разумення іх значэння. Падрабязней гл. Francesca Tasca, "Le predicatrici valdesi medievali: "mundus reversus et perversus" o "mundus novus"? Sulla testimonianza custodita nel "Super Apocalypsim" di Goffredo d'Auxerre," *Museikon* 6 (2022): pp. 9–22.

[3] Алюзія на 2 Пят 2:22.

паюцца ў грахах[4], якія, пранікаючы ў дамы іншых, цікаўныя і гаваркія, дзёрзкія, юрлівыя, бессаромныя, як дзве з іх, якія былі схопленыя пяць гадоў таму ў войску, што ахоўвала ад злачынцаў паважанага біскупа горада Арвеніка[5], праходзячы ля яго, напалі з найцяжэйшымі, наколькі змаглі, абразамі, папракаючы, што, калі ён некалі знайшоў іх падчас пропаведзі ў сваёй дыяцэзіі, і што пасля таго, як там жа старанна выявіў, угаворамі і пагрозамі пераканаў адрачыся ад гэтай секты. З-за гэтага яны абрынуліся на яго з ганьбамі, бессаромна блюзнерачы, і публічна аб'явілі: "Пасля штодзённай пропаведзі, распачынаючы вялікую пагулянку, амаль кожную ноч мы выбіралі сабе новых палюбоўнікаў, без аніякай пакорлівасці, без абмежаванняў, без працы пражывалі мы моманты жыцця без аніякай небяспекі[6], якой зараз мы штодзённа падвяргаемся ў якасці служанак гаспадароў, і розныя цяжкія няшчасці церпім". Што на гэта скажам, браты? Што гэта Іезавель[7] пасля тысячнага года ўваскрэсла, як маладзенькая дзяўчына, і "на вуліцах і на завулках"[8] нападае ўбогая блудніца-прапаведніца? Бо належыць біскупам і архібіскупам адлучыць яе, нарэшце, ад Рымскай Царквы, і больш пільна ставіцца да допускаў і ўважліва слухаць пра тых, каму «вада крадзеная салодкая і ўтоены хлеб смачны» (Сал 9:17). Вядома, што звычайную жанчыну, і балбатлівую, і асцярожную ў словах, прасцей выкрыць, чым мужчыну.

Б) Чаму ж тады здзіўляемся, браты, што падманная і лжывая дактрына прымае вобраз цноты набожнасці, адмаўляецца ад цноты змірэння[9]? Чаму б ерэтыкі не прыпадабняліся і што б ні хавалі, няма сапраўднай набожнасці ў іх, як і няма дактрыны. Адным словам, наконт гэтых сучасных лісак, якія не марудзяць, каб змарнаваць вінаграднік Гасподні і яго нявесты[10], укараніўшыся ў кожнай заганнасці, і змяінае казанне іх, як пухліна[11], прывяло да празмернай бязбожнасці, некалькі гадоў таму ў раёне горада Тулузы, у горадзе, які называецца Валліс[12], мы дапытвалі двух схопленых з дапамогай арміі, якая рупілася аб веры, ерэсіярхаў, дастаўленых паважанаму Айцу Нашаму, Уладару Генрыку, біскупу Альбана, які быў тады дасланы ў Аквітанію Апостальскім Прастолам [далей высвятляецца, што гэта катары][13].

II.ii Бернард з Фанкода. Трактат супраць Вальдэнсаў

Бернард з 1172 г. быў абатам прэманстранцкага кляштара Фанкод у ваколіцах Безье і актыўна ўдзельнічаў у антыерэтычных дэбатах каля 1190 г. "Трак-

---

[4] Алюзія на 2 Цім 3:6.

[5] Клермон-Феран.

[6] Ёрг Фёхтэр лічыць, што з гэтага, безумоўна, тэндэнцыйнага фрагмента вынікае, што вальдэнкі адрозніваліся вандроўным ладам жыцця, жылі на міласціну і прапаведавалі. Feuchter, "Waldenserinnen im Mittelalter," 51.

[7] Імя "Іезавель" у Сярэднявеччы трактавалася як "выплёскванне крыві і экскрэментаў" (Kienzle, "Holiness and Obedience," 272), а пакольк самі ерэтыкі асацыяваліся з тымі, хто распаўсюджвае праз пропаведзі бруд і заразу, то магло адсылаць да жанчын – прапаведніц ерасей.

[8] Алюзія на Песн 3:2.

[9] Тыповы палемічны прыём, падрабязней гл. Sackville, *Heresy*, 38.

[10] Алюзія на Песн 2:15.

[11] Алюзія на 2 Цім 2:17

[12] Пюі-он-Вэлэ (Puy-en-Velay), сучасная Францыя.

[13] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 45–47.

тат супраць секты Вальдэнсаў" (Adversus Waldensium sectam liber) быў напісаны ў 1190–1193 гг. Тут прыведзены вытрымкі з пралога з апісаннем дыспутаў, а таксама загалоўкі, якія ўтрымліваюць асноўныя палажэнні вучэння вальдэнсаў.

Пралог

I. У часы Уладара Луцыя, слаўнай памяці правадыра Святой Рымскай Царквы, раптоўна паднялі галаву новыя ерэтыкі, якія, выпадкова абраўшы сабе імя з прагнозам на будучыню, былі названыя Вальдэнсамі (Valdenses), імя, якое, пэўна, паходзіць ад "глухі лес", паколькі яны ўсё глыбей праваліліся ў прорву і глухую цемру памылак. Хоць яны і былі асуджаныя вышэйназваным найвышэйшым пантыфікам, яны ванітавалі атрутай свайго нявер'я далёка і шырока на ўсіх, хто легкадумна наблізіўся.

II. З гэтай прычыны Уладар Бернард, архібіскуп Нарбоны, вядомы сваёй набожнасцю і чысцінёй перад Богам, палкі паслядоўнік Боскага закона, паўстаў цвёрдай сцяной супраць іх, і яшчэ сабраў шмат клірыкаў і міран, манахаў і свецкіх святароў, і аб'яднаў іх для суда. Што яшчэ сказаць? Пасля таго, як усё было прааналізавана з вялікай стараннасцю, яны былі адлучаныя.

III. Нягледзячы на гэта, яны і пасля гэтага працягвалі сеяць насенне сваёй грахоўнасці прыватна і публічна. І таму ізноў, хоць гэта было і празмерна, яны былі запрошаныя на дыспут з пэўнымі асобамі, клірыкамі і міранамі. Таму, каб спрэчка не зацягнулася надоўга, адзін святар, Раймунд з Давентра, набожны і богабаязны чалавек, шляхетны ад нараджэння, шляхетны ў паводзінах, быў абраны абодвумі бакамі ў якасці суддзі.

IV. Таму калі дзень, прызначаны для дэбатаў, надышоў, і абедзве партыі сабраліся, разам з многімі іншымі клірыкамі і міранамі, яны [Вальдэнсы] былі абвінавачаныя сапраўднымі католікамі па некаторых пунктах, па якіх яны памыляліся. І яны адказвалі на кожны выклік, кожны аргумент доўга абмяркоўваўся, спачатку адным бокам, потым другім, і аўтарытэтныя доказы[14] былі прыведзены кожнай партыяй. Калі былі выслуханы сцверджанні абодвух бакоў, вышэйназваны суддзя пісьмова прадставіў канчатковы прысуд і назваў Вальдэнсаў ерэтыкамі па пунктах, па якіх яны былі асуджаныя.

V. У прыведзеным невялікім трактаце мы апісваем тэксты і аргументы, якімі яны абаранялі сваю пазіцыю, і наш, каталіцкі, адказ ім, з тэкстамі з Пісання, якімі абараняецца каталіцкая вера; і мы дададзім некалькі пасажаў супраць іншых ерасяў. Усё гэта мы зрабілі, каб праінструктаваць і падбадзёрыць некаторых клірыкаў, якія пакутуюць, бо працуюць ва ўмовах недасведчанасці і ці ад недахопу кніг не супраціўляючыся ворагам ісціны, чым уводзяць вернікаў, якімі кіруюць, у абурэнне або спакусу. Бо іх у каталіцкай веры не ўмацоўваюць і пладамі Святога Пісання не насычаюць. З-за гэтага яны як быццам бы посцяцца [духоўна] на дарозе, якая вядзе праз гэта жыццё, і застаюцца пакінутымі сіламі духоўнымі, і не маюць моцы на радзіму, акурат у рай, вярнуцца. Менавіта гэтым прадвызначаныя асноўныя беды, крыважэрныя ваўкі – маецца на ўвазе дэманы, ерэтыкі і тыраны – не выгнаныя з хлява авечак Хрыстовых ні галасамі пропаведзяў, ні жазлом дысцыпліны ці суровасцю.

---

[14] Маецца на ўвазе – спасылкі на Свяшчэннае Пісанне і / або Айцоў Царквы.

VI. Таму няхай яны прымуць, я думаю, невялічкі падарунак ад нас, калі заўгодна, гэтую невялічкую працу, і завучваюць на памяць доказы Святога Айца, каб па міласці Божай яны мелі эфектыўную зброю супраць кіраўнікоў цемры, супраць падманшчыкаў, супраць стваральнікаў вычварных дагматаў, гэта значыць супраць дэманаў-ерэтыкоў; да якой ступені міласць Божая ідзе наперадзе іх, і ім належыць быць моцнымі, каб здабыць перамогу, і каб быць вартымі прыняць вянок славы, які ніколі не звяне, ад найвышэйшага пастара[15] за належнае кіраванне і навучанне сваіх падначаленых.

Глава 1: Супраць таго, што яны кажуць, што не трэба падпарадкавацца найвышэйшаму пантыфіку і іншым прэлатам...

Глава 2: Трактат пра статус прэлатаў: якое падпарадкаванне і павага ім належаць...

Глава 3: Супраць тых, хто прыніжае тых, хто клапоціцца пра душы...

Глава 4: Супраць таго, што ўсе, нават міране, могуць прапаведаваць: Што яны могуць сказаць у сваю абарону і што мы можам сказаць супраць іх...

Глава 5: Што ім не дазваляецца даносіць слова Божае вернікам...

Да таго ж, тыя, хто мае жонку, або цягне цяжар зямных клопатаў, не падыходзяць да распаўсюджвання слова Божага...

Глава 6: Адказ на аргумент, у якім яны кажуць, як Апостал: "Мы павінны падпарадкоўвацца больш Богу, чым людзям"; таксама некаторыя іншыя прычыны...

Глава 7: У гэтай апісаныя асобы, каго яны ўладна спакусілі, і каго не...

Спакушаюць спачатку жанчын, а праз іх – мужчын...

Глава 8: Супраць таго, што яны кажуць, што жанчыны могуць прапаведаваць...

Глава 9: Супраць таго, што яны кажуць, што міласціна, пасты, правядзенне імшы і іншыя малітвы жывых не прыносяць карысці верным, якія ўжо памерлі...

Глава 10: Супраць тых, хто абвяргае, што ёсць агонь чыстца, і хто кажа, што дух, які выйшаў з цела, ідзе напрамкі на неба ці ў пекла...

Глава 11: Супраць тых асоб, якія кажуць, што перад Страшным Судом тыя самыя душы памерлых ідуць ні на неба, ні ў пекла, але застаюцца ў іншым прыстанку...

Глава 12: Супраць тых, хто адмаўляецца маліцца ў царкве, і хто аб'яўляе, што царква не вартая свайго імені. Тут даказваецца, што царква названая менавіта так, што трэба маліцца ўнутры яе, што ёй належыць найвялікшае пакланенне. Тут таксама адказ менавіта на той аргумент тых ерэтыкоў, у якім, абапіраючыся на словы Блажэннага Стэфана, што "Найвышэйшы жыве не ў тым доме, што зроблены рукамі", а значыць не ў царкве[16].

II.iii Ліст біскупа П'ячэнцы Ардыцыя пра бедных з Ліёна

Зыходзячы з подпісу, ліст складзены біскупам П'ячэнцы Ардыцыем (Ardicius; у італьянскай традыцыі Ардыццоне) з ордэна канонікаў рэгулярных Святога Аўгусціна, які займаў пасаду з 1 ліпеня 1192 па 3 чэрвеня 1199 г. Адпаведна, ліст быў напісаны ў гэты прамежак часу.

---

[15] Алюзія на 1 Пятра 5:4.

[16] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 64–90; Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 210–213.

Непахісным калонам, якія Саламон паклапаціўся паставіць у сваім храме, міласцю Божай кіраўнікам Святой маці Царквы, ад Ардыцыя, той жа міласцю сціплага служкі царквы П'ячэнцы, каб вы аказаліся вартымі нябеснай узнагароды за вашу штодзённую працу. Калі мы імкнёмся быць пільнымі, згодна з нашым пастарскім абавязкам клапаціцца аб Божай Царкве і выратаванні душаў, то нам належыць загадзя паклапаціцца пра падзел абавязкаў, каб мы падчас кіравання не адпачывалі і не траціліся бадзёрасці, бо дакладзена нам, што статак Гасподні быў апаганены ваўчынымі ўкусамі. Адсюль вашы абавязкі гэтай паперай, замацаванай нашай сціплай пячаткай, хочам вам паведаміць пра фанабэрыстую тупасць некаторых, якую мы раней заўважылі, і што з прызнанняў некаторых [ерэтыкоў] пра сябе і праз іх адрачэнне ад памылак мы спасціглі, як можна ацаліць памылкі, ад якіх яны адракліся. Такім чынам, перад намі былі некаторыя з секты Бедных Ліёнцаў, якія, натхнёныя нябёсамі, адрынуўшы свае памылкі, падпарадкаваліся законам Рымскай Царквы і, адрокшыся ад сваёй алеепадобнай нявернасці, пасадзілі аліўкавае дрэва царквы і, згодна з прынятымі кананічнымі пастанаўленнямі, былі вернутыя да грудзей маці Сіёну. Выкрытыя ў вышэйназваных ерэтычных падманах і праклятых памылках, былі прыгавораныя да анафемы за свае справы і ад лона Святой Царквы аддзеленыя. Гэта былі тыя, пра якіх было сказана голасам нябесным: "праходзіце мора і сушу, каб прыдбаць хоць аднаго навaверца; і калі гэта здараецца, робіце яго сынам геены, двойчы горшым за вас" (Мф 23:15). Гэта яны, згодна з Апосталам, "лісьлівасьцю ды красамоўствам ачмураюць сэрцы прастадушных" (Рым 16:18), "лісьліва віжуюцца ў дамы і ачмураюць жанчын" (2 Цім 3:5). Гэта тыя, пра каго б было ад пачатку пастаноўлена апосталамі: "Былі й лжэпрарокі ў народзе, як і ў вас будуць лжэнастаўнікі, якія ўвядуць згубныя ерасі, і адракаючыся ад Госпада, Які адкупіў іх, навядуць самі на сябе неўзабаўную пагібель" (2 Пят 2:1). Гэта тыя, хто згодна з лекарам чалавечым "адступяцца ад веры, слухаючы духаў спакусьнікаў і вучэньняў дэманскіх" (1 Цім 4:1). Гэта той звер, які ў Апакаліпсісе "выходзіў з мора" (Апак 13:1) і чыя атрута апаганіла Святую Царкву. Гэта тыя, хто знішчаюць таінства алтара, прапаведуюць, што ўсім дазволена здзяйсняць боскія таінствы, пагардліва абвяргаюць ахвяры для вернікаў праз імшы і малітвы. Лічаць, што ніхто не можа пасля гэтага жыцця ачысціцца, і, нават будучы міранамі, прымаюць у людзей споведзі і за любое злачынства пакаянне накладаюць. Квакаюць, што ніхто не зможа сваю душу давесці да выратавання, калі толькі не пераняў іх звычкі або выступіў іх утрымальнікам або сябрам, а значыць, пра іх ведаў. Мяркуюць, што шлюб павінен быць разарваны; не баяцца выганяць святых пустэльнікаў з іх келляў і іншых манахаў з іх кляштараў; папскія дэкрэты з пагардай абвяргаюць; царкоўнымі пасадамі пагарджаюць. Прававерных дактароў названай Царквы, а менавіта Амвросія, Іераніма, Аўгусціна і ўсіх іншых не прымаюць; больш за тое, калі бачаць на іх адсылкі, пярэчаць. А яшчэ – і пра вераванне немагчыма казаць, не напоўніўшыся слязьмі – яны саманадзейна заяўляюць, што не толькі іх міранам можна спакойна здзяйсняць таінства ўшанавання Цела Гасподняга, але паведамлена, што яны саманадзейна заяўляюць тое ж самае і наконт сваіх жанчын. Паколькі яны ў шаленстве супрацьстаяць Царкве і яе статутам, мы забараняем ім казаць рэчы, якія абражаюць каталіцтва. Але калі мы даведаемся, што нехта неразважліва рве палатно тунікі Хрыстовай, то, зважаючы на боскія законы і з пашанай да каталіцкай веры, не дазваляйце гнілому чальцу заставацца сярод чальцоў здаровых, але, каб Царкву задаволіць, звярніцеся [да іх] міласціва

з царкоўнай суровасцю і цвёрдай справядлівасцю, каб вы прывялі іх душы да багацця Божага і зберагліі даручаны вам просты люд ад іх благога ўплыву, каб за ўсе добрыя справы вы атрымалі ўзнагароду ад Хрыста на нябёсах. Амінь[17].

II.iv Пётр Спявак. У абарону пропаведзі міран

Пётр Спявак (Cantor) – французскі каталіцкі тэолаг, атрымаў адукацыю ў Рэймсе, затым быў канонікам у Нотр Дам дэ Пары, дзе праявіў сябе як актыўны дзеяч. Пісаў каментары да Старога і Новага Запаветаў, а таксама іншыя палемічныя працы. Тут прадстаўлены вытрымкі з яго палемічнага твора ў апраўданне мірской пропаведзі, напісанага не пазней за 1197 г.

Камяні будуць крычаць. Што і было зроблена, бо падчас укрыжавання Гасподняга апосталы маўчалі ад жаху, камяні раскалоліся, і, расчыніўшы грабніцу, Бога прызывалі і сведчылі. Такімі былі словы Ліёнцаў, калі яны адмаўлялі царкоўным прэлатам, якія іх змушалі маўчаць. Таксама і граматыкі пісьменныя, нароўні з простымі і непісьменнымі, без перашкод [маглі] спавядаць і прапаведаваць Бога. Таемнае значэнне: калі былі сляпыя ў Ізраілі, таму што маўчалі пра славу Божую, аднак народ паверыў свайму творцу, размякчыўшы сваё каменнае сэрца народнае, і стаў несці добрую вестку[18].

Але ён скардзіцца, няўжо згодна з гэтым правілам міран, напрыклад Ліёнцаў, належыць выключыць з пропаведзі дабра? Так, сапраўды, у публічных пропаведзях і святкаваннях (так і найміты, бо для іх пропаведзь стала малавартаснай, і што не прагнуць нічога, акрамя багацця, і пра гэта адкрыта вядома); не могуць прапаведаваць дабро нават аднойчы, каб не быць раскрытымі і абвінавачанымі ў распаўсюджанні пустазелля. Так атрымліваецца, што мову ў іх збіраюцца адабраць, то бок вусны закрыць. Пра тое, што прапаведаваць належыць у пэўны час і ў пэўным месцы па прадпісанні, мы атрымалі наказ з наступнага: "калі згрэшыць супроць цябе брат твой" (Мф 18:15–71; Лк 17:3), і прытым правіла (як засведчыў Аўгусцін) пашыраецца ад роўнага да роўнага, ад большага да меншага, ад меншага таксама да любога найвышэйшага. Але ці да Уладара Папы? Такім чынам кожны смяротны, вядомы курыі ці як мінімум кардыналам, павінны быць у гэтым абвінавачаны. Але не так сурова, як за ерась ці сіманію. І таму пастанаўленне, якое наконт гэтага прынялі, супрацьлеглае боскаму пастанаўленню. Але Уладар Папа не можа проста так смяротна грашыць, паколькі яго пасада робіць яго святым або ўжо знаходзіць яго святым. Такім чынам перанясенне на іншыя пасевы дазваляе каласы перацерці і зерне спажыць, а не вон выкінуць. З сярпом на чужое поле не дазволена заходзіць (Друг 23:24–25). Але любому дазволена прамаўляць словы папроку і словы ўсхвалення, але не праводзіць таінствы, не сеяць, не вязаць ці развязваць, і так далей. Бо не павінны забараняць рабіць дабро ці цуды ў маё імя, якое ёсць я сам[19].

І прага ўзбагачэння – гэта абсалютна іншае, яна стрымлівае іншых ад гэтага, а менавіта ад задавальнення ад магчымасці падбадзёрвання (exhortando) і даван-

[17] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 13–15.
[18] Buc, "Vox clamantis in deserto?," 44.
[19] Buc, "Vox clamantis in deserto?," 43–44.

ня парад (admonendo), каб патлумачыць нябачнае праз бачнае, прапаведуючы абодвум полам, навучаючы, і па добрай традыцыі, аб'ядноўваючы прынятыя таленты па двое. Такім чынам мы маем доказ, што ўсім дазволена прапаведаваць і навучаць; калі такое дазволена нават найпрасцейшым, тады чаму ж наадварот [гэта не дадзена] больш вартым, хто мае больш шырокія веды. Апостал таксама не забараняў прапаведаваць самым дрэнным прапаведнікам, калі не кажуць нічога супраць веры і добрых звычаяў. Сцвярджаў наадварот "Як бы ні прапаведавалі Хрыста, ці дзеля блізіру, а ці шчыра, я і таму радуюся і буду радавацца" (Флп 1:18). Чаму ж тады вы забараняеце Ліёнцам прапаведаваць, калі яны нічому супраць веры і праўды не вучаць? Магчыма, таму, што страшна, што калі будзе дазволена, то ўпадуць у ерась, і таму забаронена[20].

II.v Алан Лільскі. Пра каталіцкую веру

Алан Лільскі, таксама вядомы як Алан з Астравоў (Alanus ab Insulis), – выбітная асоба ў хрысціянскім свеце XII ст. Паэт, філосаф, тэолаг, настаўнік, адзін з вядучых літаратараў свайго часу, які заслужыў такія эпітэты, як "Вялікі" і "Універсальны Доктар". Ён нарадзіўся ў Лілі, верагодна, у 1128 г., вучыўся ў Шартры, выкладаў у Парыжы. Магчыма, ён уступаў у дыспуты з Папам Рымскім. Фактычна даказана, што ён бываў у Лангедоку асабіста[21], а значыць, мог быць непасрэдна знаёмым з вальдэнсамі. Стаўшы членам цыстэрцыянцкага ордэна, ён выкладаў у Манпелье. Творы яго былі напісаныя збольшага ў апошняй чвэрці XII ст., а заканчваецца яго жыццёвы шлях у 1203 г.

Яго манументальная праца "Пра каталіцкую веру супраць ерэтыкоў свайго часу" (De Fide Catholica contra haereticos sui temporis) складаецца з чатырох частак: супраць ерэтыкоў[22], супраць вальдэнсаў, супраць яўрэяў і супраць арабаў. Магчыма, некаторыя дадзеныя ён атрымаў з асабістых размоў з вальдэнсамі, але збольшага Алан браў звесткі з іншых прац. Люсі Босварт разглядае яго працу хутчэй не як палемічную, а як схаластычную[23].

Тут прадстаўлены назвы і кароткія вытрымкі з некаторых главаў з другой часткі, якія раскрываюць менавіта пазіцыю вальдэнсаў, без аргументацыі з боку каталікоў у асобе Алана.

Кніга II. Супраць Вальдэнсаў

Глава I. Тут паказана з тэкстаў і аргументамі розуму, што ніхто не павінен прапаведаваць, калі ён не пасланы вышэйстаячым прэлатам.

---

[20] Buc, "Vox clamantis in deserto?," 45–46.

[21] Biller, "Goodbye to Catharism?," 297.

[22] Традыцыйна лічыцца, што пад "ерэтыкамі" разумеліся катары, але Эмануэль Бэн у сваім апошнім даследаванні прадэманстраваў, што гэта частка (у адрозненні ад вальдэнскай і мусульманскай) магла быць хутчэй агульнапалемічнай і схаластычнай, скіраванай супраць усіх ворагаў царквы. Emmanuel Bain, "Les hérétiques du prince: Alain de Lille et les hérétiques méridionaux," in *Le «Catharisme» en questions*, vol. 55 (Fanjeaux: Centre d'études historiques de Fanjeaux, 2020), pp. 173–196.

[23] Bosworth, *Perceptions of the Origins and Causes of Heresy*, 25.

Ёсць адныя ерэтыкі, якія прэтэндуюць на праўду, між тым як яны – ваўкі ў авечых шкурах. Пра іх Госпад кажа ў Евангеллі: ... (Мф 7:15). Яны называюцца Вальдэнсы ад іх ерэсіярха, чыё імя – Вальдэс (Waldus). Ён, са сваёй асабістай падачы, а не пасланы Богам, заснаваў новую секту, без дазволу з боку прэлата, без Боскага натхнення, без ведаў, без навучання, ён самастойна ўзяў на сябе ролю прапаведніка; філосаф без думак, прарок без відзежаў, Апостал без місіі, настаўнік без куратара. Яго вучні, а лепш сказаць – падманшчыкі, спакушаюць просты народ у розных частках свету, хутчэй адварочваюць, чым зварочваюць іх да праўды. Яны прапаведуюць хутчэй, каб набіць сваё бруха, а не запоўніць розум, і, паколькі яны не хочуць працаваць сваімі рукамі, каб зарабіць сабе на ежу, яны робяць д'ябальскі выбар жыць без заняткаў, прапаведуючы няпраўду замест заробкаў ... дазваляюць жанчынам прапаведаваць. Пра гэтых ерэтыкоў было сказана Апосталам у другім пасланні да Цімафея: ... (2 Цім 3:1–7). Гэта ўсё абсалютна падыходзіць да Вальдэнсаў...[24]

Глава II. Гэтыя Вальдэнсы аб'яўляюць, што не трэба падпарадкоўвацца нікому, акрамя Бога[25].

Глава VI. Што таксама толькі тым дадзена ўлада вязаць і развязваць, хто служыць вучэнню і жыццю апостальскаму[26].

Глава VIII. Кажуць таксама згаданыя ерэтыкі, што для магчымасці асвячаць і бласлаўляць, вязаць і развязваць большае значэнне мае справа, чым царкоўнае пасвячэнне або пасада. Адкуль, паколькі самі яны не маюць аніякага пасвячэння, але саманадзейна пасягаюць на права бласлаўляць, як святары, бо робяць выгляд, што яны справядлівыя і маюць апостальскую годнасць. Кажуць таксама, што могуць асвячаць, вязаць і развязваць, бо заслугі даюць такую ўладу, а не пасада: і паколькі яны сябе называюць вікарыямі апосталаў, за заслугі павінны мець іх пасады ... але не толькі тыя, што належаць святару, але і любыя тыя, якія меў сам Хрыстос...

Глава IX. Вышэйзгаданыя ерэтыкі таксама кажуць, што няма неабходнасці чалавеку спавядаць свае грахі святару, калі побач ёсць міранін, якому можна спавядацца[27].

Глава XI. Вышэйзгаданыя ерэтыкі таксама спрабуюць даказаць, што агульнае адпушчэнне грахоў, якое даецца біскупам пры асвячэнні царквы, ці пры іншых абрадах, не дзейснае.

Глава XI. Таксама названыя ерэтыкі кажуць, што малітвы ці заступніцтвы тых, хто смяротна саграшыў, не карысныя душам мёртвых[28].

Глава XV. Любы падман – гэта смяротны грэх[29].

Глава XVIII. Ні ў якім разе нельга клясціся[30].

Глава XX. Заяўляюць таксама вышэйназваныя ерэтыкі і ворагі Царквы, што ні ў якім разе і ні па якой прычыне, ні на якой падставе, чалавек не можа быць забіты[31].

---

[24] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 217–220.
[25] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 105.
[26] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 107.
[27] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 109.
[28] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 111.
[29] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 113.
[30] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 114.
[31] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 115.

Глава XXIV. Вышэйзгаданыя ерэтыкі таксама кажуць, што яны ніякім чынам не павінны працаваць сваімі рукамі, але браць усё патрэбнае ад тых, для каго яны прапаведуюць...

Глава XXV. На гэта мы можам сказаць, што прапаведнікам можна браць неабходнае ў сваіх слухачоў. Але яны – несапраўдныя прапаведнікі, жывуць у гультайстве на дабрыні сваіх ахвяраў, якіх абдурваюць... Сам жа Павел працаваў сваімі рукамі, хоць і быў абцяжараны пропаведзямі, якія прапаведаваў...[32]

II.vi Эбрард з Бецюна. Кніга супраць ерасяў

Эбрард з Бецюна (Ebrardus Bethuniensis), фландрыец, паэт і граматык, у 1210–1212 гг. напісаў "Кнігу супраць ерасяў" (Antihaeresis liber) з 28-і главаў, дзе першыя 24 главы прысвечаныя выключна катарам, 25-я – перакладзеная тут – вальдэнсам, 26-я – яўрэям, у 27-й – даецца спіс ерасяў, запазычаны з Ісідора Севільскага, а ў 28-й – цытаты са Святога Пісання.

Супраць тых, якія называюцца "Абутыя ў сандалі" (Xabatati)[33]

Таксама ёсць некаторыя, якія называюць сябе Людзі Далін (Vallenses), гэта значыць тыя, хто застаецца ў даліне слёз, робячыся апосталамі Хрыста, і гэтым смеючыся з апосталаў Хрыста; і таксама хочуць называцца "тымі, хто носіць сандалі" (Xabatentes) ад назвы грубых сандаляў (Xabata) нават больш, чым хрысціянамі ад Хрыста. Лёгкія сандалі выразаюць крыжам, у той час як павінны распінаць свае часткі цела. Абутак каранує, а галава – не, як сказаў Ісая ... (Іаіл 2:13). О новыя норавы! Новыя людзі-бадзягі, якія не могуць розныя новыя месцы ўбачыць ці захапляцца імі, калі не прыкінуцца Хрыстом. Так і сядзяць цэлы дзень на сонцы. Падчас вячэры выходзяць на плошчы [прасіць міласціну]. Пра іх сказаў Павел да фесаланікійцаў ... (2 Фес 3:11–12).

І таму належыць ім маўчаць і працаваць, і есці свой хлеб, а не чужы. Яны ж забіраюць сабе хлеб, прызначаны для сляпых, кульгавых і калек, і таксама ўбогіх, якіх Бог загадаў запрашаць[34], а не моцных або магутных, якія могуць самі сабе зарабіць. І менавіта іх называў Гасподзь шчанятамі, кажучы[35] ...

Такім чынам, вы павінны зарабляць, каб набываць. Чытаем жа[36] ...

Гэта ўсё ўжо было сказана Саламонам, о Людзі Далін. Вы ж нічога не збіраеце, як мурашы, не працуеце рукамі, як павукі, якія хоць і малыя, але мудрэйшыя за мудрых[37], як сказаў Саламон, і Эклезіяст таксама сказаў ... (Экл 5:11, 9:1, 9:4).

---

[32] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 101–119.

[33] Такая назва можа перакладацца як "абутыя ў сандалі", і як "тыя, хто паважаюць суботу", падрабязней глядзі Gerard P. Damsteegt, "Decoding Ancient Waldensian Names: New Discoveries," *Andrews University Seminary Studies* 54.2 (2016): pp. 237–258, https://digitalcommons.andrews.edu/auss/vol54/iss2/4/.

[34] Алюзія на Лк 14:13.

[35] Аўтар пацвярджае гэта наступнымі біблейскімі цытатамі (Мф 15:26; Эф 4:28; 1 Фес 4:11–12; 2 Фес 3:7–8, 10; Дзн 20:34, 4:34–35, 20:35; Ін 4:8).

[36] Далей ідуць наступныя біблейскія цытаты (Сал 12:9, 12:11, 12:15, 13:4, 19:24, 20:13, 21:25, 22:13, 26:14, 26:16).

[37] Алюзія на Сал 30:24–28.

Пра вас таксама сказаў Ісус, сын Сіраха ... І таксама чытаем мы ў Выслоўях ... (Сал 30:27). Вы ж ясцё з ліхвярамі, што забараніў Павел, кажучы карынфянам ... (1 Кар 5:11). Магчыма, вы ўзвышаеце сябе тым, што чытаеце "Дабрашчасныя бедныя духам" (Мф 5:3). Але многія бедныя тыя не ёсць бедныя у Духу, бо сквапныя. Таксама многія з тых, хто быў бедным у Духу, мелі маёмасць, так, як Аўраам і Ёў. Не маёмасць губіць людзей, а сквапнасць і прага.

Вы ж адказваеце: мы працуем не для ежы спрахлай[38], але так не саскочаце. Чаму ж тады Гасподзь стварыў ежу, якая спрахнее, гэта значыць манну? ... (Ін 6:49, 58, 5–13, 10:25). Вашыя справы выразна сведчаць пра вашу крывадушнасць. Як жа вы можаце не быць крывадушнікамі, калі вы не называеце добрымі тыя справы, чыімі пладамі вы харчуецеся. Так і Павел пра вас прапаведаваў, кажучы ... (Дзн 20:29; 2 Цім 3:6). Хто ж шмат навучае супраць веры, той некаторых добрых людзей заблытвае, бо хоць з выгляду яны і падаюцца добрымі, насамрэч хаваюць зло, дурняў труцячы: яны, пакуль прапаноўваюць атруту, намазваюць краі келіху мёдам, каб праз слодыч давесці да смерці. Гэта ж узгадваў і Вергілій, які казаў: "О дзеці, хто збірае з зямлі кветкі і схаваныя суніцы, уцякайце, змяя хаваецца ў траве". І Мацвей казаў ... (Мф 7:15). Адкуль і Катон сказаў "Не трэба судзіць пра людзей па спакуслівых казаннях; дудка салодка спявае, чым птушкалоў птушку падманвае".

... (Сал 1:10, 5:3–4, 6:12–14, 12:26). Таму Вергілій вас называў данайцамі, кажучы: Я баюся данайцаў, нават якія прыносяць дарункі. Калі вас Павел называў цікаўнымі, ён заўважыў, што вы цікаўныя. Цікаўнасць жа – найгоршая загана. Бо цікаўны заўсёды так робіць, каб найменшае адшукаць, а пра найважнейшае забыцца, каб ён падаваўся больш святым, чым астатнія. ... (Быц 34)[39]. Так і Вы, цікаўныя, хочаце чужое пабачыць, а менавіта злачынствы чужых, і пакідаеце радзіму і свае дамы, а гэта значыць – на свае злачынствы не зважаеце, і тым падтрымліваеце шкоду, якую наносіць нячысты дух, і ніякім чынам не можаце быць вызваленымі, калі толькі не з Божай дапамогай і малітвамі братоў за вас. Яшчэ Саламон гэта забараняў, і мы да вас звяртаемся, кажучы: ... (Сал 22:22–25). Вядома, што на цярновым кусце не можа вырасці вінаград, аднак часам падтрымлівае вінаградную лазу з вінаградам. Так і ерэтыкі, хоць і добраму вучаць, але цярніста. Так сказаў Якуб: ... (Як 3:10). Так часам і з дрэннага дрэва нараджаецца добры плод: так, як Юда, які ішоў за Ісусам з яго вучнямі; і Навухаданосар, які загадаў ва ўсім сваім царстве пакланяцца Богу Данііла[40]; і Ётар, калі даваў Майсею карысныя парады[41]. Таксама і Пётр, які быў добрым дрэвам, даў благія плады, калі ад Бога адрокся. І таму калі Бог казаў: .... (Мф 7:17), і наадварот, ён звяртаўся да людскіх намераў. Бог жа па сэрцы судзіць. Адкуль і Гасподзь сказаў: якія будуць твае намеры, такая будзе і твая справа.

І так гультайства ваша выкрыў Саламон, які сказаў ... (Сал 20:4). О гультаі, капаць вы не хочаце; а жабраваць вам не сорамна. Вы ж заўсёды бераце, але нічога не даяце, як сказаў Гасподзь ... (Лк 6:38). Чаму ж тады вам павінна давацца? Вы нічога не сееце, а толькі збіраеце. Паслухайце, што сказаў Ісус сын Сірахаў ... І таксама Гасподзь сказаў: .... (Лк 12:48).

---

[38] Алюзія на Ін 6:27.

[39] Вольны пераказ.

[40] Данііл 6:26.

[41] Выхад 18:13–27.

Калі ж мы звернемся да Пісання, то нам загадана больш даваць, чым браць. ... (Лк 11:41; Іов 15:34; Друг 16:19; Сал 15:27; 22:7). Вы ж, прымаючы багатыя ахвяраванні, аслепленыя імі, таму і седзіце ў гультайстве і сне. Гэта ж вам належыць сказаць: ... (Мф 20:6). І вы выхваляецеся гэтым, схаваныя за покрывам крывадушша? Тады і вам сказаў Гасподзь: ... (Мф 23:28; Лк 18:11). На некаторыя рэчы вы гледзіце ўважліва, а на некаторыя заплюшчваеце вочы. Заглядаеце ў торбу таму, хто ідзе наперадзе, як сказаў Персій[42].

Такім чынам, вашу пыху можна падзяліць на чатыры часткі. Першай выхваляецца чалавек, які прыпісвае сабе, чаго насамрэч не мае. Другое, што не верыць, што тое, што ён мае, ад Бога ўзята, а прыпісвае заслугі сабе. Трэцяе, што верыць, што ад Бога ўзяў, але выдае за свае заслугі. Чацвёртае, калі пагарджае астатнімі, бо думае, што мае тое, чаго яны мець не могуць. Такім чынам, чатыры тыпы пыхі сабраныя ў вас, маецца на ўвазе ў ерэтыках, у адным месцы. Вы ж усхваляеце самі сябе, як тыя фарысеі, якія, молячыся ў храме, казалі: ... (Лк 18:11–12). Даюць шмат дзесяціны, бо належыць даваць дзесяціну, але больш жорсткія прадпісанні ігнаруюць ... (Лк 18:13)

Ці не тыя вы, пра каго сказана: падвойным знішчэннем знішчыце іх. Вы ж бедныя, і беднымі застанецеся. Карабель ваш добра збудаваны, мала дзірак, у адкрытым моры затануў. А вы думаеце, што зможаце сабраць пыл пад ветрам. Тварам долу падаюць змірэнныя, вы ж пышлівыя, таму на спіну паваліцеся, пра вас напісана: ... (Ін 18:6). Хто ж падае тварам долу, той бачыць, куды падае. Хто ж на спіну, той не бачыць, куды падае. Адкуль жа ў вас гэта пыха, вы ж жабракі? Вы здабываеце ежу для вантробаў вашых, у той час як павінны здабываць ежу для душаў. Ці ж не сказаў Псальмапевец: ... (Пс 37:25).

Але супярэчыце, бо Гасподзь сказаў: Не клапаціцеся. О лянівыя: ён прыбраў клопаты, а не працу. Мы павінны працаваць, але не павінны быць заклапочанымі[43]. Паслухайце Госпада ў Евангеллі: ... (Мф 7:12). Але гэта любоў у вас не ўзаемная. І гэта пра вас было сказана Госпадам: ... (Мф 13:12). Падаецца, што ў вас ёсць нейкая святасць, але большую частку вы страцілі. Бо вы на вуснах маеце адно, а ў сэрцы іншае.

Адкуль Іерэмія сказаў пра вас: ... (Іер 9:8). Вы, як чарот, пусты ўнутры: а звонку выглядаеце святымі праз крывадушнасць. Пра такіх сказаў Ёў: ... (Іов 20:16–17; Друг 32:32–33). Так і ўладар ваш Д'ябал, блага вытлумачаны ў Пісанні, калі падгаворваў Хрыста, як напісана: ... (Мф 4:6; Пс 90:11–13). З дапамогай анёлаў, калі гэта неабходна, сказана: пра сваё ж жорсткае абыходжанне, як аматар выкручвацца, прамаўчаў: так і вы двудушнічаеце ў дачыненні да Пісання: як тыя іўдзеі, дрэнна ведаеце закон. Гасподзь жа, калі даваў закон Майсею, напрыканцы загадаў давесці да слухачоў: ... (Друг 6:8), што абазначае: з павязкай на руцэ, працуючы без пустой славы, трымаючы перад вачыма, гэта значыць, думаючы пра іх дзень і ноч. Фарысеі ж насілі закон на паперцы, як быццам бы карону на галаве, гэта значыць, на руцэ на вялікім пальцы, а ў сэрцы адмаўлялі. Не разумелі таго, што Гасподзь сказаў: ... (Мф 23:5; 21:44). Грэшнікі ж упадуць на камяні і разаб'юцца, і гэтым усё раздушаць. Наверх жа на ерэтыкоў упадзе камень і іх усіх раздушыць.

Калі ж вы чыстасцю выхваляецеся, паслухайце Ісаю: ... (Іс 56:3). Вы ж, аднак, – гэта змяя, якая схавалася ў зялёнай траве. Чым жа вы выхваляецеся? Вось

---

[42] Аўл Персій Флак, рымскі паэт.

[43] Алюзія на Мф 6:25–34.

Саламон казаў: ... (Сал 3:35; 30:20). Ваш жа шлях – гэта шлях распусных жанчын, бо, як сказаў Саламон, ... (Сал 30:20). Вы ж, хоць і дурныя, сваёй дурасці не прызнаяце. Адсюль Эклезіяст: ... (Экл 10:3). Але Гасподзь вас пазнае. Адсюль Ісус сын Сіраха ...

Вы ж падбіраеце словы так, каб іншых спакушаць. Падчас дыспутаў вы карыстаецеся фальшывымі доказамі, супраць якіх выступаў Мацвей, кажучы: ... (Мф 10:19). Вы ж напаўняеце свае кнігі рознакаляровымі знакамі. Але вы не хочаце прызнаваць, што робіце благое; пра такіх было сказана: ... (Пс 35:4; 51:5–6). Вы ж спрабуеце падняць ваду над алеем, што немагчыма, бо вада апускаецца на дно, а алей усплывае. Вы спрабуеце схаваць святло ў цемры: праганяючы цемру, святло застаецца. Вы спрабуеце змясціць зямлю над нябёсамі, але дарэмна. Зямля ж апускаецца пад сваёй вагой. Вы робіце гэта па няведанні, і па няведанні грашыце. Але Апостал сказаў: ... (1 Кар 14:38). Там вы імкняцеся спадабацца людзям; на што Давід казаў: ... (Пс 52,6).

Вы ж папракаеце, кажучы: Не дзіва, што клірыкі нас пераследуюць. Напісана так: ... (1 Цім 3:12). Але нічога няма [пра тое што]: Пераслед мае дачыненне да таго, што сказаў Апостал: ... (2 Кар 11:29). Пераследы справядлівыя ў дачыненні да іншых слабасцяў і скандалаў.

Але на гэта працягваеце адказваць: Калі даведаемся, што блага тое, што мы робім, то перастанем гэта рабіць: Але гэта не адказ. Інакш бы пра вас Давід не казаў: ... (Пс 54:16). Калі ж вы ведаеце, што благое робіце, то жывымі спусціцеся ў пекла. Бо вы ў некаторых рэчах з намі згодныя, у іншых супрацьстаіце; як быццам бы ўнутраныя ворагі. Адкуль Давід: Абараняе душу маю ад тых, хто побач са мной і г.д. У чытанні Евангелля, у павазе да дня нядзельнага, у пастах, у малітвах вы разам з намі. Толькі вера, якая ёсць найгалоўнейшая, нас ад вас аддзяляе; пра што Давід: ... (Пс 55). Вы ж нас цікуеце, схаваўшыся: каб, калі мы павалімся, быць гатовымі нас абвінаваціць. Але, у чым праблема? ... (Пс 54:23). Вы ж аддзяліліся ад матчынага ўлоння Царквы, і ў гэтым вы лжывыя. Адкуль Давід: ... (Пс 57:4, 8). Вы ж ведаеце, што вы кажаце, і ў гэтым вы цалкам выкрытыя ў падмане. І менавіта вас выкрываў Ян, кажучы: ... (Ін 9:41). Вы ж ахвотней да дому спажывання мяса падыдзеце, чым да дому посту, як казаў Эклезіяст: ... (Экл 7:2). Таксама вы імкнецеся да балявання, як мухі да мядовых сотаў: пра гэтых мух было пазначана ў словах: ... (Экл 10:1)[44].

II.vii Эрменгард (з Безье?). Урыўкі

Хутчэй за ўсё, прыведзеныя ўрыўкі (арыгінальная назва не захавалася), якія дайшлі ў манускрыпце разам з больш раннім антыкатарскім творам Эрменгарда, абата Сэн-Жыля (паміж Манпелье і Авіньёнам), напісаным да 1195 г., належаць пяру паплечніка Дуранда з Оскі – Эрменгарду з Безье (Ermengardus Biterrensius). Падобна, што яны былі напісаны перад IV Латэранскім саборам на аснове прызнання трох схопленых вальдэнсаў. Існуе гіпотэза, што створаны невядомым цыстэрцыянцкім манахам[45].

---

[44] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 143–152.

[45] Paweł Kras, *Ad abolendam diversarum haeresium pravitatem: system inkwizycyjny w średniowiecznej Europie* (Lublin: Wydawnnictwo KUL, 2006), 111.

Жак Шыфалё ў сваім апошнім даследаванні прапануе датаванне каля 1230 г. і звяртае ўвагу, што абвінавачванні, якія Эрменгард выставіў вальдэнсам, амаль цалкам супадаюць з тымі, якія прыводзілі ў сваёй палеміцы з петрабрузіянцамі і генрыкіянцамі Пётр Вялікашаноўны і іншыя аўтары[46].

Пра Вальдэнсаў

Мы хочам сказаць вам пра памылкі Вальдэнсаў праўду, з якой усе згодныя. Кажуць, што самі могуць хрысціць, не толькі ў выпадку непазбежнай смерці. Кажуць таксама, што яны так робяць ахвярапрынашэнне. У келіху замочваюць хлеб у віне і кажуць, што гэта Цела Гасподняе. Кажуць таксама, што могуць спавядацца паміж сабой. Выбіраюць таксама біскупаў, якіх слухаюцца, а біскупамі Святой Царквы пагарджаюць або пакідаюць без увагі. Сцвярджаюць таксама, што як міране, так і жанчыны без навукі, а таксама без умення пісаць, могуць прапаведаваць. Кажуць таксама, што Святая Царква – гэта працоўнае месца і пячора бандытаў. Ерэтык жа Гілельм з Карпентрас есць мяса па пятніцах у знак пагарды да Святой Царквы. Пётр жа Рафамас, і Цітбальд з Аўрэнцыі, і Гілельм Мунус усе разам згодна кажуць пра блудніцу, якая апісаная ў Апакаліпсісе, што яна абазначае Папу Рымскага, і пра дракона, які абазначае, кажуць, Рымскага імператара. Таксама кажуць, што другі звер, пра якога ідзе гаворка ў Апакаліпсісе, абазначае Іерусалімскага патрыярха. Сцвярджаюць такасама, што гэта менавіта той патрыярх цішком запальвае агонь у другую суботу Вялікадня, а не Бог. Кажуць таксама, што тое, што асвячаецца на алтары, не ёсць Целам Гасподнім. Кажуць таксама, што тыя, хто прымае тую кроў, якая асвячаецца на алтары, напаўняюць Бога гневам. Кажуць таксама, што Найсвяцейшая Марыя не была народжаная ад цялеснай пары. Гэтым памылкам навучаюць сваіх вучняў у доме Пятра з Рэгардана ля Аўрэнка. Адзін з іх, якога завуць Амікус, казаў, што быў у царкве пад Лімасам і бачыў чатыры алтары ў піку Святой Царкве: Вось alter et altaras et autaram et altaraset[47]. Гілельм з Карпентрас, іх біскуп, і Г. з Баньёлс, магістар памылак, і П. Рафамас казалі, што прымусілі сябе перахрысціць, бо не верылі, што могуць быць выратаванымі праз хрышчэнне, якое прынялі ў Святой Царкве. І гэта дакладна, што па іх унушэнні Бертран Гілафр, Г. Катала і Г. Калвет, іх госці, трэба думаць, ілжыва прысягнулі сваім біскупам. Г. Гілафр ахрысціў свайго сына ў Вальдэнсаў у піку Рымскай Царкве. Натуральна, Г. з Балены і Г. з Банолса былі гэтаму сведкамі. Ян з Мантэл сказаў у піку Рымскай Царкве, што ён мае жаданне, калі б ён быў галоўным, каб усе людзі ў Авіньёне былі тым часам ахрышчаныя ў водах Роны[48]. Г. Калвет пахаваў свайго сына пад каранямі нейкага дрэва па ўнушэнні і парадзе Вальдэнсаў. Ля Валнаса Вальдэнсы ахрысцілі двух хлопчыкаў, каб прыгнятаць Святую Царкву. Ян з Весэнціны з сямю сваімі вучнямі прынялі паўторны хрост і ўзялі сабе іншыя імёны, а менавіта як у апосталаў: Пётр, Ян, Якуб і г.д. Г. з Банолса, і Понцій з Графілона, і Гілельм з Лерыды, і Г. з Алеста, і Г. з Баврэ, і Г. з Арэлата, і Г. з Балена. Яны ўсе сцвярджаюць у піку Рымскай Царкве, што не посцяцца ў Вялікі Пост, але ядуць тры ці чатыры разы на дні, і забараняюць, каб хто-небудзь казаў пры іх Credo in Deum, ці Quicumque

---

[46] Chiffoleau, "Religious Dissidence and Political Struggles," 107.

[47] Фрагмент не паддаецца перакладу, у лацінскай мове ёсць толькі слова "altar".

[48] Пытанне хрышчэння немаўлят было актуальнае ў даліне Роны з пачатку XIII ст., падрабязней гл. *Balossino and Chiffoleau*, "Valdesi e mondo comunale in Provenza nel Duecento," 66 n. 19.

vult[49], ці "Змілуйся над намі", і ўсе яны кажуць, што ніхто не павінен клясціся, і самі адкрыта парушаюць клятву. Вальдэс (Valdes), стваральнік іх памылак, ля Ліёна прысягнуў аднаму кардыналу Рымскай Царквы, што ніхто з членаў гэтай секты не трымаецца і не мае гэтых памылак. П. Рос. і Г. Ян. разам з В. пакляліся за морам. Галурам прысягнуў біскупу Анціболісу. П. Р. з Кайрана, Машэль Эмбагард, Бенігн з Канета Калумбена, Эліас Мерцер прысягнулі архібіскупу Нарбоны. Г. прысягнуў біскупу Арэлата. Аўн з храма прысягнуў біскупу з Авіньёна. Усе яны давалі лжывыя клятвы і прымушалі даваць ілжывыя клятвы сваіх гасцей. Усе яны давалі Богу запавет чысціні і рабілі наадварот. Амікус з Бланкафлор, з Марыяй з Нарбоны, і з госцяй сваёй з Сэн-Антанэн-Нобль-Валя. Галуам з Генцэзабен з Раікхаса, з Брунезінай. П. Р. з Кайрана з Марыяй з Безье і з Марыяй з Нарбоны. Пейранэт з Марыяй з Нарбоны, і стала вядома многім братам, што ён задумаў. П. Грос з Марыяй з Цэстэрыёна і ад яе меў аднаго сына. П. Рос з Бенедыктай. Г. з Балена з Алаізай Дат. Лаўрэнцій Капатрола з Марыяй з Нарбоны. Якуб з Павіі з Персіяй. Сімеон з Ламбардыяй. Гэтыя і многія іншыя Вальдэнсы ўдзельнічалі ў такім устрыманні. Ян з Мантэля, і Эліяс, яго паплечнік, і Б. з Фіята вышэйпералічаныя памылкі засведчылі і пацвердзілі, што раней усе яны і паплечнікі іх у гэтых памылках удзельнічалі. Пасля з-за страху вечнага асуджэння яны раскаяліся, прыйшлі да сваіх біскупаў, прызнаючы свае грахі і выкрываючы ўсе вышэйназваныя Вальдэнскія памылкі. Тады біскуп Валянцін далучыў Яна з Мантэля, які быў Вальдэнскім прэсвітарам, і наклаў на яго пакаянне, каб ён вечна служыў у доме Св. Антонія. На Эліяса наклаў падобнае, каб служыў вечна ў лепразорыі з Мантэля Адэмара, і на Б. з Фіака, каб служыў у гасцявым доме Іерусалімскім навечна. Пасля вышэйназваныя трое для выратавання сваіх душ раскрылі свае вышэйназваныя памылкі Святой Царкве і яе службовым асобам. І я, Ян з Мантэля, і я, Эліяс, паплечнік яго, і Бернард з Фіка ўсё вышэйназванае цалкам прызнаём да прызначанага дня і пад справядлівым судом, што, калі не зможам даказаць гэтага, нас таксама кінуць у агонь для спалення. Канец гэтай главы[50].

Аб'яўленне ерасі Альбігойцаў і Ліёнцаў

Больш за тое, ёсць іншыя ерэтыкі, якія называюцца "Ліёнцы", ад [горада] Ліён; "Вальдэнсы" ад Вальдэса (Valdesio); а таксама "Бедныя", бо кажуць, што не клапоцяцца пра заўтра (Мф 6:34), "Босыя" (dessotulati), бо носяць абутак з дзіркамі. Ад Каталоніі і мора ў Нарбоне ажно да мора ў Бардо гэтыя людзі публічна спавядаюць каталіцкую веру вуснамі, але не ў сэрцы, а яшчэ на сваіх сакрэтных сходах, да якіх я сапраўды быў вельмі блізкі, калі яны кажуць, што толькі яны адзіныя, як вучні Хрыста, павінны хрысціць. Таму яны хрысцяць дзяцей сваіх вернікаў і тых, хто дае ім прытулак, калі толькі могуць. З-за гэтай практыкі ад іх пайшла секта "перахрышчаных". Яны таксама вераць і кажуць, што той грашыць, хто прызначае ці ўхваляе цялесныя пакаранні злачынцаў; тое самае робіць той, хто прыносіць клятвы. Яны кажуць у дадатак, што калі хто-небудзь мяркуе прынесці ахвяру святару ці перад алтаром, то лепш даць міласціну беднаму, бо гэта больш ухвальна, чым даваць ахвяры [Царкве]. Наведванне могілак, акрапленне асвечанай вадой, спальванне ладану, прамаўленне імшаў за памерлых нічому не дапамагае, як яны кажуць. Таксама яны вераць – і сорамна гэта паўтарыць – што Рымская Царква дае

[49] Сімвалы веры: Нікейскі і Афанасьеўскі.

[50] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 153–157.

ім не лепшае духоўнае прычасце, чым можа даць любы мужчына ці жанчына з іх ліку, без царкоўнага адзення, без танзуры, і павінен асвячаць Цела Хрыстова. Далей яны кажуць, што ніхто не можа быць дасканалым і ніхто не выратуецца, калі не памрэ цалкам бедным і – дазвольце мне прызнацца папраўдзе – яны непакояць і нападаюць на Божую Царкву больш, чым іншыя ерэтыкі. І, як мне падаецца, ні яны, ні іншыя не могуць быць выкараненыя інакш як свецкай зброяй[51].

II.viii Іаахім Флорскі. Трактат пра Чатыры Евангеллі. Пра артыкулы веры

Італьянскі багаслоў, экзэгет і містык Іаахім Флорскі, які з'яўляецца блажэнным Рымска-Каталіцкай Царквы і адначасова чыё вучэнне наконт надыходу Тысячагодняга царства Божага ў 1260 г. было асуджана каталіцкімі саборамі, пакінуў пасля сябе значную пісьмовую спадчыну. Змешчаныя ніжэй урыўкі ўзятыя з твораў "Трактат пра Чатыры Евангеллі" (Tractatus super quatuor Evangelia) і "Пра артыкулы веры" (De articulis fidei), напісаных у канцы XII ст. Аўтар палемізуе з Вальдэнсамі наконт забароны працы рукамі, абсалютнай беднасці і ўсеагульнай пропаведзі, у тым ліку жаночай.

Трактат пра Чатыры Евангеллі

Аднак вядома, што гэты цуд, такі, як цуд са сляпым ад нараджэння, быў апісаны як здзейснены Госпадам у нядзелю[52]. З-за гэтага насмешнікі-яўрэі сцвярджаюць, што ложак свой перанёс у нядзелю. Бо, натуральна, ілжывыя сведкі, якія як быццам бы бачылі знакі канца свету, будуць сцвярджаць новаперавернутым у веру, якія працуюць, каб зарабіць сабе на хлеб, і слугам, што ім рэкамендавана духоўнымі людзьмі, каб яны раздзялілі тое, што маюць, паміж тымі, хто церпіць ад нястачы, бо гультайства – вораг душы. Што ж тады я скажу наконт таго, калі Бедныя Ліёнцы на гэтым будуюць усе свае разважанні і кажуць усім, што верныя ў Хрысце не павінны працаваць дзеля той ежы, што знікне, але для той, што застанецца ў вечным жыцці?

Калі б чалавек не менш баяўся, не паводле прадпісання, а паводле ўласнага меркавання рабіў тыя справы, якія яму падаюцца добрымі, то рабіў бы чыстае зло, бо хоць злом ёсць не прынясенне належнай ахвяры Госпаду, нашмат горш прыносіць Госпада ў ахвяру ў вышынях. Гэта сцверджанне – наконт ерэтыкоў Бедных Ліёнцаў: тым жа самым чынам манахі сарабаіты, якія не хацелі людзям падпарадкоўвацца, так кажучы "хто вас слухае, мяне слухае", а самому Богу, які так казаў, праяўлялі непадпарадкаванне, калі што-небудзь абіралі, казалі, што гэта – святое; калі ж ім што-небудзь не падабалася, то казалі, што гэта недазволенае.

Пра артыкулы веры

Што таксама ўсім ім дазволена добрае казаць, не дазволена толькі прапаведаваць. Вядома, што жанчынам дазволена добрае казаць, але паводле Апостала забаронена ў царкве прапаведаваць ці навучаць.

---

[51] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 15–17.
[52] Ін 9:1–38.

Паколькі многія псеўдаапосталы праніклі пад выглядам апосталаў, перакручваючы апостальскае і кананічнае вучэнні, належыць, каб ніхто не распачынаў пропаведзь, калі толькі не пасланы клірам, а менавіта да абавязку прапаведнікаў ніхто не дапускаецца, калі перад гэтым не апытаны і не выпрабаваны, і хто мае сведчанні ад тых, хто звонку, і хто дапушчаны, хто мае вядомы знак на галаве, чым можа быць адрознены ад мноства астатніх вернікаў. Бо так належыць, так пастаноўлена на саборах, і гэтага заўсёды трымалася і трымаецца Святая Універсальная Царква, як было цудоўна сказана апосталам: "І ніхто сам сабою ня прымае гэтага гонару, а толькі пакліканы Богам, як і Аарон" (Яўр 5:4) і Апосталам Якубам: "ня многія рабецеся настаўнікамі, ведаючы, што мы тым большай асуды дастаём" (Іак 3:1). Заслужана адлучыла Царква Ліёнскіх ерэтыкоў, якія аднолькава і абыякава, як мужчыны, так і жанчыны, без вучэння, без міласці, без парадку, не столькі абвяшчалі, колькі перакручвалі слова Божае і пад выглядам святасці рабілі сходкі Сатаны[53].

II.ix Пётр з Во-дэ-Сэрнэ. Гісторыя альбігойцаў

Пётр быў манахам цыстэрцыянцкага абацтва Во-дэ-Сэрнэ (Vaux-de-Cernay) за трыццаць кіламетраў ад Парыжа. Са сваім дзядзькам, абатам Гаем, ён далучыўся на 6 гадоў да Альбігойскага крыжовага паходу ў 1212 г., падчас якога напісаў трактат "Гісторыя альбігойцаў" (Historia Albigensis) да смерці яго вайсковага правадыра Сымона дэ Манфора ў 1218 г. Першая частка трактата, вытрымка з якой прыведзена ніжэй, была напісана яшчэ ў 1213 г. Магчыма, пры напісанні ён выкарыстоўваў трактат Эрменгарда з Безье[54], але большасць падзей апісаў зыходзячы з уласнага вопыту.

Гісторыя альбігойцаў

Аднак там былі і іншыя ерэтыкі, якія называліся Вальдэнсы ад нейкага Вальдэса (Valdio), гараджаніна з Ліёна. Яны дастаткова дрэнныя, але ў параўнанні з іншымі не такія сапсаваныя. На самой справе па многіх пунктах яны згодныя з намі, па іншых – адрозніваюцца. Калі мы прапусцім многія моманты іх адрозненя, іх памылкі зводзяцца да чатырох рэчаў: у выказванні сваёй выключнасці ў нашэнні сандаляў на ўзор апосталаў; у адмаўленні, незалежна ад абставінаў, давання клятвы і забойства; і таксама ў іх патрабаванні, што кожны з іх у выпадку неабходнасці, калі ён "абуты ў сандалі", можа асвячаць Цела Хрыстова, нават калі ён не пасвечаны біскупам.

Не варта замоўчваць, што там мы знайшлі сем ерэтыкоў з той секты, якія называліся Вальдэнсы і, будучы прыведзенымі да легата, сваю нявернасць прама і цалкам прызналі; схопленыя нашымі паломнікамі (peregrini)[55], былі з найвялікшай радасцю спаленыя[56].

---

[53] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 96–100.

[54] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 235.

[55] Удзельнікі крыжовых паходаў таксама лічыліся паломнікамі.

[56] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 167–168; Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 240–241.

Дыспут у Пам'е паміж каталікамі і Вальдэнсамі, 1207 г.

Біскуп Оскі хацеў вярнуцца ў сваё біскупства, каб дом свой прывесці ў парадак і прапаведнікаў слова Божага ў правінцыі Нарбоны ўсім неабходным забяспечыць. Такім чынам, калі ён далёка ад'ехаў, кіруючыся ў Іспанію, прыбыў у Пам'е на тэрыторыі Тулузы, і далучыліся да яго Фульк, біскуп тулузскі, і Навар, біскуп Кузерана, і шматлікія абаты. Мелі яны там дыспут з Вальдэнсамі, і Вальдэнсы былі цалкам абвергнутыя і збітыя з панталыку, і гарадскі люд, галоўным чынам галота, у большасці сваёй схіліўся на наш бок; той жа, хто быў арганізатарам суда на дыспуце і быў вялікім прыхільнікам Вальдэнсаў[57], у тым горадзе адмовіўся ад ерэтычнай заганнасці і перадаў у рукі біскупа Оскі сябе і сваю [жонку? маёмасць?]: і ў той жа дзень мужна атакаваў яе [жонку?] і іншых паслядоўнікаў ерэтычных памылак. На тым дыспуце прысутнічаў той найгоршы здраднік, граф Фуа, той самы бязлітасны ганіцель Царквы, вораг Хрыста; яго жонка была адкрытай ерэтычкай з секты Вальдэнсаў, і дзве сястры, з якіх адна да секты Вальдэнсаў, а другая да іншай абшчыны бязбожнай ерасі належала; вышэйапісаны ж дыспут праводзіўся ў палацы гэтых графаў; і гэты ж граф адзін дзень прымаў у сябе Вальдэнсаў, а на другі дзень нашых прапаведнікаў[58].

II.x Рычард з Пуацье. З жыццяпісу Папы Рымскага Аляксандра III

> Гэта вытрымка, датычная вальдэнсаў, з жыція Папы Аляксандра III, якое было састаўной часткай "Каталога Пап" (Liber Pontificalis) 1216 г. аўтарства Рычарда з Пуацье (у франкамоўнай традыцыі – Рышара з Пуату), манаха бенедыкцінскага абацтва ў Клюні.

Каля года Гасподняга 1570 (MDLXX)[59] узнікла секта і ерась іх, якая называлася Вальдэнсы, або бедныя з Ліёна, чый творца і вынаходнік быў нейкі грамадзянін Ліёна па імені Вальдэнс (Valdensis), ад чаго і яго сектанты сталі так называцца, той багацей рэчы раздаў і ўсё, што засталося, вырашыў трымацца беднасці і евангельскай дасканаласці так, як служылі апосталы. І калі зрабіў сабе спіс з Евангелля, некаторых кніг Бібліі і Айцоў Царквы на народнай мове, якія назваў "Падсумаванне", і часта іх чытаючы, натхніўся іх зместам, хоць быў не вельмі адукаваны, узурпаваў ролю апосталаў, а таксама зазнаўся, прапаведуючы Евангелле "па вуліцах і па завулках"[60], шматлікіх мужчын і жанчын прыцягнуў да таго ж зазнайства, што стаў дасылаць вучняў, каб тыя таксама прапаведавалі; якія, будучы непісьменнымі і неадукаванымі, па вёсках разышліся, распаўсюджваючы вакол сябе мноства памылак, і, звярнуўшыся да архібіскупа ліёнскага Уладара Яна Праведныя Рукі[61], былі ім забароненыя, але не хацелі аніякім чынам яму падпарадкоўвацца, супрацьпастаўляючы свае вар'яцкія шаты і кажучы, што

---

[57] Арно з Кампаны.

[58] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 127–128.

[59] Магчыма, памылка ў лацінскім тэксце – D замест C.

[60] Алюзія на Песн 3:2.

[61] Відавочная памылка: у той час архібіскупам Ліёна быў Гвічард.

належыць больш падпарадкоўвацца Богу, чым людзям[62], як было прадпісана Апосталам: "абвяшчайце Дабравесьце ўсяму стварэньню"[63], прысвойваючы сабе тое, што было сказана Апосталам, яны сталі імітатарамі і лжывымі спадчыннікамі беднасці, яны нацягнулі на сябе лжывы вобраз святасці, абураючы клірыкаў і прэсвітараў. І таму з-за саманадзейнай узурпацыі права пропаведзі яны перасталі падпарадкоўвацца, у чым і далей упарціліся, і ад таго са сваёй радзімы выгнаныя, адлучаныя. Нарэшце, запрошаныя на Сабор, які праводзіўся ў Рыме ў Латэране, праявілі ўпартасць і былі асуджаныя як ерэтыкі. І так распаўсюдзіліся па розных правінцыях, і на межах з Ламбардыяй з іншымі ерэтыкамі змяшаліся, іх памылкі ўпіталі і іх трымаліся, былі асуджаныя як ерэтыкі, іх памылкі і ерасі недзе ў іншым месцы былі названыя[64].

II.xi Сальва Бурчы. Кніга над Зорка

Палемічны твор, складзены міранінам з П'ячэнцы Сальва Бурчы (Salvus Burci) у 1235 г. як адказ на кнігу пад назвай "Stella" (Зорка), што і абумоўлівае граматычна няправільную форму назвы "Кніга над Зорка" (Liber supra Stella). "Зорка" была напісаная, верагодна, катарамі, не захавалася, але ў сваім адказе Сальва палемізуе не толькі з катарамі, але і з іншымі ерэтыкамі, у тым ліку – вальдэнсамі (прадстаўнікамі 2-х груп: бедных леаністаў і бедных ламбардцаў).

Кацярына Брускі ў сваім найноўшым выданні кнігі Бурчы адзначае, што яна, хутчэй за ўсё, называлася "Палын"[65]. Таксама даследчыца падкрэслівае сувязь аўтара з ордэнам дамініканцаў. Андрэй Роўч у сваёй рэцэнзіі адзначае, што поўнае выданне тэксту, недаступнае раней шырокаму колу даследчыкаў, дазваляе зрабіць выснову пра глыбокую зацікаўленасць п'ячэнцінца справамі духоўнага жыцця камуны: найбольш увагі ён надае не столькі "ерэтычным" у сучасным разуменні пытанням, колькі надзённым праблемам для тагачаснай італьянскай гарадской супольнасці – грамадзянскім шлюбам, сумяшчальнасці магчымасці выратавання з уладаннем маёмасцю і г.д.[66]

У тэксце ў дужках пасля літары Д дадзеныя ўрыўкі, якіх няма ў выданні Іларына з Мілана, але ёсць у Ігнаца фон Дзёлінгера і прадубляваныя ў Жана Ганэ.

О, бедныя леаністы і бедныя ламбардцы, і вы, спераністы, вы можаце ўбачыць, як з кнігі адкрытай са спраў тых, якія называюцца катары, што яны могуць быць асуджаныя як ерэтыкі, бо выказваюцца дрэнна пра Новы Запавет, шлюб і многае іншае; і няхай вы не дасягаеце ў ерасі такой вышыні і глыбіні, як тыя ерэтыкі, што называюцца катары, аднак вы таксама ерэтыкі. Бо аддзяліліся вы ад святой каталіцкай Царквы, ад якой вы прымалі хрышчэнне і рукапакладанне, але ж менавіта гэтымі двума таінствамі чалавек хрысціянінам робіцца і прымае Дух Святы, і таму супраць вас сведчыць хочам.

---

[62] Алюзія на Дзеі 5:29.

[63] Марк 16:15.

[64] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 1, 164–166.

[65] Алюзія на Апак 8:10–11.

[66] Salvo Burci. *Liber suprastella.* Edited by Caterina Bruschi. [Fonti per la storia dell Italia medievale. Antiquitates, 15] Rome: Istituto storico italiano per il Medio Evo. 2002. Cit. by Andrew P. Roach, *The Catholic Historical Review*, (January 2008): 140–142.

(Д: Па-першае, майце на ўвазе, што Апостал праз Дух Святы прадбачыў, што вы павінны быць аддзеленымі ад веры, я маю на ўвазе ад веры Рымскай Царквы, якая абвяшчаецца ва ўсім свеце, як я яўна прадэманструю; дэманструючы гэта так відавочна, каб было настолькі зразумела, быццам калі б ён сам сказаў, прыдуць рагатыя людзі, чаго Апостал хутчэй не казаў бы, хоць вы і кажаце, што ведаеце іх, што не дзіўна, бо і вы і самі кульгаеце).

Таксама відавочна, што катары спачатку былі ў Рымскай Царкве, і ад яе веры хрышчэнне, і рукапакладанне, і іншыя таінствы прымалі, і ў ёй некаторы час былі, і з яе выйшлі. І адсюль вырастаюць іх мітуслівыя пустыя зласлові, якія яны прамаўляюць супраць самой Царквы, кажучы, што яна блудніца, і змяінае гняздо, і звер. І вы, неразумныя, гэта ж кажаце. Звярніце пільную ўвагу, што Апостал кажа "некаторыя"[67]; гэтым ён дае зразумець, што мала ці амаль няма тых, хто аддзяліўся, адносна тых, хто застаўся. І таксама яшчэ старанней заўважце, што катары не "некаторыя" ў параўнанні з вамі; вы як бы нішто з іх пункту гледжання, бо іх нашмат больш па ўсім свеце, чым вас; і катары – нішто з пункту гледжання тых, якіх мноства, гэта значыць тых, хто належыць да Рымскай Царквы; такім чынам, вы бачыце, што вы не Царква Божая; такім чынам, праца ваша марная. Адзначце ж, што вы верыце, што абшчына і Царква Старога Запавету ад Бога, а таму што Ён вывеў іх з Егіпта, і даў ім закон, і быў з імі, і вадзіў іх па пустыні, і ў гэта вы чынна верыце. (Д: І запомніце, што гэта старазапаветная Царква была значна больш шматлікая, чым вы. Такім чынам, вы, няшчасныя, верыце, што абшчына і Царква Новага Запавету меншыя, чым Старога. Але гэта не так. Чаму? Таму што старазапаветная Царква, а менавіта іўдзейская, знаходзілася ў аддаленай частцы свету, а менавіта ў Іерусаліме, і недалёка ад Іерусаліма. Царква ж Новага Запавету распаўсюджана ва ўсім свеце. Такім чынам вы можаце бачыць, што новазапаветная Царква большая за старазапаветную. Такім чынам вы можаце бачыць, што вы не Царква Божая. Чаму? Таму што вас нашмат менш, чым старазапаветнай Царквы).

1235. 8 год індыкта, дзень нядзеля, 6 месяца сакавіка, у доме Монака Карыа. Відавочна, што Царква Божая існуе ад апосталаў да нашага часу і будзе існаваць ад гэтага часу да канца; і што ў Царкве Божай павінны быць біскупы, прэсвітары, дыяканы, прыёры і іншыя. Вальдэс (Valdexius), быў які з Ліёна, быў вашым правадыром, і да Вальдэса вы не мелі правадыра акрамя Рымскай Царквы; і гэта было прыкладна 60 гадоў назад; і яшчэ жывыя многія, хто былі яго прыяцелямі, і сам Вальдэс быў з Рымскай Царквы. Такім чынам, вы неразумныя, паколькі вы лічыце, што да Вальдэса не было Царквы. Сперон быў главой спераністаў, і гэта было каля 50-і гадоў таму. Бедныя ламбардцы аддзяліліся ад бедных ліёнцаў, і гэтаму каля 30-і гадоў; і ўзвысіўся Ян з Ронка, які быў сярод іх старэйшынай, і ён быў невук непісьменны. Такім чынам, вы можаце бачыць, што вы неразумныя і праца ваша марная.

(Д: Магчыма, ерэтыкі скажуць: мы аддзяліліся ад ганьбы блудніцы, іначай кажучы, ад Рымскай Царквы, і лічым прэлатаў за звяроў дзікіх. Самі маюць тысячу марак ад ахвяраванняў, а таксама больш і менш за гэта, і вы бачыце, як яны падстаўляюць адзін аднаго, апаганьваюцца, распуснічаюць, а таксама да такой ступені аб'ядаюцца, што іх часам ванітуе; і такім чынам як я павінен верыць змяінаму гняздзе? І ўзняўся смурод на вачах у Бога і яго святых; не можа быць, каб я калінебудзь да яго вярнуўся. Звярніце ўвагу, што ёсць добрыя святыя, якія трымаюцца

[67] 1 Цім 4:1.

веры Рымскай, такім чынам, чаму вы маеце сумнеў наконт гэтага? Дзе строгія пасты? Дзе цвёрдае ўстрыманне? Дзе шчодрая міласціна? Хто будуе масты і шпіталі? Дзе цнатлівасць, і ўстрыманне, і пабраныя шлюбам, як не ў каталіцкай Царкве? Але лепшыя будуць выратаваны, горшыя будуць асуджаны, а асабліва найвышэйшыя прэлаты найбольшую адплату атрымаюць).

І таксама ў тысячны раз звярніце ўвагу на вышэйсказанае. Чаму? Таму што, калі вы добра навучаныя будзеце, вы лепш убачыце, наколькі вы новыя, і таму змешчана дата, каб спазналі вы сваю навізну. Бо Вальдэс з Ліёна і Уга Сперон, а таксама Ян з Ронка – яны трое былі першымі кіраўнікамі вашай абшчыны; толькі Ян з Ронка каля 30-і гадоў, Уга Сперон жа каля 50-і, Вальдэс каля 60-і, такім чынам, можаце вы бачыць неразумнасць вашу; і таму сціхніце і не кажыце больш нічога супраць Святой Рымскай Царквы.

О ерэтыкі, вялікі жах вы будзеце мець ад тых рэчаў, пра якія кажа каталік. Канкарыцыі, якія называюцца катарамі і вераць у добрага Бога; албанцы, якія называюцца катарамі, лічаць яго злым; не можа быць большага падзелу. Бедныя леаністы і бедныя ламбардцы падзелены; і гэтыя чатыры секты варагуюць адна з адной, як агонь з вадой; і адна прыгаворвае другую да смерці, і кожны з іх гаворыць, што ён – вучань Хрыста; і калі каго насцігне смерць, кажуць, што ён пакутаваў за Хрыста; такім чынам, можаце бачыць, што вялікі страх ваш. Чаму? Устаноўлена, што адзін будзе выратаваны, аднак трое будуць асуджаны; таму вялікім павінен быць жах ваш.

О бедныя ламбардцы, вы раней былі ў Рымскай Царкве: не спадабалася вам Царква, злучыліся вы з беднымі леаністамі, і былі вы з імі пад кіраўніцтвам Вальдэса (Gualdensis), і заставаліся некаторы час пад яго кіраўніцтвам; потым абралі сабе іншага галаву, выхаванага Вальдэсам і беднымі леаністамі, імя якому было Ян з Ронка, якога я бачыў; і вы прапаведавалі некалькі гадоў тое, што прапаведавалі Бедныя, кажучы, што вы не супраць іх; але паміж вамі быў найвялікшы разлад.

О бедныя ламбардцы, заўважце ў імя Бога, што вы пачуеце, што канкарыцыі і албанцы – гэта дзве секты; у Бога адзін верыць добрага, а другі падманнага; ніхто не можа быць такім раздзеленым, і таму кажуць, што крок за крокам адыходзяць ад Хрыста; але не могуць даказаць гэта праз Боскае Пісанне; але лепш могуць даказаць праз старых людзей (якія ёсць у вашай секце) васьмідзесяці гадоў. Але вы, бедныя ламбардцы, не зможаце даказаць, што вам трыццаць шэсць; таму што запісана тысячы разоў у той кнізе, што многія бачылі, што вы былі ў Рымскай Царкве, і выйшлі з беднымі леаністамі, і ўвайшлі ў іх абшчыну, і стварылі сваю абшчыну, і таму вы кажаце, што Царква Божая адраклася шмат гадоў назад ад вас, і вы вярнуліся. Не можа быць, каб вы верылі такой дурасці. Няхай нават Царква Божая калісьці прыйшла ў заняпад. Аднак Гасподзь сказаў Царкве: "Я з вамі ва ўсе дні да сканчэньня веку" (Мф 28:20); такім чынам, не занепадзе да сканчэння веку, і сказаў таму: "Не пакіну вас сіротамі" (Ін 14:18); калі б пакінуў, сталі б сіротамі. О бедныя ламбардцы, Царква Божая па ўсім свеце, і ўвесь свет павінен выратавацца, і гэта даказана; але гэта не вы. Пётр за два дні звярнуў [у каталіцкую веру] восем тысяч чалавек; магчыма, вас і столькі няма...

О ламбардцы, можа быць і я веру, што іўдзеяў было некалькі сотняў, таму што было шэсць сотняў тысяч без жанчын і дзяцей, калі яны выйшлі з Егіпта, і пасля было нашмат больш; з іншага боку, Царква Новага Запавету нашмат большая, чым Царква Старога; і вы кажаце, што вы Царква Новага Запавету; такім чынам, вы можаце бачыць, што вы не Царква Божая. О Бедныя, звярніце ўвагу. Казаў Апостал:

"Ажарсьцьвеньне спасьцігла Ізраіля часткова, да той пары, пакуль ня ўвойдуць многія язычнікі" (Рым 11:25)"; і заўважана, што сказаў: "многія язычнікі", што зроблена было да таго, як памерлі ўсе прапаведнікі першаснай Царквы. Ці не вы тыя многія язычнікі? Хай так. Тады вы не Царква Божая. Акрамя таго, у Апакаліпсісе сказана, што іўдзеяў, які павінны выратавацца, было 1144 (Апак 7:4), што можа быць зразумета – з дасканалых, і адразу ж дадаў: "Я ўбачыў натоўп вялікі, які ніхто не можа палічыць" (Апак 7:9); і кажа, хто з іх можа выратавацца; але што, калі вы незлічоныя? Ці не зараз вы незлічоныя? Падумайце самі. Бо наўрад ці вы не ў Ламбардыі, за выключэннем нямногіх. О бедныя ламбардцы, калі свет прастаіць яшчэ пяцьдзясят тысяч гадоў, то ў той колькасці, у якой вы ёсць, не можаце дасягнуць вышэйназванай колькасці; і адзін чалавек палічыць вас за адзін дзень.

II.xi.a Пра права свецкай улады на забойства

Каб паглядзець на права свецкай улады на забойства, спачатку паглядзім з прыроднага пункту гледжання, адкінуўшы ўсё Пісанне. Без сумневу вядома, што Бог стварыў гэты свет; такім чынам Ён хацеў, каб усё захоўвалася ў такім жа парадку і стане, і стварыў у ім парадак і спосаб выканання; але без свецкага правасуддзя ніякі парадак не зберагаўся; і таму стварыў у ім свецкае правасуддзе; такім чынам яно не грэх. Такім чынам, дрэва пазнаецца па пладах; з наяўнасці свецкага правасуддзя зыходзіць незлічоная колькасць зла; пры яе адсутнасці здараецца тое ж самае; адзін з іх ад Бога, гэта вядома ад праціўнага; такім чынам, свецкае правасуддзе нашмат больш прыемна для Бога, чым яго адсутнасць.

Коратка апісаўшы вобраз права свецкай улады на забойства з прыроднага пункту гледжання, мы зараз, вядома, павінны паглядзець на гэта з пункту гледжання Пісання; і пачнём гаворку з плоцевага ўладарання і падначалення, якія маюць да гэтага дачыненне.

(Д: Заўваж, што казаў Павел: "Кожная душа няхай скараецца вышэйшым уладам; бо няма ўлады не ад Бога; а ўлады, якія існуюць, ад Бога ўстаноўлены" (Рым 13:1), бо ён насамрэч хоча, каб людзі былі падпарадкаваны ўладарам сваім не толькі справай, але і думкамі, адкуль больш: не толькі на вачах у слуг. Супраць беднага з Ліёна, які казаў, што гаворка ідзе пра права свецкай улады на забойства, і ўсхваляецца ўлада гэта паводле хвалы чалавечай, супраць гэтага яўна тое, што не ўсхваляе гэта паводле хвалы чалавечай, але боскай, калі кажа: "скарацца ня толькі з страху перад карай, але і з сумленьня" (Рым 13:5), яшчэ паводле сумлення належыць служыць. Калі б таксама вы казалі, о Ламбардзец ці катар, што аддаў духоўнае пакаранне прэлатам або кіраўнікам, свецкую ж сабе пакінуў: наадварот, улада духоўнага пакарання больш Боская, чым улада свецкага пакарання і г.д. Магчыма, кажа ерэтык: што верныя не выплачваюць належныя падаткі, падаецца, што гэта можа паходзіць з гл. 17 Евангелля ад Мацвея: "цары зямныя з каго бяруць мыта ці падатак? ці з сыноў сваіх, ці з чужых? Кажа Яму Пётр: з чужых. Сказаў яму Ісус: значыцца, сыны свабодныя" (Мф 25–26). [Сцверджанне], што суддзі, якія разбіраюць свецкія справы, павінны прызначацца ў Царкве, узыходзіць да Першага паслання да Карынфянаў, дзе кажа апостал: "Як можа каторы з вас, маючы зыскі да іншага, судзіцца перад бязбожнымі, а ня перад сьвятымі" (1 Кар 6:1). Калі б таксама сказаў, што гэта сказаў Апостал іранічна, наадварот: "Больш чутна і г.д.", дзе сказаў, што гэта павінна разбірацца святымі, якія ніжэй называюцца небаракамі не таму, што яны святыя, а таму, што яны такім чынам пра небаракаў судзілі. Супраць бедных ламбардцаў і бедных леаністаў сказана ў Першым пасланні

Апостала Цімафея: "А мэта ўмаўленьня ёсьць любоў ад чыстага сэрца і добрага сумленьня і некрывадушнай веры" (Ціт 1:5), да таго, што мне даверана. З іншага боку тое, што прапаноўваецца гэтым меркаваннем, так працягваю і пытаюся: Скажы мне, Бядняк, ці дазволена было пакаранне ў Старым Запавеце. Кажа: так. Я пытаюся такім чынам: прадпісанне "не забівай", якое было ў Выхадзе 20:13, было зроблена на ўсе выпадкі ці на асобныя. Кажа: на асобныя. Не было забаронена гэтым прадпісаннем забойства злачынцаў і г. д. Такім чынам я пытаюся, ці грашыў суддзя, здзяйсняючы пакаранне? Кажа: не, наадварот, гэта павінна было быць зроблена. Такім чынам я пытаюся, ці яно такое ж святое і добрае, як у Старым Запавеце. Кажа: не; аднак глядзі, ерэтык, які небяспечны закон, які Апостал прамовіў у Першым пасланні Цімафея і г.д.).

У Святым Пісанні паказана, што пакаранне – гэта добра і ад добрага Бога; але відавочна, што ерэтыкі гэтаму не вераць; таму каталік прыводзіць такія абгрунтаванні, якія просты народ можа пабачыць на свае вочы; людзі, якія ёсць па ўсім свеце...

(Д: Ерэтыкі кажуць, што пакаранне – гэта ад Д'ябла ці ад злога Бога, бо не можа быць таго, каб свецкае пакаранне зыходзіла ад добрага Бога).

Магчыма, кажуць некаторыя, што няверуючыя асабліва падтрымліваюць пакаранні ерэтыкоў. О абаронца Рымскай Царквы, ёсць добрая праца, напісаная для цябе, паводле нашага разумення, бо таму, што ты сказаў пра пакаранне, верым і мы; але, о каталік, ты пачаў доказы з прыроднага пункту погляду без Пісання, і нам яўна паказаў, што пакаранне паходзіць ад усемагутнага Бога Айца. І не былі нязначнымі твае доказы, але даказаў ты таксама праз Пісанне і аўтарытэт, што ёсць больш надзейны шлях ці доказ; і даказаў, але пачаў гаварыць з прыроднага пункту погляду, што дамінаванне і падпарадкаванне ёсць і могуць быць у Царкве Божай, калі уладар уладарыць, а падначалены падпарадкоўваецца; і яшчэ раз паказаў, што свецкае пакаранне належыць Царкве, і павінна быць ад уладароў і магутных, і гэта паводле Новага Запавету; і зноў паказаў, што пакаранне павінна насцігаць не толькі злачынцаў, але і ерэтыкоў; і гэта найвялікшы доказ. Чаму? Таму што ёсць шмат людзей, якія вераць у пакаранне для злачынцаў ад усемагутнага Бога Айца, але не вераць у яго магчымасць для ерэтыкоў; і яшчэ раз паказалі гэта праз пасланне апосталаў да рымлянаў, у якім расказваецца пра пакаранне і якое асвятляе кнігу тваю; пасланне гэта наступнае: "Ня помсьціце за сябе, любасныя, а дайце месца гневу Божаму. Бо напісана: Мне помста, Я адплачу", кажа Гасподзь (Рым 12:19). Але ерэтыкі, і асабліва бедныя леаністы і бедныя ламбардцы, выкладаюць гэта не так, як ты выклаў. Такім чынам, пакажам адну і другую выкладку. Першыя, у такім выпадку, Беднякі: Кажуць Бедныя, о Царква, што ты прапаведуеш і кажаш, што пакаранне павінна быць, і можа здзяйсняецца ўладарамі і магутнымі без граху. Гэта самая лжывая пропаведзь; гэта не дзіўна, таму што ты сама таксама лжывая. О людзі, слухайце, што мы кажам, і вы зможаце спасцігнуць іх дурасць. Кажуць таксама: слаўны Апостал перад рымлянамі: "Ня помсьціце за сябе, любасныя, а дайце месца гневу і г.д." (Рым 12:19). О няшчасная Царква, відавочна, што не мог Апостал сказаць гэтага; што было сказана "Ня помсьціце за сябе" і г.д.; так было сказана: калі хто шкодзіць табе, не асуджай. Чаму? Таму што не ваша мусіць быць помста, а таго, каму павінны. Але каму? Апостал кажа, што Госпаду. І калі зробіць? У дні Суда, калі скажа: "Прыйдзіце да мяне" (Мф 25:41) і г.д. Такім чынам, вы бачыце, о людзі, што ніякія ўладары, ніякія магутныя, ніхто іншы не можа здзяйсняць пакаранне, акрамя Бога, так сказаў. Сціхні ж, о блуд-

ніца-Царква, таму што звязана з гэтым. Гэта – выкладка ерэтыкоў. А зараз будзе бачна выкладку каталікоў...

Магчыма, дагэтуль кажуць, што былі тыя, хто не верылі ў пакаранне, але прыйшлі да веры: О Каталіцкая, пакажы якую-небудзь выкладку ерэтыкоў, якую ерэтыкі распаўсюджваюць сярод сваіх слухачоў, і тады клопаты будуць скончаны. Кажуць, ёсць тыя, хто не верыць у пакаранне: "Вы чулі, што сказана: «Вока за вока, і зуб за зуб». А Я кажу вам не працівіцца злому. Калі хто цябе ўдарыць па правай шчацэ тваёй, падстаў яму і другую; і калі хто захоча судзіцца з табою і ўзяць у цябе кашулю, аддай яму і вопратку". Гэта настаўленне напісана паводле Апостала Мацвея (5:38–40). Тое ж і ў Яна: "нават прыходзіць час, калі кожны, хто забівацьме вас, будзе думаць, што ён тым служыць Богу" (16:2). Яшчэ раз сказаў апостал: "Не давайце панады ні Яўрэям, ні Элінам, ні Царкве Божай" (1 Кар 10:32). І гэты аргумент старанна прыводзяць тыя, хто не верыць, што пакаранне не ёсць і не можа быць ад Бога; і гэтымі ж выкладкамі многія людзі былі спакушаныя. Каталік адказаў...

Праўда, што катары, бедныя з Ліёна і бедныя ламбардцы не вераць у свецкае пакаранне; але ёсць адрозненне паміж катарамі і беднымі; гэта становіцца відавочным, калі паслухаць тое, што ад іх зыходзіць. Кажуць бедныя, што пакаранне было належным у Старым Запавеце, і многія святыя людзі каралі; але кажуць, што Сын Божы забараніў ім у Новым Запавеце; і гэта яны хочуць прывесці як доказ. Катары ж кажуць, што пакаранне ў Старым Запавеце было ад злога бога, і сёння ёсць ад таго ж бога; і гэта яны хочуць прывесці як доказ. (Д: Разгледзім спачатку доказ Бедных. Бо кажуць Бедныя: Хто слухае, той пачуе: Паводле Мацвея, Хрыстос казаў: "Вы чулі, што сказана продкам" і г.д. (Мф 5). З гэтага ты можаш ясна ўбачыць, што пакаранне было дазволена ў Старым Запавеце. Зараз вы пабачыце, як Сын Божы забараніў гэта, кажучы: "А Я кажу вам" і. г.д. (Мф 5). Такім чынам, як можаш ты, о праклятая Царква, прапаведаваць, што павінна быць пакаранне ў Царкве Божай? Дык сціхні ж, звер дзікі. А зараз глянем на доказ катараў: яны ж кажуць: "Вы чулі, што сказана продкам" і г.д. (Мф 5), гэта закон, дадзены злым богам, які Сын Божы з намерам перадаў праклятай Царкве). Але з гэтым стасуецца тое, што пакаранне – гэта не добра, і ў гэтым яны супраць Царквы; кажучы наступнае: "А Я кажу вам не працівіцца злому. Калі хто цябе ўдарыць па правай шчацэ тваёй, падстаў яму і другую" (Мф 5:39). А таксама наступнае: "і калі хто захоча судзіцца з табою і ўзяць у цябе кашулю, аддай яму і вопратку" (Мф 5:40). О Царква гэтага свету, ці трымаешся ты таго парадку, якому вучыў Хрыстос? Ніколькі. О людзі, заўважайце ж пільна тое, што вы слухаеце, і, слухаючы, аддзяляйцеся ад блудніцы; такім чынам вы ўбачыце, як добра яна трымаецца запавету Хрыста. Прэлаты гэтай Царквы прыкладаюць намаганні і працуюць, колькі могуць для таго, каб выкладзена было ў Статутах гарадоў, што рознымі пакутамі павінны катавацца тыя людзі, якія імі самімі называюцца ерэтыкамі; і калі гарадская абшчына не хоча гэтага рабіць, то змагаюцца з імі, кажучы: "Мы вас адлучым". І варта рабіць так, як загадана; і калі яны [гарадскія ўлады] гэтага не робяць, яны [прэлаты] не прамаўляюць ні імшаў, ні якіх-небудзь іншых сваіх падманаў; і ў гэтым абшчына неразумная і працягвае дурасць сваю. О народ, паглядзіце, як яны іх забіваюць; бо тыя не хочуць ні быць судзімымі, ні быць разбэшчанымі, ні есці мяса і г.д. Але на тых, хто мае меч на баку, распуснічае і забівае, не дзейнічаюць іх выкладкі. О Рымская Царква, твае рукі ўсе ў крыві пакутнікаў. О народ, не захапляйся ўсім, што сказана; бо кожны сам вызначае меру маёмасці сваёй; бацькі іх забілі Хрыста, Стэфана і Якуба, а іншых вуч-

няў катавалі рознымі пакутамі. Вы таксама можаце бачыць, што яны самі добра трымаюцца ерасі; не дзіўна, бо Хрыстос сказаў праз Яна: "нават прыходзіць час, калі кожны, хто забіваць вас, будзе думаць, што ён тым служыць Богу" (Ін 16:2). Цалкам можа быць, што хто-небудзь па дурасці сваёй, калі будуць забіваць яго, будзе лічыць сябе пакутнікам, бо гэтым ён служыць Богу. О Царква, такім чынам маю цябе пад капытамі. (Д: І яшчэ раз сказаў апостал: "Не давайце панады ні Яўрэям, ні Элінам, ні Царкве Божай" (1 Кар 10:32). О людзі, бачыце, ці трымаецца Царква зараз парадку; ні ў якім разе. О людзі, зараз вы добра бачыце, што павінны быць аддзеленыя ад гэтага дзікага звера? Таму просім вас, што вы павінны аддзяліцца з дапамогай Рымскай Царквы; капыты звязаныя, і з-за гэтага анямела Рымская Царква).

II.xi.b Пра тое, што каралі, уладары і магутныя свецкія, або мірскія, ад добрага Бога, а не ад Д'ябла...

Але ерэтыкі, і асабліва бедныя леаністы і ламбардцы, хочуць спаслацца на іх, бо кажуць пра іх словы (Д: "цары валадараць над народамі і ўлады іх дабрадзеямі называюцца; а вы ня так" (Лк 22:25–26)), яўна паказваючы, што ні каралёў, ні магутных не павінна быць у Царкве Божай; і гэта хочуць прывесці як доказы. Адсюль кажуць, што ні каралі, ні магутныя не пастаўлены Богам, наадварот, яны супраць Бога; і кожны раз, калі яны здзяйсняюць пакаранне, яны смяротна грашаць, бо яны пастаўлены светам, тым светам, які супраць Бога, гэта значыць, зямным. Адсюль кажуць: "ідзе князь сьвету гэтага, ды ня мае ўлады нада Мною" (Ін 14:30). Гэтым яны кажуць, што тыя ўладары, якія пастаўлены над ёй, падпарадкаваны большаму ўладару, гэта значыць д'яблу. Але каталік сказаў...

(Д: Магчыма, кажуць ерэтыкі, а больш Бедныя: адкажы мне, калі зможаш, бо мы так звяжам язык твой, што ты не зможаш запярэчыць. Напісана ў Мацвея і Лукі, што была спрэчка між апосталамі, хто між імі быў галоўны; Хрыстос, даведаўшыся, што яны памыляюцца, адразу цвёрда сказаў: цары валадараць над народамі і ўлады іх дабрадзеямі называюцца; а вы ня так" (Лк 22:25–26), такім чынам, мы відавочна маем, што ні каралёў, ні ўладароў не павінна быць у Царкве Божай. Запытайся ж цяпер, о неразумны, чаму ты пераследуеш Царкву Божую? Ты можаш добра ўразумець, калі маеш розум, што ты неразумны; і такім чынам можаш убачыць, што гэтыя пакаранні не ад Бога. О няшчасныя Бедныя ерэтыкі, калі б Бог не паставіў магутных для суду, разбору і пакарання злачынцаў, як бы паставіў іх? кажа амаль ні пра што, бо лжывы).

II.xi.c Пра клятву

Пра клятву кажа Каталік, што яна павінна і можа быць паводле волі Божай; і хоча сказаць пра гэта, а менавіта пра клятву, да гэтага, што хто верыць, той не грашыць, і хто вагаецца, няхай будзе ўпэўнены, і хто не верыць, пяройдзе няхай да сумневу, і ад сумневу да ўпэўненасці; і да гэтага прыводзяць добра падабраныя аргументы так, што ўбогім будзе той, хто не зможа ў гэта паверыць; але папярэдне хоча сказаць такую рэч, што калі раптам каму-небудзь не ясна, то стане ясна пасля таго, як ён ізноў звернецца да клятвы "сьпявайце Яму на дзесяціструннай псалтыры" (Пс 32:2). Гэта словы Святога Пісання, словы прарока Давіда; я кажу іх, калі пачынаю гаварыць, і кажу, калі заканчваю, на лаціне і на народнай мове; і падаец-

ца, што гэта немнагаслоўна. Але ва ўсёй Бібліі, гэта значыць, у Новым Запавеце і ў Старым, няма слоў ні больш таемных, ні больш зразумелых; таму што ў гэтых дзесяці струнах заключаная ўся мудрасць Святога Пісання; і хто ўмее жыць у згодзе з дзесяццю струнамі псалтыра, жыве ў згодзе з усімі Святымі Старонкамі... Такім чынам, яны – сапраўдныя настаўнікі. Вы ж павінны адказаць: "Тыя, хто дакранаецца да ўсіх дзесяці і жыве ў згодзе з імі". Тыя, хто трымаецца толькі пяці струн, былі яўрэі, якія трымаліся толькі Старога Запавету. А чаму трымаліся толькі Старога Запавету? Таму што вераць, што той, хто падаў Новы Запавет, – падманшчык, і з гэтай прычыны не ўмеюць трымацца дзесяці струнаў. Тыя ж, хто трымаецца іншых пяці, – гэта катары, і гэта Новы Запавет, бо яны вераць і прапаведуюць, што Стары дадзены падманшчыкам, а менавіта Д'яблам; і яны не ўмеюць жыць у згодзе з дзесяццю струнамі, таму што ў іх зблытана новае са старым. На гэты конт напісана ў Езэкііля: "быццам кола было ў коле" (Ез 1:16). Іншыя ж, якія трымаюцца і адных пяці, і другіх, – бедныя з Ліёна і бедныя ламбардцы, і іншыя, якія не ўмеюць і не могуць жыць у згодзе, не настаўнікі. Тая ж, хто трымаецца ўсяго без нязгоды, – гэта Рымская Царква.

Заўважце, што Рымская Царква ўмее жыць у згодзе з імі; і паколькі яна гэта ўмее, яна спасцігла, што дазволена людзям, а што не дазволена. Адгэтуль яна з усёй відавочнасцю спасцігла, што людзям дазволена даваць клятву ў выпадку ці выпадках неабходнасці; гэта тады, калі спрэчкі, калі Царква Божая становіцца паміж чалавекам і чалавекам, праз клятву абвяргаюцца і сканчваюцца, выяўляючы ісціну і папіраючы падман... О ерэтыкі, бедныя ламбардцы і леаністы прапаведуюць і вераць, што клятва павінна была і магла быць у Старым Запавеце, таму што гэтаму вучыў сам Бог; і парушэнне клятвы было забаронена; але ў Новым Запавеце Сын Божы забараніў, а менавіта што ніхто ні ў якім выпадку не можа клясціся без смяротнага граху. Таксама і іншыя ерэтыкі, якія называюцца катарамі; калі ж яны даведваюцца па клятву, кажуць, што клятва забаронена толькі ў Царкве, і яны хрысціяне; для тых жа, хто па-за Царквой, не забаронена ні клясціся, ні парушаць клятву, ні забіваць, таму што ад гэтага яны не стануць ні лепшымі, ні горшымі перад Богам; але калі парушаюць клятву, распачынаецца сапраўдны скандал. І таму прапаведуюць Канкарыцыі, што ўсе асуджаныя мець будуць сваю кару; і таму, калі хто знаходзіцца па-за Царквой, робіць усё што хоча, і яму не шкодзіць распуста і не прыносіць карысці мірапамазанне, таму што кожнаму прызначана сваё пакаранне...

(Д: Катары не пагаджаюцца ў гэтым (палажэнні пра клятву) з Беднымі. Такім чынам бачна, што між імі ёсць адрозненне. Кажуць катары: "чулі вы, што сказана продкам і г.д." (Мф 5:33). Гэты закон быў дадзены або падманшчыкам, або злым Богам; той жа, хто вядомы як Сын Божы, даў насуперак іншы закон Царкве Божай. Адтуль вынікае: "гэта я кажу вам і г.д." (Мф 5:34–37) Гэтым ён дае зразумець, што тыя, хто клянецца, робяць зло, а не цуд, таму што знаходзяцца пад кіраўніцтвам злога Бога, і такім чынам Сын Божы даў ім насуперак іншы закон).

Каталік адказвае збольшага супраць Бедных: О Бедныя, вы яшчэ большае дзіва, чым катары, бо верыце ў Стары Запавет і ў Новы; калі вы верыце, што Стары Запавет ад добрага Бога, якім чынам можаце вы верыць, што "не парушай клятвы, а выконвай перад Госпадам клятвы твае" (Мф 5:33) анулявана ў Царкве? Гэта незвычайнае глупства. Чаму вы верыце "не парушайце клятвы" і г.д., ёсць прадпісанне фігуратыўнае і цьмянае? Няхай будзе так; але гэта, наадварот, прадпісанне,

якое выказаў Бог; гэтага маральнага прадпісання павінны прытрымлівацца і прытрымліваюцца ў Царкве Божай...

Магчыма, кажуць катары: Добра, скажу, што Бог кляўся і што ёсць наказ людзям, што Бог кляўся; але пра якога Бога ты гэта спасціг? Мы не спазнаём ілжывага Бога, які быў у Старым Запавеце; і таму людзі маюць яго сведчанне пра гэта; тыя людзі, кажу я, падпарадкоўваюцца Царкве зла... Мы відавочна выявілі, што Бог кляўся ў Старым Запавеце. Такім чынам, мы хочам выявіць, добра спасцігаючы, што Хрыстос кляўся ў Новым...

II.xi.d Падзел палоў

... і таму вы дагэтуль аддзяляеце мужа ад жонкі супраць волі мужа, і наадварот. Адкуль вы кажаце, што можаце рабіць гэта згодна са словамі Евангелля ад Мацвея: "і кожны, хто пакіне дамы, альбо братоў, альбо сёстраў, альбо бацьку, альбо маці, альбо жонку, альбо дзяцей, альбо землі дзеля імя Майго, атрымае ў сто разоў больш і ўспадкуе жыццё вечнае" (Мф 19:29); і таму ты можаш бачыць, што той, хто пакінуў жонку, багацце вялікае займее; і таму, калі мы прапаведуем, што муж аддзяляе сябе ад жонкі, і наадварот, гэта добрая справа; і таму чаму ты нас ушчуваеш? Змоўкні. Каталік адказаў: о бедныя ламбардцы, вы лічыце, што спасцігаецца толькі з напісанага і што гэта было пра вас. Чаму? Таму што вы маеце дом і зямлю. О ерэтыкі, заўважце: Апостал добра зразумеў Хрыста і разабраўся ў шлюбе лепш за ўсіх іншых; і не згаджаецца з вамі, што жанчына можа аддзяліцца ад мужа без узаемнага жадання...

(Д: О бедныя ламбардцы і бедныя леаністы, вы добра можаце ўбачыць, што не ўсё гэта спасцігаецца толькі напісаным і г.д.).

II.xi.e Традуцыянізм[68]

Таксама вы кажаце, што плоць пайшла ад плоці і дух ад духа...

Вы асуджаеце шматлікія памылкі ерэтыкоў, напрыклад, што мы маем пачуцці ад душы ці ад духа. Кажуць бедныя ламбардцы: Верым, што дух паходзіць ад духа і плоць ад плоці; і гэта адбываецца падчас сувязі паміж мужчынам і жанчынай; слухайце, бо гэта ісціна. Кажа Сын Божы паводле паслання ад Яна: "народжанае ад плоці ёсьць плоць, а народжанае ад Духа ёсьць дух" (Ін 3:6). Такім чынам, ты можаш убачыць, што мы згодныя з Сынам Божым; дык маўчы і няхай не ўзнікне ў цябе жадання пярэчыць гэтаму. Адказвае каталік... О бедныя ламбардцы, настаўнікі цвёрда не згодны з вамі, яны кажуць, што не можа нараджацца дух ад духа і г.д. Слухайце, што сказаў Хрыстос пра ўрачоў: "не здаровыя маюць патрэбу ў лекары, а хворыя" (Лк 5:31). Фізічнае не супярэчыць боскаму; даказана тое, што вы не можаце даказаць праз Боскае Пісанне тое, што вы кажаце; ні вы, ні мы, у што трэба верыць, ці нам, ці іншым? Ні нам, ні іншым. Чаму? Таму што ўжо даўно медыкі праводзілі вопыты, і таму што яны гэта даказалі; што, калі жанчына нараджае жывое дзіця, такім яго і знаходзяць; а калі мёртвае, гэта значыць, без душы, знаходзяць яго мёртвым; і калі цела яшчэ не сфарміравалася, знаходзяць; такім чынам, да іх больш веры, чым да астатніх людзей. Гэтага доказу дастаткова для ўсіх людзей вучоных; калі ж для якога-небудзь дурнога ерэтыка недастаткова, тады каталік

[68] Традуцыянізм – канцэпцыя Цертуліяна, што душа дзіцяці фарміруецца з душаў бацькоў: супярэчыць крэацыянізму, што душа дзіцяці ствараецца Богам.

скажа як-небудзь па-іншаму. Для шчырага каталіка не відавочна верыць у тое, што дух ад духа, а душа ад душы сыходзіць падчас сувязі мужчын з жанчынамі. Чаму? Таму што з гэтага вынікае, што семя духа мужчыны і жанчыны змешваецца з семем іх плоцей, ці семя духа знаходзіцца з аднаго боку, а семя плоці – з іншага; калі гэта так, то дзіця не выжыве; такім чынам, мы бачым, што неразумна верыць у гэта. З іншага боку, вы бачыце пастаянна, як злучаюцца цялесна мужчына з жанчынай, і не толькі калі дзяцей робяць; і таму, калі б дух паходзіў ад духа, тады б дух у нішто сыходзіў або цела; а гэта няпраўда; таму дух, або душа, або чалавек, што адно і тое ж, ёсць унутры, з чаго яны створаны, і з'яўляюцца як быццам бы Богам, таму што яны ёсць заўсёды... Такім жа чынам жанчына ў сувязі можа нарадзіць сем сыноў; такім чынам яны прымаюць ад бацькі і маці сем душаў, як і прымаюць сем целаў; такім жа чынам душа аддзяляецца ад душы, як плоць ад плоці; такім чынам пашкоджваецца і душа, і цела: і таму яна можа знікаць, і ўзнікаць, і пашкоджвацца, як і цела; а гэта няпраўда... О няшчасныя ерэтыкі, вы верыце, што ў гэтай сувязі, калі павінна сфарміравацца цела, менавіта ў гэты момант цела фарміруецца? Няхай будзе так. Але калі ў гэты час заглянеце ў лона жанчыны, там не будзе знаходзіцца ніякага цела; і стане ясна, што цела, якое фарміруецца, – гэта чаша, і ў чашы схаваны скарб; душа – гэта скарб, а цела – гэта чаша... О бедныя ламбардцы, канкарыцыі спачатку верылі ў гэта, а потым Вы; таму што першымі былі ерэтыкі, якія па-за Царквой, а потым Вы. Вы маглі б чуць, што спачатку была сфарміравана чаша з зямлі, і пасля змясціў у яе Бог скарб свой, а гэта значыць, каштоўную душу, і з дапамогай Бога ажыло цела. Чаму Бог спачатку стварыў чашу, а пасля змясціў у яе скарб? Таму што таго патрабуе закон прыроды, што спачатку ствараецца чаша і поласць, а потым туды змяшчаецца скарб; і таму няма сумневу, што спачатку чаша, гэта значыць, цела, якое фарміруецца ва ўлонні маці, а потым у ім душа. Ясна і даказана, і даказваецца кожны дзень, што цела не фарміруецца ва ўлонні маці за 60 дзён; калі ж ад пашкоджання ці яшчэ па якой-небудзь прычыне, калі жанчыне давядзецца нарадзіць, дзіцёнка, які нарадзіўся раней за 60 дзён, знаходзяць не цалкам сфарміраваным... Як можа Бог даць жыццё ў падарунак, калі ён часовы? Не можа; таму што дае толькі той, хто мае. Але калі ён гэтага не мае, то хто дае? Так павінна быць спасцігнута: чалавек знешні, які без жыцця знаходзіцца ў целе жанчыны, гэта значыць, без душы; чалавек фарміруецца і ствараецца на сорак шосты дзень, тады, калі Бог дае яму жыццё; бо жыццё ёсць душа, якую даюць яму, калі цела ажывае; і такім чынам Бог дае ўсім жыццё; такім чынам, ясным становіцца пытанне, якое трэба было спасцігнуць, бо Гасподзь вывеў усіх людзей ад Адама цялесна, каб яны распаўсюдзіліся па ўсёй зямлі, з душой, якую Бог перадае, якая ёсць жыццё людское. О бедныя ламбардцы, о канкарыцыі, выглядае дзіўна з вашага боку, бо верыце вы, што душа паходзіць ад душы, як плоць ад плоці. Душа бессмяротная, плоць жа смяротная. Чаму ж душа бессмяротная, а цела смяротнае? Таму што душа не складаецца з частак, яе немагчыма падзяліць, яна не ўзнікае і не знікае, і таму яна бессмяротная; таму што, калі б мы маглі яе падзяліць, яна была б смяротнай, як цела, ці плоць. Цела – гэта не тое самае, што душа, таму што цела складаецца з 4-х элементаў і можа быць падзелена, яно ўзнікае, падзяляецца на часткі і знікае, і таму яно смяротнае і павінна памерці, а душа – не. Магчыма, скажуць Канкарыцыі: як ад адной свечкі можна запаліць іншую і не падзеліцца агонь, так з адной душы зыходзіць іншая, і душа заўсёды застаецца. Я адказваю: гэта падабенства не падыходзіць, таму што адна запаленая свечка не запаліць іншую запаленую; з гэтага вынікае, што адну, згаслую, трэба запаліць аб іншую.

Калі душа мужчыны і душа жанчыны жывыя, не могуць адна адну запаліць; і таму неабходна, каб адна з іх была мёртвая, ці мужчынская, ці жаночая; а гэтага не можа быць. Ясна, што жанчына можа мець сем сыноў, і значыць, яна можа мець сем душаў; а значыць, неабходна, каб гэтыя сем душаў былі мёртвымі, калі яны маглі запаліцца ад іншых дзвюх душаў, а менавіта ад мужчынскай і жаночай, як свечка мёртвая або згаслая павінна быць запалена ад жывой; а казаць так бязбожна[69].

II.xii Пётр Пакутнік. Супраць патарэнаў

Пётр нарадзіўся ў Вероне ў катарскай сям'і, але пасля сканчэння Балонскага ўніверсітэта ўступіў у ордэн дамініканцаў і стаў адным з самых эфектыўных інквізітараў, прапаведнікаў і арганізатараў барацьбы з ерэтыкамі, перш за ўсё – з катарамі, у Ламбардыі другой чвэрці XIII ст. На аснове некаторых прац сваіх папярэднікаў і ўласнага вопыту ў 1235–1240 гг. напісаў палемічны твор "Супраць патарэнаў[70]" (Contra patarenos). У 1252 г. быў забіты (ерэтыкамі або па палітычных прычынах з-за сваёй актыўнай дзейнасці[71]), у выніку чаго атрымаў мянушку "Пакутнік" і быў кананізаваны Рымскай Царквой.

1. ... [спераністы] існавалі ў адзін і той жа час з беднымі леаністамі і былі супрацьлеглага ім ладу жыцця, бо леаністы жывуць без маёмасці і на міласціну і без жонак...

2. Пра бедных леаністаў, якія іх уласныя памылкі.

Далей пра бедных леаністаў, якія іх уласныя памылкі, а менавіта што любому добраму чалавеку можна праводзіць і даваць таінствы, і што ніхто не зможа выратавацца з маёмасцю ці з мірской працай, ні ўступаючы ў цялесныя сувязі ў шлюбе, і гэтымі памылкамі з нядаўняй пары яны ахопленыя. Ужо амаль 60 гадоў, як гэта ерась распаўсюдзілася, якае мае паходжанне ад нейкага па імені Вальдэс (Gualdese) з горада Ліёна (Lugdune) над Рэйнам, адтуль і яны называюцца ліёнцамі (lugdunenses) ці леаністамі (leoniste). І гэтыя бедныя леаністы пачаліся ўнутры Рымскай Царквы, але пасля з-за пыхі ўпалі ў непадпарадкаванне, і былі адлучаныя, і ўпалі ў шматлікія памылкі і пасля гэтага падзяліліся на дзве часткі. І адна была заснаваная вышэйназваным ерэсіярхам Вальдэсам, а другая ж – нейкім Янам з Ронкарола, які быў з П'ячэнцы; і першыя называліся беднымі з-за гор (ultramontani), іншыя ж нарачоныя ламбардцамі, і паміж імі існуе розніца. Ультрамантаны сапраўды вераць, што ў Рымскай Царкве ёсць шмат добрых людзей і што дрэнны прэлат або святар выконвае свае абавязкі, чаму ламбардцы пярэчаць. Ламбардцы пасля таксама падзяліліся на дзве часткі, наконт чаго на Міланскай зямлі адбыўся сабор, выпадкова вялікі кубак, поўны віна, апырскаў нейкую курыцу, якую вышэйназваны Ян прынёс у ахвяру згодна са сваім звычаем, і іх жанчыны растапталі яе пад сваімі нагамі. Некаторыя, якія гэта самі бачылі, казалі ў абурэнні, што ніхто не можа асвячаць Цела і Кроў Хрыстову, акрамя як святары, прызначаныя Рымскай Царквой; і гэтыя пазваныя былі тыя з поля, якое цалкам знішчана.

---

[69] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 62–78; Ilarino da Milano, "Il «Liber supra Stella» del piacentino Salvo Burci contro i catari e altre correnti ereticali," *Aevum* 17, no. 1/2 (n.d.): pp. 90–146; Ilarino da Milano, "Il «Liber supra Stella»," *Aevum* 19, 281–341.

[70] Маецца на ўвазе "катараў".

[71] Merlo, "Pietro da Verona – San Pietro martire." 478–488.

Адныя з тых бедных леаністаў, як з ультрамантанаў, так і з ламбардцаў, якія калісьці з Бернардам Прымам былі перавернутыя ў каталіцкую веру і сталі называцца бедныя зноў далучаныя. Але пасля, угавораныя найвышэйшым пантыфікам, далучыліся да царкоўных [манаскіх] ордэнаў. Ад гэтага некаторыя з іх захаваліся ў нашым ордэне да сённяшняга дня, а іншыя спачылі ў Госпадзе.

Вышэйназваныя ж ерэтыкі маюць агульныя памылкі з тымі, пра каго мы кажам ніжэй у трэцяй кнізе, дзе гаворка ідзе пра Рымскую Царкву, і пра клятву, і пра ўладу, і гэтак далей. У гэтым трактаце мы асуджаем іх уласныя памылкі, а менавіта тыя тры, што мы перш выклалі, а чацвёртая ж, а менавіта пра шлюб, ужо асуджаная ў першай кнізе[72].

II.xiii Манета з Крэмоны. Супраць Катараў і Вальдэнсаў

Манета з Крэмоны быў прафесарам філасофіі ў Балоньі і членам ордэна дамініканцаў, а таксама інквізітарам у Ламбардыі. Палемічны трактат "Супраць Катараў і Вальдэнсаў" (Adversus Catharos et Valdenses) ён напісаў у 1244 г. часткова на аснове прац папярэднікаў, часткова на ўласным інквізітарскім досведзе[73]. Ніжэй прыводзяцца вытрымкі з пятай часткі кнігі.

I. Хто такая Рымская Царква; і як ерэтыкі даказваюць, што Рымская Царква не Царква Божая

Да нянавісці ж да Рымскай Царквы ерэтык прыйшоў [пад уплывам] Апакаліпсіса 17:3, дзе Ян кажа, што ўбачыў "жанчыну, якая сядзела на зьверы барвовым, поўным назоваў богазьняважлівых" ... супраць Каталіцкай Царквы ў сказанае вераць як катары, так і леаністы; лічаць Рымскую не толькі зверам, але і жанчынай...

ID. Спецыяльны доказ, што Бедныя Ліёнцы не з'яўляюцца Божай Царквой

Даказваючы, што сукупнасць катараў не Божая Царква, мы даказваем, што сукупнасць бедных з Ліёна не Божая Царква; гэта даказваецца праз тое [месца] II Пятра 2:1, дзе напісана пра лжэнастаўнікаў: "якія ўвядуць згубныя ерасі"; і ёсць адзін знак, па якім вядома, дзе сказана ў радку 10 "пагарджаюць уладамі"; яны адмаўляюць, што свецкае пакаранне можа накладацца тымі, хто існуе ўнутры Царквы, і сказаным яны намагаюцца сказаць, што такім чынам у Царквы не павінна быць свецкай улады, а менавіта імператарскай улады, і каралеўскай, і гэтак далей. Калі яшчэ хацелі сказаць, што сказаў Пётр наконт духоўнай улады, ты кажаш, што гэтага быць не можа, гэта і ёсць спрэчка паміж мной і табой, хто ёсць той, хто пагарджае духоўнай уладай; такім чынам, гэта не знак, па якім можна пазнаць ілжэнастаўнікаў, знак жа павінен быць аб'яўлены, і знак аб'яўлены, калі Пётр казаў пра духоўную ўладу; адпаведна, калі б той меў намер змясціць знак, які б быў вызнаны ерэтыкамі, ён бы казаў пра свецкую ўладу. Паколькі ж такія ўладныя паўнамоцтвы могуць быць унутры Царквы і павінны быць, як вынікае з гэтых слоў Святога Пятра, і з гэтых слоў да Яўрэяў верш 8, як гэта стане ясна з 13 главы гэтай часткі.

---

[72] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 79–82.

[73] Lucy J. Sackville, "The Textbook Heretic: Moneta of Cremona's Cathars," in *Cathars in Question* (Woodbridge: York Medieval Press, 2016), pp. 208–228, 219–220.

Другім спосабам гэта можна выявіць, калі паразважаць пра іх паходжанне, бо прайшло не так шмат часу, калі яны з'явіліся, паколькі, як відаць, свой пачатак яны вядуць ад Вальдэса (Valdesio), ліёнскага гараджаніна, які стаў на гэты шлях не болей як 80 гадоў таму, а калі і болей, то ці не нашмат, ці іх было мала; такім чынам, яны не паслядоўнікі першаснай Царквы; такім чынам, яна не Царква Божая. Калі ж кажуць, што яны былі на гэтай дарозе да Вальдэса, то хай дадуць гэтаму доказы, чаго яны ніяк зрабіць не могуць.

Трэцяе, праз адпушчэнне грахоў можа быць даказана, што іх аб'яднанне не Божая Царква, такім чынам: Вы паходзіце ад Вальдэса, а скажыце, адкуль ён сам пайшоў; вядома, што Рымская Царква ні ад кога іншага, як ад Папы; такім чынам, Папа – адзіны спадчыннік Першаснай Царквы. Калі ж кажуць, што не ад Папы; для чаго ж тады прыйшоў да Папы? І абяцаў служыць чатыром Айцам Царквы, а менавіта Амвросію, Аўгусціну, Грыгорыю і Іераніму, і так атрымаў ад Папы права пропаведзі, доказы чаму можна лёгка знайсці. Калі ж кажуць, што паходзяць ад Бога і ад апосталаў, а таксама ад Евангелля. Супраць: Сам не карыстаецца, акрамя як праз Міністра, адтуль (Ін 20:23) "каму даруеце грахі, таму даруюцца". Такім чынам, калі адпускаў Вальдэс, то праз міністраў[74] адпускаў; але скажы мне, праз якога Міністра яму адпушчана?

Далей, тое, што няма адпушчэння, акрамя як праз Міністраў, ясна з Дзн 9:11 і далей, дзе Павел быў пасланы Ананіем; але чаму ён даслаў яго да яго, акрамя як каб даказаць, што не хоча разбурыць воблік сваёй Царквы, але трымацца таго, што было сказана: "каму даруеце грахі, таму даруюцца".

...

Чацвёрты спосаб даказаць тое самае праз царкоўныя чыны, якіх прызнана як мінімум тры, а менавіта біскупства, прэсвітарыят і дэканат, без гэтых трох чыноў не можа быць Божай Царквы, і не павінна быць, як самі сцвярджаюць; Тады мы ім кажам: Калі Божай Царквы не можа быць без гэтых чыноў, а ваша акурат узнікла без іх; такім чынам, яна не Царква Божая. Калі ж скажа, што наша Царква таксама мае гэтыя чыны, якія павінна мець, то дзе ж ваш Біскуп? Калі скажуць, што вунь той чалавек; скажыце, хто яго рукапаклаў? Калі скажуць, што вунь той, то хто рукапаклаў яго самога, і так па сыходзячай дойдуць ажно да Вальдэса; пасля гэтага трэба запытацца, а ён сам адкуль рукапакладанне мае? Калі скажуць, што ад сябе самога ... Вальдэс жа, калі сам ад сябе рукапакладанне мае, праслаўляе самога сябе, як калі б быў Пантыфікам; але такім чынам ён з'яўляецца Антыхрыстам, ворагам Хрысту і яго Царкве. Калі кажуць, што атрымаў рукапакладанне проста ад Бога, то гэта не могуць даказаць ніякім сведчаннем з Пісання; па той жа прычыне любы іншы чалавек, які прыкідваецца, што вядзе добрае жыццё, можа так сказаць, і так секта прыходзіць да пагібелі.

Далей, пра гэта сярод іх не адзначана.

Далей, калі ён захоча сказаць, што рукапакладзены Богам, хоць гэта і не запісана; акрамя як ты скажаш, што Першасвятар[75] Мелхіседэк быў, аднак пра яго пасвячэнне Пісанне нічога не кажа.

Супраць: Як найменш яно кажа, што быў Першасвятаром; а пра Вальдэса ж гэтага ніхто не кажа; адпаведна, ён не падобны ні да таго, ні да гэтага.

---

[74] Слова дадзена ў транслітарацыі без перакладу. Маецца на ўвазе – праз службовых асоб, пасярэднікаў.

[75] Тэрміны "Першасвятар" і "Пантыфік" тут ужываюцца як узаемазамяняльныя.

...

Вядома таксама, што некаторыя кажуць, што Вальдэс меў рукапакладанне ад сукупнасці сваіх братоў. Галоўным аўтарам з тых, хто так кажа, з'яўляецца ерэсіярх бедных ламбардцаў, вычварны доктар, па імені Томас; гэта ж даказаць спрабуюць так: Любы з іх задзіночання можа даць Вальдэсу сваё права, а менавіта кіраваць сабой, і так усё задзіночанне можа гэта засведчыць, і Вальдэс атрымае сукупнае кіраванне над усімі, і так свайго ўласнага Пантыфіка і Прэлата. Калі ж ерэсіярх усвядоміў бы, наколькі гэта па-дурному, ён бы не дазволіў гэтаму сыходзіць з яго вуснаў; бо ўсе Пантыфікаты – гэта кіраўніцтва, але не любое кіраўніцтва – пантыфікат, такім чынам адсюль вынікае: ці маглі яму даць кіраўніцтва яго; а значыць, Пантыфікат? Нічога не варта, я магу табе даць што-небудзь; такім чынам, гэта што? Не варта.

...

Пятае, як даказваецца, што яны не Божая Царква, праз адсутнасць пропаведзяў: як было ўжо ясна паказана, для чаго яшчэ патрэбныя чыны, і гэта таксама можна даказаць, што патрэбныя для служэння пра пропаведзь, згодна з гэтымі словамі Апостала да Рымлянаў (10:15): "як прапаведаваць, калі ня будзе пасланых?", самі ж яны не могуць даказаць, што пасланыя кім-небудзь з тых, хто мае права пасылаць. Мы дайшлі да апошняга, да Вальдэса, які быў іх першым; у якога не было кім быць пасланым, акрамя як Папам. Такім чынам, яны не Божая Царква, якая мае чыны і служэнне праз пропаведзь, бо яны не маюць ні таго, ні другога.

...

Шосты спосаб, якім можна гэта даказаць, гэта праз выхад катараў з Царквы; пра гэта ж было сказана Апосталам (1 Цім 4:1) "Дух жа ясна кажа, што апошнім часам адступяцца некаторыя ад веры, слухаючы духаў спакусьнікаў і вучэньняў дэманскіх". І тады я пытаюся: Хто ж тады тыя, хто адступіўся ад веры, калі не катары, якія прапаведуюць, што не варта ўступаць у шлюб і трэба ўстрымлівацца ад ежы, якую Бог стварыў; вядома, што ніхто іншы, як яны. Такім чынам я пытаюся ў цябе: ці не ад цябе адступілі? Ты кажаш так.

Супраць: Нічога такога з табой не было, што б ты змог даказаць нейкім сведчаннем: я ж табе відавочна даказваю, што яны выйшлі з Рымскай Царквы; усе былі ў Рымскай Царкве, або амаль усе; такім чынам, тваё задзіночанне не Божая Царква, але толькі задзіночанне Рымскай Царквы. Магчыма яны скажуць, што катары хай нават выйшлі не ад нас, аднак ад нашай веры выйшлі, Апостал таксама сказаў, што яны адступіліся не ад каго-небудзь, а ад веры, якая, як яны самі кажуць, ёсць і ў Рымскай Царкве, і ў задзіночанні Вальдэса, можа быць спазнана па ўчынках.

...

Сёмае, праз што можна даказаць, гэта тое, што ерасі ўвогуле зыходзяць з Царквы;

...

... Божая Царква, якая заняпала, як кажуць, у часы Сільвестра...

...

Восьмае, гэта можна даказаць праз параўнанне па колькасці Царквы Старога Запавету з Царквой Новага Запавету. Вядома ж, што Царква Новага Запавету павінна быць большай, чым Царква Старога Запавету, інакш Хрыстос здзейсніў злачынства.

... Твая ж Царква, о Вальдэнс, не большая, чым Царква Старога Запавету; такім чынам, твая Царква не Божая, а мая Царква – так, бо мае больш веры ў Хрыста.

...

Дзявятае, гэта ж можна даказаць праз усеагульнасць вучэння Рымскай Царквы ... твая Царква не прапаведуе па ўсім свеце ці ўсім народам, ці амаль усім, а менавіта язычнікам і яўрэям, але толькі Рымская Царква прапаведуе па цэлым свеце...

D. Доказ супраць Вальдэнсаў Ультрамантанаў

Вальдэнсы Ультрамантаны, якія прызнаюць, што Рымская Царква мае сем таінстваў, якія ад нас іх прымаюць, калі мы пажадаем ім іх даць, і вераць, што мы іх выканаем належным чынам. Могуць супрацьпастаўляць такое: Рымская Царква ніяк не Царква Божая? Так.

...

Дзясятае таксама даказваецца праз таго ж Мацвея (22:9–16) ... Гэтым мы хочам даказаць два тэзісы, першае, што ўсе Бедныя, як называюць сябе Вальдэнсы, збіліся са шляху, і паўсталі супраць той Царквы, якая завецца Рымскай, і не толькі ў справах, але і ў веры аслабелі, бо пайшлі супраць наступнага палажэння: не вераць, што ў "Веру ў Святую Каталіцкую Царкву" гаворка ідзе пра задзіночанне рымлян[76].

...

Іншае, што хочам даказаць, гэта іх найпыхлівейшае нахабства. Вядома, што ў часы прарокаў сярод яўрэяў было больш страшных грахоў або злачынстваў, чым у часы Вальдэнсаў сярод "рымлянаў" [каталікоў]. ... аднак ніхто з названых Прарокаў, ні з іншых людзей не былі настолькі саманадзейнымі, каб аддзяліцца, каб заснаваць новую Царкву і новае святарства. У гэтым і праяўляецца нахабства Вальдэнсаў, якія былі настолькі саманадзейнымі, каб выйсці з Рымскай Царквы з-за некаторых недахопаў, пра якія яшчэ Бог праз цудадзейнае сведчанне паведаміў, як сярод жывых, так і сярод тых, хто гэта жыццё пакінуў, асабліва, калі Бог кажа (Мф 23:2): "на Майсеевым пасадзе селі кніжнікі і фарысэі", і калі нават найнягоднейшым кніжнікам і фарысеям трэба было падпарадкоўвацца згодна з законам Майсея, і чынам святароў для выканання закону, то наколькі больш трэба падпарадкоўвацца святарам і прэлатам паводле закона Хрыста, нават калі яны благія, пакуль яны не будуць выдаленыя з Царквы.

Таксама, калі дазволена будзе Вальдэсу выйсці з Рымскай Царквы, каб аднавіць Царкву, якая, адпаведна памылковаму меркаванню, была разбураная ў часы Сільвестра; тады чаму не іншаму ў іншай правінцыі? І таксама чаму не трэцяму ў трэцяй правінцыі або каралеўстве; чаму таксама не многім іншым? Тады могуць заснаваць столькі ж цэркваў, колькі каралеўстваў або правінцый. Але такім чынам пастаноўлена ў Песні Песняў (6:8): "ды адна яна, беспахібная, чыстая горлінка"[77]. Цвёрда сказана, што адна горлінка, а значыць Царква у цэлым, хоць ёсць некалькі асаблівасцяў.

Супраць: Ці не быў Вальдэс для іх Найвышэйшым Пантыфікам: натуральна, замест Сільвестра; але па той жа прычыне кожны пры аднаўленні Царквы, як ты кажаш, Найвышэйшы Пантыфік. Тады атрымліваецца, што ў адной Царкве ёсць шмат Найвышэйшых Пантыфікаў, што падаецца неадпаведным, бо такога не было знойдзена ў Старым Запавеце, таму адсюль вынікае яшчэ больш неадпаведнасцяў[78].

---

[76] Маецца на ўвазе, што ў Сімвале веры гаворка ідзе пра падпарадкаванне Папе Рымскаму.

[77] 6:9 у Сёмухі.

[78] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 83–98.

II.xiv Стэфан дэ Бурбон. Пра сем падарункаў Святога Духа

Хоць трактат Стэфана (у франкамоўнай традыцыі – Эцьена) дэ Бурбона, напісаны на паўстагоддзя пазней за апісаныя ў ім падзеі, але яго сведчані заслугоўваюць даверу, бо зыходзяць ад людзей, якія ведалі Вальдэса асабіста. Сам аўтар, пасля навучання ў Парыжы, уступіў у дамініканскі кляштар у Ліёне ў 1223 г. і праз дзевяць гадоў стаў інквізітарам на тэрыторыі паміж рэкамі Сонай і Ронай. Каля 1249 г. ён вяртаецца ў кляштар і да сваёй смерці ў 1261 г. піша трактат у дапамогу прапаведнікам "Пра сем падарункаў Святога Духа" (De septem donis spiritus sancti). У ім апісвае вальдэнскую дактрыну на сярэдзіну XIII ст.[79]

II.xiv.a 1173–1184 гг.

Вальдэнсы ж названыя так ад першага заснавальніка іх ерасі, якога таксама называлі Вальдэнс (Valdensis). Яны таксама называюцца "бедныя з Ліёна", паколькі там распачалі практыкаваць беднасць. Самі ж сябе называюць "беднымі Духам", бо Бог сказаў "Дабрашчасныя ўбогія духам" (Мф 5:3); сапраўды, яны бедныя духам – у духоўных бласлаўленнях і ў Духу Святым.

Секта ж пачала гэты шлях, згодна з тым, што я чуў ад некаторых асоб, хто бачыў самых першых іх [членаў секты], і ад аднаго святара па імені Бернард Ідрас, які сам быў даволі паважаным і дабрадзейным чалавекам у горадзе Ліёне, сябрам нашага брата-дамініканца; калі той быў маладым і пісцом, запісаў названаму Вальдэсу за ўзнагароду на народнай мове (in romano) першыя кнігі, якія займелі тыя людзі, перакладзеныя (transferente) і надыктаваныя яму адным вучоным, па імені Стэфан з Анса, які, прэбендарый (beneficiatus) кафедральнага сабора ў Ліёне, пазней нечакана памёр, звалiўшыся з даху дома[80], які ён будаваў; я яго часта сустракаў.

Адзін багацей у названым горадзе, названы Вальдэс, які не быў добра адукаваны, але, слухаючы Евангеллі, захацеў даведацца, пра што яны кажуць, заключыў дамову з названымі святарамі, што адзін перакладзе (transferret) іх на народную мову, а другі запіша пад дыктоўку, што яны і зрабілі; падобным чынам былі [сабраныя] многія кнігі Бібліі і многія сентэнцыі з Айцоў Царквы (auctoritates sanctorum), згрупаваныя па тэмах, якія яны назвалі "Меркаванні".

Калі гэты грамадзянін шматкроць прачытаў і завучыў на памяць [гэтыя тэксты], паабяцаў трымацца евангельскай дасканаласці, так, як гэта рабілі апосталы; ён, прадаўшы ўсю сваю маёмасць, у пагардзе да гэтага свету раздаў грошы бедным і ўзурпаваў апостальскую справу і зазнаўся. Прапаведуючы на вуліцах і перакрыжаваннях Евангеллі і тыя рэчы, якія ён завучыў на памяць, ён прыцягнуў да сябе шмат мужчын і жанчын, якія павінны былі рабіць тое самае, і ўмацоўваў іх у Евангеллі. Ён таксама пасылаў людзей нават самых нізкіх прафесій прапаведаваць у навакольных вёсках. Мужчыны і жанчыны разам, дурныя і неадукаваныя,

---

[79] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 208.

[80] Раптоўная смерць магла трактавацца як Божае пакаранне за супрацоўніцтва з ерэтыкамі. Pekka Tolonen, "Medieval Memories of the Origins of the Waldensian Movement," in *History and Religion: Narrating a Religious Past* (Berlin, München, Boston: de Gruyter, 2015), pp. 165–188, 175.

разышоўшыся па вёсках і пранікаючы ў дамы, прапаведуючы на плошчах і нават у цэрквах, і заклікалі іншых рабіць тое ж самае.

Цяпер, калі яны праз сваю безразважнасць і неадукаванасць усюды распаўсюдзілі памылкі і скандалы, яны былі выкліканыя архібіскупам Ліёна, чыё імя было Ян, які забараніў ім праяўляць сябе праз тлумачэнне Евангелля або пропаведзі. Яны ж звярнуліся да адказу апосталаў; іх лідар, узурпуючы ролю Пятра, так адказаў галоўным святарам: "Мы павінны падпарадкоўвацца больш Богу, чым людзям" (Дзеі 5:29), – як загадаў Апостал: "Прапаведуйце Евангелле кожнаму стварэнню" (Мк 16:15). Як быццам бы Гасподзь сказаў яму тое, што казаў апосталам; яны, аднак, не рызыкнулі прапаведаваць, пакуль не атрымалі права зверху, пакуль яны не былі асветленыя найлепшымі і найпаўнейшымі ведамі, і цалкам не атрымалі прапаведніцкага дару.

Такім чынам, яны, а менавіта Вальдэс і яго [паслядоўнікі], упалі спачатку ў непадпарадкаванне сваёй саманадзейнасцю і ўзурпацыяй апостальскіх абавязкаў, потым у непаслухмянасць, і, у рэшце рэшт, трапілі пад адлучэнне.

Пасля, выгнаныя з гэтай зямлі і выкліканыя на сабор, які адбыўся ў Рыме перад Латэранскім храмам, яны засталіся ўпартымі і былі ў рэшце рэшт асуджаныя як схізматыкі. Пасля, з таго часу, як яны змяшаліся ў Правансе і Ламбардыі з іншымі ерэтыкамі, памылкі іх пераймаючы і насаджаючы, яны былі асуджаныя Царквой як найбольш варожыя, заразныя і небяспечныя ерэтыкі, якія бадзяюцца паўсюль, выяўляючы святасць і шчырасць, але насамрэч таго не маючы, тым больш небяспечныя, чым больш таемныя, яны маскіраваліся пад розныя абліччы і заняткі. Аднойчы быў схоплены галоўны (maximus) сярод іх, які цягаў з сабою шмат розных прылад, з дапамогай якіх ён змяняў сябе, як Пратэй: калі ён быў заўважаны ў адным абліччы і выкрыты, ён перамяняўся. Часам ён меў аблічча і вопратку пілігрыма, у іншыя разы насіў посах і кайданы таго, хто раскайваецца, у іншыя ж часы ён выяўляўся як шавец, цырульнік або жнец і гэтак далей. Іншыя рабілі тое самае.

Гэтая секта пачалася каля года Божага 1170, у час біскупства Яна, празванага Праведныя Рукі[81], архібіскупа ліёнскага[82].

Таксама калі ў дыяцэзіі Безансона ў вёску, якая называецца Жуанвіль-на-Соне, прыйшоў нейкі ерэтык, пераапрануты ў арбалетнага майстра, які быў пасланы да яе [вёскі] вернікаў, каб суцешыць, падтрымаць і наіўных вяскоўцаў спакусіць, калі старэйшына (major) вёскі быў на сваіх палетках са сваімі работнікамі, калі ўбачыў названага ерэтыка, які ішоў па дарозе, распусціў работнікаў, не ведаючы, як гэта падазрэнне ўвайшло ў яго сэрца, не іначай як Бог, у якога ён верыў, уклаў яго туды, і адразу ўсклікнуў: "Бачу ерэтыка-Вальдэнса; бяжыце сюды, схопім яго". Калі ён быў схоплены, пасля шматлікіх сафізмаў было высветлена, што прайшло добрых 18 гадоў, як ён пакінуў гэтую зямлю, каб вучыцца ерасі. Ён, як сам прызнаўся нам, увесь гэты час вучыўся пад Міланам у ерэтычнай секце Вальдэнсаў, завучваючы на памяць увесь Новы Запавет і вялікую частку Старога, з дапамогай чаго можа абараняць сваю секту і нападаць на нашу веру, і наіўных пераконваць ён змог з дапамогай такіх жа доказаў. Ён быў апытаны, пасля два дні былі дыспуты супраць яго, і былі даказаны запісаныя палажэнні яго памылак, і было прызнана пацвер-

---

[81] Паўтор памылкі, дапушчанай Рычардам з Пуацье. Можа ўскосна сведчыць пра выкарыстанне Стэфанам яго тэксту.

[82] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 15–18; Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 209–210.

джаным, што ён добра ведае пра існаванне пад Міланам 17-і сектаў, паміж сабой адрозных і варожых, якія яго сектай, аднак, усе асуджаныя, і ён назваў іх мне і розніцу паміж імі.

Першая, з якой ён сам, называецца бедныя з Ліёна, якія сябе таксама называюць беднымі Духам, якія называюць Вальдэса сваім ерэсіярхам; яны разам з іншымі сваімі памылкамі асуджаюць усю зямную маёмасць. Таксама бедныя ламбардцы, якія маёмасць прымаюць, пра чые памылкі мы кажам ніжэй. Таксама іншыя, названыя Тарталанамі (Tortolani), якія кажуць, што толькі іх дасканалы настаўнік раз на год падчас вячэры можа служыць імшу; якія робяць тарталеткі, якімі прычашчаюцца... Іншыя называюць усіх добрых людзей святарамі, але не жанчын. Іншыя не робяць розніцы па полу. Іншыя называюцца камуніятамі, бо кажуць, што ўсё павінна быць агульным. Іншыя – гэта перахрышчаныя, бо кажуць, што павінны быць перахрышчаныя Царквой. Таксама арнальдысты, спераністы, леаністы, катары, патарыны, маніхеі або балгары, названыя так па сваіх стваральніках.

Першае, на чым яны могуць быць схопленыя, гэта іх саманадзейнасць і незаконная ўзурпацыя; яны незаконна ўзурпавалі сабе права пропаведзі і навучання Святой дактрыне, і асабліва Евангеллям і іншым кнігам Новага Запавету, якія завучваюць на памяць на народнай мове (in vulgata lingua) і адзін аднаму пастаянна паўтараюць, і казанні пра перасследаванні і пакуты, і цярпенне, і бласлаўлёную беднасць. І калі людзей да сябе заманьваюць, сцвярджаюць, што яны і ёсць бласлаўлёныя бедныя, якія рахмана церпяць мардаванні, і пакутнікі, і што клірыкі іх перасследуюць ад зайздрасці, як калісьці яўрэі перасследавалі прарокаў, а кніжнікі і фарысеі – Госпада і вучняў яго; і самі, як кажуць, з тых Гасподніх: "Таму, вось, Я пасылаю да вас прарокаў, і мудрых, і кніжнікаў; і некаторых зь іх вы заб'яце" (Мф 24:34). Калі ж спачатку звярнуліся да простых людзей, бо хітрых і вучоных унікалі, сказалі, што ведаюць найлепшыя малітвы і маюць цудоўныя словы, каб прасіць міласці, якія спачатку казалі і якім навучалі, а пасля Евангеллю на народнай мове, якое адно за адным, а не з выратавальным сэнсам слоў казалі і пераказвалі іншым, калі да іх прыходзілі цікаўныя і ахвотныя да навучання. Я бачыў аднаго маладога валапаса, які правёў толькі адзін год у доме гэтых ерэтыкоў Вальдэнсаў, які з такой стараннай увагай і чуллівым успрыманнем завучваў і запамінаў тое, што чуў, што за год завучыў на памяць і запомніў сорак нядзельных Евангелляў, за выключэннем святочных, якія слова за словам на сваёй мове вывучыў, за выключэннем іншых слоў казанняў і малітваў. Таксама я бачыў некаторых міран, якія, прывучаныя да іх дактрыны, так шмат з Евангелістаў, а менавіта з Мацвея і Лукі, завучылі на памяць, а асабліва тое, што тыя кажуць пра навучанне і казанні Гасподнія, што як толькі адзін у словах прыпыняўся, другі яго адразу ж працягваў; і праз іх стараннасць у злых справах і нядбальства каталікоў у добрых [відавочнае], што настолькі шмат нядбайных пра выратаванне сваё і сваіх родных, што наўрад ці нават "Ойча наш" ці "Сімвал веры" ведаюць ці сям'ю сваю навучаюць[83].

II.xiv.b 1249–1261 гг.

Зараз вось памылкі, якімі заражаныя, атручаныя і пашкоджаныя ў сваіх вучэннях; іх вераванні выклікаюць агіду не датычна аднаго артыкула веры ці аднаго таінства, але ва ўсім, прама і ўскосна, як я даведаўся праз шматлікія апытанні і са

[83] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 101–104.

споведзяў пад клятвай, запісаныя даслоўна як дасканалага, так і іх вернікаў, і таксама сведкаў, якія давалі паказанні супраць іх. Яны верылі, што кожны падман – гэта смяротны грэх, і тое ж самае клятва. Аднак я чуў, што некаторыя з іх казалі, што пад страхам смерці дазваляецца тым, хто не дасканалы, падманваць і даваць клятвы. Самі яны падманваюць і прыносяць ілжывыя клятвы, не думаючы, што гэта грэх, паколькі яны прабачылі і замаскіравалі свой падман хітрыкамі і сафістыкай.

Таксама фундаментальны пункт іх памылак – адмаўленне большага, чым уся вера – у іх сцверджанні, якое я знаходзіў у споведзях амаль усіх дасканалых і іншых, што душа першага чалавека была часткай боскай субстанцыі, самога духа Бога, або ўдзельнікам Яго існавання. Калі я прапаведаваў у горадзе Валенсіі дваццаць пяць гадоў таму, раней я ведаў шмат пра іх дзейнасць, і перад тым, як мне былі даверапыя абавязкі інквізітара, адзін каталік сказаў мне, што ён чуў, як настаўнікі тлумачылі тэкст "стварыў Гасподзь Бог чалавека з пылу зямнога і ўдыхнуў у твар ягоны дыханне жыцця" (Быц 2:7) як наступнае: Бог зрабіў і надаў форму адной чалавечай фігуры з мяккай гліны, як робяць дзеці, і паклаў яе на сонца сохнуць. Калі яна высахла, дзе сонечнае цяпло правяло невялікія шчыліны, там зрабіліся вены для крыві. У рэшце рэшт праз подых у твар Ён удыхнуў Свой дух у яго, і такім чынам чалавек быў створаны з жывой душой; і такім жа чынам, сказаў гэты чалавек, Бог зрабіў іншыя душы. Амаль усе з іх згодныя, што душа кожнага добрага чалавека – сапраўды Святы Дух, які ёсць Бог, і гэты добры чалавек, пакуль ён застаецца добрым, не мае іншай душы, акрамя як Святога Духа, або Бога. Калі ж ён грашыць, Святы Дух сыходзіць, а Д'ябал уваходзіць, так як мы чыталі, што ён увайшоў у сэрца Юды, якому Бог прадвызначыў быць Д'яблам. Гэта пацвярджаецца Евангеллем, у якім Бог кажа: "не вы будзеце гаварыць, а Дух Айца вашага гаварыць будзе ў вас" (Мф 10:20)...

Таксама яны сцвярджаюць – гэта, магчыма, зыходзіць з іх першай прапановы – што не існуе пакарання ў чыстцы, за выключэннем таго, што пры жыцці, і заступніцтва Царквы памерлым не карыснае, як і іншае, што для іх робіцца.

Таксама яны кажуць, што ўсе добрыя людзі – святары, і што любы добры чалавек мае столькі ж улады адпускаць грахі, як мае Папа ў нашай веры. Больш за тое – каб прадэманстраваць сапраўдную прыроду іх вераванняў – яны сцвярджаюць, што Бог адзіны можа адпусціць грахі, але яны таксама кажуць, што ўсе добрыя людзі могуць рабіць гэта, бо гэта толькі Бог, якога яны маюць у сабе, дзейнічае праз іх, і праз якога яны здольныя вязаць і развязваць усе рэчы. Яны пагарджаюць царкоўнымі адпушчэннямі грахоў і адлучэннямі, бо, як яны кажуць, толькі Бог можа адлучаць.

Таксама адзін з вядучых настаўнікаў і місіянераў прадставіў перада мной наступнае вызначэнне. Ёсць, ён сказаў, некаторыя асобы, хто не пасвечаны ні Богам, ні людзьмі, напрыклад, грэшныя міране; а ёсць іншыя, такія, як грэшныя святары, пасвечаныя людзьмі, але не Богам; і ёсць яшчэ іншыя, пасвечаныя Богам, а не людзьмі, такія, як добрыя міране, якія трымаюцца Боскіх загадаў, і яны маюць ўладу вязаць і развязваць, асвячаць і пасвячаць, калі яны выкарыстоўваюць словы Божыя, прысвечаныя для гэтага. Але, як яны кажуць у дачыненні да іх, некаторыя робяць розніцу паміж поламі і кажуць, што толькі мужчыны могуць быць пасвечанымі; іншыя не робяць такога адрознення, яны кажуць, што жанчына, калі яна добрая жанчына, можа выконваць святарскія абавязкі. (Я бачыў адну жанчыну-ерэтычку, якая была спаленая, якая верыла, што яна можа, і якая збіралася ажыц-

цявіць гэта на скрыні, падрыхтаванай у якасці алтара). Ён таксама казаў, што ёсць таксама іншыя асобы, пасвечаныя і Богам, і людзьмі, калі святары, пасвечаныя людзьмі, таксама трымаюцца Боскіх загадаў, бо Бог не прыслухоўваецца да грэшнікаў.

Таксама яны кажуць, што злы чалавек, які жыве ў граху, не можа вязаць і развязваць, выдаваць індульгенцыі ці адпушчэнні грахоў, або пасвячаць, або рабіць што-небудзь такое, што патрабуе Божага ўхвалення, або што робіцца для ўлагоджвання Бога, бо ўсё гэта робіцца толькі для ўлагоджвання вачэй чалавечых. Яны высмейваюць папскія індульгенцыі і адпушчэнні грахоў, і ключы ад царквы[84], называючы пасвячэнні і асвячэнні цэркваў і алтароў святамі камянёў.

Таксама яны кажуць, што ўся зямля аднолькава асвечаная і бласлаўлёная Богам. Яны пагарджаюць хрысціянскімі могілкамі і цэрквамі.

Таксама яны кажуць, што ўсе суддзі грашаць, калі прыгаворваюць да крывавага пакарання, і ставяцца як да забойцаў і знішчальнікаў душаў да тых, хто прапаведуе вайну супраць сарацынаў, альбігойцаў ці іншых людзей, акрамя вайны супраць "пякельных" сарацынаў і альбігойцаў, якіх яны называюць дэманамі.

Таксама яны кажуць, што для выратавання карысна спавядацца толькі Богу, а не людзям, і што знешняе пакаянне не з'яўляецца неабходным для выратавання; але калі пакаяцца за ўсё, у чым саграшыў, якія б вялікія і шматлікія грахі не зрабіў, калі памрэ, то ўзнясецца на неба.

Таксама, дух чалавека, калі ён быў добрым чалавекам, калі ён памірае, адзіны з духам Бога і самім Богам; адтуль многія з іх, застаючыся са сваёй першай прапановай, згаджаюцца, я думаю, што на нябёсах няма ніякага духа, акрамя духа Бога, хто сам ёсць Бог, і што на нябёсах няма душы, за выключэннем Бога. І калі ў іх запыталіся, ці душы Пятра і Паўла, і іншых святых на нябёсах, яны заявілі, што на нябёсах няма душы, акрамя Бога, нікога, хто не Бог: так кажуць некаторыя з іх.

Таксама яны кажуць, што нашы клірыкі і святары, хто мае багацці і ўвогуле маёмасць, – гэта сыны Д'ябла і пагібелі, і кожны, хто дае ім дзесяціну і ахвяраванні, грашыць, бо рабіць так – усё роўна што даваць тлушч свінням.

Таксама яны кпяць з тых, хто ахвяруе свечкі святым для асвятлення цэркваў.

Таксама яны кпяць з царкоўных спеваў і святых імшаў, заяўляючы, што той, хто прысвячае свае звароты Яму, выглядае так, як быццам бы высмейвае Бога, як быццам бы Той не можа зразумець, пакуль Яму не праспяваюць песню або не памоляцца ў выглядзе песні.

Таксама яны кажуць, што няма святасці, акрамя як добрых мужчын або жанчын.

Таксама яны сцвярджаюць, што Рымская Царква – гэта Вавілонская Блудніца, пра якую мы чыталі ў Апакаліпсісе.

Таксама яны кажуць, што тыя, хто трымаецца дзён святых, выстаўляюць сябе на смех, і што працаваць у гэты дзень не лічыцца за грэх, за выключэннем стварэння прэцэдэнту для скандалу. Таксама яны кажуць, што тыя, хто грэбуе правіламі посту і хто есць мяса ў любы дзень, не грашаць, акрамя як у тым выпадку, калі з-за гэтага распачынаецца скандал. Але ў прыватных абставінах дазволена есці мяса штодня, таму яны кажуць, што гэта не прычына для плётак.

---

[84] Ключы ад царквы – права царквы "вязаць і развязваць"(адлучаць ад царкоўнага адзінства і прабачаць грахі), па аналогіі з ключамі ад Царства Нябеснага, якія даў Хрыстос Апосталу Пятру.

Таксама яны катэгарычна адмаўляюць неабходнасць падпарадкавання Рымскай Царкве.

Таксама яны сцвярджаюць, што толькі Бог адзіны мусіць быць аб'ектам пакланення з усімі магчымымі спосабамі пакланення, і што асобы, хто пакланяецца Крыжу, або таму, што мы называем і верым, што з'яўляецца Целам Хрыстовым, або іншым Божым святым, або выявам, грашаць.

Таксама, на аснове папярэдняга сцверджання, многія з іх трымаюцца – я чуў у споведзі вялікай колькасці іх правадыроў – што любы добры чалавек – гэта сын Божы, такі, як Хрыстос. І такім жа чынам, яны кажуць пра Яго, што ён не меў іншай душы, акрамя Божай, або Духа Святога, які ёсць Бог; гэта таксама сцвярджалі для любога добрага чалавека. І калі яны кажуць, што яны вераць у цялеснае ўвасабленне, нараджэнне, пакуты і ўваскрэсенне Хрыста, яны таксама кажуць, што вераць у сапраўднае зачацце Хрыста, яго нараджэнне, пакуты, уваскрэсенне і ўзнясенне так, як добры чалавек зачаты, народжаны, або ўваскрасае для пакаяння, або ўзыходзіць на неба, калі церпіць пакуты; і гэта сапраўдныя Страсці Хрыстовы. Тое самае, калі яны кажуць, што вераць у хрышчэнне, пакаянне, і так далей для ўсіх таінстваў, яны кажуць, што гэта – сапраўднае таінства, і прымаюць яго, але толькі тады, калі добры чалавек, які пакаяўся, праводзіць яго. Тады гэта сапраўднае хрышчэнне, сапраўдная канфірмацыя, сапраўдная Еўхарыстыя, бо тады пераўтвараецца Цела Хрыстова, тады гэта шлюб і апошняе мірапамазанне, зробленае Ім. І праз гэту духоўнасць многімі з іх наша вера ў палажэнні і таінствы абвяргаецца. Ёсць тыя, хто ў гэтым пытанні, падаецца па адчуваннях, менш памыляюцца, бо кажуць, што Цела Хрыстова можа быць пераўтворана і асвечана любым добрым чалавекам, хто прамаўляе словы, прадпісаныя для гэтай цырымоніі, хоць ён і не пасвечаны людзьмі.

Таксама яны кажуць, што ў цялесным шлюбе жонка можа пакінуць свайго мужа без яго згоды, і тое самае для мужа, каб далучыцца да іх суполкі або практыкі ўстрымання.

Таксама вось такая Тройца, якой або ў якую яны вераць: што, як Айцец, Ён той, хто павяртае іншага да дабра, а той, хто павяртаецца – ён Сын; тое, праз што або ў чым павяртаюцца – гэта Дух Святы. Гэта тое, што яны маюць на ўвазе, калі кажуць, што вераць у Айца, Сына і Духа Святога, у Хрыста, зачатага, народжанага, які пакутаваў, і так далей, як запісана ў Сімвале Веры, які яны ведаюць вельмі добра і паўтараюць на народнай мове. Прычына ўпадзення іх у такое паскудства, я думаю, у пысе і нянавісці да кліру, і гніенні веры; таму што яны згубілі сваю аснову і трапілі ў лабірынт і пастку зла. Як бы тое ні было, адукаваны чалавек, калі ён прасякнуты Божым Духам, можа хутка аспрэчыць усё гэта з дапамогай логікі і Пісання.

У гэтых жа памылках яны паміж сабой разыходзяцца, залежна ад узроўню, у залежнасці ад таго, хто больш ці менш заражаны. Я чуў, як дачка спрачалася са сваёй маці, абедзве яны былі заражаныя аднолькавай памылкай і былі вельмі вопытныя ў дэталях; аднак з-за ўпартасці ў гэтай памылцы, да якой яны моцна прычапіліся, яны былі абедзве спаленыя. Я ўставіў гэта, мяркуючы, што гэта будзе добра для братоў-абаронцаў веры, каб яны не былі ў няведанні[85].

---

[85] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 104–108; Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 346–351.

II.xv Райнэрый Саконі. Падсумаванне пра катараў і леаністаў, або бедных з Ліёна

Гэты трактат (лацінская назва – Summa de Catharis et Leonistas sive de Paiperibus de Lugduno; 1250 г.) належыць пяру былога ерэтыка Райнэрыя Саконі (Rainerius Sacconi), які вярнуўся ў каталіцтва. Ён нарадзіўся ў П'ячэнцы, горадзе, які ў поўнай меры ўвасабляў сабой тыповую італьянскую камуну, з вялікай колькасцю ерэтыкоў і зацятай палітычнай барацьбой. На працягу многіх гадоў ён сам дайшоў "практычна да ерэсіярха", але ў 1245 г. пад уплывам Пятра Пакутніка Веронскага раскаяўся, уступіў у дамініканскі ордэн і нават стаў інквізітарам. У 1252 г., калі яго настаўнік і паплечнік быў забіты, сам Райнэрый цудам выратаваўся і прыняў удзел у працэсе супраць забойцаў. З 1254 г. па 1259 г. быў інквізітарам у Ламбардыі, памёр пасля 1262 г. У 1250 г. ім была напісана гэтая праца. Такім чынам, ён ведаў пра ерэтычны рух не звонку, а знутры, што дало яму магчымасць падчас інквізіцыйнай дзейнасці задаваць тыя пытанні, якія б дэманстравалі найбольшае разыходжанне ерэтычнага вучэння з каталіцкім. З іншага боку, як і ва ўсялякага рэнегата, у яго сустракаюцца перабольшванні. Гэтая праца з'яўляецца адной з найбольш папулярных (па колькасці захаваных спісаў) і найбольш часта "цытаваных" у трактатах іншых аўтараў.

Трактат складаецца з 2-х частак: першая, большая, прысвечана катарам, другая, меншая, – уласна вальдэнсам. Прыведзены пераклад другой часткі.

Пра ерась леаністаў або бедных з Ліёна

Гэтая ерась падзеленая на дзве часткі. Першая называецца бедныя ультрамантаны, другая ж бедныя ламбардцы, і гэтыя пайшлі ад тых. Першыя, а менавіта бедныя ультрамантаны, кажуць, што ў Новым Запавеце ўсе клятвы забароненыя, як смяротны грэх. І тое ж кажуць наконт свецкага суда, а менавіта пра тое, што не дазволена каралям, прынцам і іншым, хто мае ўладу, караць злачынцаў.

Таксама кажуць, што просты міранін можа асвячаць Цела Божае. Веру таксама, што тое самае кажуць наконт жанчын, бо наконт гэтага мне яны не пярэчылі.

Таксама, што Рымская Царква – не Царква Ісуса Хрыста.

Пра бедных ламбардцаў

Бедныя ламбардцы згаджаюцца з першымі наконт клятвы і свецкага суда. Наконт жа Цела Гасподняга думаюць яшчэ горш, чым першыя, кажучы, што агульнавядома, што любы чалавек, які не здзейсніў смяротнага граху, яго асвячае.

Таксама кажуць, што Рымская Царква – Царква зла, і звер, і блудніца, пра якую мы чытаем у Апакаліпсісе, і такім чынам кажуць, што няма аніякага граху, каб есці мяса ў Вялікі Пост і па пятніцах, і робяць гэта, калі ёсць магчымасць пазбегнуць скандалу.

Таксама, што Царква Хрыста заставалася ў біскупаў і іншых прэлатаў да Блажэннага Сільвестра і пры ім заняпала ажно да таго часу, пакуль яны яе не аднавілі.

Аднак кажуць, што заўсёды былі тыя, што жылі ў страху Божым, і таму будуць выратаваныя.

Таксама кажуць, што немаўляты выратуюцца без хрышчэння[86].

II.xvi Жыццяпісы братоў ордэна прапаведнікаў

Гэта кніга, якая акумулюе ў сабе гісторыі першага пакалення ордэна дамініканцаў, была складзеная па замове іх генеральнага капітула ў прамежку паміж 1255 і 1260 гг.

Брат Пётр з Обены, які ў Правансе быў прыёрам і чытачом, і свята і шчасліва пражыў сваё жыццё ў ордэне, апісваў, што прыйшоў у ордэн такім чынам. Расказваў, што калі ў горадзе Парыжы займаўся медыцынай і ўжо быў абяцаны ордэну, Бедныя Ліёнцы, якія яшчэ называюцца Вальдэнсамі, настолькі душу яго вычварылі, што быў у вялікім сумневе, за кім лепш ісці; аднак больш схіляўся да Вальдэнсаў, якіх там знайшоў і ўбачыў у іх вялікую знешнюю пакорнасць і паказную цноту набожнасці; сапраўдныя ж браты падаліся поўнымі задавальненняў і залішне заможнымі. Ён так пра гэта хваляваўся, што не ведаў, што рабіць, укленчыў і з вялікімі слязьмі Бога прагнуў ад усяго сэрца, каб па яго міласці раскрылася, што ён павінен рабіць у сваіх сумневах. Калі ж пасля сваіх малітваў ён трошкі задрамаў, то яму падалося, як быццам бы ідзе па нейкай дарозе, і леваруч яго цяністы лес, у якім убачыў розных Вальдэнсаў, аддзеленых адзін ад аднаго, з сумнымі тварамі; праваруч жа ўзнік найпрыгажэйшы мур, вельмі доўгі і высокі, ідучы немала часу ўздоўж якога, урэшце дайшоў да дзвярэй і, зазірнуўшы, убачыў вельмі маляўнічы палетак, з пасаджанымі дрэвамі, з рознакаляровымі кветкамі, і на ім шматлікіх братоў-прапаведнікаў у коле, вясёлых і звернутых да нябёсаў, і некаторыя з іх трымалі Цела Хрыстова ва ўзнятых руках. Калі ж яго гэтае відовішча настолькі моцна напоўніла радасцю, што ён да іх паспрабаваў увайсці, то яго спыніў анёл, які ахоўваў дзверы, і сказаў: "Сюды не ўвойдзеш такім чынам". Калі ж ад гэтага моцна заплакаў і прачнуўся, то зразумеў, што ўвесь мокры ад слёз, і адчуў, што сэрца яго ажыло ад былой журбы; і пасля таго, як прайшло некалькі дзён і ён вырашыў усе свае свецкія справы, у ордэн прапаведнікаў уступіў.

Гэта і многае іншае я пачуў з яго вуснаў[87].

II.xvii Ансельм з Александрыі. Трактат пра ерэтыкоў

Ансельм Александрыйскі – дамініканскі інквізітар у Італіі, які напісаў сваю працу "Трактат пра ерэтыкоў" (Tractatus de hereticis) у 1266 г. на аснове кнігі Райнэрыя Саконі, свайго папярэдніка. Але шмат фактаў дадаў са свайго ўласнага інквізітарскага досведу[88] апытання ультрамантаніна Гіёма з Альбі і лам-

[86] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 109–111.

[87] Gerardus de Fracheto and Benedictus Maria Reichert, *Fratris Gerardi de Fracheto ... Vitae fratrum ordinis praedicatorum necnon cronica ordinis ab anno 1203 usque ad 1254. Ad fidem codicum manuscriptorum accurate recognovit, notis breviter illustravit Fr. Benedictus Maria Reichert* (Lovanii: E. Charpentier & J. Schoonjans, 1896), 183–184.

[88] Wakefield and Evans, *Heresies of the High Middle Ages*, 361.

бардца Андрэаса з Груара, двух вальдэнскіх біскупаў, невядомых па іншых крыніцах. Праца ў асноўным прысвечана катарам, тут прапанаваны пераклад асобных фрагментаў, якія апісваюць непасрэдна вальдэнсаў[89].

10. Пра адрозненне Вальдэнсаў Ламбардскіх і Ультрамантанскіх

Ёсць адрозненне Вальдэнсаў Ламбардскіх і Ультрамантанскіх, бо Ультрамантаны кажуць, што любы чалавек, ці добры, ці дрэнны, нават не будучы святаром, можа асвячаць і праводзіць іншыя таінствы. Ламбардзец кажа, што не можа, акрамя па міласці Божай. Таксама ламбардзец памыляецца ў таінствах, не робіць цалкам хрышчэнне. Таксама ламбардцы працуюць. Таксама ўсе, як ламбардцы, так і ўльтрамантаны, пагарджаюць усталяванай Царквой: лічаць магчымым шлюб паміж стрыечнымі братам і сястрой, калі няма больш забаронаў, акрамя як ад усталяванай Царквы.

11. Абагульненне, складзенае братам Райнэрыем з ордэна прапаведнікаў

Калісьці ерэтычныя секты былі шматлікія і разнастайныя, але ўсе яны былі знішчаныя дзякуючы міласці Ісуса Хрыста, аднак дзве галоўныя нейкім чынам праявілі вынаходніцтва...[неразборліва] і захаваліся. Таксама кажуць, што немаўляты будуць выратаваны без хрышчэння. У год Гасподні 1201 скончана з верай вышэйназваная праца названым братам Райнэрыем.

10 [працяг]

Ультрамантаны не ўкленчваюць ні перад крыжам, ні перад алтаром, прыводзячы ў доказ наступнае: "Ідалы са срэбра і золата і г.д." Такім жа чынам робяць ламбардцы. Таксама вераць, што любы добры чалавек – святар і Царква, ламбардцы – не: кажуць, калі няма двух сабраных – няма Царквы. Таксама Ультрамантаны асуджаюць ламбардцаў, і наадварот. Таксама Ультрамантаны не працуюць ні на сябе, ні на другіх за грошы, не гандлююць нічым, не служаць. Яны ж – абутыя ў сандалі і носяць манаскі абутак (clericatam supe subtellaribus) або абутак, падрэзаны зверху; і не служаць за грошы, але іх паплечнікі (socius) за іх, не служаць каму-небудзь за штодзённую ежу, і носяць толькі адну туніку. Тое ж самае робяць жанчыны, за выключэннем таго, што не носяць сандаляў. Але і ламбардцы маюць абутых у сандалі. Таксама Ультрамантаны кажуць і вераць, што Папа мае не больш улады адпускаць грахі, чым любы чалавек. Таксама, што Рымская Царква не ёсць Царквой Божай, але блудніца; у тое ж самае верыць Ламбардзец. Таксама, што Папа – не намеснік Пятра на зямлі; тое ж сама кажа Ламбардзец. Таксама, што хрышчэнне і алей усталяваны Рымскай Царквой. Ва ўсталяванае ж не вераць; не клапоцяцца пра пасты, усталяваныя Рымскай Царквой, і не вераць, што грашаць, калі перарываюць пост. Таксама верыць Ламбардзец. Таксама іх жанчыны прапаведуюць. Таксама не вераць у індульгенцыі, якія выдае Рымская Царква. Таксама перахрышчваюць сябе і ўсё, што ўжываюць у ежу, Ламбардзец так не робіць, толькі прасцірае ўгору рукі. Вераць Дактарам Царквы ў тым, што адпавядае іх інтарэсам. Таксама яны кажуць, што Святы Сільвестр звярнуў з роўнай дарогі, калі прыняў маёмасць. Таксама іх біскуп – Вільгельм альбігоец. Таксама прычынай падзелу паміж імі была праца, і тое, што Ламбардзец сказаў, што благія святары не могуць асвячаць. Таксама Добры Ян з Ронка быў першым сярод ламбардцаў, калі

[89] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 140.

ламбардцы аддзяліліся ад ультрамантанаў, і ўльтрамантаны адлучылі ламбардцаў. Канец.

Гэта занатаваў я, брат А., і запісаў ад іншых двух, якія знаходзіліся доўгі час сярод Вальдэнсаў і былі з секты Ультрамантанаў; але пасля звярнуліся і прынялі пакаянне ў вязніцы пад Альбам.

12. Пачутае аб іншага [пра ламбардцаў]

Наступнае ж было сказана тым Луіджы з секты ламбардцаў, які быў схоплены з Генуі і перавернуты. Ён сказаў, што Андрэас з Груара з'яўляецца Ламбардскім біскупам, і іх не больш за сто асоб абодвух полаў. Яны, як сказаў, вераць, што ніякі дрэнны святар не можа бласлаўляць, аднак вераць, што добры можа хрысціць і даваць добрыя парады. Адтуль тое, што мы называем накласці пакаянне, яны называюць – даць добрую параду. Таксама сказаў, што не вераць у тое, у што Ліёнцы вераць, што дрэнны святар можа даваць апошняе мірапамазанне. Таксама іх святары і біскуп уступаюць у сан праз накладанне рук. Таксама не вераць у царкоўныя чыны, маюць свае ўласныя. Таксама абутыя ў сандалі сярод іх, якія называюцца святарамі, носяць адну доўгую туніку і ходзяць босымі або абутымі ў адкрытыя зверху сандалі. Не маюць маёмасці і не чапаюць яе, але другія для іх. Але іншыя, якія не з'яўляюцца святарамі, зарабляюць і валодаюць. Не набываюць ні вінаградніку, ні дома. І вядома, што большасць з іх жыве ўдвох, утрох ці больш, але з выпадку неабходнасці можа жыць і адзін. Таксама іх абутыя ў сандалі не працуюць за грошы, а харчуюцца ад другіх. Жанчын не пасвячаюць, але яны прапаведуюць; таксама не накладаюць пакаяння. Таксама вераць, што ніхто не можа зберагчы, акрамя Бога, і кажуць, што чалавек або святар дае толькі парады. Таксама не робяць ніякіх пасвячэнняў ці ўсталяванняў. У чысцец, клятву і правасуддзе не вераць, як і другія [ультрамантаны]. Пра дактароў Царквы не ведае, у што вераць. Яны вераць, што ніхто не можа асвячаць, акрамя імі пасвечанага святара, і жанчына не можа. У паломніцтвы не вераць, як і другія. Таксама пра заморскую дарогу вераць, што яна благая[90]. Не вераць ні ў царкоўныя індульгенцыі, ні ў пастанаўленні, як і другія. Яны вераць, што любы можа быць выратаваным, маючы свецкую маёмасць.

15. а) Пра пагадненне бедных з Ліёна і ламбардцаў

У гэтым пагаджаюцца бедныя з Ліёна з беднымі ламбардцамі супраць Царквы, а менавіта, што Папа Сільвестр і пакутнік Лаўрэнцій – не святыя. Таксама, што Рымская Царква трымаецца не таго шляху, што трымаецца Царква Хрыста, а [таго, што трымаецца] Царква зла. Таксама, што няма чыстца. Таксама, што чалавеку не варта наведваць пахаванні святых, ні пакланяцца крыжу, ні ўзводзіць цэркваў, ні рабіць малітваў, імшаў ці міласціны для мёртвых. Таксама, што не выратавальна клясціся ў любым разе. Таксама, што нельга прымяняць цялесныя пакаранні ў дачыненні да злачынцаў. Таксама, што не з'яўляецца грахом ва ўсе дні года есці мяса, яйкі і сыр, акрамя як з-за моцнага скандалу. Падобнае тычыцца таго, калі чалавек возьме сабе ў жонкі кузіну ці стрыечную сястру. Таксама вераць, што ад Святога Клемента да Настаўніка Вальдэса (ad don Valdensem) не было ніводнага сапраўднага спадкаемцы Святога Пятра без выключэння, і нават Лін ці Клемент не мелі права вязаць і адпускаць. Таксама вераць, што Папа Сільвестр быў першы натхнёны Д'яблам на пабудову Рымскай Царквы.

---

[90] Магчыма, гаворка ідзе пра паломніцтва "за мора" – у Іерусалім.

b) Пра ламбардцаў

Бедныя ламбардцы вераць, што дрэнны святар не можа асвячаць Цела Хрыстова, ні Бог па яго просьбах. Таксама вераць, што душы перадаюцца. Таксама, што немаўляты, ахрышчаныя святарамі Рымскай Царквы, не выратуюцца.

c) Пра ліёнцаў: пра іх асвячэнне раз на год

Названыя бедныя з Ліёна асвячаюць толькі раз на год, а менавіта на Вячэру Гасподню. І тады амаль самай ноччу той, хто кіруе імі, калі ён святар, склікае ўсю сваю сям'ю абодвух полаў і загадвае ім падрыхтаваць лаву ці які стол, пакрываюць яго грубай ваўнянай тканінай, наверх ставяць адзін добры келіх добрага і чыстага віна і адзін прэсны хлеб. Пасля гэтага той, хто кіруе, кажа астатнім: "Просім Госпада нашага, каб ён у сваёй міласэрнасці збярог нас ад нашых грахоў і няшчасцяў, і гэта тое, да чаго з годнасцю імкнёмся, каб ажыццявілася праз яго міласэрнасць; і кажам сем разоў "Ойча наш" у гонар Бога і Святой Тройцы, каб усё гэта споўнілася". І тады ўсе, укленчыўшы, сем разоў кажуць "Ойча наш". Пасля ж устаюць. І тады той, хто асвячае, перахрышчвае хлеб і келіх віна. І, разламаўшы хлеб, дае ўсім астатнім кавалачак яго; і пасля гэтага дае ўсім адпіць з келіха. І стаяць увесь час на нагах. І так сканчаецца яго ахвярапрынашэнне. І цвёрда вераць і спавядаюць, што там прысутнічае Цела і Кроў Госпада нашага Ісуса Хрыста. І калі хто не патрапіць на таінства, пакідаюць яго да Вялікадня, і тады ўсё ўжываюць. Калі ёсць хто іншы, хто ў нястачы, дабро даюць яму. Увесь астатні час года не даюць сваім хворым нічога, акрамя бласлаўлёнага хлеба і віна. Увогуле ўсе бедныя абодвух полаў трымаліся аднаго тыпу асвячэння, а менавіта вышэйапісанага, перад падзелам, які быў у іх[91].

II.xviii "Гэта высветлена аб перавернутых у секту Вальдэнсаў"[92]

Вытрымка з французскага манускрыпта другой паловы XIV ст., перапісанага ў Авіньёне. Аўтар невядомы, твор, відавочна, кампілятыўны.

Зазначана, што кіраўнікі секты Вальдэнсаў маюць такі спосаб і лад жыцця. Першае, што посцяцца чатыры дні на тыдзень, а менавіта па панядзелках, серадах, пятніцах і суботах; у некаторыя з іх, а менавіта па пятніцах, на хлебе і вадзе, акрамя тых, хто ў дарозе або цяжка працуе. Моляцца сем раз на дзень, але не прамаўляюць нічога акрамя "Ойча наш". Старэйшы сярод іх распачынае малітву і робіць яе доўгай або кароткай зыходзячы з таго, як ён гэта сабе бачыць. Па большай сваёй частцы іх кіраўніцтва адукаванае і ведае на памяць Святое Пісанне. У словах стрыманыя, імкнуцца пазбягаць падману і брыдкаслоўя. Апранутыя проста. Старанна навучаюць сваіх падданых, каб тыя праяўлялі свае дабрачыннасці і пазбягалі заганаў. І паколькі іх паводзіны выглядаюць ухвальнымі, то іх падначаленыя прымаюць ад іх усё на веру і ў тым надта ўмацоўваюцца. Па-першае, адмаўляюць чысцец, і як наступства – заступніцтва за мёртвых; пакланенне ўсім святым, у тым ліку і Слаўнай Дзеве, прымаюць за ідалапаклонства, не прызнаюць, што якоенебудзь умяшальніцтва святых мае для нас значэнне. Кажуць на ўсе клятвы без

[91] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 140–144.

[92] Лацінская назва – Hec sunt manifesta per conversos de secta Waldensium.

разбору, што гэта грэх; і што ніякі злачынца не павінны быць пакараны смерцю. І што апостальскія біскупы, манахі і ўсе клірыкі не павінны мець маёмасці. На царкоўныя індульгенцыі не звяртаюць увагі; паломніцтвы не паважаюць і не робяць. На кананічныя гадзіны і іншыя царкоўныя імшы кажуць, што гэта нейкі падман. Усе астатнія царкоўныя сродкі, накшталт святой вады, царкоўных пабудоў і падобнага, лічаць залішнімі. Спавядаюцца чыстым непасвечаным міранам, няхай нават непісьменным. Таксама калі хочуць каго-небудзь далучыць да свайго ладу жыцця, найперш некаторы час выпрабоўваюць яго і падчас пасвячэння прымушаюць яго спавядацца ва ўсіх сваіх грахах ад самай маладосці, бо не прымаюць да сябе нікога, хто б не быў чысты і ад любых стасункаў з жанчынай вольны, бо гэта цялесная справа[93]. І калі хто-небудзь з іх пасля праслухоўвання споведзі павінен быць пасвечаны і прыняты ў кіраўніцтва, то спытаны першым чынам пра сем артыкулаў веры, а менавіта ці верыць у адзінага Бога ў трох асобах і адзінаіснага; другое, што гэты ж Бог – творца ўсяго бачнага і нябачнага; трэцяе, што перадаў закон Майсею на гары Сінай; чацвёртае, што паслаў сына, каб той увасобіўся праз Дзеву Марыю; пятае, што абраў сабе беззаганную Царкву; шостае – у цялеснае ўваскрэсенне; сёмае, што прыйдзе судзіць жывых і мёртвых. Таксама спытаны пра сем таінстваў, а менавіта пра хрышчэнне і так далей. Зарокі, якія ад яго патрабуюцца, наступныя: першае – каб абяцаў падпарадкаванне Богу і яго законам; другое – чыстасць; трэцяе – каб устрымліваўся ад фальшывых клятваў і смяротных грахоў, нават каб выратаваць сваё жыццё ў выпадку якой-небудзь смяротнай небяспекі або каб уладкавацца ў грамадстве; чацвёртае – каб не меў ніякай надзеі на працу рук сваіх, але заставаўся ў добраахвотнай беднасці; пятае – каб не меў большага даверу да сваіх кроўных сваякоў, чым мае да членаў сваёй секты. І толькі праз ускладанне рук, і ніяк інакш, пасвячаюць у сваё кіраўніцтва.

Гэта было запісана і паведамлена праз перавернутых з гэтай секты[94].

---

[93] Падобныя вераванні сустракаюцца ў прызнанні Раймунда дэ ла Коста (Döllinger, *Beiträge*, 131).

[94] Dondaine and Dossat, *Les hérésies et l'inquisition*, 274–275.

III. Інквізіцыйныя матэрыялы. Францыя

У першай палове XIII ст. адбываецца паступовае фарміраванне інквізіцыі на поўдні Францыі. Яшчэ не была наладжаная працэдура дазнання, ішло складанне апытальнікаў для розных груп ерэтыкоў, а таксама ўсталяванне розных варыянтаў пакарання ў залежнасці ад ступені ўдзелу ў секце. Тут прыводзяцца вытрымкі з інквізіцыйных дакументаў.

III.i.a Інквізіцыйная нарада ў Авіньёне, дзе было аб'яўлена, каго лічыць Вальдэнскімі вернікамі (1235 г.)

Тых, хто

... казалі, цвёрда і надзейна абдумаўшы, ... Вальдэнсы – добрыя людзі ці святыя, верылі Вальдэнсам і ў іх памылкі...

... іх грахі спавядалі Вальдэнсам, як павінны былі спавядаць святарам;

... ужывалі хлеб і рыбу на Вячэру згодна з праклятым сваім звычаем па дабраславенні Вальдэнсаў ... бо верылі, што Вальдэнсы так асвячаюць Цела Гасподняе;

... даведваліся ад Вальдэнсаў Пасланні, Евангеллі і іншае са Святога Пісання;

... часта наведваліся Вальдэнсамі, ці слухалі іх пропаведзі, ці прымалі іх, ці рабілі ім іншыя паслугі, і прымалі ад іх пацалунак міру;

... часцей наведвалі Вальдэнсаў ... але не для таго, каб асудзіць...

Усе гэтыя людзі і тыя, хто ім спрыяе[1], адлучаюцца ад Царквы і падлягаюць пераследу.

Царквой прызнаныя ерэтыкамі Вальдэнсы, або бедныя духам, або бедныя з Ліёна[2].

III.i.b Вальдызм у дыяцэзіі Німа ў 1200 г.

Даведайцеся, што Б. Саіса (B. Sayssa), ваш прыхаджанін, які прыйшоў да нас і выспаведаўся пакорліва і набожна, што вінаваты, што быў пад уплывам ерэтыкоў-Вальдэнсаў на працягу сарака гадоў, наведваўся імі і грошы і іншае ім аддаваў. Адкуль мы, хацеўшы абысціся з ім літасціва, тым больш што ён прыйшоў не выкліканы і не названы, мала таго – са свайго дабраахвотнага жадання, тым больш, што ён сваю віну па сваёй волі пакорна прызнаў, у апошні час Вальдэнсаў

---

[1] Ужо з XII ст. развіваецца царкоўнае вучэнне пра градацыі ерэтыкоў. Акрамя непасрэдна саміх "ерэтыкоў" маглі вылучацца іх "вернікі" (credentes), тыя, хто ім спрыяе/дапамагае (fautores), абараняе (defensores) і прымае ў сябе/ укрывае (receptatores). Падрабязней гл. Sackville, *Heresy*, 94–95.

[2] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 50–54.

рэдка бачыў і не наведваў, і ні ў чым іншым не было рэцыдываў, тым больш, што тады з царквы публічна не збег – мы, паўтаруся, адпраўляем яго к вам вызваленага згодна з царкоўным фармулярам і накладаем на яго такім чынам выратавальнае пакаянне, а менавіта, каб на працягу года наведаў царкву Святой Марыі дэ Подзіа і выплаціў вашаму савету такую суму, якую, як ён верыць, ён заплаціў ерэтыкам-Вальдэнсам[3].

III.i.c Вальдэнс Ян з Бургундыі (каля 1205–1240 гг.)

Паколькі ты, Ян з Бургундыі, які быў дасканалым ерэтыком Вальдэнсам на працягу больш за трыццаць гадоў, і верыў у іх памылкі, і праводзіў час са сваімі сямейнымі-Вальдэнсамі, а таксама сябрамі-Вальдэнсамі, цяпер адкрыў свае вочы і ад смяротнай немачы вальдызму і іншых ерасяў, чыіх імёнаў не злічыць, адрокся... вяртаем цябе да адзінства Каталіцкай Царквы... прызначаем табе выратавальнае пакаранне ў выглядзе пажыццёвага турэмнага заключэння... [4]

III.i.d Пра разбураны дом

У 1240 г. у Нарбонскай дыяцэзіі быў разбураны дом, дзе калісьці жылі дзве Вальдэнскія жанчыны. Жанчыны здолелі ўцячы, а на месцы дома было пастаноўлена арганізаваць вечны сметнік, каб ён ніколі не быў адбудаваны. Такі лёс павінен быў чакаць любую ерэтычную хованку. Той, хто захоча распачаць адбудову, павінен быць адлучаны[5].

III.i.e Працэс супраць жанчыны, якая падтрымлівала Вальдэнсаў, у 1230-х гг.

...ты, ... будучы верніцай ерэтыкоў-Вальдэнсаў і сяброўкай, тая, хто шматкроць прымала свядома незнаёмцаў... у сваім доме былі... многія схаваныя ерэтыкі з кнігамі і сандалямі... многія і многія разы прымала, ведаючы, што гэта ерэтыкі-Вальдэнсы, ела з імі, прымаючы пацалунак міру ад жанчын-Вальдэнак, ела таксама з імі хлеб, бласлаўлёны Вальдэнсамі, за Вячэрай Гасподняй у доме тваім, і слухала іх пагібельныя нагаворы, а менавіта супраць клятвы, правасуддзя, чыстца і малітваў за памерлых, і часткова верыла ў гэта, кажаш таксама, што верыла каля васьмі гадоў, што Вальдэнсы – добрыя людзі і сябры Бога, і ў стане выратавацца, і гэтаму выратаванню вучаць іншых, калі хто хацеў далучыцца да іх, і ты прымала іх па той прычыне, што верыла, што яны – добрыя людзі, хоць і магла пачуць, што яны Царквой перасследуюцца і вымушаны збягаць як ерэтыкі, і свецкія ўлады спальваюць іх, калі звярнуцца не хочуць...

Асуджаная на "дамашні арышт", пры парушэнні правіл якога можа быць прызнанай рэцыдывісткай і спаленая[6].

---

[3] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 55–56.
[4] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 56–58.
[5] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 58–59.
[6] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 59–62.

III.i.f Працэс супраць Вальдэнскай верніцы, асуджанай на турэмнае зняволенне

Гэта ўстаноўлена па прызнанні жанчыны, якая бачыла і ведала Вальдэнсаў абодвух полаў ад 16-і да 18-і гадоў, і чула, што і яны, і тыя, хто ім спрыяе, былі адлучаныя ў Царкве, і тым не менш пасля гэтага прымала іх у сваім доме, і слухала шмат разоў іх пропаведзі пра Евангеллі і Пасланні, і што клясціся – гэта смяротны грэх, і шмат разоў ела з імі, і дапамагала ім, і збірала на Вальдэнскую справу хлеб, віно і грошы для дома сяброў Вальдэнсаў, і па даверлівасці думала, што яны – добрыя людзі і змогуць выратавацца, і секта, і жыццё сваё, і шмат разоў прымала ад іх пацалунак міру, і ела хлеб і рыбу, бласлаўлёную Вальдэнсамі на Вячэры, і, у рэшце рэшт, прыйшла, выкліканая, і мы асуджаем яе на пажыццёвае зняволенне[7].

III.i.g Вальдэнская верніца, асуджаная на нашэнне двух крыжоў на сукенцы, 1244 г.

Паколькі адна жанчына, якая рабіла падарункі, як мы зрабілі высновы паводле дадзенага ёй самой прызнання, давала і дасылала Вальдэнсам хлеб, віно, садавіну, грошы і іншае, часта слухала пропаведзі і казанні, якімі Вальдэнсы навучалі і прапаведавалі, што любая клятва і забойства, нават па судовым рашэнні, з'яўляецца грахом, у сваім доме Вальдэнсаў шмат разоў прымала, аддала Вальдэнскай жанчыне кашулю сваёй памерлай дачкі, і з Вальдэнсамі ў адной сталовай і ў доме сваім па-сямейнаму ела і піла тое, што яны блаславілі па сваім звычаі, хворым Вальдэнскім жанчынам чытала Евангелле ад Святога Яна і "Quicumque vult" з дазволу галоўнага, больш за тое, спадзеючыся, што Вальдэнсы і іх памылкі выратуюць, і цвёрда ў гэта верыла шмат гадоў[8].

III.i.h Перадача ў рукі свецкіх уладаў трох Вальдэнскіх прапаведнікаў у 1240 г.

... якія называліся Вальдэнсамі або беднымі з Ліёна ... Паколькі прызналіся двое з іх, а менавіта Ян і Гірод (Guiraudus), якія між імі назваліся "абутымі ў сандалі", як толькі ўзнікне неабходнасць, маглі асвячаць Цела Гасподняе, нават калі не былі пасвечаныя ў святары паводле царкоўнага абраду. Што ж да трэцяга, па імені Понці Ламбардзец, не захацеў ні пацвердзіць, ні адмовіць. Але ж яны ўсе адзінадушна і згодна выспаведаліся, што верылі цвёрда і трымаліся, што нікому не дазволена дзеля свайго сапраўднага будучага выратавання даваць клятву, сцвярджаючы, што клятва забаронена ў любым выпадку. Звыш таго яна дадалі, што ніякаму прадстаўніку ўлады ці суда не дазволена нікога ні за якія ўчынкі да смерці прыгаворваць; хто ж так зробіць, ужо толькі за гэта варты геены. Агонь жа чыстца, у якім, як трымаецца і прапаведуе шчырасць нашай веры, павінны ачысціцца па боскім правасуддзі душы тых, хто, нават калі памерлі ў пашане, засталіся віннымі якую-небудзь кару, то яго цалкам і ўсюды адмаўляюць, вызнаючы памылкова, што

[7] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 42–43.
[8] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 63–65.

заступніцтва жывых мёртвым не карысна, калі толькі яно не патрабавалася тым, хто яшчэ намінальна жывы, ад жывых[9].

III.i.i Эксгумацыя[10] парэшткаў жанчыны, якая зрабіла тэстамент на карысць Вальдэнсаў

Паколькі зазначана праз сведкаў, што адна жанчына запаветвала па хваробе, ад якой памерла, свой плашч Ангеліне[11] Вальдэнцы, і 20 солідаў абшчыне бедных з Ліёна, то мы аб'яўляем, што яна была верніцай ерэтыкоў Вальдэнсаў, і таму павінна быць з магілы дастаная і з могілак верных [хрысціянаў] выкінутая[12].

III.ii Прысуды, вынесеныя інквізітарам Пятром Селанам у Керсі ў 1241–1242 гг.

Пётр Селан (Cellani) паходзіў з буржуазнай эліты Тулузы, быў заможным чалавекам і меў вопыт працы ў судзе графа Тулузскага. На момант правядзення следства ён ужо пакінуў свецкае жыццё і далучыўся да дамініканскага ордэна, меў каля 60-і гадоў. Пётр Білер мяркуе, што менавіта яго паважны ўзрост і адсутнасць спецыяльнай тэалагічнай падрыхтоўкі абумовілі адносна мяккія прысуды[13].

Тэксты ўтрымліваюць кароткія апісанні віны вернікаў катараў (у тэкстах фігуруюць проста як "ерэтыкі"). Вальдэнсы супрацьпастаўлены катарам і названыя сваім іменем. Абедзве групы вернікамі ўспрымаюцца як "добрыя людзі". Часта апытаныя прызнаваліся ў кантактах і з катарамі, і з вальдэнсамі адначасова. Паказальна, што апісаныя выключна вернікі-міране. У канцы кожнага тэксту запісана накладзенае інквізітарам пакаянне. У той час як "катарскія" вернікі-мужчыны прыгаворваліся да паломніцтва ў Канстанцінопаль (для абароны Лацінскай імперыі)[14], а жанчынам загадвалі насіць нашытыя на вопратцы крыжы да канца жыцця, вальдэнсаў жа (як і некаторых катараў) адпраўлялі ў больш блізкія паломніцтвы[15]. Ніводнага смяротнага прысуду ці пажыццёвага зняволення не зафіксавана (што суадносіцца з адсутнасцю прызнанняў "дасканалых" і "рэцэдывістаў"). У той жа час нельга выключыць, што такія выпадкі былі, проста запісы пра іх не дайшлі да нашага часу.

---

[9] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 65–67.

[10] Таксама з Лангедока маюцца звесткі пад 1231 г. пра эксгумацыю Гальвана, "Вялікага Архімандрыта Вальдэнсаў", спаленне парэшткаў і руйнаванне яго дома. Taylor, "A Presence in Languedoc," 44.

[11] Слова "anageline", якое стаіць у арыгінале, не мае прамога перакладу з лацінскай мовы, але паводле склону яно дастасавана да "вальдэнцы", таму я мяркую, што гэта імя.

[12] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 46.

[13] Peter Biller, "Inquisitors' Interrogations of Waldenses," in *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*, vol. 103 (Leiden: Brill, 2022), pp. 354–393, 364–365.

[14] Feuchter, "The Heretici of Languedoc," 117.

[15] *L'inquisition en Quercy*, 24.

Шанаваў многіх ерэтыкоў і еў з імі, а таксама бачыў Вальдэнсаў і калі-нікалі слухаў іх словы[16].

... аднойчы прымаў Вальдэнса Пятра з Вальса[17] ў сваім доме, каб той паклапаціўся пра яго хворага сына[18].

Гіёма з Віны прымала ерэтыкоў у сваім доме, і пасярэднічала ў падрыхтоўцы[19], і бачыла ерэтыкоў шмат разоў і ў розных месцах, і прымала мір з кнігі ерэтыкоў[20], і там іх шанавала. І верыла, што яны – добрыя людзі. І бачыла шмат разоў Вальдэнсаў і слухала іх пропаведзі, і давала ім хлеб і віно, і прымала нейкага Вальдэнса ў сваім доме[21].

Гальтэр Архембо бачыў ерэтыкоў шмат разоў і ў розных месцах, слухаў іх пропаведзі і часта еў з імі і часта іх шанаваў, і шмат разоў прымаў пацалунак міру ад ерэтыкоў, і прысутнічаў на двух ерэтыкалізацыях[22], і прывёў Вальдэнсаў да ерэтыкоў у свой дом, каб яны правялі дыспут, і суправаджаў ерэтыкоў, і быў іх ахоўнікам, настолькі шмакроць іх шанаваў, і еў з імі, і даваў ім ад сваёй маёмасці, і слухаў іх пропаведзі, што не памятае, колькі разоў, і верыў, што яны – добрыя людзі і што з імі выратуецца, і калі давядзецца паміраць, то хацеў бы памерці ў іх на руках. Павінен правесці 5 гадоў у Канстанцінопалі, насіць крыжы і рабіць паломніцтвы, як і іншыя, і на ўсё жыццё заставацца бедным[23].

Гіём з Гадора бачыў Вальдэнсаў і слухаў іх тры дні, і еў з тымі, хто быў прыгавораны да выгнання, і верыў, што яны – добрыя людзі. І бачыў ерэтыкоў і слухаў іх пропаведзі[24].

... раілася з ерэтыкамі наконт хваробы сваёй дачкі, і перадала ім салёнай рыбы[25].

Б. Бональд бачыў Вальдэнса Пятра з Вальса і слухаў яго пропаведзі, і паверыў тады, што чалавек не павінен клясціся, і ў сваім доме прымаў ерэтыка Тасета з Ножа і дыскутаваў з ім, і параіў яму секту Вальдэнсаў[26].

Правіў абутак Вальдэнсаў[27].

Пана столькі разоў прымала Вальдэнсаў, што не можа палічыць, і была гасціннай гаспадыняй для Вальдэнсаў, і дала ім незлічоную колькасць хлеба і віна, і правяла ў сваім доме дыспут паміж Вальдэнсамі і вернікамі ерэтыкоў, і шанавала Пятра з Вальса як анёла Божага[28].

Петрона, жонка Раймунда Яна, прывяла Вальдэнса Пятра з Вальса ў свой дом, і прымала яго там, і давала яму есці і піць, і слухала яго там, і прымала тры тыдні

---

[16] *L'inquisition en Quercy*, 34.

[17] Жан Дзюверная лічыць, што гэта імя можа быць адсылкай да заснавальніка руху – Вальдэса. *L'inquisition en Quercy*, 27.

[18] *L'inquisition en Quercy*, 36.

[19] Катарскі рытуал публічнай споведзі.

[20] Маецца на ўвазе "пацалунак міру", які мог перадавацца не напрамкі, а праз пацалунак кнігі.

[21] *L'inquisition en Quercy*, 40.

[22] Маецца на ўвазе катарскі рытуал суцяшэння.

[23] *L'inquisition en Quercy*, 56.

[24] *L'inquisition en Quercy*, 58.

[25] *L'inquisition en Quercy*, 58.

[26] *L'inquisition en Quercy*, 64.

[27] *L'inquisition en Quercy*, 66.

[28] *L'inquisition en Quercy*, 68.

вальдэнку Геральду. І верыла, што тая добрая жанчына, і давала ёй са сваёй маёмасці. І бачыла ерэтыкоў, і давала ім хлеб, віно і арэхі[29].

І ела хлеб, бласлаўлёны ерэтыкамі, і верыла тады, што ніхто не павінен клясціся ці забіваць[30].

Бернард з Разэ сказаў, што нейкі Вальдэнс памыў яму галаву, і два разы даваў Вальдэнсам свой хлеб і прыгатаванае мяса[31].

Р. з Барнака бачыў шмат разоў многіх Вальдэнсаў у розныя часы і прымаў у сваім доме месяц сваю цешчу-вальдэнку[32].

Таксама бачыў Вальдэнсаў, якія публічна прапаведавалі...[33]

Гіёма з ля Барты бачыла Вальдэнак, і давала ім са сваёй маёмасці, і слухала іх пропаведзі, і верыла, што яны – добрыя жанчыны, і чула ад іх, што не належыць ні клясціся, ні забіваць, і верыла, што гэта добра[34].

Бернарда Фабрыса зняла нейкі дом для Вальдэнсаў, і яны жылі там каля года. Таксама казала, што Вальдэнсы прыходзілі да яе дадому і наадварот, і вучылі яе, каб не клялася і не падманвала. Таксама сказала, што верыла, што яны – добрыя людзі, і часта давала Вальдэнсам хлеб і віно[35].

Гіём Геральд, сын Уга Геральда, сказаў, што калі хварэў, меў Вальдэнскіх урачоў, і даваў ім са сваёй маёмасці, і шмат разоў бачыў Вальдэнсаў[36].

С. Геральд сказаў, што раіўся з некаторымі Вальдэнсамі наконт сваёй хваробы. Таксама, што запрашаў Вальдэнсаў, і паколькі яны не хацелі прымаць [грошай?], то даслаў ім віна. І бачыў шматлікіх ерэтыкоў[37].

П. з ля Барэйры бачыў Вальдэнсаў, і слухаў іх пропаведзі, і ўдзельнічаў у Вальдэнскай вячэры, і еў хлеб і рыбу, бласлаўлёную імі, і піў іх віно. Таксама іншы раз удзельнічаў у іх вячэры і еў, як апісана вышэй, і слухаў іх пропаведзі, і даваў ім шмат міласціны, і верыў, што яны – добрыя людзі, і прымаў [пацалунак] міру ад іх, і даваў ім шмат разоў паесці ў сваім доме, і начавалі яны там шмат разоў[38].

П. Лан Старэйшы казаў, што бачыў Вальдэнсаў і даваў ім міласціну, і жонка яго аддалася Вальдэнсам у смерці і была пахавана на іх могілках. Але яго там не было, як ён сцвярджаў. І бачыў Вальдэнсаў у іншым месцы[39].

Таксама прысутнічаў пры ерэтыкалізацыі ерэтыкоў і Вальдэнсаў[40].

Якаў Карбанэль сказаў, што наведваў школу Вальдэнсаў і чытаў з імі. Таксама ўдзельнічаў у дыспуце ерэтыкоў з Вальдэнсамі, і еў хлеб і рыбу, бласлаўлёную імі, і віно піў, і так было дванаццаць гадоў ці каля таго. І верыў, што Вальдэнсы – добрыя людзі, да таго часу, пакуль Царква іх не забараніла[41].

---

[29] *L'inquisition en Quercy*, 68.
[30] *L'inquisition en Quercy*, 92.
[31] *L'inquisition en Quercy*, 92.
[32] *L'inquisition en Quercy*, 98.
[33] *L'inquisition en Quercy*, 102.
[34] *L'inquisition en Quercy*, 106.
[35] *L'inquisition en Quercy*, 122.
[36] *L'inquisition en Quercy*, 124.
[37] *L'inquisition en Quercy*, 126.
[38] *L'inquisition en Quercy*, 128.
[39] *L'inquisition en Quercy*, 130.
[40] *L'inquisition en Quercy*, 130.
[41] *L'inquisition en Quercy*, 132.

Б. з Каравы казаў, што падчас хваробы атрымаў ад Вальдэнсаў мазь. Таксама ўдзельнічаў у вячэры Вальдэнсаў і так, як апісана вышэй. Таксама слухаў казанне пра Пакуты [Хрыстовы] ад Вальдэнсаў у Вялікую Пятніцу. Таксама даваў міласціну Вальдэнсам. Таксама верыў, што яны – добрыя людзі, і ў веры іх магчыма выратавацца[42].

Гіём з Катусы сказаў, што калі яго брат і дачка былі хворыя, то ён прывёў у свой дом Вальдэнсаў, каб яны пра іх паклапаціліся. Таксама слухаў тлумачэнне Евангелля ад нейкага Вальдэнса. Таксама аднойчы Вальдэнсы прыйшлі закляпаць бочкі, і за гэта ён даў ім паесці. Таксама калі-нікалі хацеў даваць ім міласціну, але не захацелі ўзяць. Таксама калі-нікалі прымаў ад іх [пацалунак] міру і калі-нікалі слухаў іх казанні. Таксама верыў, што яны – добрыя людзі, і тое, што яны казалі і рабілі, яму падабалася[43].

Доміна з Кута бачыла, як Вальдэнсы публічна прапаведуюць, і дала і міласціну, і прыйшла ў дом, дзе яны спыніліся, і слухала іх пропаведзь, і шмат разоў прыходзіла да іх наконт аднаго хворага. Таксама двойчы ў Вялікую Пятніцу прыходзіла да Вальдэнсаў і слухала іх пропаведзь, і выспаведала аднаму Вальдэнсу свае грахі, і прыняла пакаянне ад Вальдэнсаў. Таксама верыла, што яны – добрыя людзі. Таксама бачыла ерэтыкоў і ела з імі вішні, і яны казалі ёй, што яны ізноў далучаныя [да Царквы]. Таксама ў іншым месцы бачыла шмат ерэтыкоў. Таксама ела хлеб, перахрышчаны Вальдэнсамі[44].

Геральда Агера дала Вальдэнсам два хлябы і грошай на віно[45].

Дуранд Курта раіўся з Вальдэнсамі наконт сваёй хваробы. Таксама Вальдэнсы ўночы прыходзілі да яго дадому, і ён слухаў іх пропаведзі[46].

Бернарда, жонка А. Капра, бачыла Вальдэнсаў, і вячэрала з імі ў Вялікі Чацвер ды слухала іх пропаведзі, і таксама ў Вялікую Пятніцу слухала іх пропаведзі. Таксама сказала, што Вальдэнсы клапаціліся пра яе, калі яна была хворая, і часта давала ім хлеб, віно і мяса, і верыла, што яны – добрыя людзі[47].

Таксама сказала, што пазвала аднаго Вальдэнса да сябе дадому і раілася з ім наконт сваёй хваробы, і даслала яму адзін збан віна. Сказала аднак, што не верыла ні Вальдэнсам, ні ерэтыкам[48].

Бертранд Бадо бачыў Вальдэнсаў і слухаў пропаведзь адной Вальдэнскай жанчыны. Таксама шмат разоў слухаў пропаведзь Вальдэнсаў на плошчы ў Мантабане. Таксама калі прыйшоў да іх[49], даведаўся ад іх, што яны з царквы выгнаныя. Таксама адзін Вальдэнс прыходзіў да яго дадому[50].

Шмат разоў наведвала хворых Вальдэнсаў і была на Вальдэнскім пахаванні і слухала іх пропаведзі[51].

---

[42] *L'inquisition en Quercy*, 134.
[43] *L'inquisition en Quercy*, 136.
[44] *L'inquisition en Quercy*, 144.
[45] *L'inquisition en Quercy*, 160.
[46] *L'inquisition en Quercy*, 166.
[47] *L'inquisition en Quercy*, 182.
[48] *L'inquisition en Quercy*, 190.
[49] Няма дакладнага апісання, куды можна было прыйсці "да вальдэнсаў". Пётр Білер мяркуе, што ў Мантабане ў вальдэнсаў быў цэлы комплекс накшталт мужчынскага і жаночага кляштараў, а таксама шпіталя (Biller, "Helping the Poor and Healing the Sick," 429).
[50] *L'inquisition en Quercy*, 192.
[51] *L'inquisition en Quercy*, 212.

III.iii Апытальнік для Вальдэнсаў

Ананімны апытальнік для выяўлення вальдэнсаў захаваўся ў манускрыпце ўніверсітэцкай бібліятэкі ў Празе, побач з тэкстамі Давіда Аўгсбургскага, датуецца прыкладна другой паловай XIII ст.

1. Гэта можна запытацца ў Вальдэнсаў

1. Ці яны бедныя ліёнцы, а можа ламбардцы ці ўльтрамантаны.
2. Ці Рымская Царква – гэта Царква Хрыста ці блудніца.
3. Ці займае Папа пасаду Блажэннага Пятра, і ці можа ён аберагаць лепш, чым іншы чалавек.
4. Калі хто-небудзь з'яўляецца добрым чалавекам, ці можа ён выратавацца, трымаючыся веры Рымскай Царквы; ці займае хто-небудзь месца Святога Пятра на зямлі, хто можа вязаць і развязваць і хто гэта; ці які-небудзь добры чалавек можа асвячаць Цела Хрыстова, не будучы пасвечаным, і іншыя царкоўныя таінствы здзяйсняць.
5. Ці немаўляты будуць выратаваныя без хрышчэння ў Рымскай Царкве, і наконт таінстваў.
6. Ці Царква Божая сапсаваная з часоў Сільвестра, і хто аднаўляе яе.
7. Ці быў Папа Сільвестр Антыхрыстам.
8. Хто пераняў у спадчыну ўладу Блажэннага Пятра вязаць і развязваць.
9. Ці з'яўляюцца бедныя Вальдэнсы, ламбардцы ці ўльтрамантаны Царквой Божай.
10. Ці задзіночанне катараў – Царква Хрыстова,
11. Ці павінны быць чыны ў Царкве Божай і нейкае памазанне ў тваёй [Царкве/секце].
12. Пра індульгенцыі і паломніцтвы, якія робіць Царква.
13. Пра іконы, крыж і дарогу за мора[52].
14. Пра пастанаўленні Рымскай Царквы,
15. І пра ўжыванне мяса падчас Вялікага Посту.
16. Ці святы Лаўрэнцій – святы.
17. Хто даў табе права прапаведаваць.
18. Ці перасяляюцца душы.
19. Ці з'яўляецца смяротным грахом браць за жонку родную па крыві.
20. Ці карысна для памерлых, што знаходзяцца ў чыстцы, правесці тысячу імшаў і даць тысячу рымскіх фунтаў на ахвяраванні.
21. Ці будзе мець высокую вартасць перад Богам той, хто за свае грошы пабудуе тысячу цэркваў.
22. Ці будзе смяротным грахом разбурыць усе матэрыяльныя цэрквы і спаліць усе крыжы.
23. Пра суд; і хто навучыў цябе казаць, што суд – зло.
24. Пра клятву як выратаванне для пераможанага чалавека.
25. Ці навучалі дактрыне бедных з Ліёна.
26. Ці хочаце вы адрачыся [ад гэтага вучэння] і быць у Рымскай Царкве.

---

[52] Маецца на ўвазе паломніцтва ў Святую Зямлю.

11. Памылкі бедных з Ліёна ці ламбардыаў

1. Бедныя з Ліёна ці ламбардцы кажуць, што ўсе клятвы забароненыя.
2. Асуджаюць свецкі суд.
3. Проста міранін можа асвячаць Цела Хрыстова, і тое самае кажуць пра жанчын.
4. Бедныя Ламбарцы кажуць, што сярод іх ёсць тыя, хто не мае смяротнага граху.
5. Таксама, што Рымская Царква – Царква зла, звер і блудніца, што была прадказана ў Апакаліпсісе,
6. І таму няма ніякага граху есці мяса ў Вялікі Пост,
7. І не служыць устаноўленаму Царквой.
8. Таксама немаўляты будуць выратаваныя без хрышчэння[53].

III.iv Прызнанне Раймунда дэ ла Косты і яго паплечнікаў

Раймунд дэ ла Коста, названы яшчэ "са Святой Веры" (Raymundus de Costa, aliter dictus de s. fide) быў злоўлены інквізітарам Жакам Фурнье (будучым Папам Рымскім Бенедыктам XII) у 1318 г. разам з яшчэ трыма паплечнікамі. Гэта быў вальдэнс у чыне дыякана (не каталіцкага), з пэўным узроўнем тэалагічнай падрыхтоўкі і нават з некаторымі літургічнымі тэкстамі пры сабе. Звесткі, атрыманыя ад яго, радыкальна адрозніваюцца ад тых, што даюць астатнія крыніцы. Магчыма, яны былі дадзеныя пад катаваннямі або ў спробах зменшыць сваю віну / абараніць паплечнікаў.

III.iv.a Раймунд дэ ла Коста, 1318 г.

У год Божы 1318

Гэта артыкулы, у якіх названы Раймунд дэ ла Коста, таксама празваны "са Святой Веры", дыякан секты бедных з Ліёна, прызнаўся на судзе ў прысутнасці Уладара біскупа і брата Гальярда з Пам'е, што меў месца пры Уладары інквізітары Каркасона, таго самага Раймунда, які ў адказ на пытанні названага Уладара біскупа вызнаў наступныя памылкі:

Па-першае, ён сказаў, што калі ён дасць клятву казаць праўду, то верыць, што ён смяротна саграшыць, хоць і не вельмі цяжка. Таксама ў Новым Запавеце, калі хто-небудзь клянецца калі-небудзь з любой прычыны – смяротна грашыць, бо гэта ідзе супраць прадпісання Бога не клясціся ні ў якім разе. Таксама сказаў, што калі хто-небудзь загадае яму даць клятву ці хто-небудзь іншы дасць клятву або прымусіць яго ці каго іншага зрабіць гэта, грашыць у той жа меры. Таксама сказаў, што ўся Рымская Царква, якая загадвае і нават прымушае людзей клясціся, смяротна грашыць, хоць і не вельмі цяжка. Таксама сказаў, што Царква ці хто заўгодна, хто кажа, што можна клясціся, грашаць супраць веры Хрыстовай у гэтым. Таксама сказаў, што той, хто церпіць пераслед або прыме смерць з-за таго, што не хоча даць клятву па любой прычыне, з'яўляецца пакутнікам за Хрыста.

---

[53] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 185–187.

Таксама, што той, хто пераследуе або адпраўляе на смерць каго-небудзь, хто не хоча клясціся ні ў якім разе, з'яўляецца забойцам, бо забівае таго, хто правільны і нявінны, і складае кампанію тым, хто кідаў камяні ў Святога Стэфана...

Таксама сказаў, што паколькі Рымская Царква памыляецца ў веры, кажучы, што дазволена клясціся, і што ёсць чысцец у іншым жыцці, то ёй не належыць падпарадкоўвацца, акрамя выпадкаў, калі прымае тое, што згодна з Богам, або ў выпадку сумненняў, ці тое па волі Божай або не, і па нязначных пытаннях, роўна да таго моманту, пакуль не акажацца, што Уладар Папа і іх Галоўны (Major) заяўляюць процілеглае, то належыць абраць заяўленае іх Галоўным, а не Уладаром Папам...

Звяртаўся як да Рымскай Царквы па ўсе таінствы, так і да ерэтычнай, за выключэннем таінства пакаяння.

Таксама казаў, што іх Галоўны атрымлівае сваю ўладу і правы наўпрост ад Бога, а не ад Уладара Папы, ... і праз гэта ён не трапляе пад судовую юрысдыкцыю Уладара Папы і не павінен яму падпарадкоўвацца, калі яго загады не супадаюць з Божымі, хоць прызнае, што Рымскі Пантыфік ёсць і будзе галавой Царквы...

Таксама сказаў, што яны па той прычыне не вяртаюцца да веры і еднасці Рымскай Царквы, бо вераць, што іх вера адпавядае Боскаму Пісанню, і баяцца Бога пакрыўдзіць, калі да Рымскай Царквы павернуцца; сказаў, аднак, што не хацеў тым зняважыць Рымскую Царкву, што сказаў, што яна не адпавядае Боскаму Пісанню. Таксама сказаў, што, калі Рымская Царква павернецца да іх веры, то тады стане Царквой, якую Хрыстос абраў. Таксама сказаў, што Рымская Царква нядобрая, бо не верыць таму, чаму яны вераць, і таму што іх пераследуе.

Таксама сказаў, што не верыць, што хто-небудзь можа быць святым, калі ён кананізаваны Рымскай Царквой...

Таксама кажа, што, хоць Уладар Папа і мае ключы ад Царства Нябеснага і адлучыў іх (Вальдэнсаў) за іх непадпарадкаванне і за тое, што яны кажуць, што забаронена клясціся, і адмаўляюць чысцец, але гэта не значыць, што яны не змогуць увайсці ў Царства Нябеснае, бо няма ніякага зла на іх ні ў веры, ні ў звычаях, таму не можа іх справядліва і законна адлучыць, і яго словы не з'яўляюцца справядлівымі і законнымі; пасля гэтага дадаў, што гэтае выказванне справядлівае, бо, калі іх Галоўны праводзіць імшу, не зважае на тое, як Уладар Папа загадаў імшы праводзіць... Таксама, што чалавек адлучаецца толькі праз благія справы, і толькі гэта можа вывесці яго па-за межы супольнасці вернікаў.

Таксама, што ў Царкве існуюць толькі тры чыны: дыяканат, прэсвітарыят і біскупства, і што біскуп у іх Царкве называецца Галоўны (Majoralis[54]) або міністр. ... Таксама кажа, што над імі біскуп павінен прызначаць Галоўнага, прэсвітара і дыякана, але, калі нікога з Галоўных не будзе ў жывых, тады прэсвітар са згоды ўсіх прэсвітараў і дыяканаў можа пасвяціць на ўзроўні Пантыфіка. Таксама сказаў, што сярод іх пасвячаюць Галоўнага наступным чынам: дамовіўшыся пра абранне, усе, укленчыўшы, моляцца за яго, прамаўляючы "Ойча наш", затым спачатку спавядаецца таемна ва ўсіх сваіх грахах, затым публічна ў грахах агульных, затым Галоўны, калі ён прысутны, або які-небудзь прэсвітар, молячыся і прамаўляючы "Ойча наш", накладае рукі яму на галаву, каб прыняў Духа Святога, і пасля гэтага ўсе іншыя, як прэсвітары, так і дыяканы, накладаюць рукі яму на галаву, і так ён становіцца пасвечаным, як ён сказаў, у біскупскі чын, не апранаючы на

[54] Звычайна пад такой формай мелася на ўвазе інстытуцыя, але тут аўтар выкарыстоўвае як сінонім да Major. Абодва словы будуць дадзены ў аднолькавым перакладзе "Галоўны".

яго нічога, як гэта робіцца ў Царкве, і не ўскладаючы яму на галаву Евангелле, не памазваючы яму галаву і рукі, і не перадаючы яму ніякіх інсігній ад пантыфіка цялесна і дзейсна, а толькі духоўна і праз веру, і кажучы яму словы, якія абазначаюць інсігніі пантыфіка, з вялікай урачыстасцю. І, як сказаў, верыў, што пасвечаны такім чынам з'яўляецца сапраўдным біскупам, як і пасвечаны ў Рымскай Царкве. Сказаў таксама, што так былі пасвечаныя Павел і Варава, і іншыя ў першаснай Царкве. Таксама сказаў, што іх галоўны адзіны можа праводзіць таінствы пакаяння, пасвячэння і еўхарыстыі. Таксама сказаў, што названы Галоўны можа адпусціць любыя грахі, якія былі яму выспаведаныя, не важна, якія яны. ... Калі ён адпускае, ён кажа: "Бог можа адпусціць табе ўсе твае грахі" ... але не кажа "Я сам адпускаю табе". ... [Іх святары, пасвечаныя галоўным, не могуць здзяйсняць імшы, але толькі слухаць споведзі (без накладання пакаянняў). Пасвечаны такім жа чынам дыякан не можа нічога, акрамя як прыслужваць святарам і галоўным]. Таксама, што іх галоўны асвячае Цела Хрыстова толькі на Вялікдзень, але не робіць і не прамаўляе нічога больш за тое, што сказаў і зрабіў Уладар на Тайнай Вячэры, калі ён пераўтварыў хлеб і віно ў Цела і Кроў. І ў Чысты Чацвер толькі галоўнаму дазволена бласлаўляць хлеб, рыбу і віно, якія даюцца толькі тым, хто належаць да секты. Таксама, што ніхто не можа ўспрымацца за біскупа, святара або дыякана, калі мае жонку, і калі ён будзе пасвечаны, то яго пасвячэнне будзе не дзейсным.

Таксама, што няма чыстца пасля смерці, а што душы людзей пасля смерці кіруюцца толькі ў рай або пекла... Таксама, што малітвы, ахвяры, міласціна і добрыя справы не карысныя нікому пасля смерці... Таксама сказаў, што ў вышэйсказанае не верыць ні Аўгусціну, ні Амвросію, ні Грыгорыю, ні Рымскай Царкве, бо ў гэтым яны памыляюцца. Таксама, што ён не ведае, у чым карысць пахавання вернікаў у цэрквах ці на могілках.

Таксама сказаў, што ніхто не можа быць у стане дасканаласці, калі ён не пасвечаны ў дыяканы, нават калі ён даў аброк беднасці, чысціні і падпарадкавання... Таксама, што прырода зароку беднасці ў тым, што той, хто зарокся, не жыве з працы сваіх рук, і што ён не павінен нічога мець сам ці ў агульным.

Таксама, што яны ні пры якіх абставінах не прымаюць цнатлівых дзяўчын або жанчын, бо яны не могуць ні прапаведаваць, ні станавіцца дыяканамі; таксама не прымаюць тых, хто быў жанаты, з-за небяспекі, што яны будуць не ў стане жыць у чысціні і ўстрыманні.

Таксама сказаў, што іх Галоўны мае ўладу прапаведаваць Евангелле ад Бога, які яе перадаў Святому Пятру ... Таксама, што іх Галоўны можа даваць уладу прапаведаваць Евангелле, і што ён дае яе прэсвітарам.

Таксама, што калі ён [Папа] абвінаваціць каго-небудзь перад свецкім судом з прычыны, з якой той можа быць забіты ці пакалечаны, ён верыць, што ён саграшыць. ... Таксама сказаў, што з таго, што Гасподзь сказаў "вярні меч твой" (Мф 26:52), усе цялесныя забойствы злачынцаў былі забароненыя Уладаром Нашым Ісусам Хрыстом.

Таксама сказаў, што пасля раскрыцця гэтай запаведзі "калі хто не народзіцца згары, ня можа ўбачыць Царства Божага" (Ін 3:3), ніхто не зможа выратавацца, нават калі прыняў смерць за Хрыста, ці па знешніх прычынах не змог прыняць таінства хрышчэння, акрамя як хрышчоны ў вадзе.

Таксама сказаў, што без памазання на ілбе можа быць канфірмаваны і што робіць гэта з павагі да таінства, а не з неабходнасці.

Таксама, што ўсе парадкі могуць быць пацверджаны без вызначанай слоўнай формулы, а толькі праз накладанне рук і без пацвярджэння аніякімі іншымі прадметамі, якія перадаюцца ад біскупа да пасвечанага[55].

Вучэнне Галоўнага ў тым, калі пасылае сваіх прэсвітараў прапаведаваць, каб навучалі і настаўлялі сваіх вернікаў, каб хадзілі на імшы да святароў, падпарадкаваных Рымскай Царкве, для таго, каб там слухалі пасланні, якія Святы Дух прамаўляў праз вусны апосталаў і прарокаў, і Евангелле, што Гасподзь прамовіў, нават калі відавочна, што яны не змогуць іх зразумець, бо яны прамаўляюцца на лаціне, але тое добра, што яны слухаюць і вераць, бо гэта – словы Духа Святога; таксама, што яны могуць маліцца больш таемна, пад вялікім сакрэтам і вельмі ўважліва, чым у сваім доме, бо там ім перашкаджаюць мірскія справы; у царкве ж яны могуць бачыць Цела Госпада нашага Ісуса Хрыста, якому трэба пакланяцца і ўшаноўваць, бо гэта прывядзе іх да добрай веры і ачысціць ад граху; там таксама могуць слухаць "Ойча наш", які, калі не ведаюць, то лепш змогуць завучыць, і пасля канца службы няхай прымаюць бласлаўленне ад святара ў імя Святой Тройцы. Таксама сказаў ім, што навучаюць вернікаў, што, калі захварэюць, каб пасылалі па святара, пасвечанага Рымскай Царквой, спавядалі яму свае грахі, прымалі прычасце і апошняе мірапамазанне з яго рук.

... верыць, што Рымская Царква мае ўсе таінствы і можа іх здзяйсняць, і што здзейсненае ёй мае такую ж эфектыўнасць і вартасць, як і праведзенае Святым Пятром ... як і яго Царква ...

Пра тое, што іх Галоўны не хоча падпарадкоўвацца Папу, бо Папа кажа, што існуе чысцец і можна клясціся, што іх Галоўны адмаўляе, і таксама паколькі Папа не дазваляе, каб яны трымаліся дарогі беднасці, як ён і яго абралі для сябе.

У дачыненні да дыяканскага чына Галоўны прымае згодна са сваім станам, і стан гэты называецца бедны ў Хрысце, пасвечаны праз яго ў дыяканы, бо да пасвячэння ў стан дыякана стан яго ніякі, і прыняцце ў гэты стан адбываецца толькі праз прыняцце зароку беднасці, які там даецца, і дапасуе чалавека да яго стану, і неабходны для яго стану. Калі хто-небудзь пасвечаны ў дыяканы, прэсвітары ці біскупы ў Рымскай Царкве, і хоча перайсці да (Вальдэнскага) стану, то іх Галоўны не перапасвячае такога чалавека, але той толькі павінен прынесці зарокі чысціні, беднасці і падпарадкавання названаму Галоўнаму і яго таварышам, і гэта яго абавязкі перад сваім станам, бо належыць, каб ён іх прытрымліваўся, калі Бог даў яму сваю міласць, быць і захоўваць свой стан да самай смерці. ... Калі мае маёмасць, перад тым, як стаць дыяканам, належыць, каб раздаў усё, што мае ад мужчын і жанчын, робячы міласціну ў імя Божае, бо існуючы ў іх (дыяканскім) стане нічога ўвогуле не можа мець. Галоўны не мае нічога ва ўласнасці. І яны не складаюць тэстаментаў. І не пакідае нічога на заўтрашні дзень, за выключэннем таго, што яму даюць, прымае, але толькі ў той колькасці, якую зможа выкарыстаць сам і таварышы яго для харчавання і адзення на вызначаныя дні ...

Ян Латарынгец, які быў тады іх Міністрам, зрабіў яго дыяканам, і ад таго, з кім ён быў пасля, на працягу двух гадоў ці каля таго вучыўся Боскаму Пісанню; і пасля двух гадоў названы Ян паслаў яго да іншых таварышаў, каб заставаўся з імі і ўмацоўваўся ў Боскім Пісанні, з кім ён заставаўся сем гадоў ці каля таго, і на працягу названага часу вучыў яго Міхаіл Італік, які памёр ...

---

[55] Döllinger, *Beiträge*, 125–133; фр. Duvernoy, *Le registre d'inquisition de Jacques Fournier*, 108–112; англ. *Raymond de Sainte-Foy*.

І Галоўныя не заводзяць маёнтка ў адным якім-небудзь месцы, але Галоўны пераходзіць з месца на месца ...

Галоўны не збірае капітула, на якім таварышы збіраюцца, але робіць вядомай таварышам волю сваю, але не пісьмова, але сам асабіста ходзіць або пасылае кагонебудзь са сваіх таварышаў да іх, бо ведае, дзе хто-небудзь з таварышаў памёр[56].

III.iv.b Ян з В'ен, ерэтык-Вальдэнс, 1319 г.

Тут выкладзеныя артыкулы ерэтыка, у якіх прызнаўся раней [каб запытацца], ці верыць у тое, што напісана.

1. Клясціся, кажучы праўду, калі чалавек знаходзіцца пад судом, і асабліва ў пытаннях веры, – грэх.

2. Чыстца не існуе ў іншым жыцці, у якім прабачальныя грахі ачышчаюцца і адбываецца выкупленне віны за смяротныя грахі, якія ў гэтым жыцці не былі цалкам выкупленыя.

3. Малітвы, імшы, міласціна і іншыя набожныя справы не карысныя для больш хуткага вызвалення душаў, якія існуюць у чыстцы за віну, якую яны [душы] нясуць на сабе за свае грахі.

4. Адлучэнне, зробленае можным паводле рытуалу і канона, супраць свайго падданага, не выключае адлучанага з Царства Божага і духоўных дабротаў, якія ёсць у Царкве.

5. Свецкія ці царкоўныя ўлады, калі здзяйсняюць свецкі суд, грашаць, забываючыся на сваіх падданых.

6. Не верыць, што з'яўляецца падданым Рымскага Пантыфіка, акрамя толькі, калі той загадвае тое ж, што і Бог.

7. У Царкве няма іншых чыноў, акрамя трох, а менавіта біскупства, прэсвітарыята і дэканата.

І яго пераконваў і настойліва ўгаворваў, што гэтыя артыкулы ерэтычныя, у якія, як ён сказаў, што ён верыў, і каб перастаў верыць і адрокся паводле царкоўнай формулы, а таксама адрокся ад усіх артыкулаў Вальдэнскай веры, і ўсіх іншых ерасяў, якія паўсталі супраць ведання Божага і Каталіцкай Апостальскай Рымскай Царквы. Ён адказаў, што жадае застацца ў гэтых вераваннях названых артыкулаў, у якіх прызнаўся вышэй, і не хоча ад гэтых вераванняў адракацца, але хоча застацца пры іх у жыцці і ў смерці[57].

III.iv.c Прызнанне Гіёма Эсканэрыя з Акса, 1320 г.

І сам еў з ім (ерэтыком) у адной сталовай ... І перад тым, як адправіцца ў ложак, названы ерэтык захацеў, каб выпіў з ім вады з адной шклянкі. І пасля таго, як сказаў адпраўляцца ў ложак, названы ерэтык шматкроць укленчыў над нейкай лаўкай, якая стаяла ля ложка ... І пасля таго, як ён пайшоў у ложак, названы ерэтык і названы Марцін навучалі яго, кажучы, што пакланяюцца названаму ерэтыку, укленчваючы перад ім і тройчы кажучы: "блаславі", што ён і рабіў над названай лаўкай, кажучы: "блаславіце, добрыя хрысціяне"[58].

---

[56] Döllinger, *Beiträge*, 106–109.

[57] Döllinger, *Beiträge*, 143–144; Duvernoy, *Le registre d'inquisition de Jacques Fournier*, 133–134.

[58] Döllinger, *Beiträge*, 145.

III.v Прысуды Тулузскай інквізіцыі ў 1320-х гг.

Даюцца вытрымкі з прысудаў, вынесеных вальдэнсам Тулузскай інквізіцыяй пад кіраўніцтвам Бернарда Гі і будучага Папы Рымскага Бенедыкта XII Жака Фурнье (Jacques Fournier) па выніку антыерэтычнай кампаніі, праведзенай у 1320-х гг.

Свінапас Стэфан

Свінапас Стэфан, сын нейкага Гвілельма Гібененса, паходжаннем з Ліёнскай саляварні ў Бургундыі, перавернуты ў ерась секты Вальдэнсаў ці бедных з Ліёна, як ён нам законна паведаміў праз сваё прызнанне, зробленае ў судзе, годзе Гасподнім 1314 месяцы лютым, і быў тады раней прыняты ў секту і рытуал Вальдэнсаў, якія інакш называюцца беднымі з Ліёна, нейкім Вальдэнсам, які быў выкліканы Крысцінам, у прысутнасці іншых Вальдэнсаў, якіх ён назваў у сваёй споведзі, каб быць прынятым Вальдэнсамі ў названую секту, у якой быў і працягвае знаходзіцца, каб служыць ім і трымацца іх сем гадоў ці каля таго, каб есці, і піць, і супольна жыць, і ўдзельнічаць разам з Вальдэнсамі названай секты і іх вернікамі, у розных месцах, гарадах і землях. Вось названыя Вальдэнсы, пра якіх ён бачыў і ведаў, што яны імі з'яўляюцца: вышэйназваны Крысцін, і Ян з Шало ці з Шабілона, які быў сярод іх старэйшым [далей ідзе спіс імёнаў, часам з указаннем мясцовасцей, часам прафесій, такіх, як кухар, бондар, клірык, "альбігойскай мовы", і г.д.], і нейкая жанчына, якая звалася Раймунда дэ Кастрыс (Raymunda de Castris), якая была з іх секты, і пра ўсіх названых ведаў, што яны – Вальдэнсы, і трымаюцца жыцця і секты Вальдэнсаў. Таксама чуў і ведаў, што Вальдэнсы, хоць і былі міранамі, не пасвечанымі біскупамі Рымскай Царквы, слухалі споведзі грахоў ад мужчын і жанчын іх секты, якія хацелі ім спавядацца, накладалі пакаянне на тых, хто выспаведаўся ў грахах, і тыя вальдэнсы казалі пра сябе, што маюць такую ж уладу ад Бога слухаць споведзі і накладаць пакаянні, як мелі апосталы, і не прызнаюць ні на грам, што яе мае Рымская Царква. Таксама названы Стэфан некалькі разоў спавядаў свае грахі некаторым з названых Вальдэнсаў, і прымаў ад іх пакаянне.

Таксама названы свінапас Стэфан адзін раз паслухаў споведзь аднаго з тых, каго назваў, і на яго наклаў пакаянне. Таксама ведае, што названыя Вальдэнсы не падпарадкоўваюцца Рымскай Царкве, і што не ад яе адкалолася іх секта, і што кажуць, што названая Рымская Царква паводзіць сябе няправедна, несправядліва і грэшна, бо іх пераследуе і асуджае. Таксама кажуць, і трымаюцца, і навучаюць паміж сабой, што Рымская Царква не можа іх адлучаць. Таксама названыя Вальдэнсы вераць і трымаюцца, што пакаянне і ачышчэнне ад грахоў магчыма толькі ў гэтым жыцці, а калі душа выходзіць з Цела, то кіруецца ў рай або ў пекла, і з гэтай прычыны названыя Вальдэнсы не ўзносяць малітваў, ні іншых добрых спраў на карысць мёртвых, бо кажуць, што ў тых, хто ў раі, у гэтым няма неабходнасці, а тым, хто ў пекле, гэта не дапаможа. Таксама названыя Вальдэнсы кажуць і трымаюцца, што Бог у Евангеллі забараніў усе клятвы без выключэння, і што ні ў якім выпадку чалавек не павінен клясціся ні ў якой ісціне ні на судзе, ні па-за ім, і што клясціся – тое заўсёды грэх. Таксама, што Бог забараніў рабіць усе суды. Таксама названы Стэфан верыў, што веры, секта і жыццё Вальдэнсаў – добрыя і

з'яўляюцца выратавальнай дарогай, на якой названыя Вальдэнсы і тыя, хто яе трымаюцца, змогуць выратавацца, хоць і ведаў, што Рымская Царква названую секту пераследуе і асуджае, і быў у такой веры дзесяць гадоў, і упарта за яе трымаўся, калі быў схоплены і прыведзены да інквізітара Тулузскага, і некаторы час пасля[59].

З пратакола Яна брэсана (brayssan)

Таксама вышэйназваная секта Вальдэнсаў не цэніць індульгенцыі, якія выдаюцца прэлатамі Рымскай Царквы[60].

З пратакола Перына (Perrinus)

... маліўся з імі, укленчыўшы на лаўцы, паводле іх звычаю і ладу маліцца перад прыняццем ежы і пасля[61].

З пратакола Манеты

Таксама некаторым з іх даваў нейкія грошы[62].

З пратакола Германа

Таксама многіх з названых Вальдэнсаў у іншых месцах, а не ў сваім доме [сустракаў]. Таксама некаторых з названых Вальдэнсаў звязваў то з адным месцам, то з другім. Таксама даваў нешта некаторым з названых Вальдэнсаў, і атрымліваў ад некаторых[63].

Вы ўсе названыя з аксітанскай дыяцэзіі, і вы так сур'ёзна па многіх пытаннях здзейснілі ерась, як вам даходліва зачытана і расказана на народнай мове[64].

З пратакола Перына цесляра

Таксама даў два соліды двум Вальдэнсам адзін раз, і іншыя два соліды прапанаваў іншым разам іншым Вальдэнсам, але яны не захацелі прыняць. Імёны ж Вальдэнсаў, якіх ён бачыў, такія: Крысцін Майенс (Cristinus Mayens) і Перын з Гудона (Perrinus de Gaudone), святар і яго паплечнік (socius ejus), і Ян Маран (Johannes Moran), і яшчэ адзін іх паплечнік, які называўся Белы.

З пратакола Яна Шавоя (Chauoat) і Перын з Вінцэнды

Таксама, што прэлатаў Рымскай Царквы, прыніжаючы іх статус, абвяргаюць і асуджаюць, кажучы, што яны сляпыя і вядуць сляпых, і не служаць Евангельскай праўдзе і не ідуць за апостальскай беднасцю. І з'едліва прыдумваюць, што сама Рымская Царква з'яўляецца прытулкам падману. Таксама саміх сябе параўноўваюць з апостальскім жыццём і дасканаласцю і вартасць прыпадабняюць, і сябе ў гэтым пыхліва ўсхваляюць, фанабэрліва заяўляючы, што трымаюцца і служаць Евангельскай і апостальскай беднасці. Таксама гэтаму і нечаму іншаму, настолькі ж памылковаму, наколькі бязбожнаму навучаюць таемна сваіх вернікаў у сваіх схованках. Таксама прапаведуюць з Евангелляў, Пасланняў і іншых частак Свяшчэннага Пісання, выкладаючы якое, апаганьваюць, як настаўнікі памылак, якія не

---

[59] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 200–201.
[60] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 208.
[61] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 222.
[62] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 224.
[63] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 225.
[64] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 227.

хочуць, каб іх вучні ведалі праўду, у той час як міранам забаронена пропаведзь і выкладанне Святога Пісання[65].

З пратакола Угуэты

Таксама, што ніякі чалавек не павінен быць асуджаны на смерць. Таксама, што адлучэнне, якое робіцца Царквой, і іншае ад Царквы нічога не вартыя. ... Таксама верыла і чула, што Вальдэнсы вераць, што названы Ян Латарынгец, хоць і не з'яўляецца святаром, але старэйшынай (majoralis) названай секты, можа праводзіць імшы[66].

З пратакола Якуба

... Гэты Варфаламей быў іх настаўнікам ... начавалі і вячэралі там, і бласлаўлялі ежу згодна са сваім звычаем, і пасля вячэры пайшлі ў нейкі пакой, дзе названы Варфаламей Вальдэнс казаў шмат слоў і ўгаворaў, што чалавек не павінен ні рабіць, ні казаць зла, ні клясціся, бо гэта грэх, і некаторыя іншыя рэчы, якія падаваліся добрымі, і пасля ўсе ўкленчылі на лаўцы і маліліся згодна са сваім звычаем малітвы. ... тады той Якуб запытаўся ў названага Варфаламея Вальдэнса, ці іх ордэн ухвалены Папам і Царквой, і ці маюць яны ад Уладара Папы, і названы Варфаламей адказаў яму, што не, толькі ад Бога і ні ад каго іншага[67].

З пратакола Хугі

Таксама пасля сняданку і пасля вячэры сама з іншымі персонамі, якіх назвала, малілася з гэтым Вальдэнсам адпаведна са звычаямі Вальдэнсаў, а менавіта ўкленчыўшы на лаўцы і прамаўляючы шмат разоў "Ойча наш". Таксама яе маці сказала ёй і ўгаварыла, каб яна выспаведала свае грахі названаму Вальдэнсу, і прыняла адпушчэнне і пакаянне праз тое, што пасцілася некалькі дзён і прамаўляла некалькі разоў "Ойча наш", і верыла, што атрымала адпушчэнне, што гэта пакаянне паспрыяе ёй для вызвалення душы так, як калі б святар ці капелан яе прабачыў і наклаў на яе гэта пакаянне, хоць верыла ці ведала, што названы Вальдэнс не быў святаром, пасвечаным біскупам Рымскай Царквы[68].

З пратакола ткачкі Жакеты

Таксама, што самі Вальдэнсы былі з тых вучняў, што паходзяць ад вучняў і апосталаў Хрыста, якім ён надаў уладу вязаць і развязваць, і што яны маюць тую ўладу, якую Хрыстос даў Святому Пятру і іншым пасля яго. Таксама, што капеланы і манахі не хочуць выразна патлумачыць людзям Пісанне і Закон, каб тыя маглі зразумець, бо там лепш уладарыць над народам, таму што калі выкладаць яўна і адкрыта закон Божы, як Хрыстос ім даручыў, то ў іх не будзе неабходнасці[69].

---

[65] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 264.
[66] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 290–291.
[67] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 345.
[68] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 357.
[69] Limborch, *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae*, 377.

III.vi Бернард Гі. Кіраўніцтва для інквізіцыі наконт ерэтычнай заганнасці

Бернард Гі (Bernardus Guidonis) быў дамініканскім манахам, біскупам і, галоўнае, папскім інквізітарам у Тулузе і ваколіцах у 1307–1323 гг. Яго кніга "Кіраўніцтва для інквізіцыі наконт ерэтычнай заганнасці" (Practica officii inquisitionis heretice pravitatis) – гэта не столькі інквізіцыйны падручнік, як прынята лічыць, бо тыя звычайна былі кароткімі, вельмі канкрэтнымі і мелі кішэнны фармат, а анталогія інквізіцыйнай справы, яе праслаўленне і дэманстрацыя яе значэння, неабходнасці і эфектыўнасці[70].

Гэта адна з самых важных крыніц па сярэднявечнай ерэсіялогіі[71]. Значнасць ёй надае той факт, што аўтар стараецца быць аб'ектыўным: ён абвяргае некаторыя абвінавачанні супраць вальдэнсаў як няслушныя, размяжоўвае "паклёп" і "сапраўднае" абвінавачванне ў ерасі. Напісана яна на аснове ўласнага інквізітарскага вопыту з дапаўненнямі з прац сваіх папярэднікаў (Стэфана дэ Бурбона – у частцы паходжання секты[72], Давіда Аўгсбургскага – у частцы, датычнай пропаведзі, і Райнэрыя Саконі).

II. Пра секту Вальдэнсаў

III.vi.1 Наступнае – пра секту Вальдэнсаў, і перш-наперш пра іх паходжанне і часы, калі пачалася

Вальдэнсы, або бедныя з Ліёна – секта і ерась, якая пачалася каля года Божага 1170-га; чый заснавальнік і стваральнік быў грамадзянін Ліёна, па імені Вальдэс (Valdesius) ці Вальдэнс (Valdensis), ад якога яго сектанты сталі так называцца, які Божымі справамі натхніўся і прапанаваў усім астатнім служыць беднасці і дасканаласці евангельскай, як служылі апосталы. І загадаў перапісаць для сябе Евангелле і некаторыя іншыя біблейныя кнігі на народнай гальскай мове, а таксама некаторых святых аўтарытэтаў: Аўгусціна, Іераніма, Амвросія, Грыгорыя, арганізаваных па загалоўках, да чыіх выказванняў сам і наступнікі апелююць, часцей чытаючы і менш разумеючы, [гэтым] завышаючы сваю значнасць, паколькі былі не вельмі пісьменнымі, узурпавалі апостальскія абавязкі і саманадзейна "па вуліцах і па завулках"[73] прапаведавалі Евангелле; і названы Вальдэс ці Вальдэнс падобным чынам саманадзейна прывязаў да сябе многіх людзей абодвух полаў, мужчын і жанчын, і сам адпраўляў прапаведаваць як быццам бы вучняў. Яны, будучы невукамі

---

[70] Biller, "Goodbye to Catharism?," 306.

[71] Осип Вайнштейн, *Западноевропейская средневековая историография* (Ленинград: Наука, 1964), 200–201; Александра Люблинская, *Источниковедение истории Средних веков* (Ленинград: Издательство Ленинградского университета, 1955), 307.

[72] Але і тут Бернард не проста капіруе, а "карэктуе" тэкст згодна са сваімі дадзенымі. Ён дадае варыянт напісання імя Вальдэса, піша, што рух пачынаўся не столькі з яго, колькі з яго паслядоўнікаў. Таксама змяншае ролю жанчын у руху. Пётр Білер мяркуе, што гэта адпавядала рэальнай гістарычнай сітуацыі. Peter Biller, "Why No Food? Waldensian Followers in Bernard Gui's *Practica Inquisitionis* and *Culpe*," in *Texts and the Repression of Medieval Heresy* (Woodbridge: York Medieval Press, 2003), pp. 127–146, 139.

[73] Алюзія на (Песн 3:2).

непісьменнымі, хадзілі па вёсках і заходзілі ў дамы, як мужчыны, так і жанчыны, на плошчах, а таксама і ў цэрквах, прапаведавалі, і, прапаведуючы, распаўсюджвалі вакол сябе шматлікія памылкі. Але яны былі выкліканы ліёнскім архібіскупам, спадаром Янам Праведныя Рукі[74], каб забараніць ім такую саманадзейнасць, але яны не захацелі падпарадкавацца, выстаўляючы напаказ сваё шаленства і кажучы, што належыць падпарадкавацца больш Богу, чым людзям, а той паслаў апосталаў прапаведаваць кожнаму стварэнню, дзёрзка кажучы, што яны як апосталы; лёгкадумна прысвоілі сабе ролю нашчадкаў апосталаў і прадаўжальнікаў ілжывай беднасці і падманную лічыну святасці на сябе нацягнулі, пасміхаючыся з прэлатаў і клірыкаў, паколькі тыя валодаюць багаццямі і жывуць у раскошы. Таксама з-за саманадзейнай узурпацыі права пропаведзі зрабіліся выкладчыкамі памылак, і хоць іх пераконвалі, каб яны спыніліся, яны даказалі сваё непадпарадкаванне і ўпартасць; і таму яны былі адлучаныя ад свайго горада і выгнаныя са сваёй радзімы. Нарэшце, на тым саборы, што прайшоў у Рыме ў Латэранскім саборы, калі былі прызнаныя па суду ўпартымі схізматыкамі і потым асуджаныя як ерэтыкі. Так яны ў мностве распаўсюдзіліся па зямлі, як па сваёй правінцыі, так і па блізкіх частках і ў межах Ламбардыі, аддзеленыя і выключаныя з Царквы, калі з іншымі ерэтыкамі змяшаліся і іх памылак набраліся, папоўнілі свае прыдумкі старымі ерэтычнымі памылкамі і ерасямі.

III.vi.2 Пра тры народныя назвы саміх Вальдэнсаў

Такім чынам, Вальдэнсы, або бедныя з Ліёна, або неабутыя (Insabbatati), секта так пайменаваная або называная ад імені першага заснавальніка ці стваральніка секты Вальдэса ці Вальдэнса; беднымі ж з Ліёна яны пайменаваныя або называныя па месцы, дзе яны пачалі і зарадзіліся; неабутымі таксама называюцца, таму што калісьці ад самага пачатку Вальдэнскія дасканалыя спецыяльны знак паказвалі, як быццам бы зразаючы верхнюю частку абутку, і гэтым знакам яны ад іншых сваіх набліжаных (complicibus) і вернікаў адрозніваліся; памылкі гэтай секты будуць далей дададзеныя, каб можна было загадзя надзейна прадумаць вышук і праверку.

III.vi.3 Пра памылкі Вальдэнсаў гэтага часу, бо раней мелі шмат іншых

Такім чынам, названыя Вальдэнсы ад пачатку былі ерассю і ўсё яшчэ ўпарта пагарджаюць царкоўнай уладай. І таму таксама яны былі нізвергнутыя адлучэннем і перададзеныя Сатане з-за сваіх шматлікіх памылак і папоўнілі свае прыдумкі старымі ерэтычнымі памылкамі і ерасямі. Такім чынам, гэтая секта ўтрымлівае шалапутных паслядоўнікаў (sectatores) і бязбожных святароў і пастулюе, што не падпарадкоўваецца ні Уладару Папу, Рымскаму Пантыфіку, ні іншым прэлатам Рымскай Царквы, аб'яўляючы, што Рымская Царква іх несправядліва і няправільна пераследуе і адлучае. Таксама аб'яўляюць, што яны таксама не могуць быць адлучаны рымскім пантыфікам і прэлатамі, і паслядоў-

[74] У тэксце прапушчаны этап кантактаў Вальдэса з архібіскупам Гвічардам. Невядома, ці аўтар паўтарае памылку Рычарда з Пуацье і Стэфана дэ Бурбона, ці наўмысна не згадвае той перыяд, калі Вальдэса прыхільна прымалі царкоўныя іерархі.

нікі і прафесары названай секты не павінны падпарадкоўвацца ніякім іх рэкамендацыям ці даручэнням, якія ад яе [Царквы] адступіліся і адмовіліся, хоць для Рымскай Царквы гэтая секта асуджаная як ерэтычная. Таксама яны трымаюцца і аб'яўляюць, што ўсе клятвы, як на судзе, так і па-за судом, без усялякага выключэння і агаворак, Богам забароненыя, недазваляльныя і грахоўныя па словах Святога Евангелля і Святога Апостала Якуба пра забарону клятвы, хоць гэта іх інтэрпрэтацыя павінна ацэньвацца як вар'яцкая і падманлівая, калі аднак паводле выратавальнай дактрыны святых дактароў Царквы і традыцыі, якую святая Каталіцкая Царква ўсталявала, для ісціны на судзе дазволена па неабходнасці клясціся; таксама супраць паказанай памылкі ўжо даўно выдадзена ў статуце: Калі хто не хоча клясціся, адмаўляючыся ад клятвы з-за рэлігійнай прымхі асуджэння, то з-за гэтага лічыцца ерэтыком [далей прыводзіцца спіс булаў].

Заўважана таксама, што гэтыя Вальдэнсы рэгулююць забарону наконт клятвы, што сярод іх магчыма клясціся пры ўмове смяротнай пагрозы, ці каб выратавацца і збегчы, ці таксама каб не выдаць іншых паслядоўнікаў ці каб не выдаваць сакрэтаў сваёй секты. Бо кажуць, што гэта непрабачальны грэх у Духу Святым – выдаваць каго-небудзь дасканалага са сваёй секты. Таксама з крыніцы памылак названай секты і ерасі аб'яўлена, што ўсе суды Богам забароненыя і адпаведна з'яўляюцца грахом, і [суды] выступаюць супраць Божай забароны, калі які-небудзь суддзя ў якім-небудзь выпадку па якой-небудзь прычыне чалавека асуджае на катаванні, праліццё крыві ці смерць, бо ў словах святога Евангелля так напісана: "Нікога не судзіце і не будзеце асуджаныя", а таксама "Не забі", і што-небудзь падобнае без належнага тлумачэння да гэтага прымяняюць, не разбіраючыся ў гэтым, не прымаючы ні тлумачэнняў, ні абгрунтаванняў, а менавіта, як святая Рымская Царква выратавальна тлумачыць і ў веры перадае паводле вучэння Айцоў і дактароў і святых канонаў. Таксама ад святых кананічных дэкрэтаў і пастановаў Найвышэйшага Пантыфіка і статутаў наконт правядзення пастоў і святаў, а таксама дэкрэтаў Айцоў названая секта ўхіляецца і не прымае правільны шлях і не лічыць яго належным, а абвяргае, адхіляе і асуджае. Таксама наконт таінства пакаяння і ключоў Царквы названыя паслядоўнікі, гібельна памыляючыся, кажуць, трымаюцца і вучаць, што самі маюць уладу толькі ад Бога і ні ад каго іншага, як апосталы мелі ад Хрыста, каб слухаць споведзі вышэйназваных мужчын, а таксама жанчын, якія ім ахвотна спавядаюцца, і адпускаць грахі, і накладаць пакаянне; і слухаюць такія споведзі, і адпускаюць грахі і пакаянне накладаюць, хоць і не з'яўляюцца ні святарамі, ні клірыкамі, пасвечанымі якім-небудзь біскупам Рымскай Царквы, а з'яўляюцца простымі міранамі; і тады не прызнаюць улады, што маецца ад Рымскай Царквы, але з імпэтам адмаўляюць, і насамрэч не маюць яе ні ад Бога, ні ад Царквы, паколькі існуюць па-за Царквой і ад гэтай Царквы ўжо адрэзаныя, па-за якой няма сапраўднага пакаяння і выратавання. Таксама названая секта і ерэтыкі, насміхаючыся, аб'яўляе нявартымі свайго кошту індульгенцыі, якія выдаюцца прэлатамі Рымскай Царквы. Наконт жа таінства еўхарыстыі памыляюцца, кажучы, не публічна, але таемна між сабой, што на алтары падчас таінства хлеб і віно не пераўтвараюцца ў Цела і Кроў Хрыстову, калі святар, які праводзіць або асвячае, – грэшнік, і лічаць любога чалавека грэшнікам, акрамя тых, хто з іх секты. Таксама кажуць, што асвячэнне Цела і Крыві Хрыстовай можа зрабіць любы праведны, хоць міранін, а не пасвечаны каталіцкім біску-

пам святар ці прэсвітар, абы толькі ён быў з іх секты, і ў тое ж самае вераць наконт жанчын, абы толькі яны былі з іх секты, і таксама кажуць, што ўсялякі святы – святар.

III.vi.4 Пра іх спосаб ці рытуал правядзення імшы

Таксама іх спосаб ці рытуал правядзення імшы, які ўвайшоў у звычку, такі, а менавіта: асвячаюць або праводзяць імшу толькі адзін раз на год, а менавіта на Божую Вячэру; і таксама амаль самай ноччу. Той, хто сярод іх бацька, хоць і не святар ці прэсвітар, пасвечаны каталіцкім біскупам, склікае ўсіх сваіх пасляДоўнікаў абодвух полаў, і кажа, каб падрыхтавалі спрытную для гэтага лаву ці куфар, і кладзе зверху чыстую тканіну, і наверх ставіць адзін поўны келіх добрага чыстага віна і пірог на попеле, прэсны пірог ці лусту прэснага хлеба. Пасля гэтага той, хто айцец, кажа тым, хто стаіць ля яго: "Просім Госпада нашага, каб прабачыў нам нашы грахі і нашы памылкі па міласэрнасці сваёй, і годна просім, каб па міласэрнасці сваёй ён выправіў іх, і кажам сем разоў "Ойча наш" у гонар Бога і Святой Тройцы, каб так было". І тады, укленчыўшы, усе кажуць сем разоў "Ойча наш" і пасля гэтага падымаюцца. І пасля гэтага ён асвячае ўказаны хлеб і келіх віна, і адломвае хлеба ўсім, хто стаіць ля яго, і пасля гэтага дае ўсім выпіць з кубка, і яны ўвесь час стаяць на нагах; і так сканчваецца ахвярапрынашэнне; і цвёрда вераць і спавядаюць, што гэта ёсць Цела і Кроў Госпада нашага Ісуса Хрыста; і калі хто-небудзь не зможа ўзяць ахвяры, захоўваюць яе ажно да Вялікадня і тады ўжываюць. Увесь астатні час года не даюць сваім хворым нічога, акрамя блаславёнага хлеба і віна. Такім чынам, трымаліся такога спосабу адзначэння Вялікадня ўсе бедныя з Ліёна, або Вальдэнсы, пакуль не адбыўся сярод іх падзел, а менавіта, пакуль не падзяліліся яны на бедных, празваных ламбардцамі, і бедных па гэты бок ад гор (citramontanos). Таксама названыя Вальдэнсы адмаўляюць, што пасля жыцця ёсць чысцец для душаў, і што прамаўленне малітваў і міласціна, а таксама правядзенне імшаў і іншыя пабожныя справы, якія робяцца вернікамі для памерлых, для іх карысныя. Таксама прэлатаў і клірыкаў, а таксама манахаў свяшчэннай Рымскай Царквы, няславячы, не ўхваляюць іх статус і асуджаюць, і кажуць, што яны – сляпыя і кіруюць сляпымі, і не служаць Евангельскай праўдзе і не трымаюцца апостальскай беднасці. Таксама з'едліва падманваюць, што сама Рымская Царква – гэта дом няпраўды. Таксама параўноўваюць сваё жыццё і апостальскую дасканаласць і, параўноўваючы, сябе ўпустую ўхваляюць, кажучы, што яны – паслядоўнікі апосталаў, і выхваляюцца, што трымаюцца Евангельскай і апостальскай беднасці. Таксама ў сваёй Царкве трымаюць і прызнаюць тры чыны, а менавіта дыяканы, прэсвітары і біскупы, улада якіх залежыць толькі ад іх саміх, а не ад Рымскай Царквы; і нават лічаць, што парадкі Рымскай Царквы паходзяць не ад Бога, а ад людской традыцыі, і таму падступна падманваюць, кажучы, што памылкова верыць у святую Рымскую Царкву, выстаўляючы замест яе свае парадкі: біскупства, прэсвітарыят і дэканат. Таксама кажуць, што ўсе цуды, якія адбываюцца ў царкве з-за малітваў святых, несапраўдныя, таму што ніхто з іх ніколі не зрабіў аніякага цуду. Таксама кажуць і трымаюць у таямніцы, што святыя на небе не чуюць малітваў верных і не звяртаюць увагу на пакланенне, якое ім узносіцца на зямлі, і кажуць, што паколькі святыя не моляцца за нас, то не варта нам слёзна прасіць іх заступніцтва. І таму пагардліва адзываюцца аб тых святах, з якімі мы праводзім пакланенне святым, і аб іншым, чаму мы пакланяемся і што ўсхваляем; і ў святочныя дні, калі асця-

рожнасць дазваляе, працуюць. Але аднак не паказваюць усім без разбору тры свае вераванні, але іх дасканалыя трымаюць іх між сабой у сваёй секце, а менавіта: пра цуды святых, якія несапраўдныя, і непатрэбнасць у іх усхваленні, і пра пагарду да святаў, за выключэннем дзён нядзельных і свята Найсвяцейшай Дзевы Марыі, і некаторыя дадаюць апосталаў і евангелістаў. Вернікаў сваіх на таемных сходах настаўляюць, што трэба трымацца вышэйералічанага, і што гэта не памылкова і згубна. Таксама прапаведуюць сваім вернікам з Евангелляў, Пасланняў і іншых Святых Пісанняў, і, выкладаючы, псуюць, як быццам бы настаўнікі памылак, якія не ведалі, як быць вучнямі праўды, але аднак пропаведзь міранам увогуле забаронена. Вядома таксама, што названая секта раней мела шмат іншых памылак, і трымалася, і да гэтых дзён у некаторых мясцінах таемна, як кажуць, праводзяць імшы і Тайныя Вячэры, як было сказана вышэй, і пра тое, што ў цемры робяць мярзоту, злучаючыся адзін з адным без разбору, і пра з'яўленне катоў і акрапленне хвастамі, і пра некаторае іншае, што працягвае пісацца на гэты конт у большых падрабязнасцях.

III.vi.5 Пра лад жыцця Вальдэнсаў

Наконт звычаяў і ладу жыцця ерэтыкоў-вальдэнсаў павінна быць зганьбавана наступнае, каб па гэтым іх можна было адрозніць і пазнаць.

Такім чынам, па-першае, вядома, што Вальдэнсы маюць і паставілі сабе адзінага галоўнага над сабой, якога называюць сваім Найвялікшым (Majoralem), якому ўсе падпарадкоўваюцца, як усе каталікі ў падпарадкаванні Уладару Папу. Таксама Вальдэнсы п'юць і ядуць разам. Таксама посцяцца па панядзелках і серадах, хто можа і хоча; посцячыся, аднак, ужываюць мяса. Таксама посцяцца па пятніцах і ў Вялікі Пост, і тады ўстрымліваюцца ад мяса, каб не прыводзіць у жах астатніх; таму што кажуць, што ўжываць мяса ў любы дзень – не грэх, таму што Хрыстос ні забараняў ужываць мяса, ні рэкамендаваў ад яго ўстрымлівацца. Таксама, пасля таго, як аказваюцца прынятымі ў гэтую абшчыну, якая называецца брацтвам, і абяцаюць падпарадкоўвацца сваім старэйшынам і служыць евангельскай беднасці, ад гэтага часу павінны служыць чысціні і не мець маёмасці, але павінны прадаць усё, што маюць, і ахвяраваць грошы ў абшчыну, і жыць з міласціны, якая ім даецца іх вернікамі і тымі, хто згодныя з іх справамі; і тыя, хто старэйшы паміж імі, раздае і размяркоўвае кожнаму паводле яго неабходнасці. Таксама Вальдэнсы ўхваляюць устрыманне сваіх вернікаў; дазваляюць аднак, каб неадкладныя палавыя жаданні былі задаволеныя якім-небудзь непрыстойным спосабам, тлумачачы апостальскімі: "Лепш жаніцца, чым распаляцца", кажучы, што лепш жарсць задаволіць у якім-небудзь непрыстойным дзеянні, чым унутры сэрца спакушацца; але гэта таксама трымаюць у таямніцы, каб не апаганіцца перад сваімі вернікамі. Таксама робяць зборы са сваіх вернікаў і сяброў, і тое, што дадзена і сабрана, перадаюць свайму кіраўніцтву. Таксама кожны год трымаюць ці праводзяць адзін ці два генеральныя капітулы (capitula generalia) у якой-небудзь звычайнай вёсцы, як мага таемней, збіраючыся ў якім-небудзь доме, які належаў раней камусьці з іх вернікаў, як быццам бы яны гандляры, і на гэтым галоўным капітуле ўсіх пасвячаюць у прэсвітары і дыяканы і размяркоўваюць, каго паслаць у розныя часткі і рэгіёны да сваіх вернікаў і сяброў, каб слухаць споведзі і збіраць міласціну, і слухаюць і прымаюць рашэнні пра сабранае і выдаткаванае. Таксама не працуюць рукамі пасля таго, як становяцца дасканалымі, не робяць аніякай справы для заробку, акрамя як, магчыма, для адводу вачэй, каб не быць пазнанымі або

схопленымі. Таксама агулам называюць сябе братамі і кажуць, што яны – бедныя ў Хрысце, ці бедныя з Ліёна. Таксама часам заводзяць для выгляду сяброўства з манахамі або клірыкамі, каб сябе абараніць, і падносяць ім розныя падарункі ці паднашэнні, ці робяць розныя паслугі і ўслужэнні, каб забяспечыць сабе і сваім шанец застацца на свабодзе, і жыць, і псаваць душы. Таксама наведваюць цэрквы і пропаведзі, і на ўсіх знешне выказваюць рэлігійнасць і маўчаць або маюць словы схаваныя і асцярожныя. Таксама шмат разоў на дзень моляцца і кажуць і настаўляюць сваіх вернікаў, каб рабілі так, як яны робяць. Спосаб маліцца ў іх такі, а менавіта, што, укленчыўшы, згінаюцца і расцягваюцца на якой-небудзь лаве ці на чым-небудзь падобным, падыходзячым для гэтага, і так, укленчыўшы, сагнуўшыся да зямлі, і стаяць так там, молячыся ў маўчанні, што за дзень могуць сказаць 30 ці 40 разоў малітву "Ойча наш", а часам і больш; і так рэгулярна робяць кожны дзень, калі знаходзяцца са сваімі вернікамі і тымі, хто падзяляе іх погляды, без каго чужога; перад сняданкам і пасля, і перад вячэрай і пасля, і на ноч, калі хочуць ісці класціся спаць, перад тым як пакладуцца; таксама раніцай, пасля таго як падымуцца з ложка; таксама ў іншыя моманты дня, як ранкам, так і ў полудзень. Таксама не кажуць ніякіх іншых малітваў і тады не вучаць і не маюць, акрамя малітвы "Ойча наш", не паважаючы ні вітанне Найсвяцейшай Дзевы Марыі "Вітай, Марыя", ні апостальскага Сімвала веры, паколькі кажуць, што яны ўсталяваны і пасвечаны Рымскай Царквой, а не Хрыстом; аднак кажуць і вучаць сем артыкулаў веры боскіх і сем чалавечых, дзесяць запаведзяў, і сем спраў міласэрнасці, пад гэтым скарачэннем і гэтым спосабам яны пасвячаюць і служаць, кажуць і навучаюць, і гэтым яны збольшага хваляцца і так прапануюць, каб тлумачылі адказ пра сваю веру. З-за гэтага яны могуць быць злоўлены такім чынам: Скажы мне Сімвал веры, а менавіта "Веру ў Бога", як вучыць Каталіцкая Царква, бо там прысутнічаюць усе артыкулы, і тады яны адказваюць: Не ведаю, бо ніхто мяне не навучыў яму. Такім чынам, перад тым, як перайсці да ежы, яны [яе] бласлаўляюць, так кажучы: Benedicte, Kyrie eleison, Christe eleison, Kyrie eleison, "Ойча наш"; гэта прамовіўшы, больш шчыра паміж сабой кажуць па-прастанароднаму: Бог, які блаславіў пяць ячменных хлябоў і пяць рыб у пустыні, бласлаўляе сваіх вучняў у гэтай сталовай і тых, хто ёсць перад ёй, і тых, хто прыйдзе ў яе. І робіць знак крыжа, дадаючы "У імя Айца, і Сына, і духа Святога, Амінь". Таксама, калі падымаюцца ад ежы падчас сняданку або вячэры, узносяць падзяку такім чынам, а менавіта, як было больш шчыра сказана па-народнаму тое, што маецца ў Апакаліпсісе [далей прыводзіцца фрагмент з царкоўных спеваў[75]]; і далей дадае: "Бог дае добрую ўзнагароду і добрую адплату ўсім тым, хто робіць нам дабро і бласлаўляе нас, і Бог, які дае нам ежу цялесную і ежу духоўную, і Бог з намі і мы з ім навечна". І іншыя адказваюць: Амінь. Таксама, калі бласлаўляюць ежу і калі аддаюць падзяку, стараюцца трымаць рукі складзенымі і паднятымі ў неба. Таксама, пасля сняданку, кажучы дзякуй і прамаўляючы малітву, як вышэй апісана, прапаведуюць і вучаць, або настаўляюць у сваёй дактрыне прысутных, калі яны ў падыходзячым месцы, дзе могуць не баяцца чужынцаў ці служак, якія не падзяляюць іх складу думак; але куды часцей робяць свае настаўленні ноччу пасля вячэры, калі збіраюцца іх вернікі, таму што тады вяртаюцца са сваіх работ, і ў гэты час у сакрэтным, бяспечным і схаваным месцы могуць, прачытаўшы пропа-

[75] "Benedictio et Claritas et Sapientia," *Cantus Manuscript Database*, accessed 10.11.2022, https://cantus.uwaterloo.ca/chant/457044.

ведзь, сабраўшы ўсіх вакол сябе, укленчыўшы, сагнуўшыся як для пакланення, і каго-небудзь просяць патушыць святло, калі сядзяць там для таго, як кажуць, каб яны не былі ўбачаныя ці схопленыя чужынцамі ці знешнімі, якія не падзяляюць іх думак. Таксама кажуць сваім вернікам і інфармуюць іх, каб ні ў якім разе не выдавалі іх ні капеланам, ні клірыкам, ні манахам, ні інквізітарам, бо, як вядома, ловяцца імі, бо інквізітары несправядліва пераследуюць іх ад імя Рымскай Царквы, таму кажуць вернікам сваім, што гэта з-за таго, што яны служаць Богу і служаць, пасланыя Богам, беднасці і дасканаласці Евангельскай, як Хрыстос і апосталы; і кажуць, што яны лепш ведаюць ісціну і Божы шлях, чым капеланы, клірыкі і манахі Рымскай Царквы, і таму іх пераследуць, бо ігнаруюць ісціну, і таму, што Хрыстос у Евангеллі сказаў Апосталам і сваім вучням, што, калі іх будуць пераследаваць за імя Божае, то будуць уцякаць ад горада да горада; з-за гэтага яны самі, як кажуць, церпяць ад пераследаў ворагаў.

III.vi.6 Пра спосаб навучання Вальдэнсаў

Пра спосаб навучання ці пропаведзі ерэтыкоў-Вальдэнсаў у гэтым месцы павінна быць зганьбавана наступнае. Існуе дзве групы ўнутры секты; некаторыя з іх – дасканалыя, і так называюцца менавіта самі Вальдэнсы, якія, найперш атрымаўшы неабходныя веды, атрымліваюць пасвячэнне паводле свайго рытуалу, каб умелі іншых вучыць; кажуць, што яны нічога свайго не маюць: ні дома, ні маёмасці, ні іншага прытулку. Калі ж хто з іх раней меў жонку, то калі прымаецца [у секту], яе пакідае. Яны кажуць, што з'яўляюцца паслядоўнікамі апосталаў, яны для іншых настаўнікі і спавядальнікі, і вандруюць па землях, наведваючы і падтрымліваючы вучняў у памылках. Яны кіруюць вучнямі і вернікамі сваімі па неабходнасці. Калі ж прыходзяць у якое-небудзь месца, ціха арганізоўваюць свой усеагульны сход, і прыходзяць да іх многія ў гаспіцый, дзе іх прымаюць, бачаць і слухаюць, і даюць ім усё, што маюць добрага есці і піць, і слухаюць іх пропаведзі на сходах, якія наведваюць больш ноччу, калі астатнія спяць або адпачываюць. Яны прынцыпова не адразу адкрываюць свае таемныя памылкі, але спачатку кажуць, якімі павінны быць вучні Хрыста паводле слоў Евангельскіх і апостальскіх, кажучы, што яны таксама з'яўляюцца паслядоўнікамі апосталаў, якія трымаюцца і аднаўляюць іх жыццё, і з гэтага выводзяць і заключаюць, што Папа, і біскупы, і прэлаты, і клірыкі, якія маюць багацці на гэтым свеце, апостальскай святасці не трымаюцца, і [таму] не з'яўляюцца пастухамі і кіраўнікамі Божай Царквы, але прагнымі ваўкамі і драпежнікамі, не такім Хрыстос даручыў захоўваць сваю нявесту-Царкву, і таму ім не трэба падпарадкоўвацца. Таксама кажуць, што ні нячысты не можа іншых ачысціць, ні звязаны іншых развязаць, ні вінаваты не можа судзіць іншага вінаватага, каб супакоіць свой гнеў, ні тыя, хто заблукаў, не могуць вывесці іншых на неба; і такім чынам прыніжаюць клір і прэлатаў, каб перанесці на іх нянавісць, каб ім не верылі і не падпарадкоўваліся. Гэта першае, чаму Вальдэнсы супольна кажуць і вучаць сваіх вернікаў, такім рэчам, якія падаюцца добрымі і маральнымі, і рабіць цнатлівыя і добрыя справы, быць асцярожнымі і пазбягаць заганаў, – каб так лягчэй іх пачулі і зразумелі пачутае; таксама кажуць, што чалавек не павінен падманваць, што ўсе, хто падманвае, забіваюць душу, як вучыць Пісанне. Таксама, што чалавек не павінен рабіць таго, чаго не хоча, каб яму зрабілі. Таксама, што чалавек павінен служыць Божым пасланням. Таксама, што чалавек не павінен ні ў якім разе клясціся, бо Бог забараніў усе клятвы ў Евангеллі, кажучы: (Мф 5:34–37). ... Таксама кажуць і вучаць, што клясціся

заўсёды ў любым выпадку – смяротны грэх; і калі хто-небудзь з іх вернікаў вымушаны якой-небудзь свецкай ці царкоўнай уладай клясціся на судзе, то ў такіх клятвах потым трэба выспаведацца і прыняць пакаянне, як за грэх. Таксама калі б ні прапаведавалі паводле Евангелля, ці Пасланняў, ці прыкладаў і царкоўных аўтарытэтаў, кажучы і спасылаючыся: Так сказана ў Евангеллі, ці ў пасланні Святога Пятра, ці Святога Паўла, ці Святога Якуба, ці так кажуць: Такі святы ці такі доктар, каб больш са сказанага прымалася слухачамі. Яны супольна маюць таксама Евангелле і Пасланні на народнай мове і таксама на лаціне, бо некаторыя з іх разбіраюцца, і некаторыя ўмеюць чытаць, і часам тыя, хто кажа або прапаведуе, чытаюць з кнігі, а некаторыя таксама без кнігі, бо большасць з іх не ўмее чытаць, але трымаюць завучанае ў памяці. Таксама свае пропаведзі робяць у дамах сваіх вернікаў, як было ўказана вышэй, некаторыя ў падарожжах ці на дарозе. Таксама кажуць і вучаць сваіх вернікаў, што сапраўднае пакаянне за грахі і чысцец ёсць выключна ў гэтым жыцці, не ў іншым; і таму кажуць і вучаць сваіх вернікаў, каб спавядалі ім свае грахі, і слухаюць іх споведзі, і адпускаюць грахі тым, хто выспаведаўся ім, і накладаюць на выспаведаных пакаянні, і накладаюць агулам пасты па пятніцах і паўтарэнні "Ойча наш", і кажуць, што маюць такую ўладу ад Бога, як мелі святыя апосталы. Таксама кажуць і вучаць, што душы, калі выходзяць з цела, неадкладна накіроўваюцца або ў рай для тых, хто павінен выратавацца, або ў пекла для тых, хто павінен быць асуджаны, і няма іншага месца для душаў пасля гэтага жыцця, акрамя раю і пекла. Таксама кажуць, што ніякія заступніцтвы, якія робяцца за памерлых, не карысныя ім, бо тым, хто ў раі, яны не патрэбныя, а тых жа, хто ў пекле, нішто не выкупіць. Таксама, калі слухаюць споведзі, кажуць тым, хто ім спавядаецца, каб калі будуць спавядацца [каталіцкім] святарам, не казалі і не адкрывалі ім, што яны спавядаліся Вальдэнсам.

III.vi.7 Пра хітрасці і хітрыкі, якімі яны прыкрываюцца, адказваючы

Заўважана, што Вальдэнсаў вельмі цяжка правяраць і знайсці падставу для абвінавачання, каб атрымаць ад іх праўду наконт іх памылак з-за хітрыкаў і падступных слоў, за якімі яны хаваюцца, каб не быць выкрытымі; і такім чынам наконт іх падступстваў і хітрыкаў тут павінна быць зганьбавана наступнае.

Па-першае, яны маюць наступную звычку, калі каго-небудзь з іх, злоўленага, прыводзяць на допыт, прыходзіць як быццам бы спакойны і як быццам бы нічога дрэннага пра сябе не ведае і знаходзіцца ў бяспецы. Запытаны, ці ведае, за што схоплены, адказвае без анікага наракання і ўсмешкі: Паночку, з задавальненнем даведаюся пра вашу прычыну. Запытаны пра веру, якой трымаецца і верыць, адказвае: Веру ўсяму, чаму павінен верыць добры хрысціянін ... як вучыць верыць і трымацца святая Царква.

[Далей ідзе інструкцыя наконт пытанняў пра Рымскую Царкву, Папу і прэлата; пра транссубстанцыю, якая ажыццяўляецца святаром, што Гасподзь Ісус Хрыстос быў народжаны цялесна ад Дзевы і перацярпеў на крыжы, і ўваскрос і ўзнёсся на неба. На гэтае пытанне вальдэнс адкажа: веру так, як вы верыце, што я веру. Цвёрда верыць у цялеснае ўвасабленне Хрыста, яго ўваскрасенне і ўзнясенне].

Я просты і непісьменны чалавек, таму не ведаю, што трэба вам адказваць ... нічога не разумею ў сваіх словах. ... Калі вы загадваеце мне паклясціся, я падпарадкоўваюся ... усяк скажаюць форму клятвы, прапускаюць і перайначваюць словы,

ператвараюць яе ў малітву ... але іх можна абходнымі манеўрамі прымусіць паклясціся ці прызнаць свае памылкі... Я хачу вызваліцца праз гэта ад смерці і захаваць сваё жыццё, і панесці пакаянне за грэх.

III.vi.8 Пра сафізмы і падваенні іх слоў

[Апісваюцца варыянты адгаворак і гульняў у словы, да якіх прыбягаюць Вальдэнсы, каб не адысці ад сваёй дактрыны, але і не выказацца прама супраць дагматаў Каталіцкай Царквы.]

Такім чынам заўважана, што ерэтыкі, паколькі не могуць абараніць сябе ні сілай, ні праз доказы, ні праз спасылкі на аўтарытэты супраць ісціны веры, тады звяртаюцца да сафізмаў, крывадушнасцяў і ўцёкаў у словах, каб не быць выкрытымі ў сваіх памылках; і ёсць адзін відавочны знак, па якім яны могуць быць распазнаныя, што яны ерэтыкі, якія крывадушна адказваюць. Ёсць таксама яшчэ адзін тып іх сафізмаў праз двухсэнсоўныя словы, калі іх пытаюцца, ці вераць яны ў таінства хрышчэння, еўхарыстыі, ці пакаяння, ці шлюбу, ці чыны, ці апошняе мірапамазанне, адказваюць, што дакладна вераць; але ўсё гэта яны прызнаюць або ад чыстага сэрца, або ад унутранага пакаяння. Таксама маюць два сэнсы наконт сапраўднага Цела Хрыста: пра містычнае цела, якое па сутнасці – Царква, і пра цела каго-небудзь з добрых людзей, пра якіх кажуць, што яны – гэта Хрыстос, як і іх целы; і такім чынам, калі ў іх пытаюцца, ці вераць яны ў Цела Хрыстова, адказваюць двухсэнсоўна і падступна. Таксама ёсць іншы спосаб іх двухсэнсоўнасці, калі пытаюцца: "Ці верыце, што Хрыстос быў народжаны, і пакутаваў, і ўваскрос, і г.д.?" Адказваюць ясна і цвёрда: "Веру". І разумеюць і тлумачаць, што гэта значыць: "Я маю ясную і цвёрдую веру ў тое, што тычыцца маёй секты". Таксама ёсць іншы спосаб, каб сысці ў сафізмы праз дадатковыя ўмовы, каб калі пыталіся: ці верыш у тое ці іншае? Адказваюць: Калі Богу гэта падабаецца, то веру ў тое ці іншае, разумеючы, што Богу не падабаецца тое, у што яны вераць. ... Таксама ёсць іншы спосаб пастарацца змяніць адказ, каб калі запыталіся: "Ці верыш ты, што можна даваць клятвы ці выносіць смяротныя прыгаворы без граху?" Ерэтык адказвае: "А як верыце вы і іншыя?" Калі яму адказаць: "Мы гэтаму верым". Тады адказвае ерэтык: "І тады і я цвёрда веру", маючы на ўвазе, што верыць, што мы гэтаму верым, а не тое, што ён верыць таму, што ў яго запыталіся. ... Таксама заўважана, што ерэтыкі часам прыкідваюцца дурнымі ці з цьмяным розумам...

III.vi.9 Спецыяльны апытальнік для тых, хто з секты Вальдэнсаў

Па-першае, такім чынам, у тых, хто спавядаецца, што з секты Вальдэнсаў, пытаюць, ці ён бачыў ці чуў каго-небудзь з такой секты, таварыства ці брацтва, якую мы называем Вальдэнсы, ці бедныя з Ліёна; таксама самі яны сябе між сабой называюць братамі ці беднымі ў Хрысце. Таксама, калі, дзе і з кім бачыў. Таксама, ці чуў калі-небудзь пропаведзь, ці дактрыну, ці настаўленне, ці словы іх. Таксама пра словы, якія чуў ад іх, і пра іх дактрыну. Таксама, ці чуў ад іх размовы пра клятву, ці заўсёды і ці ва ўсіх выпадках яна з'яўляецца грахом. Таксама пра чысцец душаў пасля смерці ці тут пасля жыцця. Таксама пра заступніцтвы, якія робяць за памерлых. Таксама пра індульгенцыі, якія даюцца і робяцца Папам і прэлатамі (хоць па гэтых трох пунктах не кажуць пагардліва і разгорнута перад усімі сваімі простымі

вернікамі, але перад больш высокімі і дасканалымі з іх пад сакрэтам). Таксама, ці еў з імі разам, ці бачыў іх, калі яны снедалі ці вячэралі. Таксама пра спосаб бласлаўлення ежы і пра спосаб прынясення падзякі пасля ежы. Таксама, калі бачыў іх за малітвай, перад сняданкам ці пасля, і перад вячэрай ці пасля, і пра спосаб маліцца і стаяць падчас малітвы. Таксама, ці маліўся сам з імі і ці бачыў, як іншыя маліліся, і хто і дзе і калі, і што яны кажуць падчас малітвы. Таксама, ці спавядаў хто свае грахі каму-небудзь з Вальдэнсаў і хто гэта быў. Таксама, ці прымаў адпушчэнне грахоў і пакаянне ад іх, і якое пакаянне, і ці выконваў яго, і пра спосаб адпушчэння. Таксама, ці чуў, як яны казалі, ці ведаў, што яны не былі святарамі, пасвечанымі якім-небудзь біскупам Рымскай Царквы. Таксама, ці верыць зараз і ці верыў, што споведзь грахоў, якую зрабіў перад імі, і адпушчэнне і пакаянне, якое атрымаў ад іх, падыходзіць для выратавання душы, а таксама, ці спавядаўся свайму святару, пасвечанаму біскупам Рымскай Царквы, і ці атрымаў ад яго прабачэнне і пакаянне. Калі таксама адкажа, што не, тады дзейсна прывесці доказы супраць яго, што спавядаўся таму, хто заведама не быў святаром, хоць і ведаў ці верыў, што гэта будзе карысна; не трэба лёгка верыць таму, што яны кажуць. Таксама, ці спавядае грахі свае раз на год, у Вялікі Пост ці перад Вялікаднем, перад святарамі, і ці спавядаў між іншым, што бачыў Вальдэнсаў ці чуў іх навучанне, і ці спавядаў ім грэх свой. І калі адкажа што не, запытацца належна пра прычыну, чаму не спавядаўся ў вышэйназваным. Таксама, ці прымаў камунію раз на год на Вялікдзень, бо Вальдэнсы таксама не прымаюць камунію са сваімі вернікамі, акрамя як для выгляду, бо не маюць веры да таінства, якое выконваецца святарамі Рымскай Царквы, хоць многія трымаюць гэта ў сакрэце, выключна для сваіх дасканалых вернікаў. Таксама, ці верыў, што Вальдэнсы ці тыя, хто кажа, што яны – Бедныя ў Хрысце і называюць сябе Братамі, з'яўляюцца добрымі людзьмі, справядлівымі і святымі, і маюць добрую веру, і трымаюцца добрай секты, у якой, як яны самі вераць, яны могуць выратавацца, хоць чуў і ведае, што яны не сыходзяцца ў веры з тымі, хто з Рымскай Царквой, і што яны церпяць пераслед ад Рымскай Царквы. Таксама, колькі часу знаходзіцца ў гэтым вераванні і хто прывёў яго, каб верыць так, і калі адмовіўся ад гэтага веравання і чаму. Таксама, ці аддаваў што-небудзь Вальдэнсам ці прымаў ад іх штосьці, ці ведае гэта пра якую-небудзь іншую асобу. Таксама, ці вадзіў іх ад месца да месца, і да каго. Таксама, ці ведае каго-небудзь з іх вернікаў ці тых, хто іх прымае. Таксама, ці быў ён у іншы час выкліканы да іншага інквізітара, ці названы, ці схоплены па справе сувязяў з Вальдэнсамі, і ці спавядаўся, атрымаў адпушчэнне, прыняў пакаянне і ад ерасі і секты Вальдэнсаў адрокся на ўсеагульным судзе і г.д.[76]

III.vii Пра жыццё і дзеі бедных з Ліёна

Доўгі час лічылася, што гэты ананімны трактат (лацінская назва – De vita et actibus Pauperes de Lugduno) паходзіць з нямецкіх тэрыторый з другой чвэрці XIV ст., але ў сваім артыкуле Пётр Білер пераканаўча прасачыў шматлікія паралелі паміж ім і працай інквізітара Бернарда Гі "Кіраўніцтва для інквізіцыі наконт ерэтычнай заганнасці". Іх параўнанне дазволіла вучонаму выказаць абгрунтаванае меркаванне, што асновай для твору паслужыла прызнан-

[76] Bernardus Guidonis, *Practica inquisitonis*, 244–257.

не каталіцкага святара Яна Філіберці, які правёў шмат часу ў вальдэнскай абшчыне[77]. Такім чынам, трактат можна датаваць 1320–1330 гг. Менавіта на яго аснове праводзіцца рэканструкцыя штодзённага жыцця вальдэнскай "рэзідэнцыі" – гаспіцыя; дапаўняюцца звесткі пра знешні выгляд вальдэнскага вандроўнага прапаведніка-настаўніка, структуру і вераванні Вальдэнскай абшчыны.

Пра жыццё і дзеі, пра веру і памылкі ерэтыкоў, якія сябе называюць беднымі з Ліёна

I. Найперш пра саміх ерэтыкоў і іх сяброў, і пра тых, хто верыць у іх памылкі, і якая паміж імі розніца.

1. Па-першае, да ведама, што ў вышэйназванай секце адны называюцца ерэтыкамі "дасканалымі" (perfecti) і "адобранымі" (consolati), а іншыя – сябрамі (amici).

2. Таксама сярод гэтых дасканалых ерэтыкоў адных называюць "абутымі ў сандалі" (sandaliati), а іншых – "новенькімі" (novellani).

3. Абутыя ў сандалі – гэта тыя, якія называюцца святарамі, настаўнікамі і кіраўнікамі (rectores) усёй ерэтычнай заганнасці, і могуць, як яны сцвярджаюць, асвячаць Цела Хрыстова, як каталіцкія святары.

4. Таксама абутыя ў сандалі не маюць грошай, і абутак з адрэзаным верхам або з дзіркамі носяць на нагах – так званыя сандалі.

5. І што б ні было праз гэтых абутых у сандалі загадана, усталявана ці таксама прынята, усімі ніжэйшымі без пытанняў паважаецца, і яму падпарадкоўваюцца, як галоўным.

6. І ў гэту секту прымаюцца мужчыны і жанчыны, якія ўрачыста называюцца братамі і сёстрамі.

7. Не маюць ніякай маёмасці, нават ад сваёй адмаўляюцца і трымаюцца беднасці.

8. Не працуюць, нічога не набываюць і не атрымліваюць прыбытку, на які маглі б выжываць, але на даброты і міласціну сваіх сяброў і вернікаў існуюць і жывуць, шчыра клапоцячыся пра навучанне.

9. А іх сябры і вернікі маюць маёмасць і ўступаюць у шлюб, гандлююць, вядуць справы, набываюць і атрымліваюць прыбытак для сваіх ерэтыкоў-дасканалых, якія іх наведваюць, прапаведуюць і накіроўваюць у іх даверлівасці, як будзе паказана ніжэй.

II. Другое пра іх вераванні і памылкі.

1. Па-другое, трэба сказаць, што вышэйназваныя ерэтыкі трымаюцца, вераць і вучаць сваіх сяброў сямі артыкулам веры, і таксама яны ў сем таінстваў, і з большага ва ўсё іншае, як у каталікоў, вераць, за выключэннем наступных памылак.

2. Не вераць, што Уладар Папа мае такую ж уладу на зямлі, як меў Святы Пётр, і таксама з'яўляецца такім жа вартым і святым, як быў Святы Пётр.

3. Таксама не вераць, што ёсць чысцец, акрамя як на гэтым свеце.

4. Таксама не вераць, што міласціны і малітвы карысныя для душаў памерлых.

5. Таксама не вераць, што каму-небудзь дазволена без смяротнага граху ў любым выпадку на свеце забіваць чалавека ці клясціся.

---

[77] Peter Biller, "Fingerprinting an Anonymous Description of the Waldensians," in *Texts and the Repression of Medieval Heresy* (Woodbridge: York Medieval Press, 2003), pp. 163–193, 189.

6. Таксама вераць, што спавядаць свае грахі трэба адзін аднаму паводле права Святога Якуба (5:16).

7. Таксама вераць, што тыя, хто між імі пасвечаны ў абутыя ў сандалі, можа так жа добра асвячаць Цела Хрыстова, як і каталіцкія святары.

III. Трэцяе як зварочваюцца ў гаспіцыях.

1. Па-трэцяе, вядома, што пазначаныя ерэтыкі ў розных месцах, правінцыях і рэгіёнах такім жа чынам, як у Германіі, так і ў іншых частках, спыняюцца ў дамах і сем'ях, па два ці тры ў кожным гаспіцыі, з дзвюма ці трыма жанчынамі, якія прыкідваюцца іх сёстрамі ці жонкамі.

2. Некаторыя старыя жанчыны жывуць у гаспіцыях без мужчын, але астатнія ерэтыкі часта і часцей наведваюцца і ежу для іх гатуюць.

3. У гаспіцыях вядуць такое жыццё. Рана ўстаюць[78], кажуць, што моляцца за каралёў, князёў і губернатараў, каб Бог іх наставіў такім чынам кіраваць светам, каб было ўсё для Яго славы і выратавання, ці чагосьці падобнага.[79] Таксама моляцца за сваіх ворагаў і пераследавацеляў, каб тыя з дапамогай Бога былі звернутыя да раскаяння, ці чагосьці падобнага, і кажуць за кожнага сем ці дзесяць разоў "Ойча наш".

4. Памаліўшыся, той, хто кіруе гаспіцыем, першы ўстае і кажа: "Бог з намі, калі яму падабаецца". Пасля гэтага яны, як мужчыны, так і жанчыны, якія хочуць навучыцца пісаць, слухаюць лекцыі ад іх дактароў, і, паслухаўшы лекцыі, шмат разоў паўтараюць, затым робяць хто што хоча, і жанчыны гатуюць ежу.

5. Калі хто-небудзь у чымсьці саграшыў, перад усім гаспіцыем укленчвае і просіць прабачэння, тады тыя, хто стаіць вакол, яго падымаюць, і яму даецца пакаянне.

6. Перад абедам накіроўваюцца да малітвы, як было апісана вышэй, і так шматкроць у дзень; падчас сняданку той, хто кіруе гаспіцыем, бласлаўляе абед такім чынам, кажучы "блаславіце", і астатнія адказваюць "Бог", потым прамаўляецца "Ойча наш". Як скончаць, кіраўнік (rector) гаспіцыя кажа цалкам на роднай мове: "Божа, які хацеў блаславіць у пустыні пяць ячменных хлябоў і дзве рыбы, блаславі ежу і пітво, і людзей, якія іх прымаюць, у імя Айца, і Сына, і Духа Святога".

7. Часам, калі той, хто кіруе гаспіцыем, прамаўляе падчас сняданку ці вячэры, і, прамовіўшы пропаведзь, дзякуе таксама тым, хто стаіць вакол, і яго пропаведзь падмацоўваецца.

8. Пасля ежы прамаўляюць словы падзякі, і кіраўнік гаспіцыя кажа на роднай мове: "Дабраславенне і слава" і г.д. (Апак 7:12) І тады накіроўваюцца да малітвы, як было згадана вышэй.

9. Насельнікі гаспіцыя спавядаюць свае грахі свайму кіраўніку, калі захочуць, і іх да гэтага ніхто не прымушае, калі яны не хочуць.

---

[78] У іншым манускрыпце можна знайсці ўдакладненне: "Часта ўстаюць і часта ўкленчваюць перад сваімі ложкамі, скіроўваючыся да малітвы. І той, хто кіруе гаспіцыем, кажа ім маліцца за каралёў etc." Bruschi, "De vita et actibus Pauperes de Lugduno," 198.

[79] У іншым манускрыпце можна знайсці дадатак: "Таксама яны моляцца за сваіх братоў і сёстраў, што яны могуць у гэтым свеце зрабіць столькі ўсяго добрага і столькі пакаяння, што яны вартыя перайсці да райскай радасці, ці падобныя словы". Bruschi, "De vita et actibus Pauperes de Lugduno," 198.

10. Калі які-небудзь вернік ці сябра іх прыходзіць у гаспіцый, гэта ўспрымаецца як вялікае свята, і яго з вялікай радасцю прымаюць, і яму прапаведуюць і падбадзёрваюць, як згадана вышэй, і калі яны хочуць выспаведацца, то спавядаюцца кіраўніку ці старшаму ў гаспіцыі, калі кіраўніка няма, і ён накладае на іх пакаянне.

11. Таксама, калі іншыя дасканалыя ерэтыкі, якія жывуць у вёсцы, прыходзяць, каб спыніцца ў гаспіцыі якога-небудзь іншага дасканалага ерэтыка, па прыходзе даюць адзін адному пацалунак міру, мужчына мужчыне, жанчына жанчыне, і тое самае робяць пры адыходзе.

IV. Чацвёртае як яны праводзяць свае сіноды або капітулы.

1. Па-чацвёртае, да ведама, што названыя дасканалыя ерэтыкі адзін раз на год у Вялікі Пост ці каля яго праводзяць сход ці ўсеагульны капітул у якім-небудзь месцы Ламбардыі ці Праванса, ці ў іншых рэгіёнах, дзе яны спыняюцца ў абутых у сандалі ці якіх-небудзь іншых, але маюць звычку рабіць гэта часцей у Ламбардыі, чым яшчэ дзе.

2. На гэты сход прыходзяць тры ці чатыры дасканалыя ерэтыкі з Германіі, маючы з сабой якіх-небудзь клірыкаў ці іншых перакладчыкаў, і паводзяць сябе так, быццам бы хочуць наведаць месцы, звязаныя з Апосталамі Пятром і Паўлам.

3. І на такім генеральным сходзе ці капітуле амаль усе ерэтыкі, якія кіруюць гаспіцыямі, збіраюцца.

4. На такія капітулы не дапускаюцца ні вернікі, а таксама ні маладыя дасканалыя ерэтыкі, ні жанчыны, нават калі яны дасканалыя і старыя, ні якія-небудзь дасканалыя старыя ерэтыкі, акрамя толькі тых, хто служыць іх секце бездакорна, шчыра і з поўным падпарадкаваннем.

5. На гэтых сходах абмяркоўваецца стан усіх у названай секце, і пытаюцца ў кожнага, што чуў пра стан свайго дома і як ім кіруе, і калі рабілі якое-небудзь непадпарадкаванне або паўстанне, выганяюць і да іншых паплечнікаў (sociis) далучаюць.

6. Таксама, калі былі сярод іх якія-небудзь дасканалыя ерэтыкі, якія доўгі час былі слаўна пасвечаныя ў секту належным чынам, і мелі веды ў Пісанні, выбіраліся на гэтым капітуле ў "абутыя ў сандалі", і ад гэтага часу з іншымі абутымі ў сандалі называліся настаўнікамі, кіраўнікамі і святарамі.

7. Таксама на гэтым капітуле адбываецца пасвячэнне тых, хто ў гэтай секце вельмі хоча вучыцца і суцяшацца, і тыя, каго прынялі, пасля суцяшаюцца, і да іх прыпісваюць паплечнікаў і прытулак, у якім яны павінны год заставацца.

8. Таксама на гэтым капітуле падлічваюць і прызначаюць наведвальнікаў сваіх сяброў і вернікаў, якіх павінны наведаць за гэты год, і пасылаць дваіх у кожны рэгіён або правінцыю, у якім ёсць хто-небудзь, перавернуты ў іх веру.

9. Таксама на гэтым капітуле яны збіраюць грошы і міласціну, якая была ім дадзена і перададзена іх сябрамі і вернікамі. Гэтыя грошы размяркоўваюцца паводле пасвячэння паміж названымі абутымі у сандалі, і даецца кожнаму пэўная доля для сябе і свайго дома, каб хапіла пратрымацца з ежай і адзеннем у надыходзячым годзе.

10. І калі хто-небудзь, хто кіруе гаспіцыем, не прысутнічаў, пасылаюць яму грошы праз іншых, хто ёсць у яго краі,

11. І з Германіі прыходзіць большая частка грошай, на якія жывуць і трымаюцца.

12. Як таксама... не ведае таго, хто гэта засведчыў[80]. Як у абутых у сандалі пасвячаюць, не ведае таксама. Але чуў, што разуваецца перад іншымі абутымі ў сандалі, і яму ўручаюць замест ботаў сандалі з дзіркамі, каб ён далей іх насіў.

V. Пятае калі і як публічна заяўляюць [пра пасвячэнне ў сан] або суцяшаюцца.

1. Пятае, вядома, што іх афіцыйнае аб'яўленне, якое яны між сабой маюць, здзяйсняецца наступным чынам: старэйшы ці найбольш мудры з абшчыны ці гаспіцыя, у якім суцешаны павінен правесці гэты год, ці іншы старонні ерэтык, калі такі будзе прысутны і будзе лічыцца больш разумным, збірае ўсіх, як мужчын, так і жанчын, якія спыніліся ў гэтым гаспіцыі, і прапаведуе і тлумачыць прапаведанае таму, каго прымаюць, усё, чаго трымаюцца ў названай секце, у што належыць таму, каго прымаюць, верыць, і што ён будзе гэтага прытрымлівацца, і служыць чысціні нораваў, і не мець маёмасці, абяцаць пакорлівасць і падпарадкаванне сходу, і слухацца і падпарадкоўвацца ахвотна гэтым ерэтыкам ва ўсім, не падманваць, не клясціся, не забіваць, не рабіць іншых магчымых смяротных грахоў, наадварот, калі хто-небудзь вышэйпералічанае будзе вымушаны зрабіць, то лепш памерці; хто пералічанага не хоча выконваць, такога да сябе не прымаюць.

2. І суцешаны адказвае асобна на кожную з усіх вышэйназваных прапанаваных рэчаў, што ён з верай можа выканаць і падпарадкавацца, і потым распрасціраецца на зямлі, а тыя, хто стаіць навокал, падымаюць яго, і хто-небудзь дае яму пацалунак міру, калі мужчыне – то мужчына, жанчыне – жанчына.

3. І тады той, хто быў прыняты, аплачвае кошт ежы, калі не мае – не аплачвае.

VI. Шостае пра адведкі сваіх верных і сяброў.

1. Шостае, вядома, што тыя, хто вызначаны і пасвечаны для наведвання вернікаў, так перасоўваюцца: прыходзяць у месца, якое належыць наведаць, і паведамляюць, што такія браты прыйшлі. І тады пасылаюць да іх названых вернікаў, прызначаюць дзень і час, да якога трэба прыйсці. Да гэтага часу прыходзяць з якім-небудзь вернікам, які збірае іх або днём, або ноччу.

2. Не робяць так, каб збіраліся вялікія сходы, але названых вернікаў наведваюць ад гаспіцыя да гаспіцыя, відавочна, кожнага ў сваім гаспіцыі, і ў якім-небудзь гаспіцыі застаюцца на два, тры ці чатыры дні, а ў іншым менш, і прапаведуюць, падбадзёрваюць і настаўляюць ў апісанай веры і памылках сваіх вернікаў,

3. І каб устрымліваліся ад вышэйпералічанага: не забівалі, не падманвалі, не кляліся, не рабілі нічога такога, чаго б не хацелі для сябе.

4. Таксама слухаюць споведзі сваіх вернікаў і накладаюць на іх пакаянні, збіраюць з іх міласціну і вучаць іх Пісанню.

5. Некаторыя таксама ў іншых гаспіцыях наведваюць сваіх вернікаў такім чынам, і ў многіх месцах згаданыя дасканалыя ерэтыкі прыносяць сваім вернікам, іх парабкам і сямейным розныя каштоўнасці, а менавіта паясы, ножычкі, шпількі[81], каб быць прынятымі ахвотна і па-сяброўску.

6. І такія наведванні робяцца больш зімой, чым летам, бо вернікі больш вольныя. Наведваючы вернікаў, перадаюць ім прывітанні ад усіх братоў.

---

[80] У іншым манускрыпце можна знайсці ўдакладненне: "Той, хто гэта засведчыў, не ведае, як асвячаць". Bruschi, "De vita et actibus Pauperes de Lugduno," 202.

[81] У адным з манускрыптаў гэтае слова было напісана не па-лацінску, а па-аксітанску, што дае дадатковы аргумент на карысць "аквітанскага" паходжання трактата. Biller, "Fingerprinting an Anonymous Description of the Waldensians," 177.

7. І гэтыя вернікі просяць у іх, каб перадавалі прывітанні ад іх усім сваім братам, і маліліся Госпаду за іх.

8. І, наведваючы такім чынам сваіх вернікаў і збіраючы з іх грошы і міласціну, прыносяць яе на наступны генеральны капітул і яе там паміж прысутнымі дзеляць, як было пазначана вышэй[82].

III.viii Нікалас Эймерык. Шлях інквізітараў

Нікалас Эймерык, дамініканскі манах і Галоўны Інквізітар Арагонскага Каралеўства, за сваё доўгае жыццё напісаў многа прац, часткова падсумаваных каля 1376 г. у "Шляху інквізітараў" (Directorium inquisitorum). Гэта – манументальнае (каля 800 старонак) кіраўніцтва па пераследу ерэтыкоў і чараўнікоў.

Эймерык навучаўся ў Тулузе і Парыжы, бываў у Авіньёне. Відавочна, быў знаёмы з працамі Бернарда Гі і іншых інквізітараў. Гэта не дае магчымасці сцвярджаць, напісаны раздзел пра вальдэнсаў (перакладзены ніжэй) на ўласным вопыце, ці на аснове трактатаў сваіх папярэднікаў. Адзначым, што пратаколы апытанняў вальдэнсаў у Каралеўстве Арагон невядомыя.

Пра ерась вальдэнсаў

Падсумаванне.

Чатырнаццатая тэма – пра ерасі і памылкі вальдэнсаў, або бедных з Ліёна, або In zabbatatorum[83] (што адно і тое ж), якія ўзніклі на французскіх землях і там жа былі асуджаныя прэлатамі і інквізітарамі, і ў наш час яшчэ часцей асуджаюцца.

Паходжанне вальдэнсаў, або бедных з Ліёна.

На гэта мы адкажам, што ў часы Уладара Папы Грыгорыя IX і каля года Гасподняга 1270[84] з'явіўся на землях Галіі, у архіепіскапіі і горадзе Ліёне, нейкі чалавек па імені Вальдэс (Valdesius) ці Вальдэнс (Valdensis), які, пакінуўшы ўсё, прапанаваў трымацца евангельскай беднасці, як апосталы трымаліся; які займеў сабе шматлікіх паслядоўнікаў, і зрабіў вялікае згуртаванне мужчын і жанчын. Ён таемна і публічна аб'яўляў ніжэйзапісаныя ерасі і памылкі, і, баючыся супрацы архібіскупа і царквы, адтуль уцяклі, па французскіх і італьянскіх землях рассеяўшыся; і паколькі яны мелі шмат саўдзельнікаў, то прыдбалі яшчэ больш, і таму сёння іх памылкі рассеяныя там і тут.

Вальдэнсы называюцца рознымі імёнамі і чаму так.

Яны называюцца вальдэнсамі, бо Вальдэс быў аўтарам і настаўнікам іх памылак. Называюцца беднымі з Ліёна ад горада Ліёна, адкуль маюць паходжанне, і паколькі абралі жыццё ў беднасці. Акрамя гэтага, яна называюцца Inzabbatati, бо ў іх секце найбольш дасканалыя in zabata іх, або "тыя, якія даходзяць да шчыкалаткі" (sotulari), спецыяльныя адметныя знакі, на манер пляскатай талеркі, якімі яны публічна адрозніваюцца. Памылкі і ерасі гэтых вальдэнсаў такія.

---

[82] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 177–184.

[83] Магчымы пераклад – "неабутыя".

[84] Відавочная памылка: павінна быць 1170.

Памылкі і ерасі вальдэнсаў.

Першая памылка і ерась, што яны не падданыя ні Рымскаму Пантыфіку, ні іншым прэлатам Рымскай Царквы; аб'яўляючы, што царква іх пераследуе няправільна і несправядліва.

Другая памылка і ерась, што не могуць быць адлучанымі ні Рымскім Пантыфікам, ні іншымі царкоўнымі прэлатамі, і ім не абавязаныя падпарадкоўвацца нават там, дзе загадаюць, сваю секту абараняюць, [а Царквы] выракаюцца.

Трэцяя памылка і ерась, што клясціся на судзе, ці па-за судом, па якой-небудзь прычыне ці з якой-небудзь нагоды – недазваляльна і смяротны грэх.

Чацвёртая памылка і ерась, што клясціся ў прысутнасці суддзяў веры, каб не сказаць праўду і не выкрыць сваіх таварышаў з гэтай секты, не ёсць [чымсці] недазваляльным ці грахом, але нават свяшчэнна.

Пятая памылка, што асуджаць чалавека на пакаранне ці на смерць не дазволена ні ў якім разе, больш таго, гэта – смяротны грэх.

Шостая памылка, што царкоўныя дэкрэты і пастанаўленні Уладара Папы наконт пастоў і каляндарных святаў не вартыя трымання, але адмаўлення і татальнага асуджэння.

Сёмая памылка, што гэтыя вальдэнсы, нават калі непісьменныя, не скіраваныя біскупамі Рымскай Царквы да якога-небудзь святога ордэна, як мужчыны, так і жанчыны, маючы ўладу ад аднаго Бога, як мелі апосталы, слухаючы споведзі на плошчах ад мужчын і жанчын, якія каюцца, накладаючы пакаянне, а таксама адпушчэнне.

Восьмая памылка, што індульгенцыі, якія ад Рымскага Пантыфіка, ці ад іншых царкоўных прэлатаў выдаюцца, не маюць ніякай каштоўнасці, карысці ці вартасці.

Дзявятая памылка, што падчас алтарнага таінства ні хлеб не пераўтвараецца ў сапраўднае Цела Хрыстова, ні віно ў Кроў, незалежна [ад таго] бласлаўляе святар ці грэшнік.

Дзясятая ерась і памылка, што ўсе людзі – грэшнікі, калі не належаць да іх секты, і адпаведна, усякае асвячэнне, напрыклад пераўтварэнне Цела Хрыстова, лічацца таксама памылковым, калі толькі яно не адбываецца ў іх секце.

Адзінаццатая памылка, што любы міранін, мужчына ці жанчына, абы толькі быў з іх секты, можа асвячаць і пераўтвараць Цела Хрыстова.

Дванаццатая памылка і ерась, што кожны мужчына і кожная жанчына з іх секты з'яўляецца сапраўдным святаром.

Трынаццатая, што годныя душы пасля смерці імкнуцца ў рай, або на нябёсы, а асуджаныя спускаюцца ў пекла; і ніхто не ўваходзіць у чысцец.

Чатырнаццатая памылка і ерась, што чысцец – гэта нішто, і што службы, міласціна, малітвы, а таксама добрыя справы і ўсё, што ёсць у рымскай царкве для памерлых, нічым ім не карысныя і нічым ім не могуць дапамагчы.

Пятнаццатая памылка і ерась, што святыя, якія на небе, нашых малітваў ніколі не слухаюць і не прыслухоўваюцца, і за нас Богу не моляцца, таму не варта ні маліцца ім і выпрошваць іх міласці, ні спраўляць святы ў іх гонар; а цуды іх, пра якія людзі кажуць, асуджаюць як несапраўдныя і падробныя, і таму ім не належыць даваць веры.

Шаснаццатая памылка і ерась, што лепш задаволіць юр якім-небудзь непрыстойным спосабам, чым пакутваць ад распаленай плоці[85]; але гэта (як кажуць і самі

[85] Алюзія на 1 Кар 7:9.

робяць) дазволена ў цемры, любы з любой без разбору цялесна злучаюцца кожны раз, калі яны распаляюцца цялеснымі жаданнямі.

Сямнаццатая памылка і ерась, што Сімвала Веры не належыць ні трымацца, ні яго верыць, ні падчас малітваў прагаворваць, як пастаноўлена Рымскай Царквой.

Васямнаццатая памылка і ерась, што ні анёльскае прывітанне, а менавіта, "Вітай, Марыя", ні якія-небудзь іншыя малітвы не дапушчальныя, і не належыць казаць таго, што было калі-небудзь пастаноўлена Рымскай Царквой, акрамя "Ойча наш", бо гэта адзіная малітва, якая была ўстаноўлена Хрыстом.

Дзевятнаццатая памылка і ерась, што яны – наступнікі апосталаў у евангельскай беднасці, і лепш ведаюць ісціну веры, чым прэлаты, клірыкі або манахі Рымскай Царквы, і што ім [ерэтыкам], а не гэтым належыць верыць.

Дваццатая памылка і ерась, што Папа, біскупы і прэлаты, якія маюць багацці ў гэтым свеце, і святасці апосталаў не трымаюцца, не з'яўляюцца сапраўднымі правадырамі Божай Царквы, ці кіраўнікамі, але драпежнымі ваўкамі, і пажыральнікамі; і не такіх Хрыстос угнараваў апекавацца сваёй нявестай-Царквой, і таму ім не належыць верыць і падпарадкавацца, але толькі вальдэнсам, якія маюць, як жанчыны, так і мужчыны, ад аднаго Бога поўную ўладу асвячаць, слухаць споведзі і накладваць пакаянні.

З-за гэтых ерасей і памылак вальдэнсы, або бедныя з Ліёна, якія па-іншаму называюцца Inzabbatatis, узніклі ў часы Уладара Папы Грыгорыя IX. Гэтыя вальдэнсы, або бедныя з Ліёна, якія па-іншаму называюцца Inzabbatatos, адлучаныя, анафемстваваныя і асуджаныя[86].



[86] Nicolas Eymeric, *Directorivm Inquisitorvm*, ed. Francisco Peña (Romae: In aedibvs Pop. Rom., 1578), 205–206.

IV. Італія

IV.i Була ў Марсэль наконт п'емонцкага ерэсіярха Марціна Пастрэ

Гэтая була была дасланая 8 ліпеня 1332 г. інквізітару Марсэля, каб вальдэнскі "настаўнік" Марцін, які там утрымліваўся, быў перададзены інквізітарам П'емонта.

Улюбёнаму сыну Яну з Бадзіса з ордэна меншых братоў, інквізітару ерэтычнай заганнасці ў горадзе і дыяцэзіі Марсэля, пасланаму Апостальскім Прастолам, а таксама тым, хто яго замяняе.

Нядаўна ад улюбёнага сына Альберта дэ Кастэлярыа з ордэна братоў прапаведнікаў, інквізітара ерэтычнай заганнасці ў П'емонце і Верхняй Ламбардыі, накіраванага туды Апостальскай уладай, дайшло да нашага ведама, што ў далінах Люцэрна і Перозы, на землях, якія знаходзяцца ў свецкім падпарадкаванні высакароднаму мужу Філіпу Савойскаму, Уладару Турынскаму, настолькі разрасліся і памножыліся ерэтыкі, пераважна з секты Вальдэнсаў, што маюць нахабства там праводзіць пастаянныя сходкі ў выглядзе капітулаў, на якіх часам збіраецца адначасова па пяцьсот Вальдэнсаў; перад гэтым, калі названы Альберт хацеў правесці там інквізіцыйны працэс, названыя Вальдэнсы паўсталі супраць самога Альберта-інквізітара са зброяй у руках, і што аднаго дня легкадумна забілі Гвілельма, рэктара парафіяльнай царквы ў Ангроньі Турынскай дыяцэзіі, які перад імі служыў імшу, на плошчы таго самага горада, падазраючы, што гэты рэктар данёс пра іх ерасі названаму інквізітару; тады названыя ерэтыкі яўна перад названым інквізітарам аб'явіліся і яго ў адным замку асадзілі, каб такім чынам яму давялося пакінуць інквізіцыйны працэс цалкам незавершаным; ты трымаеш у сваёй вязніцы Марціна Пастрэ, аднаго з названых ерэтыкоў, які прымусіў у названай дыяцэзіі адных называць сябе Пятром Марцінам, а іншых Юльянам: гэты самы Марцін з'яўляўся галоўным у названых сходках і капітулах гэтых ерэтыкоў, а таксама ад усіх інквізітараў, якія былі ў П'емонце на працягу апошніх дваццаці гадоў, уцёк, а таксама галоўным прапаведнікам ерэтычнай заганнасці, які асабліва прапаведаваў супраць увасаблення сына Божага і існавання Цела Хрыстова падчас таінства на алтары, і які таксама ведае ўсе асаблівасці земляў названых улюбёных сыноў высакародных мужоў маркіза Салуцца, а таксама ўладара Люцэрны Філіпа Савойскага. Клапоцячыся таксама, каб такім чынам той Альберт меў поўную і належную ісціну наконт ерасяў і ўсіх абставінаў, пакідаем апостальскім лістом на тваю думку, якім чынам ты гэта арганізуеш, але паклапаціся неадкладна гэтаму Альберту перадаць у бяспечнае месца і замацаваць пячаткай доступ да ерэтыка Марціна, каб гэты інквізітар змог правесці дазнанне як супраць Марціна, так і супраць іншых згаданых ерэтыкоў і таксама іх апытаць, каб такім чынам правасуддзе здзейснілася[1].

---

[1] *Bullarium Franciscanum*, 530 doc. 987.

IV.ii Працэс інквізітара Альберта дэ Кастэлярыа ў Джавэна ў студзені-лютым 1335 г.

Як слушна заўважыў Града Джавані Мерло ў крытычным тэксце да выдання дадзенай крыніцы, "інквізітары больш цікавіліся, каго адправіць на касцёр, чым чаму"[2]. У сувязі з гэтым дакумент уяўляе сабой апісанне ўзаемаадносін дапытанай асобы (якую спачатку прыводзілі да прысягі) і яе знаёмых з ерэтыкамі. Па сведчаннях пратаколаў (відавочна, перакладзеных з жывой мовы на лаціну), зборы Вальдэнсаў праходзілі ў "сінагозе"[3], а "святароў"[4] секты называлі "настаўнікамі"[5], у чые абавязкі ўваходзіла прапаведаваць і прымаць споведзі[6]. Кіраўніка называлі "галоўны доктар" (principalis doctor). Вядома, што некаторыя з гэтых прапаведнікаў прыходзілі "з таго боку гор" і прапаведавалі ўночы[7]. Саманазва ўсёй групы – "добрыя людзі" (bonas gentes), "спазнаныя людзі" (gentes de recognoscentia), "народ апосталаў" (populus apostolorum)[8], "бедныя Хрыстовы" (pauperes Christi)[9], якіх вернікі лічылі нават святымі[10].

Пры допытах маглі выкарыстоўвацца катаванні[11], але пасля абвінавачаны павінен быў пацвердзіць, што даў паказанні "дзеля праўды, а не з-за жорсткасці катаванняў"[12].

Да нас дайшлі не ўсе дакументы, некалькі лістоў было страчана, больш за ўсё ў частцы прысудаў. Але з захаванага вядома, што было асуджана як мінімум 8 мужчын і 6 жанчын. У якасці пакарання (якое самі інквізітары выстаўлялі як вялікую міласціну, бо "за ўпартасць тваю і цяжкасць тваіх правінаў па законе мы маглі адправіць цябе на пажыццёвае зняволенне") было накладзена: публічнае пакаянне, спяванне малітваў у цэрквах, пасты, паломніцтвы і нашэнне нашытых на адзенне крыжоў[13].

Ніжэй прыведзены пераклады ўрыўкаў, якія ўтрымліваюць звесткі пра вальдэнскую дактрыну.

Гэта – вышук, які быў і мае намер быць зробленым братам Альбертам дэ Кастэлярыа з Кунэа, інквізітарам ерэтычнай заганнасці, пасланым Апостальскім Прастолам, з ордэна братоў-прапаведнікаў. Гэты вышук названы інквізітар мяркуе праводзіць супраць усіх ерэтыкоў Вальдэнсаў і іншых ерэтыкоў, якія трапяць пад падазрэнне і будуць заўважаныя, зняслаўленыя і абвінавачаныя згодна з папскімі і імператарскімі пастановамі, а таксама іх пакараць і вынесці ім прысуды згодна з парадамі законазнаўцаў і манахаў, паводле таго, што кажуць папскія пастановы.

---

[2] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 14.
[3] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 167.
[4] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 169.
[5] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 167.
[6] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 171.
[7] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 182, 183, 191.
[8] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 190.
[9] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 193.
[10] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 238, 242.
[11] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 176, 185.
[12] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 178.
[13] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 251–257.

Год Гасподні 1335, 20 снежня. У крэпасці (castrum) Джавэна[14].

Нейкі чалавек вучыў яго малітве "Ойча наш" паводле звычаю Вальдэнсаў, кажучы сам сабе ў звароце да госціі, якую ўзнімаў святар: "Свяшчэнная госція, калі ты мне можаш дапамагчы, дапамажы мне"[15].

Чыстца ў іншым жыцці няма, але тыя, хто благое робіць, адразу накіруюцца ў пекла, а хто добра – у рай; і што святая вада слаба карысная для душы; і што пахаванне ў полі такое ж каштоўнае, як і на могілках; і пасмяхаўся з іконаў святых, кажучы таму, хто пытаецца: "Вы, святары, зрабілі іконы, каб вымагаць у нас нашу маёмасць"[16].

Жонка Яна Беса (Ioannis Beç), якая была таксама запытаная, ці не хоча ісці да імшы, адказала: "Не ведаю, ці будзе тая імша мне карысная"[17].

Вальдэнсы кажуць, што маюць добрую веру, бо не клянуцца, не падманваюць і паважаюць бацькоў тры разы ў галечы сваёй; і што Бог не сыходзіць у госцію, калі святар яе ўзнімае; і што многія людзі з розных земляў прыходзяць да іх, калі хочуць быць з секты Вальдэнсаў[18].

Некалькі разоў чуў названага Андрэя Сакерыя, які прапаведаваў на плошчы ў прысутнасці многіх людзей, што не належыць ні клясціся, ні падманваць, бо кожная клятва – смяротны грэх.

[Далей сцвярджаецца: Святыя могуць дапамагчы людзям у Судны Дзень толькі тады, калі змогуць дапамагчы самі сабе. Вялікі Айцец не спускаўся з нябёсаў, каб прыняць плоць, бо ён не мог так сябе прынізіць]. ... Святары робяць іконы больш для часовай выгады, чым для сапраўднай набожнасці. Таксама казалі, што не маюць даверу ні да іконаў, ні да крыжа, і калі той, хто вёў допыт, запытаўся: "Хто навучыў вас такім словам?", адказалі: "Адзін наш святар, які прыйшоў з Вапінга".

Таксама казалі, што тыя, хто новай веры, настолькі памножыліся і так памножацца, што выганяць святароў і клірыкаў са сваёй радзімы[19].

Чуў, як нейкі кульгавы мінак сказаў [вальдэнсу]: "У вашай зале – вялікая Газарыя (Gazaria)"[20].

Той самы Андрэй быў бы таксама ахвотна пахаваны на сваім агародзе, як і на могілках, бо Бог можа яму дапамагчы таксама на агародзе, як і на могілках[21].

І калі так ішлі, на дарозе знайшлі ў пылу нейкую жалезную дзіду, і той спытаўся, ці можа гэтую дзіду падняць і прыняць, і тады названы Ян з Кастанья[22] сказаў яму: "Калі ты з нашай секты, ты ні ў якім разе не возьмеш гэтага жалеза"[23].

Міласціна, якую чалавек робіць пры жыцці ці збіраецца зрабіць перад смерцю, дапаможа яму пасля смерці, аднак тое, што робіцца для мёртвых, мае значэнне для тых, хто гэта робіць, а не для мёртвых; што чысцец ёсць толькі ў гэтым свеце; і што вера іх лепшая, чым вера іншых; і што могуць адпускаць грахі, як іншыя святары Царквы[24].

---

[14] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 163.
[15] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 164.
[16] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 164.
[17] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 164.
[18] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 166.
[19] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 166–167.
[20] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 168.
[21] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 169.
[22] Ніжэй указана, што названы Ян меў жонку.
[23] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 171.
[24] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 178.

Тыя, хто адносіцца да іх веры, лепшыя, чым іншыя, і лепш выратуюцца[25].

Таксама казалі, што тыя з іх секты павінны былі хадзіць у царкву для адводу вачэй, каб іншыя людзі не выкрылі, што яны з секты Вальдэнсаў. Быў запытаны, чаму не расказаў усё вышэйсказанае падчас першага дазнання, пакуль не быў аддадзены на катаванні, сказаў, што з-за сваёй дурасці[26].

[Далей у тэксце пазначана, што дапытаны як адмовіў усе абвінавачанні ў вальдызме і нават сваё веданне вальдызму]. Быў запытаны, ці не падазрае кагонебудзь, хто б мог яго абвінаваціць з нянавісці ці злых намераў, і ці хоча палепшыць свае паказанні, адказаў, што не[27].

Быў запытаны, што казалі вышэйназваныя Вальдэнсы, адказаў, што ніхто не павінен клясціся, бо кожная клятва – смяротны грэх; і што ў іншым жыцці ёсць толькі дзве дарогі, а менавіта дарога да раю і дарога да пекла паводле дзвюх скрыжаляў Майсеевых, з якіх адна была белай, а іншая – чорнай; і што добрыя справы, якія робяцца ў гэтым свеце для памерлых, не карысныя ні для каго, акрамя саміх робячых. Таксама гэтыя вальдэнсы забаранялі сябе і іншых выдаваць і абвінавачваць тым, хто вядзе допыты[28].

Названы Ян Муліні пакляўся служыць веры святой Рымскай Царквы і трымацца даручанага Царквой і Уладаром Папам і вышэйназванымі інквізітарамі і ўсімі іх наступнікамі, і выканаць усё пакаянне, якое яны на яго накладуць за яго віну. Таксама адрокся ад усіх ерасяў, вераванняў, дапамогі, абароны і гасціннасці да ерэтыкоў, даўшы ў заклад таксама ўсю сваю рухомую і нерухомую маёмасць, якую меў і мае, інквізітарскай службе пад апекай Рымскай Царквы, калі ён раптам працягне даваць ерэтыкам парады, дапамогу ці спрыянне[29].

І выспаведаў яму свае грахі, і тады вячэраў і начаваў у яго дома спадар (seygnor) Францыск Вальдэнс і яго паплечнік (socius) Пейрэт з Кавацыя. ... Клірыкі іх [Вальдэнсаў] пераследуюць, і таму не асмельваюцца прыходзіць адкрыта з-за клірыкаў, якія іх пераследуюць, але прыходзяць таемна, як Хрыстос прыходзіў[30].

І выспаведаў яму свае грахі, і наклаў на яго пакаянне, каб пасціўся[31] адзін дзень на тыдні[32].

Міхаіл Барберый, натарыус, які чытаў і трымаў нейкую паперу ці ліст, які названыя вальдэнсы перадалі натарыусу Міхаілу Барберыю, і задавалі пытанні адзін з адным. І калі адзін з тых, хто задаваў пытанні, сказаў названаму натарыусу Міхаілу Барберыю, што яму неабходна парада, ці павінен аберагаць гэтых людзей, тады названы Міхаіл Барберый адказаў таму, хто запытаў: "Яны – добрыя людзі і трымаюцца правільнай дарогі паводле Евангелля і Боскага Пісання"[33].

Паломніцтвы не прыносяць нічога, акрамя разбітага абутку[34].

---

[25] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 184.
[26] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 185.
[27] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 186.
[28] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 190.
[29] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 192.
[30] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 198.
[31] Пост прызначаўся на хлебе і вадзе. Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 203.
[32] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 199.
[33] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 204.
[34] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 207.

Была запытаная, чаму навучалі і прапаведавалі названыя Вальдэнсы, адказала, што кожная клятва – смяротны грэх, што было вычленена з двух выслоўяў Саламонавых[35] ... Казалі таксама, што калі Хрыстос узышоў на неба, пакінуў у гэтым свеце 12 апосталаў, якія яго веру прапаведавалі. З якіх чацвёра захавалі яго кнігі, іншыя ж восем заняліся сваімі гародамі[36] і спявалі па іншых кнігах, і ніхто іх не разумеў. Іншыя ж чацвёра спявалі па кнігах Хрыста і ўсе іх разумелі. Тыя восем, якія слухалі, сталі мацнейшыя, і выгналі першых чацвярых з царквы. І калі тыя чацвёра прыходзілі на плошчу і там спявалі, іншыя восем раз'юшваліся і выганялі іх з плошчы. І тады тыя чацвёра пачалі прыходзіць таемна і ўночы. І дадавалі вышэйназваныя вальдэнсы: "Мы трымаемся шляху тых чатырох, у якіх засталіся кнігі Хрыстовы; святары ж і клірыкі трымаюцца шляху астатніх васьмі, якія хочуць ісці па шырокай дарозе"[37].

IV.iii Була Амадэю Савойскаму аб Папы Рымскага Грыгорыя XI

У 1375 г. булы з падобным зместам былі накіраваныя Папам Грыгорыем XI графу Амадэю VI Савойскаму і французскаму каралю Карлу V[38].

Улюбёнаму сыну Знатнаму Мужу Амадэю Графу Савойскаму.

Заахвочаныя тваёй стараннасцю ў веры, а таксама тваім гонарам і заслугамі, мы заклікаем да абароны названай веры, асабліва сярод прадстаўнікоў твайго дваранства. Мы даведаліся з надзейнага апісання ўлюбёных сыноў інквізітараў ерэтычнай заганнасці з частак твайго Савойскага графства і іншых тваіх тэрыторый, што ў гэтых і іншых частках па суседстве знаходзіцца вялікая колькасць ерэтыкоў, і што некаторыя ерэтыкі з іншых тэрыторый на гэтыя твае землі ўцякаюць, і пасля ўсе застаюцца ў гэтых [частках], бо некаторыя са знаці з тваіх зямель, пагарджаючы Божым гневам у спрыянні, не дазваляюць той самай Інквізіцыі дзейнічаць супраць іх, з-за чаго памножыліся вартыя праклёну ерасі, і з-за гэтага бяздзеяння, о гора! Колькасць ерэтыкоў у гэтай і бліжэйшых землях працягвае ўзрастаць. А таму, калі з тваёй самаадданай дапамогай, без якой немагчыма вяршыць правасуддзе, да іх не будзе прыменена хуткіх і надзейных сродкаў, то ва ўсіх названых землях, і таксама Графстве, калючкі і пустазелле ерэтычных памылак могуць настолькі хутка прарасці, што іх складана будзе выкарчаваць, у найцяжэйшай небяспецы для душаў і затуманьванні яснасць каталікоў, шчырасць артадаксальнай веры, якую твае найхрысціяннейшыя і славутыя продкі не толькі мужна абаранялі, але і цудоўна ўзвялічвалі. З гэтай прычыны мы заклікаем тваю графскую міласць і настойліва ўгаворваем, каб наконт вышэйапісанага наколькі самааддана, настолькі палымяна і дзейсна, а таксама хутка не толькі лісты адаслаў, але і каб палымяныя паслы і выканаўцы, адважныя і самаадданыя, былі ў тыя землі табой накіраваныя, а таксама забяспеч іх неабходнай колькасцю сродкаў, што прынясе табе ўзрастанне тваіх заслугаў перад Богам,

[35] Маецца на ўвазе апакрыфічная кніга "Прамудрасць Ісуса Сірахава".
[36] Маецца на ўвазе – не духоўнымі справамі.
[37] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 220.
[38] *Annales Minorum* vol. 8, 364–365.

і праслаўленне ў гэтай Божай справе, што ўсё пераўзыходзіць, будзе яшчэ слаўней пераўзнесена[39].

IV.iv Працэс супраць Вальдэнсаў у 1373–1388 гг.

У 1387–1388 гг. інквізітарам-дамініканцам Антоніем Сёмым з Савільяна была праведзена маштабная акцыя супраць вальдэнсаў Пінерола. Захаваліся яе матэрыялы, якія былі двойчы выдадзены: першы раз Джыраламо Амаці[40], другі – Ігнацам фон Дзёлінгерам[41]. Дагэтуль невыдадзеная кандыдацкая дысертацыя Альберто Барберо з транскрыпцыяй іншага манускрыпта[42]. Як стала вядома, Антоній часткова перапісаў матэрыялы допытаў свайго калегі Томаса з Казаска, праведзеных ім з 17 мая да 11 чэрвеня 1373 г. у далінах Ланца[43].

Ніжэй прыведзены вытрымкі з матэрыялаў допытаў спачатку Томаса з Казаска, а пасля і Антонія Сёмага (якія могуць уключаць у сябе таксама і матэрыялы Томаса з Казаска, бо Дзёлінгер у сваім выданні не праводзіць розніцы). Фрагменты, якія паўтараюцца, а таксама большасць канкрэтных імёнаў і інфармацыя, дзе, хто, з кім, пры якіх абставінах сустрэўся, выключаная з перакладу.

IV.iv.a Томас з Казаска, даліны Ланца, 1373 г.

Сведчанні судовай справы апавядаюць пра трыбунал, які быў праведзены супраць мужчын і жанчын з ваколіц мястэчка Мандаві (у П'емонце). У дакументе асобна адзначана, што прызнанні былі дадзеныя без прымянення катаванняў і любога іншага цялеснага прымусу[44]. Найбольш суровае пакаранне атрымаў "рэцыдывіст" Марцін, які быў прыгавораны да 3-х гадоў зняволення, прамаўляць штодзённа 100 разоў "Сімвал Веры" і "Ойча наш", "Вітай, Марыя", а таксама строгага посту; больш за тое, асобна прагаворваецца пазбаўленне яго ўсялякай магчымасці пропаведзі, навучання і ўвогуле абмеркавання Святога Пісання. Астатнія атрымалі параўнальна лёгкія пакаранні: паломніцтва ў Санцьяга-дэ-Кампастэлу, пост, малітвы, нашэнне валасяніцы на голае цела, прыніжальныя цырымоніі ў царкве падчас службаў і раздача міласціны. Акрамя таго, усе былі абавязаныя насіць крыжы і рабіць грашовыя ўнёскі на карысць Царквы[45]. У той самы час мы сустракаем звесткі, што як мінімум адзін настаўнік, Пётр Гарылы, быў на момант правядзення допытаў спалены[46].

Нетыповым для Ламбардскага рэгіёну і ўвогуле для канца XIV ст. з'яўляецца наяўнасць жанчын-настаўніц, якіх лічылі "добрымі і святымі"[47]. Адну з іх, найбольш часта згадваемую, Фіну, хацелі пакараць пажыццёвым зняволеннем,

---

[39] *Annales Minorum* vol. 8, 365–366.
[40] Amati, "Processus Contra Valdenses in Lombardia Superiori, Anno 1387," 3–61.
[41] Döllinger, *Beiträge*, 251–273.
[42] Alberto Barbero, "Fermenti ereticali nel Piemonte alla fine del Trecento: I processi di Thomas de Casascho e di Anthonius de Septo de Savigliano. II: Il Ms. 3217 (D.III.18) della Biblioteca casanatense di Roma" (dissertation, 1965).
[43] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 257.
[44] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 259.
[45] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 260, 72–273.
[46] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 279.
[47] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 262–265.

> але з-за яе раскаяння памілавалі і прызначылі пакаранне ў выглядзе нашэння крыжоў, пастоў, штодзённага ляжання на голай зямлі, а таксама "хатняга арышту": можна было выходзіць толькі ў царкву, а прымаць у сябе дома – толькі каго-небудзь са сваякоў, і тое ў выпадку хваробы або старасці, на вуліцы ж размаўляць з людзьмі забаранялася[48].
>
> Некалькі разоў сустракаецца пытанне, ці чулі абвінавачаныя што-небудзь пра "суцяшэнне" (катарскі рытуал), але на гэтае пытанне няма ніводнага станоўчага адказу[49].
>
> Таксама ў апытаннях шараговых вернікаў прасочваюцца іх "хістанні", як быццам бы яны выбіралі паміж каталіцтвам і вальдызмам, слухаючы і тых, і тых прапаведнікаў, але не даючы да канца веры ні адным, ні другім.

Мы, брат Томас з Казаска з ордэна братоў прапаведнікаў, інквізітар ерэтычнай заганнасці ў правінцыі Верхняя Ламбардыя і графстве Джавэна, накіраваны Апостальскім Прастолам, у імкненні аддаць незгасальнаму агню калючкі і пустазелле, якія адрадзіліся на ніве Гасподняй у выглядзе благіх старажытных змеяў, прывёў у парадак так, каб прапітанае атрутай ерэтычнай заганнасці агнём Святога Духа было ператворана ў пакаянне ў ружах і лілеях; авечкі, якія памыліліся і пякельнымі ваўкамі былі адбітыя ад статку авечак Гасподніх, былі вернутыя ў рукі пастухоў, да авечак, і грамады, і еднасці вернікаў Хрыста, і каб святая каталіцкая вера заззяла яшчэ больш бліскуча, ярка і прамяніста, выяўляючы блюзнерскую дактрыну промнямі святой каталіцкай веры, мы правялі вышук ... [супраць тых], хто не верыць, што падчас еўхарыстыі на алтары Гасподзь наш Ісус Хрыстос прысутнічае цялесна, але [думае, што] толькі духоўна; крыжу не трэба пакланяцца; іконы не заслугоўваюць аніякай пашаны; з-за грахоў кліра ў Царквы была аднятая ўлада/аўтарытэт Святога Пятра; святар, які знаходзіцца ў стане смяротнага граху, не можа адпусціць даверанае яму; чыстца па-за гэтым жыццём не існуе.

Таксама вучыла яе, што крыж не варты пакланення, і што забіваць жывёл – цяжкі грэх, і што працаваць у нядзелю[50] – не вялікі грэх[51].

Рымская Царква – не Царква з-за грахоў святароў і клірыкаў; з гэтага вынікае, што яны не могуць асвячаць Цела Хрыстова, ні даверанае ім адпускаць, ні індульгенцыі даваць; паломніцтвы ненавідзяць, іконы святых, Хрыста, Найсвяцейшай Дзевы, санктуарыі і крыж іх раздражняюць, як быццам бы ідалы; свечкі і царкоўны алей лічаць мітуснёй і пустэчай; і ўсё, што паходзіць ад Рымскай Царквы, асуджаюць як марнае і пустое, і мяркуюць, што ўсё неабходнае для Царквы ёсць у тых, хто накладае на іх пакаянні[52].

Хрыстос яшчэ не прыйшоў у Дзеву Марыю, але павінен прыйсці[53].

Быў запытаны, ці верыць, што браць пазыку пад працэнты – грэх, адказаў, што так. ... Быў запытаны, ці немаўляты, якія памерлі да хрышчэння, саграшылі смяротна ці веніяльна[54], адказаў, што залежыць ад Божай міласэрнасці. ... Быў запы-

---

[48] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 271–272.

[49] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 276.

[50] Іншы з апытаных зазначыў, што працаваць у нядзелю – смяротны грэх, а ў святочныя дні – не. Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 278.

[51] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 263.

[52] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 264.

[53] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 268.

[54] Веніяльны грэх – той грэх, які, у адрозненне ад смяротнага, можа быць прабачаны.

таны, ці ўшаноўваў якога-небудзь ерэтыка, адказаў, што не, але калі Пётр Гарылы прыходзіў у якое-небудзь новае месца, яго віталі ўкленчыўшы[55].

Быў запытаны, ці прымаў яго [Пятра Гарылы] ў сваім доме, адказаў, што шмат разоў для ежы, піцця, начлегу і гэтак далей[56].

Дастаткова маліцца ў сваім доме, а не хадзіць у царкву. Таксама, што калі была ў царкве – не павінна была ні глядзець з пашанай на іконы, ні маліцца, але толькі мець Бога ў сэрцы. ... Таксама вучылі яе маліцца, калі ў царкве ўзнімаюць Цела Хрыстова: "Малюся Богу, існаму ва ўсе часы, і Дзеве Марыі, чыім сынам ён ёсць, і святому сапраўднаму крыжу, на якім ён быў, і ўсім тым, кім былі гэтыя трое". ... Таксама казала, што названыя Яна і Якубіна казалі ёй, што лепш даць бедным, чым выдаткаваць на свечкі, якія ставяцца перад святымі ў царкве[57].

Быў запытаны, ці верыў і ці казаў, што душы святых, якія памерлі ў стане святасці, ці пакутніцкай смерцю, ці нечым падобным, ідуць у рай, адказаў, што так[58].

IV.iv.b Антоній з Савільяна, Пінерола, 1387–1388 гг.

Што бываў у сінагозе Вальдэнсаў[59] [і далей месца збору шматкроць названа сінагогай].

...Пасля пропаведзі піў і даваў астатнім, і раздаваў усім блаславёны хлеб, які называецца consolamentum.

Меў цялесную сувязь з ... жанчынай, калі ... было пагашана святло ... верыць, што гэта не грэх.

Настаўнікі Вальдэнсаў, Барыдон і іншы Ян, абодва з Апуліі[60], прапаведавалі пасля агульнай вячэры:

Дактрына яго [настаўніка вальдэнсаў] была слаўная і добрая, а хрысціянская – дрэнная, і ніхто па-за яго сектай не будзе выратаваны.

Таксама, што найвышэйшы пантыфік паходзіць з іх секты і пражывае ў Апуліі, і што Рымская Царква з'яўляецца Царквой зла, і збірае грахі з часоў святога Сільвестра і ад гэтага заняпала...

Таксама, што кожная клятва з'яўляецца смяротным грахом. Таксама, што няма нічога, акрамя двух шляхоў, а менавіта райскага і пякельнага, і што чыстца няма нідзе, акрамя як у гэтым жыцці[61].

Таксама, што міласціна і паломніцтвы не карысныя душам памерлых. Таксама, што Хрыстос не быў сапраўдным Богам, бо Бог не можа памерці, бо і сам мёртвы. І што любы з іх секты можа асвячаць Цела Хрыстова. ... Запытана, ці ўсяму вышэйпералічанаму верыць, што вышэйпералічаныя настаўнікі пастанаўляюць і прапаведуюць, адказаў, што так, бо даў зарок так верыць вышэйназванаму Вальдэнскаму настаўніку, пасланаму найвышэйшым Пантыфікам з Апуліі. Запытана, ці спавядала вышэйназваным настаўнікам свае грахі, адказала, што так, шматкроць. Запытана, ці перадавала ім якую-небудзь маёмасць, адказала, што так, першы раз

---

[55] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 276.
[56] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 277.
[57] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 280.
[58] Merlo, *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento*, 281.
[59] Döllinger, *Beiträge*, 251.
[60] Лацінскі тэрмін "Апулія" мае два значэнні: тэрыторыя сучаснай італьянскай аднайменнай правінцыі, а таксама паўднёвы ўсход Апенінскага паўвострава ў цэлым.
[61] Döllinger, *Beiträge*, 252.

паўфлорэна, іншыя разы [давала] ежу. Запытана, ці прымала бласлаўлёны хлеб ад Вальдэнскіх настаўнікаў, які называецца consolamentum, адказала, што так, з пашанай і ўкленчыўшы.

...

Настаўнік Вальдэнсаў ... Ян Барыдон з Апуліі, пасланы ў гэтыя землі сваім Папам Апуліі, каб пасля споведзі адпускаць грахі сваіх вернікаў[62].

...

Што належыць верыць у Бога Айца, але не ў Сына. Таксама, што не належыць адзначаць святы святых, як гэта робяць хрысціяне, бо ніякі святы ці душа ніякага святога не ўвойдзе ў рай, але будуць спадзявацца да самага Суднага Дня.

...

[Далей сцвярджаецца: галоўнае таінства – праламленне перахрышчанага хлеба, які прымаюць на каленях]

... атрымаў права слухаць споведзі, і дадзеную сабе ўладу, укленчыўшы пакорна, ад ... [вальдэнскага настаўніка], які перахрысціў яго, даючы ўладу слухаць пропаведзі і адпускаць грахі, кажучы, што мае больш улады, чым іншыя святары, і такую ўладу давалі сабе ад года ў год[63].

...

[Далей сцвярджаецца, што пазнавалі адзін аднаго па спецыяльных знаках двума пальцамі]

...

... у гаспіцыі... было пяць жанчын і шэсць мужчын і не больш, сярод жанчын былі дзве блудніцы.

...

Марцін казаў, што Бог – не ў таінстве еўхарыстыі, як кажуць і вераць хрысціяне, але заўсёды на нябёсах, і бачыў яго, лежачы ў ложку сваім, і пасмяяўся са сваёй жонкі, калі яна вярнулася з царквы. І сказала, што яна бачыла падчас таінства ў алтары[64], кажучы гэтым, што Рымская Царква з'яўляецца домам падману і пакінута Богам. І што ні Папа, ні святары не маюць улады адпускаць грахі, акрамя як члены іх секты сваім. Таксама, што асуджае біскупаў і інквізітараў, якія судзяць яго і яго [паплечнікаў], і праклінае ўсіх клірыкаў Рымскай Царквы. ... Таксама сказаў, што даваць у пазыку дзесяць флорэнаў за адзінаццаць або дванаццаць не было грахом. Таксама, што не варта верыць, што нейкія царкоўныя таінствы маюць значэнне для выратавання, акрамя хрышчэння, бо іншыя ўвогуле не таінствы, але былі заведзеныя з-за прагнасці царкоўнікаў. Таксама, што святым мужчынам і жанчынам не трэба пакланяцца і запальваць перад імі свечкі, бо яны не могуць дапамагчы, а толькі адзін Бог[65]. ... Быў запытаны, ці абвяргае веру Каталіцкай Царквы, адказаў, што так, у руках названага Марціна, і абяцаў яму быў у яго секце на ўсё жыццё сваё і верыць усяму, што сказаў Марцін, [бо яно] настолькі сапраўднае, што прывяло да выратавання яго душы, і пакланяцца богу свайму дракону, які супрацьстаіць Богу і яго анёлам, і больш адважны і магутны, чым Бог, і там урачыста аддаўся ў рукі названага Марціна[66].

---

[62] Döllinger, *Beiträge*, 253.
[63] Döllinger, *Beiträge*, 254.
[64] Паўтор на Döllinger, *Beiträge*, 264–265.
[65] Döllinger, *Beiträge*, 255–256.
[66] Döllinger, *Beiträge*, 256–257.

Меў паплечнікаў (socios), якія прынялі падобную ўладу слухаць споведзі і адпускаць грахі ад названага Марціна, братоў Якуба Бека [гл. ніжэй] і інш.

[Далей ідзе гаворка пра тое, што адбываецца ў "сінагозе"] ядуць і п'юць з вялікай радасцю, пачынаючы, калі народы зямлі адыходзяць да сну, пасля піцця і ежы тушаць святло, кажучы: хто мае, трымае[67], і тыя мужчыны і жанчыны наступным крокам адно да аднаго прыціскаюцца, і так застаюцца да світання[68]. Сярод жанчын галоўнай была Білія з ла Кастанья, якая памерла, якая раздавала ўсім прысутным напой, калі паставіла яго на стол, напой той прынесла ў фіяле, і напой той быў брыдкі на выгляд, і калі хто прымаў дастаткова, моцна апухаў, і тады той, хто шмат прыняў, памёр, і такі напой сам і ўсе астатнія прымалі столькі разоў, колькі наведвалі вышэйназваную сінагогу, і былі ці ёсць абавязаныя так дзейнічаць, каб хто прыняў аднойчы, пасля не мог кінуць абшчыну вышэйназванай сінагогі, і былі чуткі, што трымала пад ложкам тлустую рапуху, якую карміла мясам, хлебам і сырам. Запытаны, для чаго трымалі, адказаў, што з яе памёту рабіла вышэйназваны напой або вышэйназваныя паслугі. Быў запытаны, ці то вышэйназваная жанчына рабіла вышэйапісанае, адказаў, што шмат разоў, і ўсе тыя, хто прыходзіў у сінагогу. Быў запытаны, ці меў паплечнікаў, адказаў што так, Бону ла Картона, якая ўжо памерла, і Алаксія з Гарца, яе мужа, якая настаўніца (magistra) у вышэйапісаных прымхах. Быў запытаны, што кладуць у вышэйназваны напой, адказаў, што памёт вышэйназванай рапухі, і што была абвінавачаная, што спальвала свае валасы, і што валасы з галавы або з пахвіны ў вышэйназваны напой падмешвала і так напой рабіла перад надыходам Богаяўлення ўночы ля агню, і ў гэтым сама прызналася ў жыцці ў і смерці, і ў першы дзень сакавіка пачынала[69].

...

Асабліва адмаўляў цялеснае ўвасабленне Хрыста, яго пакуты, уваскрэсенне і ўзнясенне, бо Бог не мог і не хацеў настолькі сябе прынізіць, каб прыняць чалавечую плоць. Таксама адмаўляў ... царкоўныя таінствы, бо яны не карысныя для выратавання душы, і асабліва таінства хрышчэння, апошняга мірапамазання, Цела Хрыстова, шлюбу і пакаяння, бо ўсё гэта пустая пахвальба[70].

...

... усе вераць у Бога Айца, які стварыў неба, але не зямлю, але вялікі дракон быў творцам зямлі, уладаром сусвету, і мацнейшым на зямлі, чым Бог. Запытаны быў брат Антоній, ці быў ён пры наданні суцяшэння якой-небудзь хворай асобе з іх секты, адказаў, што так...[71] і што многія людзі там былі, а не толькі адна вышэйназваная, а таксама прыйшоў Лаўрэнцій з Лармеа, які даў ёй напой, пасля, трымаючы кавалак [хлеба], сказаў названай жанчыне: памятай пра гэта. Працягнуў ёй названы кавалак хлеба, які яна прыняла сашчэпленымі рукамі са слязьмі, пасля паклаў ёй падушку з яе ложку на яе галаву і грудзі, і яна сканала[72].

...

---

[67] Алюзія на Апак 2:25 або 3:11. Але калі ў Бібліі гаворка ідзе пра захаванне веры, то каталіцкія палемісты выкарыстоўвалі гэта для доказу распуснасці вальдэнсаў. Тое самае датычыцца вобразу затушанай свечкі.

[68] Döllinger, *Beiträge*, 257–258.

[69] Döllinger, *Beiträge*, 258.

[70] Döllinger, *Beiträge*, 259.

[71] Döllinger, *Beiträge*, 259.

[72] Döllinger, *Beiträge*, 259–260.

Таксама, што Бог не ўвайшоў у нявінніцу, не прыйшоў і не быў пахаваны. Таксама, што апосталаў і святых не належыць шанаваць, а таксама няварта служыць ім начныя імшы, і што Хрыстос быў народжаны ад Найсвяцейшай Марыі і яе мужа Іосіфа цялесна, і, адпаведна вышэйсказанаму, не ад Святога Духа. Таксама казаў той Бернард, прапаведуючы, што са смерцю цела душа памірае...[73]

...

[Далей паведамляецца, што ерэтыкі кляліся на нейкай кнізе захоўваць справы секты ў тайне; на сустрэчах у сінагогах жанчыны таксама маглі быць настаўніцамі і найпярвейшымі (magistra et principalis)]; прафесійныя заняткі жанчын: прадавачка каштанаў, ткачыха воўны][74].

...

... не грэх працаваць у дні нядзельныя, і ўжываць мяса падчас Вялікага Посту, святых вігілій і па суботах, бо Рымская Царква не можа нас прымусіць гэтаму падпарадкавацца[75]. Таксама, што Бог не прымаў чалавечай плоці і што Найсвяцейшая Марыя – не беззаганная і не маці Божая. Таксама, што Бог не можа быць у алтарным таінстве. Таксама, што апосталы і іншыя святыя мужчыны і жанчыны не маюць ніякай вартасці, і няма толку ад звароту да іх[76].

Што ўвесь бачны свет створаны вялікім драконам, які змагаецца супраць Бога і больш моцным у гэтым свеце, і яго належала шанаваць замест Бога[77]. Чыстца няма, і з мёртвага цела – мёртвая душа, і пасля душа не атрымае пакарання[78].

...

[У пратаколах пазначана, што сярод дапытаных былі 2 французскія-тэрцыярыі і селянін][79]

...

[з прызнання Якуба Бека (Jacobus Beth), вераванні якога ўяўляюць сумесь розных ерэтычных вучэнняў, але называюцца вальдэнскімі[80]]

Любы мужчына ці жанчына складаецца не з разумнай душы і цела, але адна частка – з дэманаў, якія грашаць, аб'яднаная з целам і ўкладае душу ў гэтае цела, і другая, якая будзе выратавана, выпраўлена з дапамогай анёлаў, якія спусцяцца з неба. ... сярод іх ёсць сапраўдны Найвялікшы Папа. Таксама, што не трэба верыць у дванаццаць артыкулаў веры і сем царкоўных таінстваў[81]. Таксама, што крыжу не варта пакланяцца[82]. ... Працаваць у святы і дні нядзельныя – не грэх. ... Няма ні чыстца, ні пекла, акрамя як у гэтым свеце, і няма іншых д'яблаў, акрамя як мужчыны і жанчыны, якія існуюць на гэтым свеце. Таксама, што калі жанчына цяжарная, мае д'ябла ў целе, і ніякім чынам ён не выратуецца, пакуль не будзе прыняты ў іх секту, што яны робяць, калі яму спаўняецца дзесяць і восем гадоў, і не раней, а да гэтага часу ён ва ўладанні д'ябла, і хрышчэнне не будзе яму карысным, калі ён загіне раней або ў дзяцінстве. Таксама, што калі хто-небудзь з іх секты не прыме

---

[73] Döllinger, *Beiträge*, 260.
[74] Döllinger, *Beiträge*, 260–261.
[75] Döllinger, *Beiträge*, 262–263.
[76] Döllinger, *Beiträge*, 263.
[77] Döllinger, *Beiträge*, 263.
[78] Döllinger, *Beiträge*, 263.
[79] Döllinger, *Beiträge*, 264–265.
[80] Döllinger, *Beiträge*, 270.
[81] Döllinger, *Beiträge*, 266.
[82] Döllinger, *Beiträge*, 266–267.

суцяшэнне перад смерцю, бо яму не будзе дадзена, яго душа далей пяройдзе ў іншае цела, якое раней сустрэне, або чалавека, або жывёліны, таму прымае перад самай смерцю выратавальнае бласлаўленне ад свайго духоўнага айца. ... Што цялесная сувязь з маці, дачкой ці сястрой – не грэх. Што даваць грошы пад працэнты – не грэх. ... Таксама, што Д'ябал стварыў Адама і Еву, і што прарокі, патрыярхі і нават Святы Ян Хрысціцель, якога Рымская Царква лічыць святым і шануе, асуджаныя. Таксама, што Майсей быў найвялікшы грэшнік, які калі-небудзь існаваў, і што атрымаў закон ад Д'ябла. Таксама, што не варта верыць у цялеснае ўваскрэсенне ў будучым, ні ўвогуле ў будучы суд[83]. ... Таксама кажа, што мінула ўжо 10 гадоў, ці каля таго, з той пары, калі быў пасланы Айцом Пятром/Пятром Патрыцыем[84] у Склавонію[85] (Sclavoniam), каб цалкам давучыць і ўдасканаліць названую дактрыну ад настаўнікаў/настаўнікаў, якія там пражывалі[86], у месцы, якое называецца Лаксэна (Loxena) / Баксэна (Boxena)[87], і гэта месца падпарадкавана нейкаму ўладару, які завецца Альбан з Лаксэны (Albanus de Loxena) / Баксэны, і падпарадкаваны названы ўладар каралю Русінаў[88] (Dominus regi Russienae) / Рашкі (Rassene)[89], і даў яму названы Пётр 10 флорэнаў, але той даехаў толькі да Ярры (prope Jarram) / Таны, і не пераязджаў далей за мора з-за дрэннага надвор'я ці навальніцы, пасля чаго вярнуся ў К'еры (Cherium)[90]. ... Запытаны, ці быў калі-небудзь у якой-небудзь іншай секце ці іншай веры, адказаў, што ажыццявіў паварот і ўдзельнічаў у перамовах, будучы ў Дафінэ каля месца Буксія (in Delfinata justa locum Buxii) у нейкай царкве Святой Люцыі з ерэтыкамі той часткі, што называюць сябе беднымі з Ліёна, і верыў у тое, што яны вераць і навучаюць, да гэтага на працягу двух гадоў[91]

... перад тым, як іх настаўнік захоча даць яго [суцяшэнне (consolamentum)], прымушае названага хворага паабяцаць яму, што калі ачуняе ад хваробы, то будзе трымацца наступнага: першае, што ніколі не скажа няпраўду ні па якой прычыне, другое, што ніколі не будзе ўжываць іншай ежы, як з Вялікага Посту, трэцяе, што ніколі не кране жанчыну, а жанчына – ніколі мужчыну, ні ўвогуле ніхто нікога, чацвёртае, што хутчэй пойдуць на катаванні, чым адмовяцца ад веры і вераванняў сваіх перад тварам любога пераследу, які ўчыняць супраць іх інквізітары. І тыя заўсёды носяць пальчаткі, каб да каго не дакрануцца або хто да іх не дакрануўся.

---

[83] Döllinger, *Beiträge*, 267.

[84] Гэты ўрывак мае значныя розначытанні, таму праз дроб прыведзены варыянт, прапанаваны ў Amati, "Processus Contra Valdenses in Lombardia Superiori, Anno 1387", 53.

[85] Верагодна, славянскія землі на Балканах (сённяшнія Боснія, Харватыя і Сербія).

[86] Хутчэй за ўсё, гаворка ідзе пра дуалістаў-багамілаў, якіх на захадзе лічылі папярэднікамі катараў. У "Склавоніі", а больш канкрэтна – у Сербіі, у гэты час была распаўсюджана "Баснійская Царква", якая ў розныя часы трактавалася, як ерэтычная і каталіцкай, і праваслаўнай цэрквамі, часам атаясамлівалася з багамільствам і патарэнствам. Smajo Halilović, "Trgovina robljem u srednjovjekovnoj Bosni s osvrtom na Usoru," *Članci i građa za kulturnu historiju istočne Bosne* 17 (2002): pp. 37–45, 37. Абвінавачванні баснійцаў у ерасі былі ўзмоцненыя палітычнымі прэтэнзіямі суседзяў, Балгарыі і Венгрыі, да баснійскага уладара Бана Куліна. Barabás, "Heretics, Pirates, and Legates," 39–40.

[87] Сярэднявечная назва Босніі.

[88] Галіцка-Валынскае княства, з 1253 г. – каралеўства.

[89] Вобласць сярэднявечнай Сербіі, побач з Босніяй.

[90] Döllinger, *Beiträge*, 268.

[91] Döllinger, *Beiträge*, 268.

Таксама кажа, што пасля прыняцця гэтага consolamentum ад аднаго з настаўнікаў, настаўнік кажа такому "суцешанаму" хвораму: Ты хочаш быць пакутнікам ці спаведнікам? Калі кажа, што хоча быць пакутнікам, то кладуць падушку або ўзгалоўе на гэтага хворага, і трымаюць працяглы час без прыціскання. І калі такі хворы аднаўляе дыханне, сканчваюць яго словы, якія кажуць, пакуль трымаюць падушку над ім; кажуць, што ён – пакутнік, або хутка памрэ, або ачуняе. І калі той ачуняе, называецца сярод іх дасканалым і трымаецца названых правілаў, і мае права даваць іншым хворым падобнае consolamentum. Калі ж хоча быць спаведнікам, трымаецца тры дні пасля прыняцця названага consolamentum без ужывання любой ежы і таксама пітва, і выконвае вышэйадзначаныя правілы і мае падобнае права, і надаюць яму зноў, і такі або выжывае, або памірае, аддае ўсю сваю маёмасць у рукі таго, хто даваў суцяшэнне[92]. ... Таксама кажа, што настаўнік, які называецца сярод іх дасканалым, не павінен ніколі ні грашыць, ні датыкацца да чаго-небудзь зямнога; у знак гэтага яны заўсёды носяць з сабой пальчаткі, каб гэтага пазбегнуць, і маюць падрыхтаваны посуд, абмыты дзевяць разоў, з якога ядуць і п'юць.

Таксама кажа, што калі інквізітар хоча даведацца пра жыццё іх без катаванняў, то няхай абароніць сябе, каб не прасіў такога ерэтыка, каб той казаў яму праўду, калі паходзіць з ліку тых, хто называецца Газэры (Gazeri), бо, пасля таго, як інквізітар такога запытае, кажучы: ці ты – дасканалы з Газэраў? Такі, калі ён з іх, адразу ж пра гэта інквізітару адкажа, што так, і пасля гэтага не прагаворыць ніводнага слова і не будзе есці[93]; але калі асцярожны інквізітар, кажучы або прамаўляючы сам, першы чым казаць яму пра яго жыццё, запытваючыся сам, каб расказаў яму пра жыццё яго і асобна пра Бога, у якога верыць, і тады ўсё скажа, не падманваючы[94].

[са слоў усё таго ж Якуба Бека: цела чалавека створана Д'яблам] ... усё, што ўтрымліваецца ў дванаццаці артыкулах веры – няпраўда...[95]

... пра кнігу Апакаліпсіс, якую патаемна насіў з сабой той самы ... і яе чытаў і распаўсюджваў тое, што ў гэтай кнізе ўтрымлівалася[96].

IV.v Працэс 1394–1395 гг. супраць Якуба Рысталаксія

У 1394–1395 гг. у Турыне адбываўся вялікі працэс супраць рабочага з турынскага прадмесця Карманьёліа (Carmagnolia) Якуба Рысталаксія (Iacobus Ristolaxius). Але падчас яго не было нават прыменена катаванне, паколькі падазраваны ахвотна расказваў пра сваю веру і адмовіўся ад памілавання, бо чакаў ганаровага ўваскрэсення праз тры дні пасля смерці. Далей прыведзены галоўныя вытрымкі яго адказаў на пытанні інквізітара[97].

Спачатку быў запытаны, ці бачыў калі-небудзь брата Ангеліка (Angelicus), ерэсіярха бязбожнага, адказаў, што так. Запытаны быў, ці верыў яму. Адказаў, што

[92] Döllinger, *Beiträge*, 271.

[93] Магчымыя два варыянты перакладу: "перастаў спажываць" як узмацненне да "замаўчаў"; і рэальна перастаў прымаць ежу, каб скончыць жыццё самагубствам.

[94] Döllinger, *Beiträge*, 272.

[95] Döllinger, *Beiträge*, 272.

[96] Döllinger, *Beiträge*, 272.

[97] Boffito, "Eretici in Piemonte," 381–432.

верыў. Таксама, што ёсць чалавек, пасланы богам, каб судзіць сусвет, і каб уваскрэсіць увесь свет для суда Хрыстова.

... Ад брата Ангеліка ўзяў цнатлівую дзяўчыну, якую прывёў з сабой у Карманьёліа ... каб яна была яго жонкай паводле веры яго, хоць ён ужо і быў жанаты, кажучы, што ўсе цнатлівыя жанчыны і дзяўчыны былі яго законнымі жонкамі.

Спавядаўся ў сваіх грахах названаму брату Ангеліка ... шмат разоў. Пакаянне ... жыць у чысціні і міры.

... чыстца няма ... імшы і малітвы, і іншае духоўнае заступніцтва не прыносіць карысці памерлым.

Асвечаная госція, пакладзеная ў добра закрытую скрыню, не застаецца Целам Хрыстовым ... бо не можа дыхаць. ... Святары, якія здзейснілі смяротных грэх, не могуць пераўтвараць Цела Хрыстова ці адпускаць каму-небудзь яго грахі.

Брат Якуб Бехус[98], спалены ў Турыне, не мёртвы, а жывы, кажучы, што акунуўся і абмыўся ў найкаштоўнейшай крыві Хрыста.

Навучаны дзесяці артыкулам веры.

Пост і іншыя добрыя справы, якія робяць, не карысныя нікому, акрамя толькі самога выканаўцы.

Папа не з'яўляецца сапраўдным вікарыем Хрыста і не можа вязаць ці развязваць[99].

Не прапаведаваў у сінагозе, але публічна.

Вальдэнсы выконваюць волю Хрыста ... яны не ерэтыкі, а святыя і сябры Бога, а калі б былі ерэтыкамі, то ён сам бы быў ерэтыком. А наадварот – ерэтыкі тыя, хто іх пераследуе[100].

Святы Грыгорый быў адным з чатырох Дактароў Царквы, і ніхто іншы. Папа Сільвестр не быў на месцы Святога Апостала Пятра, а быў Д'яблам, які запусціў атруту ў Божую Царкву, а менавіта прыняў тое, што яму даў імператар Канстанцін.

Ніхто не ідзе ў рай перад Судным днём, але знаходзіцца ў зямным раі.

Сказаў, што не грэх мець цялесную сувязь з цнатлівымі і маладзенькімі дзяўчынамі.

Перарваць Вялікі Пост у выпадку неабходнасці – не грэх.

Крыжу пакланяцца не грэх, яму варта пакланяцца. ... Грэх запальваць свечкі перад выявамі святых і пакланяцца ім[101]. Але свечкі запальваюцца перад алтаром, калі спяваецца імша і адбываецца Божая імша. І што акрапленне святой вадой не больш карыснае, чым акраплення вадой дажджавой.

Індульгенцыі Рымскай Царквы і іншых прэлатаў не карысныя і не маюць значэння, бо яны не могуць іх даваць, бо іх даюць за грошы, а не з-за Божай любові. ... Няма пэўных месцаў, прызначаных для малітвы, бо Бог усюды, і ўсюды – малітоўнае месца.

Толькі Богу належыць маліцца і звяртацца з просьбамі, а не іншым святым, бо міласць сыходзіць ад Бога, а святыя яе тады толькі перадаюць, і ніяк інакш.

---

[98] Названы вераломным ерэтыком. Спачатку належаў да ерэтычнай секты фратычэлі, потым перайшоў у вальдызм і быў у рэшце рэшт спалены за катарскія погляды. Магчыма, той самы Якуб Бек з папярэдняга працэсу.

[99] Boffito, "Eretici in Piemonte", 392.

[100] Boffito, "Eretici in Piemonte", 393.

[101] Boffito, "Eretici in Piemonte", 394.

Працаваць па нядзелях – смяротны грэх, які ніхто не можа адпусціць, акрамя Бога. Наконт іншых дзён святочных, а менавіта апостальскіх і святых, іншыя могуць адпусціць, прэсвітары і біскупы, калі яны святыя[102].

Яўрэі і сарацыны не былі выкуплены Хрыстом на крыжы[103].

[Якуб Рысталаксій ужываў клятву; у пратаколах няма звестак пра правядзенне еўхарыстыі не святарамі][104].

IV.vi Працэс супраць Яна Сэнсі ў Даліне Сузы 1403 г.

Вальдэнскі настаўнік Ян Сэнсі, родам з Сардзініі, быў затрыманы, дапытаны, катаваны і ў рэшце рэшт спалены ў савойскай даліне Сузы ў 1403 г. Спалены таму, што раней не раз трапляў у рукі царкоўных уладаў як ерэтык у Іспаніі. Вядома, што ён вандраваў, прапаведаваў, праводзіў службы і нават лячыў на шырокай тэрыторыі ад Сарагосы (Каралеўства Арагон) да альпійскіх далінаў ля Турына, праходзячы таксама паселішчы ў рэчышчы рэчкі Рона.

Цалкам рукапіс не быў апублікаваны, таму прыводзім асобныя вытрымкі пра яго вераванні па нататках-цытатах лацінскага арыгінала з артыкула Лукі Патрыя[105].

Быў запытаны, чаму навучаў іх у школах, уладкаваных у сінагогах, адказаў, што першае, чаму навучаў, – што не было славы райскай. Таксама, што ў рай ніхто не трапіць да дня Страшнага Суда. Таксама, што святыя, намаляваныя на сценах, не павінны ўшаноўвацца, бо гэта нішто. Таксама, што чыстца не існуе. Таксама, што Бог не ўваходзіў у Дзеву Марыю і не мог увайсці. ... таксама, што ніхто не асуджаны, толькі Д'ябал[106].

...[папярэдне асвечаны каталіцкім святаром і скрадзены паплечнікамі] кавалак Цела Хрыстова блюзнерскі падзялілі на чатыры часткі, каб паглядзець, ці зможа супрацьстаяць Магамету[107], Вальдэнскаму Богу...[108]

Таксама быў запытаны, ці існуе шлюб, адказаў, што шлюб – гэта падман, і што кожная жанчына, якая носіць пярсцёнак на пальцы, павінна даць задавальненне кожнаму мужчыне, якому захочацца і які запатрабуе ад гэтай жанчыны цялеснай сувязі[109].

Таксама сярод дэманаў гэтыя Вальдэнсы маюць аднаго спецыяльнага дэмана за свайго ўладара па імені Ангарыэль, князь Распусты. І іншага дэмана ў выглядзе

---

[102] Boffito, "Eretici in Piemonte", 395.

[103] Boffito, "Eretici in Piemonte", 397.

[104] Boffito, "Eretici in Piemonte", 400.

[105] Patria, "'Sicut canis reddiens ad vomitum'," 121–161.

[106] Patria, "'Sicut canis reddiens ad vomitum'," 130–131 н. 27.

[107] Лука Патрыя звязвае змяшэнне негатыўных вобразаў ерэтыкоў, д'яблапаклоннікаў і мусульманаў з узрастаннем пагрозы з боку піратаў у Міжземнамор'і, а асабліва з ростам турэцкай пагрозы пасля разгрому каталіцкага войска пад Нікопалем у 1396 г., дзе ў тым ліку быў узяты ў палон Гумберт Савойскі, зводны брат Амадэя VIII Савойскага. Patria, "'Sicut canis reddiens ad vomitum'," 153–156.

[108] Patria, "'Sicut canis reddiens ad vomitum'," 133 н. 31.

[109] Patria, "'Sicut canis reddiens ad vomitum'," 134 н. 34.

ката, якому пакланяўся, якога называюць Тэмон, і таксама яшчэ аднаго ў выглядзе казла, якому пакланяўся[110].

Быў запытаны, ці хоча што яшчэ сказаць, адказаў, што так, і сказаў, што сярод Вальдэнсаў Іспаніі ёсць такі звычай. Калі хто-небудзь з Вальдэнсаў зробіць дзіця сваёй маці ці сястры ў сінагозе, то дзіця, якое народзіцца, аддаюць у рукі Вальдэнскага біскупа, які называецца сярод іх таффія (taffia)[111], і той варыць гэтую істоту ў кацялку і з тлушчавой субстанцыяй, злучанай з маслам, атрымлівае мазь, якая захоўваецца ў невялікай ёмістасці, і гэтым маззю яны намазваюць палкі, на якіх вальдэнсы скачуць[112].

IV.vii Ліст Вінцэнта Ферэра

Апошні авіньёнскі Папа Бенедыкт XIII выправіў інквізітара-дамініканца Вінцэнта Ферэра ў 1399 г. у "рэйд" па Правансе, Савоі, Дафінэ і П'емонту, у якім той, пачуўшы пра нараджэнне Антыхрыста, разгарнуў маштабныя рэпрэсіі супраць вальдэнсаў і яўрэяў. 17 снежня 1403 г. года з Жэневы Вінцэнт напісаў падрабязную справаздачу пра сваё падарожжа.

Найвялебнейшаму ў Хрысце Айцу Брату Яну з Пюі-дэ-Нуа[113], генералу-магістру ордэна прапаведнікаў.

Найвялебнейшы Магістр і Айцец,

Праз незлічоныя турботы, якія мяне апанавалі, не здолеў Вашай міласці напісаць як належыць. Аднак, як выявілася, з таго часу, як я сышоў ад Рымлянаў, і да гэтага моманту ўключна, мне даводзіцца штодзённа прапаведаваць, і часцей за ўсё па два разы на дзень; а часам нават па тры; больш за тое, яшчэ і служыць урачыстыя імшы з нотамі; так што на перамяшчэнні, ежу, сон і іншыя патрэбы мне ледзь хапала часу; і нават у падарожжах даводзілася мне прамаўляць казанні. Такім чынам, не трэба абвінавачваць мяне ў непісанні з-за нядбайнасці ці пагарды, але таму, што я пакутаваў на працягу многіх дзён, тыдняў і месяцаў, часам штодзённа ў такіх клопатах, каб хоць напісаць Вам пра тое, што я зрабіў.

Такім чынам, вядома Вашай Бацькоўскай Вялікашаноўнасці, што пасля таго, як я сышоў ад Рымлянаў, куды Вы мяне апошнім наказам адправілі, на працягу яшчэ трох месяцаў я быў у Дафінэ, ходзячы па ваколіцах і прапаведуючы Слова Божае насельнікам мястэчак і вёсак, у якіх раней не быў, аднак асабліва наведваў тыя тры найвядомейшыя ерэтычныя даліны, з якіх адна называецца Люцэрна, другая Арджэнтэра, і трэцяя Вальпута. Я ўжо наведваў іх раней два ці тры разы, і з набожнасцю і вялікай павагай да Божай міласці яны прымалі вучэнне каталіцкай ісціны: але для іх канфірмацыі і далейшага суцяшэння хацеў іх наведаць: што і зрабіў па шматлікіх просьбах і запытах, як пісьмовых, так і вусных, перамясціўся ў Ламбардыю, дзе працягнуў прапаведаваць на працягу года і месяца па ўсёй сукупнасці гарадоў, мястэчак і вёсак у Вашым падначаленні, і не толькі, а менавіта ў дамене маркіза Монт-Ферат па шматлікіх просьбах

---

[110] Patria, "'Sicut canis reddiens ad vomitum'," 135 н. 36.

[111] Хутчэй за ўсё, паходзіць ад тэрміна марыскаў, якім яны называлі дробных арабскіх уладароў мусульманскай Іспаніі. Patria, "'Sicut canis reddiens ad vomitum'," 132 н. 29.

[112] Patria, "'Sicut canis reddiens ad vomitum'," 135 н. 37.

[113] Сёння Бейнат.

і запытах яго і ягоных. Таксама ў тых частках за гарамі я знайшоў шмат ерэтычных далінаў, як Вальдэнскіх, так і вычварных газараў (gazariorum)[114], асабліва ў Турынскай дыяцэзіі, якія я наведаў кожную па парадку, прапаведуючы ў кожнай з іх веру і вучэнне каталіцкай ісціны, з адрачэннем ад сваіх памылак, і праз Божую міласэрнасць палымяна і ў стане вялікай набожнасці, а таксама павагі, прымалі ісціну веры. Натуральна з дапамогай уладара і з пацвярджэннем пропаведзямі...

Я адкрыў, што прычынай іх схільнасці да ерасяў і памылак была адсутнасць пропаведзей. Бо, як я даведаўся праўду ад тых мясцовых, на працягу трыццаці гадоў не трапляла да іх ніякіх прапаведнікаў, акрамя як ерэтыкоў-вальдэнсаў, якія да іх звычайна прыходзілі два разы на год з Апуліі. З чаго раблю выснову, Шаноўны Магістр, што гэта віна царкоўных прэлатаў і іншых, хто па службовых абавязках ці па прафесіі павінен ім прапаведаваць, але больш хочуць адпачываць у прыгожых пакоях у вялікіх гарадах і вёсках з усімі асалодамі. А між тым тыя душы, за выратаванне якіх памёр Ісус Хрыстос, гінуць з-за недахопу ежы духоўнай, бо няма таго, хто адломіць ім лусту хлеба. Бо жніва шмат, а працаўнікоў мала. Таму я малю Госпада, каб даслаў працаўнікоў на жніво сваё[115].

Пра біскупа ерэтыкоў, якога я знайшоў у адной іх даліне, якая называецца Луфорыя, які хацеў такім чынам праз мяне звярнуцца таемна, і звярнуўся; таксама пра Вальдэнскую школу, якую я выявіў у даліне, якая называецца Ангронья, і яе разбурэнне; таксама пра ерэтыкоў газараў у даліне Валь дэ Понт, і якім чынам яны ад сваіх мярзотаў адвярнуліся; таксама пра ерэтыкоў даліны Валь дэ Ланц, або па-іншаму Квінні, дзе знайшлі прытулак забойцы Святога Пятра Пакутніка, і як яны ставіліся да мяне; таксама пра замірэнне партый гвельфаў і гібелінаў; таксама пра ўсеагульны саюз у тых краях і іншыя незлічоныя рэчы, якія Гасподзь міласціва здзейсніў да сваёй славы і карысці душаў, я прамаўчу. Але Бог блаславёны ва ўсім.

Пасля таго, як прайшло трынаццаць месяцаў у Ламбардыі, я ўвайшоў у Савою, пра што мяне прасілі прэлаты і многія ўладары: тут прайшло ўжо пяць месяцаў; і з вялікім стараннем я ўжо наведаў чатыры дыяцэзіі, а менавіта Сіён, Аосту, Тарантазію, Сен-Жан-дэ-Мар'ен і Грэнобль, якіх шмат у Савоі, прапаведуючы ў іх гарадах, мястэчках і вёсках больш ці менш, у залежнасці ад абставінаў. І такім жа чынам у Жэнеўскай дыяцэзіі.

Апрача іншых грахоў, я знайшоў у гэтых краях адну, надзвычай пашыраную, памылку: калі кожны год на наступны дзень пасля свята Цела Хрыстовага збіраюцца брацтвы пад вызваннем святога Усходу. Казалі мне нашы браты[116], а таксама браты меншыя[117], і іншыя манахі, і таксама члены курыі, што не асмельваліся там прапаведаваць ці што-небудзь казаць супраць гэтых памылак, ахопленыя жахам, бо ім пагражалі смерцю, а таксама ўхіляліся ад ахвяраванняў і міласціны. Я ж супраць гэтых памылак прынцыпова настойваў, прапаведваючы штодзённа, з дапамогай уладара і з пацвярджэннем пропаведзямі, і паспяхова выкараніў. Людзі, якія зараз прыходзяць, пакутуюць, слухаючы, наколькі яны памыляліся ў веры. Калі

---

[114] Сярэднявечнае абазначэнне ерэтыкоў; у розныя часы пад ім разумеліся катары, вальдэнсы, патарэны, проста ерэтыкі без канкрэтызацыі і г.д.

[115] Алюзія на Лк 10:2.

[116] Дамініканцы.

[117] Францысканцы.

ж сапраўды дзякуючы Божай міласці гэтая памылка была цалкам выдалена, хуткім часам накіруюся ў Лазанскую дыяцэзію, дзе, як агульнавядома, пакланяюцца Сонцу, як Богу, пераважна сяляне, уздымаючы да яго рукі ў малітве, робячы гэта з павагай. Бо ўжо сам біскуп лазанскі пасля двух ці трох пастоў прыходзіў пакорліва да мяне, молячы ад усяго сэрца, каб я яго дыяцэзію наведаў, бо ёсць шмат ерэтычных далінаў на памежжы Савоі і Германіі, што я і паабяцаў. Таксама я пачуў, што ерэтыкі тых далінаў надзвычай дзёрзкія і бясстрашныя. Але я накіроўваюся туды, давяраючы па звычцы міласэрнасці Божай, і пачну прапаведаваць падчас Вялікага Посту. А як была на тое воля Нябёсаў, так і будзе.

Мой паплечнік Антоній, і я буду разам з ім, мы набожна аддаемся Вашай Бацькоўскай Вялікашаноўнасці, якую Сын Дзевы няспынна зберагае, паводле прыкладу і пад нагляд святых правіл манаскага жыцця. Амінь.

Было канчаткова напісана маёй рукой ў горадзе Жэневе, 17 снежня 1403 г.

Нягодны слуга Хрыстовы і Ваш пакорны сын,

Брат Вінцэнт, прапаведнік[118].

IV.viii Бернардзін Сіенскі. Пропаведзь 1427 года

Бернардзін Сіенскі – італьянскі прапаведнік, францысканскі манах і святы. Вядомы цыклам сваіх пропаведзей на італьянскай мове. Прыведзены ўрывак быў прамоўлены ў Сіене ў 1427 г. Лічыцца, што гаворка ішла пра вальдэнсаў.

Таксама там часткова трымаюцца гэтага праклятага звычаю, пра які я вам раскажу, калі познім вечарам мужчыны і жанчыны збіраюцца ў адным месцы і робяць мешаніну, і маюць вогнішча, і калі падыходзіць час яго тушыць, тушаць, і пасля хто каму трапіцца – той таго мае, або каго хоча. Ой! Ой! Вы павінны ненавідзець пракляцце, якое пранікае ўнутр! І такіх людзей тут, у П'емонце, так шмат, і ўжо пяць інквізітараў накіравалася туды, каб знішчыць гэтае пракляцце, і ўсе былі забітыя гэтымі злымі людзьмі. І больш няма інквізітараў, якія б хацелі пайсці туды, каб прыкласці да гэтага рукі. І ведаеце, як называюцца гэтыя людзі? Называюць сябе "з бочкі" (del barilotto). Гэта імя такое, таму што раз на год яны хапаюць адно дзіця, і кідаюць адзін аднаму з рук у рукі, пакуль яно не памрэ. Потым, калі яно ўжо мёртвае, яны робяць з яго муку, і дадаюць гэту муку ў бочку, і кожнаму даюць выпіць з гэтай бочкі. І так робяць, таму што кажуць, што тады не адкрыюць нічога з таго, што яны робяць. У нашым ордэне ёсць брат, які раней быў адным з іх, і ён расказаў пра кожную рэч, якой яны трымаюцца, і яшчэ больш бязбожныя спосабы, якіх, я веру, яны трымаюцца[119].

[118] Fages, *Notes et documents de l'histoire de Saint Vincent Ferrier*, 109-11.

[119] San Bernardino da Siena, *Le prediche volgari di san Bernardino da Siena: dette nella piazza del Campo l'anno MCCCCXXVII* (Siena: Tip. Edit. All'Inseg. Di S. Bernardino, 1884), 356-57.

V. Свяшчэнная Рымская Імперыя

V.i Пасаўскі ананім

Ананімны трактат другой паловы XIII – канца XIV ст. з Пасаўскай дыяцэзіі, вядомы яшчэ як Псеўда-Райнэрый (бо ўключае ў сябе працу Райнэрыя Саконі) – першая маштабная згадка пра вальдэнсаў у Аўстрыі. Яго аўтарам быў парафіяльны святар або дамініканец. Да некаторых палажэнняў трактата варта паставіцца насцярожана, бо ён напісаны пад відавочным уплывам працы Аўгусціна Блажэннага "Кніга пра ерасі", таму многія месцы "падкарэктаваны" для падабенства з класічным творам: напрыклад, да пераліку ерэтычных сектаў, каб іх агульны лік супадаў з лічбай Аўгусціна, штучна дадаюцца (акрамя катараў) "тоесныя" ім маніхеі. Прысвечаная катарам глава – гэта кампіляцыя (з каментарамі) таго ж Аўгусціна, Райнэрыя Саконі і дамініканца Вільгельма Перальта[1], што можа сведчыць пра нераспаўсюджанасць катараў у Пасаўскай дыяцэзіі і, як вынік, адсутнасць у аўтара асабістых назіранняў. Нягледзячы на шматлікія запазычанні з палемічных твораў, гэта хутчэй тэарэтычная, чым палемічная праца. Што ж да вальдэнсаў, то Пасаўскі ананім – фактычна адзіны, але вельмі грунтоўны зрэз вальдэнскага жыцця ў 1260-я гг. Дадзеныя датычацца ў асноўным ніжнеаўстрыйскіх зямель (уздоўж аўстрыйскага берага Дуная).

Пётр Білер мяркуе, што тэкст напісаны пасля правядзення маштабных антывальдэнскіх інквізіцыйных працэсаў. Адрознай рысай ад падобных працэсаў на поўдні Францыі стала тое, што "нямецкі" інквізітар быў больш зацікаўлены ў апісанні вераванняў, а не дзеянняў канкрэтных ерэтыкоў. І, хутчэй за ўсё, быў скіраваны на апытанне не простых вернікаў, а непасрэдна "настаўнікаў"[2].

Пралог. Пра прычыны ерасі

Секта бедных з Ліёна з'явілася такім чынам: у даўнія часы былі важныя людзі ў Ліёне, і адзін з іх раптоўна заўчасна памёр. І адзін з гэтых важных людзей быў настолькі напалоханы, што адразу ж раздаў значную частку сваёй маёмасці бедным. І з-за гэтага сабралася вакол яго велізарная колькасць беднякоў, якіх ён навучаў звярнуцца разам з ім да добраахвотнай беднасці і стаць пераймальнікамі Хрыста і апосталаў. А паколькі ён быў крыху пісьменным, то навучаў іх тэксту Новага Запавету на народнай мове. З-за сваёй неразважлівасці, калі ён быў асуджаны біскупам, да гэтага паставіўся з непавагай і працягнуў настойваць на сваёй дактрыне, навучаючы сваіх вучняў, [што] паколькі [біскуп] жыве благім жыццём, [то біскуп] зайздросціць яго святому жыццю і дасканалай дактрыне. Калі ж Папа наклаў на іх

---

[1] Patschovsky, *Der Passauer Anonymus*, 79–82.

[2] Biller, "Inquisitors' Interrogations of Waldenses," 368–369.

адлучэнне, яны ўпарта не звярнулі на тое ўвагі, і так сёння іх вучэнне распаўсюдзілася па многіх землях[3].

A. Пра прычыны ерасі

Першая – гэта пустая фанабэрыя. Бо яны ж бачаць дактароў, якіх паважаюць у Царкве, і самі прагна імкнуцца быць паважанымі праз дактрыну.

Другая ў тым, што ўсе: мужчыны і жанчыны, старыя і малыя дзень і ноч не перастаюць вучыць і вучыцца; рабочы, хто днём працуе, начамі вучыцца або вучыць. Таму мала моляцца, бо [шмат] вучацца. Таксама вучаць і вучацца без кніг. Вучаць таксама ў лепразорыі. Для пачатку вучаць пазбягаць сямі смяротных грахоў і яшчэ трох, а менавіта падману, зласлоўя і клятвы. Гэтым падтрымліваюць многія меркаванні, і называюць гэта дзесяць запаветаў. Таксама вучань пасля сямі дзён шукае іншага для навучання, як адно кольца фіранкі штурхае наступнае[4]. Хто прыдумвае сабе апраўданне, што не здольны вучыцца, кажуць таму: Вучы штодзень адно слова, і праз год ты будзеш ведаць трыста, і так дасягнеш поспеху[5].

Я чуў ад аднаго верніка, што нейкі ерэтык – якога я таксама ведаў – для таго, каб яго ад нашай веры адвярнуць і ў сваю павярнуць, уначы, зімовай парою, пераплыў да яго праз раку, якая называлася Ібіс[6]. Ён абвяргае з сорамам верных [каталіцтву] дактароў, якія не прагнуць так ісціны каталіцкай веры, як бязбожныя леаністы прагнуць памылак нявер'я[7].

Трэцяя прычына ў тым, што Новы і Стары Запавет яны пераклалі на народную мову, і так вучаць і вучацца. Ты бачыш і чуеш вясковага невука, які чытае на памяць Ёва ад пачатку да канца, і многіх іншых, якія дасканала ведаюць увесь Новы Запавет. Але паколькі яны – неадукаваныя міране, яны тлумачаць Пісанне няправільна і скажона [прадстаўлены прыклады няправільнага тлумачэння Пісання]. Таксама вучаць і вучацца яны ў месцах і часах патаемных, не дапускаючы нікога, хто б не быў іх вернікам. Калі ў адным месцы збіраюцца, найперш кажуць: Асцерагайцеся, каб не было сярод нас нікога з крывым языком, гэта значыць, нікога чужога. І сваё вучэнне яны спрабуюць хаваць ад духоўных асоб [Каталіцкай Царквы]; такім чынам, звяртаюцца да каго-небудзь знакамі, якія ніхто не ведае, акрамя іх, і гэтыя знакі ператвараюць у словы, якія ніхто не ведае, акрамя іх: цэрквы называюць каменнымі дамамі, клірыкаў – пісарамі, манахаў – фарысеямі, і так пра многае іншае. Прама не адказваюць[8].

Чацвёртая прычына ў тым, што яны ўводзяць у зман іншых людзей благім прыкладам. Адкуль, калі бачаць, што хто-небудзь блага сябе паводзіць па жыцці, кажуць: Ні апосталы так сябе не паводзілі, ні мы, мы – пераймальнікі апосталаў[9].

Пятая прычына ў недастатковасці вучэння некаторых людзей, якія прапаведуюць што-небудзь пустое ці лжывае. Калі хто-небудзь з царкоўных дактароў навучае таму, што не можа пацвердзіць Новым Запаветам, яны ўспрымаюць гэта за байку.

---

[3] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 112–113.
[4] Устойлівы выраз.
[5] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 70.
[6] Правы прыток Дуная.
[7] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 70–71.
[8] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 71.
[9] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 71.

Шостая прычына – гэта непавага, якую яны выказваюць да царкоўных таінстваў[10].

Сёмая прычына – гэта нянавісць, якую яны маюць да Царквы. Я чуў з вуснаў ерэтыкоў, што яны былі нацэленыя звесці клірыкаў і кляштары да стану невукаў/землякопаў, каб адабраць дзесяціну і маёнткі для ўзмацнення і памнажэння іх вернікаў і прыхільнікаў. Калі нейкі ерэсіярх Генрых, майстра па вырабе пальчатак з Тэвіна (Thewin), быў прыгавораны да смерці, то сказаў усім ад сэрца: Вы нас за справу праклінаеце, бо, калі б нас не была меншасць, то тое права на забойства, што вы выкарыстоўваеце супраць нас, мы б выкарыстоўвалі супраць клірыкаў, манахаў і міран[11].

Ва ўсіх гарадах Ламбардыі і ў правінцыі Праванс, і ў многіх каралеўствах і землях ёсць тэалагічныя ерэтычныя школы. І яны маюць шмат слухачоў, многа дыскутуюць, і людзей склікаюць на ўрачыстыя сходы на плошчах і ў палях, і прапаведуюць у логавах. Няма таго, хто мог бы перашкодзіць ім, такія шматлікія і магутныя іх заступнікі. Інквізітары і тыя, хто дапытвалі ерэтыкоў, часта іх знаходзілі і налічылі ў дыяцэзіі 150 цэркваў, якія былі заражаныя ерассю. У адной толькі парафіі Комнат (Comnath) – 10 школ ерэтыкоў; і сам плябан парафіі заражаны ад ерэтыкоў, і таму няма аніякага асуджэння для секты[12].

B. Што секта бедных з Ліёна больш небяспечная, чым іншыя секты

Сярод усіх сектаў, якія ёсць ці былі, няма ніякай больш пагібельнай для Царквы, чым леаністы. І гэтаму тры прычыны: першая – гэта таму, што яна вельмі даўняя. Кажуць нават, што яна доўжыцца ад часоў Сільвестра; іншыя кажуць, што з часоў апосталаў[13]. Другая: яна больш усеагульная. Нават няма такой зямлі, куды б гэтая секта таемна не пранікла. Трэцяя ў тым, што калі іншыя дазваляюць жах ганьбы на Бога перад слухачамі, то леаністы знешне маюць вялікую набожнасць – гэта калі жывуць перад людзьмі з праведным сэрцам, і ўсе ў Бога вераць па ўсіх пунктах, што ў Сімвале [веры] ўтрымліваюцца – усяго толькі ганяць Рымскую Царкву і клір, чаму шматлікім міранам лёгка паверыць.

C. Як ерэтыкі распазнаюцца

Вядомыя ерэтыкі сваімі звычаямі і словамі. У звычаях сваіх яны напраўду ўраўнаважаныя і стрыманыя: фанабэрыі ў вопратцы не маюць, гэта значыць, ні раскошным, ні вельмі вульгарным не карыстаюцца. Гандляры не карыстаюцца ні падманам, ні клятвамі, ні лжывымі адгаворкамі, але жывуць з працы рук сваіх, як працаўнікі; нават іх дактары – гэта ткачы і шаўцы. Багацця не памнажаюць, задавальняюцца толькі неабходным. Леаністы – самыя цнатлівыя. Стрыманыя ў ежы і пітве. У шынкі не ходзяць, карагоды не водзяць і пустога не робяць. Гнеў стрымліваюць. Яны заўсёды або працуюць, або вучаць і вучацца, а таму мала моляцца. Таксама яны для выгляду ходзяць у царкву, ахвяруюць, спавядаюцца, прымаюць прычасце і прысутнічаюць на пропаведзях – але для таго, каб правесці пропаведзь у размовах.

У словах яны лаканічныя і стрыманыя: асцерагаюцца зласлоўя, жартаў і пустых слоў, а таксама падману і клятвы, не кажуць "сапраўды" і "дакладна" і ім падобных,

---

[10] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 72.

[11] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 72.

[12] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 72–73.

[13] Некаторыя аўтары лічаць, што гэта больш позняя устаўка. Падрабязней гл. Patschovsky, *Der Passauer Anonymus*, 105.

бо гэта падобна да клятвы. На пытанні рэдка адказваюць прама, калі ты пытаешся пра наступнае: Ты ведаеш Евангелле і Пасланні? адказвае: Хто б навучыў мяне гэтаму? Або кажа: Гэтага не павінен казаць, ёсць больш разумныя або больш рашучыя і больш вартыя; і кажа толькі: "Так, так – Не, не". Так яны дазваляюць сабе казаць, бо гэтак Хрыстос запаведаў (Мф 5:37)[14].

D. Метады самапрапаганды Вальдэнсаў

Ерэтыкі вельмі хітра стараюцца, калі прыцягваюць да сябе знатныя і заможныя сем'і. А робяць яны гэта наступным чынам: прапаноўваюць на продаж гаспадарам і гаспадыням якія-небудзь мілыя тавары, напрыклад, пярсцёнкі і мантыі. Калі тавар прададзены, пытаецца: Ці ёсць у вас больш на продаж? адказвае: Маю найкаштоўнейшыя камяні, якія толькі ёсць, якія дам вам, калі вы мяне ўпэўніце, што не выдасце клірыкам. Атрымаўшы запэўніванне, кажа: Маю камень настолькі бліскучы, што чалавек праз яго спазнае Бога; ён настолькі рдзее, што сэрцы тых, хто яго мае, напаўняе боская любоў. І так пра іншыя камяні кажа іншасказальна. Пасля чытае якую-небудзь набожную главу, напрыклад ... (Лк 1:26; Ін 13,1; Рым 12:1; Мф 23:2).

Пасля гэтага ерэтык параўноўвае стан Рымскай Царквы і свой стан і кажа: Дактары Рымскай Царквы ганарлівыя ў вопратцы і звычаях ... (Мф 23:7) Яны няўстрыманыя, а кожны з нас мае жонку і з ёй у чысціні жыве. Яны багатыя і сквапныя ... (Лк 6:25) Мы ж маем свае надзелы і іх трымаемся, і гэтым задаволеныя. Таксама яны прагныя да асалоды ...(Мф 23:14; Лк 20:47) Мы ж ад такога ўстрымліваемся. Таксама яны б'юцца і аб'яўляюць войны, і адпраўляюць забіваць і паліць няшчасных ... (Мф 26:52) Мы ж церпім смяротныя пераследы з-за суда. Таксама ядуць гультайскі хлеб, не працуючы. Мы ж працуем сваімі рукамі. Хочуць, каб толькі яны былі дактарамі ... (Мф 23:13; Лк 11:52) Між тым, сярод нас як мужчыны, так і жанчыны навучаюць, і вучань пасля сямі дзён вучыць іншага. Таксама рэдкі доктар сярод іх, які можа ведаць на памяць тры главы з Новага Запавету запар. Сярод нас жа вельмі рэдка сустракаецца мужчына ці жанчына, які не можа паўтарыць па памяці гэтага тэксту на народнай мове (vulgariter). Паколькі мы вучым жыццю і дактрыне ўсіх, таму кніжнікі і фарысеі дарма пераследуюць нас да смерці, як Хрыста.

Акрамя таго, яны шмат гавораць, але не робяць, і навешваюць цяжар грувасткіх папрокаў на плечы людскія, а самі і пальцам не варухнуць. Мы ж робім усё тое, чаму вучым. Таксама яны больш заклікаюць трымацца людскіх звычаяў, чым боскіх запаветаў, такіх, як пасты, і святы, і працэсіі, і многае іншае, што ўсталявана чалавекам. Мы ж угаворваем трымацца толькі вучэння Хрыста і апосталаў. Яны ж таксама накладаюць у пакаянне найцяжэйшыя кары, хоць самі і пальцам не варушаць. Мы ж кажам грэшнікам па прыкладзе Хрыста ... (Ін 8:11), і накладаннем рук усе грахі адпускаем. І душы мы неадкладна адпраўляем на неба, яны ж усе душы адпраўляюць у чысцец. Гэтыя і іншыя меркаванні кажа ерэтык: Падумайце, чый стан і чыя вера больш дасканалая, наша ці Рымскай Царквы, – і выберыце. І так ад каталіцкай веры адварочваецца і да сваіх памылак паварочваецца, і робіцца іх вернікам, і ахоўнікам, і спрыяльнікам, і абаронцам, і многія месяцы ў сваім доме патаемна расказвае пра сваю секту[15].

---

[14] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 73–74.

[15] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 75–77.

Е. Трактат Пасаўскага Ананіма наконт Вальдэнсаў

У гэтым творы спачатку прыводзяцца памылкі ерэтыкоў, потым іх доказы ці развагі, потым тлумачэнне памылкі, чацвёртае – доказ ці развага каталікоў, пятае – прычына ці абставіны першай ерэтычнай секты, а менавіта бедных з Ліёна.

Пра Рымскую Царкву

Першая памылка леаністаў і рункарыяў[16] у тым, што [яны думаюць што] Рымская Царква – гэта не Царква Ісуса Хрыста, але Царква зласлоўя і блудніца, што ў Апакаліпсісе (17:3) сядзіць вярхом на жывёліне, і што яна прыйшла ў заняпад з часоў Сільвестра, калі ў Царкву пацякла атрута мірскога. І што яны самі – Царква Ісуса Хрыста, якая трымаецца евангельскай дактрыны і апостальскіх слоў. Яны грэбуюць усімі пастанаўленнямі Царквы, не прымаючы аніякіх доказаў і разваг. ... (Лев 10:1; Друг 4:2, 12:32; Выхад 31:11; Мф 5:17) Таксама кажуць, што яны аднаўляюць евангельскую і апостальскую дактрыну дзеля вызвалення, а каноны і ўстанаўленні Царквы – гэта фарысейскія традыцыі ... (Мф 15:3; 1 Кар 7:12; Мф 23:2; Друг 17:12, 21:5; Лк 10:16; Рым 13:1) Наконт сваёй памылкі яны кажуць, што царкоўныя ўстанаўленні шматлікія і груваcткія, а ў Хрыста былі маленькія і лёгкія ... (Дзн 15:10) Таксама кажуць, што царкоўныя ўстанаўленні супярэчаць боскім устанаўленням, – гэта пра царкоўную маёмасць ... (Друг 18:1) Таксама, што ўстанаўленні Хрыста ўсеагульныя, а царкоўныя прыватныя, – гэта пра дзесяціну ... (Друг 12:5). Таксама, што Усходняя Царква не трымаецца ўстаноўленага. Таксама тыя, хто ўстанаўлівае, самі гэтага не трымаюцца ... (Мф 23:4) Таксама, што царкоўныя ўстанаўленні часта змяняюцца, гэта пра кроўную роднасць. Хрыстос жа сказаў: слова маю нязменнае (Лк 11:33). Такім чынам, Царква пастанаўляе тое, што ёй падыходзіць, бо распушчаная. Таму што ўстанаўленні Хрыста вызначаныя, а царкоўныя нявызначаныя"[17].

Пра Папу і клір

Папа, як яны кажуць, – галава ўсіх памылак, названых прэлатаў, пісцоў і манахаў-фарысеяў. Кажуць, што клірыкі, якія не працуюць, грашаць. Таксама кажуць, што яны [клірыкі] поўныя пыхі, сквапнасці і зайздрасці. Пыха: ... (Мф 23:6) Сквапнасць ... (Іер 6:13) Зайздрасць ... (Мф 23:13) Таксама кажуць, што кожны чалавек, у тым ліку жанчына, павінен прапаведаваць ... (Лік 11:29; 1 Кар 14:5; 14:13; Лк 19:40; Апак 22:17) Таксама, што апосталы прапаведавалі, будучы міранамі. Таксама, што дазволена міраніну прапаведаваць дзякуючы судовай скарзе, але нашмат больш – дзякуючы Богу. Супраць гэтага ў пасланні да Рымлянаў (10:15) ...: Як прапаведуюць, калі не былі пасланыя? Кажуць, што атрымліваюць натхненне ад Бога. Таксама ў Божай Царкве вельмі важны парадак дактароў ... (Эф 4:11; 1 Кар 12:28, 14:34). Таксама ерэтыкі абмяркоўваюць каталіцкіх прапаведнікаў. Калі які-небудзь з [каталіцкіх] прапаведнікаў кажа, што гэта не даказваецца ні ў Новым, ні ў Старым Запавеце, такую пропаведзь яны называюць падманам. Кажуць, што толькі Богу належыць падпарадкоўвацца, а не Папу і не прэлатам ... (Дзн 5:29). Яны называюць ідалапаклонствам тую пропаведзь, дзе Папа – Бог на зямлі, большы за людзей і роўны з анёламі, і таму не можа грашыць. Таксама не ўхваляюць, што называем Папу – Айцом, а манахі – абатам ... (Мф 23:9) Таксама, што некаторыя кажуць, што

---

[16] Магчыма, паслядоўнікі Яна з Ронка – "бедныя ламбардцы".

[17] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 77–79.

належыць падпарадкоўвацца прэлатам, што б ні казалі іншыя. Таксама пагарджаюць укленчваннем, якое робіцца перад святарамі (Апак 19:10)[18].

Пра царкоўныя таінствы

Усе царкоўныя таінствы яны асуджаюць. А менавіта, ім няважныя абставіны, калі святар здзяйсняе таінствы, і гэта таму, што гэтыя таінствы прадажныя, і з-за благога жыцця таго, хто іх адпраўляе. Таксама кажуць, што Папа і ўсе біскупы – забойцы. Гэта з прычыны вайны, што вядзецца супраць хрысціян, язычнікаў і ерэтыкоў[19]. І тыя, хто крыжовы паход прапаведуе, асуджаныя, таму што русіны і язычнікі не павінны зварочвацца да веры мячом, а толькі прыцягвацца пропаведдзю ... (Вых 32:27; Дзн 5:1–5)[20].

Пра хрышчэнне

Адносна хрышчэння яны памыляюцца ў тым, што кажуць, што немаўляты не выратуюцца праз хрышчэнне ... (Мк 16:16) Паколькі немаўля не верыць, яно не выратуецца. ... Таму яны перахрышчваюць, ускладаючы рукі замест хрышчэння. Тлумачэнне, што хросны бацька не разумее пытанняў святара[21] (Мф 19:14)[22].

Пра канфірмацыю

Пра канфірмацыю яны не клапоцяцца. Таму яе атрымліваюць вельмі нямногія, адзін з пяцідзесяці, таму што біскупы аддаленыя. Асуджаюць, што такім чынам біскупы пакідаюць усё для сябе, хоць Цела Гасподняе вартае большага ...[23].

Пра Цела Гасподняе

Яны кажуць, што святары, якія смяротна саграшылі, не могуць ажыццяўляць таінства еўхарыстыі ... (2 Цар 6:6–8; Мф 3:14) Таксама кажуць, што добры міранін, нават жанчына, калі ведае словы, можа здзейсніць. Таксама, што трансубстанцыя здзяйсняецца не ў руках, а ў вартых вуснах таго, хто яе прымае... (Пс 10:17) Таксама, што Цела Гасподняе асвячаюць левіты, такія як Лаўрэнцій ці акаліт Тарзіцый, які пайшоў у Рым. Выпадае, што гэта рабілі з абы-якой мукі, з абы-якога вінаграду; з нейкага абмакнутага ў віно хлеба; што ў адну вазу налівалі змяшаную з віном ваду; што асвячалі тое, што сабралі пасля абмывання; іншыя здзяйснялі [еўхарыстыю] кіслым віном; бывала, што еўхарыстыю служылі ў пакоях і ў дварах, як у Баварыі. Таксама субдыяканы Цела Гасподняе давалі хворым. Таксама дыяканы ўсю ноч весяліліся ў шынку, з рукамі ў [адной] ніжняй кашулі праводзілі імшу, па сведчанні ерэсіярха Гота (Goth). Таксама еўхарыстыя магла кішэць чарвякамі, як побач з Цветэлем; як сведчаць манахі. Таксама Цела Гасподняе магло папірацца рукамі і нагамі і паліваццa крывёю. Таксама яно прымаецца і ўжываецца нявартымі і адкрытымі грэшнікамі, а вартыя такія, як святыя, цнатлівыя і ўдовы, дароў не атрымліваюць, акрамя толькі выпадкова на Вячэры Гасподняй. Таксама ў вёсках часам шкалярам даецца без казання.

---

[18] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 79–81.

[19] Тут можа мецца на ўвазе вайна паміж Папам і Гогенштаўфенамі ў Італіі, на Сіцыліі і ў Германіі.

[20] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 81.

[21] Аляксандр Пачоўскі мяркуе, што маецца на ўвазе – не разумее лаціны. Patschovsky and Selge, *Quellen*, 81 н. 36.

[22] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 81.

[23] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 81–82.

Прычына ў тым, што плябанамі цэрквы аддаюцца ў трыманне, а вікарыі не задавальняюць патрэбы шкаляроў у казаннях[24].

Пра імшу

Кажуць, што імша – гэта нішто, таму не спявалі ні Хрыстос, ні апосталы. І таму, калі Хрыстос адзін раз быў ахвяраваны, святары прыносяць яго ў ахвяру па два разы на дзень. Таксама, што імшы спяваюцца, каб пажаліцца ... (Мф 23:14; Мк 12:40) Таксама, што не спяваюць ютрань або вігілій. І таму кажуць, што тыя, хто ладзіць імшу, – грашаць. Таксама кажуць, што першая імша новага маладога святара больш дзейсная, чым сотая. Тлумачэнне: некаторыя прапаведуюць, што грэшны святар, калі апранае [манаскі] капюшон, анёлам ачышчаецца. Таксама, што некаторыя прэтэндуюць на поўную імшу без канона [асвячэння][25]. Таксама кажуць, што царкоўныя спевы – гэта пякельныя стогны, і робяцца яны для задавальнення. І асуджаныя людзі, якія працаўнікам перашкаджаюць.

Царкоўнымі гадзінамі пагарджаюць ... (Пс 118:164, 118:62) Таксама кажуць, што адзін "Ойча наш" больш карысны, чым звон дзесяці званоў[26].

Пра ахвяраванні

Яны кажуць, што ахвяраванні дапамагаюць не таму, хто іх прыносіць, а выключна таму, хто іх прымае ... (Мф 9:13, 12:7) І што лепш даць беднаму, чым ахвяраваць святару ... (Мф 5:3) На гэта адказвае, што там прымаюцца ахвяраванні ў выглядзе малітваў або добрых спраў. Таксама, як Бог прыняў ахвяраванне ўдавы ... (Лк 21:3) Прычына, што ахвяраванні блага аддзячваюцца.

Таксама нагаворваюць на імшы праз залішнія перапынкі і спевы. І гэта таму, што святары паміж імшамі спрачаюцца з-за нязначных прычын, і так святар часта заканчвае імшу з неспакойнай душой. Яны кажуць, што з-за гэтага звычаю імша прыпадабняецца да сіманіі. І гэтыя выдумкі дзеля прыбытку называюцца добрымі звычаямі і гэтаму прымушаюць служыць, што на народнай мове называецца "зман"[27].

Пра таінства пакаяння

Пра таінства пакаяння кажуць, што ніякі святар, які меў смяротны грэх, нічога завязанага не можа развязаць, але гэта можа добры міранін ... (Экл 34:4; Мал 2:2; Лк 4:23; Мф 7:5; Іс 28:20) Таксама кажуць, што добры міранін мае ўладу адпускаць грахі. Таму што калі не мае, як можа даць? ... (Лк 9:49) Таксама кажуць, што лепш спавядацца добраму міраніну, чым благому святару ... (Лк 17:14; Ін 11:44) Прычына ў тым, што дзесяцерых слухаў адначасова. Таксама Багемскі святар Тэўтона чуў, і нічога не спасціг[28]. Таксама споведзь робіцца праз пасярэдніка. Таксама споведзь робіцца публічна. Кажуць, што гэта таму, што споведзь без дабравольнай ахвяры не падыходзіць. Гэта значыць, што бедныя не могуць спавядацца, а гэта іўдзейства. Таму што, калі віна прызнаецца з набожнымі думкамі, тады віны няма; мацерак, якія ненаўмысна зацiснулі хворых дзяцей, святары прымушаюць прыняць публіч-

---

[24] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 82–84.

[25] Маецца на ўвазе: прымушаюць міран пакланяцца неасвечанаму хлебу, падрабязней глядзі Patschovsky and Selge, *Quellen*, 85 н. 62.

[26] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 84–85.

[27] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 85–86.

[28] Магчыма, маюцца на ўвазе моўныя непаразуменні паміж тымі, хто размаўляе на чэшскай, нямецкай і лацінскай мовах.

нае пакаянне, якое звычайна накладаецца за самае звычайнае[29] злачынства. І так, разбегшыся ва ўсе бакі па зямлі, качаюцца ў грахах[30]. Яны ж, паколькі адначасова трымаюцца абмежаванняў у ежы[31], каб мець магчымаць уваходу ў царкву, ніколі не страцяць царкоўнага прычасця. Таксама за аб'яўленыя грахі караюць вялікай грашовай карай; і Царква не вымагае ніякай адплаты [справамі], [таму] ёсць спакуса правініцца. Таксама для таемных грахоў уводзяць вялікую колькасць імшаў. Таксама ўводзяць ускосныя споведзі. Таксама, калі грэх таемны, пішуць пісьмова; і так праводзяць споведзь. Таксама жанчыну, якая таемна зрабіла аборт ці нешта падобнае, адпраўляюць да біскупа; бо ў такім падазроная мужам забіваецца[32].

Пра таінства шлюбу

Таінства шлюбу абвяргаюць[33], кажучы, што жанатыя смяротна грашаць, за выключэннем уступлення ў палавую сувязь дзеля завядзення дзяцей ... (1 Кар 7:29, 7:38) Іншыя лічаць шлюб распустай ... (1 Кар 7:2) Тлумачэнне: з-за распусты вымушаны абараняць [тое, што маеш], а не імкнуцца [да большага] ... (Лк 14:20) Такім чынам той, хто ў шлюбе, не можа выратавацца ... (Мф 19:6; 1 Кар 7:27; 7:9; Кал 3:19; 1 Кар 7:5; 1 Цім 5:14; 2 Цім 3:1; 1 Цім 4:1) Прычына: адны з боку сужэнца, таму што жанатыя не сочаць ні за часам, ні за мерай; іншая з боку святароў, таму што яны вымушаюць цнатлівых жонак шукаць беглых мужоў у многіх землях, якія таксама не трымаюцца за сумеснае жыццё ў сям'і, за выключэннем уласнага жадання, і так многія жанчыны спакушаюцца[34]. Такім чынам нарачоная нявінніца ўтрымліваецца ля ўвахода ў царкву сорак дзён, а блудніца ніводнага дня. Падобным чынам, калі яна памірае пры родах, паводле саміх царкоўных канонаў дазваляецца ўнесці ў царкву ў першы дзень. У той час як некаторыя з іх прапаведуюць, што жанчыны, якія памерлі пры родах, асуджаныя. Няшчасным не застаецца нічога іншага, як прадставіцца пасля родаў, не атрымаўшы бласлаўлення. Такім чынам, калі роды блізка, [жанчыны] прымушаюцца да саракадзённага посту, і так тыя, хто працуе, атрымліваюць выкідыш[35].

Пра таінства мірапамазання

Пра таінства мірапамазання рашуча кажуць, што гэта найгоршая пыха ... (Іак 5:14) Прычына: таму што гэтае таінства нічога не дае, акрамя грашовага прыбытку. І гэта робіць большасць святароў, і дазволена, каб многія святары гэты гонар уводзілі, у рэшце рэшт, як хрышчэнне і канфірмацыя адзін раз даюцца, як і мірапамазанне. Такім чынам прапаведуюць, што ніякае таінства не павінна давацца нікому, акрамя як таму, хто можа мець як мінімум дзве каровы. З-за гэтага беднякі моцна абураюцца. Таксама кажуць, што дванаццаць свечак у канфірмацыі абавяз-

---

[29] "Vulgarissimo" – можа быць перакадзена не толькі як "самае звычайнае", але адначасова мае дадатковае значэнне "нярэдкае сярод простага люду", і таму "самае брыдкае" з пункту гледжання клірыкаў.

[30] Той самы дзеяслоў апісвае свінняў, якія "качаюцца" у гразі.

[31] Прадпісаных Каталіцкай Царквой.

[32] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 86–87.

[33] Нягледзячы на тое, што вальдэнсы ўсхвалялі цнатлівасць і чысціню, яны аддавалі перавагу шлюбу. Herzog, *Die romanischen Waldenser*, 34.

[34] Не вельмі зразумелы сказ, напісаны з граматычнымі памылкамі. Магчыма, маецца на ўвазе, што святары вымушаюць жонак выпраўляцца па беглых мужоў, і тыя спакушаюцца ў дарозе.

[35] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 88–89.

ковыя; але калі хапіла адной свечкі, каб служыць Целу Гасподняму, што з'яўляецца найважнейшым таінствам, такім чынам і тут [павінна быць][36].

Пра таінства пасвячэння

Пра таінства пасвячэння кажуць, што гэта нішто, таму што апосталы былі міране. Таксама Хрыстос не даваў Апосталам ні столы, ні інфулы, ні пярсцёнка, ні іншых убораў. Грэшны святар ачышчае нячыстае (Яўр 7:27) ... Таму, калі б толькі святарам дазволена было даваць госцію і ажыццяўляць таінствы па боскім законе, то абразанне, бласлаўленне, духоўнае і цялеснае ачышчэнне і навучанне – нашмат больш было б дазволена толькі царкоўным святарам. Толькі племя Леві было святарамі. Озія атрымаў праказу, калі ўзурпаваў святарскі стан.

З танзуры пасміхаюцца, таму што апосталы яе не мелі ... (1 Пят 5:3) Такім чынам, клір быў і ў часы апосталаў ... (Дзн 14:22; Вых 28:39; 1 Цім 3:2; 3:8–10; Ціт 1:5) Прычына ў тым, што нявартых жыцця і навукі, тых, хто мае хібы ад нараджэння, да пасвячэння і ўшанавання заахвочваюць, і такія прыслужнікі словам і прыкладам уводзяць у зман Божую Царкву.

Кажуць таксама, што Царква вельмі глыбока памыляецца, забараняючы святарам уступаць у шлюб, таму што закон стары і перашкаджае новаму, і хавае распусту. Таксама большасць сцвярджае правы незаконнанароджаных у царкве. Таксама кажуць некаторыя, што ўстрымліваюцца тыя, хто робіць вышэй за пояс: пацалункі, пагладжванні цмочкаў, сціскання ды любоўныя мілоты грудзей, усё, што належыць рабіць у каханні ... (1 Кар 7:1; Мф 5:28) Такім чынам, сярод іх шмат тых, хто ўпадае ў распусту[37].

Пра адлучэнне

Адлучэннем пагарджаюць, кажучы, што тыя, хто адлучае – праклятыя ... (Быц 27:29; Экл 21:30; 1 Кар 6:10; Дзн 5:1–11; 1 Кар 5:5; 1 Цім 1:20; 1 Кар 5:3; Гал 1:9; 2 Ін 10)

Таму, яны кажуць, адлучэнне трымаецца на несправядлівасці. Таксама падчас адлучэння ерэтыкі радуюцца, таму што такім чынам могуць спакушаць хрысціян і прымушаць іх абясцэньваць пакланенне Богу. Таксама бязбожна караць нявінных пазбаўленнем таінстваў за чужыя грахі. Таксама, што хвала Бога і нябеснай курыі замоўчваецца. Таксама, што душам у чыстцы несправядліва адмаўляецца ў царкоўным заступніцтве. Таксама, што жывыя вернікі ахвяраванні змяншаюць, і такім чынам не дадаюць дзесяціны. Прычына ў тым, што адлучэнні памнажаюцца па нязначных падставах, такіх, як грошы ад дзесяціны, або калі хто не ходзіць да царквы, і ім падобныя. І яны караюць іх, як маланкай, не зважаючы на законны парадак, і пасля далучэнне да канца не даводзяць. І такім чынам, і той, хто адлучае, і адлучаны, і далучаны народ – у небяспецы[38].

Пра дзесяціну

Дзесяціна, яны кажуць, не мусіць давацца, таму што ў першаснай Царкве яе не давалі. Таму што тады таксама тыя, хто дзесяціну прымае, павінен дзесяціну даваць (Яўр 7:9). Калі ж кажаш, што трэба даваць таму, што іўдзеі давалі, то мы павінны і іншых прававых звычаяў трымацца. Таксама кажуць, што ў нямногіх землях

---

[36] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 89.
[37] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 89–90.
[38] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 90–91.

дзесяціну даюць, а менавіта ў ваколіцах Рыма. Таксама кажуць, што грашаць тыя, хто дае дзесяціну, і грашаць міране, якія дзесяціну атрымліваюць[39], таму што зло вяртаецца ... (Мал 3:10; Мф 23:23)[40]

Пра маёмасць

Кажуць, што асабістую маёмасць клірыкі не павінны мець... (Друг 18:1; Дзн 4:32)[41]

Пра індульгенцыі

У індульгенцыі яны не вераць ... (Лк 5:21) Царкоўнае адпушчэнне грахоў ні ў што не ставяць. Пра не замацаванае канонамі не дбаюць. Тлумачэнне: Бог узнагароджвае намер, а святар паслугу ... (Ін 20:23) У царкоўнае кіраванне не вераць. Прычына: узрастанне колькасці індульгенцый. Гэта значыць таму, што ўсе грахі адпускаюцца за грошы. І гэта значыць, што будучае пакаранне адмяняецца, у што яны не вераць[42].

Пра святы

Пра святы царкоўныя не дбаюць, кажучы, што адзін дзень такі ж, як і іншыя. Супраць: Гасподзь прадпісаў дзень суботні асвяціць. На гэта адказваюць: калі па прадпісаным мы павінны служыць дэкалог, то гэтым і абмяжуемся. Супраць: Хрыстос наведваў свята. Прычына: каля ста дваццаці святаў на год. Такім чынам, гэта святы Вялікадня і Пяцідзясятніцы, кажуць, калі былі Стэфан і Ян. Таксама падчас святаў кірмашы. Таму для атрымання фінансавай выгады святы былі перанесены на нядзелю. І таму там працуюць краўцы і фурманы. Таксама таму, што існуе зашмат святаў, пераносін [мошчаў], новаўвядзенняў і восьмых дзён пасля Вялікадня. І таму рэдкі той тыдзень, калі б не сустракаліся два ці тры. І таму, калі сабраць усё паказанае разам, то народ упадае ў спакусу. І таксама таму працоўныя не зберагаюць, а ўпадаюць у галечу. І таксама таму, што гэта прыносіць шматлікія грахі. І таму ў першаснай Царкве было мала святаў. І такім чынам таму яны таемна працуюць[43].

Пра пасты

Царкоўных пастоў не трымаюцца, а ў дні суботнія таемна ўжываюць мяса (Рым 14:17; Іс 58:5; Рым 14:3) Супраць: Ян пасціўся, і Ганна, і Хрыстос 40 дзён, і апосталы ... (Мф 2:20) Прычына: паколькі працоўным і беднякам належыць пасціцца на хлебе і вадзе падчас Вялікага Посту, таму падчас посту не працуюць[44].

Пра матэрыяльную царкву

Збудаваную царкву ўспрымаюць як склад і называюць яе проста "каменны дом" (stainhaus) ... (Дзн 17:24) І малітвы ў ёй не больш дзейсныя, чым у іншым доме... (Мф 6:6; Ін 4:21; 1 Цім 2:8; Мк 11:15; Мф 21:15) Таксама ўстрымліваюцца ад нячыстага храма цялесна і духоўна. Таксама мытнік, знаходзячыся ў святым месцы, не адважваецца вочы падняць. Матэрыяльная царква – гэта храм апосталаў ...

---

[39] Распаўсюджаная сярэднявечная практыка атрымання даходаў з прыходаў міранамі.
[40] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 92.
[41] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 92–93.
[42] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 93.
[43] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 93–94.
[44] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 94.

(1 Кар 11:22; 3 Цар 8; Мф 21:13; Ін 2:14; Мк 11:16, 12:35, 14:19; Лк 19:47) Прычына: таму што ў царкве былі гульні прывідаў, і там раскошнае адзенне выстаўляюць напаказ і хваляцца[45].

Пра пасвячэнне

Пра пасвячэнне не клапоцяцца ... (3 Цар 8:63; Вых 40; Ін 10:22) Алтар, кажуць – гэта праклятая груда камянёў, дзе на камянях парахнее рыззё ... (Вых 20:22–26) Таксама Ной, Аўраам і Якуб узводзілі алтары. З гэтай прычыны кажуць, што многія выдаткі, якія пайшлі на пабудову царквы, лепш было б раздаць бедным ... (Мф 24:2) І таму маюць цэрквы ў халупах. І кажуць некаторыя, што колькі разоў царкву абмінеш, столькі смяротных грахоў загладзіш. Таксама некаторыя прапаведуюць, што грэх распусты ідзе ад чужой царквы. І што лепш маліцца ў хляве, чым у чужой царкве[46].

Пра царкоўнае аздабленне

Царкоўнае аздабленне называюць грахом, і што лепш было б апрануць беднякоў, чым сцены ... (Вых 36:8–40:33; 3 Цар 6) Большасць айцоў у працэсіі была апранута ў скуру Антонія. Кажуць, у штаны з тканіны цялеснага колеру. Пра свяцільнікі яны кажуць, што Богу, які ёсць святло, свяцільнікі не трэба, і гэта важна толькі ў царкве, каб святары не спатыкнуліся ... (Вых 25:6; 3 Цар 7:49) Курэнне духмянасцямі асуджаюць ... (Вых 25:6) Святую ваду лічаць за звычайную ... (Лік 19:11) Іконы і выявы святых прымаюць за ідалапаклонства ... (Вых 20:4) Рашэнне: абразы не для пакланення, а для напаміну. Таксама выявы – гэта пісанне міран. Прычына: Абрэзаныя іконы і апаганеныя выявы больш наводзяць жах, чым набожнасць.

Сэнс у словах, а не ў мелодыі; з царкоўных спеваў здзекуюцца ... (1 Пар 16; Пс 32:3; Мф 21:15–16; Лк 19:40) Прычына: зацягванне і залішняе запаўненне песень, каб вершы ішлі за вершамі. Смяюцца з крыкаў міран ... (Пс 101:2; 1 Мак 4:10) Хрэснымі хадамі пагарджаюць з-за дурасці, якая там прысутнічае[47].

Пра святых

У святых не вераць, акрамя апосталаў і тых, хто згаданы ў Евангеллях або ў Дзеях. ... Таксама не звяртаюцца з малітвамі ні да Святых, ні да Святой Марыі, а толькі да аднаго Бога. ... Прычына: гэта несапраўдныя святыя, такія, як Іван (Iwanus), і іншыя, чыя імёны не варта нават ведаць. Таксама паважаюцца крыніцы, такія, як у Дроза[48], дзе ў крыніцы святары хрысцяць распяццем і людзі ахвяруюць крыніцы. Тое ж самае да святых дрэў, як да святога Хрыстафора, і да вогнішчаў у палях. Таксама гуляюць з імёнамі святых, як Эрхард[49], прыносячы яму ахвяраванні. Таксама ў дачыненні да святых Старога Запавету не выказваецца ніякай набожнасці. Таксама павага, якая павінна выказвацца Богу, – адкуль ... (1 Цім 1:17) яму больш выказваецца, чым святым. Адтуль тыя, хто посціцца ў чацвер – дзень святога Мікалая, у суботу – дзень Божы, – не посцяцца. Таксама, калі ўзгадваецца Мікалай, усе ўздыхаюць; калі ж узгадваюць Ісуса Хрыста, усе маўчаць. Таксама ў легенды і

---

[45] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 94–95.
[46] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 95.
[47] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 95–97.
[48] Сёння Дросс ля Крэмса.
[49] Сярэднявечны святы, вядомы сваімі тлумачэннямі (=мудрасцю), атрыманымі ад Бога.

пакуты святых не вераць. Нагода для пярэчання ў хрышчэнні Канстанціна і іншых неверагоднасцях, такіх, як легенда пра Маргарыту, ці Юліяну, ці сем святых[50].

Пра цуды

У цуды святых не вераць. Супраць гэтага: калі ў царкоўныя цуды не вераць, то і ў апостальскія не вераць. Такім чынам, уваскрэслыя ўсё яшчэ жывуць. Нагода: калі з ікон сыходзіць алей, кроў, слёзы ці нябеснае святло – гэта лжывы цуд. Такое крывадушша, якое па-народнаму называецца Штэрцар (Stercer), калі спачатку дэманструюць розныя раны, а потым паказваюць, як хутка загаіліся[51].

Пра мошчы

У мошчы святых не вераць. ... Нагода: несапраўдныя мошчы, якія носяць вакол вёсак і з якіх смяюцца ў корчмах, такія, як малако Дзевы Марыі, якім кармілі яшчэ малога Хрыста, і саламандра з адзення Дзевы Марыі, і пот Хрыста, і саван, у які быў загорнуты Хрыстос; а таксама анёльскія мошчы. Таксама той, хто прадае, публічна пахваляецца, што можа зрабіць столькі святых, колькі хоча. Той, хто падманвае, такім чынам кажа, што ведае, як бычыныя косці пасячы на часткі, загарнуць у пурпур і падпісаць як святых па сваім жаданні; і так часта робіць. Так, малаком святой Марыі хрысцяць і вады даюць піць. Таксама яны прадажныя. Таксама плябан паказаў народу, што многія пагрызены мышамі, і быў вялікі скандал з-за гэтага. Таксама розныя цэрквы сварацца за целы святых, кажучы, што яны іх маюць, як пра целы святой Марыі, Дыянісія, Віта і інш.[52]

Пра святы крыж

Святога крыжа баяцца з-за тых пакутаў, што на ім перанёс Ісус Хрыстос. Нагода: некаторыя прапаведуюць, што ён пасля распяцця таемна сам яго пакінуў.

Таксама дрэва крыжа, як яны кажуць, – гэта проста дрэва. І таму не аберагаюць сябе крыжом ... (Гал 6:14; Прам 14:7; Мф 24:30) Таксама, калі святое ўлонне, што Хрыста прынесла, такім чынам, святы і крыж, які кроў яго праліў[53].

Пра пахаванне

Не зважаюць ні на пахаванне Госпада, ні святых ... (Мф 23:29; Іс 11:10; Пс 131:7) Пахаванні Госпада і прарокаў шануюцца такім жа чынам, як і басаногіх родзічаў.

Пра царкоўнае пахаванне не клапоцяцца. Бо яны б аддавалі перавагу пахаванням у полі перад могілкамі, каб не баяліся Царквы ... (Дзн 8:2) Таксама святыя айцы выбралі быць пахаванымі ў святых месцах. Прычына: не перашкаджаеце хаваць тых, і хто самі сябе забілі, і цалкам адмаўляеце ўсялякае пахаванне. Тое ж самае наконт усіх, хто быў выгнаны, таксама наконт немаўлят, якім патрабуецца заступніцтва. Таксама таму, што святыя былі пахаваныя некаторыя ў садах, як Хрыстос, некаторыя ў сваіх дамах, а некаторыя ў вадзе, як Клеменс. Начныя імшы перад пахаваннямі адмаўляюць за шалёныя ўчынкі, якія бываюць там. Таксама гэта было прынята адначасова звычаёвым правам і царкоўнымі канонамі ад пачатку свету, бо калі чалавек будзе сам сабе абіраць месца для пахавання дзе яму ўздумаецца, многія непаразуменні з-за памерлых перарастуць у вялізны вэрхал паміж вернікамі і няверуючымі[54].

---

[50] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 97–98.
[51] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 99.
[52] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 99–100.
[53] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 100.
[54] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 100–101.

Пра паломніцтвы

Паломніцтвы абвяргаюць праз тое, што трэба раздзяляцца ... (Лк 24:18; Мф 27:7) Прычына: многія паломнікі спакушаюцца ў дарозе. Таксама лжывыя паломнікі, каго называе Стэрцар[55]. Таксама кажуць, што ў Аахене Хрыстос і апосталы асвяцілі царкву і ўсім паломнікам адпусцілі грахі, як пры хрышчэнні[56].

Пра чысцец

Чысцец адмаўляюць, кажучы толькі пра дзве дарогі, адна для абраных на неба, другая для асуджаных у пекла ... (Экл 11:3), гэта значыць, на нябёсы або ў пекла. Кажуць таксама, што імшы, ахвяраванні і іншыя заступніцтвы для душаў бессэнсоўныя, і сёмы дзень, і ўгодкі робяцца для фінансавай выгады ... (2 Мак 12:35; 1 Кар 3:14) Таксама Аўгусцін: Хто моліцца за пакутніка, прыносіць яму пакаранне. Такім чынам, хто замаўляе імшу або моліцца за немаўля, прыносіць яму пакуты. Таксама, калі хто добры, то яму не трэба заступніцтва, а калі дрэнны, то яно не дапаможа ... (Ін 17:9) Калі за жывых не належыць маліцца, то такім чынам і за мёртвых. Рашэнне: мы не молімся за вельмі добрых, таму што ім не трэба, і за вельмі благіх, бо ім не дапаможа, але толькі за сярэдніх паміж дабром і злом, каб хутчэй вызваліліся ці атрымалі больш паблажлівае пакаранне. Таксама кажуць, што малітвы добрых міран больш карысныя, чым благіх святароў, і адзін "Ойча наш" больш дзейсны, чым многія імшы ... (Ін 9:31; Іс 1:15) Грыгорый: Калі таго, хто не падабаецца, дасылаюць выступіць пасярэднікам, дух прыходзіць у яшчэ большы гнеў. Таксама кажуць, што малітвы на латыні міранам не дапамагаюць.

З памылкі пра чысцец вынікаюць тры іншыя памылкі: Першая, што ніякі грэх не можа быць прабачаны, а ўсе смяротныя ... (Сал 24:16) Другая памылка: калі прабачаецца віна, прабачаецца пакаранне. З гэтага вынікае магчымасць свабодна грашыць, і таінствам пакаяння ўсё адменіцца ... (Мф 4:17; Лк 3:8) Трэцяя памылка, што заступніцтва не карыснае. Каб не ўкладаць у мёртвых ... (Экл 7:37)[57] Калі па просьбах сястры быў уваскрэсены Лазар, то просьбы святых могуць пазбавіць чыстца ... (Мф 12:31) Такім чынам, любы грэх можа быць адпушчаны ў будучыні[58].

Пра свецкі суд

Суддзяў і першых асоб асуджаюць і кажуць, што злодзеі не павінны быць асуджаныя ... (Мф 7:1; Быц 9:6; Вых 20:13; Мф 26:52; Ін 18:11; Мф 13:30; Дзн 13:8–11; Вых 22:18, 21:14; Лк 22:36, 3:14) Значыць, што барацьба супраць зла дазволеная. Прычына: Першыя асобы і суддзі – тыраны. Такім чынам, правасуддзе прадажнае на кірмашы міран і клірыкаў ... (Іс 5:23, 1:23)[59]

Пра клятву

Кажуць, што клясціся – смяротны грэх ... (Мф 5:37; Пс 62:12) Таксама Айцы Царквы кляліся. Апостал кляўся ... (2 Кар 1:23; Апак 10:5) Таксама Бог кляўся ... (Яўр 6:13) і Хрыстос ... (Ін 5:19) Значыць, у некаторых выпадках дазволена клясціся. Прычына: звычка клясціся часта і па нязначных прычынах, бо прыводзіць

---

[55] У прадмове да трактата пазначаецца, што гэта народная назва секты "крывадушнікаў". Patschovsky and Selge, *Quellen*, 23.

[56] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 101.

[57] Няма адпаведніка ў перакладзе В. Сёмухі.

[58] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 101–103.

[59] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 103.

да парушэння клятвы. Ерэтыкі, якія ніколі не клянуцца, падобныя да Д'ябла, які нідзе не будзе прыведзены да прысягі[60].

V.ii Давід Аўгсбургскі. Пра вышук ерэтыкоў

Францысканец Давід з Аўгсбурга – нямецкі містык XIII ст. (памёр у 1271 г.), адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў руху "новай набожнасці", пісаў не толькі на лаціне, але і па-нямецку. Яго трактат "Пра вышук ерэтыкоў" (De inquisitione hereticorum), відавочна, моцна дапоўнены яго паслядоўнікамі і перапісчыкамі, захаваўся ў дзвюх рэдакцыях, сціслай і доўгай, у 24-х манускрыптах. Тут прыведзены загалоўкі ўсіх частак з перакладам тых, дзе ўказваюцца менавіта вальдэнскія "памылкі".

1. Каталіцкая вера – аснова ўсялякага дабра.
2. Каго называюць ерэтыкамі.
3. Для таго, каб быць спасцігнутым паўней і прасцей, гэты запіс падзелены на тры галоўныя часткі. У першай паказана паходжанне ці развіццё секты і ў чым выступаюць яны супраць веры, і якія ўстаноўленыя іх звычаі і дзеі. У другой, як будзе дадзена ніжэй, якім чынам яны павінны быць апытаныя, выкрытыя і асуджаныя. Трэцяя ўключае ў сябе пастанаўленні Апостальскага Прастола і свецкія законы, выдадзеныя супраць іх і тых, хто з імі звязаны, выбраныя з інквізіцыйных інструкцый Апостальскага Прастола.
4. Пра паходжанне бедных з Ліёна.
5. Пра памылкі бедных з Ліёна.
6. Што сярод іх жанчыны вучаць.
7. Што ёсць дзве іх секты і адна называецца дасканалыя.
8. Пра іх адзенне.
9. Пра іх прытулкі.
10. Калі збіраюцца.
11. Пра пакланенне Люцыферу.
12. Пра іх норавы.
13. Пра іх праслаўленне сваёй навукі і святасці.
14. Пра маскіроўку слоў.
15. Пра навучанне, як зварочваць іншых.
16. Пра спосаб, як трэба прамаўляць.
17. Пра спосаб, як трэба навучаць.
18. Пра забарону клясціся і якім чынам яны даюць зарок.
19. Пра пакаянне і пакаранне за лжывую клятву.
20. Пра ўзаемнае павучанне.
21. Пра сяброўскія адносіны з клірыкамі ці манахамі.
22. Якім чынам называюць смяротныя грахі.
23. Пра забарону забойства.
24. Пра прыцягненне ўладных персон.
25. Якім чынам праводзяць пропаведзі.
26. Якім чынам належыць прапаведаваць ерэтыкам.

---

[60] Patschovsky and Selge, *Quellen*, 103.

27. Якім чынам яны радуюцца абгаворванню клірыкаў.
28. Якім чынам іх злавіць.
29. Як не выдаць ерась і пра іх асцярожнасць.
30. Варта звярнуць увагу.
31. Якім чынам яны клянуцца, калі ніколі нельга клясціся.
32. Як выкрыць тых, хто спрыяе ерэтыкам.
33. Таксама якім чынам яны прыходзяць да таго, каб выдаць ерась.
34. Як варта асцярожна задаваць пытанні.
35. Як прымусіць іх клясціся.
36. Пра тых, хто збег або часова хаваецца ад вышуку.
37. Што яны павінны быць абвінавачаныя свецкімі ўладамі.
38. Пра сведкаў.
39. Заўвага, што павінны быць асуджаныя як ерэтыкі тыя, хто так робіць.
40. Тыя, хто спрыяе, такія.
41. Як сябе паводзіць у падазроных месцах.
42. Якім чынам дапытваць ерэтыкоў.
43. Якім чынам лавіць ерэтыкоў.
44. Пытанне пра тое, што ерэтыкам спачатку належыць быць дапытанымі ў духоўных судах.
45. Пра сквапных і заражаных суддзяў.
[І тры пункты, якія разыходзяцца ў іншых манускрыптах:]
22: Навучанне для інквізітараў.
23: Пра абставіны хрысціян, якія ўпалі ў яўрэйства.
24: Якім чынам ерэтыкі пазнаюць адзін аднаго.

4. Паходжанне гэтай секты, якая называецца Pover de Leun[61], ці бедныя з Ліёна, як я чуў ад розных людзей і прысутнічаў на апытаннях некаторых з тых, якія, як падаецца, вярнуліся да [каталіцкай] веры, як яны самі паведамляюць, такое: у Ліёне былі адны простыя міране, якія, узбуджаныя нейкім духам, выхваляліся саманадзейна сярод іншых, што толькі яны жывуць згодна з евангельскімі запаветамі і літаральна трымаюцца напісанага, вырашылі да Уладара Папы Інакенція III адправіць апісанне ладу свайго жыцця, каб атрымаць ухваленне сваёй улады і сваіх паплечнікаў, і прызналі такім чынам за ім права карыстацца апостальскімі паўнамоцтвамі[62]. Пасля гэтага заганарыліся, што наблізіліся шчыльней да вучняў Хрыста і спадкаемцаў апосталаў, а таксама пахваляліся, што прынялі на сябе абавязак пропаведзі, кажучы, што Хрыстос сабраў сваіх вучняў, каб прапаведаваць Евангелле, і паколькі яны настолькі зазналіся, каб тлумачыць такім чынам Евангельскія словы, рашуча кіруючыся меркаваннем, што ніхто іншы не трымаецца цалкам напісанага ў Евангеллі, што, як яны выхваляліся, яны хочуць рабіць, бо яны казалі, што толькі яны – сапраўдныя паслядоўнікі Хрыста. Калі ж Царква заўважыла, што яны ўзурпавалі сабе яе абавязак пропаведзі, хоць і не былі пасланыя, бо былі неадукаваныя і міране, то забараніла ім, як належыць, і тых, хто не захацеў падпарадкавацца, адлучыла. Але ж яны пагарджалі ў гэтым пытанні ключамі царквы, кажучы, што клірыкі зрабілі гэта з зайздрасці, бо бачылі, што яны лепшыя за іх, і лепш навучаюць, і больш павагі сярод народу за гэта маюць, таму

[61] Скажонае "бедныя з Ліёна".
[62] Верагодна, гаворка ідзе пра групы Бернарда Прыма і Дуранда з Оскі.

што за добрую і дасканалую справу, чым і з'яўляецца навучанне каталіцкай веры і вучэнню Хрыста, ніхто не павінен быць адлучаны, наадварот, ніхто не павінен падпарадкоўвацца тым людзям, хто такія добрыя справы забараняе. І ўспрынялі гэтае адлучэнне як адвечнае бласлаўленне, праслаўляючы сябе як спадкаемцаў апосталаў, і як апосталы за Евангельскае вучэнне былі выгнаныя кніжнікамі і фарысеямі з сінагогі і цярпелі іх праклёны і пераследы, так і яны самі падвяргаюцца таму самаму ад клірыкаў. Так яны з саманадзейнай пыхай і слепатой падхарашылі сваю святасць і імкненне да ўнікальнасці, што прывяло да ерэтычнай заганнасці, бо Евангельская дасканаласць больш вучыць пакорліва падпарадкоўвацца Дактарам і кіраўнікам Царквы, чым у празе выключнасці парываць з каталіцкай еднасцю.

5.

1) Гэта іх першая ерась – пагарда да царкоўных уладаў.

2) З таго часу, як яны аддаліся сатане, яны былі ўвергнутыя ім у шматлікія памылкі, і змяшалі свае прыдумкі з памылкамі ерэтыкоў старажытнасці, таму што былі выгнаныя з Каталіцкай Царквы, і прызнаюць, што толькі яны – Хрыстова Царква і вучні Хрыста. Кажуць, што з'яўляюцца паслядоўнікамі апосталаў і маюць апостальскую ўладу і ключы вязаць і развязваць.

3) Кажуць, што Рымская Царква – гэта Вавілонская блудніца, і ўсе тыя, хто ёй падпарадкоўваецца, асуджаныя.

4) Кажуць, што ўсе святыя і вернікі з часоў Святога Папы Сільвестра асуджаныя.

5) Кажуць, што ніякі цуд непраўдзівы, які адбыўся ў Царкве, бо сама не зрабіла ніякага цуду.

6) Кажуць, усе царкоўныя пастанаўленні, прынятыя пасля Узнясення Хрыста, не вартыя таго, каб іх трымацца, і не маюць аніякага сэнсу.

7) З пагардай цалкам абвяргаюць святы, пасты па святах, чыны, бласлаўленні, царкоўныя імшы і г.д. Усё гэта яны праклінаюць і кажуць, што гэта было ўсталявана толькі з-за прагнасці кліру, каб атрымаць з гэтага матэрыяльныя выгады, і таму вышэйназваныя [клірыкі] патрабуюць грошай і ахвяраванняў. [Дадатак з пражскага манускрыпта: Кажуць, што асвячэнне цэркваў і могілак усталявана клірам выключна з прагнасці, каб зарабляць на гэтым грошы].

8) Кажуць, што чалавек толькі тады сапраўды ахрышчаны, калі ў іх ерась уведзены. Але некаторыя кажуць, што хрышчэнне немаўлят не дзейснае, бо яны яшчэ няздольныя верыць.

9) З пагардай абвяргаюць царкоўную канфірмацыю, але іх настаўнікі ўскладаюць рукі на сваіх вучняў падчас іх таінстваў.

10) Кажуць, што біскупы, клірыкі і манахі – гэта кніжнікі і фарысеі, якія пераследавалі апосталаў.

11) Не вераць, што Цела і Кроў Хрыстовы сапраўдныя, але толькі бласлаўлёны хлеб, які фігуральна называецца Целам Хрыстовым, кажуць так: Камень таксама быў Хрыстом і г.д. Некаторыя кажуць так пра тых, хто быў добрым, а іншыя пра ўсіх, хто ведае словы асвячэння. Яны таксама практыкуюць гэта на сваіх сходах, паўтараючы гэтыя словы з Евангелля ў сваіх сталовых, і лічаць сябе ўдзельнікамі Хрыстовай вячэры.

12) Кажуць таксама, што грэшны святар не можа нічога вязаць і развязваць, калі ён сам звязаны грахом, і што любы добры міранін, які валодае належнымі ведамі, можа іншаму грахі адпусціць і накласці пакаянне.

13) З пагардай абвяргаюць апошняе мірапамазанне і асвечаны алей, і памазанні не маюць большага значэння, чым любыя іншыя.

14) З пагардай абвяргаюць усе царкоўныя чыны, кажучы, што гэта хутчэй пракляцце, чым таінства.

15) Кажуць, што шлюб – гэта ўзаконеная распуста, акрамя толькі з мэтай працягу жыцця. Кажуць, што любая іншая юрлівая разбэшчанасць больш дазволеная, чым савакупленне сужэнцаў. З устрымання смяюцца, але дазваляюць задаволіць распалены юр любым непрыстойным спосабам, спасылаючыся на гэтыя словы Апостала (1 Кар 7:9): "бо лепей шлюбам пабрацца, чым распаляцца", бо лепш, калі хто-небудзь непрыстойным спосабам задаволіць юр, чым адчуваць спакусу ў сэрцы. Але гэта трымаюць у строгім сакрэце, каб не згубіць павагі. Калі якая-небудзь прыстойная дзяўчына, якая лічыцца цнатлівай, народзіць дзіця, то яго таемна перадаюць каму-небудзь іншаму, каму гэта не адкрылася.

16) Кажуць, што любая клятва недапушчальная і з'яўляецца смяротным грахом, нават калі яна праўдзівая. Аднак так адрэгулявана, што можна клясціся, каб пазбегнуць цялеснай смерці, або іншага не выдаць, або захаваць у сакрэце сваё нявер'е.

17) Кажуць, што выдаваць ерэтыкоў – гэта недаравальнае злачынства і грэх перад святым духам.

18) Некаторыя прытрымліваюцца такой прымхі, што нават звяроў і неразумных істот, такіх, як рыб, авечак і так далей, нельга забіваць. Калі ж хочуць нешта такое з'есці, трымаюць іх над агнём у дыме, і так яны самі паміраюць. Блох і ім падобных істот вытрасаюць у агонь або апускаюць адзенне ў гарачую ваду, і так не хочуць іх забіваць, а кажуць, што яны самі паміраюць. І такое ўдаванае сумленне яны маюць і ў іншых сваіх назіраннях, што можна вызначыць па тым, як яны, пакінуўшы ісціну, ганьбяць сябе лжывымі прыдумкамі.

19) Кажуць, што няма чыстца, і ўсе памерлыя пераносяцца на нябёсы або ў пекла: такім чынам яны сцвярджаюць, што заступніцтва за памерлых, якое здзяйсняе Царква, не прыносіць карысці, бо тым, хто на нябёсах, яно без патрэбы, і з пекла яно нікога не выведзе. Адсюль кажуць, што ахвяраванні, якія робяцца для памерлых, выгадныя клірыкам, якія іх ядуць, а не душам, якія не маюць патрэбы ў харчаванні.

20) Кажуць, што святыя на небе не чуюць малітваў верных, ні ўсхваленняў, якія мы да іх узносім, думаюць, даказваючы, што, паколькі плоць святых мёртвая, пахаваная, і духам [яны] настолькі аддаленыя ад нас на небе, [то] нашы малітвы ніякім чынам не могуць быць ні пачутыя, ні ўбачаныя. Таксама кажуць, што святыя не моляцца за нас, і таму нам не належыць са слязьмі прасіць іх пра ўхваленне, бо яны агорнутыя нябеснай асалодай, не могуць забяспечыць нам атрыманне нябеснай асалоды, ні як-небудзь інакш паклапаціцца, таму пагардліва пасміхаюцца, што мы праводзім для святых усхваленні і іншае, як мы іх шануем.

21) У святочныя дні, калі асцярожнасць дазваляе, працуюць, тлумачачы гэта тым, што працаваць – гэта добра, і дабро, здзейсненае ў святочныя дні, не становіцца злом. У Вялікі Пост і ў іншыя дні царкоўных пастоў не пасцяцца, але мяса ядуць, калі могуць сабе дазволіць, кажучы, што Бог не радуецца смутку сваіх сяброў, таму і без гэтага можна выратавацца. Некаторыя ж ерэтыкі шкодзяць сабе шматлікімі пастамі, усяночнымі малітвамі і г.д., бо без гэтага не могуць здабыць сабе вобразу святасці сярод прасцякоў, калі не ўвядуць іх у зман ілжывым удаваннем.

22) Старога Запавету не прымаюць да веры, але некаторыя з іх яго вывучаюць, каб на нас з яго дапамогай нападаць і сябе абараняць, кажучы, што новае Евангелле перакрэсліла ўсё старое.

23) Так яны прысабечылі вырваныя з кніг словы і аўтарытэт святых Аўгусціна, Іераніма, Грыгорыя, Амвросія і Яна Хрызастома, каб з іх дапамогай засведчыць свае прыдумкі або нам супрацьстаяць ці лягчэй спакушаць наіўных, падмалёўваючы чыстыя выказванні святых блюзнерскім вучэннем. Тыя ж выказванні святых, якія ім супярэчылі, якія іх памылкі разбуралі, ціха прапусцілі.

24) Кемлівых і красамоўных, якія з імі звязаныя, яны вучаць завучваць на памяць на народнай мове словы Евангелляў, і тое, што было сказана апосталамі і іншымі святымі, каб яны ведалі самі, і іншых вучылі, і вернікаў прыцягвалі, і секту сваю чыстымі словамі святых абаранялі, каб здаваліся выратавальнымі тым, каго яны падбухторваюць; і так праз салодкія казанні і бласлаўенні спакушаюць цнатлівыя сэрцы.

6. Не толькі мужчыны, але і жанчыны сярод іх навучаюць, бо жанчыны маюць большы доступ да пераварота жанчын, каб праз іх таксама мужчын звярнуць, як праз Еву змей спакусіў Адама.

7. У іх секты ёсць дзве групы. Некаторыя з іх[63] называюцца дасканалыя, і менавіта яны называюцца бедныя з Ліёна; не ўсіх прымаюць у гэту групу, але спачатку інструктуюць, каб умелі вучыць іншых. Кажуць, што гэтыя [дасканалыя] не маюць нічога свайго: ні дома, ні маёмасці, ні нейкага прытулку, ні жонкі, якую, калі раней і мелі, то пакінулі. Кажуць, што яны – паслядоўнікі апосталаў, настаўнікі і спаведнікі для астатніх, і абыходзяць землі, наведваючы вучняў і ўмацоўваючы іх у памылках. Вучні клапоцяцца пра неабходнае для іх, і калі яны куды-небудзь прыходзяць, таемна паведамляюць паміж сабой пра іх прыход, і збіраецца да іх шмат у адным месцы, у схованцы, каб іх слухаць і бачыць, і прыносяць ім лепшае, што ёсць з ежы і напояў, і вучні арганізуюць збор грошай для ўтрымання сваіх бедных, і настаўнікаў, і навучэнцаў; якія [дасканалыя] на сябе нічога не трацяць, але [выдаткоўваюць грошы] для падбадзёрвання іншых, каго ў іх секту прывяла прага да грошай.

[Два артыкулы з пражскага манускрыпта:]

А) Гэтыя дасканалыя з'яўляюцца для іншых настаўнікамі і спаведнікамі і называюць сябе спадкаемцамі апосталаў. Іншыя іх называюць Апастолікамі, і ў іх нічога свайго няма, нават і жонак. Таксама яны называюцца pauperes de Gluduno ці pouer lion[64], якія ўвесь час па свеце ходзяць, наведваюць і падбадзёрваюць сваіх, навучаюць Новаму Запавету на народнай мове, слухаюць споведзі, і Папу і клір, якія маюць багацці і іх саміх [вальдэнсаў] ерэтыкамі называюць, асуджаюць.

Б) іншыя, недасканалыя, нажытак маюць, і дасканалых утрымліваюць і забяспечваюць, робяць для іх зборы, і бедных не дасылаюць жабраваць, хто робіць найсакрэтнейшыя сходы, пра якія паведамляюць таемнымі знакамі, каб не быць выкрытымі, дзе ўсе нашы таінствы захоўваюць і робяць, для выгляду наведваюць імшы, прымаюць прычасце, ахвяруюць, плацяць дзесяціну, спавядаюцца, посцяцца, удзельнічаюць у публічных святкаваннях і ўсё астатняе з намі робяць, але паміж сабой з усяго гэтага кпяць і ўсе вучаць Новы Запавет на народнай мове.

---

[63] Чальцы адной з груп.

[64] Абодва словазлучэнні – скажонае "бедныя з Ліёна".

8. Тыя, хто вандруе, апранутыя ў розныя ўбранні, каб не быць пазнанымі, і калі пераходзяць ад дома да дома, пераносяць на галаве які-небудзь цяжар або вазу, і ў цемры ходзяць, каб ніхто не бачыў, што яны перамяшчаюцца.

9. Маюць звычку размяшчаць свае прытулкі там, дзе праходзіць навучанне ці дзе праводзяць свае зборы, дзе яны недасяжныя да іншых, каб не быць выкрытымі, напрыклад, у падземных ямах ці іншых ізаляваных памяшканнях.

10. Такія зборы праводзяць глыбока ўначы, калі астатнія спяць, каб вальней здзяйсняць таемныя беззаконні. Бо там таксама, як кажуць, целуюць катоў або жаб, ці іх наведвае Д'ябал, ці, выключыўшы святло, аддаюцца распусце, але я не думаю, што гэта менавіта пра гэту секту, бо я, насамрэч, ніколі не чуў такога ад тых, хто варты даверу.

11. Тыя ж, хто пакланяецца Люцыферу ці спадзяюцца на яго вяртанне ў славе, належаць да іншай секты. Чым больш [ерэтыкі] вераць у нешта неразумнае ці агіднае, тым лягчэй [сапраўдным каталікам] іх унікнуць, і нескладана выявіць, калі збягаюць, бо адкрытае зло менш шкодзіць. Секта ж бедных з Ліёна і ім падобныя з'яўляюцца нашмат больш небяспечнымі, бо хаваюцца пад вэлюмам ілжывай святасці. Такім чынам, што ні робіцца людзьмі, яны, як малпы, недарэчна імітуюць, бо самі лічаць сябе за спадкаемцаў апосталаў і першых святых, то яны павярхоўна імітуюць некаторыя знешнія элементы паводзінаў апосталаў, як тое, што апосталы збіралі для бедных міласціну ў цэрквах і дамах верных, калі яшчэ не было збудаваных цэркваў, калі навучаюць ці здзяйсняюць святыя таінствы, то адпраўляюць вучняў прапаведаваць па розных правінцыях, якія засноўваюць ці ўмацоўваюць цэрквы. Таксама гэтыя крывадушнікі прыпісваюць сабе розныя імёны. Не называюць сябе тымі, кім з'яўляюцца, а менавіта ерэтыкамі, але называюць сябе сапраўднымі хрысціянамі, сябрамі Божымі і беднымі Бога, і іншымі падобнымі імёнамі. Іншыя ж з'яўляюцца вернікамі ерэтыкоў, паслядоўнікамі іх дактрыны, сапраўды вераць таму, чаму яны вучаць, лічаць іх добрымі людзьмі і ўступаюць у секту, адрываючы сябе ад царкоўнага адзінства. Яны [вернікі] – гэта тыя, хто ім [ерэтыкам] спрыяе, іх прымае і па магчымасці абараняе, якія дапамагаюць ім з маёмасцю, і абмяркоўваюць з імі Евангеллі і Апостальскія [Дзеі? Пасланні?], і калі хто з іх моцна прасунецца ў вывучэнні памылак, калі будзе імкнуцца, то будзе прыняты ў настаўнікі, як было сказана вышэй.

12. Норавы іх знешне выглядаюць сціпла, але ў сэрцах сваіх яны найпыхлівейшыя, бо лічаць сябе вышэйшымі за астатніх.

13. Уся іх пахвальба зыходзіць з адчування асабістай выключнасці, што бачаць сябе лепшымі за астатніх, бо могуць цытаваць на памяць некаторыя Евангеллі і Пасланні на народнай мове. Яны аддаюць сабе перавагу перад нашымі людзьмі, не толькі перад міранамі, але і перад адукаванымі, бо дурныя і не разумеюць, што часта дванаццацігадовы шкаляр ведае ў сто разоў болей, чым настаўнік ерэтыкоў шасцідзесяці гадоў, які толькі тое і ведае, што паўтараць па памяці, першы ж праз мастацтва граматыкі можа чытаць тысячы кніг на лаціне і такім чынам спасцігаць навуку. Яны ўзвышаюцца нават дзякуючы выключнасці іх ілжывай святасці, бо па звычаі тых самых фарысеяў лічаць, што толькі яны маюць рацыю і на іншых у параўнанні з сабой глядзяць з пагардай, дурныя і сляпыя, не ўсведамляючы, што чым бы яны не выхваляліся, мы маем непараўнальна больш выбітных асоб, якія не маюць ніякага крывадушнага падману, у той час у ерэтыкоў усё падфарбавана крывадушшам.

14. Бо яны навучаюць казаць завуаляванымі словамі, каб пад выглядам праўды казаць няпраўду, каб, калі пытаюцца пра адно, адказваць ускосна пра іншае, і так выкрутліва сваіх слухачоў падманваюць, бо кожны раз баяцца, што будуць выкрытыя праз прызнанне сваіх сапраўдных памылак. Ад гэтага ўдавання яны часта наведваюць нашы цэрквы, цікавяцца боскім, ахвяруюць перад алтаром, прымаюць таінствы, спавядаюцца святарам, посцяцца ў царкоўныя пасты, удзельнічаюць у святах і прымаюць бласлаўленні святароў, укленчыўшы і схіліўшы галаву, аднак з гэтым і іншых падобных царкоўных пастанаўленняў смяюцца, і асуджаюць бязбожна і разбуральна, як нават калі б воўк схаваўся ў авечай скуры, воўк не можа быць вызнаным авечкай.

15. Усё навучанне скіравана на тое, каб як мага больш уцягнуць у свае памылкі. Дзяўчынак вучаць словам Евангелляў і Пасланняў, каб з дзяцінства звыкаліся схіляць да памылак, і таму, чаму яны навучыліся, яны з усіх сіл намагаюцца і іншых навучаюць усюды, дзе б не знайшлі тых, хто б хацеў іх спакойна слухаць. Яны звычайна паходзяць ад простых і грубых, найбольш ад тых, хто не з'яўляецца сябрамі братоў меншых ці прапаведнікаў ці іншых, хто імкнецца да веры, і з тых месцаў, якія імі [каталікамі] не наведваюцца, і прыцягваюць да сябе ў першую чаргу лжывай святасцю сваіх нораваў.

16. Затым спакушаюць, кажучы ліслівыя словы такім чынам: Ты глядзіш на мяне, о добрая жанчына, скіраваная да таго, калі б так было, хто табе паказаў шлях да ісціны, ты б хутка здзейсніла вялікія справы ў сэрцы Божым, і таксама хутка б спасцігла нябесныя таямніцы лепш за ўсіх вучоных, і Бога ўбачыла і словы яго пачула, і ўсяго, аб чым малілася, атрымала б, і стала б роўнай анёлам і святым на небе. Калі ж такім чынам дурніца, завабленая гэтымі абяцанкамі, пачынае прагна ўспрымаць яго словы, бо і змей Еву спакусіў абяцаннямі ведаў і веліччу боскага падабенства, каб яна была супакоеная яго ўгаворамі.

17. Тады ерэтык пачынае доўга вучыць яе чысціні, рахманасці і іншым набожным справам, і пазбягаць заганаў, і прапаноўваць словы Хрыста і апосталаў і іншых святых, каб ёй здавалася, што яна слухае не чалавека, а анёла з неба. Тады загадвае ёй трымаць усё ў таямніцы і нікому не адкрываць, бо адшуканы скарб павінен заставацца схаваным, каб не быць выкрытым, і нябесныя сакрэты не павінны трапляць без разбору да нявартых, каб яна больш старанна аберагала пачутае, раз ужо была спецыяльна абранай Богам для захавання такіх таямніц, і таксама не выдала самога ерэтыка, ці яе ніхто ад гэтага не адгаварыў, каму б яна адкрылася, далей прымаць такое вучэнне, якому ён не асмельваецца навучаць адкрыта. Далей вучыць прамаўляць некаторыя малітвы да Найсвяцейшай Дзевы ці да іншых святых, каб праверыць, наколькі яна здольная ўспрымаць і запамінаць тое, чаму навучылася. Калі такім чынам яе доўга выпрабуе, калі палічыць яе трывалай і здольнай трымаць у сакрэце тое, што ён сказаў, падводзіць яе да іншага вучэння, або настаўніка, які зможа больш таемна і часцей з ёй заставацца, маючы добры замер якога-небудзь промыслу ці гандлю, каб яна паступова стала мацней да іх прывязаная. Апісвае ёй іншых сваіх настаўнікаў, наколькі яны святыя і выпрабаваныя, і што, хто бачыў іх і чуў, той як быццам бы бачыў і чуў самога Бога, і распальвае мацней у ёй жаданне далучыцца да іх, і адкрывае ёй з таго, чаму яны насамрэч навучаюць, і больш бяспечна раскрывае ёй памылкі свайго вучэння. Але не адкрываюць так лёгка свае сакрэтныя памылкі, калі толькі не будуць цалкам упэўненыя, што яна паверыць у гэта ўсё, бо баяцца, што аддаліцца ад іх і выдасць іх. Першае ж, чаму яны вучаць, што павін-

ны быць вучнямі Хрыста паводле слоў Евангелля і апосталаў, кажучы, што яны і ёсць спадкаемцы апосталаў, якія трымаюцца іх жыцця. З гэтага робяць выснову, прад'яўляючы абвінавачанне, што Папа, біскупы і клір, якія маюць матэрыяльную маёмасць і не імітуюць Апостальскую святасць, не з'яўляюцца сапраўднымі кіраўнікамі Царквы, і не такіх палічыў вартымі Хрыстос, каб даручыць сваю ўлюбёную нявесту-Царкву, хто яе хутчэй апаганьвае благімі прыкладамі і благімі справамі, замест таго, каб падтрымліваць чыстую дзеву Хрыстову, аберагаючы яе ў яе чысціні, і з гэтага вынікае, што ім [царкоўным прэлатам] не варта падпарадкоўвацца. Таксама кажуць, што нячысты не можа іншых ачысціць, ні вязаць ці развязваць іншых, і як абвінавачаны не можа супакоіць угневанага суддзю, так і той, хто ідзе па гібельнай дарозе, не можа паказаць іншым шлях да нябёсаў. Таксама кажуць, што праз сваё падступства і сілу клірыкі трымаюць міран у падпарадкаванні сабе, каб тыя давалі ім дзесяціну і ахвяраванні, яны з гэтага жывуць, і распуснічаюць, і каханак сваіх і дзяцей утрымліваюць. Таксама ўзводзяць паклёпы на клір, каб, паколькі іх ненавідзяць, не даць яму [кліру] верыць ці падпарадкоўвацца. Калі такое адбудзецца, то міране не будуць умець вучыцца, і гэтыя ерэтыкі стануць настаўнікамі народа, каб усіх павесці за сабой. З прычыны нянавісці да кліру яны выстаўляюць напаказ любую сапсаванасць кліру. Яны адгаворваюць даваць ім ахвяраванні, дзесяціну і г.д., кажучы, што гэта і іншае гэтаму падобнае яны ўвялі для сваёй карысці, і ўсе царкоўныя інстытуцыі былі ўсталяваныя ад прагі багацця. Сваім прысудам яны не толькі асуджаюць усіх клірыкаў, але і тых, хто ім падпарадкоўваецца, паводле гэтага "ці можа сьляпы вадзіць сьляпога? ці не абодва ўпадуць у яму?" (Лк 6:39). Калі іншага спакушаюць, ліслівяць такім чынам: нарэшце ты прыйшоў да сапраўднага святла, бо ты вынайшаў залатую дактрыну, ты, які раней быў падмануты меддзю замест золата, і так далей. Таксама яны імітуюць нейкі рытм, які называюць трыццаццю ступенямі Святога Аўгусціна, з дапамогай якога яны вучаць як быццам бы трымацца цнотаў і асуджаць заганы, і па-майстэрску ўключаюць туды свае звычкі і ерасі, каб лепш завабліваць да іх, і каб іх словы лепш адбіваліся ў памяці, як і мы прапаноўваем свецкім вернікам Сімвал Веры, нядзельныя малітвы і іншыя прыгожыя спевы падобнага тыпу.

18. Раней яны вызначаліся тым, што не кляліся ўвогуле, калі паколькі іх па гэтым было лягчэй вылічыць, то абачліва ўвялі права клясціся для абароны сябе ці іншага ад смерці. Калі ж яны вымушаныя клясціся, то або клянуцца завуаляванымі словамі, каб сапсаваць клятву, або прыкідваюцца, і так рознымі спосабамі; або, калі яны змушаныя іншым да клятвы, то яны вяртаюць гэты грэх тым [хто прымусіў іх паклясціся], а самі такім чынам застаюцца чыстымі.

19. Калі ж клянуцца для сябе, баючыся смерці, то прапаноўваюць выканаць пакаянне, каб для зняцця граху за чатырнаццаць ілжывых клятваў прыцягнуць аднаго чалавека ў іх секту.

20. Калі ж раней у адной секце былі ўсе, хто называўся Бедныя Ліёнцы, і Ортлібарыі, і Арнальдысты, і Рункарыі, і Вальдэнсы, і іншыя, то з-за амбіцый іх лідараў і розных супрацьлеглых памылак, яны паміж сабой рассварыліся з-за розніцы ў поглядах і падзяліліся на розныя секты, і былі названыя па імёнах аўтараў гэтых меркаванняў. Але лічаць адзін аднаго паслядоўнікамі розных ерасяў, і ненавідзяць, і асуджаюць, і сваіх набліжаных (complicis) ад якога-небудзь аб'яднання перасцерагаюць, каб яны не былі спакушаныя іншымі. Не толькі перасцерагаюць адзін аднаго ад іншых ерасяў, каб ніхто не павярнуўся туды і іншых не выкрыў, як

калі сціскаецца луска Левіяфана, што не прадыхнуць[65]. Але ўсе яны адзінадушна ненавідзяць Каталіцкую Царкву, якая пастаянна звяртаецца да іх, каб абвергнуць іх праз сапраўднае вучэнне і асудзіць іх праз суд згодна з прынятай ад Бога ўладай.

21. Асуджаюць, калі хто-небудзь прытворна сябруе з манахамі або клірыкамі, каб такім чынам сябе засцерагчы, каб, калі будзе інквізіцыйны вышук ерэтыкоў, быць абароненым імі, і падкупаюць іх праз падарункі, і прымаюць іх у прытулках (hospicia), як быццам бы адкупаючыся такім чынам ад сваіх пакутаў, і шукаюць магчымасці, каб сабе і сваім блізкім вальней хавацца, жыць і псаваць душы, як было намі шмат разоў устаноўлена. Наведваюць цэрквы і пропаведзі і паўсюль найнабожнейша сябе паводзяць, маюць падыходзячыя норавы, словы як быццам бы вытанчаныя і асцярожныя, ахвотна звяртаюцца да Бога і да святых, і да цнотаў, і грахоў пазбягаюць, і іншыя добрыя справы робяць, каб мець лепшы вобраз, і калі хто-небудзь іх ахвотна пачынае слухаць, вось тады яны атруту сваіх таемных вычварэнстваў уліваюць і атрымліваюць спагаду да сваіх заганаў.

22. Калі хто-небудзь трывала застаецца ў іх секце, нават калі ва ўсім астатнім ён смяротна грашыў, а менавіта ў распусце, ліхвярстве і іншым, даюць яму надзею на выратаванне, бо кажуць, што яны лёгка знішчаюцца ў смерці праз спавяданне іх веры ці праз ускладанне рук каго-небудзь з іх дактароў. Ставяць сябе вышэй за святых на небе, нават Найсвяцейшай Дзевы, у тым сэнсе, што кажуць, што, раз яны ўлюбёныя Богам, то чаго б ні дамагаліся ад Яго, прыслухоўваецца, а святыя ж, з іншага боку, не вартыя малітваў, каб іх дасягнуць, але ж, аднак, мы бачым, што яны не дасягнулі таго, каб мы ўсе сталі ерэтыкамі, і каб ніхто з іх за ерась не быў намі спалены, а гэта тое, чаго б ім больш за ўсё хацелася, то гэта значыць, што яны сурова сябе падманваюць, каб пасеяць ці вырасціць падман.

23. Таксама кажуць, што нікому не павінна быць дазволена забіваць, а самі асабіста не забіваюць, колькі б ні насілі без прычыны для выгляду меч ці шчыт, аднак даюць зразумець сваім набліжаным (complices), што яны возьмуць на сябе адказнасць пры ўмове, калі тыя заб'юць каго-небудзь з тых, хто пагражае іх знішчыць. Так быў забіты Святы Пётр з ордэна прапаведнікаў[66] і некаторыя іншыя.

24. Старанна вучацца, як прыцягваць да сябе якіх-небудзь заможных і знатных дам, каб праз іх таксама зрабіць сваімі спрыяльнікамі іх мужоў ці сваякоў, каб такім чынам на іх землях свабодна распаўсюджвацца, і ніхто не наважыцца чапаць іх, забяспечаных іх абаронай.

25. Бо калі [чужынец] выпадкова трапіць на якую-небудзь пропаведзь і паспрабуе паведаміць людзям, каб устрымліваліся ад ерэтычных памылак, яны будуць распальваць раздражненне супраць таго, хто хоча абвінаваціць грамаду ў ерасі, калі адкрыта не быў выяўлены ніхто з ерэтыкоў, а сапраўдныя ж вернікі абураюцца, што хоча ўзвесці на іх такую несправядлівасць. І так яго стрымліваюць, бо ў цэлым ні адны, ні другія не зацікаўленыя ў згадках ерэтыкоў, калі ж распачнецца інквізіцыйны вышук супраць ерэтыкоў, то ён са страху перад імі не асмеліцца іх абвінаваціць ці супраць іх сведчыць. І так перад суддзямі абвінавачаныя праз просьбы, падарункі ці праз страх перад можнымі схіляюць тых на бок зла, і так ганьбы пазбягаюць і праз гэта ерэтыкі наважваюцца прыносіць яшчэ болей шкоды.

---

[65] Алюзія на (Ёў 41:15). Бернард Клервоскі выкарыстоўваў тую самую алюзію, калі зневажаў саюз двух "ерэтыкоў" – Пятра Абеляра і Арнольда Брэшыньянскага. Bernard. Letters. 239:318.

[66] Маецца на ўвазе Пётр Пакутнік з Вероны, забіты катарамі 6 красавіка 1252 г.

26. Калі ён з'яўляецца ў месцах, прыдатных для пропаведзі веры, то, каб прадставіць які-небудзь артыкул веры, кажа: "Гэта – ісціна веры" і так верыць Святая Царква, але ёсць ерэтыкі, і яны выступаюць супраць гэтага: такім чынам, калі хто-небудзь раптам прыйдзе і так яўна ці адкрыта навучае, то вы павінны лічыць яго ерэтыком. І такім чынам належыць замыкаць вусны ерэтыка, верныя ў веры ўмацоўваюцца і, будучы ўважлівымі, устрымліваюцца ад дарогі, што зняслаўлена ерассю.

27. Таксама ерэтыкі моцна радуюцца, калі падбухторваюць людзей выступіць супраць кліру і Дактароў Царквы, у той час як хто-небудзь дзёрзка асмельваецца клір прынізіць і міран прывесці да нянавісці да кліру, калі народ паўстае супраць кліру і Дактароў Царквы, як бы агульным намаганнем, тады лёгка могуць міран звярнуць да ерасі, бо, хто разам са мной пераследуе маіх ворагаў, тады лічыцца амаль сябрам, і калі хто з іх захоча звярнуць мяне да зла, лёгка згаджуся. І так падступныя ерэтыкі не прапускаюць ніякіх сродкаў, калі здараецца магчымасць: падчас расколу, які адбыўся паміж Уладаром Папам Інакенціем IV і імператарам Фрыдрыхам з яго прыхільнікамі, быў адзін тэўтонскі прынц, які з гэтай прычыны быў супернікам Царкве і ворагам кліру, ерэтыкі запланавалі яго прыцягнуць на свой бок угаворамі і да сябе схіліць, калі б толькі Бог яго з гэтага свету не забраў і гэтым сваю Царкву ад вялікага зла абараніў. І таму робяць вялікае зло, калі пры кожнай магчымасці падбухторваюць міран да нянавісці да кліру, чаму, аднак, і самі клірыкі вельмі моцна спрыяюць, калі падаюць дрэнны прыклад, вымагаюць грошы або накладаюць без разбору шматлікія адлучэнні. Часам больш мудра праігнараваць меншае зло, каб большае і непапраўнае адпачатку застрашыць[67].

V.iii Перапіска перавернутых вальдэнсаў Зігфрыда і Яна Лезера са сваімі былымі аднаверцамі ў Італіі

Як мяркуе Альберт дэ Ланге, дзейнасць інквізітара Генрыка з Оламаўца па вяртанні ў каталіцтва некаторых аўстрыйскіх вальдэнсаў падштурхнула іх былых аднаверцаў напісаць сваім паплечнікам у Італію з просьбай парады. У адказ на гэты не захаваны ліст італьянскія вальдэнсы даслалі свае разважанні ў абарону кароткага трактата, вядомага ў гістарыяграфіі як "Кніга Выбраных" [68].

V.iii.a "Кніга Выбраных"

"Кніга Выбраных" (ці "Правільных" – Liber Electorum – вядомая таксама як "вальдэнскія правілы") – гэта сціслая (каля 1000 слоў) гісторыя вальдэнсаў у тым выглядзе, у якім яны яе сабе ўяўлялі. Выкарыстоўвалася, хутчэй за ўсё, для завучвання на памяць і далейшай пропаведзі. Яна была складзена паміж 1335 і 1368 гг. і змешчана ў адным з лістоў Зігфрыда і Яна Лезера (гл. ніжэй).

Кароткі змест: вальдэнсы – сапраўдная Божая Царква, якая вядзе сваё паходжанне ад апосталаў. Раздзяленне паміж цэрквамі адбылося праз 300 гадоў пасля Хрыста, падчас кіравання Папы Сільвестра, які прыняў дар імператара

[67] Gonnet, *Enchiridion fontium valdensium*, vol. 2, 145–172.
[68] de Lange, "Waldenses in Bohemia," 129.

Канстанціна. Адзін з паплечнікаў (socius) Сільвестра адмовіўся ад дароў і выбраў шлях беднасці, і на працягу 800 гадоў цэрквы разыходзіліся – адна ішла па шляху служэння Мамоне, другая захоўвала першапачатковую чысціню. У гэты момант з'яўляецца Пётр, празваны Вальдэс, які падчас чытання Евангелля прымае словы Бога да сэрца і сыходзіць са шляху багацця на шлях беднасці. Ён пачаў прапаведаваць, і словы яго дайшлі да Рыма, але той не здолеў пакінуць свой грахоўны шлях. Між тым вакол Вальдэса сталі групавацца паплечнікі, і памнажаліся яго добрыя справы на працягу 200 гадоў. Але потым з-за хітрыкаў Сатаны пачаліся ганенні, і вальдэнсы вымушаны былі пераязджаць з месца на месца, і ўсюды яны распаўсюджвалі сапраўдную Царкву.

Пры аналізе "Кнігі Выбраных" К. Папіні прыходзіць да высновы, што яе аўтар паходзіў з Апуліі, куды вальдэнсы ўпершыню пранікаюць ужо ў 1260-я гг.[69] Пётр Білер у сваю чаргу мяркуе, што яна была створана ў альпійскім рэгіёне[70].

Тэкст "Кнігі Выбраных" на лацінскай мове захаваўся ў васьмі манускрыптах; таксама да нас дайшла версія на аксітанскай мове. Ніжэй прыведзены два перакладзеныя з лаціны варыянты "Кнігі Выбраных": як асобны тэкст і ў складзе "Ліста братоў з Італіі".

Ад часоў жа апосталаў Святая Царква ў святым парадку на землях свету пашырылася на многія тысячы [чалавек] і праз доўгія часы заставалася ў святой цноце манаскасці, і нараджала царкоўных кіраўнікоў на працягу 300 гадоў ажно да праўлення імператара Канстанціна. Пры гэтым Канстанціне, хворым на праказу, Царквой кіраваў адзін чалавек, якога звалі Сільвестр Рымлянін. Ён вёў тады на гары Сірах каля Рыма ўбогае жыццё разам са сваімі [паслядоўнікамі], як лічыцца, з-за пераследаў. Канстанцін жа, згодна з відзежам, атрыманым у сне, прагна звярнуўся да Сільвестра і, прыняўшы ад яго хрост у імя Хрыста, ачысціўся ад праказы. Канстанцін, бачачы, што вылечыўся ад такой нікчэмнай хваробы іменем Хрыстовым, вырашыў ушанаваць таго, хто яго ачысціў, і карону і званне імператара яму перадаў. Той жа прыняў. Яго ж паплечнік, калі пачуў, як усё было, ад яго сышоў і з гэтым не пагадзіўся, але трымаўся шляху беднасці. Канстанцін жа сышоў у заморскія землі з многімі рымлянамі, і там, як кажуць, пабудаваў Канстанцінопаль, які назваў па сваім імені. З таго часу ерэсіярх дасягнуў вялікіх пашанаў і званняў, і памножылася зло на зямлі. Мы верым, што не ўся Царква цалкам сышла з сапраўднага шляху. Але некаторая частка заняпала, і гэта большая частка, як гэта звычайна здараецца, трымалася зла, другая ж частка, як трэба верыць, праз доўгія часы заставалася верная праўдзе. І так паступова Святая Царква змоўкла і спазнала цяжкасці. Праз 800 гадоў пасля Канстанціна ўзняўся адзін чалавек, чыё ўласнае імя было Пётр, але з-за паходжання яго назвалі Вальдэс (Waldis). Ён, як кажуць, быў вельмі багатым і прыстойным чалавекам, і ці недзе прачытаўшы, ці ад некага пачуўшы, прыняў словы Евангельскія і ўсё, што меў, прадаў, бедным раздаў, радасна на дарогу беднасці ступіў, прапаведаваў, займеў вучняў і, уступіўшы ў Рым, у прысутнасці ерэсіярха дыскутаваў пра веру і набожнасць. Там у той час быў адзін кардынал з Апуліі, які быў яго сябрам і рэкамендаваў яго словы і жыццё і, такім чынам, вельмі любіў яго слухаць – атрымаў ад Рымскай курыі адказ, што

[69] Carlo Papini, "Il «Libro degli Eletti» (1335–1340) e i valdesi delle Puglie," *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 195 (2004): pp. 3–30, 10–11.

[70] Biller, "The Waldenses 1300–1500," 85.

Рымская Царква не можа прыняць яго слоў і ад распачатай дарогі адмаўляецца і вынесены яму прысуд быў зроблены па-за сінагогай. Але ён усё адно ў горадзе прапаведаваў і шмат вучняў займеў, і, робячы так па розных абласцях Італіі, стварыў задзіночанне, і там скрозь [людзі] былі прыцягнутыя [у гэта задзіночанне] як ім самім, так і яго паслядоўнікамі, і надзвычай памножыліся. На самой справе ахвотна слухаў яго народ, бо тое было казанне праўды з вуснаў яго і пабуджала да выратавальнага шляху. І яны настолькі памножыліся, што да яго парад сцякаліся іншы раз па 700, іншы па тысячы, іншы раз больш і іншы раз менш, і там было многімі пачута, што ім ахвотна расказвалася, і Бог любаваўся ягонымі справамі. Як казалі старэйшыя, тыя пладаносныя часы працягваліся каля 200 гадоў. Тады зайздрасць Сатаны і злосць бязбожнікаў, што узняліся супраць слугаў Хрыстовых, распачалі пераследы, з краю ў край іх выганялі, і іх лютасць супраць нас да гэтага часу трывае. І калі такое здарылася, мы нарэшце зразумелі, бо ў тыя часы, якія папярэднічалі надыходу Хрыста, былі ценем і адбіткам тых часоў, якія працягнуцца ад Хрыста і да канца стагоддзя. Таму што мы ніяк не можам вынайсці ў кнігах Старога Запавету, што ад Аўраама ажно да Хрыста святло праўды пагасла, але ўвесь час многія ці нямногія ў святым жыцці заставаліся. Таксама мы нідзе не чытаем, што яны цалкам пацярпелі няўдачу; такім чынам мы робім выснову, што ад часоў Хрыста і да сённяшняга дня тое самае адбывалася і ажно да сканчэння свету будзе штосьці, на чым будзе трымацца Царква ажно да канца веку, і ніколі Царква Божая цалкам не загіне, і дзе-небудзь у якіх-небудзь кутках свету якія-небудзь святыя будуць заўсёды. І сапраўды па ўсіх землях разышлося слова іх і г.д. І быў ён пачуты ў многіх частках Царквы Божай, асабліва заморскіх. Такім чынам, трэба лічыць, што на тым баку мора і на гэтым ва ўсе часы свяшчэннае святло не згасала. Сапраўды і нашы браты, якія ў старажытныя часы перабраліся за мора з-за пераследаў, у некаторых абласцях знайшлі братоў. Але паколькі не ведалі моў тых краёў, то не змаглі дамовіцца наконт узаемнага сяброўства, што лёгка маглі б, але праявілі цвёрдасць і ў розныя бакі разышліся. На гэты конт мы чытаем у прарока Іераміі (33:18) "і ў сьвятароў-лявітаў ня будзе неставаць мужа перад абліччам Маім" ва ўсе дні. Так выконвалася Боскае абяцанне наконт Святой Царквы. І сапраўды, сказанае прарокамі было скіравана Хрысту і Царкве. Такім чынам мы бачым, што ад Хрыста да канца стагоддзяў не знікне той прадстаўнік містычных святароў Хрыста, які будзе прыносіць ахвяры ва ўсе дні. І сапраўды, і па сёння тыя, хто з'яўляецца па святасці свайго жыцця сапраўднымі першасвятарамі, духоўна здзяйсняюць ахвярапрынашэнне Богу госціі на алтары, і нават калі іх няшмат, то не зманіў на гэты конт прарок, бо не сказаў: не знікнуць людзі, але сказаў: не знікне чалавек са святароў перад тварам маім, які будзе рабіць тое і тое. Асцерагайцеся месяца, бо як месяц можа на выгляд ад поўні дайсці да нябачнасці, але заўсёды застаецца месяцам, і калі нават хаваецца ў цемры і людзям у змроку не бачны, аднак па сваёй сутнасці, як мы верым, заўсёды застаецца месяцам. У адваротным выпадку Богу трэба было б кожны месяц рабіць месяц наноў. Але Пісанне кажа, што Бог стварыў месяц адпачатку. Такім чынам, мы лічым, як было сказана Давідам: "Ён стварыў месяц на азначэньне часу" (Пс 103:19), а значыць, у заняпадзе і аднаўленні, і ён нядоўга застаецца ў заняпадзе. І ў прыродзе месяц часта абазначае Царкву, бо заўсёды хто-небудзь з вялікай колькасці святых на гэтым свеце знаходзіцца ў росквіце, а калі-небудзь набліжаецца да скону. Адпаведна, калі праз зайздрасць Сатаны і з-за зайздрасці бязбожнікаў, нядбайнасці большасці, цяжкіх выпрабаванняў і пераследаў у якіх-небудзь краях Царква бліз-

кая да скону, то, з іншага боку, у якіх-небудзь іншых частках свету, мы верым, хаця б невялікая колькасць святых застаецца ў добрым жыцці і святым яднанні. І сапраўды, Бог сказаў Саламону праз дух прарока: "Калі ўзвышаюцца бязбожныя, людзі хаваюцца; а калі яны падаюць, множацца праведнікі" (Сал 28:28). Гэтымі і многімі іншымі свяшчэннымі выказваннямі мы даказваем, што ў будучым Царква паўстанне ў вялікай колькасці. Такім чынам, Вы з поўнай упэўненасцю прызнаеце, што кіраўнік гэтага ордэна – Ісус Хрыстос, і галава гэтай Царквы – Ісус, Сын Божы. Мы молімся Госпаду, каб у нашы часы праз сваю міласць тысячы святых памножыліся і праславілася імя яго, Бога Айца праз Сына і Святога Духа, чыя слава і ўлада на вякі вякоў[71].

V.iii.b Ліст братоў з Італіі, што не вераць у святароў, але кажуць, што самі з'яўляюцца сапраўднымі паслядоўнікамі апосталаў, да тых, хто вярнуўся з ерэтычнай заганнасці ў Санкт-Петэр-ін-дэр-Ай

Такую назву лісту далі каталіцкія перапісчыкі, але сам ён утрымлівае адказ італьянскіх вальдэнсаў Зігфрыду і Яну Лезеру. У гэтым лісце, у адрозненне ад наступнага, ідзе гаворка не столькі пра рытуальныя або сацыяльна-эканамічныя асаблівасці існавання вальдэнскай абшчыны, колькі пра асаблівасці іх самаідэнтыфікацыі. Завяршаецца фарміраванне ўласнага гістарычнага міфа, які надае легітымнасці іх секце і абгрунтоўвае неабходнасць існавання ўласнай царкоўнай арганізацыі.

Шаноўныя браты ў Хрысце Joannes Gyrardus, Petrus Chrymon, якія бачаць перад сабой гэты ліст, а таксама ім падобныя і ніжэйназваныя, шчырыя прывітанні і любоў у Хрысце, Госпадзе нашым. Даведаецеся, што мы прынялі ваш ліст з усёй належнай увагай, з якога мы даведаліся пра некаторыя рэчы, якія нас смяротна засмуцілі, бо Гасподзь неахвотна нас наведваў. Але калі звярнуцца да прыкладаў старажытных Айцоў, то цярпення вымагае вянок [цярновы], згодна са словамі Гасподнімі: "Цярпеньнем вашым ратуйце душы вашыя" (Лк 21:19).

Калі нам унушаюць адсутнасць улады, кажучы, што не маем сапраўднай асновы ці паходжання нашага закону, і што ён не паходзіць ад апосталаў, бо мы не праводзім усіх таінстваў; звернемся ж, аднак, да Мацвея: "І дам табе ключы Царства Нябеснага" (Мф 16:19) і да Ціта: "мілата, міласэрнасьць і мір ад Бога Айца і Госпада Ісуса Хрыста, Збаўцы нашага" (Ціт 1:5). Яны прыводзяць таксама ў доказ уладу, дадзеную левітам, бо ніхто не можа даць тое, чаго не мае, якую мы ўсім перадаём. Але наша ўлада не змяншаецца, а павялічваецца ў сіле і памнажаецца, калі, як яны даказваюць, у гэтым яны пастаянна прагрэсуюць і занепадаюць, бо мы не адмаўляем, а, наадварот, пацвярджаем, што так і ёсць. Яны пытаюцца, ці мелі біскупы, пасвечаныя іншымі апосталамі, такую ж паўнату ўлады, як і тыя, хто быў пасвечаны Пятром. Кажуць, што не. Супраць гэтага сказана: Сабраўшы 12 вучняў, даў ім уладу і г.д. Кажуць, што аб'яўлена, што ўсе яго наступнікі мелі аднолькавую ўладу паводле псалма "Па ўсёй зямлі праходзіць іхні гук" (Пс 18:5) і што гэты закон паходзіць ад апосталаў, заўважце, што ў часы Канстанціна

[71] Döllinger, *Beiträge*, 352–355.

Вялікага, калі Папа Сільвестр прыняў скарб, таварышы Сільвестра адмовіліся, кажучы, усё належнае маем ад Бога, каб нічога зямнога не мелі ва ўласнасці. Сільвестр жа сказаў: калі мне не падпарадкуецеся, я вас з зямлі звяду. Яны ж адказалі, радуючыся: у гэтым мы спадзяёмся на Божую ласку, бо калі звядзеш нас з зямлі за тое, што трымаемся Запаветаў Яго, то атрымаем узнагароду на нябёсах, як сказаў Хрыстос: "Вітаю вас, хто мяне пераследуе" і г.д. Хто ж не пагадзіўся з Сільвестрам, наступнай ноччу пачулі голас з неба, які казаў: сёння разлілася атрута па Царкве Божай, і бедныя, якія слухаюцца голасу Хрыста, становяцца смялейшымі, і так аказваюцца па-за Сінагогай, і напаўняюцца словам Божым. І так рассеяліся па свеце, кажучы Сільвестру наступнае: мы пакідаем твае землі, бо кіруемся на нябёсы. Сільвестр жа адпусціў іх, і яны перайшлі да шляху беднасці і праз многія складаныя часы значна памножыліся. Пазней зайздрасць псеўдахрысціянаў супраць іх лютавала ажно да такой ступені, што яны амаль былі знішчаныя, як у Псалме 2:3, і хоць зайздроснікі нашы каталікі кажуць, што ганенні здзяйсняюць толькі язычнікі ці яўрэі, аднак дрэнна разумеюць Пісанне, дзе прарокаў забівалі не язычнікі, а яўрэі, і Яна [Хрысціцеля] Ірад забіў, хоць той і быў яўрэем. Таксама: Хрыстос прыйшоў сам асабіста і яго не прынялі, але перадалі яго смерці, Якуб, брат Гасподні, быў імі забіты, і многія іншыя вучні Гасподнія таксама былі забітыя сваімі, але ўсё, што было напісана, было напісана для нашага вучэння. Адсюль адкрыта заяўляем, што абраныя зведваюць пераследы не толькі ад язычнікаў ці яўрэяў, але ад усіх народаў, як язычніцкіх, так і яўрэйскіх або псеўдахрысціянскіх, паводле слова Божага: "вы будзеце зьненавіджаныя ўсімі людзьмі за імя Маё" [алюзія на Мф 24:9, у Пісанні – усімі народамі], тое, што кажа пра цэлае, нічога не выключае, такім чынам, няма сумневу, што да самага канца свету святыя будуць зведваць пераследы з боку сваіх жа, але праз іх не будуць і не могуць быць цалкам знішчаныя, паводле слоў Госпада. Аднак, як і раней, разгарэўся пераслед слугаў Хрыста, і бачачы, што цалкам іх вынішчыць не атрымаецца, як было сказана вышэй: "не пасьпееце абысьці гарадоў Ізраілевых" і г.д. (Мф 10:32)

(Дадатак Яна Лезера ў яго лісце супраціву: Кажуць – што частка, якая сышла, і большая частка, якая, паводле іх [слоў], павінна была прызнаць Сільвестра, і частка, якая засталася на баку праўды з тым таварышам, пра якога гаворка ішла вышэй. Якімі ж былі кіраўнікі той часткі, ці як кіравалі, пра гэта нічога не кажа, аднак пераходзіць ад Канстанціна адразу да Пятра Вальдэса, паміж якімі пралягае шмат гадоў, што сам адзначае, кажучы: "Праз 800 гадоў пасля Канстанціна ўзняўся адзін чалавек" і г.д. І таксама кажа, што ніколі святло сапраўднай веры не згасала, але заўсёды былі нейкія святыя, аднак не працягвае іх да сённяшняга дня, але як бы прымае ад новага аўтара, кажучы: узняўся адзін чалавек. Але сэнс у тым, што царкоўныя пантыфікі могуць быць прасочаныя хоць узыходзячы ад апошняга да першага, хоць сыходзячы ад першага да апошняга, які ёсць зараз і які завецца Грыгорый XI. І пасля спакойна кажа: "уступіўшы ў Рым, у прысутнасці ерэсіярха дыскутаваў пра веру і набожнасць". Такім чынам праз таго, каго ён назваў ерэсіярхам, ён зрабіў выснову, што не толькі Сільвестр, але і ўсе яго наступнікі былі ерэсіярхамі, і паколькі яны ўзначальвалі ўсю Царкву, то ўся Царква апаганеная. Такім чынам тое, што Царква кажа пра пакутнікаў, пра споведзі, пра нявінніц, пра ўсё, што было пасля Сільвестра, з'яўляецца падманам).

Пётр з Вале (de Walle) і яго таварыш Ян Ліёнец у названым горадзе Ліёне, якога нашы зайздроснікі лжыва называюць прыдуркаватым, які быў па-за

сінагогай, паколькі казаў, што як вада цячэ і абвадняе паступова пшаніцу, так і Святы Дух быў не пачаткам, а аднаўленнем нашага парадку, хоць ён і быў судзімы людзьмі па-за сінагогай, але не судом Гасподнім. І такім чынам, як вы чулі, яны былі названыя Вальдэнсамі і пасля Беднымі Ліёнцамі ад горада Ліёна, у якім у тыя часы шмат людзей было перавернута. Усё, што сказана, прачытана ці пачута – павінна быць спасцігнута праз ідэю шляху беднасці, якога трымаюцца святыя людзі. Праз кароткі час ён атрымаў тыя самыя словы з Евангелля: "калі хочаш дасканалым быць" і г.д. (Мф 19:21), як леў прачынаецца ад сну, Пётр працу завяршае. Тады, калі ён прыйшоў у курыю, вы яго з зайздрасці асудзілі; але ён сам, як вам вядома, натхніў многіх людзей, з ім звязаных, сваім прыкладам, каб прынялі дасканалую дарогу, памятаючы словы Гасподнія. Калі ж яны з пыхі сваёй, так робячы, зазналіся, робячы гэта легкадумна, то гэтым грашылі адпаведна таму, як было сказана Апосталам і Аўгусцінам: "бойцеся граху судзіць таямніцы чужога сэрца" і г.д.[72] І калі б гэта справа была не ад Бога, то яна б ужо даўно ад зла распалася, як можна прачытаць у Дзеях 5:38. І калі кажуць, што вера Магамета дагэтуль не растварылася, і што яна не ад Бога, а ад чалавека, то трэба сказаць, што гэта не ідзе ад цвёрдасці іх веры, але толькі ад Гасподняга дапушчэння, які аддаў іх падманным сэнсам і іх практыкаванню, як было сказана апосталам: "Бо мусіць быць і разнадум'е" (1 Кар 11:19), гэта значыць, для практыкавання іх мудрасці, як сказаў Аўгусцін. Згодна з запаветам Гасподнім гэтага трымаліся як сам Пётр, так і ўсе вернікі: "Уцякайце з асяродзьдзя Вавілона" (Іер 51:6). Кожны ратуе душу сваю. І сказаў Хрыстос: "на шлях язычнікаў не хадзеце і ў горад Самаранскі ня ўваходзьце" (Мф 10:5); і Апостал: "Таму я кажу і заклінаю Госпадам, каб вы болей не рабілі, як робяць астатнія народы ў марноце розуму свайго" (Эф 4:17), і Апакаліпсіс "выйдзі ад яе, народзе Мой" (Апак 18:4). Яны пярэчылі гэтаму моцна, бо чыталі ў кнізе выбраных, дзе сказана: як мы чулі, летапісец у гэтым відавочна сумняваўся. Ён гэтага не зрабіў не таму, што сумняваўся, ці так гэта, бо не сумняваўся, што гэта так, а каб пазбегнуць памылкі ў расповедзе. Прычын жа дзве, па якіх мы не можам так цвёрда адказаць ці даказаць так, як гэта можа быць прачытана і даказана па іншых хроніках, па якіх мы можам такім жа чынам адмовіць, калі б хацелі адрачыся яго ж веры, бо і яе няма ў каноне Святога Пісання. Першая прычына ў адсутнасці сведкаў, бо няма сёння тых, хто сам чуў ці бачыў Цара Цароў, бо прайшло ад таго шмат часу. Але галоўная і асноўная прычына ў бясконцых перасследах, якія мы пераносім, з-за якіх вялікая колькасць кніг прапала, з-за чаго мы ледзь змаглі захаваць святую старонку, адкуль можам паўтарыць Псалом 47:9 "Як мы чулі, так і ўбачылі"; і Псалом 43:2 "Божа, мы чулі на вушы свае"; і 1 Кар 11:23 "Бо я ад Самога Госпада прыняў тое, што і вам перадаў". І хоць існаванне названага Пятра Вальдэнса (Waldensis) не было прызнанае, мы лічым, што ён быў пасвечаным прэсвітарам свяшчэннага ордэна разам са сваім паплечнікам ці сабратам Янам з таго ж ордэна, і пасля ён быў дабразычліва пацверджаны тым самым Кардыналам, пра якога вы чулі, і мы не падвяргаем сумневу вялікую і незлічоную колькасць святароў, якія абралі такое жыццё і веру, на якіх браты маглі не ўскласці рукі. Аднак і зараз ёсць у памяці некаторых з тых, хто быў сярод нас, імёны братоў Яна з Бургундыі і двух братоў-мінарытаў, якія пакінулі

[72] Цытата са зборніка "Кніга Выслоўяў" Праспера Аквітанскага, якая ўключае 392 максімы супраць Св. Аўгусціна. Тут прыведзена частка 21-й цытаты.

свае ордэны і абралі гэтую набожную веру. І той самы біскуп Лестард, які з той прычыны, што нам спрыяў, быў выкліканы ў курыю і адтуль пасля не вярнуўся, і іншы святар, які быў узведзены на вогнішча з рукамі, прывязанымі да шыі, і спалены. Усе, хто ў памяці некаторых усё яшчэ існуе сярод нас, ад чаго павінны спыніцца іх пярэчанні нашай уладзе. Ведаем, што будзем прынятыя Госпадам і нашымі пробашчамі, і можам такім чынам сказаць разам з апосталам: "Я ведаю і ўпэўнены ў Госпадзе Ісусе" і г.д. (Рым 14:14). Адкуль вынікае, што калі не вераць, што пасвечаныя, то не пасвечаныя. І не прымаючы – самі іншым даць не могуць, што нам несправядліва прыпісваюць. Акрамя таго, павінны быць уважліва спасцігнутыя словы, сказаныя да яўрэяў (Яўр 5:5) "так і Хрыстос ня Сам Сабе прысвоіў славу быць першасьвятаром" і г.д. Ці паколькі не хочуць, ці не могуць выказаць меркаванне наконт гэтых слоў, але і, як падаецца, нічога добрага на гэты конт не думаюць. Мы ж цвёрда верым, што ніхто не можа прыпісаць сабе гонар, як і Хрыстос не ўслаўляў сам сябе праз свае цуды і свае цноты, як гэта робіць Пантыфік і г.д. Нічога не вартае і іх пярэчанне гэтаму, паколькі тады трэба адмовіцца і ад права караля Осіі праводзіць імшы і г.д. Не можа быць аўтарытэтам прыведзенае ў Іллі, але карысна для нашай пабудовы, бо кіраваў праз страх народа свайго ў таямніцы, хоць і ў Ізраілі. Але паколькі наконт выкарыстання ключоў паводле выказванняў Настаўніка ... аддзяліць звязванне і развязванне, і нарэшце звязваць ці развязваць. Кожны раз, калі несправядліва звязваюць ці развязваюць, сваёй улады сябе пазбаўляюць, робяць сябе вартымі пазбаўлення. Адкуль – як Бог сказаў Пятру: табе даю ключы і г.д., я кажу, што гэта месца можа быць кімсьці дрэнна зразумета, калі робяць выснову пра пыху фарысеяў, каб асудзіць нявінных, калі перад Богам патрабуецца не меркаванне святароў, а жыццё ў цэлым. У кнізе Лявіт загадана паказваць пракажоных святарам, бо яны не робяць пракажоных або чыстых, але раздзяляюць тых, хто чысты або нячысты, і тут таксама так. Таму належыць адкрыта паказваць, што Бог не прыслухоўваецца да суда Царквы, якая з-за заняпаду і няведання судзіць па мірскіх справах, а Бог жа заўсёды судзіць паводле ісціны. Бо святары ставілі імя Божае над чынамі Ізраілевымі, але ён бласлаўляў іх. Ад таго ж, што яны дадалі, мы паміраем, як непазбежна памірае член, аддзелены ад цела. Бо калі, такім чынам, мы з'яўляемся гэтымі членамі, як сказаў Апостал: "Альбо ня ведаеце, што той, хто паруецца з распусьніцаю, робіцца адным целам зь ёю" (1 Кар 6:16), такім чынам, мы зусім не хочам стаць часткай цела распусніцы.

Зараз мы пяройдзем да трэцяй. Калі яны выдумалі, што наша дарога з'яўляецца не выратавальнай, а вядзе да асуджэння, і гэта пашырылі. Першае, бо найміты, якія пра гэта часцей кажуць, бо яны пакінулі авечак даступнымі для ваўкоў, бо ім начхаць на авечак. Другое, бо царкоўныя таінствы не праводзім, як астатнія. На гэта адкажам словамі Апостала: "о Хрыстос паслаў мяне ня хрысьціць, а зьвеставаць" (1 Кар 1:17) і "Хіба ня ведаеце, што слугі пры храме кормяцца з храма? што слугі пры ахвярніку бяруць долю з ахвярніка?" (1 Кар 9:13) Так і Гасподзь пасвячае тых, хто Евангелле звястуе, каб жылі згодна з Евангеллем, пра што належыць разумець, што не ўсе здольныя несці такі цяжар, і паколькі мы не здзяйсняем таінстваў у момант смерці, то яны кажуць, што многія з нашых паміраюць без прычасця. Што няпраўда, па словах Гасподніх: "Хто есьць Маю Плоць і п'е Маю Кроў, мае жыцьцё вечнае, і Я ўваскрэшу яго ў апошні дзень" (Ін 6:54) і яму ўслед Павел: Хто еў, будзе жыць ува мне. Адкуль Аўгусцін: Есці Хрыста – гэта не толькі прымаць плоць яго падчас таінства, бо многія прымаюць яго неналежна, але яшчэ

і быць у ім і каб ён у вас быў. Духоўна ж ужывае той, хто застаецца ў еднасці з Хрыстом і Царквой, гэта і абазначае таінства еднасці. У той жа час той не ў ладзе з Хрыстом, хто плоці Хрыстовай не есць і крыві не п'е, колькі б таінстваў ён штодзённа перад судом не здзяйсняў.

Мы кажам, паколькі больш шматлікая Царква падману, чым Царква Божая, і пра гэтыя цэрквы часта ідзе гаворка ў псалмах. Адкуль вы можаце вызначыць, што больш шматлікая гэта Царква зла, як было сказана. Сказаў таксама: "Крывое ня выпрастаецца, і чаго няма, таго нельга зьлічыць" (Экл 1:15). На тое, што яны кажуць або пярэчаць: Слова Гасподняе павінна прапаведавацца не па кутках, а публічна з вышыні, каб быць на святле, а не пад спудам, адказваю: Хай яны добра разгледзяць і зразумеюць, што такое спуд і падсвечнік, на якім стаіць свечка. Таксама і Гасподзь папракаў тых, хто гаворыць і не робіць, кажучы: "а паводле ўчынкаў іхніх не рабеце, бо яны гавораць, і ня робяць" (Мф 23:3).

Такім чынам, браты, няхай не занудзяць вас шматлікія словы або паўтарэнні, бо калі б мы выклалі свае намеры больш сцісла, вы маглі б іх не цалкам зразумець. Адкуль мы можам сказаць такія словы Гарацыя: "Калі я кажу коратка, я станаўлюся незразумелым". Трымаючыся лёгкасці, гэта значыць, лёгкімі ці шматлікімі словамі прыводзяць душы да пагібелі, а менавіта праз перанасычанасць слухачоў. Таксама: З'едлівы прамоўца праганяе невука і вучонага, не адпадаючы ад скуры, пакуль не напоўніцца, як п'яўка. Не толькі як мы навучаем, але і як да памяці звяртаемся, некаторым з вас пішам, і ў канцы ліста дадаем, як сказаў Апостал, молім вас у імя Госпада нашага Ісуса Хрыста і дзеля міласэрнасці Святога Духа, каб вы падтрымалі нас у нашых малітвах, каб мы былі вызваленыя ад няверных, якія ў Іўдзеі, а менавіта, якія Хрыста на словах падтрымліваюць, а насамрэч адракаюцца ад Яго. Прывітанне ўсім нашым сябрам. Няхай будзе з вамі мір у Хрысце і яднанне з Духам Святым[73].

V.iii.c Лісты Лезера

Захаваліся таксама лісты Зігфрыда і Яна Лезера (Чытача) з мястэчка Санкт-Петэр-ін-дэр-Аў (Sankt Peter in der Au) у Аўстрыі, якія вярнуліся ў каталіцызм, да іх былых італьянскіх аднаверцаў-вальдэнсаў. Ад Яна – два лісты, адзін з 1368 г., другі напісаны пазней, у прамежку з 1370 па 1378 г. Там згадваецца паплечнік Вальдэса, нейкі Ян з Ліёна (магчыма, гэта Ян з Ронка, або Вівет, якому нададзена апостальскае імя). Абодва аўтары называюць сябе святарамі, адлучанымі за тыя ж памылкі, што былі выказаны на стагоддзе раней Манетам з Крэмоны, што можа ўскосна сведчыць пра выкарыстанне аўтарамі яго трактата, ці наўпрост паказвае нязменны характар базавых вальдэнскіх дагматаў.

Стыль і лексіка лістоў указваюць на высокі адукацыйны ўзровень перавернутых вальдэнсаў, выдатнае веданне Айцоў Царквы, што можа служыць працягам "кніжнай" традыцыі вальдызму. Таксама варта зазначыць, што перапіска вядзецца на правільнай лаціне, прыводзяцца шматлікія цытаты, у тым ліку і з "Дэкрэтаў Грацыяна". Падсумоўваючы, можна зрабіць выснову, што на канец XIV ст. адукацыйны ўзровень вальдэнскага "настаўніка" быў прыкладна роўны каталіцкаму святару[74].

---

[73] Döllinger, *Beiträge*, 355–362.

[74] Patschovsky, "The Literacy of Waldensianism," 125–126.

Ян у лісце раскайваецца ў асноўных сваіх былых вальдэнскіх памылках перад інквізітарскім трыбуналам.

Ян Лезер прызнаецца, што яны не маюць права адпраўляць таінствы і не хочуць нават пальцам іх кранаць, і кажа, што чысцец ёсць і належна пакланяцца святым. І таксама верыць, што некаторыя з нашых і міран, і клірыкаў могуць выратавацца. Таксама кажа, што святары павінны прымаць споведзі. ... І што яны не могуць здзяйсняць таінствы[75].

Вялікая дыскусія ў іншым лісце была прысвечана таму пытанню, ці быў сам Вальдэс святаром. Ужо перавернуты Лезер адмаўляў факт яго пасвячэння, але падкрэсліваў, што гэты факт павялічыў бы віну ерэсіярха, бо ў віну яму ставілася наступнае "паўстанне непадпарадкавання":

- ✠ узурпацыя права пасвячэння святароў, бо яна не атрымана ні ад Папы, ні ад Царквы;
- ✠ апаганьванне спосабу асвячэння і пасвячэння;
- ✠ беспрычынныя змены святарскага адзення і адмова ад танзуры;
- ✠ адмова ад кананічных гадзін, царкоўных рэчытатываў і спеваў;
- ✠ апаганьванне разам са сваімі паплечнікамі каталіцкай веры і многіх царкоўных адметнасцяў.

Вальдэнсы, згодна з лістом Яна, лічылі самай галоўнай прычынай грэхападзення Рымскай Царквы тое, што некаторыя яе святары не змаглі захаваць свае рукі чыстымі. Але самі яны, з яго пункту гледжання, не маглі прэтэндаваць на тытул "сапраўднай Царквы Божай", бо "ніхто не можа хаваць святло веры", а іх секта "патаемная". Значыць, да моманту напісання ліста яны ўжо канчаткова спынілі публічную пропаведзь[76].

V.iii.d Ліст Зігфрыда

Зігфрыд у недатаваным лісце склаў спіс галоўных "зманаў" вальдэнсаў у сваім "абвяржэнні" супраць "ліёнскіх беднякоў".

... вы супраціўляецеся царкоўным уладам, адмаўляеце пісанні святых настаўнікаў, не вызнаеце паломніцтваў, абвяргаеце пакланенні святым, адмаўляеце чысцец, прызнаеце, што індульгенцыі святых айцоў не маюць сілы, абвяргаеце малітвы за памерлых, выдаляеце царкоўную іерархію, скажаеце чытанні псалмоў і царкоўныя песнапенні, рабуеце царкоўных правіцеляў і прыніжаеце падначаленых ім людзей, абязбожваеце пропаведзі ў цэрквах і шматлікімі жахлівымі рэчамі душыце Святую маці Царкву[77].

---

[75] Döllinger, *Beiträge*, 351–352.

[76] Gonnet, "I Valdesi d'Austria," 21–22.

[77] Вернер, "Идеология немецко-австрийского вальденства в XIV в.," 127.

V.iv Антывальдэнскі працэс у Майнцы ў 1390 г.

V.iv.a Артыкулы ерасі ў Майнцы

Гэтыя артыкулы былі напісаныя амаль адразу пасля пачатку працэса ў верасні 1390 года[78]. Антыерэтычны працэс у Майнцы меў месца ў 1390–1393 гг., 18 вальдэнсаў, якія раскаяліся, былі прыгавораныя да нашэння нашытых на адзенне крыжоў. Некаторыя з абвінавачаных здолелі ўцячы ад пераследу ў Бінген, але пасля там былі спалены 36 з іх (пазней па аналагічным абвінавачанні было адпраўлена на вогнішча яшчэ трое мясцовых)[79].

У год Гасподні 1390 каля свята Св. Міхаіла[80]. У Майнцы былі знойдзены такія артыкулы секты Вальдэнсаў.

Першае. Што святары, якія прадстаўлены іўдзеямі і хрысціянамі, не могуць пераўтвараць Цела Гасподняе.

Другое. Што гэтыя святары і іх вучэнне не могуць выратаваць.

Трэцяе. Што чыстца няма, але хто добра робіць, пасля смерці займее вечнае жыццё, а хто дрэнна робіць – будзе зрынуты ў пекла.

Чацвёртае. Што малітвы, якія ёсць у Царкве за памерлых, не дапамагаюць ім.

Пятае. Што Найсвяцейшая Дзева і іншыя святыя, якія існуюць на нябёсах, не могуць уступіцца за людзей, якія існуюць на зямлі.

Шостае. Што індульгенцыі, якія выдаюцца ў царкве, – падман і вынайдзеныя дзеля прыбытку.

Сёмае. Што бласлаўлёная вада і соль не валодаюць ніякім выратавальным эфектам.

Восьмае. Што спевы, якія ёсць у Божай Царкве, не прымаюцца Богам, бо служаць для пыхі.

Дзявятае. Што ўзвядзенне высокіх і вялікіх цэркваў – супраць Бога.

Дзясятае. Што самі ерэтыкі – лепшыя за святароў, таму што больш моляцца і часцей посцяцца, чым тыя святары, і не клянуцца і не падманваюць, як святары.

Адзінаццатае. Што іх малітвы лепш прымаюцца Богам, чым святарскія, таму што яны кажуць нядзельныя малітвы акурат так, як вучыў Хрыстос.

Дванаццатае. Што анёльскае вітанне не варта казаць, таму што гэта не малітва і не ўстаноўлена Богам, а вынайдзена святарамі.

Трынаццатае. Што яны лепш прапаведуюць сярод сваіх слова Божае, слухаюць споведзі і праводзяць належныя таінствы, чым гэта робяць вышэйназваныя святары.

Чатырнаццатае. Што гэтыя таінствы могуць здзяйсняць і самі іх праводзіць.

Пятнаццатае. Што іконы супраць запавету Божага і вынайдзены дзеля сквапнасці.

Шаснаццатае. Што дрэва крыжа не важнейшае за любое другое дрэва.

Сямнаццатае. Што споведзь, якая робіцца з амбона для народа, не мае хоць якой вагі, бо гэта прыдумкі[81].

---

[78] Reima, "More Powerful than Mere Matter?" 242.

[79] Smelyansky, *Heresy and Citizenship*, 44–45.

[80] 29 верасня.

[81] Döllinger, *Beiträge*, 620–621.

V.iv.b Майнцкая хроніка

Гэтая хроніка, найбольш верагодна, была напісаная вікарыем кафедральнага сабора Янам Кунгштайнам ў 1405–1487 гг. і апісвае падзеі 1187–1478 гг. Цытаваны ніжэй урывак адносіцца да 1390 г.

У гэтыя дні ў верасні была выкрыта найвялікшая ерась супраць хрысціянскай веры, якая налічвала 18 артыкулаў, якія аббрахалі хрысціянскую веру, і ў горадзе Майнцы і ваколіцах многія былі заражаныя той ерассю. Яны мелі ў Майнцы свой уласны дом, называны "Люстраная гара" (Spiegelberg), дзе мелі сваю хованку. Сярод іншага благога падманвалі, што ніякі святар не можа асвячаць Цела Хрыстова, але толькі жанаты чалавек з іх секты можа такое рабіць. Таксама забаранялі прамаўляць "Вітай, Марыя" і Апостальскі сімвал веры, а таксама многія іншыя прыдумкі, якія задоўга будзе апісваць. На заўтра пасля Дня Святога Клімента[82] яны былі асуджаныя інквізітарам ерэтычнай заганнасці і многімі іншымі магістрамі, а таксама знаўцамі Святога Пісання, і накладзеныя былі на іх крыжы жоўтага колеру, і нашытыя на плечы, і іх насіць яны былі асуджаныя на працягу многіх дзён; пахаваныя ж і памерлыя былі эксгумаваныя. Колькасць тых, хто застаўся ў Майнцы і прыняў пакаянне, складала 18 чалавек, акрамя тых, у каго атрымалася ўцячы, якіх яшчэ шмат застаецца[83].

V.v Янтывальдэнскія працэсы ў Фрыбуры і Берне

Восенню-зімой 1399 г. у Фрыбуры быў праведзены інквізіцыйны трыбунал. Яго дакументацыя цалкам захавалася, у тым ліку і спіс "адступленняў ад каталіцкай веры", па якім было прад'яўлена абвінавачанне. Пачатак працэсу паклаў ліст з Берна, дзе па выніку допытаў мясцовых вальдэнсаў быў складзены спіс 15 вальдэнскіх "памылак", пра якія бернскі магістрат папярэджваў калег з Фрыбура і Страсбурга, прыкладаючы спіс меркаваных ерэтыкоў у гэтых гарадах. Пратаколы Бернскага працэсу не захаваліся.

Першае: не вераць, што Папа ці біскупы, ці таксама прапаведнікі могуць даваць якія-небудзь іншыя індульгенцыі або адпушчэнні грахоў, і аб'яўляюць іх тымі, хто не мае ўлады, і што індульгенцыі і папярэдняе дараванне – гэта нішто.

Другое: мяркуюць наконт царкоўных пасвячэнняў, што такія пасвячэнні не маюць ніякага значэння і карысці, і што ў славу Маці Божай Марыі ці якога-небудзь іншага святога не варта рабіць паломніцтваў, што такія паломніцтвы – нішто.

Трэцяе: мяркуюць і кажуць, што ніякія малітвы ці просьбы не павінны ўзносіцца да Найсвяцейшай Марыі ці астатніх святых, заключаючы, што святыя, якія на небе, знаходзяцца ў такой радасці і так ім добра, што малітваў нашых не чуюць і перад Богам за нас не заступяцца, і так кажуць, што малітва да Найсвяцейшай Марыі, калі кажуць "Вітай, Марыя", застаецца не сказанай.

Чацвёртае: не вераць у любыя цуды, здзейсненыя на зямлі ці праз умяшальніцтва святых ці таксама ў іх мошчы, якія ёсць на зямлі.

---

[82] 24 лістапада.

[83] *Chronicon Moguntinum*, 63.

Пятае: мяркуюць, што працаваць усе святочныя дні, за выключэннем дзён нядзельных і дзён дванаццаці апосталаў, – не грэх.

Шостае: мяркуюць, што ёсць дзве дарогі ў іншым жыцці, а менавіта райская дарога і пякельная дарога, з чаго кажуць, што калі чалавек памірае, яго вызваленая [ад цела] душа ідзе ў рай ці пекла, з чаго заключаюць, што чыстца няма.

Адкуль сёмае: робяць выснову, што ўсе ахвяраванні, малітвы, імшы і ўсё добрае, што робіцца для аблягчэння душы пераходу на той свет, не мае ніякай эфектыўнасці ці каштоўнасці, і што гэта душам не карыснае.

Адкуль восьмае: робяць выснову, што такія ахвяраванні і міласціну прэсвітары і царкоўныя асобы вынайшлі і ўсталявалі з-за найвялікшай сквапнасці, а не для аблягчэння і выратавання душы.

Дзявятае: кажуць і мяркуюць, што святая вада, якая ў царкве, не можа аблегчыць несмяротны грэх.

Дзясятае: кажуць, што спавядаюць грахі свае адзін аднаму і даюць пакаянне за грахі свае, паказваюць між сабой адзін аднаму, але не спавядаюць іншым нашым прэсвітарам ні артыкулы свае, ні веру сваю, але што хаваюць артыкулы, у якіх нельга паспавядацца.

Адзінаццатае: кажуць, што калі адзін з іх памірае, то больш ахвотна хоча быць пахаваны ў полі, чым на могілках.

Дванаццатае: мяркуюць і кажуць, што цялесныя сувязі нават у святым шлюбе не могуць быць без граху, за выключэннем зачацця плода.

Трынаццатае: кажуць і мяркуюць, што ўзгадванне імені Бога ўпустую – смяротны грэх.

Чатырнаццатае: кажуць пра пасвячэнне святароў сваіх, што не трэба пасвячаць, акрамя як ва ўзросце трыццаці чатырох гадоў.

Апошняе: кажуць, што самі ерэтыкі падвяргаюцца вялікаму пераследу з боку астатніх хрысціян, і што калі яны б мелі такую сілу, як тыя, хто іх пераследуе, яны б хацелі давесці і даказаць, што вера іх і перакананні правільныя і праўдзівыя[84].

[84] Utz Tremp, *Quellen zur Geschichte der Waldenser von Freiburg*, 590–592.

VI. Каралеўства Багемія

VI.i Була Папы Рымскага Аляксандра IV наконт ерэтыкоў на памежжы каралеўстваў Багеміі і Польшчы

Доўгі час лічылася, што була апісвае з'яўленне ерэтыкоў у Польшчы, але, насамрэч гаворка ідзе пра Багемію.

Таму ж Варфаламею, лектару з Бруна, і Ламберту, празванаму Тэўтонам, з ордэна братоў меншых, якія прызначаны інквізітарамі ерэтычнай заганнасці ў частках каралеўства Багемія і польскім памежжы. Напісана ў Латэране ў 16 календы мая, 1257 год.

Аляксандр, біскуп, раб рабоў Божых. Улюбёным сынам Варфаламею, лектару з Бруны, і Ламберту, празванымі Тэўтонам, братам ордэна братоў меншых, з Оламаўцкай і Пражскай дыяцэзій, вітанне і апостальскае бласлаўленне. Нягледзячы на ўсе адзначаныя нашы палымяныя імкненні да пашырэння каталіцкай веры, мы напаўняемся вялікім болем, калі чуем ці даведваемся, што нехта ўвіхаецца, каб гэту веру прыгнятаць якім-небудзь злом, то псуючы яе легкадумнымі нараканнямі, то перакручваючы лжывымі прыдумкамі або ж фанабэрыста зводзячы яе ў нішто. Мы настойліва садзейнічаем суніманню іх упартай варожасці гам, дзе, як мы ведаем, заражаныя пагібеллю людзі змовіліся ў найбольш разбуральным спосабе пагібелі душаў. Бо адкуль у некаторых частках каралеўства і валадарства найдаражэйшага сына нашага ў Хрысце Святлейшага Караля Багеміі і памежных польскіх землях памылкі нявер'я ўзмацніліся настолькі, што многія сышлі з прамога шляху праўды ў адваротны бок на бездарожжа памылак, самі сябе апаганіўшы рознымі і разнастайнымі ерасямі, сканструявалі механізм для гібельнага хістання муру артадаксальнай веры, і маюць намер зруйнаваць яе лжывымі доказамі. Апостальскі Прастол старанна выкарыстоўваў належныя лекі супраць такіх падступных хітрыкаў, каб не распаўсюдзілася паціху гэтая хвароба, выкарыстоўваючы такіх вартых мужоў, якія б звярталі [у каталіцкую веру] сваім пачэсным прыкладам чысціні, а іх вучонае красамоўства ўмацуе выратавальнае вучэнне, каб іх святым служэннем пазначаныя мясцовасці былі ачышчаныя ад такіх пачварных пошасцяў. Належыць, каб гэтыя людзі былі накіраваны непасрэдна ў тыя ж самыя часткі княства, пераадольваючы пры гэтым многія небяспекі, бо тыя, хто ўсё ж такі непакоіцца, каб справа веры, цалкам выправіўшыся ад усіх памылак, мацней разраслася, мы няспынна з усіх сілаў клапоцімся пра гэта для нас і для іншых; і такім чынам мы пільна стараемся, каб пераканацца, што ў названым каралеўстве да гэтай вельмі важнай справы паспяхова рухаюцца. А таму згодна са зробленым намі дасканалым разглядам мы падрыхтавалі таксама для прысутных асоб

некаторыя інструкцыі для выканання дадзенай справы. І таму зараз у вашым клопаце, разважлівасці і стараннасці мы маем апору ў гасподняй надзеі, бо вас сярод іншых выбралі, і мы адправілі вас у тыя ж часткі вышэйадзначанага каралеўства прызначанымі, паўнамоцтвы вашы праз апостальскія прадпісанні строга даручаныя, а таксама адпушчаныя вашы правіны, паколькі ў міласці Божай чалавечыя страхі адступаюць, з вышыні вы надзеленыя сілай духу. Стварыце установу вышуку супраць ерэтыкоў для выкаранення ерэтычнай псоты з вышэйадзначаных частак, за што вы ўсе атрымаеце вечную ўзнагароду, і справы вашы будуць суправаджацца поспехам, старайцеся, каб праз вашы клопаты і разважлівасць крыніца ерасі была знішчана, і былі адагнаны ліскі ад вінаграднай лазы Госпада[1], а таксама сапсаваныя норавы былі выпраўлены, быў прынесены плод каталіцкай чысціні; зробленыя вамі квартальныя справаздачы і іншыя лісты, у якіх утрымліваюцца пошукавыя дадзеныя супраць ерэтыкоў і працэсы супраць іх звычак, замацуйце за якімі-небудзь адказнымі людзьмі. Калі ж вы знойдзеце каго-небудзь, вартага асуджэння за гэту псоту, заражанага або ганебнага, то іх, калі толькі яны не захочуць быць выпрабаванымі ў абсалютным падначаленні Царкве, а таксама іх укрывальнікаў, абаронцаў і спрыяльнікаў, такім жа чынам падвергніце пакаранню, якое прадпісана кананічным апостальскім правам, паклапаціцеся пра дзейсны страх чалавечы перад гневам боскім, а каб справу гэту зрабіць, папрасіце дапамогі з рук свецкай улады. Тыя, хто адмаўляе і г.д. Мы не адмяняем забароны на дзейнасць па-за межамі частак дыяцэзій, у якія па гэтай [буле] вы цяпер накіраваны Апостальскім Прастолам. Аднак мы не жадаем перашкаджаць вашым дзеянням у тых дыяцэзіях і гарадах, у якія вы прызначаны, мы таксама не маем намеру скасоўваць вашы ўчынкі, асабліва тыя, што былі вам даручаны па справах веры, калі яны здзейснены слушна. Калі ж якія-небудзь з ерэтыкоў ад сваёй ерасі ад усяго сэрца клятвенна адракуцца і захочуць вярнуцца ў царкоўную еднасць, і атрымаць роўным чынам царкоўную міласць адпушчэння грахоў, зрабіце ім тое, што такім прынята рабіць: дасціпна і ўважліва праверце, ці не падступна і крывадушна яны вяртаюцца, а можа нават вас саміх уводзяць у зман, і пад знешнасцю ягнятаў хаваюцца ваўкі. І каб такім чынам вы больш ахвотна выконвалі свой прызначаны абавязак, праводзячы суды, апытваючы сведак, калі вы распачалі расследаваць вышэйзгаданае злачынства і яго абставіны, мы даем вам поўныя правы выносіць прысуды, якія вы будзеце прад'яўляць супраць любога з гэтай прычыны; калі ж хто-небудзь з манахаў, якія абавязаны браць на сябе шматлікія даручэнні або справы і якія не могуць быць адлучаны ад Царквы, трапіць пад інтэрдыкт або адлучэнне, то Апостальскі Прастол дазваляе пайсці на саступкі. Але паколькі ў такім вялікім злачынстве належыць дзейнічаць вельмі асцярожна, каб без усялякай памылкі на вінаватых было накладзена належнае і жорсткае пакаранне, мы жадаем і загадваем, каб вы ці тыя, каго вы прызначылі ў якасці намеснікаў для допыту сведак, якіх неабходна прыняць па вышэйзгаданым злачынстве, звярнуліся да двух разважлівых манахаў, у чыёй прысутнасці паказанні гэтых сведак былі дакладна запісаны кампетэнтнымі людзьмі. Акрамя таго, каб аб'явіць каго-небудзь ерэтыком або накласці на яго пакаранне пажыццёвым зняволеннем, для гэтага стварыце савет са сваіх прысутных дыяцэзіяльных [клірыкаў], або вікарыяльных сваіх, калі дыяцэзіяльныя будуць

[1] Алюзія на Песн 2:15.

адсутнічаць, бо ў такіх справах вынясенне прысуду папскай уладай не варта адкладваць. Каб жа названае вышэй вы маглі выконваць больш эфектыўна і свабодна, вы можаце шчодра раздаваць індульгенцыі на дваццаць і сорак дзён, колькі палічыце патрэбным, усім, хто пакаяўся і выспаведаўся, хто па вашым запрашэнні прыйшоў да вас, каб гэта зрабіць, на што мы вам даём усю паўнату паўнамоцтваў. Бо калі вы бралі ўдзел у якой-небудзь справе і пры ўсім асабіста прысутнічалі, мы міласціва даруем вам гэты веніяльны грэх, як гэта было ўстаноўлена на ўсеагульным саборы для тых, хто наведаў Святую Зямлю. Тым жа, хто для змагання з ерэтыкамі, з іх спрыяльнікамі, укрывальнікамі і абаронцамі дасць вам ад усёй душы падтрымку і параду, спадзеючыся на міласць усёмагутнага Бога і ўладу яго святых апосталаў Пятра і Паўла, мы на тры гады накладзенае пакаранне здымаем; і калі раптам хто з іх на працягу якой-небудзь справы памрэ, усе яго грахі, у якіх ён сэрцам прызнаўся і вуснамі раскаяўся, цалкам міласціва прабачаем. Акрэсленае ў ранейшай пастанове апостальскага суда абмежаванне на дзейнасць святароў, якія выдаюць індульгенцыі, ніякім чынам не распаўсюджваецца на тых, хто заняты такой карыснай справай [барацьбой з ерэтыкамі?], мы надаем ім вольнае права пры нагодзе выдаваць індульгенцыі. Так, калі вы не дасягнеце абедзвюх мэт, то хаця б адна з іх вам скарыцца. Калі ж вы ўдваіх не зможаце прыняць удзелу ў выкананні гэтага, хаця б адзін з вас працягне выкананне.

Напісана ў Латэране, 15 календы мая, трэці год нашага пантыфікату.

Мы прыпыняем дзеянне папярэдніх рашэнняў апостальскага суда.

Мы таксама дазваляем вам выдаваць індульгенцыі, калі вам трэба, і не забараняем тым, хто выдаваў раней[2].

VI.ii Інквізіцыйныя пратаколы Гала з Касорыц і Пятра з Начырадца

У 1335 г. Папа Рымскі Бенедыкт XII прызначыў двух новых інквізітараў у Пражскую і Оламаўцкую дыяцэзіі: дамініканца Гала з Касорыц і францысканца Пятра з Начырадца, якія правялі да 1339 г. вялікую працу па выкрыцці вальдэнсаў у Йіндржыхуве Градцы і ваколіцах. Ніжэй прыведзены апытальнік і вытрымкі з інквізіцыйных пратаколаў, якія адлюстроўваюць асноўныя элементы вальдэнскага веравучэння дадзенага рэгіёну, без указання ўсіх імёнаў і падрабязных узаемасувязяў паміж падазраванымі.

VI.ii.a Апытальнік

Як сведчаць даследчыкі, гэты апытальнік не мае прамога дачынення да земляў Багеміі, а з'яўляецца толькі кампіляцыяй французскіх фармуляраў, створаных на аснове тэарэтычных выкладак Бернарда Гі[3].

---

[2] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae*, vol. 3, 238–240.

[3] de Lange, "Waldenses in Bohemia," 141–142, 146.

Спачатку належыць даць клятву, якая выглядае так: Ці ёсць свецкія ўлады, якія ажыццяўляюць якія-небудзь службы -:[4] каб, калі яны хочуць, каб іх вернікі паважалі і ўспрымалі, то для абароны Бога цвёрда далі клятву, што на ўсіх землях, якія знаходзяцца ў іх юрысдыкцыі, яны будуць імкнуцца выганяць усіх магчымых ерэтыкоў, а таксама тых, хто ерэтыкам верыць, абараняе, прымае і спрыяе з дапамогай людзей, якія прызнаюцца Царквой як тыя, хто мае добрую веру. Калі ж няма такой улады, трэба таемна апытаць некалькі чалавек паасаобку, ці не ведае [такі чалавек], ці ёсць там ерэтыкі, а таксама тыя, хто ерэтыкам верыць, абараняе, прымае і спрыяе. Таксама, ці ведае, ці не праводзіць хто таемных сходак у воўчых ямах, падклеццях ці іншых аддаленых будынках, і там у начныя часы збіраюцца, і там пропаведзі міран слухаюць, і споведзі робяць і іншыя блюзнерствы. Таксама, ці не ведае, каб хто-небудзь адрозніваўся ад грамады верных ладам жыцця і звычкамі, маецца на ўвазе, хто не служыць агульнапрынятым чалавечым і найвышэйшым боскім запаветам, і не трымаецца ўстаноўленых Царквой пастоў і святаў святых, і выдумляюць сабе іншы лад жыцця і звычкі, якіх не трымаюцца іншыя вернікі, раздзяляюць ежу і так далей. Таксама належыць запытацца, ці верыць і ці ведае пра каго-небудзь, хто не верыць, што існуе ўсеагульная Царква верных, па-за якой ніхто не выратуецца, такім чынам, ці вераць і трымаюцца таго, што зараз Папам з'яўляецца Уладар Бенедыкт [XII] і іншым вернікам належыць яму падпарадкоўвацца: і калі скажа, што верыць, трэба яму сказаць: Пакляніся, фізічна дакрануўшыся да Святога Евангелля, што ў гэта цвёрда верыш, і што не верыш у якую-небудзь Царкву акрамя гэтай; і калі не захоча паклясціся, то гэтым ён сябе выдасць. Таксама трэба запытацца, ці верыць у артыкулы веры, якія змешчаныя ў Апостальскім Сімвале – а менавіта "Веру ў Бога ..." і г.д.; і выкладзе, як разумее кожны артыкул; і ці ведае каго-небудзь, хто ў гэтыя артыкулы не верыць; калі кажа, што верыць, то няхай скажа: Клянуся, што цвёрда веру і лічу менавіта так, а не інакш. Таксама трэба запытацца, ці верыць, што ёсць менавіта сем царкоўных таінстваў, і не больш, і не менш, і ці ведае каго-небудзь, хто ў гэта не верыць, а менавіта: хрышчэнне, канфірмацыю, пакаянне, Цела Хрыстова, пасвячэнне ў сан, шлюб і апошняе мірапамазанне; калі кажа, што верыць, то няхай скажа: Клянуся, што не веру ў іншыя таінствы. Таксама трэба запытацца, ці верыць, што Цела Хрыстова, якое асвячаецца на алтары, з'яўляецца сапраўдным Целам Хрыстовым, а менавіта: [што Хрыстос] быў народжаны ад Дзевы Марыі, пакутаваў, быў укрыжаваны, памёр, і быў пахаваны, і што ўваскрэс з мёртвых і ўзышоў на неба, і ўзнёсся на неба, сядзіць па правы бок ад Айца і пойдзе судзіць жывых і мёртвых; і ці ведае каго-небудзь, хто ў гэта не верыць; калі кажа, што верыць, то няхай скажа: Клянуся, што веру менавіта так, а не інакш. Таксама трэба запытацца, ці верыць, што ніхто не можа здзяйсняць таінства Цела і Крыві Госпада Нашага Ісуса Хрыста, акрамя пры наяўнасці чатырох умоў, а менавіта: першае, каб былі ў наяўнасці хлеб і віно, другое, каб быў святар, пасвечаны згодна з царкоўным звычаем, трэцяе, каб была прамоўленая пэўная формула, перададзеная Хрыстом, чацвёртае, каб святар меў намер ажыццявіць пераўвасабленне; і ці ведае каго-небудзь, хто ў гэта не верыць; калі кажа, што верыць, то няхай скажа: Клянуся, што цвёрда веру менавіта так, а не інакш. Таксама трэба запытацца, ці верыць, што Царква, якае існуе пад

[4] Такі знак прыпынку стаіць у крыніцы.

[кіраўніцтвам] Папы Бенедыкта і яго верных, мае ўладу вязаць і развязваць; і ці ведае каго-небудзь, хто ў гэта не верыць; калі кажа, што верыць, то няхай скажа: Клянуся, што веру менавіта так, а не інакш. Таксама трэба запытацца, ці верыць у існаванне чыстца; і ці ведае каго-небудзь, хто ў гэта не верыць; калі кажа, што верыць, то няхай скажа: Клянуся, што веру менавіта так, а не інакш. Таксама трэба запытацца, ці верыць і ці ведае каго-небудзь, хто не верыць, што імшы, міласціна, малітвы і безмясныя пасты і іншыя царкоўныя заступніцтвы карысныя для душаў, якія існуюць у чыстцы[5].

VI.ii.b Пратаколы

Варта адзначыць, што назвы "вальдэнсы", або "бедныя ліёнцы", у тэкстах пратаколаў не сустракаецца, толькі ў тых формулах, што былі перапісаныя з французскіх арыгіналаў (гл. вышэй).

Чэске Будзеёвіцы

... Пётр ... консул[6], які быў прызваны і пакляўся сведчыць згодна з верай, паведаміў, што западозрыў у ерасі ткача Фрыдрыха і ўмацаваўся ў падазрэннях, паколькі калі Цела Хрыстова ўзнімалі, тады той Фрыдрых адвярнуўся, заплюшчыўшы вочы ... таксама паведаміў, што Гербар быў таксама зняслаўлены падазрэннем у ерасі. Быў запытаны, адкуль тое ведае, адказаў: "Не святкуе святы, устаноўленыя Царквой, і не паважае клір, і перашкаджае даваць міласціну Царкве, і перашкаджаў наколькі мог аплачваць працу інквізітара, які хацеў правесці вышук"[7].

Гайнлін (Heynlinus), сын Гербарда, консул, які быў прызваны і пакляўся сведчыць згодна з верай, сказаў, што наконт запытанага нічога не ведае, акрамя таго, што чуў, што нейкія гараджане былі названыя ерэтыкамі ў Празе. Быў запытаны, ці ведае што-небудзь пра тое, што консулы аднадушна згаварыліся даваць аднолькавыя адказы інквізітарам, адказаў, што пра гэта зусім нічога не ведае[8].

... суддзя, які быў прызваны і пакляўся сведчыць згодна з верай, паведаміў, што ... зняслаўленыя падазрэннем у ерасі. Таксама паведаміў, што Уладар Майнлін сказаў: "Мой Бог мне даў найлепшае". Далей названы Майнлін сказаў: "Перш чым паклясціся і прыняць крыж, я б хацеў быць падаражэй (carius) спаленым". Таксама паведаміў, што школьны настаўнік публічна сказаў – але гэтага ён сам не чуў, а па чутках, – што здзяйсняць пералюб дзеля зачацця – не грэх[9].

Йінδржыхув Градзец

... спавядалася настаўніку Пятру, які быў самым галоўным (praecipuus) сярод настаўнікаў, у доме свайго свёкра ... і гэта Зертла казала жанчынам, чые мужы былі схопленыя, каб кляліся пра тое, што кажуць; тады ім будзе лягчэй, бо будуць клясціся па прывычцы, а тым жа цяжэй, бо нязвыклыя[10].

---

[5] Patschovsky, *Die Anfänge Einer ständigen Inquisition in Böhmen*, 104–105.
[6] Прадстаўнік мясцовай адміністрацыі.
[7] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 175–176.
[8] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 179.
[9] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 180.
[10] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 189.

Таксама сказала, што чула, што большая частка жыхароў у Прахаціцэ (Prachatice) – ерэтыкі ... і што ў Храсчані (Chrasczan) чатыры гаспіцыі ерэтыкоў[11].

... Ульрык пабудаваў асобнае памяшканне пад гарадской сцяной у горадзе ў сваім гаспіцыі, і прыгожае было гэтае памяшканне, і маленькую лазню таксама да яго прыстроіў; і гэтае памяшканне было зробленае для настаўнікаў секты, і гэты Ульрык са сваёй жонкай былі з секты. Была запытаная, адкуль гэта ведае, адказала, паколькі названы Ульрык прыязджаў са сваёй жонкай на свята з максімальнай таямнічасцю ў крытым экіпажы, і заставаліся яны 14 дзён у камфорце[12].

Таксама сказала, што чула ад згаданай Перхты, сястры спаленай Нізлы, што калі была інквізіцыя недзе ў ваколіцах Штайра, дзе шмат вёсак секты ерэтыкоў, там людзі з секты прыйшлі да настаўніка ў Гарстэн па параду, якім чынам яны павінны гаварыць у прысутнасці інквізітараў. Той адказаў: "Калі запытаюцца ў вас, ці прыходзілі да вас людзі, якія слухалі споведзі і прапаведавалі, адказвайце: «Да нас прыходзілі людзі, якія нам [неразборліва] і прыносілі іншае хатняе начынне, неабходнае жанчынам»". І такім чынам пазбеглі зняволення і ўвялі ў зман інквізіцыйную службу, бо ніхто з іх не быў спалены[13].

Прага

Быў запытаны, колькі разоў спавядаўся настаўнікам сваёй секты, адказаў: "Адзін раз міраніну ў названым доме, і другому міраніну ў яго ў тым самым доме". Быў запытаны, ці названыя настаўнікі былі міранамі ці святарамі, адказаў: "Відавочна што міранамі". Быў запытаны, ці прымаў пакаянне ад першага міраніна, адказаў, што так. Быў запытаны, ці выканаў накладзенае на яго пакаянне, і ці верыў, што яно паспрыяе выратаванню, адказаў, што так. Быў запытаны, чаму вучылі названыя міране, адказаў: "Што не павінны клясціся, і што мы – верныя (fidelis), і што існуе толькі дзве дарогі, а менавіта на неба і ў пекла, і што чыстца душаў не існуе". Быў запытаны, як яны сябе называюць у іх секце, адказаў: "Называем сябе прызнанымі і выпрабаванымі людзьмі (notos et probos homines)"[14].

Быў запытаны, у які час названы міранін-спаведнік быў у яго дома, адказаў: "Заўсёды прыходзіў ноччу і ноччу сыходзіў, такім чынам, ніколі днём не быў у маім доме". І інквізітар абвінаваціў яго ў падмане і лжэсведчанні, бо названы міранін абедаў у яго дома з яго ведама, да стала сеў, і жонка яго ежу гатавала; і пасля такім жа чынам вячэраў і застаўся на ноч. ... "... і прыходзіў заўсёды ўвечары і заставаўся там на гэту ноч і наступны дзень, і сыходзіў позна ўночы, і я яго забяспечваў неабходным на расходы". Быў запытаны, ці названы Ульрык меў з сабой паплечніка, адказаў: "Калі першы раз быў у нас, тады меў паплечніка, але апошні раз прыходзіў адзін". ... Быў запытаны, куды пайшоў, адказаў: "Такім чынам скажу вам: зараз ужо не тое, што было раней, бо прыходзяць у вялікай сакрэтнасці і таемна сыходзяць, каб ніводзін чалавек, якім бы ён сябрам не быў, не ведаў пра прыход названых спаведнікаў; і значыць, калі ўваходзяць ці выходзяць з дому, сакрэтна і таямніча выходзяць і ўваходзяць, не дазваляючы нікому даведацца, куды ідуць ці адкуль прыйшлі". Быў запытаны, як гэта незнаёмца зрабіў

[11] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 196.
[12] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 197.
[13] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 199.
[14] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 203–204.

сваім першым спаведнікам: "Як так атрымалася, што ты прыняў яго ў сваім доме і выспаведаўся яму?" адказаў: "Гэтага б не атрымалася, калі б не тыя дзве жанчыны: Елізавета, удава майго брата, са сваёй сястрой Грэльдай, якія прывялі гэтага спаведніка-міраніна ў мой дом і мне ўнушылі да яго давер, кажучы, што ён – добры чалавек, які можа мяне прывесці да Царства Нябеснага, калі я буду трымацца яго парад"[15].

Градзец Кралавэ

... нехта, чыйго імені ён не памятае, казаў публічна ў нейкай карчме, што ўсе святары, як парафіяльныя, так і манахі, усе ерэтыкі, за выключэннем аднаго.

... што дачка яго не клянецца і не кажа "trun"[16].[17]

Таксама наконт Ульрыка, ткача, які падазраецца ў ерасі, паколькі не клянецца і не ходзіць у царкву, і калі прыходзіць, то праводзіць час на могілках, і зрэдку заходзіць у царкву; і не ахвяруе, пагарджае клірам і скардзіцца на яго, і часта перад Раством, калі клірыкі калядуюць, замыкаецца ад іх, як ад ворагаў і не дазваляе ім увайсці; не святкуе ні святаў, ні дзён нядзельных, але працуе за станком; і спрачаецца пра Евангеллі і казанні, і калі жонка вяртаецца з царквы дадому, пытаецца ў яе, што там было і пра што прапаведавалі, і папраўляе яе, кажучы: "Ты павінна разумець гэта так і так"; і так кажа, як чуў з яе вуснаў. І мае ў доме сваім шматлікія прытоны і хованкі[18].

Фрагмент з прызнання Готвайга

"Кацярына, ты павінна паклясціся на Святым Евангеллі Божым, што хочаш падпарадкоўвацца Святой Рымскай Царкве і Уладару Папу Бенедыкту, і такім чынам будзем адказваць праўдзіва на пытанні". Адказала: "Усё, што я павінна рабіць як добрая хрысціянка, я зраблю". Але была запытаная тройчы наконт клятвы, ці хоча паклясціся, і нічога не адказала. Нарэшце сказала: "Калі вы загадваеце мне клясціся, паклянуся". І Уладар Інквізітар сказаў: "Я не загадваю табе, але калі ты хочаш падпарадкавацца і паклясціся, то гэта па тваім жаданні". Ад гэтага яна з пагардай адмовілася[19].

Фрагмент з прызнання Бруна

... Генрык, стары бібліятэкар, паведаміў пад прысягай, што мае аднаго брата, па імені Рудлін, які з'яўляецца настаўнікам паміж ерэтыкамі, спавядае міран і прапаведуе перад слухачамі. ... І сказаў, што ён – півавар, а таксама карчмар, і цнатлівы; і таму прыняты ў настаўнікі, бо ніхто не можа быць настаўнікам, калі не цнатлівы, і ў вучні прымаюць толькі цнатлівых[20].

---

[15] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 209–212.
[16] Trun, trewin, truwin – слова, якое дадавалася ў нямецкамоўным асяроддзі пры клятве.
[17] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 216–217.
[18] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 227.
[19] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 233.
[20] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 250.

VI.iii Статут Яна, Пражскага Архібіскупа і Апостальскага Легата, да ўсіх вернікаў Рэгенсбургскай, Бамбергскай і Майсэнскай дыяцэзій, 30 красавіка 1381 г.

Менавіта ў гэтым статуце ўтрымліваецца самае ранняе прамое ўказанне на прысутнасць вальдэнсаў у Чэхіі, праўда, без удакладнення, гаворка ідзе пра тэрыторыю Багеміі або Маравіі.

II. Таксама мы загадалі дадаць датычна раздзела пра ерэтыкоў і схізматыкаў. З болем мусім адзначыць, што ў названых дыяцэзіях, як мы даведаліся з некаторых паведамленняў, існуе атрута шматлікіх ерасяў, і асабліва секты Сарабойтаў (Sarraboytarum) і тых праклятых сялян-Вальдэнсаў. І паколькі Уладары біскупы, якім непасрэдна належыць ачышчаць свае дыяцэзіі ад благіх людзей, ставяцца да гэтай справы святой веры з вялікім прамаруджваннем, па магчымасці ўхіляючыся ад выдаткаў і не маючы інквізітараў ерэтычнай заганнасці, мы па парадзе братоў нашага свяшчэннага савета, параіўшыся з саветам, загадалі пастанавіць, каб згаданыя біскупы супраць такой заразы або самі, або праз усталяваных імі інквізітараў старанна сачылі і сцераглі, да чаго мы іх гэтым лістом заклікаем і запрашаем праз глыбінную Міласць Божую і свяшчэнны абавязак Крыві Ісуса Хрыста, і тым не менш нагадваем ім пра клятву, якую яны ўрачыста далі, прымаючы свяшчэнны біскупскі сан, і да сэрца вяртаем. Калі ў названай святой справе маюць якія-небудзь перашкоды, якія ім замінаюць, каб да нас смела звярнуліся, каб мы мелі магчымасць, а менавіта з дапамогай і рукамі найзнакаміцейшага, найяснейшага і нераможнага Уладара і Пана Вацлава, караля рымскага і Багеміі, якому ва ўсім папярэднічала Божая ласка, належныя лекі ў Госпадзе прымяніць. У адваротным мы кампенсуем нядбайнасць гэтых Уладароў біскупаў з дапамогай Бога Нашага, і самі паклапоцімся, каб даслаць інквізітараў у названыя дыяцэзіі[21].

VI.iv Пражская пропаведзь Мацвея Кракаўскага ад 25 студзеня 1384 г.

Аляксандр Пачоўскі выказвае меркаванне, што гаворка ў пропаведзі ідзе пра тых самых вальдэнсаў, якія былі арыштаваныя архібіскупам Янам (з папярэдняга дакумента), ураджэнцаў Прагі[22].

Тут запісаныя ў годзе Гасподнім 1384 у дзень павароту Святога Паўла наступныя артыкулы, якіх трымаюцца некаторыя ерэтыкі, выяўленыя пражскім архібіскупам, [гэтыя артыкулы] пералічыў настаўнік Мацвей з Кракава падчас публічнай пропаведзі перад народам у пазначаны вышэй дзень.

Па-першае, што ў нашай веры ці дзякуючы нашым таінствам ніхто не выратуецца, акрамя як ахрышчаныя намі немаўляты, але не дарослыя.

---

[21] Höfler, *Concilia Pragensia*, 26–27.

[22] Цыт. па de Lange, "Waldenses in Bohemia," 145.

Па-другое, што не прымаюць дактароў нашых[23], бо яны розняцца ў выкладанні, але кажуць, што прымаюць толькі сапраўдны тэкст Бібліі, відавочна не ўсе кнігі Бібліі.

Па-трэцяе, што на аснове Новага Запавету немагчыма зрабіць выснову, што дазволена якога-небудзь чалавека за якое-небудзь злачынства да смерці прыгаворваць. Да гэтага артыкула падвёў іх Д'ябал, бо гэта пра іх[24].

Па-чацвёртае, што кажуць, што няма чыстца. ... І калі ім прыводзяць у прыклад тыя радкі з кнігі Макавеяў "Таму ўчыніў за памерлых уміласціўляльную ахвяру, каб былі вызвалены ад граху" (2 Мак 12:46)[25], то яны кажуць, што не прымаюць Кніг Макавеяў, бо яны з'яўляюцца апакрыфічнымі, гэта значыць – не сапраўдным Пісаннем. Гэта няпраўда, бо Святая Рымская Царква прымае ўсе кнігі[26].

Па-пятае, што мірапамазанне, якое робіцца мёртвым, не мае значэння. Гэта яны выводзяць з папярэдняга [пункта].

Па-шостае, што ні святыя, ні Найсвяцейшая Дзева не вартыя ні пакланення, ні шанавання па той прычыне, што святыя адзіныя ў сваіх жаданнях з Богам; такім чынам, яны хочуць таго самага, што і Бог, і не могуць хацець нічога іншага. Але відавочна, што гэта няпраўда, паколькі Хрыстос быў адзіны ў сваіх жаданнях з Богам Айцом, і тым не менш маліўся Богу за нас. Таксама і святыя могуць такім жа чынам маліцца за нас. Дзе яшчэ ў свеце гэта могуць рабіць лепш і больш, як не там?

Па-сёмае, што святар, які здзейсніў смяротны грэх, не можа ні адпускаць камунебудзь грахі, ні асвячаць Цела Хрыстова, калі толькі не пасвечаны паўторна. Але тое, што гэта няпраўда, ясна з прыкладу Пятра, які быў пасвечаны Госпадам на святарства, але пасля ўпаў у смяротны грэх, калі адрокся ад Хрыста: але няма і знаку ў Пісанні, што быў наноў пасвечаны.

Па-восьмае, што індульгенцыі – нішто, і што ад індульгенцый адзін падман. Відавочна, што гэта падман, бо Хрыстос даў Пятру і яго спадкаемцам свае ключы, каб вязалі і развязвалі, такім чынам прэлаты, якія маюць ключы ад куфара, у якім захоўваецца вартасць пакутаў Уладара Нашага Ісуса Хрыста, могуць з прычыны, а менавіта з-за набожных спраў, і даць за іх [за набожныя справы] індульгенцыю і адпушчэнне грахоў[27].

VI.v Ліст Оламаўцкага біскупа Мікалая да Рымскага Папы 1394 г.

Ліст быў складзены адначасова з пікам актыўнасці інквізітара Марціна Пражскага, аднак прамыя звесткі наконт сувязі паміж абвінавачанымі групамі вальдэнсаў адсутнічаюць.

---

[23] Айцоў Царквы.

[24] Маецца на ўвазе: гэта іх, ерэтыкоў, прыгаворваюць да смерці.

[25] Цытата дадзена паводле: Уладзіслаў Чарняўскі, *Біблія. Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запаветаў* (Minsk: Біблейскае таварыства ў Рэспубліцы Беларусь, 2012).

[26] Кнігі Макавеяў і па сёння з'яўляюцца прадметам разыходжанняў у Біблейным каноне. Яны прызнаюцца ў Вульгаце, але адсутнічаюць у многіх пратэстанцкіх канонах.

[27] Patschovsky, *Quellen zur Böhmischen Inquisition*, 318–323.

Найсвяцейшы Айцец! Паколькі ў горадзе і дыяцэзіі Оламаўцкай ёсць ерэтыкі з секты Вальдэнсаў, якія ахвотна хочуць вярнуцца да царкоўнага адзінства, але праз пастанаўленні святой памяці Уладара Папы Бенедыкта XII не могуць атрымаць адпушчэнне сваіх правінаў без спецыяльнага дазволу Апостальскага Прастола, то моліць Вашу Міласць ваша пабожнае стварэнне Мікалай, біскуп оламаўцкі, каб вы яго ўганаравалі такім дазволам, каб ён сам або хто-небудзь іншы змог адпусціць ім грахі і накласці на іх выратавальнае пакаянне, не ўступаючы ў супярэчанне са згаданым пастанаўленнем ці якімі-небудзь іншымі, з належнымі наступствамі[28].

Рым, 30 верасня 1394 г.

VI.vi Якуб з Петрыкаў. 20 "зманаў" Вальдэнсаў

Гэты пералік захаваўся ў двух рукапісах бібліятэкі Пражскага капітула. Пражскі студэнт Якуб з Петрыкаў каля 1395 г. склаў (ці перапісаў ужо гатовы) для сябе або на замову кароткі спіс вальдэнскіх памылак, які пасля пакінуў у Кракаўскай Акадэміі[29].

Гэта памылкі Вальдэнсаў і тых, якія называюцца Рокаролі[30]

Яны ж кажуць, што Рымская Царква не з'яўляецца Царквой Божай, але ёсць сходам злодзеяў.

Другое, што Уладар Папа не можа прабачаць грахі, ні вязаць, ні даваць адпушчэнні.

Трэцяе, што ўсе царкоўныя імшы, а менавіта імшы, спевы псалмоў і іншых спеваў не згодна з Богам, і чалавеку не трэба наведваць царкву.

Чацвёртае, што ёсць толькі тры царкоўныя чыны, а менавіта: свяшчэнства, біскупства і дыяканат; астатнія – гэта ні што іншае, як людскія прыдумкі.

Пятае, што распяцце і іконы не варта паважаць, бо гэта грэх, і не трэба ставіць перад алтарамі і іконамі свечкі і здзяйсняць ахвярапрынашэнні.

Шостае, што дрэнныя святары не могуць здзяйсняць еўхарыстыю.

Сёмае, што чалавек не павінен спавядацца ў сваіх грахах грэшнікам, а толькі праведнікам.

Восьмае, што душам уласціва выходзіць за межы целаў.

Дзявятае, што дзеці злачынных бацькоў, і ахрышчаныя, і не ахрышчаныя, будуць асуджаны за грахі бацькоў, і адпаведна выратуюцца дзякуючы добрым учынкам бацькоў – і ахрышчаныя, і неахрышчаныя.

Дзясятае пра чысцец, што не існуе.

Адзінаццатае пра помсту, ці пра ўладныя правы, ці пра прысуд, якія не павінныя быць здзейсненымі.

Дванаццатае пра клятву, якую не варта даваць ні ў якім разе.

Трынаццатае, што словы святых настаўнікаў не павінны брацца на веру, толькі па ўласным меркаванні.

---

[28] *Monumenta Vaticana*, 469, č. 858.

[29] Wyrozumski, "Z dziejów waldensów w Polsce średniowiecznej," 46.

[30] Holinka, "Sektářství v Čechách," 181.

Чатырнаццатае, што яны асуджаюць дэкрэты святых айцоў, кажучы, што яны – здраднікі людзям.

Пятнаццатае, што Царква Божая прыйшла ў заняпад з часоў біскупа Сільвестра з-за царства зямнога, што атрымала ад імператара Канстанціна.

Шаснаццатае, што Енох, Ілія і Антыхрыст прыдуць не асабіста, а вобразна.

Сямнаццатае, што любы праведнік, і пасвечаны [у сан], і не пасвечаны, можа здзяйсняць еўхарыстыю.

Васямнаццатае, што міласціна, ахвярапрынашэнні і добрыя справы не дапамогуць памерлым.

Дзевятнаццатае, што жонка можа сысці ад свайго мужа пры жыцці, і наадварот.

Дваццатае, што ніхто не можа выратавацца ні ў якім званні, ні ў духоўным сане, ні ў свецкім, калі ён не быў у іх секце, і так далей.

VI.vii Трактат супраць ерэтыкоў

Ананімны твор пад назвай "Трактат супраць ерэтыкоў", напісаны ў Чэхіі ў самым пачатку XV ст., захаваўся ў рукапісу бібліятэкі Пражскага капітула.

Кажуць таксама, што яны клапоцяцца пра душы тым, што прапаведуюць і слухаюць споведзі.

Кажуць таксама, што святары нічым не мусяць валодаць, а тыя, хто робіць адваротнае, будуць асуджаныя.

Таксама яны адмаўляюць аўтарытэт Папы, кажучы, што ніхто, у тым ліку і біскупы, не можа раздаваць індульгенцыі, устрымліваючыся ад параўнання царкоўных каштоўнасцяў з кроўю Хрыстовай і страсцямі пакутнікаў.

Таксама адмаўляюць казанні святых, а менавіта Грыгорыя, Аўгусціна і іншых, дзе б яны ні знайшлі контраргумент супраць сваёй секты, не зважаючы на іх святасць, шматлікія здзейсненыя цуды і што яны напісалі свае кнігі пад дыктоўку Духа Святога, аднак прымаюць толькі створаныя імі самімі сведчанні, і пісанні святых, якія часта выкарыстоўваюць супраць іх, яны паварочваюць у адваротны бок. Так робяць тыя, маюцца на ўвазе Вальдэнскія дактары, што ў сваіх памылках і меркаваннях падзелены на тры часткі і, як вынік, не могуць Царкву стварыць, бо Царква адзіная ў веры, паводле Паслання да Эфесянаў 4...

Таксама вераць, што святыя дактары для сваёй асабістай карысці складалі кнігі, і таму іх спадчынай, гонарам і маёмасцю яны грэбуюць, як гэта яны праз усё сваё жыццё заяўляюць.

Таксама кажуць, што пакланенне іконам параўноўваюць з ідалапаклонствам; у той час калі выявы ўшаноўваюцца не самі па сабе, а тыя, хто на іх выяўлены; такім чынам многія звычаі, якія ёсць у Царкве, такія, як імша, царкоўнае адзенне, форма посуду і размяшчэнне начыння і г.д. не дзеля саміх сябе, а для заключанага ў іх цуду былі ўведзены. Так іконы і выявы збольшага для міран падрыхтаваны ў якасці Пісання.

Таксама кажуць, што чыстца няма.

Таксама кажуць, што малітвы жывых мёртвым не спатрэбяцца, і гэта таму, што ўсе мёртвыя або ў пекле, і таму малітвы ім не дапамогуць, або на небе, і тады ў малітвах няма неабходнасці.

Таксама кажуць, што святыя ці блажэнныя па ўмяшальніцтве жывых мёртвым не могуць дапамагчы.

Таксама кажуць, што толькі гасподняя малітва, а менавіта "Ойча наш", павінна прамаўляцца, і ніякая іншая, і што кананічныя гадзіны былі выдуманыя святарамі для задавальнення сваёй прагнасці.

Таксама кажуць, што ні ў якім разе, акрамя як з прычыны моцнага страху, які можа здарыцца з чалавекам, ці непазбежнай смерці, нельга клясціся.

Таксама кажуць, што ні ў якім разе, нават калі здзейсніў якое-небудзь злачынства, чалавек не можа быць прыгавораны свецкімі ўладамі да смяротнага пакарання.

І колькі б многа ні было іншых прыкладаў, якія могуць прыйсці на адзін вышэйсказаны доказ, гэта толькі тое, што я змог коратка сабраць з прычыны нязначнасці майго таленту. І гэтыя вышэйсказаныя доказы супраць ерэтыкоў, якія распаўсюдзіліся спачатку ў Аўстрыі, а зараз і ў Багеміі, а значыць, супраць тых, якіх праўдзіва адданы і верны прапаведнік спаймаў шчытом веры і добрай воляй і шлемам выратавання і любові, і мячом слова Божага, і змагаўся з імі з дапамогай нашага Святога Пісання, пераўзмагаючы нявер'е верай...[31]



[31] Neumann, "Nové doklady k dějinám Valdenských v Čechách," 679–680.

VII. Польшча

VII.i Антыерэтычны працэс у Свідніцы 1315 г.

VII.i.a Аналы

Любежскія аналы (Annales Lubenses) былі складзеныя ў цыстэрцыянцкім кляштары ў Любежы (Сілезія) і паведамляюць пра пакаранне смерцю ерэтыкоў.

У лета Божае 1315 каля дня свята святога Якуба [прыкладна 25 ліпеня 1315 г.] многія ерэтыкі колькасцю каля пяцідзесяці ці больш разам са сваімі жонкамі і дзецьмі былі спалены ў Свідніцы; у Вроцлаве і іншых гарадах таксама многія былі спалены[1].

VII.i.b Пратаколы допытаў

У 1315 г. у Свідніцы прайшоў інквізіцыйны трыбунал у складзе дамініканцаў, францысканцаў і прадстаўнікоў свецкіх улад пад кіраўніцтвам памочніка вроцлаўскага біскупа Паўла з Банча, цыстэрцыянца з Любежскага кляштара. Сам біскуп вроцлаўскі Генрык з Вежбней, які выступіў ініцыятарам вышуку, на пасяджэннях не прысутнічаў. Захаваліся пратаколы гэтых допытаў.

1

Такім чынам, падманваюць ерэтыкі, якія не кажуць клятваў (truwin). Герман Кінсперг чуў з вуснаў Сіботана (Sybothonis) і Генрыка Шпітальнага (Henrico retro hospitale): "Мы ўсе ерэтыкі і беззаконнікі, бо мы не кажам клятваў". Таксама Сіботан сказаў, што ні ў што не ставіць ні парафію [парафіяльных святароў], ні манахаў, і не верыць, што яны могуць развязваць або звязваць, але яны маюць сваіх уласных спаведнікаў-міран, якім яны даверяюць і якія ім адпускаюць, і яны прыходзяць два ці тры разы на год і прапаведуюць і адпускаюць. Таксама, што спаведнікаў 12 чалавек, і адзін раз на год збіраюцца, і сярод іх з'яўляецца 13-ы, пра якога яны кажуць, што ён іх бог. І падаецца ім, што ўсё навокал становіцца золатам, і ўзнікаюць перад імі нябёсы, і залаты трон, і Люцыфер у найвышэйшай уладзе, і анёлы лётаюць навокал; і ад таго моманту яны – слугі Люцыфера, і не прагнуць ні есці, ні піць. Казаў: "Усе вераць, што Люцыфер вернецца на неба, а вы з Хрыстом у пекла абрынецеся". Таксама прызнаўся, што злучаўся з маці, дачкой і сястрой ці кім-будзь згодна са звычаем сваіх настаўнікаў.

Таксама Людвік з Горліча чуў такія ж прызнанні.

Таксама Габель, іншы спайманы таварыш, так казаў: "Мы такое кажам ужо 30 гадоў, за што мы вартыя спалення; і ўсе мы, хто не кажа клятваў, асуджаныя".

---

[1] "Annales Lubenses a. 1241–1315," 548–549.

Таксама казалі, што толькі за тое на іх накладалі пакаянне, што кляліся, і ні за што іншае.

Таксама вышэйназваныя Герман Кінсперг, Людвік з Горліча прызналіся, што чулі ад іх, што названыя ерэтыкі – а менавіта Сіботан і Генрык Шпітальны, Ян Капач – з'яўляюцца галоўнымі над усімі.

Таксама Герман Кінсперг чуў ад іх, што Сіботан многіх прывёў у секту, і што тыя, хто ўваходзіў, спярша ўкленчвалі перад ім і клятвенна абяцалі, што хочуць пазбягаць клятваў. "Пасля навучалі іх поруч з сабой некоторым лёгкім рэчам, падобным да іх веры; затым, нарэшце, калі новенькі аказваўся талковым, навучалі яго галоўнаму і праціўнаму веры (каталіцкай)".

Таксама калі быў запытаны Сіботан, чаму не прызнаўся ў гэтым у прысутнасці біскупа, адказаў: "На схіле жыцця ап'яніўся. Калі б прыйшоў раней[2], усё б яму сказаў". Калі ж ён хацеў сказаць раніцай, то быў бы пакараны.

Таксама казалі, што пасля таго, як ачышчаліся праз споведзь, то пераносіліся на найпрыгажэйшы палетак, дзе бачылі рай і свайго бога ў найвялікшай велічы.

Пры гэтых прызнаннях прысутнічаў таксама Голдзіл, Свідніцкі гараджанін.

Таксама Герману Кінспергу казалі: "Калі б мы праіснавалі яшчэ 5 гадоў, то мы б абралі караля, аб'ядналіся з яўрэямі і распачалі б вайну з людам хрысціянскім". І калі Герман ім сказаў: "Не баіцеся быць спаленымі?", яны адказалі: "Ведаем дакладна, што Бог – наш суцяшыцель, і што вызваленая душа наша ўзнясецца ў рай".

Таксама Сіботан і іншыя адмаўлялі, што Святая Марыя была беззаганнай.

Прадстаўленыя тут данясенні і прызнанні былі зробленыя ў прысутнасці Уладара біскупа Цівалі Паўла, брата Конрада з Вімії (Wimia), захавальніка братоў-мінарытаў, і брата Гунтара, чытача ў Свідніцы, брата Крафтана, прыёра і паплечніка яго з ордэна прапаведнікаў, Яна са Стжэгама (Strigouia), Генрыка з Пічына (Pilsheyn) і іншых шматлікіх дарадцаў, Мікалая з Рыхенбаху (Richenbach), Германа Шутвурфіла (Schutwurfil), Мікалая з Аморэ (de Amore) і людзей шматлікіх і важных.

2

Таксама Энгільмар публічна прызнаў свае памылкі, кажучы: "Я адкрыта заяўляю, што паміж імі ёсць 72 спаведнікі, якія вандруюць па свеце. І адзін з маіх сваякоў прывёў мяне ў секту, дзе я даў зарок, што не скажу клятвы, і выспаведаўся аднаму з тых, хто быў злоўлены. І даведаўся ад маіх старэйшых, што тыя 72 збіраюцца раз на год. І таксама яны верылі ў таго, хто закаваны ў ланцугі[3], і іх бог тады перад імі з'яўляўся; і я верыў у Люцыфера, што павінен адтуль вызваліцца і караляваць разам з намі. І яны не вераць у Найсвяцейшую Дзеву, што засталася некранутай і што была беззаганнай. Нашы старэйшыя бачаць нашага бога. Пасля таго, як гэта адбудзецца, нас падмацоўваюць, кажучы: "Будзьце мужнымі, нічога не бойцеся!" Таксама сярод іх былі такія, якія раней змывалі таінствы. Хросны сын Генрыка Шпітальнага, зяць Сіботана, Копач былі іх старэйшымі і спаведнікамі. Вашыя святары кажуць менш справядліва. Многія хацелі б убачыць нашага бога, як нашы старэйшыя бачаць".

Учора іх мацнейшыя былі спаленыя. Па-першае, яны не казалі клятваў. Па вечарах маліліся за свой ордэн, і за яўрэяў, і за ўсё сваю сям'ю, а значыць блюзнерылі.

---

[2] "На схіле жыцця" і "раней" могуць таксама быць перакладзеныя як "вечарам" і "раніцай". Невядома, ідзе гаворка пра час чалавечага жыцця ці частку дня. Аналагічная сітуацыя з "раніцай" у наступным сказе.

[3] Алюзія на Сатану з Апакаліпсісу 20, 1–3.

"Я і жонка мая спакойна былі ў гэтым ордэне, працавалі ў святочныя дні, адзначалі дні нашых апосталаў і да сваіх святых звярталіся і іх імёны асвячалі. Пасля пераезду было 4 галоўныя ва ўсёй секце сярод нас. Але дзе яны – я не ведаю. У вашы шлюбы ніякім чынам не ўступаюць. Таксама кажуць, што яны з роду Ізраільскага[4]. І пасля хрышчэння дзяцей наноў абмываюць".

Таксама казаў: "Ёсць іншыя людзі, горшыя за нас, якія мяса не ядуць, за што мы іх пераследуем". Яўрэям так не мае ахвоты шкодзіць, як і хрысціянам.

У гэтым усім выспаведалася і яго жонка.

3

Гэта прызнанні, зробленыя ў прысутнасці Уладара біскупа Цівалі Паўла:

Жонка Генрыка, схопленая за ерась, сказала, што была ў нейкай каморы з зернем і там практыкавала найгоршае і пакланялася Люцыферу. Таксама сказала, што была ў секце 16 гадоў. Таксама сказала, што спавядалася міранам. Таксама сказала, што яе дачка была ў секце год. Таксама прачытала нейкую малітву са Старога Запавету.

Таксама жонка Гертліна з Грэцы (Greci) выспаведалася ва ўсіх гэтых жа памылках. У дадатак дадала, што злучалася з сынам сястры, сынам брата і хросным бацькам.

Уладар Зіффрыд з Герлахшайма, варты даверу рыцар, сказаў, што той казаў у прысутнасці многіх: "Жонка Гертліна мне прызналася публічна, што ўступала ў сувязь з сынам свайго брата і з мужам сваёй сястры; што гэта пачуўшы, у твар ёй плюнуў. Таксама я чуў, што сярод схопленых ерэтыкоў адна ўстала, падбадзёрваючы астатніх і кажучы: «Найдаражэйшыя сыны, будзьце цвёрдымі, і калі мы будзем аддадзеныя агню, прызывайце такім чынам святых вуснамі, а не сэрцам, і бога вашага, які закаваны ў вогненныя ланцугі, у сэрцы вашым цвёрда трымайцеся!»".

Уладар Кіліян з Хугвіча, варты даверу і слаўны рыцар, казаў: "Уладару біскупе, я чуў ад Сіботана, цяпер спаленага, якога заўсёды лічыў вартым чалавекам, такія ерасі, што было варта яго спаліць 20 гадоў назад!"

4

Гэта прызнанні, зробленыя ў прысутнасці Уладара плябана горада Яна:

Удава таго з Пятровічаў прызналася, што сама заўсёды пазбягала казаць словы клятвы. Таксама, што мела спаведнікаў-міран, як і іншыя, якія верылі, што маюць больш улады, чым каталіцкія святары. Таксама, што гэтых спаведнікаў збірала ў сябе дома, і прымала, і ежай іх забяспечвала, і давала ім [тое, што патрабавалася ў якасці] пакаяння ці пакуты.

Ткачка Чусха (Czuscha) прызналася, што была ў секце, пазбягала клятваў і спавядвалася названым настаўнікам-міранам, якія вучылі, што мы не маем улады вязаць і развязваць, але яны маюць. Таксама казала, як і раней, што прапаведуюць так прасцякам, і спачатку "лёгкім" рэчам, згодным з [каталіцкай] верай, і нарэшце простым, і пакідалі проста, і нарэшце казалі: "Мы збіраем нашых чыстых на сход!". Калі ж новенькія прасцякі становяцца больш зацятымі, такім яны прадаведуюць больш глыбока. Таксама верыла супраць нашай веры. Таксама прызналася, што

[4] Падобныя ідэі можна сустрэць і ў інквізіцыйных пратаколах з Крэмса (Аўстрыя): "Нашых святароў называюць рымлянамі (Romaniolos), а сваіх жа – ізраэлітамі (Israelitiocos)" (Patschovsky, "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315," 171 н. 160).

названыя дактары даручылі ім, каб не ўступалі ў шлюб з чужынцамі, пад чужынцамі маючы на ўвазе хрысціянаў.

5

Гэтыя прызнанні былі зробленыя ў прысутнасці брата Конрада, Вроцлаўскага захавальніка, і брата Гунтара, чытача ў Свідніцы, Яна гандляра і іншых, вартых даверу:

Уладарка Соф'я, удава Германа са Шчэціна, перавернутая ў веру пасля спалення сваіх мужа і бацькі Сіботана прызнала ў прысутнасці пазначаных раней, што спаведнікі прыходзілі не радзей за два разы на год; што былі міранамі, якім усе з секты спадведваліся ў адным з іх дамоў. "З якіх два былі ў мінулы Вялікі Пост у доме майго бацькі Сіботана, якім я спавядалася з 12-і гадоў, не радзей за два разы на год, і таксама іншыя; і больш чым за ўсе астатнія грахі каралі нас [пастом] на хлебе і вадзе, калі мы казалі клятвы. Таксама спаведнікі навучалі нас верыць у Люцыфера" і г.д.

Выкладзена секта і допыт ерэтыкоў[5].

VII.i.c Апытальнік

Выданне гэтага апытальніка і гіпотэза аб яго прыналежнасці да Свідніцкага працэсу належаць Магдалене Агурэк. На мой погляд, наяўныя пратаколы допытаў не дазваляюць цалкам пагадзіцца з гэтым меркаваннем, бо ў іх адсутнічаюць адказы на большую колькасць пытанняў.

Перад апытаннем якога-небудзь ерэтыка спачатку трэба даць яму паклясціся, што без аніякага падману, няпраўды ці падвойных сэнсаў, а каб было зразумела тым, хто пытаецца і слухае, адкажа на пытанні. Пасля прынясення прысягі, калі [ерэтык] з'яўляецца пісьменным, трэба запытаць яго пра сімвал веры Анастазія, [неразборліва] наколькі выратавальным з'яўляецца кожны радок або артыкул. Далей, будзе ён пісьменным, ці непісьменным, павінен быць апытаны паводле наступных артыкулаў, але толькі пры ўмове, [неразборліва] калі клятва была надалей выдаленая.

"Ці верыш у Бога Усемагутнага, Айца, і Сына, і Святога Духа, і так у Тройцы ў адзінага Бога, што ён адзін быў творцам неба і зямлі, цялеснага і духоўнага, рэчаў бачных і нябачных, і ўсіх стварэнняў?

Ці верыш, што людскія душы не з'яўляюцца дэманамі ці злымі духамі, якія з нябёсаў зрынуліся?

Ці верыш, што Сатана і ўсе дэманы былі Усемагутным Богам справядліва асуджаныя на пекла і што ніхто з іх [неразборліва] не будзе памілаваны ні да Суда, ні пасля?

Ці верыш, што Усемагутны Бог, якому мы, хрысціяне, пакланяемся, варта і справядліва валадарыць на нябёсах, бо ніхто з дэманаў ці нейкіх іх людзей, хто не пакаецца ў тых грахах, якія мы, каталікі, называем смяротнымі, не ўзыйдзе на нябёсы, а нізрынецца і будзе заўсёды бясконца пакутваць у пекле?

Ці верыш, што душа таго, каго Хрыстос выратаваў, з пекла скіравалася на нябёсы, і што душы апосталаў, пакутнікаў, спаведнікаў, абраных нявінніц будуць з

[5] Patschovsky, "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315," 163–176.

Хрыстом валадарыць на нябёсах да дня Суда, і з Хрыстом прыйдуць у дзень Суда забраць целы свае і будуць адгэтуль бясконца з Хрыстом на нябёсах валадарыць?

Ці верыш, што тыя, хто з-за любові да Хрыста ўсё зямное пакінулі, жывых і мёртвых будуць судзіць на Судзе?

Ці верыш, што святыя за нас, жывых, і за ўсіх [неразборліва] у чыстцы могуць заступіцца?

Ці верыш, што малітвы, імшы і іншыя добрыя справы, а менавіта вігіліі, пасты, якія мы робім для памерлых вернікаў, ім карысныя?

Ці верыш ты, што душы, якія не маюць смяротных грахоў, але праходзяць праз агонь чыстца з-за прабачальных грахоў і праз гэта будуць ачышчаныя, і ўзнясуцца на неба?

Ці верыш, што найсвяцейшая Дзева Марыя ніколі не сыходзіла для пакарання ў пекла ці да месца ачышчэння, але і не толькі сама, але таксама і шматлікія святыя ў гэтым артыкуле, адразу пасля смерці ўзнясліся на неба?

Ці верыш, што мёртвыя перасяляюцца [неразборліва] добрыя да жыцця вечнага, благія да агню вечнага?

Ці верыш, што Закон Майсею быў дадзены Богам, а не Д'яблам?

Ці верыш, што Стары Запавет быў замешчаны Новым, але кожны з іх быў добрым у свой час?

Ці верыш, што хрышчэнне сапраўдных хрысціянскіх дзяцей адбываецца ў вадзе з прамаўленнем належных слоў, а не якім-небудзь іншым чынам, як быццам бы зменены да лепшага, і што цалкам і дасканала магчыма пахрысціць дзяцей у канкрэтным узросце, і што ў гэтай веры [неразборліва] у царкве?

Ці верыш, што праз пакаянне адпускаюцца грахі?

Ці верыш, што тыя, хто не хоча ўстрымлівацца, без граху могуць ужываць мяса?

Ці верыш, што смяротны грэх святара можа сапсаваць якое-небудзь таінства, якое ім здзяйсняецца?

Ці верыш, што кожная няпраўда не з'яўляецца смяротнай, і што клятва трыма сабакамі [неразборліва] не грэх?

Ці верыш, што свецкія суддзі не грашаць, калі справядліва асуджаюць свецкіх на смерць?

Ці верыш, што ўсе людзі павінныя працаваць, нават тыя, якія працуюць рукамі?

Ці верыш, што ніякі чалавек не здолее выратавацца сам, без міласцівай дапамогі Бога?

Ці верыш, што пасля Суднага Дня не будзе больш суцяшэння для асуджаных?

Ці верыш, што чалавек, якія валодае маёмасцю, можа выратавацца?

Ці верыш, што духоўнае багацце карыснае для вечнай узнагароды: удзел у штодзённых імшах і святочных імшах і складанне на іх ахвяраванняў?

Ці верыш, што пасты, паломніцтвы да святых месцаў, вігіліі і старанныя малітвы, пастаянныя споведзі маюць вялікую карысць для адпушчэння грахоў і для ўзнагароды вечным жыццём?

Ці верыш, што ёсць ачышчальнае [неразборліва] пакаранне?

Ці верыш, што Бог наш Ісус Хрыстос – адзінанароджаны Сын Божы, адзінаісны, роўны, сувечны Бацьку, які сапраўды атрымаў плоць і ўчалавечыўся з дапамогай Духа Святога праз Марыю, усё яшчэ беззаганную да родаў, падчас родаў і пасля родаў, і Ісус быў адначасова сапраўдным чалавекам і адзіным Сынам Божым, Богам і чалавекам, ахрышчаным Янам, якога Д'ябал спакушаў, Понцій Пілат укрыжаваў,

які спусціўся, мёртвы і пахаваны, за палоннымі душамі ў падземную геенну і выратаваў, і на трэці дзень уваскрос з мёртвых, як Бог і чалавек вучням сваім з'явіўся і пасля 40 дзён на вачах у апосталаў узнёсся на неба, і так самі апосталы прапаведавалі каталіцкую веру па ўсім свеце і даказвалі яе абгрунтаваннямі, уладай і належнымі знакамі?

Тую ж каталіцкую веру, якую яны так прапаведуюць, як і Святы Пётр спачатку ў Антыёхіі і затым у Рыме прапаведаваў і зацвярджаў, і яго спадкаемцы-апосталы і да сёння [гэтай веры] трымаюцца і спавядаюць, так і ты сам прызнаеш і цвёрда трымаешся і ніколі ад яе не адрачэшся?

Ці верыш, што ўсе Папы, спадкаемцы Святога Пятра, маюць такую ж уладу вязаць і развязваць, як меў Святы Пётр?"

Пасля таго няхай дасць другую клятву, што хоча падпарадкоўвацца Папу і ім прызначаным прэталам. Трэцюю клятву няхай дасць пра тое, што ніколі не будзе мець свядома блізкіх адносінаў з тымі, хто верыць у іншае, ні [неразборліва] малітваў ці салодкіх слоў іх, і што не праміне іх указаць і абвінаваціць, калі б пра іх не даведаўся і не выкрыў, і па імені назаве, і ніколі не будзе слухаць іх пропаведзей ні таемна, ні адкрыта.

"Ці верыш, што душы ніколі не паміраюць, хоць добрыя, хоць благія?"[6]

VII.i.d Дакументы з канцылярыі вроцлаўскага біскупа Генрыка з Вежбней (1302–1319 гг.)

VII.i.d.52 Націск і перасцярога супраць тых, хто ў месцах сходу каго-небудзь таемна вучыць

Прывітанне ў Госпадзе знаным мужам кіраўніком цэркваў Святой Марыі Магдаліны і Святой Елізаветы ў Вроцлаве ад Генрыка, Божай Міласцю біскупа. Зыходзячы з ускладзенага зараз на нас абавязку клапаціцца пра ўсеагульнае выратаванне, паводле слоў Апостала пра даўжнікоў мудрых і неразумных, наколькі нам звыш дазволена, настолькі належыць быць уважлівымі, каб мы выбралі зло з семені і дабро ў дабрачыннасці ахоўвалі. У гэты ж час таксама вельмі важна аддзяліць, калі мякіна пад выглядам дабрачыннасці пранікае ў Царкву, і Сатана ў анёльскім святле прыпадабняецца да анёлаў. Хоць навучанне і выкладанне пісьма і чытання не асуджаецца, а хутчэй ухваляецца, але аднак пісар..., які нядаўна ў Вроцлаў аднекуль прыбыў, адасобіўся, можа быць не беспадстаўна абвінавачаным у тым, што для выкладання навукі пісаць і чытаць выбірае сабе аддаленае месца і таемна праводзіць сходы, куды прываблівае моладзь і шкаляроў, публічных жа і пачэсных месцаў Вроцлава, абраных для школаў, не без цяжкага падазрэння ўхіляецца і пазбягае. Ці ж сапраўднай навуцы пісьма навучаюць у поцемках, бо згодна з запаветам ісціны, той, хто задумвае зло, ненавідзіць святло, раней мы рабілі навучанне вышэйадзначанаму пісьму законна і было прынята, што калі хто хацеў навучаць ці выкладаць згаданае майстэрства пісьма і чытання, не рабіў гэтага ў месцах забароненых і таемных, а абіраў якое-небудзь публічнае месца для школьнага кіравання і навучання. І такім чынам у выратавальнай перасцярозе памятаем пра шлях да пагібелі... мы, натуральна, кажам, настойваючы ў сваім намеры па забароне злачынных спраў у тым доме ў горадзе Вроцлаве, у доме... Грамадзянін Вроц-

[6] Ogórek, *Beginki i Waldensi*, 181–183, н. 124.

лава загадзя прадчувае, што моладзь і шкаляры склікаюцца ў патаемнае месца, мы вам давяраем і даручаем, каб вы, цвёрда накладаючы паслушэнства, ад нашага імя дзейсна засцераглі вышэйназваны горад ад пагібелі, каб яшчэ перад вігіліяй ... неадкладна згаданы скрыпторый з вышэйапісанага дома цалкам выдалілі, і ён туды ніякім чынам не можа быць вернуты. Звяртайце ўвагу, каб усе астатнія вашы парафіяне цалкам і публічна былі на нашым баку, а таго, хто будзе сам-насам у доме сваім такім чынам сходы рабіць, ... сурова стрымлівайце. Акрамя таго, дзейсна засцерагайце ад пагібелі ўсіх вашых шкаляроў у цэрквах вашых і ўсіх, хто на нашым баку, перасцярогі гэтыя выдавайце ўсім і публічна, каб перад згаданай вігіліяй згаданае Пісанне, якое не вельмі асцярожна для навучання выкарыстоўвалі, пакінулі далёка ўнутры, і каб яны ў аддаленых месцах не слухалі вышэйапісаных урокаў ці настаўнікаў. Звяртайце як мага больш увагі, каб які-небудзь пісар не збіраўся ў таемным месцы такім чынам з кім-небудзь для навучання. У адваротным выпадку з-за такога настаўніка ён сам, а таксама ўсе і кожны з таго патаемнага месца, хто ў яго навучаўся, будуць намі зараз жа адлучаны ў пісьмовай форме, і адлучаныя ўсімі знаёмымі будуць пазбягацца, мы падобным чынам пісьмова адлучаем вышэйназванага настаўніка і таго, хто дае яму прытулак, пра што вы публічна абвесціце, абвяшчэнне павінна адбывацца ўрачыста выключна ў дні нядзельныя і святочныя да таго часу, пакуль не будзе атрымана ад нас абсалютнае прабачэнне[7].

VII.i.d.64 Прысуд супраць ... за невыносныя ўчынкі

Паважаным і знаным мужам гасподнім, настаяцелям кляштараў, дэканам, абатам і прыёрам, архіпрэсвітарам і прэсвітарам, кіраўнікам і плябанам цэркваў, усім і кожнаму, хто размяшчаецца ў нашым горадзе Вроцлаве і вроцлаўскай дыяцэзіі, і да каго гэта паведамленне дойдзе, вечнае прывітанне ў Госпадзе ад Генрыка, Божай Міласцю біскупа. Паколькі мы клапоцімся і цікавімся тым, каб падтрымліваць тых, хто кіруе, і выправіць тых, хто перашкаджае развіццю дабрачыннасці. З-за гэтага калі ... супраць прэсвітара-вікарыя нашай кафедральнай царквы пра неўпарадкаванае жыццё яго даўно нам ад многіх вартых даверу паведамляецца, мы можам праявіць жорсткую непахіснасць, выносячы прысуд, і мінём гэта са спакойнай душой да таго разу, аднак таму такім жа чынам ... той, хто ідзе шляхам Ваала, сына Базорава, хто любіць празмерную ўзнагароду. Нядаўна нам паведамлялася пра відавочныя і добра вядомыя здарэнні, у абставінах прыніжэння веры і хрысціянскай рэлігіі для абароны ад тых, хто моцна падазраецца ў ерэтычнай заганнасці і хто ў гэтым быў абвінавачаны публічна, прызнаў, што разбэшчваў слова ісціны любоўю да часовых жаданняў: У прысутнасці вялікай колькасці вартых веры ў горадзе Вроцлаве і толькі ў царкве Святой Елізаветы, склікаўшы людзей абодвух палоў перад архідыяканам нашым Вроцлаўскім, а таксама сінодам, у сваёй пропаведзі, якую ён прамовіў у прысутнасці народа, хоць і не атрымаў дазволу ні на якія прапаведніцкія справы, паколькі хто не быў дасланы нашай уладай, не павінен атрымліваць права прапаведаваць, непачцівымі вуснамі пасеяў публічна пустыя словы, наколькі блюзнерскія і амаральныя, настолькі схізматычныя і вар'яцкія, што з-за яго ганьбы і нечысціні не толькі быў выгнаны, але і прымусіў жахнуцца ўсіх цнатлівых вернікаў, пры гэтым нехта з яго слухачоў, які быў спужаны з-за лёгкасці і схільнасці чалавека да граху, зваліўся ў прорву: Мы ж з-за сказанай ... загады нямілаці, што ён абуджае ў нас, будучы дабрадзеямі яго, маўчым, не хочучы

[7] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5, 40–41.

больш цярпець суровасці яго невыносных учынкаў, якія цяжка крыўдзяць Хрыста, мы з-за заклікаў нашага сумлення рэкамендуем пакараць яго. Такім чынам з-за ўсяго вышэйпададзенага мы, а таксама шматлікія іншыя, каму мы расказалі пра яго ўчынкі, старанна абмеркаваўшы і звярнуўшыся да мудрай парады сабора, вышэйназванага ... вікарыя ўсіх чыноў, якія б ён не меў у нашай вроцлаўскай царкве, пазбаўляем, і замацоўваем пастанаўленне ў гэтым пісьме, і ўсё ж такі выганяем яго з нашага горада Вроцлава і Вроцлаўскай дыяцэзіі, і ў гэтым месцы ён не будзе мець маёмасці ў будучыні, хаця спадзявацца на вяртанне можна вечна, усім і кожнаму з нашых падданых у сілу святога паслушэнства і пад пагрозай адлучэння сурова забараняем, каб у будучыні вышэйназванага ... дзе-небудзь ля сябе не трымалі і яму прытулку не давалі. Калі хто-небудзь у нашай дыяцэзіі будзе заўважаны ці выкрыты, хай небеспадстаўна баіцца пакарання пажыццёвым зняволеннем[8].

VII.i.d.69 Каб ерэтыкі і тыя, хто ім спрыяе, былі аб'яўлены адлучанымі (каля 1315 г.)

Паважаным мужам гасподнім... абатам... прыёрам... намеснікам/настаяцелям манастыроў... дэканам... архідыяканам... правінцыялам ордэна братоў прапаведнікаў... заступнікам братоў меншых, а таксама прыёрам і папячыцелям іх ордэна, і астатнім архіпрэсвітарам, прэсвітарам і ўсім царкоўным кіраўнікам, якія размяшчаюцца ў нашым горадзе Вроцлаве і дыяцэзіі і да каго дойдзе, вечнае прывітанне ў Госпадзе ад Генрыка, Божай Міласцю біскупа. Вераломства старажытнай змяі, распаўсюдзіўшы сярод роду людскога цяжкасці атруты, з раю людзей выгнала, і паклапацілася, каб узыход да славы нябеснай радзімы іх нашчадкам быў забаронены, пасля чаго большасць, горка наракаючы, што верылі, што чалавек можа ўзыйсці ў Яго царства, гаруе па ім, што той з-за свайго вераломства загінуў. Пазней па міласці Божай Сыну свайму загадаў узыйсці на крыж, каб нас зрабіў грамадзянамі анёлаў і кайданы д'ябальскага рабства зняў. Але вось ворагі, вяртаючыся да падступных хітрыкаў, прыбягаюць да такіх формаў, якія ў некаторых месцах нашай дыяцэзіі, пра што мы з болем паведамляем, бясшвовую туніку Гасподню, а менавіта царкоўнае адзінства, імкнуцца разарваць, і гэтым праўдзівую веру сапсаваць, і вернікаў намагаюцца заблытаць у сетку палону. Самі яны, у авечых скурах ваўчыную драпежнасць хаваючы, у той жа час даюць пацалунак міру як вікарыі Юды, душы няшчасных скідваюць у пекла. Таму дазволена прадпрыняць шмат розных захадаў, якія шматкроць разоў павялічваюць цяжар разнастайных [клопатаў], што ляжаць на нашых плячах, мы прызнаём, што працягнем займацца справамі, аднак пераважна абаронай і захаваннем веры нашай артадаксальнай і знішчэннем ерэтычнай заганнасці, рашуча выбіваючы з нас сонную нядбайнасць, і рупліва і старанна быць пільнымі вачыма нашага сэрца ... нам належыць. Бо мы павінны ўзвысіцца найвышэй у мужнасці над ерэтыкамі настолькі больш энергічна, настолькі больш ахвотна расколваючы і вернікаў далучаючы, наколькі большасць з нас можа зменшыць шкоду, што псуе каталіцкую веру ерэтычнымі заганамі.

Аднак таксама нядаўна многія ў Свідніцы інквізіцыяй, нашай кананічнай уладай у вялікай колькасці ў тым месцы ўсталяванай, і адзін у Нісе, доказы ерэтычнасці якіх былі сапраўды настолькі належнымі, наколькі неабвержнымі і вартымі асуджэння, што яны павінны былі быць пакараны. Аднак паколькі, як ужо было сказана, колькасць абвінавачаных у Свідніцы была настолькі вялікай, наколькі

[8] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5, 49–50.

дзе-небудзь у іншым месцы ў нашай дыяцэзіі пагібельна схаваных і такім чынам выжыўшых, мы напружана патрабуем і нагадваем пра неабходнасць вашай увагі, просім і звяртаемся да Госпада і нагадваем пра вызваленне ад усіх атрыманых грахоў, паколькі вы разам з намі кіруецеся да вынішчэння ерэтычных заганаў у гэтай самай нашай дыяцэзіі, у казаннях, у якіх кожны раз нехта з вас да народа імкнецца дастукацца, у сілу святога паслушэнства і пад пагрозай анафемы ўсім і кожнаму клапоціцеся пра больш строгую забарону, і загадзя выкрывае вышэйадзначаных гібельных, якія або ў доме сваім, або ў двары, або ў гаспадарцы сваёй закрываюцца і не выходзяць, або займаюцца з імі аптовым і дробным гандлем. І нават калі каго-небудзь з ерэтыкоў ці тых, хто верыць ім, пазнае, стараецца выявіць, каб мы яго выявілі, хто папраўдзе з ерэтыком, яго ўкрывальнікаў, вернікаў, абаронцаў і памагатых, і хто дае ім заступніцтва, дапамогу, параду ці месца, дзе схавацца, будзь то клірыкі ці міране, у якіх бы ўмовах ці статусе яны не былі, згодна з устанаўленнямі святога канона яны павінны быць публічна абвешчаныя адлучанымі ў вашых цэрквах, і абвяшчэнне зроблена толькі ў дні нядзельныя ці святочныя. Такім чынам, што запавет любіць, які вы адкрыта далі, і клопат у Госпадзе ваш мы можам па заслугах даручыць Хрысту[9].

VII.i.d.89 Працэс супраць тых, хто перашкаджае інквізітарам змагацца з ерассю

Генрык, Божай міласцю... Знаным мужам... І калі нас трымае неабходнасць прыбягаць да выдалення чыіх-небудзь злачынных хітрыкаў, нам належыць быць больш пільнымі, каб мы загадзя выкрылі беззаконне, што ўсё ж такі наша звычайная юрысдыкцыя і нашы пастарскія абавязкі ў прыніжэнні, а таксама асабліва тое, што будзе перашкаджаць росту каталіцкай веры і поспеху выратавання, і каб вартае асуджэння не засталося нявыпраўленым. Сапраўды, раней нашым непасрэдным абавязкам было выпраўленне таго, што павінна было быць выпраўленым, і знішчэнне ўсіх ерэтычных заганаў, якія спараджалі пакуты ў нашай вышэйназванай дыяцэзіі. Мы даслалі мужоў паважаных і знаных Магістра [скарочана] і нашага вроцлаўскага каноніка, а таксама брата, а таксама Магістра [скарочана], нашага капелана, і з імі шаноўнага брата ў Айцы Госпадзе Паўла з Ціверыяды (Thyberiadensi), вроцлаўскага біскупа, надаўшы ім у нашай дыяцэзіі ўсю паўнату ўлады наведваць, выпраўляць, і асабліва, як было раней сказана, вышукваць ерэтычныя заганы. Калі мы не можам самі зрабіць гэтага, іншыя ў справах нашай Царквы стрымаюць невуцкае. І калі тыя ж візітатары і інквізітары пачалі кананічна распытваць аб адхіленнях і асабліва аб ерэтыках. Вось з-за неправеднага беззаконня Дыцысій Мацье з Мільхема (Dycussius Mathie de Mulheym), грамадзянін Вроцлава, слуга, паколькі быў выкрыты яго ўдзел у многіх жахлівых бязбожнасцях, і ў тым, што ён спрыяў ерэтыкам, быў затрыманы інквізіцыяй. Сваім вартым пагарды і бязбожным языком супраць вышэйназванага магістра Ар., паважанага члена нашай вроцлаўскай царквы, і тым самым нават супраць нас саміх, адкрыў не толькі сваё блюзнерства і лаянку, але і бязбожнасць; з-за гэтага, а таксама за свой саўдзел у іншых бязбожніцтвах вышэйназваныя інквізітары прадставілі яго перад інквізіцыяй, учыняючы жахі, якія прыносілі не толькі менш цяжкія пакуты для цела, але і працягваліся таксама ў забойстве. Паколькі ўсё гэта было даведзена да нашага ведама, то мы не можам і не павінны пакінуць

[9] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5, 54–55.

гэта нявыпраўленым. Калі яны вінаватыя ў якой-небудзь правіне, яны павінны быць пакараныя. А за здзейсненыя названым Дыцысіем правіны і бязбожніцтвы мы прыгаворваем яго ў гэтым замацаваным [пячаткай] прыгаворным лісце да адлучэння і асуджэння. Падобныя кананічныя прысуды існуюць для ўсіх такіх жа выпадкаў, якія прама ці ўскосна перашкаджаюць інквізіцыйным судам, вышукам ці прысудам па справах ерэтычных заганаў, або тых, хто якім-небудзь чынам супрацьпастаўляе сябе справе веры, або хто прапаноўвае ім дапамогу, параду ці спрыянне, трапяць пад прыгавор адлучэння ў тым выпадку, калі будуць на працягу году ўпарціцца, то няхай ерэтыкі будуць пакараныя. Таксама калі хто будзе ўзброены сярод духоўных айцоў, наносячы ім шкоду сваёй кляцьбой ці абразай, кананічнай уладай будзе асуджаны. Гэтымі прадпісаннямі мы вам даручаем і даваяраем, каб вы, накладаючы цвёрда ў цноце паслушэнства, так абвясцілі перад народам публічна ў вашых цэрквах абавязкова ў дні нядзельныя і святочныя, што вышэйназваны Дыцысій па дадзеных прычынах адлучаны і асуджаны, каб яму ніхто катэгарычна не прапаноўваў ежу, ваду, прытулак ці які-небудзь законныя дзеянні; і каб гэта было неадкладна пасля атрымання гэтага прачытанага, а праз восем дзён паўторанага, у двух цэрквах у Кнігнічы і Хундэсвальдзе, каб яго па няведанню памылкова не прынялі назад, вы гэтага Дыцысія ад нашага імя рашуча пакарайце, публічна зачытваючы гэтае перасцеражэнне ў вашых цэрквах. Так ці інакш, няхай з гэтага часу ён усімі лічыцца адлучаным і святататнікам. Тым не менш супраць такіх злачынстваў, як сіманія, забойства, клятваадступніцтва і ліхвярства, і іншых, больш цяжкіх, якія публічна асуджаюцца, мы будзем праследаваць у судовым парадку[10].

VII.ii Була Папы Рымскага Яна XXII наконт усталявання папскай інквізіцыі ў Польскім Каралеўстве

У маі 1318 года Ян XXII, авіньёнскі Папа Рымскі, вядомы сваім зацятым змаганнем з рознага тыпу іншадумствам, асабліва з алхіміяй, ведзьмамі і ерасямі, напісаў некалькі лістоў, якія можна назваць пачаткам папскай інквізіцыі ў Польшчы. Лісты з амаль ідэнтычным зместам былі адасланыя біскупам кракаўскаму, майсэнскаму і оламаўцкаму[11], інквізітарам Перэгрыну Апольскаму з прапаведнікаў і Мікалаю Гіспадзінэту (Hyspodinet) з Кракава, з ордэна братоў меншых, Колдзе (Colde) з прапаведнікаў і Хартману Пільненскаму (Hartmanno Pilnensi) з ордэна меншых братоў[12], знатным асобам (пералічаныя пайменна) Каралеўства Багемія, усім службовым асобам Каралеўства Багеміі (безасабова), князю вроцлаўскаму, каралю Багеміі і маркграфу майсэнскаму.

Ян, Папа XXII, дасылае ... Кракаўскаму князю і біскупам пражскаму і оламаўцкаму і многім іншым, каб у частках каралеўстваў Багеміі і Польшчы з усіх сваіх сілаў дапамагалі ўзмацненню ўстаноў па вышуку ерасяў.
Дадзена ў Авіньёне на майскія календы 1318 г.

---

[10] *Codex diplomaticus Silesiae*, vol. 5, 72–74.
[11] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae*, vol. 6, 102–104.
[12] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae*, vol. 6, 101–102.

Ян, біскуп, слуга слугаў Божых, [дасылае] прывітанне і апостальскае бласлаўленне ўлюбёнаму сыну Знанаму Мужу... князю кракаўскаму. Калі мы кіруемся законам яўрэйскага айца ў Божай Царкве, мы, хоць і не маем у гэтым дастатковых заслугаў, абавязаныя адмыслова клапаціцца пра каталіцкую веру, і па меры сілаў усюды спрыяць яе ўзрастанню, а таксама адпаведнымі захадамі засцерагаць яе ад падступных інтрыгаў і падступных пастак і хлуслівых плутняў любых зламысных і заганных ерэтыкоў, а таксама іх вернікаў, спрыяльнікаў, абаронцаў і ўкрывальнікаў. Таму мы напаўняемся вялікім болем, калі чуем ці даведваемся, што нехта ўвіхаецца, каб гэту веру прыгнятаць якім-небудзь злом або намагаецца дазвання знішчыць вінаграднік Госпада Саваофа, то псуючы яе легкадумнымі нараканнямі, то перакручваючы лжывымі прыдумкамі або ж фанабэрыста зводзячы яе ў нішто. Безумоўна, не без горычы ў сэрцы мы даведаліся, што ў некаторых частках каралеўстваў Багеміі і Польшчы, і ў іх межах і на памежжы, а пераважна ў гарадах і дыяцэзіях Пражскай, Оламаўцкай, Кракаўскай, Вроцлаўскай і Майсэнскай да такой ступені яўна ўзмацніліся ерэтычныя памылкі нявер'я, што многія сышлі з прамога шляху праўды ў адваротны бок на бездарожжы памылак, самі сябе апаганіўшы рознымі і разнастайнымі ерасямі, сканструявалі механізм для гібельнага хістання муру артадаксальнай веры, і маюць намер зруйнаваць яе падманлівымі і лісіцынымі атакамі лжывых доказаў. Сапраўды, належыць нам усюды спрыяць выкараненню такіх несправядлівых намаганняў больш заўзята, бо чым больш згубна і на пагібель душаў мы вагаемся ў іх знішчэнні, тым далей яны распаўзаюцца і небяспечней пашыраюцца, калі толькі іх не знішчыць у самым пачатку. Мы больш пільна і дзейсна стараемся клапаціцца праз нас і іншых па набліжэнні таго, каб у тых гарадах і дыяцэзіях, гарадах і землях, дзе людзі быццам бы язычнікі, якія мяжуюць [з імі] і прагнуць далучыць [іх], любыя ерэтычныя памылкі былі вынішчаныя і цярновыя кусты рашуча вырваныя з коранем, а на іх месцы магутней і шчаслівей прарастала справа веры. З гэтай прычыны для выканання інквізітарскай службы паводле кананічнага ўстанаўлення мы загадзя паклапаціліся адправіць апостальскім лістом улюбёных сыноў братоў Колда і Перэгрына з прапаведнікаў і Артмана і Мікалая з ордэна меншых братоў, чыя цнота чысціні, як мы спадзяёмся, будзе даваць прыклад ладу жыцця, а іх вучонае красамоўства ўмацуе выратавальнае вучэнне ў месцах і землях названых дыяцэзій супраць ерэтыкоў і іх вернікаў, памагатых, абаронцаў і ўкрывальнікаў. Бо нават калі абавязак зямной улады – праследаванне злачынстваў тых, хто збочвае са шляху, аднак гэты абавязак таксама і перадусім нясе ў сабе і больш важны клопат, каб супраць ворагаў каталіцкай веры ўздымаўся меч больш суровага пакарання. Звяртаючыся да тваёй высакароднасці і спадзеючыся на неабсяжную глыбіню міласэрнасці Бога нашага, мы настойліва просім і заклікаем, а таксама наказваем табе апостальскім лістом, каб узважыўшы ў пабожных развагах, наколькі цябе і астатнюю шляхту і мажнаўладцаў цікавіць, вы надзелі панцыр веры дзеля ўхілення небяспекаў для яе і аперазаліся мужнасцю дзеля ўтаймавання зухвальства яе ворагаў. Мужна ўзбройцеся; каб не выглядала так, што вы не зважаеце на крыўду той, якой вы кіруецеся і якая кіруе вамі, наколькі ты зможаш, аддана паўстань на бой супраць гэтых ерэтыкоў, іх вернікаў, спрыяльнікаў, абаронцаў і ўкрывальнікаў; а таксама належным клопатам, падтрымкаю і парадаю дапамажы тым жа інквізітарам у даручанай ім пабожнай і выратавальнай службе, якая павінна быць паспяхова выкананая, бо з тваёй дапамогаю ды праз іх святое служэнне, дбайную руплівасць, нястомную апеку, і з Божай ласкі згаданыя гарады і дыяцэзіі, землі і мясцовасці будуць ачышчаныя ад

такіх пачварных пошасцяў, і ўзрасце там і ўзмоцніцца бляск каталіцкай веры ды ясней і ярчэй заззяе на славу Бога, на ўзрастанне, моц і павагу веры ў Яго. Сам жа ты ад Таго, Чыю справу робіш у гэтым краі, здабудзеш сабе незлічоную ўзнагароду, і можа быць узнесена ў хвале Гасподняй вартае імя тваё[13].

VII.iii Прысуд Стэфану з Вроцлава

У канцы XIV – пачатку XV ст. вроцлаўскі біскуп Вацлаў змагаўся з ерэтыкамі ў Аўстрыі, Чэхіі, Маравіі, Цюрынгіі, Брандэнбургу і на Памор'і. У рамках гэтай дзейнасці ў 1396–1398 гг. у Вроцлаве быў схоплены нехта Стэфан, чые 15 пунктаў веравучэння нагадваюць вучэнні Вікліфа і вальдэнсаў. Для дакладнага высвятлення яго вучэння спачатку былі запрошаныя асобы, абазнаныя ў "святой тэалогіі", і "іншыя вучоныя", а калі яны не здолелі даць рады – абат ордэна рэгулярных канонікаў Лудольф з Жаганя і магістр Ян са Штэрнберга, якія таксама пацярпелі няўдачу. Падкрэсліваецца, што Стэфан паказаў сябе неабазнаным у граматыцы і мастацтве вядзення дыспутаў у дэбатах з дактарамі Рымскай Царквы, але часта цытаваў вялікія ўрыўкі з Бібліі на памяць (характэрная рыса вальдэнсаў). У выніку, як ерэтык, які не раскаяўся і не адмовіўся ад сваіх памылак, Стэфан быў спалены.

1. Ён мае дух святы;
2. Ён, хоць і з'яўляецца міранінам, але пасланы прапаведаваць;
3. і не толькі ён, але і ўсялякі вернік ці ўсялякі добры хрысціянін;
4. Дзеці будуць выратаваны, нават калі памруць нехрышчонымі;
5. Любы праведны міранін можа адпускаць грахі і асвячаць Цела Хрыстова, не могуць толькі тыя, хто робіць благое;
6. Падчас таінства на алтары не сапраўднае, а толькі выратавальнае [далей у тэксце – містычнае] Цела Хрыстова;
7. Чысцец не існуе;
8. Не трэба пакланяцца ні святым, ні іконам;
9. Толькі нядзельная малітва прамаўляецца дзеля малітвы;
10. Ніхто не клапоціцца пра прадвызначэнне і статус Рымскай Царквы;
11. Благія прэлаты не маюць ніякай улады ў Царкве і
12. не трэба ім падпарадкоўвацца;
13. Адлучэнне недазваляльна;
14. Клясціся абсалютна недазваляльна;
15. Зло не ад Царквы[14].

[13] *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae*, vol. 6, 104–106.
[14] "Catalogus Abbatum Saganensium," 251–252.

VII.iv Мацвей Влашыч Ілірыйскі. Вытрымкі

Мацвей Влашыч нарадзіўся ў заможнай сям'і ў Ілірыі, за што атрымаў мянушку "Ілірыйскі" (Matthias Flacius Illyricus). Лютэранскі багаслоў, праціўнік каталікоў і кальвіністаў. Заснавальнік пратэстанцкай царкоўнай гістарыяграфіі.

У творах гэтага аўтара былі ўпершыню апублікаваныя звесткі з матэрыялаў допытаў Шчэцінскага інквізіцыйнага трыбунала 1392–1394 гг. На іх падставе, а таксама на звестках, атрыманых з іншых крыніц, аўтар дае найбольш раннія даціроўкі з'яўлення вальдэнсаў на нямецкіх, польскіх і чэшскіх землях, а таксама звесткі аб сувязях паміж рознымі тэрыторыямі. Апора гэтага аўтара на першакрыніцы і яго блізкасць па часе да апісаных ім падзей дае магчымасць выкарыстоўваць яго трактаты ў якасці крыніц па гісторыі вальдэнскага руху.

Каталог сведкаў праўды, якія пратэставалі супраць Папы да нашага часу (Catalogus testium veritatis, qui ante nostram aetatem reclamarunt Papae) (1556 г.)

Тыя ж [вальдэнсы], якія накіраваліся ў Ламбардыю, многія былі даведзены да смерці за выказванні сваёй сапраўднай рэлігіі, і сваю дактрыну шырока распаўсюдзілі. Бо па ўсёй Італіі, а таксама Сіцыліі іх вучэнне настолькі пашырылася, што імператар Фрыдрых II выдаў супраць іх пастанаўленне. Таксама ж у Германіі, а асабліва ў Эльзасе і ў наваколлях Рэйна, а таксама ў Багеміі, а адтуль далей у Саксонію, Сілезію, Маравію і Польшчу дактрына іх перад 300-і гадамі [маюцца на ўвазе 1300-я гады] пашырылася. У Ламбардыі ж у іх была школа або акадэмія сапраўднай тэалогіі Хрыста. Усё гэта мы можам праверыць па старых інквізіцыйных кнігах і некаторых менш таемных сведчаннях.

Інквізіцыя ў Багеміі і Польшчы супраць Вальдэнсаў была ўсталявана каля 1330 года Гасподняга, у часы каралявання Яна, калі, між іншым, былі сабраныя звесткі, што яны маюць звычку зносіцца з братамі з Ламбардыі. Іншай інквізіцыяй было выкрыта, што для навучання тэалогіі з Багеміі яны накіроўваюцца да сваіх настаўнікаў Вальдэнсаў у Ламбардыю, у тую школу ці акадэмію[15].

Споведзь Вальдэнсаў (Confessio Waldensium) (1558 г.)

У мяне ёсць інквізітарскія кнігі, напісаныя да 300-х гг. [маюцца на ўвазе 1300-я гады], у якіх паведамляецца, што ў Багеміі, Саксоніі, Сілезіі і Польшчы было шмат паслядоўнікаў Вальдэнскага вучэння, і гэта вучэнне мела паходжанне з Ламбардыі і цызальпійскай Галіі [як яе называлі рымляне]. Там я знайшоў, што тады багемцы мелі звычку пасылаць сабраныя грошы і вучняў для навучання ў школы тэалогіі[16].

---

[15] Flacius Illyricus, *Catalogus testium veritatis*, 719–720.

[16] Matthias Flacius Illyricus, *Confessio Waldensium de plerisque nunc controversis dogmatibus ante 134. annos contra claudicantes Hussitas scripta, nostrisque temporibus statui, ac rebus pulchre correspondens* (Basileae: Oporinus, 1568), https://www.digitale-sammlungen.de/de/view/bsb10193410? page=14, Scan 13–14.

VII.v Матэрыялы Пятра Цвікера (PROCESSUS PETRI)

Я ўжываю гэту назву як сукупную для спадчыны інквізітара Пятра Цвікера і яго паплечнікаў-інквізітараў, у першую чаргу Мацвея Пражскага. Прапанаваная яна была Пятром Білерам і падтрымана Рэйма Вялімякі (Reima Välimäki)[17]. Неабходна адзначыць, што дадзеныя тэксты сустракаюцца ў розных манускрыптах з вялікімі разыходжаннямі, што дазваляе нават прасачыць змены ў стаўленні да вальдэнсаў.

Паміж 1391 і 1403 гг. Цвікер дзейнічае як інквізітар ад Балтыйскага мора да Аўстрыйскіх Альпаў. Гэты аўтар вылучаўся з шэрагу сваіх паплечнікаў таго часу наступнымі асаблівасцямі: ён быў цэлесцінскім манахам, а не дамініканцам ці францысканцам, як большасць інквізітараў; не выкарыстоўваў катаванні, а аддаваў перавагу асабіста распрацаванаму спісу пытанняў, які дазваляў дакладна вызначыць, хто перад ім: прававерны каталік ці ерэтык; ён выразна адрозніваў люцыферыян (д'яблапаклоннікаў) ад вальдэнсаў[18] і не надаваў вялікага значэння шырока распаўсюджаным у той час абвінавачанням вальдэнсаў у прамі-скуітэце[19].

Яго пяру належыць маштабны антывальдэнскі (там сцвярджаецца, што "Вальдэнсы – пасланнікі Д'ябла") палемічны трактат "Пакуль людзі спяць" (Cum dormirent homines), напісаны ў 1395 г. (хоць у яго аўтарстве дагэтуль ёсць сумненні, да сярэдзіны XX ст. стваральнікам лічыўся канонік Пётр з Піліхсдорфа (Pilichsdorf)). Гэты "самы каштоўны пісьмовы помнік пра вальдэнсаў"[20], які ў свой час быў распаўсюджаны на тэрыторыі Аўстрыі, Чэхіі, паўднёвай Германіі і дайшоў да нас больш чым у 50-і манускрыптах, быў стандартам для палемічных трактатаў нямецкамоўнай прасторы ў XV ст.[21] І тым не менш ён не выдаваўся з 1613 г., для азнаямлення з яго зместам можна звярнуцца да артыкула Георга Мадэсціна[22] і дзвюх главаў кнігі Пятра Білера[23].

VII.v.a Кароткі спіс перавернутых Вальдэнсаў і пра іх побыт і лад жыцця (De vita et conversacione)

У годзе Божым 1391, 4 верасня, ніжэйзапісаныя былі кіраўнікамі секты Вальдэнсаў: першы Мікалай з Польшчы, таксама Ян з Польшчы, сын нейкага селяніна; таксама Конрад з Саксоніі, з горада, які называецца Дэрбрым, ля Вітэнберга, сын нейкага селяніна; таксама Ульрык з Хардэка[24], па прафесіі шавец; таксама Сымон з Галіча (Galitz, Gralicz, Galicz[25]) з Венгрыі, па прафесіі кравец; таксама той,

---

[17] Välimäki, *Heresy in Late Medieval Germany*, 105.

[18] Petreman, *Peter Zwicker*.

[19] Biller, "Bernard Gui," 36.

[20] Modestin, "The Anti-Waldensian Treatise," 237.

[21] Välimäki, "Transfers of Anti-Waldensian Material," 154.

[22] Modestin, "The Anti-Waldensian Treatise," 211–229.

[23] Biller, *The Waldenses, 1170–1530*, 237–269; 271–291.

[24] Невялікае паселішча на мяжы Чэхіі і Германіі на баку апошняй, у Сярэднявеччы там знаходзіўся замак. Зараз гэта прыкладна тэрыторыя нямецкага горада Нойальбенройт (Neualbenreuth).

[25] Захавалася шмат спісаў гэтага тэксту, якія нязначна разыходзяцца, падрабязна гл. Szymański, "*Articuli secte Waldensium*," 92.

хто працуе з воўнай[26], нейкі Ян з Дзікхарца, горада, размешчанага недалёка ад Крэмса ў Аўстрыі, які быў [схоплены] у Рэгенсбургу і насіў крыж абвінавачанага ў ерасі, але насамрэч яе не выракся[27]. Таксама Конрад з Гемеда ў Швабіі, сын нейкага селяніна. Таксама Герман з Містэльга ў Баварыі, рамеснік; таксама Мікалай з Плаўвэ [Плаўэна?], абаронца зямлі, сын нейкага млынара; таксама Готфрыд з Венгрыі, шавец. Таксама Зохес, названы "з Арэны" ў Баварыі, рамеснік. Таксама Мікалай з Салатурна з Эльзаца ля Берна ў Швейцарыі, кравец. Вышэйпералічаныя называюцца паміж сабой апосталы, настаўнікі і браты. Яны мелі такое жыццё і лад: спачатку яны пасцяцца тры ці чатыры дні на тыдні на хлебе і вадзе, акрамя тых, хто выпраўляецца ў цяжкую дарогу ці займаецца цяжкай працай, і так яны робяць са сваімі падначаленымі, каб сэрцы іх напаўняліся чысцінёй. Таксама сем раз на дзень моляцца; Старшы пачынае малітву і робіць яе доўгай ці кароткай у залежнасці ад таго, чаго мяркуе дасягнуць, і астатнія трымаюцца яго ў малітве. Таксама апранаюць яны сціплае адзенне і выпраўляюцца ў дарогу па двое, старэйшы з малодшым, які ідзе за ім. У словах яны сціплыя, падману і клятвы, а таксама брыдкіх слоў пазбягаюць. Старанна выхоўваюць у сваіх падначаленых неабходнасць быць уважлівымі і асцярожнымі. У большасці сваёй яны непісьменныя і неадукаваныя. Але дзейнічаюць яны разборліва і дасягаюць поспеху: Калі старэйшыя разглядаюць [кандыдатуру] якога-небудзь маладога, або народжанага ў секце, або выратаванага дабром, але галоўнае пакорнага і чыстага, аднак не звяртаюцца да таго, хто яшчэ дзіця ці хто толькі што пазнаёміўся або далучыўся да майстэрства; яго пакідаюць на будучыню. Тады выбіраюць для яго каго-небудзь з настаўнікаў, які будзе вадзіць яго з зямлі ў зямлю і з месца ў месца на працягу аднаго ці двух гадоў. Нарэшце, прывядзе яго да іх савета ці капітула, які мае звычку праводзіцца ў вялікім кірмашовым горадзе, куды прыходзіць шмат людзей, каб самі яны [вальдэнсы] паміж імі [прыйшлымі людзьмі] маглі схавацца. Усюды ходзіць у прысутнасці настаўніка, і тады пытаюцца пра тое, ці падабаецца яму такое жыццё і ці хоча быць адным з іх братоў, калі той адказвае "так", то ўваходзяць самі ў пакой ці ў іншае месца, дзе маглі б сабрацца ўсе настаўнікі і члены іх секты. Ён спавядаецца ва ўсіх сваіх грахах, тады самы разумны з іх праводзіць таінства і агучвае сем артыкулаў веры, у якія яны толькі вераць. Зрабіўшы гэта, пытаецца ў яго, ці верыць ён. Адказвае, што так; тады даручае яму прынесці сябе ў ахвяру і прысвяціць сябе чысціні да самай смерці. І той адказвае: так, я абяцаю рабіць гэта наколькі магу з Божай ласкі і наколькі мне дазволіць крохкая чалавечая натура. Далей абяцае, што не будзе багата жыць ад працы рук сваіх, але будзе жыць з міласціны да самай смерці і вандраваць блізка і далёка, куды ён будзе пасланы, не зважаючы на перашкоды. Таксама абяцае, што адмаўляецца ад вялікага даверу да бацькоў сваіх, і да ўсіх родных сваіх, і да яшчэ якіх-небудзь дамашніх. Таксама, што не павінен у хвіліны смерці ці небяспекі ратаваць сябе з дапамогай ілжывай клятвы. І пасля таго, як згодзіцца і ўрачыста паабяцае вышэйсказанае, тады ўкленчвае, і настаўнікі і старшыя ўскладаюць рукі яму на галаву, і праз гэта пацвярджаюць яго права прымаць споведзі ў падначаленых сваіх, і рабіць іншае, што звычайна робіцца. Пасля гэтага падымаецца і, падняўшыся, бачыць настаўнікаў, якія стаяць па парадку, і прымае ад кожнага з іх асобнае ўхваленне, і хто-небудзь з іх кажа яму: вітаем вас, добры

[26] Ткач або гандляр.

[27] Ерэтыкі, якія раскаяліся ў ерасі і вярнуліся ў лона Рымскай царквы, насілі на вопратцы нашыты крыж, які павінен быў паказваць іх ранейшыя злачынствы.

брат, цяпер ты пасвечаны ў нашу веру найвялікшых апосталаў. Між тым, ён вяртаецца праз шэсць, восем ці дзевяць гадоў, каб слухаць споведзі, ідучы ад зямлі да зямлі, аднак час ад часу ў выпадку неадкладнай неабходнасці слухае споведзі сваіх настаўнікаў. Таксама ёсць звычай амаль кожны год на невялікіх сваіх сходах змяняць людзей у іх кірунках [вандровак], каб не былі яны пазнаныя хрысціянамі, і ніхто не застаецца на пасадзе настаўніка ў адным месцы або на некалькіх месцах на адным кірунку на тэрмін большы, чым адзін ці два гады.

Таксама ёсць некаторыя артыкулы веры Вальдэнсаў, якія супярэчаць каталіцызму, і першае – гэта што выслухоўваць споведзі не трэба ні ў царкве, ні пасвечаным [у сан]. Прапаведуюць яны ў месцах таемных і прыватных. Таксама яны адмаўляюць чысцец, кажучы, што пасля смерці ёсць дзве дарогі для любога чалавека, што катэгарычна кожны альбо ўздымаецца на неба, альбо спускаецца ў пекла. Таксама [адмаўляюць] звон, вігіліі, імшы, міласціну і любыя іншыя царкоўныя дзеянні на карысць памерлых[28].

VII.v.b Доўгі спіс перавернутых Вальдэнсаў

Гэта былі настаўнікі ерэтыкоў-Вальдэнсаў і некаторыя іх вучні, якія цяпер дзякуючы Божай ласцы і міласці звярнуліся да каталіцкай веры. Першы Ян з Вены, таксама Клаўс з Брандэнбурга, таксама Фрыдрых з Хардэка, таксама Генрых з Энгельштата, які быў катаваны. Таксама Пётр з Сяміграддзя ў Венгрыі. Гэта тыя, хто пасля пераваротy сталі каталіцкімі святарамі. Адзін з каторых разам з іншым прэсвітарам, а таксама перавернутым вучоным, і іншыя два, імя аднаго Ульрык Паўр (Paur), а другога Конрад Вайтаў (Waythoff), гэтыя пяцёра былі забітыя за тое, што ад секты адвярнуліся. Таксама Якуб, які паходзіць з Буды ў Венгрыі. Таксама Мікалай з Верны, які раней быў кравец; таксама Конрад з Эрфурта, які раней быў шавец; гэта пасля свайго навяртання вярнуўся ў Эрфурт і ў прысутнасці ерэтыкоў са сваёй секты абвясціў свае памылкі, прапаведуючы ім сапраўдную веру Хрыстову, але ніхто не захацеў звярнуцца (у каталіцкую веру], акрамя яго сястры, якая была сястрой Мацвея, капелюшовага майстра з Вітэнбергу, аднак пасля, у Годзе Гасподнім 1391, доктарам Марцінам з Амберга [Марцінам Пражскім] і цэлесцінцам братам Пятром, усе ў Эрфурце былі пераканаыя, перавернутыя і пазначаныя крыжамі[29]. Таксама Ганс са Штырыі, сын ткача; ён таксама, як і вышэйназваны Конрад аб'явіў і авбесціў свае памылкі перад прысутнымі ў Эрфурце. Таксама Фрыц са Штайра, які раней займаўся з воўнай. Таксама Герман Штраўс, які быў сынам капелюшовага майстра. Таксама Ганс з Энса, які быў кавалём. Таксама Мікалай з Плаўэна, які быў чорнарабочым. Таксама Ганс Зімлер са Штырыі, які быў сынам нейкага селяніна. Таксама Ганс з Майнца на Рэйне, які быў краўцом, а зрабіўся манахам. Таксама Клаўс з Плаўэна, які быў вучоным, сынам апрацоўшчыка ільну, ён памёр два гады таму ў доме Маргарыты з Вітэнберга, дзе, будучы ерэтыком, наведваў школу. Вось 20 перавернутых, з якіх адны настаўнікі, а іншыя вучні, якія былі ў секце, а зараз усе звярнуліся[30].

---

[28] Döllinger, *Beiträge*, 367–369.

[29] Маюцца на ўвазе прыгавораныя да нашэння нашытых на адзенні крыжоў.

[30] Döllinger, *Beiträge*, 330–331.

VII.v.c Маніфест супраць Вальдэнсаў

Гэта – памылкі ерэтыкоў з секты Вальдэнсаў, якая існуе больш чым сто пяцьдзесят гадоў на землях Яго Светласці Уладара Герцага Аўстрыі, а зараз ёсць год Божы 1395, месяц верасень. Упарта пачала з неўтаймаванасцю полымя і жахам забойства не столькі таемна распаўсюджвацца, колькі нікчэмна і неразважліва ўсеабдымна панаваць пасля пакутлівай смерці найсвятлейшага прынца і Уладара Альберта і будучага, на жаль, пахавання наймілейшага Герцага Альберта[31]. І ёсць вялікая небяспека, што секта гэта надта будзе пашырана на шматлікіх каталікоў абодвух палоў, якія будуць спакушаны адпасці ад каталіцкай веры і смяротна заражаныя ерэтычнай атрутаю, калі не стане ў іх на шляху хрысціянскае войска.

1. Вышэйназваныя ерэтыкі Вальдэнсы маюць сваіх спавядальнікаў, а менавіта духоўна чыстых міран – ерэсіярхаў.

2. Таксама вераць, што права прапаведаваць ідзе толькі ад Бога, а не ад Уладара Папы ці якога-небудзь каталіцкага біскупа.

3. Таксама вераць, што яны – вікарыі апосталаў Хрыста і іх легітымныя спадчыннікі.

4. Таксама асуджаюць Рымскую Царкву за тое, што яна ў часы Папы Сільвестра прыняла, мае і імкнецца прыдбаць маёмасць.

5. Таксама вераць, што іх ерэсіярхі могуць вызваляць ад грахоў лепш, чым царкоўныя святары, нягледзячы на тое, што яны – прэсвітары, пасвечаныя Апостальскім Уладаром, ці на тое, што яны біскупам каталіцкім пасланыя.

6. Таксама, калі якім-небудзь прэсвітарам у царкве будуць выспаведаныя, Цела Хрыстова ад яго прымуць, у секце сваёй гэтага ніякім чынам не пакажуць.

7. Таксама з найвялікшай увагай слухаюць пропаведзі ерэсіярхаў, і вераць ім больш, чым царкоўным прапаведнікам, хоць тыя прапаведуюць таемна і ноччу, а гэтыя – адкрыта.

8. Таксама вераць, што Найсвяцейшая Дзева і іншыя святыя ў айчыне [нябеснай] настолькі напоўнены радасцю, што нічога не могуць задумаць пра нас.

9. Таксама вераць, што Найсвяцейшая Дзева і іншыя святыя ў айчыне [нябеснай] нічым не могуць нам дапамагчы.

10. Таксама кажуць і вераць, што мы не павінны клікаць іх [Дзеву і святых].

11. Таксама кажуць і вераць, што мы не павінны ўсхваляць іх [Дзеву і святых].

12. Таксама кажуць і вераць, што мы не павінны прыслужваць ім [Дзеве і святым].

13. Таксама кажуць і вераць, што яны не могуць маліцца за нас, і, паколькі гэта нескладана, посцяцца ў вігіліі Найсвяцейшай Дзевы і іншых святых, святы адзначаюць, але ўсё гэта робяць для выгляду, не ўспрымаючы ўсур'ёз, бо толькі Богу, а не святым, узносяць гонар і славу, і таксама не вераць у святую камунію.

14. Таксама ўсе ерэсіярхі і якія-небудзь вернікі не вераць, што канфірмацыя – гэта таінства, а ўжываюць толькі ўскладанне рук.

15. Таксама вераць, што пасля жыцця ёсць толькі дзве дарогі, і ніякага чыстца.

16. Таксама кажуць і вераць, што царкоўныя вігіліі, імшы, малітвы і любое іншае царкоўнае заступніцтва, што робіцца для памерлых, не можа служыць ім апо-

[31] Альбрэхт III (1349–1395).

рай, і, паколькі гэта нескладана, на імшах па памерлых ахвяруюць, хоць толькі ўсё робяць для выгляду, ці толькі дзеля хвалы Бога, а не для выратавання душы.

17. Таксама пахаванняў царкоўных не здзяйсняюць, але кажуць і вераць, што можна і трэба хаваць дзе заўгодна.

18. Таксама не вераць, што могілкі больш святыя, чым іншае месца, ці чым плошча пад сцяной, ці чым якая-небудзь зямля.

19. Таксама не вераць, што асвечаная царква больш святая, чым які-небудзь іншы звычайны дом.

20. Таксама не вераць, што асвечаны алтар больш святы, чым якая-небудзь куча камянёў.

21. Таксама асуджаюць і абвяргаюць царкоўныя спевы.

22. Таксама асуджаюць і абвяргаюць ігру на аргане.

23. Таксама кажуць і вераць, што кананічныя гадзіны не ў Божую хвалу.

24. Таксама кажуць, што ніякіх малітваў не патрэбна, акрамя "Ойча наш", і з гэтай прычыны ерэсіярхі ніколі не дадаюць "Вітай, Марыя".

25. Таксама асуджаюць і абвяргаюць пакланенне іконам.

26. Таксама асуджаюць і абвяргаюць прыкладанне да мошчаў.

27. Таксама асуджаюць і абвяргаюць індульгенцыі царкоўных прэлатаў.

28. Таксама асуджаюць і абвяргаюць паломніцтвы да святых месцаў.

29. Таксама асуджаюць і абвяргаюць свае адлучэнні.

30. Таксама кажуць і вераць, што Найсвяцейшы Айцец і Гаспадар наш Уладар Папа, у любы час, – галава і прычына ўсіх ерэтыкоў.

31. Таксама кажуць і вераць, што мы, усе каталікі – гэта ерэтыкі.

32. Таксама асуджаюць і абвяргаюць царкоўнае адзенне і ўборы.

33. Таксама асуджаюць і абвяргаюць любыя папскія рэгаліі.

34. Таксама кажуць і вераць, што можна маліцца аднолькава як у царкве, так і ў стайні або пуні, і ў царкве не лепш, чым дзе-небудзь.

35. Таксама асуджаюць і абвяргаюць нядзельныя працэсіі.

36. Таксама асуджаюць і абвяргаюць працэсіі цягам трох дзён перад Узнясеннем Хрыстовым.

37. Таксама асуджаюць і абвяргаюць працэсіі ў дні Цела Хрыстова.

38. Таксама асуджаюць упрыгожанні кветкамі, зелянінай, тканінамі і свяцільнікамі, якія робяць верныя Хрысту падчас працэсій у славу Божую.

39. Таксама кажуць, што [аддаваць] пяршыны – гэта пыха і ганарлівасць.

40. Таксама кажуць, што пасціцца чатыры разы – гэта не боскае, а чалавечае ўстанаўленне.

41. Таксама не вераць, што дрэва святога крыжа свяцейшае за любое іншае дрэва.

42. Тое самае адчуваюць да замацаванага пакланення цярновому вянку з галавы Уладара нашага Ісуса Хрыста.

43. Тое самае адчуваюць да жалезных цвікоў, якімі працялі найсвяцейшыя рукі і ногі Ісуса Хрыста.

44. Тое самае адчуваюць да той дзіды, якой працялі найкаштоўнейшы бок Хрыста.

45. Тое самае адчуваюць да таго бізуна, якім лупцавалі Ісуса Хрыста,

46. да слупа, да якога ён быў прывязаны,

47. да падвышэння, на якое ўзышоў,

48. да пурпуровай тунікі,

49. да розгаў,

50. да белага адзення,

51. да пахавання ўкрыжаванага Госпада.

52. Тое самае адчуваюць да святой зямлі Іерусаліма, Віфлеема, Назарэі і іншых святых месцаў

53. і да ланцугоў апосталаў і да ўсіх іншых знакаў страсцей святых пакутнікаў.

54. Таксама асвячэнне і пасвячэнне акалітаў, субдыяканаў, дыяканаў, прэсвітараў, біскупаў асуджаюць і абвяргаюць.

55. Таксама не вераць, што хрысцільная вада больш святая за якую іншую, і таму любая падыходзіць для хрышчэння.

56. Тое самае адчуваюць да апырсквання вадой,

57. да бласлаўлення солі,

58. пальмаў,

59. попелу і свечак,

60. да звону званоў,

61. да юбілейнага года

62. і да бласлаўлення ежы.

63. Таксама асуджаюць і абвяргаюць усіх святых манахаў і манахіняў, не важна, рэгулярных ці абсервантаў.

64. Таксама асуджаюць і абвяргаюць кафедральныя цэрквы і калегіі.

65. Таксама кажуць і вераць, што Апостальскі Прастол не мае большага аўтарытэту, чым просты святар.

66. Таксама асуджаюць і абвяргаюць усё прывілеяванае навучанне.

67. Таксама асуджаюць і абвяргаюць усе клятвы, як і наколькі б праўдзіва і абдумана яны не былі дадзеныя.

68. Таксама асуджаюць і абвяргаюць імператараў, каралёў і прынцаў, маркізаў, ландграфаў, герцагаў, баронаў, суддзяў, юрыстаў, прысяжных і прыставаў за любое забойства, наколькі б абдумана і справядліва яно не было зроблена.

69. Таксама асуджаюць і абвяргаюць Апостальскі Прастол за тое, што ён пасылае воінаў супраць сарацынаў і дае крыж або пропаведзь супраць якіх-небудзь язычнікаў.

70. Таксама асуджаюць і абвяргаюць тыя вартыя ўхвалення звычкі, калі верныя Хрысту лупцуюць сябе па прыкладзе апосталаў.

71. Таксама асуджаюць і абвяргаюць клерыкальную танзуру святароў, як свецкую, так і манаскую.

72. Таксама асуджаюць і абвяргаюць усе словы і выразы святых дактароў Аўгусціна, Іераніма, Грыгорыя і Амвросія і ўсіх іншых, за выключэннем толькі таго, калі што-небудзь гучыць для ўмацавання іх секты – такія, як [пра] празмерна дарагія будынкі, упрыгожаныя сцены, занадта пышныя пахаванні і ім падобнае.

73. Таксама асуджаюць і абвяргаюць імператарскія законы і царкоўныя каноны.

74. Таксама ўрачыстае асвячэнне храмаў і алтароў асуджаюць і абвяргаюць.

75. Таксама асуджаюць і абвяргаюць экзарцызм і іншыя малітвы, якія кажуць святары пры хрышчэнні дзяцей.

76. Таксама асуджаюць і абвяргаюць тыя справы міласэрнасці, якія святары і прэсвітары робяць, заклінаючы дэманаў, каб прымусіць іх выйсці з апанаванага чалавека.

77. Таксама кажуць і вераць, што ніякі чалавек пасля смерці Ісуса Хрыста не можа спыніць дэманаў.

78. Таксама не вераць, што споведзі, якія верныя Ісусу прамаўляюць перад святаром, – апора і рухаючая сіла.

79. Таксама кажуць і вераць, што ўсе словы святой імшы залішнія, і нішто для правядзення імшы не важнае, за выключэннем толькі слоў асвячэння і "Ойча наш".

80. Таксама кажуць і вераць, што святары, якія правяць імшу, грашаць столькі разоў, колькі кажуць і ўпамінаюць імёны святых.

81. Тое самае кажуць і адчуваюць, калі прэсвітар або іншыя верныя Хрысту кажуць і чытаюць або пышна здзяйсняюць літаніі.

82. Таксама вераць, што бласлаўленне агню ў Велікодную вігілію нядзейснае і пустое.

83. Таксама не вераць, што тканіна і плашчаніца, у якія было загорнута цела і галава мёртвага Хрыста, маюць духоўную каштоўнасць і святасць.

84. Таксама вераць, што няма ніякай карысці ў пышных пакланенні і ўкленчванні са спевамі перад крыжам Госпада нашага Ісуса Хрыста па пятніцах.

85. Таксама вераць, што секта Вальдэнсаў – адзіныя верныя хрысціяне.

86. Таксама вераць, што ўсе каталікі асуджаныя, за выключэннем немаўлят.

87. Таксама называюць каталікоў "падземны свет", "сусвет", "іншыя", "чужыя".

88. Таксама называюць сябе, сваіх паплечнікаў па секце ці цесна з імі звязаных "вядомымі".

89. Таксама вераць, што асуджаныя ў пекле ўсе святыя душы: Лаўрэнцій, Мікалай, Марцін, Іеранім, Амвросій, Аўгусцін, Грыгорый, Бернард, Хрызастом, Бенедыкт, Францыск, Дамінік, Антоній, Вінцэнт, Кацярына, Маргарыта, Даратэя, і менш вядомыя святыя, пакутнікі, спаведнікі, дзевы, якія не згаданыя ў Бібліі, і ўсе клірыкі.

Гэтых ерэтычных асуджаных артыкулаў трымаюцца, вераць і прымаюць усе як адзін ерэсіярхі Вальдэнсаў, але іх вернікі залежна ад сваіх магчымасцяў больш ці менш. Такім чынам, няхай уважліва сочаць і сэрцам супераджываюць найсвяцейшыя ў Госпадзе нашым Хрысце Папа, кардыналы, патрыярхі, архібіскупы і біскупы, абаты і іншыя царкоўныя прэлаты, дактары і настаўнікі, непераможныя ўладары ў каталіцкай веры каралі і прынцы, і вялікі герцаг Аўстрыйскі, на падуладных якому землях ерэтыкі сёння спрабуюць гвалтоўна ўладарыць. Бо раней напярэдадні ночы нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі спалілі гумно плябана ў Штайры, таго, што ў сваім доме са сваёй сям'ёй[32] прыняў, абагрэў і накарміў інквізітараў ерэтычнай заганнасці, і на дзвярах горада або абшчыны Штайра падвесілі галавешку і акрываўлены нож на драўлянай ручцы, жадаючы такім чынам абараніць сваю ерась. Вось таму няхай усе каталікі будуць пільнымі і з болем да сэрца прымаюць, стаяць на абароне, пастаянна працуюць, каб усе нягодныя ерэтыкі, якія падпальваюць і забіваюць пастыраў, былі схопленыя, выпрабаваныя, пакараныя і да адзінства каталіцкай веры зноў прызваныя[33].

---

[32] Магчыма, што спаліў з усёй сям'ёй унутры – Ли, *История инквизиции*.

[33] Döllinger, *Beiträge*, 305–311.

VII.v.d Псеўда-Піліхсдорф

Доўгі час лічылася, што гэты тэкст належыць аўтарству Пятра Піліхсдорфа, але апошнія даследаванні Р. Вялімякі дазваляюць выказаць абгрунтаванае меркаванне, што ён быў напісаны ў асяроддзі Пятра Цвікера (а, магчыма, і ім самім) каля 1395 г.

Да мноства выратаваных; сказана супраць тых самых Вальдэнсаў.

Але відавочна, што ты, ерэтык-Вальдэнс, маеш мала вернікаў для вечнага асуджэння, але я пакажу табе людзей, народы і мовы, дзе міласцю Божай усе каталікі і ўсе людзі захавалі абарону ад тваёй віны, а менавіта Англія, Фландрыя[34], Брабант, Галандыя[35], Вестфалія, Данія, Швецыя, Нарвегія, Прусія і Кракаўскае каралеўства амаль зусім не маюць Вальдэнсаў. Як ты можаш быць паслядоўнікам вучняў Госпада, чыё вучэнне міласцю Божай ва ўсіх краях невядомае, калі Апосталам сказана: "Па ўсёй зямлі праходзіць іхні гук, і па край сьвету словы іхнія" (Пс 18:5). Такім чынам, ты – не той добры пастыр, пра якога сказаў Уладар "Пастыр Добры аддае жыцьцё сваё за авечкі" (Ін 10:11). Чаму вы ўпарціцеся з авечкамі ў Цюрынгіі, Марке, Багеміі і Маравіі, дзе міласцю Божай ужо на працягу больш двух гадоў каля тысячы чалавек ерэтыкоў-Вальдэнсаў звярнулася да каталіцкай веры? Чаму не прыйдзеш да Аўстрыі і Венгрыі, дзе ёсць надзея на інквізіцыю ерэтычнай заганнасці, па выніку чаго больш чым тысяча тваіх вернікаў былі вырваныя з пашчы Левіяфана? Нідзе не чаканыя, заўсёды ў выгнанні, і бедныя прасцякі ў сваіх пакутах пакінутыя. Я смела кажу, што калі тваё вучэнне сапраўднае, то табе павінна быць лёгка ўсюды яго прапаведаваць. Дык вось, а твае ўгаворы падманныя, таму і даводзіцца табе з асцярожнасці хавацца[36].

VII.v.e Працэс супраць вальдэнсаў Заходняга Памор'я, 1392–1394 гг.

VII.v.e.1 Апытальнік

Працэс Уладара Пятра з ордэна цэлесцінцаў, інквізітара ерэтыкоў.

Дзе ты народжаны? Хто твой бацька? Хто твая матка? Яны таксама былі вядомыя [саманазва Вальдэнсаў]? Яны ўжо памерлі? Дзе яны пахаваныя? Хто цябе прывёў? Хто табе расказаў? Колькі ты ў секце? Дзе ты ўпершыню выспаведаўся ерэсіярху? Дзе быў той дом? Якім быў узрост, у якім ты ўпершыню выспаведаўся? Калі, дзе і колькі разоў ты ў сярэднім спавядваўся? Дзе і калі ты яму апошні раз выспаведаўся? Якія яны, тыя, каго ты паважаеш і лічыш людзьмі добрымі і святымі, і што ідуць па зямлі Апостальскай дарогай, і што маюць уладу ад Бога прапаведаваць слова Божае, слухаць споведзі, накладаць пакаянні і адпускаць грахі лепш, чым царкоўныя святары, ці нароўні з імі? Ці паважаеце Вы святароў, пасвечаных якім-небудзь Папам ці каталіцкім біскупам, ці імшы, якія імі праводзяцца? Што табе накладалі ў якасці пакаяння? Колькі "Ойча наш" па буднях? Колькі па святах? Таксама "Вітай, Марыя" ці Сімвал веры? Калі і колькі пасціцца? Ці прымаў ты гэта пакаянне? Ці верыў, што будзеш праз яго вызвалены ад граху? Ці спавядаў-

---

[34] Указана два разы, як Flammigia і Flandria.

[35] У крыніцы – Garlandria.

[36] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 261–262.

ся ў гэтым святару ў царкве? Ці прымаў Цела Хрыстова? Ці раскрываў гэтую секту? Ці забаранялі табе раскрываць гэтую секту ці не? Колькі разоў слухаў пропаведзь ерэсіярхаў? Хто прапаведаваў і хто быў прысутны? Дзе і калі прапаведвалі? Колькі разоў прымаў іх, карміў, дапамагаў? Колькі грошай ім даваў? Што чуў і ведаў пра зварот да святых? Ці могуць яны за нас заступіцца, клапоцяцца ці ведаюць нас? Ці посцішся ты перад днямі святых і ці адзначаеш святы? Калі святкуеш, то ў гонар каго святкуеш, згодна з ерэтыкамі? Ці маеш Апостала [за асабістага заступніка]? Калі яго свята? Хто прапаведаваў пра гэта? І ты з гэтым згодны? Ты молішся за душы памерлых? Ці верыш ты ў царкоўныя пахаванне, святую ваду, бласлаўленне солі, зёлак, пальмаў, попелу, свечак, асвячэнне цэркваў, алтароў, могілак, арнатаў, Папскіх інсігній, пакланенне іконам, царкоўныя спевы ці арган, біццё ў званы, працэсіі па нядзельных днях, просьбы, літаніі, паломніцтвы, царкоўныя індульгенцыі, мошчы святых, косці, убранне, крыж Гасподні, цярновы вянок, цвікі, дзіду, пугу, Труну Гасподню, Запаветны Край, таінства канфірмацыі, манаскія ордэны, прывілеяванае навучанне, танзуру, пасвячэнне святароў, малітвы ў царкве, царкоўнае начынне, усеагульную споведзь – што ўсё гэта святое і каталіцкае? Ты верыш, што ўсялякае забойства з'яўляецца грахом? Ты верыш, што любая клятва з'яўляецца грахом? Ты ўжо быў раней пад следствам інквізіцыі? Ты быў выкліканы ці з'явіўся на суд па ўласнай ініцыятыве? Ты кляўся казаць праўду? Ты быў прызнаны ерэтыком? Якое пакаянне было на цябе накладзена інквізітарам? Ты насіў крыж [на вопратцы], дзе, калі, як доўга? Колькі разоў пасля гэтага ты спавядаўся, дзе і калі? Ці адрокся ты перад інквізітарам або плябанам ад сваёй секты? Ці быў пры гэтым прысутны натарыус? Ці былі прысутныя сведкі? Ці быў ты прыгаворан да спалення, калі паўторна занепадзеш? Ці верыў, што твая секта сапраўднай веры хрысціянскай, а іншыя, хто па-за ёй, асуджаныя? Ці прывёў ты каго-небудзь у секту? Ці казаў ты, што твае таварышы – гэта "спазнаныя", гэта значыць "kunden", а іншыя – гэта чужыя, гэта значыць "frömden"? Ці хочаш ты вярнуцца ад чыстага сэрца і веры не падманнай да адзінства маці Царквы каталіцкай і Рымскай? Ці хочаш ты ў гэтым паклясціся? Ці хочаш ты больш ніколі не прыходзіць і не вяртацца ні да якіх размоў з сектантамі? Ці хочаш ты прыняць публічнае і таемнае пакаянне? Ці хочаш ты быць аддадзеным пакаранню агнём, калі назад упадзеш? Ты хочаш быць яму аддадзеным, калі табе пакаянне не дапаможа, калі выявіцца, што ты казаў няпраўду на дазнанні? Ці хочаш ты паабяцаць, што з-за гэтай прычыны не будзеш помсціць? Ці хочаш ты адрачыся ад секты Вальдэнсаў і ад усіх ерасяў цяперашніх і будучых? Ці хочаш ты без прымусу трымацца каталіцкай веры? І так далей. Гэта апытальнік[37].

VII.v.e.2 Пратаколы

Кунэ Конрад з Грыфенхагена (Cune Conradi de Gryfenhagen), народжаны ў секце, 40 гадоў

22 лістапада 1392 года, каля 9 гадзін, у ацепленым пакоі, размешчаным у памяшканні вышэйназванай Шчэцінскай курыі, у прысутнасці вышэйназванага Уладара інквізітара Пятра добраахвотна здаўся Кунэ Конрад з Грыфенхагена, дыяцэзіі Камень Паморскі, падазраваны ў ерасі, і абвінавачаны, і на гэтай падставе неадкладна вусна выкліканы названым Уладаром Інквізітарам, і дапытаны, ці не хоча паклясціся казаць праўду, адказаў, што так, і сапраўды пакляўся, дакра-

[37] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 73–75.

нуўшыся Святых Евангелляў Божых, і перахрысціўшыся па форме і згодна з усталяваным звычаем.

Такім чынам ён пакляўся і быў дапытаны, калі і адкуль нарадзіўся, адказаў, што ў названым мястэчку Грыфенхагене, і што бацьку яго звалі Генрых Конрад, а маці Елізавета, і былі яны з секты Вальдэнсаў і памерлі ў ёй, і што вышэйназваныя бацькі казалі яму, што не павінен клясціся, праклінаць і іншых зямных рэчаў пазбягаць. І што першы раз ён прыйшоў на споведзь да ерэсіярха ў бацькоўскім доме, калі яму было 12 гадоў, а зараз ён ужо знаходзіцца ва ўзросце 40, і ў прысутнасці бацькі выспаведаўся ерэсіярху два разы; пасля вандраваў па свеце на працягу дзесяці гадоў, падчас якіх ні разу не спавядаўся ерэсіярху; пасля вярнуўся ў Грыфенхаген і зноў быў зазваны ў секту праз сваю маці, і там яны былі ўжо 18 гадоў, падчас якіх спавядаўся не радзей за адзін раз на год, каля двух разоў у сваім доме і калі-небудзь ля Шчэціна ў доме Ганса Рудзінгера. Быў запытаны, кім лічыў іх, напрыклад, спаведнікамі сваімі або ерэсіярхамі, адказаў, што святымі людзьмі, якія прыйшлі на месца апосталаў, але ніколі не лічыў іх святарамі. Быў запытаны, якое пакаянне на яго накладаў, адказаў, што некалькі дзён посту, 10 ці 20 на вадзе і хлебе, і часам на піве і хлебе, і маліцца 50 "Ойча наш" кожны дзень і 100 па нядзелях, але не "Вітай, Марыя", і што трымаў гэта пакаянне і верыў, што атрымаў адпушчэнне і што пакаянне было карыснае для выратавання. Быў запытаны, ці спавядаўся таксама святарам у царкве і ці прымаў Цела Хрыстова, адказаў, што так, кожны год, каб не паказаць, што ён у секце, бо гэта было забаронена.

Быў запытаны, колькі разоў слухаў іх пропаведзі, напрыклад, ерэсіярхаў, адказаў, што каля чатырох. Быў запытаны, ці звяртаўся да Найсвяцейшай Дзевы Марыі і астатніх нябесных святых, і ці верыў, што па малітве яго дапамогуць, адказаў, што звяртаўся, аднак верыў угаворам ерэсіярхаў, што не павінен да іх звяртацца, бо яны настолькі поўныя шчасцем, што гэта немэтазгодна. Быў запытаны, ці маліўся за душы памерлых верных, адказаў, што не, бо яму казалі, што пасля гэтага жыцця нічога няма, акрамя як дзвюх дарог, і ніякага чыстца, і верыў у гэта, а таксама ў іншае, чаму яго навучалі. Быў запытаны, ці верыў, што секта яго сапраўднай каталіцкай веры, па-за якой ніхто не выратуецца, адказаў, што так, бо так казалі яго ерэсіярхі. Інквізітар перайшоў да іншых артыкулаў.

Быў запытаны пра сваіх таварышаў і ці прывёў ён каго, адказаў, што нікога не прывёў, і назваў толькі сваю жонку Люцыю; таксама назваў удаву ўказанага Рудзінгера і іншую ўдаву, названую з Сучына (dy Suczyne); таксама назваў жонку ткача Пятра Цэрнава, якая не была ў секце, па імені Кацярына. Таксама назваў у Гарчы Ганча Санцэ з жонкай, таксама ў вёсцы пад назвай Лындаў назваў Дэнэка з жонкай, які быў братам Ганса Рудзінгера са Шчэціна. Таксама быў запытаны, ці хоча вярнуцца ад усяго сэрца і без усялякага падману і крывадушша да сапраўднай каталіцкай веры святой маці Рымскай Царквы і ў ёй жыць і памерці, паводле таго, як запаветаў Бог, адказаў, што так. Таксама адрачыся ад сектантаў і пераследаваць іх, наколькі гэта магчыма, і данасіць пра іх прэлатам і г.д., таксама, што хоча прыняць публічнае і таемнае пакаранне і што ад яго не адмовіцца і г.д., таксама, што аддае сябе пакаранню рэнегатаў, калі зноў упадзе, што не будзе ўдзельнічаць і г.д., таксама, што хоча сябе аддаць, калі пакаянне і адпушчэнне яму не дапамогуць, калі ён вернецца [у секту] і г.д., таксама, што не будзе помсціць ніякаму чалавеку словам ці справай, сам ці праз іншых, таксама быў запытаны, ці хоча адрачыся ад секты Вальдэнсаў і ўсіх ерасяў і трымацца згаданай раней каталіцкай

веры святой маці Рымскай Царквы, адказаў па кожнаму артыкулу асобна, што так, і сапраўды адрокся, дакрануўшыся Святых Евангелляў Божых, і перахрысціўшыся па форме і згодна з усталяваным звычаем. Тады вызвалі яго ў парадку, выкладзеным раней, і прызначылі тэрмінам наступную суботу, каб з'явіцца для атрымання пакаяння[38].

Жанчына

Была запытаная, ці звярталася да Найсвяцейшай Дзевы Марыі і іншых святых і ці верыла, што па малітве яе дапамогуць, адказала, што не, што нейкі раз верыла, а нейкі не, і што пакінула абраных ёю апосталаў Філіпа і Якуба і больш не шанавала іх ... і што сумняецца, што душы святых памерлых знаходзяцца на небе.

Была запытаная пра таварышаў і ці прывяла каго, адказала, што нікога, але са значэннем дадала, што павінны хутчэй збіраць, чым адпускаць[39].

Герман Рудэгер

Быў запытаны, якімі іх [ерэсіярхаў] уважае, адказаў, што вызначанымі і прызначанымі Богам да праслухоўвання споведзі і адпушчэння грахоў, і абранымі апосталамі Божымі, аднак не ўважаў іх за прэсвітараў, прызначаных біскупамі і пасвечаных.... Быў запытаны, ці чуў і верыў, што трэба звяртацца да святых, адказаў, што чуў, што належыць звяртацца і пакланяцца толькі Богу, і гэтаму верыў, аднак звяртаўся да Найсвяцейшай Дзевы Марыі па сваіх патрэбах[40].

Жанчына

Была запытаная, ці малілася за душы памерлых дабрадзеяў, адказала, што так, аднак не верыла ў чысцец пасля гэтага жыцця, але што Бог іх вызваліць з пекла. Была запытаная, ці акрапляла сябе жывой вадой і ці верыць, што гэта дапамагае, адказала, што так, і рабіла, каб не быць заўважанай[41].

Кацярына

Была запытаная, ці малілася за мёртвых і ці верыць, што ім гэта карысна, адказала, што так, але чула, што не карысна і няма чыстца пасля гэтага жыцця, чаму яна, аднак, не верыць, бо не цалкам добрыя не змогуць увайсці ў царства нябеснае ... Была запытаная, ці верыла, што іх секта з'яўляецца адзінай хрысціянскай, адказала, што так, аднак не верыла, што іншыя, якія робяць дабро, павінны быць асуджаныя[42].

Герман Госсаў

Такім чынам, пакляўшыся, быў запытаны наконт тых публічных ганебных чутак, якімі зганьбаваныя сярод народа ў дыяцэзіі Каменя Паморскага ерэтыкі, называныя Вальдэнсамі, хоць інквізітар і ведаў адваротнае з некаторых звестак і вопыту, ці маліўся калі-небудзь у сваім жыцці Люцыферу і ці верыў, што гэтага Бога належыць паважаць і яму маліцца, і ці меў калі-небудзь звесткі, што хто-небудзь з яго секты калі-небудзь яго паважаў ці маліўся, адказаў, што такога не рабіў і не чуў, каб які-небудзь іншы чалавек так рабіў. Таксама быў запытаны, ці чуў калі-

[38] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 79–80.
[39] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 82.
[40] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 85.
[41] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 86.
[42] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 87.

небудзь, каб людзі з секты збіраліся ў каморы ці ў іншым падземным месцы і там, змяшаўшыся, аддаваліся пажадлівасці, і ці прысутнічаў ён сам калі-небудзь пры гэтым, адказаў, што не, наадварот, адчувае агіду да такіх нікчэмных і агідных рэчаў, калі хто-небудзь з людзей пра такое лжыва расказвае. Таксама быў запытаны, ці атрымліваў звесткі пра каго-небудзь з секты ці сам рабіў, што змывалі з толькі што ахрышчаных дзяцей прынятае хрышчэнне, адказаў, што лічыць, што зрабіць такое немагчыма, каб святасць, атрыманая пры хрышчэнні, магла быць нейкім чынам змытая, і дадаў, што той, хто ў такое верыць, з'яўляецца пыхлівым і несумленным. Быў запытаны, ці чуў, ці сам рабіў, каб клалі вялікія пальцы на вочы, каб не бачыць Цела Хрыстова, адказаў, што ніколі не чуў такога, наадварот, верыць, што тыя, хто такое кажа, проста лгуць пад прысягай, і што, як інквізітар ведае, названыя артыкулы не датычацца секты Вальдэнсаў; таму, апусціўшы іх, ён [інквізітар] вярнуўся да прапанаванага [апытальніка].

Быў запытаны, кім ён іх [ерэсіярхаў] лічыць, адказаў, што добрымі людзьмі, якія правільна навучаюць, і на гэтым не спыніўся, а ці яны святары ці міране, не лічыў іх святарамі, прызначанымі біскупамі, бо не бачыў, каб яны праводзілі імшы[43].

Малады Гейнэ Вільтэр

Быў запытаны, ці верыў у бласлаўлёную ваду, соль, попел і г.д., адказаў, што верыў, што гэта добра – бласлаўляць хлеб, і што больш апырскваў сябе святой вадой летам, чым зімой, каб халадзіць сабе твар, а не каб нейкія грахі з сябе змыць. Быў запытаны наконт царкоўных убранняў святароў, біскупаў і іншых, ці могуць яны іх мець без граху, адказаў што не, і дадаў ад сябе наконт гучных спеваў у царкве, што лепш маліцца моўчкі, чым так раўці. Быў запытаны, ці верыў ён, што яго секта мае сапраўдную хрысціянскую веру, адказаў, што так, і што ўсе, хто існуе па-за ёй, павінны быць асуджаныя, і што Папу, імператара і ўсіх суддзяў духоўных і свецкіх аддае Д'яблу.

[Верыў, што Люцыфер – брат бога і што не належыць клясціся trwen][44]

Якаў Гільдэбрант

Быў запытаны, колькі разоў прымаў ерэсіярхаў, адказаў, што чатыры і што зрабіў для іх найлепшае што мог.

Быў запытаны, ці звяртаецца з малітвай да Найсвяцейшай Дзевы і іншых святых на нябёсах і ці верыць, што яны маліліся за нас і ведалі, што яго трывожыць, адказаў, што не, бо з-за паўнаты шчасця не могуць паклапаціцца пра нас, і што мае Апостала Святога Якуба, і быў пасвечаны ў Белыне, і пасціўся перад святамі апосталаў у гонар Бога, але таксама і Апостала, бо яго да гэтага падштурхнулі казанні яго плябана[45].

Зібэ Гутвільтэр

Быў запытаны, якія накладалі на яго пакаянні, адказаў, што 50 "Ойча наш" і 100 па нядзелях, але не "Вітай, Марыя", але што яму сказалі, што гэта Добрая Вестка, а не грэх, калі будзе казаць ["Вітай, Марыя"], і каб пасціўся па пятніцах і 9 разоў па сярэдах трымаўся на піве і хлебе, і што трымаўся пакаяння настолькі добра, наколькі мог, але баяўся, што не цалкам пратрымаецца, і верыў, што вызва-

[43] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 88–89.
[44] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 92.
[45] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 113.

лены, калі пасля не стане горшым, чым быў да таго, і спадзяваўся, што пакаянне прывядзе яго да выратавання.

Быў запытаны, ці таксама спавядаўся святарам і прымаў Цела Хрыстова, адказаў, што так, але не казаў, што спавядаўся ерэсіярхам, бо гэта было яму забаронена.

Быў запытаны, ці слухаў іх пропаведзі, адказаў, што так. Але не ведае, колькі разоў, і што адзін раз іх збіраў, і тады ў яго дома ён са сваёй сям'ёй і іншымі прышлымі яму [ерэсіярху] спавядаліся, і што даваў яму есці і піць, але не даваў яму грошай, акрамя яго згодна з тэстаментам сваёй жонкі Цілс аддаў плашч памерлай, які каштаваў 2 маркі, і што вадзіў іх ад Марыні да Сольдына і назад, і па навакольных вёсках, і ў Бернвальд і г.д.

Быў запытаны, што было ў іх вучэнні наконт звароту да святых, адказаў, што загадвалі трымаць пост перад алтарамі святых у славу Божую і ў іх памяць, але не пакланяцца ім, але толькі Богу, бо на небе няма нікога, акрамя Бога, які ведае сэрцы людзей. Быў запытаны, ці звяртаўся да Найсвяцейшай Марыі і святых і ці верыў, што яны маліліся за нас і ведалі, што нас трывожыць, адказаў, што не, бо яны настолькі поўныя радасці ад Бога, што не могуць ні ведаць ні маліцца за нас, і што пасціўся перад днямі сваіх апосталаў Сымона і Юды і іншым у гонар толькі Бога, але не святых, і рабіў гэта для таго, каб не быць выкрытым, што ён з секты, і так быў прызнаны правільна веруючым. Быў запытаны, ці маліўся за памерлых і ці верыў, што ім гэта будзе карысна, адказаў што так, маліўся за ўсіх, хто варты Божага суцяшэння, і верыў, што пасля смерці ёсць толькі дзве дарогі, аднак спадзяваўся на чысцец, і што ахвяраваў на імшах за памерлых не для выратавання душ, а для славы людзей, каб не быць выкрытым, і збіраў грошы для ўлагоджвання плябана.

Быў запытаны, ці верыў у бласлаўлёную ваду, соль, попел і г.д., адказаў, што не верыў, што яны змыюць з яго нейкія грахі, [але верыў, што] яны лепшыя, чым натуральныя, бо даўжэй захоўваюцца і могуць захоўвацца непашкоджанымі, і асуджаў тых, хто прызначае ім кошт і праз гэта грашыць, і лічыць, што так людзі грашаць. Быў запытаны, ці верыў, што адлучэнні каму-небудзь шкодзяць, адказаў, што быў навучаны і верыць, што не; у індульгенцыі таксама зусім не верыць.

Быў запытаны, ці верыў, што кожная клятва – гэта грэх, адказаў, што верыў, што казаць trwin для пацвярджэння праўды не грэх, але для падману так і г.д.

Быў запытаны, ці верыў, што злачынцаў можна забіваць без граху, адказаў, што верыў, што яны павінны быць забітымі не суддзёй, а сваімі грахамі[46].

Удава Грыта Хавершэ

Таксама, што [ерэсіярхі] наклалі на яе для пакаяння, што спачатку 100 "Ойча наш" і па нядзелях 200, але не "Вітай, Марыя", але яна яе сама казала па звычцы[47].

Грэта

Была запытаная, ці звярталася да Найсвяцейшай Марыі і святых, і ці верыла, што яны могуць за нас маліцца, адказала, што Найсвяцейшая Дзева можа, астатнія не ... Была запытаная, ці верыла, што злачынцаў можна забіваць без граху, адказа-

[46] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 119–120.
[47] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 134.

ла, што не, але чула таксама, як казалі яе таварышы, што хочуць маліцца за тых, хто іх пераследуе, і каб іх не каралі[48].

Кюнэ (Cuene) Хутвільтэр

Быў запытаны, кім ён іх [ерэсіярхаў] лічыць, адказаў, што тымі, хто можа адпусціць яму грахі лепш за прэсвітараў, ад Бога, а не ад Папы ці ад біскупаў, але не лічыць іх за прэсвітараў.

Таксама верыў, што ўсе клятвы – грэх, як і словы trwn для пацвярджэння праўды, але меншы. Таксама ці верыў, што трэба маліцца як-небудзь інакш, чым праз "Ойча наш", адказаў, што не[49].

Меттэ Дзёрынгішэ (Mette Döryngische)

... і што дала яму адзін раз 2 маркі, бо раней прыняла ад яго чаравічкі, і дачка яе дала 11 солідаў, такім чынам яму хацела за гэта вярнуць.

Таксама не верыла, што адлучэнне можа душы пашкодзіць, аднак трэба быць асцярожным, каб не быць праз людзей увязнёным. Таксама верыла, што аднолькавае значэнне маюць пахаванні ў полі і на могілках...[50]

Гайнэ Байер (Heyne Beyer)

Таксама лічыў, што лепш чытаць імшы, чым спяваць. Таксама ўборы святароў і біскупаў лічыў помпай. Таксама ў індульгенцыі зусім не верыў, у паломніцтвы ў Рым ... Таксама не верыў, што цалаванне мошчаў вызваляе. ... Таксама не верыў у працэсіі з рэліквіямі ...[51]

Герман Герварт

Таксама не верыў, што бласлаўлёная вада, соль і г.д. маюць большую каштоўнасць, чым іншая вада і г.д., акрамя хрысцільнай вады...[52]

Петыр Баер

Таксама не верыў у індульгенцыі і паломніцтвы, юбілейныя гады і адлучэнні, і таксама зусім не верыў у мошчы святых, у тым ліку і ў іх пацалаванне: і лічыў, што лепш служыць Богу сам сабе ў сэрцы, чым праз царкоўныя спевы. Таксама, што не маліўся за мёртвых і не верыў, што гэта можа быць ім карысна, таму што тыя, хто на небе, не маюць патрэбы, а тым, хто ў пекле, гэта не дапаможа; і не верыў, акрамя як на зямлі праз ліхія гадзіны і пастом можна ачысціцца, а пасля гэтага жыцця ніяк; і што ахвяраваў на імшах за памерлых для сяброў, але не для таго, каб душам дапамагчы, лічыў, што пахаванні мёртвых на палях ці на могілках раўназначныя; і не лічыў ніякія царкоўныя заступніцтвы карыснымі, бо было забаронена. Таксама лічыў кожную клятву грахом, бо было сказана Збаўцам: "не прысягай зусім" (Мф 5:34). Таксама не верыў, што злачынцы могуць быць забітымі без граху. Быў запытаны, ці верыў, што яго секта мае сапраўдную веру, адказаў, што так, і пры гэтым верыў, што кожны з яго секты будзе выратаваны, і з гэтай прычыны

---

[48] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 123–124.
[49] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 147–148.
[50] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 154–155.
[51] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 155–156.
[52] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 157.

называў нас "dy vremden", бо мы, такім чынам, не маем добрага запаветнага вучэння, і справы больш вядомыя Богу[53].

Грэта/Маргарыта

Таксама ў Сімвале веры пасля казанняў не трэба казаць "Прызнаю"[54].

Цілсс (Tylss)

Таксама не верыла, што належыць пакланяцца іконам і мошчам святых і спяваць den leyse[55], бо гэта грэх і ідалапаклонства[56].

Мехтыльд

Таксама верыў, што кожная клятва – грэх, таксама злачынцаў не могуць забіваць па суду без граху. Таксама верыў, што ўсе суддзі духоўныя і свецкія будуць асуджаныя за суд, які яны здзяйсняюць, і за ўладу[57].

Маргарэта

Таксама, што трымае іх [ерэсіярхаў] за братоў, а не святароў, бо не пасвечаныя ... таксама, што да святых і Найсвяцейшай Марыі не звярталася, бо не верыла, што яны змогуць дапамагчы, бо ў Найсвяцейшай Марыі няма ўлады, як і ў святых... Таксама, што малілася для сваёй уласнай душы, а не памерлых...[58]

Ганс Рубаў з Селхава, карчмар

Быў запытаны, ці яго жонка і іншыя людзі з секты ... спавядаліся ерэсіярхам, якія паміж сабой называюцца братамі, адказаў, што гэта аб'явіў яму яго дзядзька ... калі служыў вышэй названым знатным людзям, і што сказаў яму для падбадзёрвання, ад благога жыцця служачы знатным, распісваючы шчыты, але лепей бы было, калі б трымаўся ладу жыцця сваіх сяброў ...

Быў запытаны, ці спавядаўся калі-небудзь ерэсіярхам, адказаў, што не, аднак названы вышэй яго бацька і жонка з-за мацярынскага інстынкту спрабавалі прымусіць яго выспаведацца, ... і што [іншае імя] за гэта там быў адлучаны, бо не спавядаўся ерэсіярху. Таксама дадаў, што паколькі чуў, што ерэтыкі гэтай секты падвяргаліся страшным нападкам з боку каталікоў, таму спавядаўся толькі прэсвітарам, як робяць разам іншыя каталікі. Таксама дадаў, што сваёй жонцы не забараняў спавядацца ерэсіярхам, бо не верыў, што яна дрэнна робіць, і таму сам не выдаваў, бо верыў, што гэта зло, але паколькі некаторыя з сектантаў былі абвінавачаныя, то ён збег не з-за пачуцця віны, а з-за споведзі.

Таксама, што ніколі ў сваім жыцці ні ад каго не чуў, што не трэба звяртацца да святых і Найсвяцейшай Марыі. Таксама Апостала не меў, і верыў, што яму могуць дапамагчы толькі Бог і Найсвяцейшая Марыя, яго маці, бо святыя настолькі поўныя радасці, што нам не могуць дапамагчы, і паколькі ў гэта верыў, таму да іх не звяртаўся, і ўсяго іншага трымаўся з ерэтыкамі, акрамя споведзі, і што пасціўся і святкаваў [дні] святых у славу аднаго толькі Бога, а не святых. Таксама, што ма-

---

[53] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 172–173.
[54] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 197–198.
[55] Песня, якую спяваюць пры пераносе мошчаў. Reima, "More Powerful than Mere Matter?" 244.
[56] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 199.
[57] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 201–202.
[58] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 203.

ліўся за памерлых, хоць і верыў, што ёсць толькі 2 дарогі пасля смерці, а чыстца няма[59].

Беата

Таксама, што трымалася і лічыла іх [ерэсіярхаў] сапраўднымі і добрымі людзьмі, і што адзін раз на год двое з іх ходзяць у рай, і там атрымліваюць ад Бога ўладу лепш за святароў адпускаць грэх, і не лічыць іх святарамі, бо не бачыла, каб яны праводзілі імшы...[60]

Кацярына

Таксама, што трымае іх [ерэсіярхаў] за святых людзей, лепшых за святароў, якія атрымалі ад Бога права адпускаць усе грахі, і што, выспаведаўшыся ім вусна, трапіць на неба, і праўдзе вучаць лепш, чым святары, аднак не такія, як яе плябан... і што моцна смуткавалі, калі хто-небудзь спавядаўся ў вялікіх грахах... і што аднойчы была ў Рыме, і тройчы ў Аахене, двойчы ў крыві Гасподняй[61] і г.д., хоць яе за гэта і асуджалі, кажучы ёй, што гэта ўсё праходзіць, і небам не зацвярджаецца, і што ёй належыць лепш служыць Богу дома... і што няма чыстца, акрамя як які ачышчае несправядлівыя языкі людзей... таксама, што цалавала ў Рыме мошчы святых, не слухаючыся ў гэтым ерэсіярхаў, і пасвяціла гэта паломніцтва свайму бацьку, для вызвалення яго душы[62].

Грэта

Была запытаная, кім іх [ерэсіярхаў] лічыць, адказала, што яны паходзяць ад таго, што Гасподзь сказаў "ідзеце па ўсім сьвеце" [скажонае Мк 16:15], і што маюць уладу прапаведаваць, слухаць споведзі, адпускаць грахі і накладаць пакаянні лепш, чым святары, і што яны лепш за царкоўных прэсвітараў, і што раз на сем гадоў яны прыходзяць у рай, каб паслухаць там мудрасць, і што праз розныя пакуты, праз палі бітваў, праз цярноўнік заўсёды па двое ходзяць ... але сказала пра святую ваду, што застаецца свежай даўжэй іншай вады пасля асвячэння[63].

Якаў Хокман

Пасля таго, як ён прынёс клятву, ён быў запытаны, што ён рабіў і як да яго дайшла вестка пра ліст, дасланы Уладаром Інквізітарам свайму плябану праз Фікке (Fikke) з пячоры Вовізер (Wowiser)[64]. Ён адказаў, што аднойчы нядзельным днём, калі ён сядзеў у сябе дома і стрыг валасы, за ім паслалі, каб ён прыйшоў на могілкі, дзе яны акружылі названага пасланца, не дазваляючы яму ўвайсці ў касцёл і дзе ад яго самога патрабавалі, каб ён учыніў ім суд па ім, і што ён сам ад [імя гэтых] паноў павінен быў бы арыштаваць Фікке, бо той прынёс ліст ад інквізітара, і што ён сам аддаў (гэта) на вырашэнне згаданых, якія акружылі пасланца на могілках, а менавіта Рудэрбэке (Ruderbeke), Сыбекура (Sybecura), яго дзядзька/стрый Гайнэ Гокман (Heyne Hokman), Пётр Меўс (Peter Mews) і яго жонка, Клаўс Лівэндаль

---

[59] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 203–205.
[60] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 207–208.
[61] Горад Вільснак (сённяшні Бад-Вільснак у Брандэнбургу, Германія), які пасля 1383 г. стаў адным з самых папулярных паломніцкіх цэнтраў па ўсёй Еўропе, дзякуючы тром госціям, на якіх цудадзейным чынам праступіла Кроў Хрыстова.
[62] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 209–210.
[63] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 222–223.
[64] Магчымы варыянт перакладу: "з Вялікага Вовізера".

(Clauss Livendal), Ганс Грабаў (Hans Grabaw), і што калі ён сам патрабаваў паручальніка за 30 копаў, Фікке даў як паручальніка свайго брата Кунэ Мельсава (Cune Melssaw) і Пятра Меўса, да таго часу, пакуль не паручыўся Клаўс Гіркен (Clauss Gyrken), які даў яму лісты. І таму, гэтага не ведаючы, Гэненг Ігэн (Henneng Ygen) быў накіраваны плябанам па пасланца да захавальніка, які трымаў пасланца, і што потым нічога больш не было зроблена і не запатрабавана ад пасланца ці паручальнікаў, калі толькі не тое, што ён з'явіўся ў суд, калі прыйшоў тэрмін і сам паставіў Сібекурава суддзёю, і той запатрабаваў перад ім з боку паноў 30 памянёных копаў, і калі прыйшлі паручальнікі і сказалі, што хочуць стаць [перад судом], ён сам распусціў іх і сышоў, кажучы: Не магу больш і г.д. Аднак паручальнікаў ён не адпусціў і не звольніў. Таксама, што Сыбе Каўрава (Sybe Cavraw) тады ён ведаў як ерэтыка, і не выспавяданага [пакаранага] альбо вызваленага інквізітарам, калі яго самога паставіў замест сябе суддзёй, і што перад ім той зрабіў прапанову пра 30 копаў, і што той паручыўся і што дзеля гэтай парукі былі пастаўленыя паручальнікі.

Таксама датычна другога ліста, дасланага інквізітарам і парванага перад плябанам з пячоры Вовізер, што пасля таго, як сам яго прачытаў ці хацеў прачытаць перад алтаром, Сыбе Кураў спрабаваў яго выхапіць, і сам хацеў яго паглядзець, бо чуў, што ў лісце ўтрымліваюцца дрэнныя звесткі пра яго адзінаўтробнага брата Гайнэ Гокмана, Сыбе Курава, Рудэрбэке, Ганса Гокмана і многіх іншых, і тады сышоў са свайго дома і схаваў на могілках, і ў прысутнасці плябана сказаў і прачытаў, кажучы, што яны ўсе ерэтыкі, такім чынам што ўсе тыя, хто тады слухаў, як ён чытаў, і сам таксама там знаходзіўся, і таксама ў другім названым лісце ў Марыні быў згаданы, і што плябан у той час у іх прысутнасці праводзіў для іх боскую [імшу].

Быў запытаны, хто былі тыя сяляне або людзі, якія адмовіліся прыйсці, калі былі выкліканыя, адказаў, што Сыбе Караў (Sybe Caraw), Рудэрбэке і Клаўсс, яго брат, і Гайнэ Змервыкель (Smerwykel), і Ганс Гокман, яго бацька, і яго сястра, жонка Пятра Меўса па імені Метта, якая сышла перад тым, як яе муж прыйшоў да інквізітара, а пасля вярнулася, і пасля гэтага зноў сышла, і так збегла з Гансам Гокманам, бо муж не хацеў з ёй заставацца, што пасля добрых чатырох ці пяці дзён даведаўся, што хочуць сысці, і што пра гэта даведаўся мясцовы суддзя Геннынг Эйгенэр (Hennyng Eygener), які сказаў ім, што калі яна не хоча заставацца, то можа сыходзіць[65].

Звароm da Познаньскай дыяцэзіі

У імя Божае Амінь. Год ад яго нараджэння 1394 дзень 12 месяца сакавіка, другога індыкта, пантыфікату найсвяцейшага ў Хрысце айца і ўладара нашага Уладара Баніфацыя Божай воляй IX, у Шчэціне, і таксама ў доме Яна Папендорфа, дэкана Найсвяцейшай Марыі, каля дзявятай гадзіны, брат Пётр, правінцыял братоў ордэна цэлесцінцаў у Германіі, інквізітар ерэтычнай заганнасці ў звароце да братоў у Хрысце ўладароў архібіскупаў і біскупаў пражскага, любушскага і камень-паморскага, пастанавіў: Паколькі ў дыяцэзіі Камень-Паморскай больш чым 400 ерэтыкоў абодвух палоў з секты Вальдэнсаў выявіў, дапытаў, выкрыў і наклаў пакаянне, сярод якіх чатыры ніжэйпазначаныя асобы былі знойдзеныя не ў названай, але ў Познаньскай дыяцэзіі, і не будучы раўнадушным як да душаў названых асоб, так і сапраўднай каталіцкай веры ўвогуле, мяркуючы, што з-за блізкасці названых дыяцэзій ужо перавернутыя лёгка могуць скаціцца назад у ерась, якой выракліся, калі

[65] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 233–234.

ерэсіярхі будуць наведваць ерэтыкоў з суседніх дыяцэзій, то ў прысутнасці свайго брата Мікалая з Вартэнберха, прафесара ордэна цэлесцінцаў, Аўгусціна Мікалая з Тангліна, клірыка і грамадскага натарыуса Камень-Паморскай дыяцэзіі, і многіх іншых людзей абодвух палоў, і, безумоўна, мяне, яго пісара, і службовых асоб інквізіцыі пакляўшыся, што будзе скіроўваць названага Уладара біскупа, яго інквізітараў ці каго-небудзь яшчэ, бо ён [не жадае] ажыццяўляць ніякага абмежавання і ўрону або за штосьці брацца, што выходзіць за межы дзеянняў, накіраваных на збаўленне душаў і якія ўваходзяць у яго абавязкі перад Усяленскай Царквой. Апрача таго, ёсць сведчанні, што біскуп познаньскі не мае намеру гэтым займацца, што ён уважае гэта за нявартую справу і мяркуе, што яна будзе выканана інквізіцыяй[66].

Ганс Шпігільман

Добра ведаў "Вітай, Марыя" ... Быў запытаны, ці звяртаўся да Найсвяцейшай Дзевы Марыі і іншых святых на [нябеснай] Радзіме, адказаў, што цвёрда верыў, што Найсвяцейшая Дзева была беззаганнай дзяўчынай, але да яе і святых не звяртаўся...[67]

Кацярына

Таксама, што спрабаваў падвесці да веры ўгаворамі, і праз слуханне казанняў да споведзі, але не атрымалася, хоць і намагаўся; і яна б выспаведалася, калі б тое днём было, але ўначы яна была моцна спалоханая адсутнасцю святла ў тым месцы, дзе сядзела[68].

VII.v.f Артыкулы секты Вальдэнсаў

"Артыкулы секты Вальдэнсаў" (Articuli secte Waldensium) былі запісаныя ў 1393 г. інквізітарамі Марцінам Пражскім і вышэйадзначаным Пятром Цвікерам. Гэты тэкст з невялікімі рэгіянальнымі асаблівасцямі меў хаджэнне ў вялікім рэгіёне Памор'я – Германіі – Аўстрыі – Чэхіі – Сілезіі. Яраслаў Шыманьскі вылучае нават асобны ад нямецка-аўстрыйскага і пражскага сілезска-лужыцкі тып, што толькі падкрэслівае актуальнасць вальдэнскага пытання на тэрыторыі Польшчы ў вызначаны перыяд.

Тут прыведзены спіс вальдэнскіх памылак з манускрыпта, знойдзены ў бібліятэцы Семінарыі г. Пелпліна (побач з Гданьскам), былога цыстэрцыянцкага кляштара. Кодэкс датуецца 1394 г., але мог быць створаны і крыху пазней, на мяжы XIV і XV стст. На 45 лісце кодэкса прыводзіцца спіс з 15-і памылак (апошняя неразборліва):

Ліст. Далей змешчаны артыкулы ерэтычнай секты Вальдэнсаў.

Першае, што малітвы, пасты, міласціны, царкоўныя святкаванні і іншыя добрыя справы такога плана толькі перад Богам, а не перад Найсвяцейшай і Бездакорнай Маці Божай Марыяй ці іншымі святымі належна ўзносіць хвалы, славу і гонар.

Другое, што пасля гэтага жыцця няма ніякага чыстца, але толькі два шляхі: добрыя [людзі кіруюцца] неадкладна да вечнага жыцця, а дрэнныя – да смерці.

---

[66] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 235–236.
[67] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 236–237.
[68] Kurze, *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*, 250.

Трэцяе, што заступніцтва Царквы за памерлых нічога не дае.

Чацвёртае, што ніякая клятва, ці то ў судзе, ці па-за ім, любым чынам дадзеная, з'яўляецца грахом.

Пятае, што ўсё забойствы, у тым ліку і асуджаных злачынцаў, зробленыя любым чынам, з'яўляюцца грахом.

Шостае, што папскія і біскупскія індульгенцыі нічога не даюць.

Сёмае, што царкоўныя спевы нічога не вартыя.

Восьмае, што царкоўнае пахаванне нічога не дае.

Дзявятае, што ні бласлаўлёная вада, ні соль, ні свечкі, ні пальмавыя галінкі, ні зёлкі, ні ежа, ні попел нічому не спрыяюць, гэта значыць прамаўленне слоў асвячэння нічога не паляпшае.

Дзясятае, што біскупскі ўбор, а менавіта інфула, курватура, каліга, сандалі і іншае начынне яго, ні таксама арнат, не з'яўляюцца неабходным у царкве для правядзення імшы.

Адзінаццатае, што выява ўкрыжавання і Дзевы Марыі, а таксама выявы іншых святых, не з'яўляюцца аб'ектам пакланення.

Дванаццатае, што царкоўныя пасвячэнні і штогадовыя імшы ні для чаго не прыдатныя.

Трынаццатае, што адлучэнні Папы, біскупаў ці судоў царкоўных прэлатаў не звязваюць сэрца Божае.

Чатырнаццатае, што гэта секта Вальдэнсаў мае сапраўдную веру і толькі яна [далей неразборліва].

> Дакладных копій гэтага кодэкса нідзе няма, сустракаецца толькі некаторае падабенства. У параўнанні з некаторымі іншымі кодэксамі для чатырнаццатага пункта расшыфроўка можа выглядаць наступным чынам "Гэта секта Вальдэнсаў – адзіная і праўдзівая ў веры каталіцкай, па-за якой ніхто не зможа выратавацца"[69].
>
> Яраслаў Шыманьскі на аснове вывучэння шматлікіх манускрыптаў з Вроцлаўскай універсітэцкай бібліятэкі прапанаваў расшыфроўку-рэканструкцыю нечытэльнай часткі Пелплінскага рукапісу. У гэтай бібліятэцы знойдзены кодэкс чэшскага паходжання, які змяшчае апісанне "памылак" вальдэнсаў і з'яўляецца, па сутнасці, працягам кодэкса Пелплінскага.

Чатырнаццатае, што гэта секта Вальдэнсаў – адзіная каталіцкая, і чалавек праз іншае не зможа ўратавацца.

Пятнаццатае, што яны кажуць, што Папа – галава ўсіх ерэсіярхаў.

Шаснаццатае, кажуць кардыналы, архібіскупы, біскупы, імператары, каралі, прынцы і князі, а таксама ўсе суддзі, як духоўныя, так і свецкія, разам з усімі клірыкамі і прэсвітарамі з'яўляюцца асуджанымі, у гэта яны вераць і даказваюць, і што змагацца супраць гэтай секты немагчыма.

Сямнаццатае, яны не вераць у таінства канфірмацыі, таму што канфірмацыю, як многія з іх лічаць, дазволена рабіць аднаму Богу, а не іншым.

Васямнаццатае, кажуць што не трэба прамаўляць аніякія малітвы, акрамя "Ойча наш".

---

[69] Cegna, "Il valdismo medievale come religione penitenziale," 40–41.

Дзевятнаццатае, кажуць, што кожнае слова імшы, і кожны строй, зроблены спецыяльна для імшы, – памылковыя, акрамя слоў асвячэння.

Дваццатае, што працэсіі ў Дзень Цела Хрыстова і іншых святаў, якія ўрачыста святкуюцца хрысціянамі, яны называюць смешнымі і марнымі. Таксама і на свечкі, што запальваюць хрысціяне, яны маюць звычку скардзіцца[70].

VII.v.g Працэс у Трнаве 1400 г.

Матэрыялы гэтага працэсу захаваліся ў вельмі дрэнным стане ў адным манускрыпце ад 1436 г.

Мы, брат Пётр, правінцыял братоў ордэна цэлесцінцаў Германіі, і прэсвітар Марцін, інквізітары ерэтычнай заганнасці ў Эстэргамскай правінцыі, Вам, Уладар плябан у Трнаве Эстэргамскай дыяцэзіі, займаючыся замест Вас святым падпарадкаваннем і накладаючы запозненае адлучэнне, чым накладаем на вас адну з трох кананічных перасцярогаў, калі вы не зробіце тое, што Вам у гэтым лісце загадваем, то будзем, як вынікае з напісанага [неразборліва] паколькі асабіста ўдзельнічалі, калі вы маеце да іх надзейны доступ, або ў іх дамах адкрыта [неразборліва] ці ў Вашай царкве ў прысутнасці людзей Эльса Саўрмерыенса, Гензэля, яго сына або пасынка, Кунэля Праймфрыдліенса, яго арандатара, Паўля, сына Екеля Прэвера з Хольцкендорфа і маці Міхеля Слына [неразборліва] усе вашы людзі і ўсе і кожны з названых абодвух палоў і хто-небудзь з іх, каго вы выклікаеце да нас для вынясення канчатковага рашэння, якіх мы выклікалі да нас публічна і праз паведамленні, а таксама ўсіх і кожнага, хто на народнай мове паміж сабой называюцца "dy K[un]den" [спазнаныя], каб у панядзелак раніцай яны могуць з'явіцца перад намі асабіста, а не праз прадстаўніка, і кожны, хто з'явіцца перад намі, павінен будзе наконт наступных артыкулаў веры адказаць. Дадзена ў Трнаве ў Год Гасподні 1400 дзень 11 месяца верасня, замацавана пячаткай нашай службы [неразборліва].

Была запытаная, адказала, што яны былі з секты Вальдэнсаў ... была запытаная, дзе нарадзілася, адказала, што "czu Aspach" у Аўстрыі, і што бацьку яе звалі Конрад Непек і маці Катрын, і што яны не былі з секты, і што яе прывёў [у секту] Ортэль або Ортальф, і што сказаў ёй, што павінна прыйсці і выспаведацца ерэсіярху, бо ён можа адпускаць ёй грахі лепш за святароў, і што ўпершыню выспаведалася ерэсіярху ў сваім доме, калі мела прыкладна 30 гадоў, і што пасля гэтага тройчы ім спавядалася ... што наклаў на яе пакаянне, каб пасцілася і малілася 50 "Ойча наш" у дзень і 100 па нядзелях, але ніякіх "Вітай, Марыя"... браты гэтыя не былі прэсвітарамі, але ад Бога мелі такую ж уладу, як і апосталы, і лепш за прэсвітараў маглі адпускаць грахі.

Толькі Богу, але не святым і не Найсвяцейшай Марыі ... не верылі ў чысцец.

Верыла таксама, што немагчыма клясціся без граху, і што індульгенцыі і адлучэнні былі ўведзеныя з-за іх [святароў] пыхі і нічога не вартыя ... Таксама адказала, запытаная ... лепш памерці ў секце і верыла, што іх вера сапраўдная, а тых, хто па-за [сектай], называла "dy vremden" [чужынцы][71].

---

[70] Szymański, "*Articuli secte Waldensium*," 88 н. 26.

[71] Josef Truhlář, Paběrky z rukopisů Klementinských. LXIV. Inkvisice Waldenských v Trnavě r. 1400. *Český časopis historický*, 1903, roč. 9, s. 196–198.

Бібліяграфічны спіс

1. "Annales Lubenses a. 1241–1315." In *Monumenta Germaniae Historica. Scriptorum* 19, 548–549. Hannoverae: Impensis Bibliopolii Aulici Hahniani, 1866.
2. "Annales Marbacenses a. 631–1375." In *Monumenta Germaniae Historica. Scriptorum* 17, 142–180. Ed. by Roger Wilmans, 1861.
3. "Annales Matseenses." In *Monumenta Germaniae Historica. Scriptorum* 9, 823–837. Ed. by Wilhelm Wattenbach, 1851.
4. "Benedictio et claritas et sapientia." *Cantus Manuscript Database*. Accessed 10.11.2022. https://cantus.uwaterloo.ca/chant/457044.
5. "Bischof Peter von Olmütz wegen Begünstigung der Schismatiker." In *Archiv für Österreichische Geschichte* 55, 364–372. Karl Gerold's Sohn, 1877.
6. "Breve Chronicon Silesiae." In *Scriptores Rerum Silesiacarum* 1, 33–37. Ed. by Gustav Adolf Stenzel. Breslau: Max, 1835.
7. "Burchardi et Cuonradi Urspergensium Chronicon." In *Monumenta Germaniae Historica. Scriptores* 23, 333–390. Ed. by Ottonis Abel et Ludewici Weiland. Hannoverae: impensis bibliopolii Hahniani, 1974.
8. "Cancelleria Arnesti. Formelbuch des Ersten Prager Erzbischofs Arnest von Pardubitz. Nach einer Handschrift der k. k. Universitätsbibliothek zu Prag." In *Archiv für Österreichische Geschichte* 61, 267–597. Ed. by Ferdinand Tadra, 1880.
9. "Catalogus Abbatum Saganensium." In *Scriptores Rerum Silesiacarum* 1, 180–528. Ed. by Gustav Adolf Stenzel. Breslau: Max, 1835.
10. "Chronica Alberici monachi Trium Fontium a monacho Novi Monasterii Hoiensis interpolata." In *Monumenta Germaniae Historica. Scriptores* 23, 631–950. Ed. by Paul Scheffer-Boichorst, 1874.
11. "Concilium Lateranese IV a. 1215." Accessed 22.10.2022. Roma, 2008. http://www.internetsv.info/Archive/CLateranense4.pdf.
12. "Decretum magistri Gratiani." Decretum Gratiani (Kirchenrechtssammlung). Accessed 05.11.2022. https://geschichte.digitale-sammlungen.de/decretum-gratiani/online/angebot.
13. "Ex Chronico universali anonymi Laudunensis." In *Monumenta Germaniae Historica. Scriptores* 26, 442–457. Ed. by Georg Waitz, 1882.
14. "Synodus Dioecesana Trevirensis." In *Sacrorum conciliorum nova et amplissima collection,* Col. 241–42. Ed. J. D. Mansi. Venezia, 1779.
15. "Библия. IV. Переводы." В *Православная Энциклопедия*. Доступ 22.10.2022. http://www.pravenc.ru/text/209473.html#part_42.
16. Agrigoroaei, Vladimir. "Préambule à une étude sur l'hérésie et la traduction biblique au Moyen Âge et à l'aube de la modernité." *Biblicum Jassyense. Romanian Journal for Biblical Philology and Hermeneutics* 8 (2021): 15–92.
17. Alberzoni, Maria Pia. "Innocent III et les Pauvres Catholiques du Midi." *Cahiers de Fanjeaux* 50, no. 1 (2015): 311–336. https://doi.org/10.3406/cafan.2015.2231.
18. Amati, Girolamo. "Processus contra valdenses in Lombardia Superiori, Anno 1387." *Archivio storico italiano* 2, no. 1 (1865): 3–61.

19. Ames, Christine Caldwell. *Medieval Heresies: Christianity, Judaism, and Islam*. Cambridge: Cambridge University Press, 2015. 368.

20. *Annales Minorum seu Trium Ordinum a s. Francisco Institutorum*. Vol. 8. 1347–1376. Ed. by Luke Wadding and Josephus Maria Fonseca. Quaracchi prope Florentiam: Ad Claras Aquas, 1932. 794.

21. Armand-Hugon, Augusto. *La donna nella storia valdese*. Torre Pellice: Società di studi valdesi, 1980. 29.

22. Armitage, Thomas. *A History of the Baptists: Traced by Their Vital Principles and Practices, from the Time of Our Lord and Saviour Jesus Christ to the Year 1886*. Paris (Ark.): Baptist standard bearer, 2001. 492.

23. Arnold, John H. "Heresy and Gender in the Middle Ages." *Oxford Handbooks Online*, August 27, 2015. https://www.academia.edu/15222947/Heresy_and_Gender_in_the_Middle_Ages.

24. Audisio, Gabriel. "La Montagne: un refuge pour les vaudois ?" *Clergés, communautés et famille des montagnes d'Europe*, 2005, 237–242. https://doi.org/10.4000/books.psorbonne.64184.

25. Audisio, Gabriel. *The Waldensian Dissent: Persecution and Survival, c. 1170–c. 1570*. Cambridge: Cambridge University Press, 1999. 234.

26. Bahlow, Hans. *Schlesisches Namenbuch*. Quellen und Darstellungen zur Schlesischen Geschichte 3. Kitzingen/Main: Holzner, 1953. 148.

27. Bain, Emmanuel. "Aux sources du discours antihérétique ? Exégèse et hérésie au XIIe siècle." In *Aux marges de l'hérésie inventions, formes et usages polémiques de l'accusation d'hérésie au Moyen Age*, 47–77. Ed. by Franck Mercier and Isabelle Rosé. Rennes: Presses Universitaires de Rennes, 2018.

28. Bain, Emmanuel. "Les hérétiques du prince: Alain de Lille et les hérétiques méridionaux." In *Le «Catharisme» en questions* 55, 173–196. Ed. by Jean-Louis Biget, Sylvie Caucanas, Fournié Michelle, and Daniel Le Blévec. Fanjeaux: Centre d'études historiques de Fanjeaux, 2020.

29. Balossino, Simone, and Jacques Chiffoleau. "Valdesi e mondo comunale in Provenza nel Duecento." In *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca*, 61–102. Ed. by Gabriel Audisio and Marina Benedetti. Torino: Claudiana, 2009.

30. Barabás, Gábor. "Heretics, Pirates, and Legates. The Bosnian Heresy, the Hungarian Kingdom, and the Popes in the Early 13th Century." *Specimina Nova Pars Prima Sectio Mediaevalis* 9 (2017): 35–58. https://doi.org/10.15170/spmnnv.2017.09.02.

31. Barbero, Alberto. "*Fermenti ereticali nel Piemonte alla fine del Trecento: I processi di Thomas de Casascho e di Anthonius de Septo de Savigliano. II: Il Ms. 3217 (D.III.18) della Biblioteca casanatense di Roma*," 1965.

32. Becker, Marvin B. "Debate Heresy in Medieval and Renaissance Florence. A Comment." *Past and Present* 62, no. 1 (1974): 153–161. https://doi.org/10.1093/past/62.1.153.

33. Behringer, Wolfgang. "How Waldensians Became Witches: Heretics and Their Journey to the Other World." In *Communicating with the Spirits*, 155–192. Ed. by Gábor Klaniczay and Éva Pócs. Budapest; New York: Central European University Press, 2005.

34. Bellarbre, Julien. "Perceptions of Heresy in Historiographical and Hagiographical Sources of Aquitaine and the Loire Valley during the High Middle Ages." In *Heresy and the Making of European Culture*, 113–128. Medieval and Modern Perspectives; Ed. by Andrew P. Roach. Farnham: Ashgate, 2013.

35. Bellelli, Rita. "I boni homines (La 'gente nova') e la 'congiura' precomunale. Secoli XI–XII." *Biblioteca Elettronica su Montesquieu e Dintorni*. Accessed 22.10.2022. https://montesquieu.unibo.it/article/download/8058/7781/24922.

36. Benedetti, Marina, and Euan Cameron. *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages*. Vol. 103. Brill's Companions to the Christian Tradition. Leiden: Brill, 2022.

37. Benedetti, Marina. "A Forgotten Crusade." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 445–458. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

38. Benedetti, Marina. "*Fratelli barlotti, cagnardi, sorelle in Cristo.* Identità valdesi nel Quattrocento." *Bollettino della Società di Studi Valdesi*, 219 (2016): 43–58.

39. Benedetti, Marina. "La repressione delle parole: la predicazione delle donne valdesi." *Clio a. Crimen* 1 (2004): 165–188.

40. Benedetti, Marina. "The Bible, Women Heretics, and Inquisitors." In *The High Middle Ages*, 83–99. Ed. by Kari Elisabeth Børresen. Atlanta: SBL Press, 2015.

41. Benziger, Wolfram. "La legislazione papale in materia di eresia e i poveri di Lione." In *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca*, 39–52. Ed. by Gabriel Audisio and Marina Benedetti. Torino: Claudiana, 2009.

42. Bériou, Nicole. "The Right of Women to Give Religious Instruction in the Thirteenth Century." In *Women Preachers and Prophets through Two Millennia of Christianity*, 134–145. Ed. by Beverly Mayne Kienzle and Pamela J. Walker. Berkeley: University of California Press, 1998.

43. Bernardus Guidonis. *Practica inquisitonis haeretica pravitatis*. Publié par C. Douais. Paris: Alphonse Picard, 1886. 370.

44. Bertolin, Silvia. "Processi per Stregoneria in Val d'Aosta (1398–1434)." In *Predicazione e repressione. Processi e letteratura religiosa*, 79–88. A cura di Andrea Giraudo e Matteo Rivoira. Torino: Claudiana, 2018.

45. Bidlo, Jaroslav. *Akty Jednoty bratrské*. Vol. 1. Brno: Historická komise při Matici moravské, 1915. https://archive.org/details/aktyjednotybratr01bidluoft.

46. Bieniek, Przemysław. "Myśl Kacerska i Ruch Dysydencki na przykładzie Waldensów." *Biuletyn Biblioteki Jagiellońskiej*, 2006, 83–88.

47. Biget, Jean-Louis, Sylvie Caucanas, Fournié Michelle, and Daniel Le Blévec. *Le «Catharisme» en questions*. Vol. 55. Fanjeaux: Centre d'études historiques de Fanjeaux, 2020. 448.

48. Biget, Jean-Louis. "Retour sur le 'concile de Saint-Félix'." In *Le «Catharisme» en questions* 55, 81–110. Ed. by Jean-Louis Biget, Sylvie Caucanas, Fournié Michelle, and Daniel Le Blévec. Fanjeaux: Centre d'études historiques de Fanjeaux, 2020.

49. Biller, Peter, Caterina Bruschi, and Shelagh Sneddon. *Inquisitors and Heretics in Thirteenth-Century Languedoc: Edition and Translation of Toulouse Inquisition Depositions, 1273–1282*. Leiden, Boston: Brill, 2011. 1088.

50. Biller, Peter. "Bernard Gui, Peter Zwicker, and the Geography of Valdismo or Valdismi." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 200 (2007): 31–43.

51. Biller, Peter. "Cathars and Material Women." In *Medieval Theology and the Natural Body* 1, 61–108. York Studies in Medieval Theology; Ed. by Peter Biller and Alastair J. Minnis. Woodbridge: York Medieval Press, 1997.

52. Biller, Peter. "Christians and Heretics." In *Christianity in Western Europe c. 1100–c. 1500*, 170–186. Cambridge History of Christianity; Ed. by Miri Rubin; Walter Simons. Cambridge: Cambridge University Press, 2009.

53. Biller, Peter. "Goodbye to Catharism?" In *Cathars in Question*, 274–313. Ed. by Antonio Sennis. Woodbridge: York Medieval Press, 2016.

54. Biller, Peter. "Fingerprinting an Anonymous Description of the Waldensians." In *Texts and the Repression of Medieval Heresy*, 163–193. Ed. by Peter Biller and Caterina Bruschi. Woodbridge: York Medieval Press, 2003.

55. Biller, Peter. "Helping the Poor and Healing the Sick." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 422–444. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

56. Biller, Peter. "Heretics Doing Things Secretly." In *Secrets and Discovery in the Middle Ages. Proceedings of the 5th European Congress of the Fédération Internationale des Instituts d'études médiévales (Porto, 24 to 29 June 2013)* 90, 15–26. Textes et Etudes du Moyen Âge; Ed. by José Meirinhos, Celia López Alcade, and João Rebalde. Turnhout: Brepols, 2018.

57. Biller, Peter. "Inquisitors' Interrogations of Waldenses." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 354–393. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

58. Biller, Peter. "Interrogation of Waldensians." In *Medieval Christianity in Practice*, 231–237. Ed. by Miri Rubin. Princeton, N.J: Princeton University Press, 2009.

59. Biller, Peter. "Medicine and Heresy." In *Religion and Medicine in the Middle Ages*, 155–174. Ed. by Peter Biller and Joseph Ziegler. Woodbridge: York Medieval Press, 2001.

60. Biller, Peter. "The Waldenses 1300–1500." *Revue de l'histoire des religions* 217, no. 1 (2000): 75–99. https://doi.org/10.3406/rhr.2000.1072.

61. Biller, Peter. "Through a Glass Darkly: Seeing Medieval Heresy." In *The Medieval World*, 2nd ed., 345–367. Ed. by Peter Linehan; Janet L. Nelson; Marios Costambeys. Abingdon and New York: Routledge, 2018.

62. Biller, Peter. "Waldensians in the Inquisition Registers in the Bibliothèque Nationale de France, Collection Doat Manuscrits 21–26." In *Predicazione e repressione. Processi e letteratura religiosa*, 23–39. A cura di Andrea Giraudo e Matteo Rivoira. Torino: Claudiana, 2018.

63. Biller, Peter. "Why No Food? Waldensian Followers in Bernard Gui's *Practica Inquisitionis* and *Culpe*." In *Texts and the Repression of Medieval Heresy*, 127–146. Ed. by Peter Biller and Caterina Bruschi. Woodbridge: York Medieval Press, 2003.

64. Biller, Peter. *The Waldenses, 1170–1530: Between a Religious Order and a Church*. Ashgate, 2001. 320.

65. Biscaro, Gerolamo. "Inquisitori ed eretici lombardi (1292 – 1318)." In *Miscellanea di Storia Italiana,* 448–557. Torino, 1922.

66. Blair, Adam. *History of the Waldenses: With an Introductory Sketch of the History of the Christian Churches in the South of France and North of Italy, till These Churches Submitted to the Pope, When the Waldenses Continued as Formerly Independent of the Papal See*. Vol. 1. 2 vols. Edinburgh: A. Black, 1832. 544.

67. Boffito, Giuseppe. "Eretici in Piemonte al tempo del Gran Scisma (1378–1417)." *Studi e documenti di storia e diritto* 18 (1897): 381–432.

68. Bolton, Brenda. "Tradition and Temerity: Papal Attitudes to Deviants, 1159–1216." *Studies in Church History* 9 (1972): 79–91. https://doi.org/10.1017/s042420840000574x.

69. Bosworth, Lucy E. *Perceptions of the Origins and Causes of Heresy in Medieval Heresiology. Edinburgh Research Archive*. University of Edinburgh, 1995. http://hdl.handle.net/1842/18041.

70. Brenon, Anne. "The Voice of the Good Women: An Essay on the Pastoral and Sacerdotal Role of Women in the Cathar Church." In *Women Preachers and Prophets through Two Millennia of Christianity*, 114–133. Ed. by Beverly Mayne Kienzle and Pamela J. Walker. Berkeley: University of California Press, 1998.

71. Brunn, Uwe. *Des contestataires aux cathares: discours de réforme et propagande antihérétique dans les pays du Rhin et de la Meuse avant l'Inquisition*. Paris: Institut d'études augustiniennes, 2006. 633.

72. Bruschi, Caterina. "De vita et actibus Pauperes de Lugduno." In *Texts and the Repression of Medieval Heresy*, 196–207. Ed. by Peter Biller and Caterina Bruschi. Woodbridge: York Medieval Press, 2003.

73. Bruschi, Caterina. *The Wandering Heretics of Languedoc*. Cambridge: Cambridge University Press, 2009. 222.

74. Buc, Philippe. "'Vox clamantis in deserto'? Pierre le Chantre et la prédication laïque." *Revue Mabillon* 65, 1993, 5–47.

75. Bueno, Irene. *Defining Heresy: Inquisition, Theology, and Papal Policy in the Time of Jacques Fournier*. Leiden: Brill, 2015. 371.

76. *Bullarium Franciscanum: sive Romanorum Pontificum constitutiones epistolae diplomata tribus ordinibus Minorum Clarissarum Poenitentium ... a Sancto Francisco Institutis ab eorum originibus ad nostra usque tempora concessa*. Vol. 5. Benedicti XI, Clementis V, Ioannis XXII Monumenta. Ed. by Conrad Eubel. Vatican: Typis Sacrae Congregationis de Propaganda Fide, 1898. 643.

77. *Bullarium Ordinis Eremitarum S. Augustini: Periodus formationis 1187–1256*. Ed. by Benignus Van Luijk. Würzburg: Augustinus-Verlag, 1964. 137.

78. Burci, Salvo. *Liber Suprastella*. Ed. by Caterina Bruschi. Roma: Istituto storico italiano per il Medio Evo, 2002. 528.

79. Burnham, Louisa A. "Unusual Choices: The Unique Heresy of Limoux Negre." *Late Medieval Heresy: New Perspectives*, 2018, 96–115. https://doi.org/10.1017/9781787443327.007.

80. Bylina, Stanisław. "Heretycy w społeczeństwie: świadectwo czeskich źródeł inkwizycyjnych z XIV wieku." *Kwartalnik Historyczny* 86, no. 1 (1982): 105–117.

81. Bylina, Stanisław. "Wizerunek heretyka w Polsce późnośredniowiecznej." In *Odrodzenie i Reformacja w Polsce* 30, 5–24. Warszawa: PWN, 1985.

82. Bylina, Stanisław. *Religijność późnego średniowiecza: Chrześcijaństwo a kultura tradycyjna w Europie Środkowo-Wschodniej w XIV–XV w.* Warszawa: Neriton, 2009. 200.

83. Bylina, Stanisław. *Ruchy heretyckie w średniowieczu*. Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1991. 225.

84. Bzowski, Abraham Stanisław. *Propago D. Hyacinthi thavmatvrgi Poloni, seu de rebus praeclare gestis in Prouincia poloniae Ordinis Praedicatorum commentarivs*. Venetiis: apud Societatem Minimam, 1606. 124.

85. Bzowski, Abraham Stanisław. *Tutelaris Silesiae seu de vita rebusque praeclare gestis B. Ceslai Oorovansii, ordinis Praedicatorum commentarius*. Cracoviae: Officina Andrea Petricouij Anno Domini, 1608. 32.

86. Cadili, Alberto. "Il veleno di Costantino. La Donazione di Costantino tra spunti riformatori ed ecclesiologia ereticale (secoli XII–XVI)." In *Enciclopedia Costantiniana*, 621–624, 2013.

87. Caesaris Heisterbacensis. *Dialogus Miraculorum*. Ed. by Joseph Strange. Cologne: Heberle, 1851. 381.

88. Cameron, Euan. "From the Reformation to the Past." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 499–534. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

89. Cameron, Euan. "The Dauphiné (13th–14th Centuries)." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 273–289. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

90. Cameron, Euan. *The European Reformation*. Oxford: Clarendon Press, 1991. 564.

91. Cameron, Euan. *Waldenses: Rejections of Holy Church in Medieval Europe*. Oxford, UK, Malden, MA: Blackwell Publishers, 2001. 336.

92. Cegna, Romolo. "Eresie e movimenti religiosi in Polonia e in Boemia-Moravia nel Medioevo (Repubblica Ceca)." *Bollettino della Società do Studi Valdesi* 174 (1994): 109–125.

93. Cegna, Romolo. "Idea wolności w ruchach heretyckich późnego średniowiecza; waldyzm europejski." *Kwartalnik Historyczny* 86, no. 4 (1979): 951–964.

94. Cegna, Romolo. "Il Valdismo nel '300 come alternativa alla Chiesa di Roma." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 148 (1980): 49–56.

95. Cegna, Romolo. "Il valdismo medievale come religione penitenziale." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 150 (1981): 37–48.

96. Cegna, Romolo. "Valdismo e Ussitismo: mito e storia tra i fogli dei Codici II-3320 della Biblioteca Nazionale di Varsavia e Mil IV 77 della Biblioteca Universitaria di Wroclaw." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 144 (1978): 27–44.

97. Cegna, Romolo. *Medioevo cristiano e penitenza valdese: il «Libro espositivo» e il «Tesoro e luce della fede» (parte seconda)*. Torino: Claudiana, 1994. 294.

98. Chaloupecký, Václav. "K dejinám Valdenských v Cechách pred hnutím husitským." *Český časopis historický* 2 (1925): 369–382.

99. Charvaz André. *Origine dei valdesi e carattere delle primitive loro dottrine*. Torino: Presso G. Bocca, 1838. 512.

100. Chiffoleau, Jaques. "Religious Dissidence and Political Struggles in the Rhône Valley (13th Century)." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 98–118. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

101. *Chronicon Moguntinum*. Ed. by Carolus Hegel. Hannoverae: Hahn, 1885. 103.

102. *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae: Urkundensamml. zur Geschichte Mährens*. Vol. 3. Ab annis 1241–1267. 15 vols. Ed. by Antonín Boček. Brünn: Verl. des Mährischen Landes-Ausschusses, 1841. 412.

103. *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae: Urkundensamml. zur Geschichte Mährens*. Vol. 6. Ab annis 1307–1333. 15 vols. Ed. by Peter Ritter von Chlumecky. Brünn: Georg Gastl's typographischer Anstalt, 1854. 538.

104. *Codex diplomaticus et epistolaris Moraviae: Urkundensamml. zur Geschichte Mährens*. Vol. 7. Ab annis 1334–1349. 15 vols. Ed. by Peter Ritter von Chlumecky and Josef Chytil. Brünn: Georg Gastl's typographischer Anstalt, 1858. 1006.

105. *Codex diplomaticus Silesiae*. Vol. 5. Das Formelbuch des Domherrn Arnold von Protzan: Namens des Vereins für Geschichte und Alterthum Schlesiens. 36 vols. Ed. by Wilhelm Wattenbach. Breslau: Max, 1862. 342.

106. Cohn, Norman. *Europe's Inner Demons: The Demonization of Christians in Medieval Christendom*. Chicago: University of Chicago Press, 2000. 218.

107. *Colección diplomática de la Catedral de Huesca*. Vol. 1. 2 vols. A. Duran Gudiol. Zaragoza: Consejo Superior de Investigaciones Científicas, Escuela de Estudios Medievales, Instituto de Estudios Pirenaicos, 1965. 886.

108. Comba, Emilio. *History of the Waldenses of Italy, from Their Origin to the Reformation*. London: Truslove & Shirley, 1889. 357.

109. Comba, Ernesto, and Luigi Santini. *Breve storia dei valdesi*. 5th ed. Torino: Claudiana, 1966. 188.

110. Comba, Ernesto. *Storia dei valdesi*. Torre Pellice: Claudiana, 1950. 379.

111. *Concilia Germaniae, quae celsissimi principis Joannis Mauritii, archiepiscopi Pragensis sumptu Joannes Fridericus Schannat magna ex parte primum collegit*. Vol. 4. Ab anno MCCXC. Ad MCCCC. 10 vols. Ed. by Johann Friedrich Schannat and Josephus Hartzheim. Coloniae Augustae Agrippinensium: Typo Viduae Joan. Wilhelmi Krakamp, et Hearedum Christiani Simonis, Bibliopolarum, 1761. 662.

112. Constable, Giles. "Renewal and Reform in Religious Life: Concepts and Realities." In *Renaissance and Renewal in the Twelfth Century*, 37–67. Ed. by Robert L. Benson. Cambridge, MA: Harvard University Press, 1982.

113. *Corpus Christianorum continuatio mediaevalis: aelredi rievallensis opera omnia*. Vol. 10. Turnholti: Typographi Brepols Editores Pontificii, 1971.

114. Corsi, Dinora. "«Interrogata dixit»: le eretiche nei processi italiani dell'inquisizione (secolo XIII)." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 194 (2004): 73–98.

115. Corsi, Dinora. "Per la storia dell'inquisizione a Firenze nella seconda metà del secolo XIII." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 132 (1972): 3–16.

116. Czarnecki, Piotr. "Europejskie drogi do Reformacji (prereformacja)." In *Dziedzictwo kulturowe Reformacji w perspektywie polskiej i europejskiej: w 500-lecie wystąpienia Marcina Lutra: V Międzynarodowy Kongres Religioznawczy: Religie w dialogu kultur, Reformacja – Dialog – Kultura, 14–16 września 2017*, Ed. by Krzysztof Pilarczyk and Wojciech Gajewski, 19–39. Kraków: Wydawnictwo Antykwa, 2017.

117. Czarnecki, Piotr. "If Not Bogomilism than What? the Origins of Catharism in the Light of the Sources." *Studia Ceranea. Journal of the Waldemar Ceran Research Centre for the History and Culture of the Mediterranean Area and South-East Europe* 11 (2021): 51–73. https://doi.org/10.18778/2084-140x.11.03.

118. da Milano, Ilarino. "Il «Liber supra Stella» del piacentino Salvo Burci contro i catari e altre correnti ereticali." *Aevum* 17, no. 1/2 (n.d.): 90–146.

119. da Milano, Ilarino. "Il «Liber supra Stella» del piacentino Salvo Burci contro i catari e altre correnti ereticali." *Aevum* 19, no. 3/4 (1945): 281–341.

120. Damsteegt, Gerard P. "Decoding Ancient Waldensian Names: New Discoveries." *Andrews University Seminary Studies* 54.2 (2016): 237–258. https://digitalcommons.andrews.edu/auss/vol54/iss2/4/.

121. de Lange, Albert. "Waldenses in Bohemia, 13th–16th Centuries." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 139–161. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

122. De Michelis, Cesare G. "Il valdismo e le terre russe (secc. XIV–XVI)." *Revue de l'histoire des religions* 217, no. 1 (2000): 139–153. https://doi.org/10.3406/rhr.2000.1075.

123. De Michelis, Cesare G. *La Valdesia di Novgorod: «Giudaizzanti» e prima riforma: con un'appendice di studi e testi*. Torino: Claudiana, 1993. 263.

124. De Stefano, Antonino. *Riformatori ed eretici del Medioevo*. Palermo: F. Ciuni, 1938. 398.

125. Deane, Jeniffer Kolpacoff. *A History of Medieval Heresy and Inquisition*. Lanham: Rowman & Littlefield, 2011. 478.

126. Diehl, Peter D. "Overcoming Reluctance to Prosecute Heresy in Thirteenth-Century Italy." In *Christendom and Its Discontents: Exclusion, Persecution and Rebellion, 1000–1500*, 47–66. Ed. by Scott L. Waugh and Peter Diehl. Cambridge: Cambridge University Press, 2002.

127. Dobrowolski, Kazimierz, and Kazimierz Chodynicki. "Pierwsze sekty religijne w Polsce." In *Reformacja w Polsce* R. 3, № 11/12, 160–211. Warszawa: T-wo do badania dziejow reformacji w Polsce, 1924.

128. *Documente privind istoria României: C. Transilvania*. Veacul XIV, vol. 2: 1321–1330. Bucureşti: Editura Academiei Republicii Populare Române, 1953. 420.

129. Doležalová, Eva. "The Inquisition in Medieval Bohemia: National and International Contexts." In *Heresy and the Making of European Culture: Medieval and Modern Perspectives*, 299–311. Ed. by Andrew P. Roach. Farnham: Ashgate, 2013.

130. Döllinger, Ignaz von. *Beiträge zur Sektengeschichte des Mittelalters*. München: Beck, 1890. 737.

131. Dondaine, Antoine, and Yves Dossat. *Les hérésies et l'inquisition, XIIe – XIIIe siècles: documents et études*. Aldershot: Variorum, 1990. 340.

132. Dossat, Yves. "À propos du prieur des pauvres catholiques : Durand de Huesca ou de Losque en Rouergue." *Bulletin philologique et historique (jusqu'à 1610) du comité des travaux historiques et scientifiques* II (1967): 673–685.

133. Dossat, Yves. "La 'Chronique' de Guillaume de Puylaurens." *Actes de la* Société des historiens médiévistes de l'enseignement supérieur public 8, no. 1 (1977): 259–265. https://doi.org/10.3406/shmes.1977.1303.

134. Drabina, Jan. *Życie codzienne w miastach śląskich XIV i XV w.* Wrocław: Wydawnictwo «Skryba», 1998. 209.

135. Drakopoulos, Théofanis. "*L'unité de Bogomilo-Catharisme d'après quatre textes latins analysés à la lumière des sources byzantines,*" Université de Genève. Thèse, 2010. https://archive-ouverte.unige.ch/unige:12233

136. Dupré-Theseider, Eugenio. "Gli eretici nel mondo comunale italiano." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 114 (1963): 3–23.

137. Duvernoy, Jean. *Le registre d'inquisition de Jacques Fournier: (Eveque de Pamiers), 1318–1325*. Vol. 43. Civilisations et Sociétés: Sciences Économiques et Sociale; Préface de Emmanuel Le Roy Ladurie. Paris: Mouton, 1978. 1376.

138. Eymeric, Nicolas. *Directorivm inquisitorvm*. Ed. by Francisco Peña. Romae: In aedibvs Pop. Rom., 1578.

139. Elliott, James Keith. *The Apocryphal New Testament: A Collection of Apocryphal Christian Literature in an English Translation*. 2nd ed. Transl. by Montague Rhodes James. Oxford: Clarendon Press, 2009. 747.

140. Engen, John Van. *Sisters and Brothers of the Common Life: The Devotio Moderna and the World of the Later*. University Of Pennsylvani, 2014.

141. Erbstösser Martin. *Ketzer im Mittelalter*. Leipzig: Edition Leipzig, 1984. 235.

142. Erbstösser Martin. *Sozialreligiöse Strömungen im späten Mittelalter: Geissler, Freigeister und Waldenser im 14. Jahrhundert*. Berlin: Akademie-Verlag, 1970. 173.

143. Fages, P. H. O. *Notes et documents de l'histoire de Saint Vincent Ferrier*. Louvain u.a.: Uystpruyst u.a., 1905. 514.

144. Félix, Bernard. *L'hérésie des pauvres: vie et rayonnement de Pierre Valdo*. Genève: Labor et Fides, 2002. 219.

145. Feuchter, Jörg. "All'ombra dei catari. Valdesi nella società «pluri-ereticale» della Linguadoca nel primo Duecento." In *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca*, 53–60. Ed. by Gabriel Audisio and Marina Benedetti. Torino: Claudiana, 2009.

146. Feuchter, Jörg. "The Heretici of Languedoc: Local Holy Men and Women or Organized Religious Group? New Evidence from Inquisitorial, Notarial and Historiographical Sources." In *Cathars in Question*, 112–130. Ed. by Antonio Sennis. Woodbridge: York Medieval Press, 2016.

147. Feuchter, Jörg. "Waldenserinnen im Mittelalter." In *Zur Geistesgeschichte des Mittelalters und der frühen Neuzeit*, 47–68. Ed. by Günter Frank and Sebastian Lalla. Heidelberg: Verlag Regionalkultur, 2003.

148. Fichtenau, Heinrich. *Heretics and Scholars in the High Middle Ages: 1000–1200*. University Park: The Pennsylvania State University Press, 2010. 403.

149. Fiertz, Gertrude Barnes. "An Unusual Trial under the Inquisition at Fribourg, Switzerland, in 1399." *Speculum* 18, no. 3 (1943): 340–357. https://doi.org/10.2307/2853709.

150. Fiori, Antonia. "Et si haereticus non sit... La condanna dei sola suspicione notabiles." *Rivista internazionale di diritto comune* 27 (2016): 185–225.

151. Fitzgerald, Timothy. *Discourse on Civility and Barbarity*. Oxford: Oxford University Press, 2007. 368.

152. Flacius Illyricus, Matthias. *Catalogus testium veritatis*. Basel: Per Ioannem Oporinum, 1556. 1095.

153. Flacius Illyricus, Matthias. *Confessio Waldensium de plerisque nunc controversis dogmatibus ante 134. annos contra claudicantes Hussitas scripta, nostrisque temporibus statui, ac rebus pulchre correspondens*. Basileae: Oporinus, 1568. 396. https://www.digitale-sammlungen.de/de/view/bsb10193410?page=14.

154. Fracheto, Gerardus de, and Benedictus Maria Reichert. *Fratris Gerardi de Fracheto ... Vitae fratrum ordinis praedicatorum necnon cronica ordinis ab anno 1203 usque ad 1254. Ad fidem codicum manuscriptorum accurate recognovit, notis breviter illustravit Fr. Benedictus Maria Reichert*. Lovanii: E. Charpentier & J. Schoonjans, 1896. 362.

155. Fratini, Marco. "Fra le Valli valdesi e il Subappennino dauno. Itinerari della predicazione e della storiografia alla vigilia della Riforma." In *Valdesi: da Monteleone di Puglia a Guardia Piemontese. Direzioni di ricerca storica tra Medioevo ed Età Moderna*, 25–38. Ed. by Alfonso Tórtora. Angri – Salerno: Gaia, 2009.

156. Fratini, Marco. "Storie di frontiera e pratiche di confine nelle Valli valdesi." *La Beidana* 47 (2003): 1–18.

157. Frédéric Barberousse. "Bulle d'or 1157." Lyon. Accessed 22.10.2022. http://museedudiocesedelyon.com/MUSEEduDIOCESEdeLYONbulled'or.htm.

158. Frédéricq, Paul. *Corpus documentorum inquisitionis haereticae pravitatis neerlandicae: Verzameling van stukken betreffende de pauselijke en bisschoppelijke inquisitie in de Nederlanden*. Vol. 1. 1025–1520. 5 vols. Gent: J. Vuylsteke, 1889. 640.

159. Frédéricq, Paul. *Corpus documentorum inquisitionis haereticae pravitatis neerlandicae: Verzameling van stukken betreffende de pauselijke en bisschoppelijke inquisitie in de Nederlanden*. Vol. 3. 1236–1513. 5 vols. Gent: Vuylsteke, 1906. 447.

160. Fridericus II imperator. "Coronatio Romana." In *Monumenta Germaniae Historica. Legum* Tomus II, 240–248. Hannoverae: Impensis Bibliopolii Aulici Hahniani, 1837.

161. Friess, Godfrid Edmund. "Patarener, Begharden und Waldenser in Oesterreich während des Mittelalters." In *Österr. Vierteljahresschr. Für Katholische Theologie* 11, 209–272. Wien: Wilhelm Braumüller, 1872.

162. Fudge, Thomas A. *Heresy and Hussites in Late Medieval Europe*. Farnham–Burlington: Ashgate, 2014. 418.

163. Gałuszka, Tomasz. *Henry Harrer's Tractatus Contra Beghardos: The Dominicans and Early Fourteenth Century Heresy in Lesser Poland*. Transl. by Magdalena Panz-Sochacka. Kraków: Wydawnictwo Esprit, 2015. 211.

164. Garsoïan, Nina G. *The Paulician Heresy: A Study of the Origin and Development of Paulicianism in Armenia and the Eastern Provinces of the Byzantine Empire. 2nd ed. Berlin: De Gruyter Mouton, 2011. Geheime Schriften mittelalterlicher Sekten*. Ed. by Petra Seifert; Transl. by Manfred Pawlik. Pattloch, 1997. 472.

165. Ghegoiu, Silviu. *Waldensians at the Turn of the Fifteenth Century in the Duchy of Austria: Perception of Eresy and Action against Heretics: Master of Arts Thesis in Medieval Studies*. Budapest: Central European University, 2008. 51.

166. Giampiccoli, Franco, and Carlo Papini. *L'eredità del valdismo medievale*. Torino: Claudiana, 1974. 63.

167. Gilly, William Stephen. *Waldensian Researches during a Second Visit to the Vaudois of Piemont: with an Introductory Inquiry into the Antiquity and Purity of the Waldensian Church*. London: C. J. G. & F. Rivington, 1831. 626.

168. Given, James Buchanan. "A Medieval Inquisitor at Work: Bernard Gui, 3 March 1308 to 19 June 1323." In *Portraits of Medieval and Renaissance Living: Essays in Memory of David Herlihy*, 207–232. Ed. by Samuel Kline Cohn and Steven Epstein. Ann Arbor: University of Michigan Press, 1996.

169. Given, James Buchanan. *Inquisition and Medieval Society: Power, Discipline, and Resistance in Languedoc*. Ithaca, NY: Cornell University Press, 2018. 272.

170. *Gli Atti del Comune di Milano nel secolo XIII*. Vol. 2, pt. 1: 1251–1262. 4 vols. Ed. by Maria Franca Baroni. Alessandria: Tip. Ferraris, 1982.

171. Gonnet, Giovanni. "I valdesi d'Austria nella seconda metà del secolo XIV." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 111 (1962): 3–41.

172. Gonnet, Giovanni. "La Bibbia e i Valdesi medioevali." *Bollettino della Socità di Studi Valdesi* 149 (1979): 3–20.

173. Gonnet, Giovanni. "La prédication vaudoise à ses origines." In *La prédication sur un mode dissident: laïcs, femmes, hérétiques ... (XI.–XIV.) ; actes du 9. colloque du Centre d'Études Cathares/René Nelli, Couiza, 26–30 août 1996*, 93–121. Ed. by Beverly Mayne Kienzle. Carcassonne: Centre National d'Études Cathares, 1999.

174. Gonnet, Giovanni. *Enchiridion fontium valdensium*. Vol. 1. Du IIIe Concile de Latran au Synode de Chanforan (1179–1532). 2 vols. Torre Pellice: Claudiana, 1958. 189.

175. Gonnet, Giovanni. *Enchiridion fontium valdensium*. Vol. 2. De la fin du XIIe au début du XIVe siècle. 2 vols. Torino: Claudiana, 1998. 197.

176. Gonnet, Giovanni. *Il valdismo medioevale: Prolegomeni*. Torre Pellice: Società di Studi Valdesi, 1942. 135.

177. Gonnet, Giovanni. *Le confessioni di fede valdesi prima della Riforma*. Torino: Claudiana, 1967. 196.

178. Gougaud, Henri, and Michel Zink. *La Chanson de la croisade albigeoise: texte original*. Paris: Librairie générale française, 1989. 637.

179. Grundmann, Herbert. *Herbert Grundmann (1902–1970): Essays on Heresy, Inquisition, and Literacy*. Ed. by Jennifer Kolpacoff Deane. Woodbridge: York Medieval Press, 2019. 269.

180. Grundmann, Herbert. *Religious Movements in the Middle Ages: The Historical Links between Heresy, the Mendicant Orders, and the Women's Religious Movement in the Twelfth and Thirteenth Century, with the Historical Foundations of German Mysticism*. Ed. by Steven Rowan and Robert E. Lerner. Notre Dame: University of Notre Dame Press, 2005. 443.

181. Halilović, Smajo. "Trgovina robljem u srednjovjekovnoj Bosni s osvrtom na Usoru." *Članci i građa za kulturnu historiju istočne Bosne* 17 (2002): 37–45.

182. Hamilton, Bernard. "Cathar Links with the Balkans and Byzantium." In *Cathars in Question*, 131–150. Ed. by Antonio Sennis. Woodbridge: York Medieval Press, 2016.

183. Hammann, Gustav. "Waldenser in Ungarn, Siebenbürgen und der Slowakei." *Zeitschrift für Ostforschung: Länder und Völker im östlichen Mitteleuropa* Bd. 20, № 3 (1971): 428–441.

184. Hansen, Joseph. *Quellen und Untersuchungen zur Geschichte des Hexenwahns und der Hexenverfolgung im Mittelalter. Mit einer Untersuchung der Geschichte des Wortes Hexe*. Bonn: C. Georgi, 1901. 730.

185. Hasan, Mihai-Florin. "O privire asupra ereziei din Ungaria medievală: Cazul Transilvnean [Sec. XIV–XV]." Accessed 06.11.2022. http://www.medievistica.ro/texte/discipline conexe/istoria bisericii/Erezia.htm.

186. Haskins, Charles Homer. *Studies in Medieval Culture*. New York: Oxford University Press, 1929. 295.

187. Haupt, Herman. *Waldensertum und Inquisition im südöstlichen Deutschland*. Freiburg: Mohr, 1890. 126.

188. Hergemöller, Bernd-Ulrich. *Krötenkuss und schwarzer Kater: Ketzerei, Götzendienst und Unzucht in der inquisitorischen Phantasie des 13. Jahrhunderts*. Warendorf: Fahlsbuch, 1996. 456.

189. Herzog, Johann Jakob. *Die romanischen Waldenser: ihre vorreformatorischen Zustände und Lehren, ihre Reformation im 16. Jahrhundert und die Rückwirkungen derselben, hauptsächlich nach ihren eigenen Schriften dargestellt*. Halle: Eduard Anton, 1853. 492.

190. Höfler, Karl Adolf Constantin. *Concilia Pragensia 1353–1413: Prager Synodal-Beschlüsse, zum ersten Male zusammengestellt und mit einer Einleitung versehen*. Prag: K. Seyfried, 1862. 116.

191. Holinka, Rudolh. "Sektářství v Čechách před revolucí husitskou." *Sb. Filosofické Fakulty Univ. Komenského* 3, no. 6 (1929): 34–181.

192. Hoose, Adam L. "The 'Sabatati': the Significance of Early Waldensian Shoes, c. 1184–c. 1300." *Speculum* 91, no. 2 (April 2016): 356–373. https://doi.org/10.1086/685025.

193. Housley, Norman J. "Politics and Heresy in Italy: Anti-Heretical Crusades, Orders and Confraternities, 1200–1500." *The Journal of Ecclesiastical History* 33, no. 2 (1982): 193–208. https://doi.org/10.1017/s0022046900029584.

194. Howard-Johnston, James, and Peter Brown. Introduction. In *The Cult of Saints in Late Antiquity and the Middle Ages Essays on the Contribution of Peter Brown*, 1–24. Oxford: Oxford Univ. Pr, 2000.

195. Iohannis abbatis Victoriensis. *Liber certarum historiarum*. Vol. 2. Ed. by Fedor Schneider; Scriptores rerum germanicarum in usum scholarum ex Monumentis Germaniae historicis separatim editi. Hannoverae: impensis bibliopolii Hahniani, 1910. 358.

196. Jalla, Jean. *La Bibbia nella storia valdese*. Catania: La veloce, 1938. 16.

197. Jas, Michel. *Le saint, le pauvre et l'hérétique: essai critique sur François d'Assise, le «saint,» le modeste Valdès de Lyon, le «pauvre» et le curieux Nicétas, théologien du catharisme, presque irréel*. Maison-Laffitte: Ampelos Editions, 2017. 104.

198. Jones, William. *The History of the Waldenses: Connected with a Sketch of the Christian Church from the Birth of Christ to the Eighteenth Century*. 2nd ed. Vol. 2. 2 vols. London: Gale & Fenner, 1816. 456.

199. Kaelber, Lutz. "Other- and Inner-Worldly Asceticism in Medieval Waldensianism: A Weberian Analysis." *Sociology of Religion* 56, no. 2 (1995): 91–119. https://doi.org/10.2307/3711758.

200. Kieckhefer, Richard. *Repression of Heresy in Medieval Germany*. Liverpool: Liverpool University Press, 1979. 160.

201. Kienzle, Beverly Mayne. "Holiness and Obedience: Denouncement of Twelfth-Century Waldensian Lay Preaching." In *The Devil, Heresy and Witchcraft in the Middle Ages: Essays in Honor of Jeffrey B. Russell*, 259–278. Ed. by Alberto Ferreiro. Leiden: Brill, 1998.

202. Kienzle, Beverly Mayne. "Religious Poverty and the Search for Perfection." In *Christianity in Western Europe c. 1100–c. 1500*, 39–53. Cambridge History of Christianity; Ed. by Miri Rubin; Walter Simons. Cambridge: Cambridge University Press, 2009.

203. Kienzle, Beverly Mayne. *Cistercians, Heresy, and Crusade in Occitania, 1145–1229: Preaching in the Lord's Vineyard*. Woodbridge: York Medieval Press, 2001. 256.

204. Kienzle, Beverly Mayne. "The Prostitute-Preacher: Patterns of Polemic against Medieval Waldensian Women Preachers." In *Women Preachers and Prophets through Two Millennia of Christianity*, 99–113. Ed. by Beverly Mayne Kienzle and Pamela J. Walker. Berkeley: University of California Press, 1998.

205. Kłoczowski, Jerzy. *A History of Polish Christianity*. Cambridge: Cambridge University Press, 2000.

206. Kotełko, Stanisław. *Średniowieczne herezje w Świdnicy*. Accessed 05.11.2022. http://um.swidnica.pl/media/Encyklopedia/czescV.pdf.

207. Kramer, Susan R. *Sin, Interiority, and Selfhood in the Twelfth-Century West*. Studies and Texts, No. 200. Toronto: Pontifical Institute of Mediaeval Studies, 2015. 171.

208. Kras, Paweł. *Ad abolendam diversarum haeresium pravitatem: system inkwizycyjny w średniowiecznej Europie*. Lublin: Wydawnnictwo KUL, 2006. 532.

209. Kras, Paweł. "*Pro fidei defensione contra modernos haereticos.* Heretiques et inquisiteurs en Pologne au Moyen Age." *Heresis* 40 (2004): 69–94.

210. Kumor, Bolesław, Kazimierz Dola, and Zdzisław Obertyński. *Historia Kościoła w Polsce*. Vol. 1. Do roku 1764. Cz. 1, Do roku 1506. Poznań: Pallottinum, 1974. 464.

211. Kurze, Dietrich. *Quellen zur Ketzergeschichte Brandenburgs und Pommerns*. Berlin, NY: de Gruyter, 1975. 390.

212. Labuda, Gerard. *Historia Pomorza*. Vol. 1. Do roku 1466. Cz. 2. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 1969. 501.

213. Lambert, Malcolm David. *Medieval Heresy: Popular Movements from the Gregorian Reform to the Reformation*. 3rd ed. Oxford, UK; Malden, MA: B. H. Blackwell Ltd, 2002. 504.

214. Lauwers, Michel. "*Dicunt vivorum beneficia nichil prodesse defunctis. Histoire d'un thème polémique* (Xie–XIIe siècles)." In *Inventer l'hérésie ? Discours polémiques et pouvoirs avant l'inquisition*, 157–192. Ed. by Monique Zerner. Nice: Centre d'Études Médiévales, Faculté des Lettres, Art et Sciences Humaines, Université de Nice Sophia-Antipolis, 1998.

215. Lavenia, Vincenzo. *The Alpine Model of Witchcraft. The Italian Context in the Early Modern Period*. Accessed 02.11.2022. https://www.academia.edu/29857735/The_Alpine_Model_of_Witchcraft_The_Italian_Context_in_the_Early_Modern_Period.

216. Le Franc, Martin. *Sorcières partant au sabbat. Des Vaudoises passe Martin Le Champion des Dames. – Cambrai. Banque d'images.* Bibliothèque nationale de France. Accessed 02.11.2022. https://images.bnf.fr/#/detail/730227/45.

217. Leff, Gordon. *Heresy in the Later Middle Ages: The Relation of Heterodoxy to Dissent*. Manchester: Manchester Univ. Press, 1999. 800.

218. Lenoble, Clément. "L'économie des hérétiques: note sur le rapprochement entre usure et hérésie." In *Aux marges de l'hérésie. Inventions, formes et usages polémiques de l'accusation d'hérésie au Moyen Âge*, 111–152. Ed. by Franck Mercier and Isabelle Rosé. Rennes: Presses universitaires de Rennes, 2017.

219. *Lettres de Jacques de Vitry: (1160/1170–1240) évêque de Saint-Jean-D'Acre*. Ed. by Robert Burchard Constantijn Huygens. Leiden: Brill, 1960. 166.

220. Limborch, Philippus van. *Liber sententiarum inquisitionis Tholosanae ab anno Christi MCCVII ad annum MCCCXXIII*. Amstelodami: Apud H. Wetstenium, 1692. 397.

221. *L'inquisition en Quercy: Le registre des pénitences de Pierre Cellan 1241–1242*. Ed. by Jean Duvernoy. Castelnaud La Chapelle: L'Hydre éd., 2001. 285.

222. Lucioni, Alfredo. "L'età della Pataria." In *Diocesi di Milano*, 2nd ed., 167–194. Ed. by Adriano Caprioli, Antonio Rimoldi and Luciano Vaccaro. Brescia: La Scuola, 1990.

223. Macek, Josef. "Die böhmische und die deutsche radikale Reformation bis zum Jahre 1525." *Zeitschrift für Kirchengeschichte* 85 (1974): 149–173.

224. Manselli, Raoul. "'Una 'Summa auctoritatum' antiereticale (Ms 47 della Bibliothèque Municipale di Albi)»." *Atti della Accademia nazionale dei Lincei*, VIII, 28/6 (1985): 324–397.

225. Manselli, Raoul. "Dai movimenti religiosi popolari ai movimenti sociali del Trecento." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 146 (1979): 38–49.

226. Manselli, Raoul. *Studi sulle eresie del secolo XII*. 2nd ed. Roma: Istituto storico italiano per il medio evo, 1975. 341.

227. Manteuffel, Tadeusz. *Narodziny herezji*. Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 2008. 145.

228. McCallum, Dennis. *Waldensian Movement from Waldo to the Reformation*. Accessed 22.10.2022. https://dwellcc.org/learning/essays/waldensian-movement-waldo-reformation.

229. Meens, Rob. *Penance in Medieval Europe, 600–1200*. Cambridge: Cambridge University Press, 2014. 282.

230. Mercier, Franck, and Martine Ostorero. "The 'Waldensian Sect': Heresy and Witchcraft." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 395–421. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

231. Merlo, Grado Giovanni. "Distribuzione topografica e composizione sociale delle comunità valdesi in Piemonte nel basso Medioevo." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 95 (1974): 1–30.

232. Merlo, Grado Giovanni. "Identità religiose tra le popolazioni delle Alpi occidentali nel basso Medioevo." *Studi di storia medioevale e di diplomatica – Nuova Serie* 10 (2018): 85–106. https://riviste.unimi.it/index.php/SSMD/article/view/9715.

233. Merlo, Grado Giovanni. "La repressione antiereticale in Piemonte nel secolo XIV." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 138 (1975): 3–13.

234. Merlo, Grado Giovanni. "Pauperes spiritu valdesi." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 219, no. 133 (2016): 15–26.

235. Merlo, Grado Giovanni. "Pietro da Verona – San Pietro martire. Difficoltà e proposte per lo studio di un inquisitore beatificato." In *Culto dei santi, istituzioni, e classi sociali in età preindustriale*, 471–488. Ed. by Lucia Sebastiana and Sofia Boesch Gajano. L'Aquila: L U Japagre, 1984.

236. Merlo, Grado Giovanni. "Sul valdismo «colto» tra il XII e il XIV secolo." In *I valdesi e l'Europa*, 67–98. Eb. by Christine Thouzellier. Torre Pellice: Società di Studi Valdesi, 1982.

237. Merlo, Grado Giovanni. "Valdo (or Valdesius) of Lyons and the Poor in Spirit." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 11–33. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

238. Merlo, Grado Giovanni. "Who Were the Waldenses in Fourteenth-Century Piedmont?" In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 225–241. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

239. Merlo, Grado Giovanni. *Eretici del Medioevo: temi e paradossi di storia e storiografia*. Ied. Brescia: Morcelliana, 2011. 181.

240. Merlo, Grado Giovanni. *Eretici e inquisitori nella società piemontese del Trecento: con l'edizione dei processi tenuti a Giaveno dall'inquisitore Alberto de Castellario (1335) e nelle valli di Lanzo dall'inquisitore Tommaso di Casasco (1373)*. Torino: Claudiana, 1977. 316.

241. Merlo, Grado Giovanni. *Eretici ed eresie medievali*. Bologna: Il Mulino, 1989. 145.

242. Merlo, Grado Giovanni. *Identità valdesi nella storia e nella storiografia. Studi e discussioni*. Torino: Claudiana, 1991. 180.

243. Merlo, Grado Giovanni. *Valdesi e valdismi medievali. Itinerari e proposte di ricerca*. Torino: Claudiana, 1984. 158.

244. Miccoli, Giovanni. "La storia religiosa." In *Storia d'Italia*. Vol. 2. Dalla caduta dell'Impero Romano al secolo XVIII: 431–1079. In 6 Vol. a Cura di R. Romano, C. Vilanti. Torino: Einaudi, 1974.

245. Mick-Evans, Kenneth M. "A Bastion of Feminine Equality? Women's Roles in the Waldensian Movement," 2014. https://www.academia.edu/12235874/A_Bastion_of_Feminine_Equality_Womens_Roles_in_the_Waldensian_Movement.

246. Mikulka, Jaromír. *Polské země a herese v době před reformací*. Praha: Ústav dějin východní Evropy ČSAV, 1969. 144.

247. Modestin, Georg. "Der Augsburger Waldenserprozess und sein Straßburger Nachspiel (1393–1400)." *Zeitschrift des Historischen Vereins für Schwaben* 103 (2011): 43–68.

248. Modestin, Georg. "Ein Mainzer Inquisitor in Straßburg: Ketzerverfolgung und Ordensreform auf dem Lebensweg von Nikolaus Böckeler OP (1378–1400)." *Mainzer Zeitschrift: Mittelrheinisches Jahrbuch für Archäologie, Kunst und Geschichte* 102 (2007): 167–173.

249. Modestin, Georg. "Les vaudois de Strasbourg devant leurs juges. Une étude comparative. Berne (1399) – Fribourg/Suisse (1399) – Strasbourg (1400)." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 203, no. 125 (December 2008): 3–14.

250. Modestin, Georg. "The Anti-Waldensian Treatise *Cum dormirent homines*: Historical Context, Polemical Strategy, and Manuscript Tradition." In *Religious Controversy in Europe, 1378–1536: Textual Transmission and Networks of Readership*, 211–229. Ed. by Michael Van Dussen and Pavel Soukup. Turnhout: Brepols, 2013.

251. Modestin, Georg. "The Metamorphoses of the Anti-Witchcraft Treatise Errores Gazariorum." In *Demonology and Witch-Hunting in Early Modern Europe*, 49–64. Ed. by Julian Goodare, Rita Voltmer and Liv Helene Willumsen. Abingdon, Oxon: Routledge, Taylor & Francis Group, 2020.

252. Modestin, Georg. "The Waldensians of Upper Austria (1395–1399): The Middle Ages' 'Forgotten Heretics' in Historical Fact and Literary Fiction." In *New Perspectives on Heretical Discourse and Identitites. The Waldensians in Historical Context*, 165–185. Ed. by Sarah Alyn Stacey and Joanna Poetz; Medieval and Early Modern French Studies 19. Oxford/Bern/Berlin, 2021.

253. Modestin, Georg. "Western Germany Including Strasbourg." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 184–206. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

254. Modestin, Georg. *Ketzer in der Stadt: der Prozess gegen die Straßburger Waldenser von 1400*. Monumenta Germaniae Historica. Studien und Texte. Hannover: Hahnsche Buchhandlung, 2007. 169.

255. Modestin, Georg. *Quellen zur Geschichte der Waldenser von Straßburg: (1400–1401)*. Vol. 22. Monumenta Germaniae Historica. Quellen zur Geistesgeschichte des Mittelalters. Hannover: Hahnsche Buchhandlung, 2007. 287.

256. Mölk, Ulrich. "La Chanson de saint Alexis et le culte du saint en France aux XIe et XIIe siècles." *Cahiers de civilisation médiévale* 21, no. 84 (1978): 339–355. https://doi.org/10.3406/ccmed.1978.2088.

257. Molnár, Amedeo. *La protesta valdese e la prima Riforma*. Gioventu evangelica italiana, 1966. 43.

258. Molnár, Amedeo. *Storia dei valdesi*. Vol. 1. Dalle origini all'adesione alla Riforma. 2 vols. Torino: Claudiana, 1989. 377.

259. Montanari, Paolo. "Valdesi a Milano tra XII e XIII secolo." *Revue de l'histoire des religions* 217, no. 1 (2000): 59–74. https://doi.org/10.3406/rhr.2000.1071.

260. Monter, William E. *Witchcraft in France and Switzerland: The Borderlands during the Reformation*. Ithaca and London: Cornell University Press, 1976. 232.

261. *Monumenta Vaticana res gestas Bohemicas illustrantia, sumptibus comitiorum regni Bohemiae ediderunt ad recensendos historiae Bohemicae fontes delegati*. Vol. 5. Acta Urbani VI. et Bonifatti IX, 1378–1404. 7 vols. Pragae: Typis Gregerianis, 1903. 630.

262. Moore, Robert Ian. "Heresy, Repression, and Social Change in the Age of Gregorian Reform." In *Christendom and Its Discontents: Exclusion, Persecution and Rebellion, 1000–1500*, 19–46. Ed. by Scott L. Waugh and Peter Diehl. Cambridge: Cambridge University Press, 2002.

263. Moore, Robert Ian. "Postface." Afterword. In *Inventer l'hérésie ? Discours polémiques et pouvoirs avant l'inquisition*, 263–269. Ed. by Monique Zerner. Nice: Centre d'Études Médiévales, Faculté des Lettres, Art et Sciences Humaines, Université de Nice Sophia-Antipolis, 1998.

264. Moore, Robert Ian. "The Birth of Popular Heresy: A Millennial Phenomenon?" *Journal of Religious History* 24, no. 1 (2002): 8–25. https://doi.org/10.1111/1467-9809.00098.

265. Moore, Robert Ian. *The Formation of a Persecuting Society: Authority and Deviance in Western Europe, 950–1250*. Carlton: John Wiley & Sons, 2008. 240.

266. Moore, Robert Ian. *The Origins of European Dissent*. Oxford: Blackwell, 1985. 336.

267. Moore, Robert Ian. *The War on Heresy: Faith and Power in Medieval Europe*. London: Profile Books Ltd, 2014. 378.

268. Morris, Colin. *The Papal Monarchy: The Western Church from 1050 to 1250*. Oxford: Clarendon Press, 1991. 673.

269. Müller, Daniela. *Frauen vor der Inquisition. Lebensform, Glaubenszeugnis und Aburteilung der deutschen und französischen Katharerinnen*. Mainz: P. von Zabern, 1996. 477.

270. Muston, Alexis. *Israel of the Alps*. 2 vols. The Baptist Standard Bear, 2001.

271. Neumann, Augustin. "Nové doklady k dějinám Valdenských v Čechách." *Čas. pro Katolické Duchowenstwo* 9/10 (1925): 674–681.

272. Nickson, Margaret Anne Eugenie. "The «Pseudo-Reinerius» Treatise, the Final Stage of a Thirteenth Century Work on Heresy from the Diocese of Passau." *Archives d'histoire doctrinale et littéraire du Moyen Âge* 34 (1967): 255–314.

273. Nigg, Walter. *Das Buch der Ketzer*. Zürich: Artemis-Verlag, 1949. 525.

274. Ogórek, Magdalena. *Beginki i Waldensi na Śląsku i Morawach do końca XIV wieku*. Racibórz: Wydawn. i Agencja Wydawn. WAW Grzegorz Wawoczny, 2012. 291.

275. Ogórek, Magdalena. "Echa z przesłuchań waldensów na średniowiecznym Śląsku i Morawach." *Zeszyty naukowe* 2 (27) (2007): 124–134.

276. Ogórek, Magdalena. "Świdniccy heretycy w 1315 roku." *Zeszyty Naukowe / Wyższa Szkoła Zarządzania i Prawa im. Heleny Chodkowskiej w Warszawie* 15, no. 2 (2010): 143–153.

277. *Ordonnances des roys de France de la troisieme race, recueillies par ordre chronologique*. Vol. 1. 21 vols. Ed. by Eusèbe Laurière etc. Paris: Imprimerie royale, 1723. 900.

278. Ostorero, Martine. "Des papes face à la sorcellerie démoniaque (1409–1459): une dilatation du champ de l'hérésie ?" In *Aux marges de l'hérésie. Inventions, formes et usages polémiques de l'accusation d'hérésie au Moyen Âge*, 153–184. Ed. by Franck Mercier and Isabelle Rosé. Rennes: Presses universitaires de Rennes, 2017.

279. Palacký, František. "O stycích a poměru sekty Waldenské k někdejším v Čechách." *Čas. Musea Království Českého* 42, no. 4 (1868): 291–320.

280. Palombaro, Ottavio. "Reality and Representations of the Doctrine of Justification in Early Waldensian Preaching." *Medieval Sermon Studies* 64, no. 1 (2020): 77–84. https://doi.org/10.1080/13660691.2020.1815435.

281. Papini, Carlo. "Il «Libro degli Eletti» (1335–1340) e i valdesi delle Puglie." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 195 (2004): 3–30.

282. Papini, Carlo. *Valdo di Lione e i «poveri nello spirito». Il primo secolo del movimento valdese (1170–1270)*. Torino: Claudiana, 2002. 549.

283. Paravy, Pierrette. *De la chrétienté romaine à la Réforme en Dauphiné: Évêques, fidèles et déviants, vers 1340–vers 1530*. Rome: École Fançaise de Rome, 1993. 1536.

284. Paravy, Pierrette. "Waldensians in the Dauphiné (1400–1530): from Dissidence in Texts to Dissidence in Practice." In *Heresy and Literacy: 1000–1530*, 160–175. Cambridge: Cambridge University Press, 1994.

285. Matthi Parisiensis, Monachi Santi Albani. *Chronica Majora*. Vol. 3. 1216–1239. Ed. by Henry Richards Luard. London: Longman, 1876. 685.

286. Pater, Józef. "7. Złote biskupstwo (1301–1376)." *Z dziejów archidiecezji wrocławskiej*. Accessed 05.11.2022. https://www.archidiecezja.wroc.pl/index.php?option=com_content&view=article&id=17:7-zote-biskupstwo-1301-1376&catid=6:historia&Itemid=15.

287. Pater, Józef. "8. Upadek biskupstwa w późnym średniowieczu (1376–1482)." *Z dziejów archidiecezji wrocławskiej*. Accessed 05.11.2022. https://www.archidiecezja.wroc.pl/index.php?option=com_content&view=article&id=18:8-upadek-biskupstwa-w-ponym-redniowieczu-1376-1482&catid=6:historia&Itemid=15.

288. Patria, Luca. "«Sicut canis reddiens ad vomitum»: lo spaesamento dei valdesi nel balivato sabaudo della diocesi di Torino fra Tre e Quattrocento." In *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca*, 121–161. Ed. by Gabriel Audisio and Marina Benedetti. Torino: Claudiana, 2009.

289. Patrologiae cursus completus. Series latina: in 221 t. Ed. by Jacques Paul Migne. Paris, 1844–1865. **Працытавана як PL.**

290. Patschovsky, Alexander, and Kurt-Victor Selge. *Quellen zur Geschichte der Waldenser*. Vol. 18. Texte zur Kirchen- und Theologiegeschichte. Gütersloh: Gütersloher Verlagshaus Mohn, 1973. 106.

291. Patschovsky, Alexander. "Der Ketzer als Teufelsdiener." In *Papsttum, Kirche und Recht im Mittelalter: Festschrift für Horst Fuhrmann zum 65. Geburtstag*, 317–334. Ed. by Hubert Mordek and Horst Fuhrmann. Tübingen: Niemeyer, 1991.

292. Patschovsky, Alexander. "The Literacy of Waldensianism from Valdes to c. 1400." In *Heresy and Literacy: 1000–1530*, 112–136. Ed. by Peter Biller and Anne Hudson. Cambridge: Cambridge University Press, 1994.

293. Patschovsky, Alexander. "Waldenserverfolgung in Schweidnitz 1315." *Deutsches Archiv für die Erforschung des Mittelalters* 36 (1980): 137–176.

294. Patschovsky, Alexander. *Der Passauer Anonymus: Ein Sammelwerk über Ketzer, Juden, Antichrist aus der Mitte des 13. Jahrhunderts*. Schriften der Monumenta Germaniae Historica. Stuttgart: Hiersemann, 1968. 208.

295. Patschovsky, Alexander. *Die Anfänge einer ständigen Inquisition in Böhmen: Ein Prager Inquisitoren-Handbuch aus der ersten Hälfte des 14. Jahrhunderts*. Berlin (West): de Gruyter, 1975. 319.

296. Patschovsky, Alexander. *Quellen zur Böhmischen Inquisition im 14. Jahrhundert*. Weimar: Hermann Böhlaus Nachfolger, 1979. 411.

297. Pegg, Mark Gregory. "The Paradigm of Catharism; or, the Historians' Illusion." In *Cathars in Question*, 21–52. Woodbridge: York Medieval Press, 2016.

298. Perrin, Jean Paul. *Histoire des Vaudois. Divisée en trois parties*. A Geneve: Pour Pierre & Iaques Chouët, 1569. https://play.google.com/store/books/details?id=ucQAAAAcAAJ&rdid=book-ucQAAAAAcAAJ&rdot=1.

299. Petreman, Cheryl. *Peter Zwicker: A Fair but Fervent German Inquisitor*. Accessed 30.06.2015. https://www.academia.edu/7519093/Peter_Zwicker_A_Fair_but_Fervent_German_Inquisitor.

300. Peyran, Jean Rodolphe. *An Historical Defence of the Waldenses or Vaudois, Inhabitants of the Valleys of Piedmont*. London: C. & J. Rivington, 1826. 534.

301. Pinagro, Claudia. "Eroine marginali nella storia: donne Valdesi tra storia e storiografia." *SinTesi*, 2007. https://www.academia.edu/36568848/Eroine_marginali_nella_storia_Donne_Valdesi_tra_storia_e_storiografia.

302. Piskorski, Jan Maria. *Kolonizacja wiejska Pomorza Zachodniego: w XIII i w początkach XIV wieku na tle procesów osadniczych w średniowiecznej Europie.* Poznań: PTPN, 2005. 301.

303. Pluquet François-André-Adrien, and Jacques Paul Migne. *Dictionnaire des hérésies, des erreurs et des schismes. Suivi d'un Dictionnaire des jansénistes.* Paris: Chez l'éditeur, 1853. 674.

304. Pons, Aline, and Matteo Rivoira. "Le lingue dei valdesi." *Riforma e movimenti religiosi (RMR): Rivista della Società di Studi Valdesi* 3 (June 2018): 379–395.

305. Popiołek, Kazimierz. *Historia śląska od pradziejów do 1945 roku.* Katowice: Śląsk, 1984. 791.

306. Potkowski, Edward. *Heretycy i inkwizytorzy.* Warszawa: Bellona, 2011. 156.

307. Pouzet, Philippe. *La vie de Guichard, abbé de Pontigny, 1136–1165 et archevêque de Lyon, 1165–1181.* Lyon: Impr. M. Audin, 1929. 150.

308. Powell, James M. "Religious Diversity and Communal Politics in Thirteenth-Century Italy." In *Portraits of Medieval and Renaissance Living: Essays in Memory of David Herlihy*, 363–381. Ann Arbor: University of Michigan press, 1996.

309. Preger, Wilhelm. "Beiträge zur Geschichte der Waldesier im Mittelalter." In *Abhandlungen der Königlich-bayerischen Akademie der Wissenschaften München, Historische Classe* 13, 182–250. München, 1875.

310. Rambaldi, Peyronel Susanna, and Marco Fratini. *1561, I valdesi tra resistenza e sterminio. In Piemonte e in Calabria.* Torino: Claudiana, 2011. 62.

311. *Raymond de Sainte-Foy, Deacon of the Vaudois Sect. Confession 3. San Jose State University.* Accessed 22.10.2022. https://www.sjsu.edu/people/nancy.stork/jacques-fournier/Raymond-de-Sainte-Foy-FINAL.pdf.

312. Regiewicz, Adam. *Wizerunek heretyka w średniowiecznym piśmiennictwie polskim.* Katowice: Biblioteka Śląska, 2002. 173.

313. Rehr, Jean-Paul. "Re-Mapping the 'Great Inquisition' of 1245–46: The Case of Mas-Saintes-Puelles and Saint-Martin-Lalande." *Open Library of Humanities* 5, no. 1 (2019): 1–52.

314. Říčan, Rudolf. *Die Böhmischen Brüder, ihr Ursprung und ihre Geschichte.* Mit einem Kapitel über die Theologie der Brüder von Amedeo Molnár. Berlin: Union Verlag, 1961. 375.

315. Roach, Andrew P. *The Devil's World: Heresy and Society 1100–1300.* Routledge, 2019. 288.

316. Roach, Andrew P. Review of Salvo Burci. *Liber suprastella.* Ed. by Caterina Bruschi. [Fonti per la storia dell Italia medievale. Antiquitates, 15] (Rome: Istituto storico italiano per il Medio Evo. 2002.). *The Catholic Historical Review* 94, no. 1, (January 2008): 140–142.

317. Ronchi de Michelis, Laura. "Il movimento valdese nella storiografia russa e sovietica." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 144 (1978): 71–76.

318. Rostagno, Giovanni. *i valdesi italiani: le loro lotte e la loro fede.* Torino: Chiese Valdesi d'Italia, 1938. 16.

319. Rouse, Mary A., and Richard H. Rouse. "The Schools and the Waldensians: a New Work by Durand of Huesca." In *Christendom and Its Discontents: Exclusion, Persecution*

and Rebellion, 1000–1500, 86–111. Ed. by Scott L. Waugh and Peter Diehl. Cambridge: Cambridge University Press, 2002.

320. Rubellin, Michel. "Au temps où Valdès n'était pas hérétique: hypothèse sur le rôle de Valdès à Lyon (1170–1183)." *Église et société chrétienne d'Agobard à Valdès*, 2003, 455–478. https://doi.org/10.4000/books.pul.19224.

321. Russell, Jeffrey Burton, and Douglas W. Lumsden. *A History of Medieval Christianity: Prophecy and Order*. New York: Peter Lang, 2000. 205.

322. Russell, Jeffrey Burton. *Dissent and Order in the Middle Ages: The Search for Legitimate Authority.* Eugene, Or.: Wipf & Stock, 2005. 128.

323. Russell, Jeffrey Burton. *Dissent and Reform in the Early Middle Ages*. Berkeley: University of California Press, 1965. 323.

324. Rymar, Edward. "Waldensi z «kacerskich» okolic Chojny w XIV–XV wieku." In *Rocznik Chojenski: pismo historyczno-społeczne*, 7–33. Chojna: Stow. Hist.-Kulturalne "Terra incognita", 2009.

325. Sackville, Lucy J. "The Textbook Heretic: Moneta of Cremona's Cathars." In *Cathars in Question*, 208–228. Ed. by Antonio Sennis. Woodbridge: York Medieval Press, 2016.

326. Sackville, Lucy J. *Heresy and Heretics in the Thirteenth Century: The Textual Representations*. Woodbridge: York Medieval Press, 2014. 224.

327. Samsonowicz, Henryk. "Śląsk w Europie w czasach Henryka IV Probusa." In *Śląsk w czasach Henryka IV Prawego*, 7–11. Ed. by Krzysztof Wachowski; Wratislavia Antiqua. Studia z Dziejów Wrocławia, 8. Wrocław: Uniwersytet Wrocławski, Instytut Archeologii, 2005.

328. San Bernardino da Siena. *Le prediche volgari di san Bernardino da Siena: dette nella piazza del Campo l'anno MCCCCXXVII*. Ed. by Luciano Banchi. Siena: Tip. Edit. All'Inseg. Di S. Bernardino, 1884. 462.

329. Santerini, Milena. "Durando d'Osca e il Liber Antiheresis: Predicazione e povertà, vocazione dei primi valdesi." *Bollettino della Società do Studi Valdesi* 148, no. 98 (1978): 53–69.

330. Schaff, Philip. *The Creeds of Christendom, with a History and Critical Notes*. Vol. 1. The history of creeds. 3 vols. Ed. by Philip Schaff. Whitefish, Mt.: Kessinger Publishing, 2009. 1263.

331. Schneider, Martin. *Europäisches Waldensertum im 13. und 14. Jahrhundert: Gemeinschaftsform, Frömmigkeit, sozialer Hintergrund*. Berlin: de Gruyter, 1981. 157.

332. Schrupp, Antje. "Waldensi." In *Heretycy: Panorama dziejów myśli kacerskiej i ruchu dysydenckiego w chrześcijaństwie*, 189–198. Ed. by Adolf Holl; Przeł. [z Niem.] Elżbieta Ptaszyńska-Dutkiewicz. Gdynia: Uraeus, 1997.

333. Scuderi, Giovanni. "I fondamenti teologici della non violenza nel valdismo anteriore al XVI secolo." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 129, no. 92 (1971): 3–14.

334. Selge, Kurt-Victor. "Il Valdismo medievale tra conservazione e rivoluzione." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 133 (1973): 3–16.

335. Selge, Kurt-Victor. *Die ersten Waldenser*. Vol. 1. Untersuchung und Darstellung. 2 vols. Arbeiten zur Kirchengeschichte. Berlin: de Gruyter, 1967. 320.

336. Selge, Kurt-Victor. *Die ersten Waldenser*. Vol. 2. Der *Liber antiheresis* des Durandus von Osca. 2 vols. Arbeiten zur Kirchengeschichte. Berlin: de Gruyter, 1967. 287.

337. Shahar, Shulamith. *Women in a Medieval Heretical Sect: Agnes and Huguette the Waldensians*. Woodbridge: Boydell & Brewer, 2001. 184.

338. Shogimen, Takashi. "William of Ockham and Conceptions of Heresy, C.1250–C.1350." In *Heresy in Transition Transforming Ideas of Heresy in Medieval and Early Modern Europe*, 59–70. Ed. by Ian Hunter, John Christian Laursen, Cary J. Nederman. London: Taylor and Francis, 2016.

339. Skrzypiec, Katarzyna. "Sekretna wieczerza, czyli o heretykach budzących sympatię." *Mówią Wieki* 4 (2009): 33–37.

340. Smelyansky, Eugene. *Heresy and citizenship: Persecution of heresy in late medieval German cities*. New York: Routledge, Taylor & Francis Group, 2021. 185.

341. Smith, Damian J. "The Early Waldenses and the Catholic Poor in the Crown of Aragon (12th–13th Centuries)." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 78–97. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

342. Sossi, Andrea. *Medioevo valdese, 1173–1315: Paupertas, Eucarestia e Predicazione: tra identità minoritaria e rappresentazione cifrata del rapporto tra l'uomo e l'Assoluto*. Trento: UNI Service, 2010. 240.

343. Stancati, Enzo, Arturo Genre, and Attilio Merlo. *I calabro-valdesi. Guida ai luoghi storicii*. Torino: Claudiana, 1986. 128.

344. Stock, Brian. *The Implications of Literacy: Written Language and Models of Interpretation in the Eleventh and Twelfth Centuries*. Princeton: Princeton University Press, 1983. 604.

345. Strong, C. H. *A Brief Sketch of the Waldenses*. Lawrence, Kan,: J. S. Boughton, 1893. 222.

346. Sundstedt, Arthur. *Valdes – der Ketzerprediger: An der Schwelle zur Inquisition*. Kreuzlingen: Dynamis-Verlag, 1992. 137.

347. Swoboda, Wincenty. "Początki herezji na ziemiach polskich." In *Europa – Słowiańszczyzna – Polska. Studia ku uczczeniu Prof. Kazimierza Tymienieckiego*, 385–396. Poznań: Uniwersytet, 1970.

348. Swoboda, Wincenty. "Waldensi na Pomorzu Zachodnim i w Nowej Marchii w świetle protokołów szczecińskiej inkwizycji z lat 1392–1394." In *Materialy Zachodniopomorskie* 19, 493–509. Szczecin: Muzeum Pomorza Zachodniego, 1973.

349. Szymański, Janusz Władysław. *Waldensi*. Goleniów: Oficyna Wydawnicza "Ston 2," 2015. 211.

350. Szymański, Jarosław. "*Articuli secte Waldensium* na tle antyheretyckich zbiorów rękopiśmiennych Biblioteki Uniwersytetu Wrocławskiego." *Studia Źródłoznawcze* 42 (2004): 85–96.

351. Szymański, Jarosław. *Ruchy heretyckie na Śląsku w XIII i XIV wieku*. Katowice; Kraków: Fund. «Zamek Chudów» ; Inst. Książki, 2007. 222.

352. Szymański, Jarosław. "Johannes Swenkenfeldt – inquisitor et martyr." *Śląski Kwartalnik Historyczny Sobótka* 1 (2003): 1–17.

353. Tasca, Francesca. "La famiglia dell'eretico: dalla normalità all'esclusione. Una fonte emblematica." In *Verwandtschaft, Freundschaft, Bruderschaft: Soziale Lebens- und Kommunikationsformen im Mittelalter*, 330–342. Ed. by Gerhard Krieger. Berlin: Akademie Verlag, 2009.

354. Tasca, Francesca. "La prima predicazione di Valdo? Riflessioni sul «Chronicon Universale» di Laon." In *Predicazione e repressione. Processi e letteratura religiosa*, 181–201. A cura di Andrea Giraudo e Matteo Rivoira. Torino: Claudiana, 2018.

355. Tasca, Francesca. *Maggio 1218: il colloquio di Bergamo un dibattito agli inizi della storia valdese* Torino: Claudiana, 2020. 217.

356. Tasca, Francesca. "Le predicatrici valdesi medievali: «mundus reversus et perversus» o «mundus novus»? Sulla testimonianza custodita nel «Super Apocalypsim» di Goffredo d'Auxerre." *Museikon* 6 (2022): 9–22.

357. Tasca, Francesca. "Sulla conversione religiosa di Valdesio. Per una rilettura dell'exemplum «De quodam divite sponte sua facto paupere»." *Bollettino della Società di Studi Valdesi* 197 (2005): 113–132.

358. Taylor, Claire. "«Heresy» in Quercy in the 1240s: Authorities and Audienses." In *Heresy in Medieval France: Dualism in Aquitaine and the Agenais, 1000–1249*, 239–256. Ed. by Andrew P. Roach. Farnham: Ashgate, 2013.

359. Taylor, Claire. "A Presence in Languedoc (12th–13th Centuries)." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 35–77. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

360. Taylor, Claire. "Catharism and Heresy in Milan." In *Heresy and the Making of European Culture: Medieval and Modern Perspectives*, 383–401. Medieval and Modern Perspectives; Ed. by Andrew P. Roach. Farnham: Ashgate, 2013.

361. Tedesco, Vincenzo. "Le comunità valdesi in Calabria dall'insediamento alla repressione del 1561. Status quaestionis e prospettive di ricerca." *Rogerius* 17/2 (2014): 45–58.

362. Théry-Astruc, Julien. "The Heretical Dissidence of the 'Good Men' in the Albigeois." In *Cathars in Question*, 79–111. Ed. by Antonio Sennis. Woodbridge: York Medieval Press, 2016.

363. Tice, Paul. *History of the Waldenses: From the Earliest Period to the Present Time*. Escondido, CA: Book Tree, 2003. 180.

364. Tinctor, Jean. *Adoration du bouc. Traité du crime de vauderie*. Bibliothèque nationale de France. Accessed 02.11.2022. http://expositions.bnf.fr/flamands/grand/fla_212.htm.

365. Tocco, Felice. *Quel che non c'è nella Divina commedia, o Dante e l'eresia. Con documenti e con la ristampa delle questioni dantesche*. Bologna: Zanichelli, 1899. 93.

366. Tolonen, Pekka. "Medieval Memories of the Origins of the Waldensian Movement." In *History and Religion: Narrating a Religious Past*, 165–188. Ed. by Bernd-Christian Otto, Susanne Rau and Jörg Rüpke. Berlin, München, Boston: de Gruyter, 2015.

367. Toti, Daniel. "Sulle prime historiae di catari e valdesi: dall'unità alla diversità attraverso la repressione." In *Predicazione e repressione. Processi e letteratura religiosa*, 41–64. A cura di Andrea Giraudo e Matteo Rivoira. Torino: Claudiana, 2018.

368. Tourn, Giorgio. "Piotr Waldes." In *Heretycy: Panorama dziejów myśli kacerskiej i ruchu dysydenckiego w chrześcijaństwie*, 26–30. Ed. by Adolf Holl; Przeł. [z niem.] Elżbieta Ptaszyńska-Dutkiewicz. Gdynia: Uraeus, 1997. 378.

369. Tourn, Giorgio. *I valdesi: identitá e storia*. Torino: Claudiana, 2003. 94 p.

370. Tourn, Giorgio. *I valdesi: La singolare vicenda di un popolo-chiesa (1170–1976)*. 2nd ed. Torino: Claudiana, 1993. 282.

371. Trawkowski, Stanisław. *Między herezją a ortodoksją: rola społeczna premonstratensów w XII wieku*. Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1964. 213.

372. Treesh, Susanna K. "The Waldensian Recourse to Violence." *Church History* 55, no. 3 (1986): 294–306. https://doi.org/10.2307/3166819.

373. Trevor-Roper, Hugh Redwald. "The European Witch-Craze of the 16th and 17th Centuries." In *The Crisis of the Seventeenth Century Religion, the Reformation, and Social Change*, 62–115. Ed. by Hugh Redwald Trevor-Roper. Indianapolis: Liberty Fund, 2001.

374. Truhlář, Josef. "Paběrky z rukopisů Klementinských (LXIV. Inkvisice Waldenských v Trnavě r. 1400)." *Český časopis historický* 9 (1903): 196–198.

375. Utz Tremp, Kathrin. "'Parmi les hérétiques...»: la Vierge Marie dans le registre d'inquisition de L'évêque Jacques Fournier de Pamiers (1317–1326)." In *Marie. Le culte de la Vierge dans la société médiévale*, 533–560. Ed. by Dominique Iogna-Prat, Éric Palazzo and Daniel Russo. Paris: Beauchesne, 1996.

376. Utz Tremp, Kathrin. "Ein Ausweg aus der Kontroverse um den «Katharismus»?" *Deutsches Archiv für Erforschung des Mittelalters* 77 (2021): 651–668.

377. Utz Tremp, Kathrin. "Une contribution à la Bible vaudoise?: Le 'Miroir de Souabe' de Hensli Ferwer (Fribourg, 1410)." In *Valdesi medievali: bilanci e prospettive di ricerca*, 113–120. Torino: Claudiana, 2009.

378. Utz Tremp, Kathrin. "Von der Häresie zur Hexerei. Waldenser- und Hexenverfolgungen im heutigen Kanton Freiburg (1399–1442)." *Schweizerische Zeitschrift für Geschichte* 52 (2002): 115–121.

379. Utz Tremp, Kathrin. *Quellen zur Geschichte der Waldenser von Freiburg im Üchtland: 1399–1439*. Monumenta Germaniae Historica. Quellen zur Geistesgeschichte des Mittelalters. Hannover: Hahn, 2000. 837.

380. Utz Tremp, Katrin. "Fribourg (Switzerland)." In *A Companion to the Waldenses in the Middle Ages* 103, 207–222. Brill's Companions to the Christian Tradition; Ed. by Marina Benedetti and Euan Cameron. Leiden: Brill, 2022.

381. Valodzina, Aliaksandra. "The Topoi of «Three Orients» and Translatio Studii in Waldensian Anti-Cathar Polemic." В *Проблемы современного востоковедения* [Электронный ресурс]: материалы III Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 29–30 июня 2023 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. Р. Боровой (гл. ред.) [и др.]. (Минск : БГУ, 2023), стр. 19–25.

382. Välimäki Reima. "More Powerful than Mere Matter? Forbidden but Practiced Material Religion among the Late Medieval German Waldensians." In *Tangible Religion: Materiality of Domestic Cult Practices from Antiquity to Early Modern Era*, 239–253. Ed. by Ria Berg, Antonella Coralini, Anu Kaisa Koponen and Reima Välimäki. Roma: Institutum Romanum Finlandiae, 2021.

383. Välimäki Reima. *Heresy in Late Medieval Germany: The Inquisitor Petrus Zwicker and the Waldensians*. Woodbridge: York Medieval Press, 2019. 335.

384. Välimäki, Reima. "Bishops and the Inquisition of Heresy in Late Medieval Germany." In *Dominus Episcopus: Medieval Bishops between Diocese and Court*, 185–206. Ed. by Elena Balzamo and Anthony Lappin. Stockholm: Kungl. Vitterhets Historie och Antikvitets Akademien, 2018.

385. Välimäki, Reima. "Imagery of Disease, Poison and Healing in the Late Fourteenth-Century Polemics against Waldensian Heresy." In *Infirmity in Antiquity and the Middle Ages: Social and Cultural Approaches to Health, Weakness and Care*, 137–152. Ed. by Christian Krötzl, Katariina Mustakallio and Jenni Kuuliala. London: Routledge, Taylor & Francis Group, 2016.

386. Välimäki, Reima. "Transfers of Anti-Waldensian Material from a Polemical Treatise to a Didactic Text." *Medieval Worlds* 7 (2018): 153–169. https://doi.org/10.1553/medievalworlds_no7_2018s153.

387. Vedder, Henry C. "Origin and Early Teachings of the Waldenses, According to Roman Catholic Writers of the Thirteenth Century." *The Amer. J. of Theology* 4, no. 3 (1900): 465–489.

388. Violante, Cinzio. "Eresie urbane e eresie rurali in Italia dall'XI al XIII secolo." In *Medioevo ereticale*, 185–212. Ed. by Ovidio Capitani. Bologna: Il Mulino, 1977.

389. Visconti, Joseph. *The Waldensian Way to God: Following the Light through Eight Centuries of Darkness and Discord*. Longwood, Fl.: Xulon Press, 2003. 576.

390. Volpe, Gioacchino. *Movimenti religiosi e sette ereticali nella società medievale italiana (secoli XI–XIV)*. Roma: Donzelli Editore, 1997. 267.

391. Waite, Gary K. *Heresy, Magic, and Witchcraft in Early Modern Europe*. New York, NY: Palgrave Macmillan, 2003. 284.

392. Wakefield, Walter L. *Heresy, Crusade and Inquisition in Southern France, 1100–1250*. Berckeley: University of California Press, 1974. 288.

393. Wakefield, Walter L., and Austin Patterson Evans. *Heresies of the High Middle Ages: Selected Sources Translated and Annotated*. New York: Columbia University Press, 1991. 865.

394. Walther, Daniel. "Were the Albigenses and Waldenses Forerunners of the Reformation?" In *Andrews University Seminary Studies* 6.2, 6.2:178–202. Accessed 22.10.2022. https://digitalcommons.andrews.edu/auss/vol6/iss2/5.

395. Wattenbach, Wilhelm. *Über die Inquisition gegen die Waldenser in Pommern und der Mark Brandenburg*. Verlag der Königl. Akademie der Wissenschaften, 1886. 102.

396. Webb, Diana M. "The Pope and the Cities: Anticlericalism and Heresy in Innocent HI's Italy." *Studies in Church History. Subsidia* 9 (1991): 135–152. https://doi.org/10.1017/s0143045900001915.

397. Wickham, Hill Dawe. *An Historical Sketch of the Italian Vaudois: From the First Age of Christianity to the Present Day; with Some Account of Their Ancient Documents*. London: Seeley, Burnside & Seeley, 1847. 232.

398. Willyams, Jane Louisa. *A Short History of the Waldensian Church in the Valleys of Piedmont, from the Earliest Period to the Present Time*. London: Nisbet, 1855. 328.

399. Wingerd, Joshua. "«Poor Preaching Protestants»: a Brief Discussion of the Waldenses." Accessed 22.10.2022. https://www.academia.edu/11593267/Poor_Preaching_Protestants.

400. Wrzesiński, Szymon. *Inkwizycja na ziemiach polskich*. Zakrzewo: Replika, 2009. 216.

401. Wyrozumski, Jerzy. "Z dziejów waldensów w Polsce średniowiecznej." *„Zeszyty Naukowe Uniwersytetu Jagiellońskiego», t. 469, Prace Historyczne* 56 (1977): 39–50.

402. Zanella, Gabriele. *Itinerari ereticali. Patari e Catari tra Rimini e Verona*. Roma: Istituto storico italiano per il Medio Evo, 1986. 128.

403. Zanoni, Luigi. "Valdesi a Milano nel secolo XIII." *Archivio storico lombardo* 39 (1912): 5–22.

404. Zanoni, Luigi. *Gli umiliati nei loro rapporti con l'eresia, l'industria della lana ed i Comuni nei secoli XII e XIII sulla scorta di documenti inediti*. Milano: Hoepli, 1911. 381.

405. Zbiral, David. "Inkviziční záznamy jako pramen historického bádání: Možnosti, omezení, strategie čtení." *Studie a eseje* 2 (2012). https://www.academia.edu/37846101/Inkviziční_záznamy_jako_pramen_historického_bádání_Možnosti_omezení_strategie_čtení_Inquisitorial_Records_as_a_Historical_Source_Their_Potential_Limitations_and_Strategies_of_Reading.

406. Zbiral, David. "The Medieval Inquisitors' Theory of Sects: Towards One Religious Theory of Religion." Accessed 22.10.2022. https://www.academia.edu/16594628/The_Medieval_Inquisitors_Theory_of_Sects_Towards_One_Religious_Theory_of_Religion.

407. Zerner, Monique. "Au temps de l'appel aux armes contre les hérétiques: du *Contra Henricum* du moine Guillaume aux *Contra hereticos*." In *Inventer l'hérésie ? Discours polémiques et pouvoirs avant l'inquisition*, 119–156. Ed. by Monique Zerner. Nice: Centre d'Études Médiévales, Faculté des Lettres, Art et Sciences Humaines, Université de Nice Sophia-Antipolis, 1998.

408. Zerner, Monique. "L'hérétique Henri dans les sources de son temps (1135–1145)." *Revue Mabillon* 25 (2014): 79–134. https://doi.org/10.1484/j.rm.5.105260.

409. Арсеньев, Иоанн. *От Карла Великого до Реформации: (Историческое исследование о важнейших реформационных движениях в Западной церкви в течение восьми столетий)*. Москва: Типолитогр. т-ва И. Н. Кушнерев и К°, 1913. 683.

410. Бирюков, Дмитрий Сергеевич. *Книга еретиков: антология*. Санкт-Петербург: Амфора, 2011. 474.

411. Бицилли, Пётр Михайлович. *Избранные труды по средневековой истории: Россия и Запад*. Москва: Яз. слав. культуры, 2014. 808.

412. Бондаренко, Николай. "Давид Аугсбургский как мастер традиционной словесности." *Символ* 51 (2007): 331–378.

413. Бродель, Фернан. *Средиземное море и средиземноморский мир в эпоху Филиппа II. Lib.ru: Журн. «Самиздат»*. Доступ 02.11.2022. http://samlib.ru/z/zubkow_a_w/braudel.shtml.

414. Вайнштейн, Осип Львович. *Западноевропейская средневековая историография*. Ленинград: Наука, 1964. 483.

415. Вернер, Эрнст. "Идеология немецко-австрийского вальденства в XIV в." В *Средние века: Сборник* 25, 113–127. Пер. с нем. В. М. Володарского. Москва: Акад. наук СССР, Ин-т истории, 1964.

416. Вис, Эрнст В. *Фридрих II Гогенштауфен*. Пер. с нем. Е. Б. Каргиной. Москва: АСТ: Транзиткнига, 2005. 378.

417. Валодзіна, Аляксандра і Мірослав Волощук, "Вальденський Магістр Symon de Galicz de Ungaria." *Галич. Збірник наукових праць* 8 (2023): 105–128.

418. Володина, Александра Вадимовна. "Общины «Paupers Catholici» и «Paupers Reconciliati» в рамках религиозного подъёма второй половины XI – первой половины XIII века." В *Bractwa religijne w średniowieczu i w okresie nowożytnym (do końca XVIII w.)*, 19–31. Под ред. Dominika Burdzy. Kielce: Wydawnictwo Uniwersytetu Jana Kochanowskiego, 2014.

419. Гарнак, Адольф. *История догматов. Библиотека Гумер – Догматика*. Доступ 22.10.2022. http://www.gumer.info/bogoslov_Buks/dogmatika/Garnak_int.php.

420. Гильем Тудельский. *Песнь об Альбигойском Крестовом походе* / Пер. с провансальского С. Д. Лихачёвой, А. А. Дубининой, В. В. Виноградовой. Москва: Квадрига, 2010. 320.

421. *Гісторыя Сярэдніх Вякоў*. 2 тома. Пад рэд. Віктара Анатольевіча Фядосіка. Мінск: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2003. 267.

422. Дмитриев, Михаил Владимирович. *Православие и Реформация: Реформационные движения в восточнославянских землях Речи Посполитой во второй половине XVI в.* Москва: Изд-во Моск. гос. ун-та, 1990. 134.

423. Дюби, Жорж. *Средние века. От Гуго Капета до Жанны д'Арк (987–1460)*. Пер. С фр. Г. А. Абрамова, В. А. Павлова. Москва: Междунар. отношения, 2000. 414.

424. Карсавин, Лев Платонович. "Очерки средневековой религиозности." В *История ересей: Сборник*, 9–266. Составитель Андрей Лактионов. Москва: АСТ, Хранитель, 2007.

425. Карсавин, Лев Платонович. *Сочинения*. под ред. А. К. Клементьева, С. Ю. Клементьевой. Санкт-Петербург: Алетейя, 1997. Том 2: Основы средневековой религиозности в XII–XIII веках. 418.

426. Керов, Всеволод Львович. "Народное еретическое движение бегинов юга Франции и Петр Иоанн Оливи." В *Французский ежегодник, 1968*, 5–33. Москва: Акад. наук СССР, Ин-т истории, 1970.

427. Керов, Всеволод Львович. *Народные восстания и еретические движения во Франции в конце XIII – начале XIV века*. Москва: Изд-во Ун-та дружбы народов, 1986. 134.

428. Ле Гофф, Жак. *Интеллектуалы в Средние века*. Пер. С фр. А. М. Руткевич. Санкт-Петербург: Санкт-Петербургский университет, 2003. http://yanko.lib.ru/books/temp/goff-intellectuala_v_sred_veka.pdf.

429. Ле Гофф, Жак. *Рождение чистилища*. Пер. с фр. В. Бабинцев, Т. Краева. Москва: АСТ, 2009. http://www.e-reading.club/bookreader.php/1034038/Goff_-_Rozhdenie_Chistilischa.html.

430. Ли, Генри Чарльз. *История инквизиции*. Том 2. Инквизиция в различных христианских землях. 3 тома. Москва: Эксмо, 2007. http://www.e-reading.club/bookreader.php/141261/Li_-_Istoriya_inkvizicii._tom_2.html.

431. Лившиц, Гилер Маркович. *Реформационное движение в Чехии и Германии*. Минск: Вышэйшая школа, 1978. 270.

432. Лозинский, Самуил Горациевич. *История папства*. Смоленск: Русич, 2004. 464.

433. Лортц, Йозеф. *История Церкви рассмотренная в связи с историей идей*. Москва: Христианская Россия, 1999. http://krotov.info/spravki/1_history_bio/20_bio/lortz.html.

434. Люблинская, Александра Дмитриевна. *Источниковедение истории Средних Веков*. Ленинград: Издательство Ленинградского университета, 1955. 374.

435. Нефедов, Сергей Александрович. *История Средних Веков*. Москва: ВЛАДОС, 1996. 363.

436. Озолин, Артур Иванович. *Из истории гуситского революционного движения*. Саратов: Изд-во Саратовского университета, 1962. 303.

437. Осокин, Николай Алексеевич. "Еретические верования." В *История ересей: Сборник*, 267–416. Составитель Андрей Лактионов. Москва: АСТ, Хранитель, 2007.

438. Осокин, Николай Алексеевич. *История альбигойцев и их времени*. Москва: Изд-во «АСТ», 2000. 889.

439. Рипарелли, Энрико. *Христианские ереси. Вчера и сегодня*. Москва: Ниола-Пресс: Вече, 2010. 127.

440. Рутенбург, Виктор Иванович. *Народные движения в городах Италии XIV – начало XV в.* Москва: Изд-во Акад. наук СССР, 1958. 383.

441. Сидорова, Нина Александровна. "Народные еретические движения во Франции в XII–XIII веках." В *Французский ежегодник* 1961, 429–433. Москва: Акад. наук СССР, Ин-т истории, 1962.

442. Сказкин, Сергей Данилович. "Первое послание Дольчино." В *Из истории социально-политических идей. Сб. ст. к семидесятипятилетию акад. В. П. Волгина*, 122–129. Под ред. Н. М. Дружинина. Москва: Академия наук СССР, 1955.

443. Сказкин, Сергей Данилович. *Из истории социально-политической и духовной жизни Западной Европы в Средние Века*. Москва: Наука, 1981. 295.

444. Устав ордена францисканцев утвержденный буллой [1223 год] *Библиотека Якова Кротова*. Доступ 22.10.2022. http://krotov.info/acts/13/1/1223ustav.htm.

445. Цыпина, Лада Витальевна. "Ересиархи и реформаторы: религиозное диссидентство позднего Средневековья как предпосылка Реформации." *Вестник гуманитарного факультета СПбГУТ им. проф. М. А. Бонч-Бруевича* 8 (2016): 133–140.

446. Чарняўскі, Уладзіслаў. *Біблія. Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запавету*. Мінск: Біблейскае таварыства ў Рэспубліцы Беларусь, 2012. 1120.

447. Шафф, Филипп. *История Христианской Церкви*. 6. Средневековое христианство. От Бонифация VIII до протестантской Реформации. 1294–1517 гг. Санкт-Петербург: Библия для всех, 2009. 516.

448. Эксле, Отто Герхард. *Действительность и знание: очерки социальной истории Средневековья*. Пер. с нем. и предисл. Ю. Арнаутовой. Москва: Новое лит. обозрение, 2007. 357 с.

449. Энгельс, Фридрих. *Крестьянская война в Германии*. Москва: Госполитиздат, 1952. 184.

450. *Эпоха крестовых походов*. Под ред. Эрнест Лависс и Альфред Рамбо. Смоленск: Русич, 2005. 627.

451. Ястребов, Николай Владимирович. *Этюды о Петре Хельчицком и его времени (Из истории гуситской мысли)*. Том 89. Записки Историко-филологического факультета Императорского Санкт-Петербургского университета. Санкт-Петербург: тип. Министерства путей сообщения (т-ва И. Н. Кушнерев и К°), 1908.



Распаўсюджанне вальдэнсаў у розных рэгіёнах Еўропы ў XII – пачатку XV ст. Карты



Карта А1. Вальдэнскія пераклады Біблii і саборы па іх забароне

Складзена на аснове: *The New Cambridge Medieval History.* Vol. IV. Part II. Cambridge Histories Online © Cambridge University Press, 2008. The kingdom of the Franks. P. 123.



Карта А2. Групы “бедных каталікоў” і “бедных ізноў далучаных” у пачатку XIII ст.

Вялікімі літарамі на карце пазначаны тыя гарады, біскупам/архібіскупам якіх былі накіраваны лісты датычна “бедных каталікоў”; група “бедных ізноў далучаных” была зафіксавана ў горадзе Крэмона.



Карта А3. Вальдэнсы ў дзяржаве Атакара II

Складзена на аснове: *The New Cambridge Medieval History.* Vol. V. Cambridge Histories Online © Cambridge University Press, 2008. The expansion of Bohemia under Ottokar II. P. 757.



Карта А4. Вальдэнсы ў Свяшчэннай Рымскай Імперыі ў канцы XIV ст.

Складзена на аснове: *Гісторыя Сярэдніх вякоў V–XV стст.* 6 клас. Контурныя карты. Вучэбны дапаможнік для навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. С. 16: Германія ў XIV–XV стст.

На карце пазначаны гарады Свяшчэннай Рымскай Імперыі, у якіх у канцы XIV ст. зафіксаваны найбольш моцныя вальдэнскія групы: у рамках – дзе анты-ерэтычныя працэсы праводзіў Пётр Цвікер, падкрэсленыя – іншыя інквізітары. Астатнія гарады дадзеныя для прасторавай арыентацыі. Штрыхоўкай пазначаны "Вальдэнскія даліны".

Рэгіёны распаўсюджання вальдэнсаў і іх асаблівасці

	Час з'яўлення	Час знікнення	Сацыяльны пласт
Ліён	1170-я гг.	1182 г.	Вальдэс – заможны гараджанін
Лангедок і Бургундыя	Канец XII ст.	Сярэдзіна XIV ст.	Неаднародны з перавагай ніжэйшых пластоў
Вольныя імперскія гарады на паўднёвым захадзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі	Канец XII ст.	1430 г.	Заможныя гандляры і рамеснікі, пераважна звязаныя з ткацтвам
Цэнтральная Еўропа	Пачатак XIII ст.	Пачатак XV ст.	Дробныя гандляры і рамеснікі (пераважна ткачы, шаўцы і краўцы), сяляне
Ламбардыя	1179 г.	Канец XIV ст.	Гараджане, пераважна ткачы
Заходнія Альпы	1212 г.	Цэнтр руху і па сёння	Жыхары горных паселішчаў

Спецыфічныя палітычныя/ сацыяльныя абставіны
1. Вольны біскупскі горад. 2. Рэфарматарская ініцыятыва біскупа Гвічарда.
1. Адкрытая пропаведзь. 2. Фактычная адсутнасць падзелу на "сваіх" і "чужых". Вальдэнсы гэтага рэгіёну слаба вылучалі сябе з агульнай масы каталіцкіх вернікаў, але даволі выразна праводзілі мяжу паміж сабой і катарамі. 3. Найменшая (у параўнанні з астатнімі рэгіёнамі) схільнасць да данатызму і малая варожасць да каталіцкага кліру (бо галоўныя ворагі – не каталікі, а катары). 4. Найбольшая колькасць згадак пра самастойнае здзяйсненне еўхарыстыі. 5. Найбольшая (але не выключная) колькасць згадак пра пераклады Біблії на "народную" мову – сведчанне таго, што мова гэтага перакладу, што лагічна, была зразумелая менавіта ў гэтым рэгіёне. 6. Найбольшая (але не выключная) колькасць згадак пра абрэзаны зверху абутак. 7. Моцны акцэнт на забароне праліцця крыві і адсутнасць звестак пра ўзброены супраціў.
1. Найбольшая ступень інтэграцыі ў гарадское асяроддзе. 2. Атрыманне высокага сацыяльнага статусу. 3. Судовая і па-за судовая барацьба за свае правы.
1. Вальдызм распаўсюджваўся пераважна нямецкамоўнымі каланістамі ў сваім асяроддзі. 2. Вальдэнсы часткова зліліся з гусітамі. 3. Адсутнічаюць сведчанні пра жаночую пропаведзь і пражыванне з жанчынамі ў адным доме – магчыма, жанчыны не маглі быць "настаўнікамі". 4. Адсутнічаюць некананічныя згадкі пра прыроду Хрыста – з-за адсутнасці моцнага катарскага ўплыву і параўнальна ніжэйшага адукацыйнага ўзроўню "настаўнікаў" (яны не рабілі на гэты конт сваіх высноваў).
1. Цэнтр руху ў XIII і XIV ст. 2. Рэгіён вялікай канцэнтрацыі розных ерасяў, моцны ўзаемаўплыў. 3. Развіццё на фоне барацьбы гвельфаў і гібелінаў.
1. Вельмі высокая канцэнтрацыя вальдэнсаў. 2. Падтрымка мясцовых улад. 3. Актыўная ўзброеная барацьба за свае правы. 4. Пражыванне ў аддаленых мясцовасцях ускладняла інквізіцыйны вышук.

Змест

Уводзіны 5

Глава 1. Гістарыяграфія і крыніцы

Гістарыяграфія 16

Крыніцы 28

I. Дакументы, створаныя самімі вальдэнсамі 28

II. Заканадаўчыя крыніцы 28

III. Тэалагічныя і палемічныя працы, а таксама працы дамініканцаў-інквізітараў, прысвечаныя шляхам барацьбы з ерэтыкамі 28

IV. Матэрыялы інквізітарскіх допытаў 30

V. Хронікі 32

Глава 2. "Класічны" вальдызм

Зараджэнне руху (1170-я гг. – 1215 г.) 35

Назва руху 35

Дата ўзнікнення руху 37

Спробы легальнага існавання (1215–1260-я гг.) 43

Пераклад Бібліі Вальдэса на "народную" мову ў вольных імперскіх і біскупскіх гарадах 44

Дзейнасць Дуранда з Оскі 49

Супрацьстаянне вальдэнсаў з катарамі 53

"Класічны" вальдызм і яго адметнасці 61

Структура вальдэнскай абшчыны 61

Знешнія прыкметы першай групы 61

Абавязкі розных груп 62

Кіраўніцтва асобнымі абшчынамі і ўсім рухам 64

Царкоўныя чыны сярод "дасканалых" 66

Веравучэнне "класічнага" вальдызму паводле Пасаўскага ананіма 67

Сацыяльны склад вальдэнсаў у розных рэгіёнах 69

Антывальдэнскія працэсы ў гарадах на паўднёвым захадзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі 72

Знікненне "класічнага" вальдызму (пачатак XV ст.) 78

Зліццё паняццяў "вальдызму" і "вядзьмарства" ў Заходняй Еўропе 79

Вальдэнсы ў Цэнтральнай Еўропе і вучэнне Яна Гуса 86

Глава 3. Гісторыка-геаграфічныя асаблівасці ўзнікнення і пашырэння руху вальдэнсаў

Лангедок і Бургундыя 94
Паўночнаітальянскія гарады-камуны 99
Аддзяленне ламбардскай групы 100
Група Бернарда Прыма 102
Горныя даліны Заходніх Альпаў 105
Паўднёвая Італія 109
Калабрыя 109
Апулія і Сардзінія 110
Вальдэнсы ў нямецкамоўных землях: Германія, Аўстрыя і Швейцарыя 112
Чэхія 116
Праца Гала з Касорыц і Пятра з Начырадца 119
Сілезія, Памор'е і Польскае Каралеўства 123
Польскае Каралеўства 123
Ніжняя Сілезія 124
Заходняе Памор'е 131
Венгерскае Каралеўства 135

Глава 4. Агульныя і рэгіянальныя рысы вучэння вальдэнсаў

Агульныя рысы сярэднявечнага вальдызму 143
Мірская пропаведзь (у тым ліку жаночая) 143
Роля жанчыны 146
Святарства міран: еўхарыстыя і споведзь 148
Шлюб і развод 150
Непрыняцце гвалту 151
Чысцец 153
Супрацьстаянне з Апостальскім Прастолам і непрыняцце царкоўных абрадаў 154
Спецыфічныя вераванні: традуцыянізм і існасць душы 157
Адрозныя рысы ў веравучэнні розных абшчын і прычыны іх узнікнення 159
Адмова ад клятвы 159
Пытанне працы 161
Валоданне маёмасцю 163
Права на здзяйсненне гвалту ў мэтах самаабароны 165
Заключэнне 169

Пераклады

I. Першыя дакументы па гісторыі вальдэнсаў 175
I.i Кніга відзежаў і цудаў 175
I.ii Споведзі веры Вальдэса і яго паслядоўнікаў Дуранда з Оскі і Бернарда Прыма, а таксама статуты апошніх 176
I.ii.a Споведзь веры Вальдэса 176
I.ii.b Булы Папы Рымскага Інакенція III датычна Дуранда з Оскі 179
I.ii.c Булы Папы Рымскага Інакенція III датычна Бернарда Прыма 192
I.iii Дуранд з Оскі. Кніга супраць ерасяў 197
I.iv Заканадаўчыя дакументы 203
I.iv.a IX артыкул сінадальнай пастановы Адона, біскупа Туля 203
I.iv.b Эдыкт караля Арагонскага і графа Праванскага Альфонса II ад 1192 г. 204
I.iv.c Эдыкт караля Арагонскага Педра II ад 1197 г. 205
I.iv.d Статут біскупа Гі з Палестрыны, папскага легата ў Бельгіі, ад 1202 г. 205
I.iv.e Згадка пра дыспут, які адбыўся ў Каркасоне ў 1203 г. 205
I.iv.f Урыўкі з лістоў Папы Рымскага Інакенція III ад 1206 г. да падэста і консулаў Фаэнцы і Эмільі 206
I.iv.g Саборная пастанова ад 1208 г. Адона, біскупа Парыжа. 206
I.iv.h Пастанова імператара Свяшчэннай Рымскай Імперыі Атона IV супраць турынскіх Вальдэнсаў ад 25 сакавіка 1210 г. 206
I.iv.i Пінерольскі статут 206
I.iv.k Статут імператара Свяшчэннай Рымскай Імперыі Фрыдрыха II супраць ерэтыкоў. 207
I.v Антывальдэнскі працэс у Мецы ў 1199 г. 207
I.v.a Вытрымкі з булаў Папы Рымскага Інакенція III у Мец 207
Да ўсіх вернікаў горада і біскупства Меца. 207
Да абатаў Сіто, Марымонда і Ла Крэт 208
I.v.b Цэзарый з Гайстарбаха. Дыялог пра цуды. 208
I.vi Артыкулы веры страсбургскіх Вальдэнсаў. 209
I.vii Ліст прадстаўнікоў італьянскай галіны Вальдэнсаў да сваіх братоў па веры з Германіі або Аўстрыі 210
I.viii Хронікі 218
I.viii.a Лаонская хроніка 218
I.viii.b Урспергская хроніка. 219
I.viii.c Хроніка манаха Альберыка з Труа-Фантэн 220
I.viii.d Хроніка настаўніка Гіёма з Пюіларана. 222
II. Палемічныя творы 224
II.i Гідэфрыд з Асэра. Наконт Апакаліпсіса (Super Apocalypsim) 224
II.ii Бернард з Фанкода. Трактат супраць Вальдэнсаў 225

II.iii Ліст біскупа П'ячэнцы Ардыцыя пра бедных з Ліёна 227
II.iv Пётр Спявак. У абарону пропаведзі міран 229
II.v Алан Лільскі. Пра каталіцкую веру 230
II.vi Эбрард з Бецюна. Кніга супраць ерасяў. 232
II.vii Эрменгард (з Безье?). Урыўкі 235
II.viii Іаахім Флорскі.
Трактат пра Чатыры Евангеллі. Пра артыкулы веры 238
II.ix Пётр з Во-дэ-Сэрнэ. Гісторыя альбігойцаў. 239
II.x Рычард з Пуацье.
З жыццяпісу Папы Рымскага Аляксандра III 240
II.xi Сальва Бурчы. Кніга над Зорка 241
II.xi.a Пра права свецкай улады на забойства 244
II.xi.b Пра тое, што каралі, уладары і магутныя свецкія,
або мірскія, ад добрага Бога, а не ад Д'ябла.... 247
II.xi.c Пра клятву. 247
II.xi.d Падзел палоў 249
II.xi.e Традуцыянізм. 249
II.xii Пётр Пакутнік. Супраць патарэнаў 251
II.xiii Манета з Крэмоны. Супраць Катараў і Вальдэнсаў 252
II.xiv Стэфан дэ Бурбон.
Пра сем падарункаў Святога Духа 256
II.xv Райнэрый Саконі. Падсумаванне пра катараў і леаністаў,
або бедных з Ліёна 262
II.xvi Жыццяпісы братоў ордэна прапаведнікаў. 263
II.xvii Ансельм з Александрыі. Трактат пра ерэтыкоў 263
II.xviii "Гэта высветлена ад перавернутых
у секту Вальдэнсаў". 266
III. Інквізіцыйныя матэрыялы. Францыя 268
III.i.a Інквізіцыйная нарада ў Авіньёне, дзе было аб'яўлена,
каго лічыць Вальдэнскімі вернікамі (1235 г.) 268
III.i.b Вальдызм у дыяцэзіі Німа ў 1200 г. 268
III.i.c Вальдэнс Ян з Бургундыі (каля 1205–1240 гг.). 269
III.i.d Пра разбураны дом 269
III.i.e Працэс супраць жанчыны,
якая падтрымлівала Вальдэнсаў, у 1230-х гг. 269
III.i.f Працэс супраць Вальдэнскай верніцы,
асуджанай на турэмнае зняволенне 270
III.i.g Вальдэнская верніца, асуджаная
на нашэнне двух крыжоў на сукенцы, 1244 г. 270
III.i.h Перадача ў рукі свецкіх уладаў
трох Вальдэнскіх прапаведнікаў у 1240 г. 270

III.i.i Эксгумацыя парэшткаў жанчыны,
якая зрабіла тэстамент на карысць Вальдэнсаў 271
III.ii Прысуды, вынесеныя інквізітарам
Пятром Селанам у Керсі ў 1241–1242 гг. 271
III.iii Апытальнік для Вальдэнсаў. 275
III.iv Прызнанне Раймунда дэ ла Косты
і яго паплечнікаў. 276
III.iv.a Раймунд дэ ла Коста, 1318 г. 276
III.iv.b Ян з В'ен, ерэтык-Вальдэнс, 1319 г. 280
III.iv.c Прызнанне Гіёма Эсканэрыя з Акса, 1320 г. 280
III.v Прысуды Тулузскай інквізіцыі ў 1320-х гг. 281
III.vi Бернард Гі. Кіраўніцтва для інквізіцыі наконт
ерэтычнай заганнасці 284
III.vi.1 Наступнае – пра секту Вальдэнсаў,
і перш-наперш пра іх паходжанне і часы, калі пачалася 284
III.vi.2 Пра тры народныя назвы саміх Вальдэнсаў. 285
III.vi.3 Пра памылкі Вальдэнсаў гэтага часу,
бо раней мелі шмат іншых 285
III.vi.4 Пра іх спосаб ці рытуал правядзення імшы 287
III.vi.5 Пра лад жыцця Вальдэнсаў 288
III.vi.6 Пра спосаб навучання Вальдэнсаў 290
III.vi.7 Пра хітрасці і хітрыкі,
якімі яны прыкрываюцца, адказваючы 291
III.vi.8 Пра сафізмы і падваенні іх слоў 292
III.vi.9 Спецыяльны апытальнік для тых,
хто з секты Вальдэнсаў 292
III.vii Пра жыццё і дзеі бедных з Ліёна 293
III.viii Нікалас Эймерык. Шлях інквізітараў 298
IV. Італія 301
IV.i Була ў Марсэль наконт п'емонцкага
ерэсіярха Марціна Пастрэ 301
IV.ii Працэс інквізітара Альберта дэ Кастэлярыа ў Джавэна
ў студзені-лютым 1335 г. 302
IV.iii Була Амадэю Савойскаму
ад Папы Рымскага Грыгорыя XI. 305
IV.iv Працэс супраць Вальдэнсаў у 1373–1388 гг. 306
IV.iv.a Томас з Казаска, даліны Ланца, 1373 г. 306
IV.iv.b Антоній з Савільяна, Пінерола, 1387–1388 гг. 308
IV.v Працэс 1394–1395 гг. супраць Якуба Рысталаксія. 313
IV.vi Працэс супраць Яна Сэнсі ў даліне Сузы 1403 г. 315
IV.vii Ліст Вінцэнта Ферэра 316
IV.viii Бернардзін Сіенскі. Пропаведзь 1427 года 318

V. Свяшчэнная Рымская Імперыя 319
V.i Пасаўскі ананім 319
V.ii Давід Аўгсбургскі. Пра вышук ерэтыкоў 332
V.iii Перапіска перавернутых вальдэнсаў Зігфрыда і Яна Лезера са сваімі былымі аднаверцамі ў Італіі 341
V.iii.a "Кніга Выбраных" 341
V.iii.b Ліст братоў з Італіі, што не вераць у святароў, але кажуць, што самі з'яўляюцца сапраўднымі паслядоўнікамі апосталаў, да тых, хто вярнуўся з ерэтычнай заганнасці ў Санкт-Петэр-ін-дэр-Аў 344
V.iii.c Лісты Лезера 348
V.iii.d Ліст Зігфрыда 349
V.iv Антывальдэнскі працэс у Майнцы ў 1390 г. 350
V.iv.a Артыкулы ерасі ў Майнцы 350
V.iv.b Майнцкая хроніка 351
V.v Антывальдэнскія працэсы ў Фрыбуры і Берне 351
VI. Каралеўства Багемія 353
VI.i Була Папы Рымскага Аляксандра IV наконт ерэтыкоў на памежжы каралеўстваў Багеміі і Польшчы 353
VI.ii Інквізіцыйныя пратаколы Гала з Касорыц і Пятра з Начырадца 355
VI.ii.a Апытальнік 355
VI.ii.b Пратаколы. 357
VI.iii Статут Яна, Пражскага Архібіскупа і Апостальскага Легата, да ўсіх вернікаў Рэгенсбургскай, Бамбергскай і Майсэнскай дыяцэзій, 30 красавіка 1381 г. 360
VI.iv Пражская пропаведзь Мацвея Кракаўскага ад 25 студзеня 1384 г. . . . 360
VI.v Ліст Оламаўцкага біскупа Мікалая да Рымскага Папы 1394 г. 361
VI.vi Якуб з Петрыкаў. 20 "зманаў" Вальдэнсаў 362
VI.vii Трактат супраць ерэтыкоў 363
VII. Польшча 365
VII.i Антыерэтычны працэс у Свідніцы 1315 г. 365
VII.i.a Аналы 365
VII.i.b Пратаколы допытаў 365
VII.i.c Апытальнік 368
VII.i.d Дакументы з канцылярыі вроцлаўскага біскупа Генрыка з Вежбней (1302–1319 гг.). 370
VII.ii Була Папы Рымскага Яна XXII наконт усталявання папскай інквізіцыі ў Польскім Каралеўстве 374
VII.iii Прысуд Стэфану з Вроцлава 376
VII.iv Мацвей Влашыч Ілірыйскі. Вытрымкі 377

VII.v Матэрыялы Пятра Цвікера (PROCESSUS PETRI). 378
VII.v.a Кароткі спіс перавернутых Вальдэнсаў і пра іх побыт і лад жыцця (de vita et conversacione) 378
VII.v.b Доўгі спіс перавернутых Вальдэнсаў. 380
VII.v.c Маніфест супраць Вальдэнсаў 381
VII.v.d Псеўда-Піліхсдорф 385
VII.v.e Працэс супраць вальдэнсаў Заходняга Памор'я, 1392–1394 гг. 385
VII.v.f Артыкулы секты Вальдэнсаў 395
VII.v.g Працэс у Трнаве 1400 г. 397

Бібліяграфічны спіс 398

Дадатак А. Распаўсюджанне вальдэнсаў у розных рэгіёнах Еўропы ў XII – пачатку XV ст. Карты 424

Дадатак Б. Рэгіёны распаўсюджання вальдэнсаў і іх асаблівасці. 428



В 15 **Валодзіна, А.** Вальдэнсы ў канцы XII – пачатку XV стагоддзя : паміж ерэтычнай сектай і народнай рэлігійнасцю / Аляксандра Валодзіна. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2024. – 440 с.

ISBN 978-985-880-471-8

Манаграфія прысвечана гісторыі вальдэнсаў, адзінага "ерэтычнага" руху эпохі Сярэднявечча, які захаваўся да нашага часу. Распавядаецца пра ўзнікненне руху і яго пашырэнне ў розных рэгіёнах Еўропы – ад Іспаніі да Польшчы. Раскрываюцца асаблівасці функцыянавання вальдэнскіх абшчын у розных грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных абставінах. Падрабязна разглядаюцца агульныя і рэгіянальныя рысы веравучэння вальдэнсаў. У кнізе апублікавана больш за 90 разнастайных дакументаў, датычных гісторыі вальдэнсаў, *у перакладзе аўтара* з лацінскай на беларускую мову. Кніга будзе карысная як навукоўцам, так і шырокаму колу чытачоў, якія цікавяцца гісторыяй рэлігіі, ерэтычных рухаў, інквізіцыі, эпохай Сярэднявечча.

УДК 272-876-9(4)"11/14"
ББК 86.375-8-3(4)
ГРНТИ 21.15.61

Навуковае выданне

Аляксандра Валодзіна

ВАЛЬДЭНСЫ

ў канцы XII – пачатку XV стагоддзя:
паміж ерэтычнай сектай
і народнай рэлігійнасцю

Рэдактар *М. Н. Гальпяровіч*
Карэктар *А. А. Федарэнка*
Макет, камп'ютарная вёрстка *Я. А. Мальдзіса*
Графічны дызайн *В. В. Гаўрычэнка*
Мастак *Я. А. Валента*

Падпісана ў друк 05.06.2024. Фармат 70×100 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 33,75. Ул.-выд. арк. 32,5.
Тыраж 200 экз. Замова 215.

Надрукавана з арыгінал-макета
заказчыка ў друкарні

РУП «Інфармацыйна-вылічальны цэнтр
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь».
Пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/161 ад 27.01.2014, № 2/41 ад 29.01.2014.
Вул. Кальварыйская, 17, 220004, г. Мінск.

ISBN 978-985-880-471-8

***Аляксандра Вадзімаўна Валодзіна** нарадзілася 15 ліпеня 1989 года ў Мінску. Скончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, яго магістратуру і аспірантуру. У 2018 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме "Рух вальдэнсаў у канцы XII – пачатку XV стагоддзя". Пераможца шматлікіх навуковых конкурсаў, у тым ліку Конкурсу навукова-даследчых работ Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Конкурсу ўрада Швейцарскай Канфедэрацыі для выбітных даследчыкаў. Праводзіла даследаванні ў навуковых установах Германіі, Італіі, Польшчы і Румыніі. Удзельніца міжнародных навуковых канферэнцый у Беларусі, Іспаніі, Чэхіі, Швейцарыі, Швецыі і інш. Аўтар 40 навуковых публікацый. Экскурсавод па Беларусі, займаецца рэканструкцыяй матэрыяльнай культуры Сярэднявечча і XIX стагоддзя.*



Вальдэнсы

ў канцы XII - пачатку XV стагоддзя:
паміж ерэтычнай сектай
і народнай рэлігійнасцю

Аляксандра
Валодзіна